Ciesząc go, by nie tracił ducha w przeciwności,
By z pokorą krzyżyki znosił Opatrzności.

W tem za Żodzinem piasek utrudzał nam drogę,
Koniki zmardowane, szły noga za nogę,
Jacek drzemał na koźle,— mnie napadła nuda;
Nuż w rozhowor ze starcem! — może też się uda
Wprawić go w dobry humor; — nuż o parenteli,
Pytać o jego przodkach po mieczu, kądzieli.

Trafiony w słabą żyłkę zacny starowina,
Uśmiechnie się życzliwie i tak rozpoczyna,
O chwale swoich przodków wieść rodowód długi,
Jak Rzeczypospolitej nieśli swe usługi.

«Ot *bodaj cię panoczku* — Murza Tuhanowski,
Gerej Mustafa, zwany w Litwie Baranowski,
Był naszym protoplastą: — choć tatarskie plemie,
Jednak ze krwi książęcej; — *bodaj* cię — swą ziemię,

Pokłóciwszy się z Hanem, opuścił w żałości,
I na Litwie — *bodaj cię* szukał gościnności.

Król Jan trzeci — *bodaj cię* — co oceniał męże,
Których w obronie kraju słynęły oręże,
Nagrodził mu zdobyte na polu wawrzyny,
Dając konsensem wioskę koło Berezyny;
I uczynił starostą miasta Borysowa.
Syn jego Mahmut piękny,— zapalona głowa!
Rozgorzał się miłością do Sliźniówny Anny,
Córy obywatelskiej, urodziwej panny!
*Bodaj cię* — cna dziewica chociaż mu sprzyjała,
Milszą wszakże Ojczyzny dla niej była chwała:

W zapale swym dla kraju,— gdy prosił jej ręki,
Położyła — *bodaj cię* warunek małęki,
Ot gdyby się pogańskiej zrzekł *panoczku* wiary,
By orężem dla kraju przyniosł świetne dary;
Wówczas zacna panienka, czcząc zasługi, męstwo,
Odda się młodzieńcowi w dozgonne małżeństwo.

Jak rzekła, tak się stało! — W Katolickiej wierze
Ochrzczony Władysławem, młodzieniec w ofierze
Dla nowej swej ojczyzny, chętnie żywot poda,
Bo też — *bodaj cię* — wabna była i nagroda!
Więc na polu rotmistrzem przez króla nazwany,
Przy boku pięknej żony goił chlubne rany.

Za Augusta trzeciego, kiedy kraj w latargu,
Gdy urzęda, przy pjanstwie, stały jak na targu,
Wówczas dziad nasz, *panoczku*,— Józef Baranowski,
Uciśniony processem, odprzedał swe wioski,
I u Szczerowskich panów wziął ziemię w arędę,
I ująwszy w dłoń lemiesz, zagonową grzędę
W krwawym pocie uprawiał, nosząc się w siermiędze,
*A bodaj cię* — przekazał synom, wnukom nędzę!»

«No przynajmniej, wyrzekłem pocieszając Jacka,
Rodowód zacnych przodków, toż nie licha cacka!»

«E!.. co tam stare herby, *panoczku* — bierz djabli!
Dziś ten klejnot bez grosza, to pochwa bez szabli;
Oto i my *panoczku,* że w biedocie żyli,
Jak w dym, do jednodworców *bodaj cię* trafili!»
Tu stary ręką utarł łzą zaszłe powieki,
I krzyknął — wiu koniki! — popas nie daleki.

Aż i Borysow, płodny w historyczne dzieje,
Z poza wałów sypanych ułudnie się śmieje.
Tędy Witold Litewski prowadził swe szlaki,
Tutaj Zygmunt swe wojska zwycięskie powitał,
Tu waleczny Batory wroga się dopytał,
W tem miejscu Cezar Franków stracił mężne znaki.
Iluż scen bohaterskich, krwawych tu dziedzina!
Patrz jak licho wygląda dzisiaj ta mieścina,

Witajże Borysowie! — miasto pełne błota,
Z którego nędznych chałup wygląda hołota
Obdartych bohaterów rozrzuconej Judy,
Jak wdzięcznie podróżnika wabią twoje brudy!
Kolebko wielkich czynów! — Tu z karczmy odartej,
Oknem, albo też bramą stodoły otwartej
Utęskliwie pogląda perła Borysowa,
Którego na sposoby wytężona głowa,
Jakby zwabić podróżnych, uczcić nowinami,
Nakarmić gniłą rybą i obwarzankami,
Kmiotka sporym kielichem uraczyć życzliwie,
A wszystkich dłonią chciwą drzeć nielitościwie!

Tu popas,— tu wieczerza dla nas i dla koni.
Pan Jacek, podchmielony, raźniej czwórkę goni,
Która, czując swe strony, uwija się żwawo,
Aż mijając Łosznicę, zwróciła na prawo,
I jeszcze milkę sporą ubiegłszy w pośpiechu,
Stanęła przy karczcmce lichej dla oddechu.

Stary i tu kielichem rzeźwi się gorzały,
I kiedy się koniki dobrze wysapały,

Ruszamy w dalszą drogę,— mijamy wiosczynę,
I wpadamy na jakąś nie wielką drożynę;
A pora już spóźniona,— dwónasta w połowie:
Trzebaż — nowe nieszczęście! — ot przy samym rowie,
Jakby widmo urocze, żyd nam przerznął drogę,
Pan Jacek drgął na kozle, nową uczuł trwogę,
A choć splunął trzy razy,— siebie, konie żegnał,
Jednak przeczucia z tęskej duszy nie odegnał.

«*A bodaj cię, panoczku* — spotkanie w podróży
Izraelitę nocą, to nieszczęście wróży,
Widać że Bóg nas dzisiaj przeznaczył na męki».
Rzekł starzec i lejczynę z nieposłusznej ręki
Upuszczając pod konie, zatrzymał je w biegu:
Klnie Pan Jacek,— jam nie rad w lesie mieć noclegu,
Wyłażę z nejtyczanki, zgubę odszukuję,
Murzie Tuhanowskiemu do ręki pakuję.

Ruszamy sporym kłusem — w tem skręcone konie,
Między krzaki w lesiste suną nas ustronie:
«A bójsież Boga Murzo! wykrzyknę struchlały,
Zawróć prędzej na lewo, gdy chcesz mieć kark cały».—
«*A bodaj cię, panoczku* — to żydowska sztuka!
Niechaj mi pan lejczynę z pod koni wyszuka,
A wnet znajdziemy drogę, *bodaj cię* — psia wiara!
To prawdziwe nasłanie,— Boska na nas kara!» —

Tak lamentuje Jacek — i ruszamy dalej,
Aż tu nowa przygoda! — jak obuchem wali
Ktoś mi z tyłu po plecach,— no! — i jam się strwożył,
Tym czasem wróg mi razy wsciąż goretsze mnożył;
Pomyślałem zlękniony pewno rozbójniki:
«Murzo! — na miłość Boga popędzaj koniki!»
Gdzie tam! — im prędzej czwórka do biegu się kwapi,
Tem mi gęstszemi razy wróg plecy utrapi.

Nowa zatem myśl w głowie błysła mi przelotnie,
Co tylko mam przy sobie, dam zbojom ochotnie,

I do serc ich przemówię czułemi wyrazy,
I skruszę, choćby twarde były, jako głazy.
Zatrzymuję Więc Jacka i szykując w głowie,
Przemawiam wierszem gładkim w następnej osnowie:

«Jaśnie Wielmożni państwo rozbójnicy!
Miejcież litość! — nie bądźcie jakby owi dzicy,
Którzy, gdy podróżnego chwycą w swe pazury,
Nie zważają że bliźni, drą jego ze skury.
Wyż przecie Chrześcianie? — miejcież to na względzie,
Że bardzo małą korzyść z zabójstwa mieć będzie,
Kto zgładzi literata, albo wierszokletę;
Bo, gdy inni rublami ładują kaletę,
Ci przeciwnie, pracując dla potomnej sławy,
W literackie kieszenie pakują rozprawy,
Nudne ody, albo też czułych wierszy krocie,
Bujając po parnasie, nie myślą o złocie.
Jam zwolennik muz pięknych, służę Melpomenie,
Stąd dowód oczywisty,— chude mam kieszenie!
Ot lepiej rozstańmy się w serdecznej przyjaźni,
A ja, przez wdzięczność dla was, z bujnej wyobraźni
Wywołam bohaterską odę, sławiąc czyny
Wspaniałych gospodarzy tej leśnej krainy!» —

Skończyłem,— wtem o dziwo! — ustało grzmocenie,
Myślę, skruszyło zbójców czułe przemówienie,
Spoglądam więc za siebie,— gdzie są rozbojnicy?
Żywej duszy nie widać, tylko między szpicy
Tylniego koła gałąź uwięzła nie mała,
I w obrocie niegrzecznie na kark mi spadała.

Jużeśmy też u celu — wpadamy do wioski;
Kończą się przecież nasze przygody i troski;
Oto i dwór Szczerowski! — Przed gankiem mię wita,
Prawa ręka dziedzica, poczciwy Mikita,
Wprowadza do pokoju, herbatą ogrzewa,
I na kominek kładzie spory kawał drzewa.
O jakże mi, roskoszny po trudach podróży,
Miękko usłana pościel, odpoczynek wróży!!

## Cześć 3-cia

## Gościna.— Literackie powodzenie

Ej! — miło jest choć wspomnieć błogi wiek co minął,
Kiedy dom staropolski gościnnością słynął!
Gdy na przybycie gościa stroją dworce, chaty,
Kiedy za zdrowie gościa podnoszą wiwaty!
Kiedy cała somsiedztwa zbiera się gromada,
A czem chata bogata, tem gościowi rada!
A sercaż? — one w czynach, w słowach i w uścisku,
Nawet na dnie kielicha, nawet na półmisku!
I również w każdej chwili będą one drgały,
Choćbyś tam gościł tydzień, miesiąc, lub rok cały!
Gospodarze, rodzina służąc kto czem zdoła,
A gdybyś chciał wyjeżdżać, pozdejmują koła!
Dziś już insze zwyczaje,— cywilizowane!
W miejscu serc, znać z słów, czynów lisy farbowane.
Przybądź w dom, i w dom Polski! — cóż dziś gość zobaczy?
Pan gospodarz i przysiąść poprosić nie raczy!
Konie w karczmę, albo szle do próżnego żłobu,
By się tam *hungier-kuru* uczyły sposobu.
Z gościem wszczęta rozmowa o deszczu, pogodzie,
Unikając materji o podróżnych głodzie,
O korzyściach niemieckiej prawią spekulacyj,
Bogu chwała, w poszóstnej cenie żytko płaci!
Ot gdyby nie głód, wojna, pomorki w tej dobie,
Trudno byłoby jakoś i wystarczyć sobie!
Westchnąłeś,— więc pan domu zerkając z ukosa,
Wpakuje ci cygaro, albo papierosa;
Lecz nie sądź że hanneman, heller, albo koffski,
To są z Mińska, lub z Pińska, fabryki żydowskiej.
Dalej ujrzysz ze szklanką, maleńki imbryczek;
Koniec końców, rozłożą zielony stoliczek:
A gdy cię jakimś czarem unika kożerka,
Napij się gościu wódki, zjedz na drogę serka,
I ruszaj! — podróżnego rubla żalem zdjęty,
Wracaj zgłodniały, goły, jak turecki święty!

Lecz kto chcesz ojców cnoty ujrzeć dziś wskrzeszone,
Bądź podróżnym, zwróć kroki w Białorusi stronę:
Tu ci zatętni serce, pocieszy się dusza,
Jakem ja był pocieszon w domu Juliusza!

Przybywam w dom,— gospodarz znany wam z nazwiska,
Serdecznie mię po polsku, po bratersku ściska:
Acz młody i bogaty, pełen uprzejmości,
Przedstawia mi z somsiedztwa zgromadzonych gości.
To,— Paweł z Pociejkowa, lepelczuk mój Panie!
To,— Pan Tadeusz, druh nasz z Mohilewskiej ziemi,
To,— Józef — i Ten również,— obaj Witebszczanie;
Poczciwy Edward,— Wiktor — i Stanisław z niemi:
To Jan, dziedzic Janowa,— chłop go ojcem wola,
Lecz szkoda że nie poznasz Białorusi czoła,
Ot Jana z Bohatowa, człowieka światłego,
Który jest opatrznością dla kmiotka biednego!
Również księcia Stefana,— zacnego magnata!
On w człeku bez różnicy widzi swego brata.
Dzisiaj nam przewodniczy; — niechże jak najdłużej
Obywatelstwu sercem, również czynem służy.

Tak przemawia Juliusz, a kompanja cała
Serdecznie, po bratersku przychodnia witała.
Każdego z nich pokochać bierzę mię pokusa,
W każdym z nich prawdziwego widzę Białorusa!
W jednej chwili znajomość stanęła,— bo razem
Wszystkich serca się zbiegły, jak magnes z żelazem.
A tym czasem przekąski stawią przedobiednie,
Masz tu szynki i sery i wędliny przednie;
Przy nich inne przysmaki, dodają ochoty
Tym więcej, że to wszystko domowej roboty.
Ślinka ciecze,— gospodarz wszakże prosi mile,
Byśmy na księdza stryja poczekali chwilę,
A tu z boku nieznacznie dorzucono głosy:
«To kapłan, co sprowadza z nieba błogie losy!
Wielki to jest przyjaciel ludu i prostoty,
Cierpiał dużo dla chwały Bożej, i dla cnoty!

Ciesząc się dziś rodziną, ludem, jakby synem,
Przyświeca okolicy nauką i czynem.
To namiestnik Chrystusa, wiarą się zaleca,
Czystością obyczajów ludowi przyświeca,
Opiekun nieszczęśliwych, przyjaciel oświaty;
Słowem w księdzu Andrzeju — kapłan starej daty!»

Na te słowa ksiądz Andrzej do sali przybywa:
Skromność w układzie, głowa nieszczęściami siwa,
W obliczu się powaga z pokorą jednoczą,
Wszyscy do całowania ręki jego kroczą,
On szczerych błogosławięstw każdemu udziela,
I do postępu w dobrem każdego ośmiela.
A gdy z kolei przyszło przemówić i do mnie,
Takie, z ojców prostotą, słowa wyrzekł skromnie:
«Miło poznać! — ten dobrze ma w sercu i w głowie,
Kto się dziś nie powstydził pisać w chłopków mowie! —
Pan się do szczęścia kmieci nie mało przyłożył,
Żeś w ich mowie zachętę do światła położył.
To Pan Bóg nam wyraźnie udziela dziś cudu,
Że się już zabierają do oświaty ludu!
Chwila! — już się szczęśliwym ujrzy naród kmieci!
A wy największy udział macie w tem poeci!
Tylkoż nam przechowajcie cnoty przodków stare!
Z postępową oświatą zlejcie ojców wiarę!
Lecz wy to dokonacie, gdy na to się wzięło,
Że oświecenia ludu rozpoczęte dzieło!
Uczcie i pocieszajcie, niech runą przesądy!
A na lud się wyleją światła, życia prądy!
A za te twoich pieni ludowych słodycze,
Pozwól niech błogosławieństw moich ci użyczę!
Pozwól niech cię zapiszę trwale w sercu mojem,
I pozwól mi pozostać przyjacielem twoim!»

Gdy tak księdza Andrzeja serce się wylało,
A mnie, powiedzieć prawdę, na łzy się zabrało,
W tem się nowa kompanja pojawiła gości,
W witaniach starych druhów, nowe serdeczności.

Chwila za chwilą całe somsiedztwo tu staje,
Każdy z serca mię wita, ja im serce daję.
I powstała rozmowa tak błoga, serdeczna,
Szczera, prosta, z dzisiejszym zwyczajem tak sprzeczna,
Że takiej nie posłyszysz dziś w żadnym salonie,
Gdzie już serca braterskie przestały bić w łonie.
A wsrzód tych serdeczności, podano do stołu,
W czasie uczty myśl błoga ożywia pospołu,
A uczta hojna, dawne przypomniała czasy;
Płyną, jak strumień z zrzudła, frykasy, bekasy.
Lecz mniejsza o frykasy,— co rzadziej się zdarza,
Wszędzie serce i duszę widzisz gospodarza.

W tem z nienacka pan domu wszystkich o głos prosi,
Zrozumiawszy się z gośćmi, taki toast wznosi;
«Niech żyje! kto ludowi pociechy użycza,
Miło nam wszystkim zdrowie wznieść Marcinkiewicza!»
A gdy kompanja zdrowie me wymawia głośno,
Gdy w mej duszy pieśń czułem wdzięczną i radosną,
Po nalaniu kielichów, takoż o głos proszę,
I, co zwierzchu na sercu, tem mój toast wznoszę:
«Nie ten człek, lub kraj się wsławia,
Co na lodzie zamki stawia,
Co w teorjach w głos się spiera;
Lecz co w dobro ludu wziera!
Kraj ten szczęśliwym bydź musi!
Zdrowie zacnej Białorusi!!»

Gdy gospodarz kielicha nie zostawia w suszy,
Toast drugi wszechmocny wyrwał mi się z duszy;
Wreszcie trzymać myśl w sercu byłoby mi nudno,
A o improwizacyą w tej chwili nie trudno:
«Mili bracia! nam błoga jeszcze gwiazda świeci,
Kiedy ze łzą współczucia podajemy dłonie!
Gdy są opiekunowie poetów i kmieci!
Gdy piękne czyny rodzi duch żyjący w łonie!
Serce woła, gdzie cnota wartą jest ołtarza!
A mojeż serce pełne i myśl nie ponura:

Więc wznoszę czcigodnego zdrowie gospodarza,
I czcigodnego brata wraz zdrowie Artura!» —

Widząc że każdy w ręku kielich z miodkiem pieści,
Zdrowie księdza Andrzeja w tej wyrzekłem treści:
«Myśmy oba swą przeszłość w cierpieniach prześnili,
Obaśmy w bolach wieku sporego dożyli;
Niechaj więc przyjaźń ściślej złączy serca nasze,
Zdrowie księdza Andrzeja! — do dna chylmy czasze!» —

Ledwo kończę me rymy, znowu szumi wino,
I te myśli, te słowa z duszy mi wypłyną:
«Biada, biada dla krainy,
Gdzie ducha nie wznoszą damy!
Lecz gdzie takie, jak tu, syny
Czciż matronom nie oddamy?
I Białoruskie dziewice
Pięknie mają w sercu, w głowie!
Spełniam więc do dna szklanicę,
Za płci pięknej waszej zdrowie!»

Żeby miarki nie przebrać, już człek nad tem duma,
W tym się z nienacka podniósł głos: zdrowie Nauma!
A Naum Pryhoworka przemilczeć nie zdoła,
Więc z kipiącym kielichem w ten sposób zawoła:
«Pić wójta Nauma zdrowie,
Zanadto Panie! — Panowie!
Lecz, wspomniawszy przodków cnoty,
Gdy w sercach ogień zapłonie,
Niech się złączą bratnie dłonie!
I bez żartów,— bez pustoty,
Rzewnie, jak nasi ojcowie,
*Kochajmy się!* — pijmy zdrowie!!»
Na te słowa już wszyscy powstali od stołu,
Jedni drugich serdecznie ściskali pospołu!

* * *

Zaledwo się skończyła biesiada i czasze,
Wtem nadspodziana scena porwie oczy nasze.
Co tylko ludu włościan znalazło się w siele,
Ze starszyzną, ze swoim dozórcą na czele,
Przyszło w dwór, aby poznać swojego lirnika,
Który do dzieł piśmiennych użył ich języka.
Na ich dzięki, oddane prosto, a serdecznie,
Lałem łzy,— i tak chciałbym płakać wiecznie, wiecznie!
A że niektórzy z włościan w Szczerach pismo znają,
By im sprzedać Hapona, Wieczernic, błagają.
Serce boli, żem szczęście rozdać darmo stracił,
Bo za wszystkie Juliusz tylko co zapłacił —
Tłumaczę się w kłopocie,— Dziedzic mię wyręcza,
«U mnie są już te książki — i każdemu wręcza —
Ja nie żądam zapłaty,— hojniem nagrodzony,
Gdy myśl wasza się zwraca w piśmiennictwa strony».

Po tej głębokiej scenie — druga się poczyna.
Włość ogłasza dożynki! — i z wieńcem dziewczyna,
Od gromady nazwana dożynek królowa,
Zagaiwszy w swej mowie — te wyśpiewa słowa:
«Cieszym się łaskawy Panie!
Że już zboże nie na niwie,
Wam,— nam,— na rok cały stanie!
Pożywajcież je szczęśliwie!

Lekko było nam horować,
Sił nam i ochoty stało,
Miłoż Panu powinszować,
Że się z tych ziem chleb zebrało!

Nasza praca — dobro Wasze!
Wasze dobro — życie nasze!
Boga chwalemy na wieki!
Że pełne pańskie zasieki!

Chwila dożynek nam święta!
Twych wsi niewiasty, dziewczęta
Tym mię wieńcem obdarzyły,
W nim nasze dusze i siły!

A mnie Bóg dał szczęścia dożyć,
Wam, Panie! ten wianek złożyć;
Niech w swej łasce Bóg Was chowa!
Życzy dożynek królowa».

Skoro więc dziedzicowi złoży upominek,
Nuż wszyscy goście w taniec z płcią piękną dożynek!
Mnie również tan się dostał z więczoną dziewicą
I posuniemy raźnie w parach *miecielicą!*
Po każdem przetańczeniu w koło wszyscy stajem,
Naum wójt, jak w *Sielance,* śpiewa swym zwyczajem[1].

Przy tańcach uczta włościan ciągnęła się długo,
Mnie już zowią swym bratem, ja zwę się ich sługą;
A w wspólnem zaufaniu, dobrałem się wieści,
Że się w sercu królowej chłopek Domko mieści.
Przyrzekam pośrednictwo u pana dziedzica,
I ręczę że cel życzeń osiągnie dziewica.
A co się wszystko działo w miłosnej osnowie,
To wam dudarz w narzeczu ludowem opowie.

Gdy wszyscy zostajemy w upojeniu takiem,
Wchodzi Pani Sędzina z pięknej płci orszakiem.
Pytam drugich, kto przy niej ta piękna niewiasta?
Prawią — to jest Olesia, Naumie, i basta!
Na jej widok poczułem serce me wzruszone,
I jej oczki pobiegły jakoś w moją stronę.
Koniec końców, znajomość pocznie się nie znacznie,
Dalej — o piśmiennictwie rozmowa się zacznie.
Zagaja z komplementem o mej kmieciej pracy,
Jak dziś wysoko w sztuce stanęli Polacy,

[1] Sielanka,— komedyo-opera mojego utworu, w której grałem niegdyś rolę wójta Nauma Pryhoworki, stąd też i mnie tem mianem tytułują.

Jak wielkich mamy wieszczów, powieściopisarzy,
Że aż dusza o błogiej przyszłości wściąż marzy.
Naprzykład nasz Kraszewski, Sztyrmer, Korzeniowski,
Siemieński, Pol, Rzewuski, Odyniec, Czajkowski,
Oddawna, a tak pięknie władają nam duszą!
Myśl wieszcza! — ich się pióra chyba z życiem skruszą.
Albo ten Syrokomla, nasz piewca domowy!
Prawie co miesiąc daje nam zasiłek nowy —
Jaka tu łatwa mowa, styl wdzięczny i miły,
Nie dziw że się Litwinki tak im upoiły.
By Pol tylko *Mohorta*, Kraszewski *Dwa światy,*
A Syrokomla wydał swego *Demboroga*,
Świat w nas uzna kraj w sztukę i w ducha bogaty,
Że epoka pism naszych dzisiaj nie uboga.

Dopełniając poczętej rozmowy z zapałem,
Z mym się własnym poglądem popisać musiałem:
«Nie mówiąc o autorach *Maryj, Wallenroda,*
Których wielkie imiona wiek, wiekowi poda;
Pomijając autora też *Króla Zamczyska,*
Który, że przestał pisać, aż żal serce ściska;
Minąwszy świeżo zmarłych poetów tak wielu,
Scjentyfików, oświatę mających na celu,
Czyniąc przeskok, dodałem,— i płeć piękna społem,
Dziś w pięknem piśmiennictwie stała się żywiołem.
Prócz Tańskiej i Ziemęckiej, wspomnę grono nowe,
Deotymę, Ilnickę, Krakow, Pruszakowę:
Dążność ich jest szlachetna, jak ich dusza czysta,
Nie raz mędrzec z kierunku ich myśli skorzysta:
I lepsza ich prostota w moralnem zakresie,
Niż owy szumny talent, co czczość wewnątrz niesie.
Pieśni Lenartowicza, również Pługa prace,
Czytając, miło w duszy, aż serce kołace!
Szczęście że tych przewaga musiała się skończyć,
Co, przy ojców prostocie, chcieli fałsz połączyć».

«Wiem o kim Pan to mówisz; gdy nie jestem w błędzie,
Duch pism naszych się zmienił w ogólnym poględzie,

Zmienił się na dodatny — i epoka nowa,
Wiąże przeszłość z przyszłością,— a czyn z treścią słowa.
Zajrzano głębiej w chatek i w salonów kąty,
Przesileniem stał się rok ośmset piędziesiąty.
Piśmiennictwo zjednało nasz wyższy szacunek,
Wyższy poezyj, wiedzy i sztuki kierunek».

«Lecz, zważ pani, lat kilka przed wspomnionym rokiem,
Wielkie głosy się wzmogły w pomyśle głębokim.
A z buntowniczej wiedzy i sztuki chaosu
Upadkiem,— znać przewagę natchnionego głosu.
Czyje tu są największej zasługi imiona,
Rzecz ta, to nie dziś jeszcze będzie wyjaśniona.
Odkrył się w piśmiennictwie plac nowy, rozległy,
Z stron Litwy, z Ukrainy te głosy wybiegły,
I cały pogląd w pismach zmienia się w momencie,
Nowe gwiazdy jaśnieją w piękna firmamencie:
Słynny z wojażów Tryplin,— Wieniarski, Dzierzkowski,
Pilat,— Wolski,— Apollon (drugi) Korzeniowski;
A nad wszystkich ta dusza wzniosła i cudowna,
Której, w poznaniu ducha ojców, mało zrówna,
Ten nasz Zygmunt Kaczkowski, to zjawisko nowe,
Tak się nam wrył głęboko dziś w serce i w głowę,
Że już z jego poglądu, ducha stanowiska,
Widziemy, chwila zbawcza światła, że jest bliska!»

«A autor Pieśni naszych czy dzisiaj co pisze?»
«On wzięty w cztery ognie, biedak ledwo dysze.
Gdy odwróci tych ciosów świata choć połowę,
Rychło objawi dalszych swych myśli osnowę».

* * *

Lecz dosyć się zaciekać w literackie sprawy!
Przecież nie dla nauki prawię, dla zabawy:
Jam nie wielki erudyt — głosząc moje zdania
Możem i bąka strzelił? — Wart ten pobłażania

Kto nieudolność własną wyznaje otwarcie;
Wszak co czułem, tom pisał na tej lichej karcie!

Olesia pełnem życiem jaśniejąc w rozmowie,
Swem ognistem spojrzeniem zmąciła mi w głowie,
Że o pismach, pisarzach zgoła zapomniałem,
I tylko, jak w zwierciadło, w jej oczki patrzałem.

O! — bo też piękną była! — ponętnego lica,
Ocząt jej, piwnej barwy, któremi zachwyca,
Uśmiechu, co podziwiać każe w niej anioła,
Żaden wieszcz, żaden malarz wyrazić nie zdoła!
Nie dziwotaż że patrząc na powabów tyle,
Słuchając rzewnej mowy, słodkom pędził chwile!

Nazajutrz w Chociuchowie też same zabawy,
Tenże uśmiech Olesi uprzejmy, łaskawy,
Taż sama gościnności staropolska cnota,
Przy uczcie do toastów jednaka ochota,
A przy nich dar wdzięczności jednakiż z mej strony,
Takie z natchnionej duszy wywołały tony:
«Gdy staropolska cnota gościnności
Rzadką jest dzisiaj srzód ludzi, niestety!
Tu ją znalazłem w całej rozciągłości,
Tu! — w domie zacnej kobiety!
Miło też będzie wspomnieć lirnikowi,
Jak tu serdecznie kilka chwil przebawił,
Miło mu będzie westchnąć ku domowi,
W którym swe serce zostawił.
Tak chwil uroczych on przez całe życie,
Wdzięczną pamiątkę w duszy swej ustali,
Ależ Wy, Panie! — czy też go wspomnicie,
Kiedy się z stron tych oddali?»

Po moim z Chociuchowa do Szczerów powrocie,
Znów dziwić się musiałem Białoruskiej cnocie:
Książki, co z sobą miałem, rozbiorą z rozkoszą,
Sto exemplarzy płacą,— i o resztę proszą.

Czas do dom wracać,— a tu tak mi lubo, miło!
Cóż za dziw? — gdy współczuciem każde serce biło!
Ściskamy się,— tu dłonie podajemy sobie
I w takiem oświadczamy braterstwo sposobie:
By każdy nie zaniechał na włościan poglądu,
Przy błogiem dozwoleniu Monarchy i Rządu,
Jak można lud oświecać w cnotach Chrześciańskich,
Nie szczędząc na zakłady małych szkół włościańskich.
Czujem wszyscy tych błogich rozrzewnień roskosze!..
Za toast mej podróży — w zamian taki wznoszę:
«Rozstając się dziś z Wami, człek spłakać się musi,
Cześć Wam zacni Rodacy,—Tobie Białorusi!
Łącząc przyjaźnią serca nasze do skonania,
Wnoszę toast ostatni,— toast pożegnania!!.»

## Epilog

Dank Wam Białorusini w sercu się pomnaża,
Żeście do serc tulili pieśni i dudarza.
Za te Wasze gościnne, serdeczne przyjęcie,
Powziętych dla Was uczuć dochowam Wam święcie!
Nawet ich dochowają me wnuki, prawnuki,
Z Waszych czynów dla siebie szukając nauki!
A za sprawione przez Was duszy mej roskosze,
*DOŻYNKI* Wam *SZCZER0WSK1E* w ofierze przynoszę.

*Mińsk, Grudnia 10 d. 1856 roku*

## ДА УЛАДЗІСЛАВА СЫРАКОМЛІ

От жа ветлівае сонца
Разагнала утрапенне.
Бліснула ў маё аконца
Светлай радасцю праменняў.

Зорка, што вяла паэта
Ў цемры па сялянскім полі,
Засвяціла, як прыкмета
Паляпшэння маёй долі.

Мову сэрца майго ўчула
Беларусь, о край гасцінны,
І да сэрца прыгарнула
Дудара, як свайго сына.

Так, дарагі Уладзіславе! — пачцівая Беларусь, адгадаўшы мэту, да якой з такой цяжкасцю, а разам і з такой няўдачай асмеліўся імкнуцца, працягнула мне руку дапамогі і такім чынам заахвоціла, каб на сваёй няўдзячнай ніве працаваць не спыняўся. Больш, чым я заслугоўваю, адзначыла беднага песняра, які з яе народнай мовай выступіў на ніве краёвай літаратуры.

Добры ж люд на гэтай Беларусі! З гарачым у сэрцы замілаваннем захоўвае ён даўнейшыя свае простыя звычаі, даўнюю цнатлівасць продкаў сваіх!

Там амаль кожны гаспадар з ахвотаю і энтузіязмам паўтарае перад грамадою сваіх сялян усё, што толькі на іх мове надрукавана, паколькі ён гэтых сялян дзецьмі сваімі называе.

Міла назіраць, як прыгожая, з арыстакратычным выхаваннем, таленавітая дзяўчына, як багатая цнотамі гаспадыня вясковага панскага двара, сабраўшы ў святочны дзень дваровую чэлядзь і сялянак, якія прыйшлі на нараду або з якой просьбай да пані, чытае перад усцешанымі ўрыўкі з *«Гапона»*, *«Вечарніц»* або з *«Купалы»*, а пачцівыя сялянкі слухаюць сцэны, з якімі штодзённа не раз сустракаюцца ў сваім жыцці; удзячныя сваім чытальніцам, вяртаюцца яны ўзрушаныя дамоў, у сямейных колах апавядаючы, як паны апісваюць іх звычаі і ахвотна цікавяцца іх доляй.

Таму селянін наш, набываючы да паноў нейкую сімпатыю, мацней з імі звязваецца і паволі выцясняе з свайго сэрца ўкаранёны з дзяцінства супраць тых жа паноў погляд, таму селянін, бачачы на сваёй зразумелай мове кніжку, у якой апісваюцца звычаі і абрады, перададзеныя яму па традыцыі ад продкаў, рад бы такую прачытаць, сам набірае ахвоты вучыцца або заахвочвае сваіх дзяцей.

У гэтым я пераканаўся на ўласныя вочы, якія заплылі слязою радасці і ўзрушэння, калі ў маёнтку Шчаўраве ахвотна прыглядаўся, як паважаныя паны Юлі і Артур Р..... на дажынках, сабраўшы вакол сябе грамаду люду, чыталі ім урыўкі з *«Гапона»*, *«Купалы»* і *«Вечарніц»*, а люд гэты з узрушэннем успрымаў малюнкі, нібы выхапленыя з яго штодзённага жыцця, са слязьмі ў вачах цалаваў рукі чытальнікаў.

Нічога б не жадаў, каб гэтай уразлівай сцэны стаў сведкам паважаны пан Скібіцкі, які пад псеўданімам «Y» ў *«Газеце Варшаўскай»* папракаў мяне, што пішу на мове беларускага люду. О! Сам ён, несумненна, прызнаў бы несправядлівай сваю рэцэнзію.

Прабач мне, Уладзіславе, калі аб гэтым, не абыякавым для нас, прадмеце так багата разважаю! Цікава, напэўна, табе даведацца, якія багі загналі мяне ў Магілёўшчыну? Вось паслухай!

На выбары, якія тут, у Менску, былі вельмі шумнымі, таму што славутыя артысты Апалінары Концкі, Станіслаў Манюшка, наш геніяльны спявак, і Адам Герман, таленавіты віяланчэліст, сваім з'яўленнем на менскім гарызонце дадалі некаторым чынам бляску гэтаму выбарчаму з'езду,— прыбылі таксама два беларусы, паны Юлі і Артур Р....., жыхары Магілёўскай і Віцебскай губерняў, якія, з гонарам мушу прызнацца, ведаючы мяне з друку толькі на іх роднай мове, асабіста стараліся пазнаёміцца са мною. Адсюль узнікла паміж намі шчырая дружба, адсюль я абяцаў ім быць 19 кастрычніка ў Шчаўраве, маёнтку паважанага Юлія, каб апісаць дажынкі, якія добры гаспадар запазніў да майго прыезду.

Аб тым, як гасціў, і аб маім поспеху дастаткова пераканаешся з апавядання *«Літаратарскія клопаты»*, з часткі I *«Паэт у клопатах»*, якая прысвечана твайму імені; няхай цябе не дзівіць супярэчлівасць таго, што ў ёй паказана, і цяжкі лёс маіх прац. Тая частка праўдзіва паказвае здарэнні і выпадкі, якія перад

падарожжам на Беларусь ляжалі цяжарам на сэрцы аўтара беларускіх спеваў. Трэцяя частка ўяўляе сабою супярэчлівы вобраз літаратурнага поспеху, як мага найпраўдзіва, але няўмела намаляваны, з якога яскрава бачна, чым з'яўляецца для паэта і літаратурных поспехаў разуменне аднаго чалавека ці некалькіх знакамітых людзей, якія вызначаюцца шляхетнасцю душы.

Усё гэта выліўшы з душы перад паэтам і прыяцелем, які зразумеў маю працу, вітаю і абнімаю цябе сардэчна, дарагі Уладзіславе, і падпісваюся тваім самым шчырым паклоннікам і слугою.

*В. М.*

# ЛІТАРАТАРСКІЯ КЛОПАТЫ

*Апавяданне ў 3-х частках*

## ДА УЛАДЗІСЛАВА СЫРАКОМЛІ

### Частка I

### Паэт у клопатах

Ой, кепскія ў нас справы, Ўладзіславе!
Ўслужыць нялёгка справядлівай славе!
Ссылае Бог на голаў мне дакукі.
Вястуне наш! — калі йшчэ служаць рукі,
Пакінь пяро! Спыні аб праўдзе словы,—
Насі ваду або ідзі сеч дровы.

Яшчэ табе, Вястун, так-сяк вядзецца,
Бо да выбраннікаў належыш кола,

І муза да цябе мілей смяецца,
А песні слаўныя твае наўкола
Ахвотна слухаюць усе, нямала
Купляюць, каб не трапіць між адсталых.

Аднак не вер, што модныя салоны
З ахвотаю твае хапаюць творы,
Для іх мілейшыя чужыны плёны,
Рамансы франкаў — вось чытання ўзоры.
А ліра свойская ўзбуджае смехі —
Яна для чэрні, пад гнілыя стрэхі!

Калі ж і ўбачыш мо дзе ў свеце модным
Ці *«Хатку ў лесе»,* ці то *«Дэмбарога»,*
Яны не рушаны, клянуся Богам!
Лісты нат не разрэзаны ў ніводным.
На прасцячкоў тут пастка: хай не баюць,
Што песняроў сваіх паны не знаюць.

А што ж дае мая скупая ніва,
Быллём паросшая? Шмат трэба працы,
Пакуль уробіш! Дык хачу прызнацца,
Што трачу дух. Я гэтак клапатліва
Шмат месяцаў тварыў, і ўвесь здабытак,—
Што многа слоў пустых пачуў і крытык.
Здароўя шмат забрала гэта праца!
Якім паддаўся прыніжэнням, мукам,
Пакуль яе ўдалося выдаць друкам,
Табе, Вястун, хачу цяпер прызнацца.

Вось рукапіс напісаны старанна,
Плод буйнай думкі — скарб мой укаханы!
Яго здаць трэба на людскі пажытак —
Бягу я ў ведаў, мудрасці прыбытак,
Дзе, як багач над скарбамі, заўсёды
Сядзіць у крэсле Бейлін той рыжабароды[1].

[1] Бейлін — менскі гандляр. Яго кнігарня была найлепшай.

«Як маешся, пан Бейлін?» —
«Прывітанне пану!
Мо трэба што купіць? Навін дастану.
Вось тут «Граф на Ванторах», *gute fain* праўдзівы!
Яго мне рваў аж з глоткі Рубен хцівы...»

«Стой, Бейлін! Памыляешся, мой пане,
Сягоння я прыйшоў не для купляння,
А скарбу ўласнага хачу пазбыцца.
Вось рукапіс,— прашу не паскупіцца,
Дык за рублёў паўсотні можам старгавацца».

«Ой вэй!.. Я нават за яго не дам і дваццаць!
Не важыць фунта ён, якой жа варт ён платы?
Фэ! З крыўдай кнігароў пан хочаш стаць багатым.
Яшчэ каб пан быў модны, як той Сыракомля,
Каб славіўся пісаннем з Вільні аж да Гомля...
А вас ніхто не знае, хіба што сяляне.
Нашто вы па-мужыцку пішаце, мой пане?
Як хочаш пан, дык без далейшае фатыгі
Дзесятку дам, і то — на гэту суму кнігі».

Я цяжка уздыхнуў, слязой зрасіўшы вочы
І звесіўшы свой нос, дамоў цішком пакрочыў.
Шукаю розных спосабаў, але дарма ўсё,
А ўрэшце на адным намеры затрымаўся:
Вось знатнага магната думкай прыкмячаю
І працу тую ўраз яму я прысвячаю.

Ура! мая ўзяла! за сорак кніг нарэшце
Далі задатак мне, ўжо маю злотых дзвесце,
Дык ёсць з чаго пачаць; вось лёсу перамена,
І прэс у хуткім руху, але зноўку дрэнна.
Друкар крычыць настырны: «Пане, грошай мала!
Хоць часткамі плаці мне, каб не перастала
Друкарня працаваць, іначай быць не можа!»
А тут — ні пфеніга. Вось кара, мой ты Божа!
Аж галава трашчыць. Гол, як ні павярніся,—

Падумаў я ў бядзе і, падкасаўшы крыссе,
Падаўся к ліхвярам; перш шлях быў недалёкі,
Да Яся-багацея скіраваў я крокі.

Што за салон багаты, што там за пакоі!
Прадметы, бы нядбайнай кінуты рукою...
Знай пана па халявах! — кажа прыгаворка.
Мяне аж памуціла, стала ў вуснах горка!
«Вось тут,— падумаў я,— адмовы быць не можа,
Мне сябра гэты мой напэўна дапаможа».
«Як маешся, пан Ян?» —
«Здароў! А пан Вінцэнты?
Чамусьці кіслы сёння; ой, ці не дашчэнту
Сыграўся ў карты? Ці якая, можа, Хлоя
Замкнула сэрцайка сваё перад табою?»

«Пакінь, прашу цябе я, пане Яне, жарты!
Мяне займаюць не каханне і не карты,
Вось паратуй ты лепш мяне ў цяжкой патрэбе,
А за твой добры ўчынак на зямлі і ў небе
Табе удзячным буду — дай мне злотых дзвесце,
Каб друкару ўплаціць. Ён у мяне нарэшце
Ўвесь розум адбярэ, бяда мне з друкарамі!»

«Паслухай, дружа мой, гаворачы між намі,
Каб ссуду даць табе, няма ў мяне падставы,
Бо пад якія іпатэкі ці заставы
Павінен я ўслужыць? Вось залатыя рэчы
Ці серабро прыму ахвотна, чалавеча,
І невялікія вазьму з цябе працэнты —
Ад сотні толькі трыццаць».—
«О святы Вінцэнты!
Дык ласку ж гэткую знайду я і ў яўрэя!
Хай счэзне дружба гэтакая, здзервянее!» —
Сказаў яму я ў гневе, пляснуўшы дзвярамі,
І рушыў з іншымі сустрэцца ліхвярамі.
Але напэўна не дабіўся б я нічога,
Каб не прыйшла мне ад Міхала дапамога.

Дастаў я грошы, кніжка вось ужо гатова,
Пусціць яе ў ход трэба, ды бяда — нанова!
Прашу тады зноў Бейліна таго грубога,
Каб на камісію прыняў, а ён мне строга
Гаворыць, папракае, што яму спачатку
Не адпусціў сваё тварэнне за дзесятку.
Нарэшце, як закончыў тое нараканне
І, ўбачыўшы, што я ў такім крытычным стане,
Змякчэў і ў гэткія ка мне звярнуўся словы:
«Я памагчы пісьменнікам заўжды гатовы
І вось, як доказ, што я не пусты прамоўца,
За кожны экземпляр дам вам па залатоўцы».

Вось як мяне пацешыў Бейлінак каханы.
Я ўцёк адтуль і новыя тварыць стаў планы.
Дамовіўся я з Рыппам[1],— носіць ён пахнілы,
Памады, пудры загранічныя і мыла,—
Каб ён узяў з сабой і між сваіх тавараў
Насіў і некалькі той кніжкі экземпляраў,
Мо пані, што на глупствы многа грошай трацяць,
Купляючы духі, за кніжачку заплацяць.

Ідзе той італьянец шастаючым крокам,
Шліфуе брук па месце й сакаліным вокам
Па вокнах сочыць, то каго зачэпіць,
Таму памады, а другому мыла ўлепіць,
То збыць адэкалон праявіць дзе фатыгу
І ўсім, як толькі можа, прапануе кнігу.
Настроіўшы нарэшце адпаведна міны,
Кіруецца ў салон праслаўленай Цаліны.

Там модныя паненкі, панічы і пані
У самым наймаднейшым, дарагім убранні;
Французскі звычай там, французская і мова,
Свайго радзімага там не пачуеш слова.

---

[1] Рыппа — італьянец. Некалькі год разносіць па горадзе ў сваім кораб галантарэйныя тавары.

Раскошы тыя ўбачыўшы, пачуўшы мовы тоны,
Падумаеш: Парыж тут адчыніў салоны.

Заўважыўшы прыход латочніка са скрынкай,
Ураз спынілі дочкі Евы вечарынку.
А хітры італьянец, модніцам надзіва,
Свае флаконы, пляшачкі вымае жыва.
Вось, кажа, гэта лек найлепшы ад вяснушак,
А гэта адсвяжае колер шчочак, вушак,
Памадка вось, а вось парыжскае бяліла,
А ў гэтай скрыначцы какосавае мыла,
Дзён колькі як з Парыжа — ўсё з дастаўкі новай.
І, каб лепш верылі яму, французскай мовай
Тавар свой хваліць і кішэні набівае,
Бо кожная з паненак штосьці набывае.

І вось прыпамінае хітры італьянец,
Што кніжак некалькі маіх паклаў у ранец,
Наверх іх дабывае, выхваляе, вабіць
З надзеяй, што спакусіцца ўсё ж нехта, мабыць.

А пані гаспадыня, з тых пакупак рада,
Каб не фатыгавацца, просьбаю-загадам:
«*Ma chére amie,*— сказала,— хай там хто з вас гляне,
Дзюма там ці Бальзак? якое там выданне?»
Тут тонкім галасочкам Франя адказала:
«*Non maman!* мужыцкі твор, якісь «*Купала*».
«*Ah mon Dieu!* Як можна мову так паскудзіць!
Кінь гэтыя грымзолы, каб рук не пабрудзіць!
Не сорам вам хваліць плюгаўства, мілы пане?
Хіба для фурманоў такое вось чытанне!»

«Мужык, фурман, таксама людзі, як вядома»,—
Прамовіў Рыппа і з арыстакратаў дома
Падаўся прэч; кляцьбою злосць сваю салодзіць
І па дарозе к пану Феліксу заходзіць.

Фю!.. Колькі тут юнцоў! А кожны з іх — руіна!
Ад кожнага дым бухае, нібы з каміна,

За дымам не відаць прадметаў нават зблізку,
Ад свечак, што гараць, ледзь бачны толькі ўзблiскі.
Усе, як тую крэпасць, стол штурмуюць зграяй;
«На сем куш!» — той крычыць, той: «Ляпка!» — паўтарае.
І, як Плутон на троне, больш за іншых варты,
З паважнай мінаю шліфуе Фелікс карты.
Ён пан тут самаўладны на зялёным полі —
Не трэба й брытвы, без яе ўсіх чыста голіць.

Тут, думаў італьянец, торг на кнігі будзе,
Да ведаў моладзь хцівая, дык іх набудзе!
Пустыя мары! Крык узняўся згодным чынам:
«Мы дзень і ноч не спім, патрэбен жа спачын нам!
Чытаць абы лухту хвілін у нас не стане.
Бач, мы занятыя,— каціся на зламанне!..»

Дарма ўся праца! Вось ён, выйгрыш выдавецкі!
Затраціўшы ўсе грошы, як святы турэцкі,
З пустою кішанёй і ашуканы лёсам,
Стаць трэ мне лесарубам або ваданосам.

Сягоння, з мар разбуджаны, спачыць хачу я,
Уздыхі кідаю, якіх ніхто не чуе,
Або сяджу з Рустэйкам, песняром натхнёным,
Які нам праўду аб'яўляў праўдзівым тонам,
Якога «Песні нашы» служаць выхаванню,
Патокі новага жыцця у душах родзяць,
А ў крытыцы зусім не маюць спачування
І, як прыйшлі на свет у болях, так адходзяць,
Дык вось з Рустэйкам чэсным ля стала малога
Увесь свет кніг і дум, бывала, з ім прасочым,
Аб прозе і паэзіі гаворым многа,—
Вось так цяжар жыцця менш сэрцы нам марочыў.

Не раз казаў Адам: «Тваіх тварэнняў мова,
Вінцэнты мой, шчасліўшай вінна быць на свеце.
Шырокае славянскае гаворкі слова
У брацціяў не сапсутых маю на прыкмеце!

І вольным будзеш ты ад канкурэнтаў, знаю,
Цябе не рушыць партачоў зайздросных зграя.
Шчаслівы! Багацеі датрымаюць слова,
Узяўшы на свой гонар кошты кніжкі друку,
Мо ты іх не абразіш той мужыцкай мовай
І так не апынешся з кніжкаю на бруку».

Аднак з надзеяй той прыйшлося размінуцца,
І вось сягоння на адной з ім граем дудцы.
Не знаем, што пачаць, і, што рабіць, не знаем,
Ці рукапіс аддаць за тых рублёў дзесятку,
Хоць за перапісанне дваццаць выкладаем,
Ці знішчыць кнігі ўсе адразу для парадку,
Ці мо прадаць выданне ўсё за залатоўкі?
Нічога мудрага не йдзе нам у галоўкі.
Ты, Ўладзіславе, дай параду дарагую,
Бо думак і праектаў маеш ты нямала,
Якой пайсці дарогай? Ці ўкажы другую,
Каб аўтара галодная смерць не забрала.

## Частка II

## Падарожжа на Беларусь

О муза! Ты, якая ўвенчыла скронь Бакі
Вянком лаўровым вечным, мне пазыч кульбакі,
Каб я дасцігнуць мог Парнаскае сялібы
На тым тваім кані, варочаючы скібы
Маёй сялянскай нівы, каб у тым палёце
Дарогаю ў Алімп не ўвяз я дзе на плоце!

Вы, цені шчырых продкаў! Я да вас малюся:
Пазычце творчых дум, каб я ўсё ж прыгарнуўся
З трыумфам да мужоў, якім былі вы ўзорам!
Паэты! каб мне з чэсцю выйсці, дайце пёры
Пашану тую ўславіць, што мяне спаткала

У краі беларускім, ўслаўленым нямала,
У краі, што старыя звычаі хавае,
Які з вякоў гасцінна кожнага прымае.

А ты, мой пане крытык, будзь мне паблажлівым
І чамярыцы не задай пяром крыклівым,
Калі прысуд свой вынесеш пісанням гэтым
У страшным для пісак артыкуле газетным.
Скажы, пісаць хоць кепска, ёсць злачынства, можа,
Калі інакш хто-небудзь працаваць не можа?
Ці ж лепш праводзіць час пры шклянцы ці більярдзе
Або шукаць уцехі ў картачным азарце?
І ў творах нават слабых, калі хто чытае,
Напэўна сэнс маральны нейкі адкрывае.
Дык вось, як маеш час, калі настрой вясёлы,
Узбройся у цярплівасць, прачытай грымзолы,
Ў якіх, калі сэнс слабы, верш цяжкі, дубовы,
Прынамсі, на бяссонне знойдзеш лек гатовы.

* * *

Даўно, у часы маладосці,
Калі я ў марах час праводзіў,
У сельскім краі прыгажосці
Ніяк чамусьці не знаходзіў,
І думка гэткая блукала,
І разважаў я так, бывала:

Паэты пашалелі! ну скажыце ўсе мне,
У чым яны знаходзяць у сяле прыемнасць,
Што пішуць фаліянты ажно да зануды?
Ну гляньце на дзядзінец — смецце там і бруды!
А дзень той вераснёвы, быццам бы чароўны,
А гоман, спеў прыроды міл мо, безумоўна?

Вось прыклад: гусь гагоча,
А індык балбоча,

Кудахчуць куры,
Равуць бычкі-раздуры,
І парасяты,
І цяляты,
Валы, каровы
То жалліва,
То шчасліва
Усклікаюць —
Бляюць, рыкаюць,
Дураць галовы!

Калі твае ў час гэты вушы
Занудзіць гоман той і зглушыць,
Тады свайго не спыніш кроку
І накіруешся ў бок току.

Машына там стракоча,
Млынок гудзе, фуркоча,
І веялка клякоча,
А цэп аб сноп лапоча,
І хмара пылу ўецца,
У нос, у вушы прэцца,
Дзярэ, грызе ў гартані,
Каўнер і плечы ўкрые,
Грызе, пячэцца ў шыю,
А тут твае сяляне
Клянуць цябе пад носам
І пазіраюць скоса,
Што ты з цяжкой іх працы
Век хочаш нажывацца.

Каб гэтакіх прыемнасцей пазбыцца,
Ідзеш на ніву трохі асвяжыцца.

Там у брыльянтавым тумане,
Пабіты градам, колас вяне;
Там лебяда, лапух, куколі,
Чартапалох вакол на полі,

Які абселі меданосы —
Чмялі ці шэршані ды восы.

Якія ж кволыя ў ідыліях, нядужы
Фіялкі, васількі, лілеі або ружы,
Якіх у сёлах нашых не шкадуюць,
Перад абліччам кветак, што ў палях бытуюць.

Дзядоўнік, як пан ясны, хоць здалёк смяецца,
Бяскрыўдна ў рукі ўзяць ці нюхаць не даецца.
Не ружа гэта, што бароніцца як быццам,
Калі свавольнік хоча за яе ўхапіцца.
Ён — вожык-куст не дасца, каб яго хто кратаў,
Стаіць, як пышны граф сярод арыстакратаў,
Між гурту кветак; рушыш — можаш укалоцца,
Панюхаеш яго, дык заскрабе у глотцы.

А каб жа на прагулцы між снапоў і сена,
Калі ўжо зросішся па самае калена,
Чароўная пастушка за ўсе тыя мукі
Ўсміхнулася табе ці сціснула за рукі!

А то і дафны там — зусім не краскі,
Кудлатыя, як тыя німфы з казкі.
Залётнікі ж іх — проста недарэкі,
Замест зайграць матыўчык нейкі
На флейце, як былі б павінны,
І за выбранніцамі жвава гнацца,
Іх сэрцы разварушыць пастарацца,
Яны гудуць у дудачкі з трысціны,
Якіясьці выводзяць казлатоны.

А тут сарокі, вераб'і, вароны,
Як хмара, гуртам шматгаловым
Уюцца, б'юцца ўкол і гарлапаняць.
Вось песня сельская табе на памяць!
Дык хай жыве дзень гэты вераснёвы!

Так думаў я калісьці, ды, мой мілы Божа,
Як думка ў чалавека адмяніцца можа!

Мяне ўжо горад дражніць, там цяпер мне душна
Ад пыхі, зайздрасці, прымусу, крывадушша.
Сягоння вёскі мне ўжо трэба ў кожным часе,
Яна мне ў памяці збалелай засталася.
Сумую я цяпер па хатцы той у лесе,
Па спеве птушак, па журчанні ручаіны,
Па сцежцы, што вяла праз саду зеляніны.
Там я ішоў бы побач з мілаю Алесяй
І пры канцы спыняўся б урачыста,
Шукаў бы купіны імшыстай
І там яе садзіў бы ў цені,
І, стаўшы поруч на калені,
Так чула да яе б звяртаўся,
Маліўся б да яе і кляўся,
Што мусіла б усхваляваццa
І ў сваім каханні мне прызнацца!
Крычыце ж, маралісты, што стары шалее,
А я вам паўтараю: сэрца не старэе!
Не дзіва, што мацней мне сэрца біцца стала,
Не дзіва, што ў душу вясёласць завітала,
Калі перада мной цуг коней апынуўся —
Чацвёрка з фурманом на козлах, беларусам,
Са Шчаўраў пасланцом. Мой Юліюш каханы,
Упэўнены, што буду верны словам даным,
Падводу шле, каб я ў гасцінным асяроддзі
Спачыў ад гарадскіх турботаў на свабодзе.

Фурман з патрэбы, Яцак — чэсны старычына!
З пакорлівым паклонам робіць напамін мне,
Каб гарадскія завідна мінуць вароты.
А тут няўпраўка ўсё! Мясцовая галота
Так час мне змарнавала, што ўжо ў самы вечар
Прыйшлося ў падарожжа запакоўваць рэчы.
Ды зборы літарата цягнуцца хвілінку,
Вось сорак экземпляраў я пакую ў скрынку:
*«Цікаўны? — Прачытай!»*, *«Гапон»* і *«Вечарніцы»*,
Падношаны касцюм і... нечым больш хваліцца.

Вось я гатоў, і ўжо дванаццаць
Гадзіннік сценны выбівае,
«Ды як жа з места выбірацца?
А хай жа Бог нас пакарае!»
Бурчыць пан Яцак. Ён баіцца,
Малітвы шэпча, стаў хрысціцца
І пачынае намаўлянне,
Каб выязджаць каля світання.
Я ж цвёрды, быццам літарат,
Які праславіцца і ў людзе
Сабе паклоннікаў здабудзе.
І вось пан Яцак, хоць не рад,
Ды пугаўём знак крыжа значыць,
Збірае лейцы, што з рук скачуць.
І рушыць з месца, скрыўшы скруху
І кленучы паноў у духу.
Пан Яцак той, прашу паслухаць,
Быў розных лёсаў чалавекам,
Не дасць сабе у кашу дзьмухаць,
Хоць выглядае недарэкам.

«Но, конікі! *бадай вас,* вось бяда якая!
Нас баба з вёдрамі пустымі сустракае,
*Бадай вас,* вось паскуда, ды парой такою!
Нячыстая тут справа, нельга ждаць спакою,
З вядром парожнім баба — варажба благая;
*Паночку,* вернемся, нас Бог прасцерагае!»
Хачу сказаць табе, чытач, што ў час размовы
Старэча паўтараў адны і тыя ж словы,
*«Бадай вас»* і *«паночку»* ў кожны сказ укручваў
І прыказкамі тымі так усім дакучыў,
Што тым, якія слухалі яго гаворкі,
У горле косцю сталі тыя прыгаворкі.

Ды вернемся к дарозе: я трымаўся строга,
Увагі не звяртаў на ляманты старога,
І вось чацвёрка наша хутка бегчы стала
І ў Смалявічы на папас нас даімчала.

Што праўда, дробныя здараліся выпадкі
Праз бабскія урокі ці праз шлях нягладкі:
У Яцка шапка раз зляцела выпадкова,
І конь адзін згубіў аж дзве свае падковы,
То пугу выпусціў фурман, то лейцы ўпалі,
Бо рукі іх актаву цэлую трымалі.
Не знаў пан Яцак лейцаў зладжаных крыжовых
Магнацкай вупражы і вынаходак новых.
Конь кожны у яго мець вінен дзве ляйчынкі.
Ён так, як арганіст, калі пяе гадзінкі
І клавішы кранае пальцамі крывымі,
Увесь час калупаўся з лейцамі сваімі
І часта іх губляў, кляў бабскія урокі
І ціха ў адрас мой бурчаў свае папрокі.
Ды я, як лібертын, не верачы нічому,
То згубленыя лейцы падаваў старому,
То пацяшаў яго у скрусе й хваляванні,
То радзіў, каб змірыўся ён з наканаваннем.

За Жодзінам пясок пагоршыў нам дарогу,
І стомленыя коні йшлі нага за ногу.
Драмаў на козлах Яцак,— нудна мне ў калясцы,
Дык гутарку пачаў з ім,— можа, як удасца
Настрой яго паправіць, дык аб парантэлі
Пачаў пытаць, аб продках па мячы, кудзелі.

Відаць, крануў я жылку слабую старога,
Ён ветліва ўсміхнуўся, памаўчаў нямнога
І аб сваім пачаў расказваць радаводзе,
Як род служыў Рэчпаспалітай праз стагоддзі.

«*Бадай вас,* вось, *паночку,* Мурза Туганоўскі,
Гірэй Мустафа, званы потым Бараноўскім,
Быў нашым продкам; хоць татарын з роду,
Ды княжае крыві, *бадай вас*, праз нязгоду
З галоўным ханам родны край свой ён пакінуў
І на Літве, *бадай вас,* стрэты быў гасцінна.

Кароль, *бадай вас,* Трэці Ян цаніў адвагу
І тым, хто славу здабываў айчыны сцягу,
Даваў узнагароды, і яму ў тым часе
Каля Бярэзіны маёмасць дасталася,
І быў назначан ён Барысава старостам.
А сын яго Махмуд, прыгожы, статны ростам,
Каханнем узгарэўся да Слізнёўны Ганны,
Памешчыка дачкі, прыгожай, стройнай панны.
*Бадай вас,* хоць здабыў ён сэрца той дзяўчыны,
Ды ёй мілейшаю была хвала айчыны,
І вось як пра жаніцьбу ён павёў размову,
Яна паставіла яму малую ўмову,
Каб ён адрокся ад сваёй паганскай веры,
Адвагай у баі даў доказ, што намеры
Яго праўдзівыя, што варт яе кахання,
Пасля чаго яна ягонай жонкай стане.

І так было. Яго ў касцёле ахрысцілі,
Назвалі Ўладзіславам, і ад гэтай хвілі
Ён стаў барацьбітом за славу, чэсць народа,
*Бадай вас,* вабнай бо была ж узнагарода!
На полі бою ротмістрам ён быў названы
І ля прыгожай жонкі стаў залечваць раны.

Як Аўгуст Трэці панаваў у краі нашым,
Калі быў рай тут для п'янчуг і звадыяшаў,
Тады наш дзед, *паночку,* Юзаф Бараноўскі,
Прыціснуты судамі, распрадаўшы вёскі,
У шчаўраўскіх паноў арэнду ўзяць быў змушан,
Зямлю стаў сам араць, зашыўся ў дзікіх глушах,
Ліў пот, сярмягай простаю прыкрыўшы плечы,
*Бадай вас,* і сыноў пакінуў у галечы!»

«Але ж,— сказаў я, каб пацешыць Яцка,—
Шляхетны радавод таксама ў нас не цацка!» —
«Э... гербы ўсе, *паночку,* хай бяруць іх д'яблы,
Яны без грошай, быццам ножны ды без шаблі.
Вось мы, *бадай вас,* што ў нястачы пражывалі,

*Паночку,* ў аднадворцы, як у дым, папалі».
І тут стары слязу рукою скінуў з вока
І крыкнуў коням: «Но! папаска недалёка!»

Вось і Барысаў, горад колісь слаўны, людны,
З-за валаў-насыпаў глядзеў на нас аблудна.
Літоўскі Вітаўт гэтаю хадзіў дарогай,
Тут з арміяй сваёю Жыгімонт спаткаўся,
Тут доблесны Баторы з ворагам змагаўся,
Тут кесар франкаў страціў войска вельмі многа.
Было тут шмат падзей геройскіх і крывавых!
Зірні, які цяпер той гарадок каравы.
Вітай, Барысаў, места, поўнае балота,
З хацін тваіх крывых глядзіць на нас галота
Герояў-галышоў рассеянае Юды,
Какетліва твае нас запрашаюць бруды,
Калыска даўняй славы! Тут з карчмы адкрытай,
З раскрытай брамы ці з-за шыбы паўразбітай
Глядзіць на нас Барысаў сумна, адмыслова,
Даўно абмеркавана тут усё талкова,
Як збавіць падарожных вечарам ці ранкам,
Гнілою рыбай накарміць ды абаранкам,
Падсунуць селяніну штоф гарэлкі, піва,
А ўсіх рукою прагнай драць нелітасціва!

Папас, вячэра тут для нас і нашых коней.
Падхмелены пан Яцак чацвярык лепш гоніць,
А той, пачуўшы блізкасць дому, шпарыць жвава
І, Лошыцу мінуўшы, павярнуў направа
Ды, мілю добрую прабегшы ў тым настроі,
Спыніўся адпачыць каля карчмы старое.

І тут старога чаркаю не абмінулі.
Пасля таго як коні добра аддыхнулі,
Мы рушылі далей; за вёсачкай убогай
Прадоўжылі свой шлях прасёлачнай дарогай.
А час быў той не ранні — хутка і дванаццаць.
Аж — на табе! Да рова сталі прыбліжацца,

А тут, як прывід, перайшоў яўрэй дарогу.
Пан Яцак здрыгануўся і адчуў трывогу.
І хоць тры разы плюнуў і перахрысціўся,
Аднак жа дрэнных прадчуванняў не пазбыўся.

*«Бадай вас,* мой *паночку,* стрэць у падарожжы
Яўрэя ноччу, заўсягды бяду варожыць,
Відаць, што Бог сягоння нам рыхтуе мукі»,—
Сказаў стары, і лейчыну пусцілі рукі
Пад ногі коням, перашкодзіўшы іх бегу.
Кляне пан Яцак, я не рад шукаць начлегу
У лесе, з брычкі злажу, лейчыну шукаю
І Мурзе Туганоўскаму ў руку ўтыкаю.

Зноў едзем добрай рыссю, ды вось раптам коні
Ў кусты павалаклі нас па якімсь адхоне.
«Пабойся Бога, Мурза! — я крычу, струхлелы.—
Вярні налева, покуль маеш карак цэлы!» —
*«Бадай вас,* мой *паночку,* той яўрэй прычына!
Знайдзі ты мне, *паночку,* пад канём ляйчыну,
Дарогу ўраз знайду, *бадай вас,* вось паскуда!
Тут насланнё на нас, не дзенемся нікуды!»

Так Яцак лямантуе, і мы едзем далей,
Аж вось ізноў здарэнне — як абухам, валіць
Мне хтосьці па плячах, дык вельмі страшна стала.
Тым часам не спынялася напасць-навала,
Дык я у страху думаў: б'юць мяне бандыты.
«Хутчэй,— крычу я Мурзе,— конікаў гані ты!»
Ды дзе там! чым хутчэй чацвёрка стане бегчы,
Дык тым часцей той хтосьці б'е мяне у плечы.

Тады з'явілася мне думка пералётна:
Што маю пры сабе, усё аддам ахвотна,
Да сэрцаў іхніх я прамоўлю словам чулым
І сакрушу іх паасобку і агулам,
Спыняю Яцка, добрых слоў шукаю ў мове
І вершам гавару на гэтакай аснове:

«Вяльможныя паны бандыты, люд вялікі,
Злітуйцеся, не будзьце, як народ той дзікі,
Што, блізкага схапіўшы ў кіпцюры, рве здуру
З яго, нягледзячы, хто ён, жывую з цела скуру.
Вы ж хрышчаны народ, ды знайце тое, людзі,
Што мала вам карысці ад забойства будзе,
Бо што у вершапісца ёсць ці літарата?
Калі ў другіх у кашальках рублёў багата,
То гэтыя, працуючы адно для славы,
Літаратурныя ў кішэнях носяць справы
Ды оды нудныя ці чулых вершаў кучы,
Пра золата ў Парнасе думка іх не мучыць.
Я муз паклоннік, а служу я Мельпамене,
Пагэтаму пустыя у мяне кішэні!
Вось лепей расставаймася у добрай згодзе,
А я, з удзячнасці да вас, у гучнай одзе
Праслаўлю ўсе велікадушныя пачыны
Гаспадароў лясной цудоўнае краіны!»

Закончыў я й — вось дзіва! Сціхла лупцаванне.
Я думаў — гэта вынікі майго старання,
Назад аглядваюся: дзе ж яны, бандыты?
Няма жывой душы, а ў заднім коле ўвіты
Між спіцаў сук, які пры кола павароце
Сцябаў мяне добрасумленна па капоце.

Вось мы ля мэты ўжо, праскокваем вароты;
Канчаюцца нарэшце ўсе нашы турботы.
Вось двор Шчароўскі, вось мяне з душой адкрытай
Вітае пана правая рука — Мікіта,
Вядзе мяне ў пакой і чаем сагравае
І некалькі пален у печку падкідае.
О як жа тут раскошна пасля падарожжа
Спачынак мне пасцель пасланая варожыць!

## Частка III

### Гасцяванне. Літаратарскі поспех

Эх! міла ўспомніць нам мінулае стагоддзе,
Калі гасціннасць працвітала у народзе,
Калі быў госцю рады бедны і багаты,
Калі у гонар госця ўзносілі віваты
Суседзі з панам дому грамадой суладнай,
І чым багата хата, тым была і рада.
А сэрцы ж! — у абдымках, словах, справах,
На дне кілішка нават, нават ва ўсіх стравах.

І будзе прадаўжацца аб табе старанне,
Каб месяц, нават год трывала гасцяванне!
Клапоціцца і гаспадар, і ўсе наўкола,
А як збярэшся ехаць, паздымаюць колы!
Цяпер звычай другі ўжо — цывілізаваны,
Заместа сэрцаў сёння — ліс пафарбаваны.
З'явіся ў польскі дом, і што там госць застане?
Пан гаспадар ледзь дасць адказ на прывітанне,
Шле коней у карчму ці к жолабу пустому
Вучыць, каб *«гунгер-курам»* праганялі стому.
Пачне гаворку пра дзень слотны ці пагодны,
Абходзячы пытанне, ці госць не галодны,
Пра спекуляцыю нямецкую са збожжам,
Пра цэны, да якіх яна давесці можа.
Вось каб не голад, войны, пошасці часамі,
Не можна б аніяк стачыць канцы з канцамі!
Калі ўздыхнеш, дык гаспадар, зірнуўшы скоса,
Ўваткне табе сігару або папяросу,
Але не «генеман», не «гелер» і не «кофскі»,
А з мінскае ці пінскай фабрыкі жыдоўскай.
Далей убачыш шклянку і малы імбрычак,
А потым к століку зялёнаму паклічуць.
Калі ж казырка, як на злосць, ісці не хоча,
Гарэлачкі папі, заеш яе сырочкам

І едзь, шкадуючы рубля, што стаў суседскім,
Вяртайся гол, галодны, як святы турэцкі.

А хто захоча ўспомніць даўнія часіны,
Няхай паедзе ў Беларусі край гасцінны,
Застукае тут сэрца, будзеш моцна ўзрушан,
Як быў я ўзрадаваны ў доме Юліюша.
Прыбыў я, гаспадар, якога кожны знае,
Мяне сардэчна і па-брацку абымае.
Хоць малады, багаты, ён пашаны поўны,
Гасцей з суседства прадстаўляе мне шаноўных:
«Вось Павел з Пацяйкова, лепяльчук, мой пане,
Вось пан Тадэвуш, сябра з магілёўскіх даляў,
Вось Юзаф і другі — абодва віцябляне,
Шаноўны Эдвард, Віктар і Станіслаў, далей
Пан Ян з Янова дзедзіч, бацька селяніну,
Ды шкода, не пазнаеш галавы краіны,
Бо пан Ян з Багатова сёння не прыбудзе,
Клапоціцца надзвычай ён аб простым людзе.
Няма Стафана князя, добрага магната,
Што ў кожным чалавеку свайго бачыць брата.
Ён прадвадзіцель наш, хай будзе век здаровы,
Памешчыкам, чым можа, ён служыць гатовы».

Так Юліюш казаў, і ўсе, хто быў у залі,
Прыезджага па-брацку, горача віталі.
І кожнага любіць бярэ мяне спакуса,
Сапраўднага бо ў кожным бачу беларуса.
Знаёмства адбылося ў доме знакамітым,
Зліліся сэрцы нашы, як метал з магнітам.
Тым часам падаюць закускі прад абедам:
Вяндліны, сыры, кумпякі, за імі следам
Прысмакі іншыя, каб больш паддаць ахвоты,
Таму, што гэта ўсё дамашняе работы.
Аж слінкі пацяклі, ды снеданне ўстрымалі:
Пан просіць, каб ксяндза хвілінку пачакалі.
А тут жа збоку шэпт пачуўся шматгалосы:

«Ён ксёндз, што з неба добрыя прыводзіць лёсы,
Вялікі гэта сябра люду, друг галоты,
Шмат выцерпеў для Божай славы і для цноты,
Ён цешыцца сям'ёй і людам, быццам сынам,
Навукай свеціць наваколлю, напамінам.
Намеснік ён Хрыста, дык верных навучае
І сціпласцю жыцця вучэнне пацвярджае.
Няшчасных апякун, асветнік ён заўзяты,
Ну, словам, ксёндз Андрэй святар старое даты!»

Ды вось і ксёндз Андрэй у залу прыбывае —
Надзвычай сціплы, галава ад бед сівая,
Пакора ў твары, мудрыя павагай вочы.
Руку яго пацалаваць тут кожны хоча,—
Ён шчыра ўсіх гасцей багаслаўляе
І кожнага да ўчынкаў добрых асмяляе,
А як прыйшла чарга загаварыць са мною,
Звярнуўся па-бацькоўску моваю такою:
«Я рад, што з мудрым чалавекам запазнаўся,
Які пісаць сялянскай мовай не стыдаўся.
Вы для дабра сялян нямала паслужылі
Тым, што ў іх мове шлях да свету пралажылі.
Выразна, што мы ў Бога дачакалі цуду,
Калі клапоцяцца ўжо пра асвету люду!
Хвіліна, і ўвесь люд схінецца да асветы,
І ў тым найбольш заслугі вашае, паэты!
Ды толькі звычаі старыя захавайце
І з адукацыяй і веру спалучайце!
Ды гэта зробіце напэўна дасканала,
Калі асвета люду актуальнай стала.
Вучыце, цешце, хай загінуць забабоны
І хай народ наш будзе светлы і натхнёны!
А за тваіх народных песень асалоду
Прымі маё багаслаўленне, друг народа!
У сэрцы у мяне ты будзеш заставацца,
І сябрам мне тваім дазволь навек пісацца».
Калі ксёндз гаварыў сардэчна так, без позы,
Дык мне, сказаўшы праўду, выступілі слёзы.

А тут яшчэ кампанія гасцей прыспела,
Дык — новыя вітанні, ў залі загудзела,
Бо ў госці ўсе з'яўляюцца суседзі,
Усе мяне вітаюць, і ў такой бяседзе
Сардэчнай, шчырай часу нат не прыкмячаем,
Яна скрозь супярэчыць сённяшнім звычаям,
Такой больш не пачуеш ні ў адным салоне,
Дзе сэрцаў разнабой запанаваў сягоння.
У часе тых сардэчнасцей на стол падалі,
І там гаворку дружна ўсе мы прадаўжалі.
Застолле даўнія напамінала часы:
Плывуць, нібы ручай, фрыкасы і бекасы,
Ды што тыя фрыкасы! ўсюды, адным словам,
Ты бачыш сэрца і душу гаспадарову.

І раптам гаспадар яму даць слова просіць
І тост такі, з дазволу ўсіх гасцей, узносіць:
«Хай той жыве, хто піша на сялянскай мове,
Дык вып'ем мы за Марцінкевіча здароўе!»
А як той тост у гонар мой усе узнеслі,
Калі ў душы пачуў я радасныя песні,
Як зноў кілішкі налілі, я слова маю
І, што на сэрцы зверху, тым тост узнімаю:
«Не той край сябе праславіць,
Што на лёдзе замкі ставіць,
Што ў тэорыях дзесь кружыць,
А той, што народу служыць!
Той шчаслівым край быць мусіць!
За здароўе Беларусі!»

І ў час, як напаўняецца за чаркай чарка,
Тост новы рваўся ўжо з душы глыбіняў шпарка,
Бо думкі ў сэрцы затаіць было мне цяжка,
Дык выліў іх імправізацыяю важкай:
«Браты мае! Нам зорка радасная свеціць,
Калі мы шчыра падаём сабе далоні,
Калі жывуць яшчэ на нашым белым свеце
Апекуны сялян і песняроў сягоння.

Пытае сэрца, дзе пашаны варта цнота?
Ад сэрца шчырага і думкі не панурай
За пана дому тост цяпер мне ўзняць ахвота
І за здароўе брата слаўнага, Артура!»

Убачыўшы, што кожны келіх з мёдам песціць,
Ксяндза Андрэя віншаваў я ў гэткім змесце:
«Абодва мы ў мінулым шмат пакут пазналі,
Абодва ў болях год паважных дачакалі,
Няхай жа дружба сцісла злучыць сэрцы нашы,
Дык за ксяндза Андрэя асушайма чашы!»
Ледзь скончыў тыя рыфмы, зноў віно бушуе,
Надходзяць думкі зноў, і гэтак тост вяршу я:
«Гора, гора для краіны,
Дзе ўжо дамы не натхняюць.
Ну, а дзе, як тут, мужчыны —
Там пра дам не забываюць.

Прыгажуні Беларусі,
Вам і чэсць, і ўшанаванне!
Выпіць чару я бяруся
За здароўе ўсіх вас, пані!»

Каб мне не перабраць,— з'яўляецца задума,
А тут узняўся гоман: «Вып'ем за Навума!»
Навуму Прыгаворку прамаўчаць не гожа,
Дык з пенным келіхам адказвае як можа:

«За Навума піць здароўе
Лішне, пані і панове!
Але, успомніўшы былое,
Сэрцы хай гараць сягоння,
Злучым братнія далоні
І без жартаў, грамадою,
З нашых продкаў успамінам,
Тост «Кахаймася» узнімем!»

На словы гэтыя ўсе за сталом усталі
І ўсе адны другіх па-брацку абнімалі.

Закончыўшы бяседу, асушыўшы чашы,
Глядзім, аж сцэна новая рве вочы нашы:
Усе сяляне, колькі іх было ў сяленні,
З правадырамі і ў святочным мо адзенні
Прыйшлі ў двор лірніка свайго вітаць гатовы,
Які ў пісаннях іхняй ужывае мовы.
На іх падзяку, пераданую сардэчна,
Я слёзы ліў і так хацеў бы плакаць вечна!
А тыя, што чытаць змаглі ўжо навучыцца,
Прасілі ім прадаць *«Гапона», «Вечарніцы»*.
Балела сэрца, што не мог тых кніг раздаць ім,
Бо Юльюш закупіў усё маё багацце,
Тут я у клопаце, ды дзедзіч выручае:
«Вось кнігі у мяне! — і кожнаму ўручае,—
Не трэба платы, я ўжо ўзнагароджан гэтым,
Што думка ваша скіравана ў бок асветы!»

Пасля той сцэны дзіваў новая прычына:
Дажынкі аб'яўляюць, і з вянком дзяўчына,
Назначаная быць дажынкаў каралевай,
Пачаўшы ў роднай мове, прадаўжала спевам:

«Цешмася, ласкавы пане,
Што убраная ўжо ніва,
Вам і нам на год хай стане,
Спажывайце ж вы шчасліва!

Праца нас не затаміла,
Працавалі мы старанна,
Віншаваць нам пана міла,
Што ўжо з поля хлеб сабраны.

Наша праца, дабро ваша!
Ваша дабро — жыццё наша.

Бога славім мы навекі,
Што ўжо поўныя засекі.

Час дажынак — наша свята!
Сёл тваіх жанкі, дзяўчаты
Вось вянок мне далі мілы —
Нашы душы ў ім і сілы!

А мне Бог дажыць даў шчасця
Вам вяночак гэты ўскласці.
Бог няхай вас захавае,
Каралева вам жадае».

Як дзедзічу аддалі той вянок прыгожы,
Пайшлі ўсе госці ў танец, з кім і як хто зможа.
Мне выпала скакаць з дзяўчынай у вяночку,
І вось мяцеліцу пайшлі мы па пясочку.
Па кожным станцаванні рух спыняла кола,
Навум войт, бы ў «Ідылыі»[1], запяваў вясёла.

І гэты баль сялянскі доўга зацягнуўся,
Завуць мяне ўсе братам, іх слугой завуся.
І ў тым давер'і я даведаўся пад спевы,
Што хлопец Домка ўпаў у сэрца каралевы,
Дык абяцаю ў пана за яе ўступіцца,
І ўсё павінна па яе жаданню збыцца.
А што было ў кахання іхняга аснове,
Раскажа вам дудар на іх сялянскай мове.

Калі ўсе застаёмся ў шчырым захапленні,
З'яўляецца суддзёва ў дамскім акружэнні.
Пытаю ў іншых, што пры ёй там за жанчына?
Алеся, кажуць мне, і больш — ніякім чынам!
А ўбачыўшы яе, адчуў я хваляванне,
Ды бачу, і яна ў мой бок штораз то гляне.
Знаёмства адбылося неяк непрыкметна,

[1] «Ідылія» — мая камедыя-опера, у якой я іграў калісьці ролю войта Навума Прыгаворкі; адтуль і мяне гэтым імем называюць.

Далей размова пачалася аб паэтах,
Пытае з камплiментамі аб сельскай працы,
Пасля мастацтвам польскім стала захапляцца,—
Якіх праслаўленых пісьменнікаў мы маем,
Што аж душа ад захаплення замірае,
Напрыклад, наш Крашэўскі, Штырмер, Каржанеўскі,
Сяменскі, Поль, Ржавускі, Адынец, Чайкоўскі —
Даўно яны валодаюць душой людскою!
Прарокі! Пёры іх не знаюць супакою!
Напрыклад, Сыракомля, майстар адмысловы,
Ледзь што ні месяц выпускае твор свой новы,
А што ў яго за мова! Стыль надзвычай мілы!
Не дзіва, што ліцвінкі хваляць з цэлай сілы.
Каб Полеў «Могарт» і Крашэўскага «Два светы»
Узяць ды Сыракомлевага «Дэмбарога»,
І то прызнаў бы свет, што гэтакіх паэтаў
У час цяперашні жыве не вельмі многа!»

І дапаўняючы пачатую бяседу,
Сказаў і я, што ў гэтай справе ведаў:
«Апроч стваральнікаў «Марыі», «Валенрода»,
Якіх імёны будуць гонарам народа,
Мінаючы і творцу «Караля замчышча»,
Які не піша больш, хоць не стары йшчэ,
Мінаючы паэтаў тых, што паўміралі,
Вучоных тых, якія пра асвету дбалі,
Зрабіўшы пераскок, скажу: і пол прыгожы
Сваім мастацкім пісьменствам хваліцца можа.
Апроч Зяменцкай, Таньскай, Кракаў, Дэатымы
Ільніцкая, Прушкова твораць для радзімы.
Высакародны іх намер, душа святая,
Не раз мудрэц з напрамку дум іх скарыстае.
І прастата іх лепшая, змест больш багаты,
Чым таленту, што шумны, але пуставаты.
Вось песні Ленартовіча і Плуга працы
Чытаючы, ніяк не можаш адарвацца!
Дык добра, што ўжо тых мінула перавага,
Якія думалі не так, пісалі блага».

«Я ведаю, каго вы маеце на ўвазе,
Дух нашай прэсы адмяніўся ў перавазе
На лепшы бок, станоўчы, і ў эпосе новай
Былое вяжа з будучым другой асновай.
Глыбей заглянулі ў салоны і у хаты,
Зрабіўся пераломным год пяцідзесяты —
Літаратура здабыла сабе павагу
І ў бок мастацтваў і навук схіліла ўвагу».

«Але, заўважце, пані, перад годам гэтым
Лунала шмат вялікіх дум над нашым светам.
Цяпер, з упадкам тых, што плавалі ў хаосе,
Натхнёнае ўжо раздаецца шматгалоссе.
Чыёй заслугі больш, пазнаць належным чынам
Яшчэ цяпер — пакуль што — немагчыма.
Адкрыцца далягляды новыя павінны —
Мы чуем галасы Літвы і Украіны.
Літаратурны погляд цалкам адмяніўся,
І шэраг новых зор у нас ужо з'явіўся:
Вандроўнік Трыплін, і Вянярскі, і Дзяржкоўскі,
Пілят, і Вольскі, і Апола Каржанеўскі,
А над усімі чалавек душы чароўнай,
Мінулага найлепшы знаўца, безумоўна,—
Качкоўскі Зыгмунт, талент надзвычайны, новы!
Ён так урыўся ў нашы сэрцы і галовы,
Што з погляду яго, са шчырых духа ўзбліскаў
Мы бачым: збаўчая святла хвіліна блізка».—
«А аўтар «Песняў нашых» ці сягоння піша?» —
«Ён, сцеснены з усіх бакоў, сядзіць у цішы,
Аднак, як скіне закідаў хоць палавіну,
Дакажа, што ягоны талент не загінуў».

* * *

Ды хопіць разбіраць літаратуры справы,
Не для навукі гавару, а для забавы;
Я невялікі эрудыт, у разважаннях

Мо часам маху даў? Ды варт той даравання,
Які сваю бяздарнасць прызнае адкрыта,
Бо што я адчуваў, пра тое й гаварыў тут.

Алеся, размаўляючы са мной так міла,
Мне позіркам гарачым розум памуціла,
Забыўся я пра кнігі, пісьменства, паэтаў,
А толькі пазіраў за ясных вочак светам.
О, бо й цудоўная ж была жанчына з твару!
З вачыма цёмнымі, напоўненымі жару,
З усмешкаю анёльскай, радаснай, прыгожай,
Якой мастак ніякі выразіць не зможа.
Дык і не дзіва, што прынады гэткай пані
І мова мілая ўмілялі гасцяванне.

Назаўтра ў Хацюхове тыя ж зноў забавы,
Усмешка тая ж, погляд гэтакі ж ласкавы,
І тая ж старапольскае гасціны цнота,
І за сталом да тостаў гэткая ж ахвота.
За гэта дар удзячнасці маёй натхнёнай
Такія з глыбіні душы паклікаў тоны:
«Калі гасціннасцю ў даўнейшым стылі
Не часта чалавек цяпер сагрэты,
Дык я знайшоў яе у поўнай сіле
У доме гэтай знатнае кабеты!
І міла ўспомніць лірнік после стомы
Аб тут праведзеным цудоўным часе
І міла думкай звернецца да дому,
Ў якім душа навечна засталася.
Ён тых хвілін ніколі не забудзе,
Іх памяць захавае назаўсёды,
Але з вас, пані, ці хто помніць будзе,
Як ён пакіне гэты край свабоды?»

Калі вярнуўся зноў я ў Шчары з Хацюхова,
Здзівіўся беларускай ветласці нанова:
Бяруць усе, што вёз я кнігі добрай воляй,
За сто ўплацілі экземпляраў, просяць болей.

Пара й дамоў вяртацца, хоць тут гэтак міла,
Не дзіва — сэрца кожнае прыхільна біла,
Дык абнімаемся і падаем далоні
І брацтва наша пацвярджаем так сягоння:
Каб кожны з нас сялян не кінуў без нагляду
І за дазволам царскім, згодаю ураду
Выхоўваў наш народ у цнотах хрысціянскіх
І не скупіўся на патрэбы школ сялянскіх.
Расчуленыя ўсе пры тосце развітання,
Адказваю на іхні не без хвалявання:
«Расстаючыся з вамі, слёз не абяруся,
Хвала вам, землякі, чэсць нашай Беларусі!
Злучаю дружбай сэрцы нашы да сканання
І падымаю тост апошні — развітання!»

## Эпілог

Падзяка, беларусы, вам за тыя хвілі,
Калі вы к вашым сэрцам дудара тулілі.
За шчырасці, з якімі быў я ў вас прыняты,
Свае да вас пачуцці я ўтрымаю свята,
Іх захаваюць праўнукі мае і ўнукі,
Знаходзячы ў вас добры прыклад для навукі!
А за ўсе вашы добрыя ка мне учынкі
Я прысвячаю вам «Шчароўскія дажынкі».

*Менск, снежня 10 д. 1856 г.*

# ШЧАРОЎСКІЯ ДАЖЫНКІ

*Аповесць у 2-х абразках*

## Пралог

Пан і войт Навум.

Навум

Нех бэндзе Езус Хрыстус пахвалёны!

Пан

На векі векаў! — Здарова, Навуме!
А што мне скажаш? — Чы ўжо ад Алёны
Адстала трасца? — як там маёй куме?

Навум

Да хваліць Богу, дарагі паночак!
Здарова, маўляў баравы рыжочак;
Вось дзякуй пану, што бабе прыслаў
Святой нядзелькай варанае зелле;
Выпіла нанач — і недуг устаў,
Вылізалася — зноў языком меле.
Як кот, жывушча; тут стогне, тут крэкча,
Няхай жа бабе стане крыху легча,
Палядзь! — вось яна з кута ў кут лятае,
Сама рабошча — дзетак прыганяе,
Бачыш, сягоння ледзь баба устала,
Зараз да пана з гасцінцам пагнала:
«Вазьмі, Навумка, дзесятак яечак,
Два кураняткі дый мёду гаршчэчак;
Ідзі да пана, падзякуй за зелле,
Скажы, што бабе хоць бы да вяселля!
Пагана цётка трасці перастала»[1].

П а н

Ну! — дзякуй Богу, што ўжо ачуняла[2].
Што ж чутно болі?

Н а в у м

Нечага казаць.
Ад ліха ціха — дабра не чуваць.
Коман назаўтра загадаў дажынкі[3];
Вось усе дзеўкі да старай Грыпінкі
Сабіраюцца, штоб выбраць дзявіцу
Прыгожу, чэсну — дажынак царыцу,
Катора б табе, дарагі паночак,
Дый каласісты паднясла вяночак.

Такія пану войт суліў расказы,
Пасля гасцінец на стол палажыў
Да пакланіўся нізенька тры разы;
Пан да Навума гарэлкі прапіў.

## Абразок 1

## Варажба

Вось за Барысавам, да на Русі Белай,
У сяле Шчароўскам, заўтра, баш, дажынкі;
Разгулялісь дзеўкі — грамадою цэлай
З песенькай вясёлай бягуць да Грыпінкі.
А соненька за бор галоўку хавае,
А месячка з-за туч лоб свой выхіляе.

Удава Грыпіна стара, што крый Божа!
Падпёршыся кіем, ледзь ступіці можа
Па сваёй святліцы — сотню лет дабіла,
З унукаў прыгожых радасці дажыла.

Нечага, браткі, казаць!
Розум яс — то дзівота!

Варажыць, зло адмаўляць —
То Грыпініна работа.

Бывала, хто заняможа
Аль хто урачэ скацінку,
Яна ўсякаму паможа:
Чы пашэпча, чы крышынку
Якогась зелля падсуне,
Палядзь! — чалавек ачуне;
І скацінку угамоніць,
Злыя урокі адгоніць.

У Грыпінінай святліцы
Сабралася грамада:
Тут дзяўчаты, маладзіцы,
А там хлапцоў чарада.
На куце сама Грыпіна,
Пры ёй справа Акуліна,
Злева — Домна і Харціння,
Тут жа Ёўга і Усціння;
Усе хоць стары, нядужы,
Да на розум, баш, дасужы.

Грыпіна рукой махнула,
Трэйчы ўголас кашлянула,
І цікавы беларусы
Замоўклі, вось, маўляў, трусы;
Чакаюць, што стара скажа,
Як ім загадку развяжа
І якія падасць рады,
Каторай з дзяўчат грамады
Вянком прыбраці галоўку?
Трэба ж прыгожу дый лоўку;
Штобы сорам знала Божы,
Чэсць хавала у старожы,
Галасочак звонкі мела,
Штоб песенькі громка пела,
Сялу штоб не было стыдна.

Дзяўчаты глядзяць завідна,
Чакаюць на старых волю,
Каторай Бог пашле долю?

«Слухайце, дзеткі! — так кажа Грыпіна.—
Сягоння у нас адвечны абрад,
Катора вянок панясе дзяўчына?
Трэба ж сумленна выбраць, не наўгад!
Вось, міленькія, памолімся Богу,
Ён нам не мыльну укажа дарогу».

Старэнькі бабы із лаўкі прыўсталі,
Тварыць малітву святую началі,
І — «Ах, мой Божа, верую Табе,
Ўсю надзею маю у Табе».
Цэла грамада голасам запела;
Шчыра малітва да неба ўзляцела.

Як святу песню да канца прапелі,
Бабы на места зноў сваё заселі;
І кума Домна стала так казаць:
«У нашым сяле малада Агатка
Хоць куды дзеўка! — разумна і гладка;
Вось мая рада: ёй вянок аддаць!»

«Не, мая кумка! — другім крыўдна будзе,
Нямаш тут праўды у гэтакім судзе,—
Так стара Ёўга Домне пераб'е.—
Чы ж што Агатка сваяшна табе,
То ўжо вянок ёй маем прысудзіць? —
Не, досыць, кумка, прыгожаю быць,
Прыгожых, бачыш, у сяле ёсць многа,
Трэба, штоб дзеўка знала боязнь Бога,
Штоб знала сорам, у чэснасці жыла,
Сваім падругам крыўды не чыніла.
А твая, кумка, малада Агатка
Хоць разгаворна, хоць лічыкам гладка,
Да яе розум не па веку будзе,

Не адно кепства аб ёй чулі людзі:
Наліха жадна з хлопцамі гуляць[4],
Равейніц сваіх любіць абмаўляць[5],
Не адну крыўдну разнясла гаворку
На другіх дзевак,— вось і на Тадорку
Пакасны сплетні ў завісці налгала;
Беднай сіротцы славу адабрала.
Тадорка ж чэсна — прысягнуць гатова,
Будзь я так шчасна! — будзь я так здарова!
Тадорцы вянком павінна грамада
Прыбраць галоўку — така мая рада!»

«Брэшаш няпраўдай!» — Домна пераб'е,
А злосна наліха! — галавой трасе,
Рукі сашчаміла у два кулакі
Да аб дзеўцы рэчы завяла такі:

«Агатчынай чэсці не смей абсуждаць!
Ну, праўда, дзеткі,— нечага казаць,
Хлопцы за дзеўкай лётаюць, баш мухі,—
Да віна ж яе, што красней дзявухі
У цэлым сяле пашукай з лучынай?
З адною толькі не смела б дзяўчынай,
З адной Тадоркай красою раўняцца,
Да хто ж ёй вінен? — не трэба ж займацца
У дварэ з падвальным,— аднаго кахаці[6];
Быў жаніх Домка,— нашто ж ёй гуляці
З другімі? — Да, баш, той панскай манеры,
А Домка мужык, хоць чэсны і шчэры;
Думала абодвух затуманіць лоўка[7],
Маўляў, ад прыбылі не баліць галоўка.
Шляхціц не возьмець,— на Домку наляжа,—
Да ён жа бачыў! — няхай сам раскажа».

Як, баш, злосна Домна кончыла гаворку,
Так зараз на Домку выпучыла вочы[8];
Зіркнуў на Агатку хлапец, на Тадорку[9]
Дый так спалохаўся, што не стала мочы[10]

Славечка сказаці, хоць Домна міргала[11],
Хоць збоку Агатка пальцам знак давала.

А ў беднай сіроткі, прыгожай Тадоркі,
Із сіненькіх вочак лілісь слёзкі горкі;
Яна, баш, на долю злу не наракала,
Вось толькі малітву ціхонька шаптала,
Штоб яе нявіннасць Бог выказаў ясна,
Штоб Домка спазнаўся, што малва няшчасна,
Каторая сэрцам яго адчурыла[12]
Ад вернай дзяўчыны, плёткамі зажыла.

Тут стара Грыпіна рукою махнула,
Ўсе кругом замоўклі,— сваяк ёй Акула
Падышоў да бабы,— та дзеду на вуха
Крыху пашаптала дый — хітра старуха! —
Паднялась із лаўкі, ўкруг вокам пагнала
І такія рэчы ёмка казаць стала[13]:

«Паслухайце, дзеткі, старэнькай Грыпіны.
Ведама ж, што ўсякі сакрэтны навіны
Бабе не дзівота,— вось паваражу,
Хто з дзяўчат віновен, праўду вам скажу.
Пастаў тут, Аўдотка, рэшата навенька,
Падай мне, Акула, пеўня маладзенька,
Затушыце агонь, штобы цёмна стала»[14].
Вось так і зрабілі, як баба сказала.

Цёмна у святліцы — выкаль, маўляў, вока,
Дзіва, да і годзе! — ціхасць там глыбока;
Усе із грамады у кучку сабралісь,
Аж валасы дыбам са страху паднялісь;
Ой!.. трасуцца хлопцы, трасуцца і дзеўкі!
А баба страшэнны заводзіць прыпеўкі
Дый рэшатам пеўня зверху прыкрывае,
Агатку, Тадорку к сабе прызывае.
«Глядзіце, дзяўчаты! — штобы мысль бязбожна[15]
Ад вас адступіла,— хлусіць тут не можна[16],

Тутацька не жарты — варажба страшэнна! —
Катора з вас будзе пачціва, сумленна,
Няхай смела рукі пад рэшата садзіць,
Няхай пеўня зверху тры разы пагладзіць,
Пявун сядзець будзе спакойна і ціха;
Катора ж нячэсна — той, дзетачкі, ліха!
Бо як пявунчыка пагладзіць рукамі,
Крыкне «кукарэку!» — пачуеце самі,
Запяе, дый годзе! — верце, мае дзеткі!
Варажбой такою я рэчы не гэткі
Выказала свету.— Ну ж, дзеўкі, да дзела!
Начынай, Агатка! — перахрысцісь... смела!»

Агатцы са страху молатам забілась
Нячыстае сэрца; дзеўцы і не снілась,
Штобы злыя матні, так пранырна, ціха[17],
Застаўлены беднай Тадорцы наліха,
Выйшлі страшнай гадкай людзям на паказ[18];
Думае: «Пастойце! — абману я вас!»
І мезіным пальцам вось не зачапіла
Рэшата, ні пеўня,— набок адскачыла
Дый сказала бабе: «Ужо, мая зорка!» —
«Добра! — стой пакойна. Ну, цяпер Тадорка!
Уздыхні да Бога,— прыступай да дзела!» —
Так кажа Грыпіна,— і Тадорка смела
Белыя ручонкі пад рэшата садзіць,
Пявунчыка трэйчы па крыллях пагладзіць.

Аж воласы дыбам сталі чалавеку,
Дзіва!.. певень крыкнуў громка «кукарэку»
І затрапятаўся — а-ва!.. вось навіна!
Усе закрычалі: «Віноўна дзяўчына!»
Бедная ж сіротка — няшчасна Тадорка —
На сваю злу долю заплакала горка,
А Агатка губу кулаком заткала,
Спадцішка хахоча: бабу ашукала!

«Ціха!..» — Агрыпінін голас адазваўся,
І замоўклі разам — усяк іспугаўся.

«Што закрычаў певень — невяліка дзіва;
Вось зараз пакажа варажба шчасліва
Тую, што у чэсці, праўдаю жыве.
Падступіце бліжай, дзяўчаты, ка мне!
Каторай з вас рукі памараны ў сажу,
Та пачціва дзеўка — так гаданне кажа.
Скарэй штоб лучынай хату асвяцілі!»
Як баба сказала, так яны зрабілі.

Далоні Агаткі, як малако, белы,
А, як смоль, Тадоркі — сажаю блішчаць.
Тут стара Грыпіна, злосна, ўголас цэлы,
На хітру дзяўчыну узяла крычаць:

«Га, шатаньска племя! язык твой змяінай
Досыць здзекаваўся вось над сірацінай[19],
Брахаць яму годзе! — Бог цябе накажа,—
Прызнайся тут зараз — ты, нячыста ўража!»

Агатка аж млее з вялікай трывогі,
А пасля Грыпіне кінулася ў ногі
Дый загаласіла: «Мае вы міленькі![20]
Даруйце ж няшчаснай, мае селязенькі![21]
Скажу усю праўду — хлусіць вам не буду,
Толькі ж не завіце нябеснага суду
На бедну галоўку: страшан мне суд Божы! —
Вось як было, браткі! — ўгледзя, што прыгожы
Домка на ігрышчах з Тадоркай танцуе,
Кулаком, гарэлкай кожан раз частуе
Да з ёй жа зручыўся,— завідна мне стала,
А Домку я сэрцам, ах, вельмі кахала!
Думаю у злосці, як бы тут зрабіць,
Штобы ад Тадоркі дзецюка адбіць?
А чорт мне з падвальным, як тут, навязаўся,
Падвальны ж Тадорцы не раз напрыкраўся.
Ну ж бегці у бровар,— ну ж яму хлусіці!
Што Тадорцы нельга без яго і жыці,
Што быццам маркотна,— павідацца б рада,

Вечарком чакаці будзе возля сада.
Хлапец ад радасці красен, як жар, стаў,
Кілішкам гарэлкі мяне частаваў.
Там сваё зрабіўшы, пайшла да Тадоркі
І ёй нахлусіла, што возля аборкі,
Тут жа каля саду, вячэрняй парою
Домка чакаць мае з пільнаю малвою.
А Домцы налгала: дзеўка цябе зводзіць,
З падвальным відацца сумеркам падходзіць.

Прыбегла Тадорка — сюды-туды гляне,
Аж тут да дзяўчыны падвальны прыстане;
А хоць, баш, за жарты з ног яго зваліла,
Кулаком із носа ліху кроў пусціла,
Да Домка паверыў: я радасць пачула,
Што прыгожа хлопца к сабе прыхінула.
Паганага ж піва я ім наварыла,
Нявінную дзеўку на чэсці згубіла!»

Скончыла Агатка,— дзівіцца грамада,
Грыпіна смяецца: із варажбы рада,
А Домка нясмела к Тадорцы падходзіць,
Рукі ёй цалуе, воч з яе не зводзіць.
Так чэсць сваю вінна Тадорка Грыпіне,
Усе прысудзілі вяночак дзяўчыне!!!

## Абразок 2

### Дажынкі

Да у Шчарах, пры дарожцы,
Проста супраціў двара,
Маўляў на курынай ножцы,
Стаіць хацінка мала;
Удава там пражывае,
Красачка там расцвітае.

Акулініна то хата!
Была калісьці багата,
Як жыў мужык ёй Хвядор.
Вось насталі злыя годы,
Мор, голад, усякі прыгоды,
І гаспадар ёй памёр.

І адна ўдава зажыла,
Гаравала дый тужыла,
Хоць дарагі мела клад:[22]
Бог даў ёй дочку Тадорку,
Вясёленьку, маўляў зорку,
Проста матчын ненагляд!

Кроў з малаком яе шчочкі,
Моланняю блішчаць вочкі,
Спадцішка, баш, як зіркне —
Сэрца молатам заб'ецца,
Грудзь полымем абальецца,
Не спазнаеш сам сябе!

Яна ж чэсна, працавіта!
Бывала, скочыць да світа,
У руч'і памые твар,
Памоліцца шчыра Богу,
Штобы маці даў спамогу,
Бяжыць дагле́дзець тавар.

Да хоць долю цяжку, горку
Мела, любілі Тадорку —
Хлопцы да дзеўкі смалой!
Чы у дварэ, пры рабоце,
Чы у карчме, пры ахвоце,
Кожан ляцеў к ней стралой!

У дварэ быў хлапец ладны,
Кухар панскі,— відны, складны!
Домкаю звалі яго.

Ён к сіротцы прывязаўся,
Душою, сэрцам аддаўся
Дый не пажалеў таго!

Бо і Тадорка красненька
Дзецюку была радзенька:
Хваціў за сэрца хлапец!
Душой яго спадабала,
Вось і ручнікоў наткала[23],
Гатовілась пад вянец.

Трэба ж, у злую гадзіну
Нашу бедную дзяўчыну
Вось падвальны спадабаў;
А к Домцы, як кажуць гадкі[24],
Сэрца злоснае Агаткі
Чорт вяроўкай навязаў.

Яны ліха наварылі,
Домку з мілай разлучылі:
Агаткі гаворка зла
Хлопца ад дзеўкі адбіла;
Тадорка слязьмі зажыла,
На язык людзям пайшла.

Бог пажалеў сіраціны,
Ён варажбою Грыпіны
Злыя брэхні укараў.
Вось, маўляў, такі суд Боскі
Сірацінцы уняў слёзкі,
Дзецюка зноў к ёй прыгнаў.

* * *

У дварэ Шчароўскім, сэрцам залаценькі,
Стаіць на ганачку паніч маладзенькі;
На ім світка чорна, шапачка рагата;
Рада гасцям яго прыгожанька хата;

Дый гасцей нямала — па дварэ гуляюць,
З панам весяленькім жнеек спатыкаюць.
А ў полі грамадка голасам заводзіць,
К панкам вось якая песенька даходзіць:

«У нас сягодня вайна была,
Усё поле зваявалі,
У копачкі паскладалі;
Гдзе горачка,
Там копачка,
Гдзе лужочак,
Там стажочак».

Якое ж там войска, маўляў туча чорна,
З сяла проста суне ў двор шырокім шлякам?
Рассыпалась па ўсёй дарозе прасторна,
Наперадзе старшы, дый з блісцяшчым знакам.
Не войска то, дзеткі, не туча нябесна,—
Паніч сяло цэла спрасіў на дажынкі,
То ж свая сямейка, — то ж грамадка чэсна!
Стары гаспадары, стары гаспадынькі.
А з поля даходзіць якісь голас дзіўны,
Штораз бліжай... бліжай... томны, прыуныўны:

«Канец ніўцы, канец!
Упляцём пану вянец;
Да ўжо жніва у канца,
Нуце ж, дзеўкі, да вянца!
Нуце, да вянца!»

Да што ж там такое на дварэ мігаець?
Чы снег прыкрыў краскі, аль мак расцвітаець?
Не снег то, не мак то, маe вы міленькі!
Гэта ідуць з нівы жнейкі маладзенькі;
Ўперадзе грамады Тадорачка красна,
З вянком залаценькім, як зорачка ясна!
Звонкім галасочкам, маўляў салавейка,
Звініць, вось аж люба! з ёю кожна жнейка.

Дзеўку памагальны пад ручкі вядуць[25],
А пачынальнічкі, крый Бог, як гудуць!

«Змялі поле мяцёлкамі,
Ідзём у двор вясёлкамі;
Выйдзі, добры наш паночак,
Да сустрэч сваіх жняёчак!
Вытачы нам бочку мёду,
Збан, другі гарэлкі,
Мы ж жнейкі, не жаўнеркі;
Гарэлкаю пакрапімся,
Мядком прахаладзімся.
Табе дабро спажываці,
Нам весяле́нька гуляці!»[26]

Тут міргнуў пан шчодры дворнай маладзіцы,
Аж лякай Мікіта вынес із святліцы[27],
Да на сярэбранай тацы, са тры сыры,
Хлеб, соль, рублявікоў беленькіх чатыры;
Другі служка панскі, што Цяглікам зваўся,
Пад цяжкім гарэлкі вядром нагінаўся.
Дзеўка ж штораз бліжай да пана падходзіць,
Тонкім галасочкам вось гэтак заводзіць:
«Наш пан маладзенькі,
Кудры яго залаценькі,
Па ганачку ходзіць,
Хустачкай матае,
Сваіх жнеек вітае;
А жнейкі маладыя,
У іх сярпы залатыя,
К месячку жалі,
Сярпы зазублялі»[28].

Вось ужо пад ганкам — схіліла галоўку
І гэтаку пану сказала прымоўку:
«Добры вечар, паночак!
Знімі з галоўкі вяночак,
З зялёнага поля,

З ядранага аўса.
Даў Бог пажаці,
Судзі, Божа, спажыці
У карысці, у радасці,
У добрым здароўі.
Судзі, Божа, нашаму пану
Жонку харошую,
Свайму дому гаспадыню,
Нам добрую паню.
Наш пан малады, конь яго вараны,
Сядло золатам вышыта, брылянтамі выбіта.
Наш пан на кані войска куе́ць,
Сваяго рыцарства даказуець,
Гавара да служкі:
«Улажыў бы я сабалі, не йдзе лукаве!
Мне сабалей бракуе».
Пан сваяго рыцарства не страціць,
Нам за вянок заплаціць,
Хоць чырвоны злоты,
Для нашай ахвоты,
Жыту на ўраджай,
А пану на доўгі век.
Пану вянок,
А нам гарэлкі збанок!»

Расплакаўся пан добры — рад, баш, прыгаворцы,
Зняў з галоўкі вяночак, а краснай Тадорцы
Сунуў у белу ручку аж два карбаванцы;
Рэшта для памагальніц.— Цэлую чарэду,
Штоб крыху пакрапілась, запрасіў к абеду,
А на пасля Астапу казаў іграць танцы.

Маладзенькія ж начынальніцы,
Прыгожанькія памагальніцы,
Як гарэлкі напіліся,
Так за песню узяліся:

«Высок явар, высок,
Над усімі яварамі!

А багат наш пан, багат,
Над усімі панамі!
У полі капáмі,
А ў гумне стагамі;
Ані ўвайці, ані ўехаць,
Ні сакалу уляцець,
Толькі пану паглядзець».

Аж вось паявіўся на шырокі стол
Цаліком пячоны прабальшэнны вол;
Да бакі ж яго тлустасцю абліты,
Да рогі ж яго золатам абвіты!
К няму назнасілі барабаноў дзесятак;
Хлеба ж, сыроў, блінцоў, тучных парасятак,
Міленькі! без ліку,— еш дый апражыся!
Здоваль было ўсяго — хоць расперажыся![29]
А Цяглік з Мікітай пры бочках стаялі,
Півам да гарэлкай людзей частавалі:
Бо ў добрага пана вялікі дастаткі,
Не жалее дабра для сваёй грамадкі!
Як малады жнейкі жывот пакрапілі,
Такой свайму пану песняй зазванілі:
«Да зялён бор, зялён
Над усімі барамі!
Да славён наш пан, славён
Над усімі панамі!
У нашага пана
Куна па дварэ іграе,
Сабаля вызывае:
«Сабалю, сабалю, пагуляем з табою;
Развесялім свайго пана:
Штоб Бог яму даў паню маладую
І чалядку весялую!»
Кончыўся полудзень — дай Бог на ўвесь век!
Еў, піў, пакуль змога, кожан чалавек;
Пасля ад грамады войт к пану явіўся,
Нізенька у ногі трэйчы пакланіўся,
Махнуў сюды-туды шапкай, штоб маўчалі,

Дый пусціў свой голас, гдзе панкі стаялі:
«Няхай бэндзе пахвалёны
Езус Хрыстус, нарадзоны
З Дзявіцы Марыі,
Прачыстай лілііі!
Добры Бог дазволіў нам дабро пажаці,
Добры пан дажынкі загадаў спраўляці,
Не жалее хлеба, гарэлкі, ні солі,
Піцення, ядзення, прынукі здаволі;
Сэрцам нас частуе — чым хата багата!
Зато ж яму вянок паднялі дзяўчата,
Вянок каласісты дый з Божага дару.
Падзякуйма ж пярвей нябесну мацару,
А пасля і пану за яго гашчэнне:
Штоб Бог яму ссудзіў багатае менне,
Жонку, як малінку! — прыгожу, вясёлу;
Штоб звяршыў год годам поўную стадолу,
Так поўну, штоб нельга варот зачыніці,
Штоб за гадкоў дзесяць дабра не спажыці.
Нуце ж, гаспадары! — ў чаркі налівайце.
Здаровейка пана душкам прапівайце;
Вы, хлапцы, дзяўчаты, карагод вядзіце,
Пакуль, маўляў, змога, ахвотна скачыце!»

Тут Астап музыка уцяў, баш, з-за вуха,
Пайшла ладам, дзеткі, вясёла крутуха[30]:
Карагодам правіць з панічом Тадорка,
Пасля гульнуў з ёю Навум Прыгаворка,
Панок весяленькі, разумны, крый Божа!
Яго у розуме і пісар не зможа,
А пісар наш, браткі,— нечага казаць!
У Халопенічах вучыўся чытаць!
Вяліка галоўка! маўляў сена стог,
Да пан загнаў яго у казіны рог.
Ён і кніжкі піша, песенькі спявае,
Так вумны, што ўсякі мужык панімае.

Кожан пан з дзяўчынай ахвотна нясецца,
Крутіся, да і годзя! пот ракою льецца.

Дасугам Тадорцы Домка кулак суліць,
Абняў тонкі станік, да сэрца прытуліць,
І пайшлі вярцецца! ног, маўляў, не чуюць;
А Цяглік з Мікітай ўсцяж водкай частуюць.

Да самага свету шчыра там гулялі,
Пілі, песні пелі, на убой плясалі!
І я, мае дзеткі, на дажынках быў,
Піва дый гарэлкі досыта папіў,
І па барадзе цякло,
Да і у роце было,
Бо гэта, браткі, праўда, а не казка.
Такая ж была дажынкам развязка,
Што чэсна Тадорка ўжо гора не знала,
З Домкай абвянчалась — гаспадыняй стала;
Яны з панскай ласкі вяселле сыгралі,
І маладым дзеўкі гэтак заспявалі:
«Ай, борам, борам, баравіною,
А хто там едзе вечарыною?
Ох, едзе, едзе Домачка п'яны:
«Ой, адчыні ж мне, Тадорка-пані!» —
«А я не пані, я паненачка,
Я ў сваім доме гаспадынечка;
Мая хацінка дахам пакрыта,
Мая спаднічка золатам шыта».
На дварэ дожджык, а ў сенях слізка,
Кланяўся Домка Тадорцы нізка,
А яна ж яго пажалавала,
Ўзяўшы за ручку, пацалавала.
«Ой, люблю, люблю мёд саладзенькі,
Люблю я Домку — ён маладзенькі!»

## OBJAŚNIENIA DO POWIASTKI DOŻYNKI

[1] Trásca — febra, również febrę nazywają pahánaja ciotka.
[2] Aczúniała — ozdrowiała.
[3] Kóman— Ekonom.
[4] Żádna — chętna, lipka do chłopców.
[5] Rawiéjnic, rawieśnic — towarzyszek równych niemal wiekiem; przyjaciółek.
[6] U dwaré s padwálnym — po ustanowieniu akcyzy, odkupszczycy zostawują po browarach swych stróżów, gdyby prowadzili rachunki o illości wiader wypędzonej okowity; takiego stróża nazywają podwalnym.
[7] Zatumánić — oczmucić, oszukać.
[8] Wýpuczyła wóczy — wytrzeszczyła oczy.
[9] Zirknúu — zerknoł, spojrzał.
[10] Spałóchausia — przeląkł się, zmieszał się.
[11] Mirháła — mrugała.
[12] Atczuryła — odstręczyła, odegnała.
[13] Jómka — dobitnie, wyraźnie.
[14] Zatuszýcie — zagaście.
[15] Wróżba takowa często się po wsiach nadarza. Czernią kogutowi porządnie sadzą skrzydła i pod rzeszoto pakują, potem wmawiają nieświadomym że kto go pod tem przykryciem pogładzi, a jest winnym, najpewniej on zapieje.— W tym razie prawdziwy winowajca, lękając się zapowiedzianego następstwa, nie tylko się nie ośmieli pogładzić to straszne wróżby narzędzie, ale się go nawet nie dotknie; inni zaś, niepoczuwając się do grzechu, śmiało przystępują do czynu, skutkiem jakowego walają sobie sadzą ręce, kiedy przeciwnie winowajca ma je czyste.— Wróżba ta zazwyczaj odbywa się po ciemku, gdyby grzesznik mógł łacniej oszukać przytomnych, wmawiając że gładził koguta, nie dotknąwszy się go nawet.
[16] Chłusić — kłamać.
[17] Tak pranýrna — tak chytrze.
[18] Strásznaj hádkaj — straszną wróżbą.
[19] Dósyć ździékawacca — dosyć pastwić się, głumić się.
[20] Dyj zahałasiła — poczęła wyrzekać, lamentować.
[21] Sialaziéń — właściwy wyraz oznaczający kaczora, najczęściej dzikiego; a że ten ma różnobarwne pióra, lud przeto, pochlebiając komuś, takowego wyrażenia używa.
[22] Kład — skarb.
[23] Dziéwka, która wychodzi za mąż, zazwyczaj musi dużo natkać ręczników i pasów na podarki dla drużb, swatów i innych.
[24] Jak każuć hádki — jak słuchy chodzą.

[25] Pomahalnice i poczynalnice zazwyczaj idą obok niosącej wianek dziewoi, one ją do pana pod ręce podprowadzają. Poczynalnice i pomahalnice mieć powinne wdzięczny i czysty głos i umieć dużo pieśni dożynkowych. I od nich też pan gościńcem, już pomniejszym, winien się wykupić.

[26] Piosnkę tę, dosłownie przezemnie na polski język przetłumaczoną, tu umieszczam.

Zmietliśmy łan miotełeczka,
Idziem do pana z piosneczką;
Wyjdź dobry, łaskawy panie,
Na twoich żniejek spotkanie.
A na dwór ten, dla ochłody,
Wytocz z boczek słodkie miody,
I gęsior wódki nie mały,
By się żniejki pokrzepiały.
Tobie plon z naszych dożynek,
Nam wesoły odpoczynek!

[27] Mikita i Ciahlik są to osoby nie fikcyjne, oni i dzisiaj exystują na Szczerowskim dworze.

[28] Siarpy zazubláli — sierzpy poszczerbili, wytępili.

[29] Choć razpirażysia — zwyczajne przymówienie wieśniaka, gdy chce dać poznać że na uczcie było wszystkiego obficie.

[30] Krutucha — taniec Białoruski, jak u nas miacielica.

## ТЛУМАЧЭННІ ДА АПОВЕСЦІ «ДАЖЫНКІ»

[1] Трасца — ліхаманка; ліхаманку таксама называюць «паганая цётка».

[2] Ачуняла — паправілася.

[3] Коман — аканом.

[4] Жадна — ахвочая, ліпкая да хлопцаў.

[5] Равейніц, равесніц — амаль аднолькавых па ўзросце таварышак, сябровак.

[6] У дварэ з падвальным — пасля ўвядзення акцызы адкупшчыкі пакідаюць на броварах сваіх вартаўнікоў, каб вялі рахунак вёдраў выгнанай гарэлкі; такога вартаўніка называюць падвальным.

[7] Затуманіць — ачмурыць, ашукаць.

[8] Выпучыла вочы — вытрашчыла вочы.

[9] Зіркнуў — кінуў погляд, паглядзеў.

[10] Спалохаўся — спужаўся, збянтэжыўся.

[11] Міргала — падміргвала.

[12] Адчурыла — адпіхнула, адагнала.

[13] Ёмка — дакладна, выразна.

[14] Затушыце — загасіце.

[15] Такая варажба часта сустракаецца ў вёсках. Крылы пеўня пасыпаюць сажай і запіхваюць яго пад рэшата. Потым запэўніваюць непасведчаных, што калі яго там пагладзіць, а быў вінаваты, то певень сапраўды запяе. У такім выпадку сапраўдны вінаўнік палохаецца прадказанай будучыні і не толькі не адважыцца пагладзіць гэты небяспечны прадмет варажбы, але нават не дакранецца да яго; іншыя ж, не адчуваючы сябе вінаватымі, смела робяць гэта, у выніку чаго забруджваюць сажай рукі, у той час як вінаўнік, наадварот, вымае іх чыстымі. Звычайна варажба адбываецца ў цемры, каб вінаваты мог лягчэй ашукаць прысутных, запэўніваючы, што гладзіў пеўня, сам нават не дакрануўшыся да яго.

[16] Хлусіць — ілгаць.

[17] Так пранырна — так хітра.

[18] Страшнай гадкай — страшнай варажбой.

[19] Досыць здзекавацца — досыць глуміцца.

[20] Дый загаласіла — пачала выкрыкваць, лямантаваць.

[21] Селезень — так называюць качара, звычайна дзікага, а паколькі ён мае рознакаляровыя пёркі, таму народ, дагаджаючы некаму, гэты выраз ужывае.

[22] Клад — скарб.

[23] Дзеўка, якая выходзіць замуж, павінна звычайна наткаць шмат ручнікоў і паясоў на падарункі для дружбы і сватоў.

[24] Як кажуць гадкі — як ходзяць чуткі.

[25] Памагальніцы і пачынальніцы звычайна ідуць паабапал дзяўчыны, якая нясе вянок, праводзячы яе пад рукі да пана. Пачынальніцы і памагальніцы павінны мець прывабны і чысты голас, ведаць шмат дажынкавых песень. Ад іх таксама пан павінен адкупіцца гасцінцам, але меншым.

[26] Гэтую песню, дакладна перакладзеную на польскую мову, тут змяшчаем.

Zmietliśmy łan mioteleczką,
Idziem do pana z piosneczką;
Wyjdź dobry, łaskawy panie,
Na twoich żniejek spotkanie.
A na dwór ten, dla ochłody,
Wytocz z boczek słodkie miody,
I gęsior wódki nie mały,
By się żniejki pokrzepiały.
Tobie plon z naszych dożynek,
Nam wesoły odpoczynek!

[27] Мікіта і Цяглік — асобы не выдуманыя, яны і сёння жывуць на Шчароўскім двары.

[28] Сярпы зазублялі — сярпы вышчарбілі, вытупілі.

[29] Хоць расперажыся — звычайнае прыслоўе селяніна, калі хоча даць зразумець, што на частаванні ўсяго было здаволі.

[30] Крутуха — беларускі танец, як у нас «Мяцеліца».

# LUCYNKA[1], CZYLI SZWEDZI NA LITWIE

*Opowiadania historyczne*
*w 4-ch obrazkach*

Jaśnie oświeconemu księciu Stefanowi Lubomirskiemu, Marszałkowi gubernialnemu Mohylewskiemu, w dowód wysokiego poważania, ten błahy utwór ofiaruje

*Autor*

*Jaśnie oświecony książę!*

Gdy nabyłem maluczki mój folwarczek Lucynkę, przy obejrzeniu go, najpierwiej zastanowiła mię w onym miejscowość; — starałem się przeto od starych, zażyłych tu ludzi wybadać, azali takowa nie kryje w sobie jakich historycznych pamiątek — i jednozgodnie mi opowiadano, że tam właśnie egzystował niegdyś przed wiekiem klasztor jezuicki, z przybytkiem bożym, że w czasie najścia Szwedów, za Karola XII, klasztor ten wspólnie z kościołem zamieniono w kupę gruzów; mnichów zaś umęczono za to jedynie, że nie chcieli wskazać miejsca, gdzie skarby kościelne zostały przez nich ukryte — a tak te skarby i dotąd jeszcze w ziemi gdzieś spoczywają.

Wysoce ceniąc wszystkie naszego kraju historyczne pamiątki, zachęciłem się jakoś może na biedę szanownego Czytelnika, z podań takowych nieudolnem mem piórem, usnuć następną powiastkę. A że Przodkowie Księcia przeważnie i zacnie dla dobru kraju działali,

[1] Lucynka — mały folwarczek w Mińskiej gubernii i powiecie położony.

Jemu więc jako godnemu ze wszech miar ich następcy, ośmielam się tę lichą moję ofiarować pracę, zwłaszcza, że w pielgrymce mojej po Białej Rusi, w gościnnej Szczaurów zagrodzie, zacne grono obywateli jednogłośnie mi ukazało w Waszej Książęcej Mości światłego badacza i lubownika narodowych pamiątek. Przymiej więc, Panie, tę ofiarę, jako prawdziwy hołd oddany Jego chwalebnym dążnościom; a stokroć szczęśliwym się policzę, jeżeli ta przez Waszę Książęcą Mość nie zostanie odrzuconą.

*W. M.*

## Prolog

Boże! który rzuciłeś człowieka na ziemię,
Który w życia pielgrzymce szczęście i trosk brzemię
W udział mu przeznaczyłeś, wyganiając z raju,
Czemu miłość gorącą rodzinnego kraju
Wlałeś mu w tęskną duszę? czemu na swej niwie
I swobodnie zamarzy, i żyje szczęśliwie?
Wszakże zimno sybirskie dech tobie zamrozi,
Wszak upal równikowy śmiercią ci zagrozi,
A przenieś na brzeg Tybru kamczadalskie dziecię,
Lub każ Beduinowi żyć gdzieś w obcym świecie,
Obaczysz, że z tęsknoty po rodzinnej skibie,
Każdego z nich niebawem sroga śmierć przydybie.

Wykwintne grody Franków,— raj niebo Romanów,
Wrzącą ci dają miłość dziewice Hiszpanów,
Na chwilkę zajmąć oko Helwetów dziedziny;
Popatrzysz!.. i westchnienie do lubej rodziny
Niechcąco jakoś leci, pierś tobie przytłacza:
Obcyś tam!.. wśród wesołych grasz rolę tułacza! —
O! pięknie na obczyźnie,— szczęsny tam lud boży,
Żyje pomarańczami, a depcze kwiat róży;
Rozkoszny cień tam dają wzniosłych drzew konary,
Wszakże milej w zaciszu, gdzie mój domek stary!
Choć niewidny, choć strzecha mchem czasu upstrzona,
Ależ to chatka własna! jak matka rodzona.

Ot kiedy burze życia horyzont zamroczą,
Ona mię pod swe skrzydła przyjmuje ochoczo,
Bołem nękana dusza szuka w niej spoczynku,
A zimą, w czas zamieci, marzeń przy kominku.
W tej to chatce dziateczki w wierze wychowałem,
Tu rozkosznych chwil życia nieraz używałem!

Domek stoi na górze,— leśne wkoło pleśnie,
Za nim sadek, obfity i w grusze i w trześnie,
Z ganku uderza oko piękny gaj z jedliny,
Na dwoje go rozdziela pas sinej Lucyny,
Rzeczułki choć niewielkiej, lecz w ryby obfitej,
Przy niej wytryska źródło wody smakowitej;
W lewo, rzekłbyś dywanem ściele się zielona
Łąka, gdzie niegdzie brzózką i kwieciem upstrzona,
Za nią z dala zobaczysz dwór niegdyś magnata,—
A w prawo, za jodłowym gajem stara chata
Ubogiego Doliwy, szlacheckiego rodu.
O nich to wam opowiem, com słyszał za młodu,
A również o klasztorze następców Lojoli,
Których dzisiaj uprawiam skibę z bożej woli.

Kiedy badawczem okiem zajrzę do wądołu,
Gdzie niegdyś chwała boża, z klasztorem pospołu,
Pod niebo się wznosiła swojemi wieżyce,
I naukę Chrystusa w dal na okolice
Szeroko rozkrzewiała,— gdy liczę kamienie,
Które murów świątyni wiązały sklepienie,
Kiedy przypadkiem stopa kość ludzką potrąci,
I kilko-wieczny pokój zmarłego zamąci,
Kiedy ciekawe oko zajrzy w te sadzawki,
Co służyły do wygód mnichów,— ich zabawki
Bogate w złotopióre karpie i karasie:
Niechcąco myśl utonie w tym rozkosznym czasie,
W którym zbytek, obfitość znaczyły wiek błogi.
Niestety! dziś kawałek chleba jakże drogi?!
A to duma bogaczy, swawoli bezdroże,
Sprowadziły na głowy nasze gromy boże!!

## Obrazek 1

Drugi już wiek w połowie, jak wieść przekazana
Tradycyą,— za czasów najścia Sudermana,
Niedaleko klasztoru stał dwór okazały
Zamożnego starosty, który pełen chwały,
Od przodków znakomitych wywodził ród pański;
Zwano go, herbu Topór, Stanisław Bohdański.

On — jak bywało niegdyś czynili magnaci —
Nie skąpił darów bożych dla szlacheckiej braci,
Wiele na dworze jego młodzi się chowało,
Wielu mu niezależny byt swój zawdzięczało.
Mężny, cnot — chrześcijańskich, słowem starej daty
Pan! — oddany ludzkości,— nie jak dziś magnaty,
(Nie mówię tu o wszys[t]kich), hodując się w złocie,
Dusze brudzą sobkowstwem, serca kąpią w błocie!

Był wdowcem — i ze związku posiadał jedyny
Skarb w córce, która imię nosiła Lucyny;
Urok, jaki rzucała krasą swą dokoła,
Nieudolne me pióro czy też skreślić zdoła?

Kibić wiotka, toczona,— pomiernej urody,
Barwą życia kwitnęły anielskie jagody,
Oczęta lazurowe miecą błyskawice,
Których rażący ogień łagodzą źrenice,
Ustka, rzekłbyś korale! — gdy błyśnie uśmiechem,
Lub kiedy głos z tych ustek zadrga srebrnem echem,
Niech serce twoje głazem, dusza lodem zionie,
W minucie serce, dusza uczuciem zapłonie!
A dołeczkiż na lica uśmiechem znęcone!
A rączkiż z alabastru, rzekłbyś utoczone!
A szyjkaż jej łabędzia! a stopka dziecinna!
A ten urok w obejściu, swawola niewinna,
Co wdzięki jej podnoszą! — O! umysł mój słaby,
By mógł jej czarujące wysłowić powaby!

Ej! szczęśliwie się wiodło w te dawniejsze lata:
Litwa nasza kwitnęła, cnotami bogata,
Zamożnością, swobodą oddychał kraj cały!
Prawda, nasze prababki modnych ksiąg nie znały;
Wychowane w prostocie, chrześcijańskiej wierze,
Uczyły swoje córki odmawiać pacierze,
Śpiewać pieśni z kantyczek, a czytać żywoty
Świętych Pańskich,— serca zaś ubogacać w cnoty.
W domach zamożnych panów francuzkie madamy
Nie wpajały obczyzny, nie wznosiły tamy
W sercach niewinnych dziatek miłości dla kraju,
Wyszydzać, co jest własne, nie było zwyczaju;
To też dziewki nie znały co Russy, Woltery,
Nie przyjmowały, jak dziś, obcej maniery;
A również francuzczyzną lichą nie paplały,
Lecz mowy Kochanowskich z chlubą używały!

Bo też piękny nasz język! — Ot kiedy lirnicy,
O wdziękach modrookiej litewskiej dziewicy,
Rzewną zanucą piosnkę, w rymowanej mowie,
Aż serce drga z rozkoszy, aż się mąci w głowie
Czytając gładkie wiersze! — Lub gdy bohaterski
Rym ci ucho połechce,— jak naród rycerski,
Któryś tam z wojowników, ot Kiejsztut, Jagiełło
Wiódł do zwycięstw — choć to już dawno przeminęło,
Choć kości ich od wieków spróchniały już w ziemi.
Czytając wszakże zda się, że obcujesz z niemi,—
Na wspomnienie ich czynów pierś mocniej zabije,
Krew zawr[z]e, w duszy męstwo naddziadów ożyje!
No, powiedzcie! nie milszaż nam ojczysta mowa,
W której się wdzięcznie kreśli chluba narodowa?
Ach! czemuż piękna onej z gruntu nie zbadamy?
Dla czego tych nieszczęsnych *partów* używamy?!

Otóż nasza Lucysia, pod domową strzechą,
Wzbogacała serduszko, z rodzica pociechą,
W pokorę, bojaźń bożą, chrześcijańskie cnoty,
Do gospodarki, robot nabrała ochoty.

Bywało, w dzień majowy, zbudzona jutrzenka,
Gdy wesołym promieniem zajrzy do okienka,
Wnet ochocza dziewczyna z łóżeczka się zrywa,
I domową czeladkę do modlitwy wzywa,
Tuż do ojczyka bieży, na dobry dzień żywo
Każe mu nieść polewkę lub też grzane piwo,
By pożywnem śniadaniem zasilić starego:
Bo też w dawniejszych czasach przysmaku chińskiego,
Ani palonych ziaren tureckich nie znali,
Choć często z Bisurmanem w polu się rąbali.

Gdy starosta ochoczo do jadła zasiada,
Ona srebrzystym głoskiem przed nim się spowiada
Z gospodarczych swych planów: — ot na jakiej grzędzie
Ma zasadzić rozsadę,— gdzie też groch siać będzie;
Tuż figlarnie się łasi, oczęta nań wznosi,
I pieszczonym swym głoskiem słodko, czule prosi,
By dozwolił bułanką pohasać spacerem.
Stary z początku gdera, stawi się kozerem,
Jednak zręcznie pieszczota tak go udobrucha,
Że w końcu starowina nie chcący jej słucha.

Zjednawszy pozwolenie dobrego rodzica,
Dziewczę uradowane, szczęściem krasząc lica,
Biegnie z piosenką w ustach zajrzeć do stodoły:
Czy pilnie gospodarcze dojrzano żywioły?
Czy też dokładnie ojca rozkazy spełnione?
Później śpieszy odwiedzić ptastwo ulubione;
A pomnąc na przysłowie, które tak nas uczy,
Że pańskie oko konia najlepiej utuczy,
Choć starosta niemało wiernych sług posiada,
Ona wszystkiem zarządza, wszędzie dojrzeć rada.
Później wraca do domu; — tam stoi u ganka,
Na rozkazy swej pani, swawolna bułanka,
Przy niej stary koniuszy, szlachetny Doliwa,
Ochoczą do wyścigów panienkę wyzywa.

Mój Boże wszechmogący! gdzie też się podziały
Czasy patryarchalne? gdy magnat wspaniały
Jednał swych domowników szacunek prawdziwy,
Tak, że każdy z swym panem złączony ogniwy
Zobopólnej przyjaźni, nie skąpił żywota
Dla dobrego magnata,— nigdy też sromota
Niewdzięczności, w cnotliwych sercach nie powstała,
Chlubą dla domowników była panów chwała;
Często od dziecka sługa na dworze poczciwy,
Miał na starość kęs chleba, albo skibę niwy.

Nasz staruszek Doliwa, chociaż mu siwizna
Na skroni śnieżnej barwy, choć niejedna blizna
W interesie magnata doszła mu w udziale,
Choć go pan wynagrodził na starość wspaniale,
Gdy wierne służby uczcił szlachecką zagrodą;
Ale on, napojony staroświecką modą,
Chciał na dwornych usługach kresu swego dożyć,
Tamże steraną trudem, wiekiem głowę złożyć.
Na grzędzie darowanej rodzinę osadził,
Syna oddał do szkoły,— w gospodarce radził
Pracowitej małżonce,— a w służbach gorliwy,
Pędzał ospałą czeladź staruszek poczciwy.

Otóż dziewczę do jazdy żywo się sposobi,
I zgrabnym gorsecikiem wiotką kibić zdobi,
Tuż dosiada bułanki,— i hajże w zapasy
Z poczciwym starowiną! — okoliczne lasy,
Błonia w minucie zwiedza dziewczyna swawolna.
Stary, w trop lecąc, gderze: z wolna, panno! z wolna!

Raz spacerem rumaków gdy dobrze zhasali,
Przed zagrodą Doliwy na chwilkę przystali.
Ten, pragnąc coś zalecić domowej czeladzi,
Chwilowy odpoczynek panience doradzi,
Zaprasza ją pod strzechę na szklaneczkę mleka,
Dowodzi, że z otwartem objęciem tam czeka
Piastunka lat dziecinnych, pani koniuszyna.

Z razu zda się przystawać, ale wiatr dziewczyna,
Natychmiast w pustej główce tworząc inne plany,
Odpowie srebrnym gloskiem: — «Doliwo kochany!
Zajdź do domu,— ja tutaj pod lipą usiędę,
I w rozkosznym jej cieniu dumać sobie będę».—

Niepewny co ma począć staruszek,— lecz w chwili
Dziewczę go uspokaja, słodko się przymili,
Przyrzeka mu roztropność, wymową porusza,
I do zwiedzenia domku starowinę zmusza.

Ledwo też się pozbyła nużącej opieki,
Już wzrokiem pożądliwym sięga w las daleki;
W minucie plan stworzony — i w przystępie szału,
Bodźcem rączego konia zmusza do zapału.

Nie tak leci Beduin na arabskim koniu,
Gdy pędzi za zdobyczą po stepowem błoniu,
I sokół też na czaplę nie tak chyżo wpada,
Jak dziewica na wyścig z wiatrami iść rada.

Ledwo dopadła lasu, już kresu dobiega,
Już z dala i wieżyce klasztorne postrzega.

Wtem z lesistej gęstwiny wypada spłoszony
Калі набыў я маленькі мой фальварчык Люцынку, пры аглядзе яго зацікавіла мяне найперш мясцовасць, дзеля гэтага стараўся я ад старых людзей, якія здаўна тут жывуць, дапытацца, ці не мае яна якіх гістарычных паданняў,— і амаль у адзін голас мне расказвалі, што тут менавіта знаходзіўся калісьці, у старажытныя часы, езуіцкі кляштар з храмам Божым і што ў час нашэсця шведаў, за Карлам XII, кляштар гэты разам з касцёлам ператвораны быў у груд друзу, а манахі былі замучаны адзіна за тое, што не хацелі паказаць месца, дзе імі былі схаваны касцёльныя скарбы,— і так тыя скарбы і да гэтага часу яшчэ знаходзяцца недзе ў зямлі.

Дужа шануючы ўсялякія гістарычныя паданні пра наш край, заахвоціўся я, можа, на бяду шаноўнага чытача, з паданняў гэтых саснаваць няздольным маім пяром наступную маленькую аповесць. А таму, што продкі Князя сумленна і шчыра дабро краю рабілі, яму, менавіта як годнаму па ўсяе меры іхняму наступніку, адважваюся прысвяціць гэту слабую маю працу, тым болей што ў вандроўцы маёй па Белай Русі ў гасцінным маёнтку Шчаўраў шаноўнае кола гаспадароў аднагалосна паказала на Вашу Княжацкую Мосць як на светлага знаўцу і аматара народных паданняў. Прыміце ж, пане, гэта прысвячэнне як належную даніну Вашым пахвалы вартым імкненням; а я стакроць палічу сябе шчаслівым, калі яно не будзе адхілена Вашай Княжацкай Мосцю.

*В. М.*

---

[1] Люцынка — малы фальварчык у Менскай губерні і павеце.

## Пралог

Божа наш! Ты шыбнуў на зямлю чалавека,
І няшчасця бярэма, і шчасця адвеку
Ты прызначыў яму, выганяючы з раю,—
Як жа ў смутак душы яго любасць да краю
Ты уліў? І чаму ён ля роднае нівы
Адчувае і вольным сябе, і шчаслівым?
У Сібіры мароз табе дух зацінае,
Подых тропікаў смерцю табе пагражае,
А на Тыбр перакінь камчадальскія дзеці,
Жыць прымусь бедуіна на чужыне у свеце —
І пабачыш, што ў смутку па маці-радзіме
Іх усіх злая смерць неўзабаве абдыме.

Гарады-цуд у франкаў, рай-неба ў раманцаў,
Вір пачуццяў, каханне — ў краіне іспанцаў,
Вабіць вока Швейцарыя (праўда, хвіліну),
Паглядзіш!.. і міжвольна згадаеш айчыну.
Уздыхнеш, а на сэрцы так цяжка! Так сумна!
Ты ж чужы на іх свяце, дзе весела, шумна.
На чужыне так добра! Люд шчасны і дужы —
Апельсіны ён мае, і топча ён ружы,
Цень даюць, прахалоду дрэў стромкіх галіны,
Ды мілейшы парог мне старэнькай хаціны.
Незайздросная хата: дах — лата на лаце,
Ды затое свая, нібы родная маці.
Калі хмара жыцця далягляд захінае,
Дык хаціна ахвотна бадзягу прымае,
Боль душы супакоіць, утаймуе ў спачынку...
А зімой добра мары снаваць ля камінку.
Дзетак я ўзгадаваў пад страхою хаціны,
Тут цудоўныя часта я ведаў хвіліны.
Дом стаіць на пагорку — лес вокал, алешнік,
Сад за домам, а ў садзе — ігрушы, чарэшні.
З ганка ступіш і бачыш — лес воддаль, яліны...
Дзеліць лес напалам стужка сіняй Люцыны...

Невялічкая рэчка, ды рыбы ў ёй поўна,
А пры рэчцы — крыніца з вадою цудоўнай.
Злева, быццам дыван, луг стракаты квітнее,
А на лузе бярозка там-сям зелянее;
Яшчэ далей відаць двор вялікі магната,
А за гаем направа — старэнькая хата,
Дзе жыў бедны Даліва, шляхецкага роду,
Вось аб ім і расказ мой, што сам чуў змалоду,
Раскажу і пра кляштар нашчадкаў Лаёлы;
Я ўладаю цяпер іх зямлёй з Божай волі.

Калі з роздумам цяжкім я гляну ў прасторы,
Дзе калісь хвалу Богу спявалі ў кляшторы,
Дзе ў нябёсы ўздымаліся стромкія вежы,
Дзе вучэнне Хрыста ў навакольныя межы
Прасякала, жыло... калі ўбачу каменне,
Што святыні муры літавала ў скляпенне,
Калі часам ступня косці людскія рушыць
І памершага вечны спакой тым парушыць,
Калі вока цікаўнага гляне ў дно става,
Што манахам служыў для выгод і забаваў,
Дзе і карп залаты, і чырвоны карасік,
Патане думка нехаць ў дзівосным тым часе,
Калі злішак ва ўсім быў, жылося як трэба,
Ці не так! А цяпер — не хапае і хлеба.
Гэта пыха магнатаў, свавольства без краю,
Вінаваты, што гром нас нябесны карае.

## Абразок 1

Век другі ўжо бытуе у нас без спадмана
Праўда-быль аб нашэсці ліхім Зюдэрмана.
Ля кляштара стаяў двор-маёнтак цудоўны,
Двор старосты-магната, што пыхі быў поўны;
Знакаміты шляхецкі быў род яго панскі,
Меў у гербе тапор, званць Станіслаў Багданскі.

Як калісьці вялося даўней у магнатаў,
Меў заўсёды пашану да шляхціца-брата.

У двары яго моладзь прымалі так міла,
Пану моладзь удзячная шчыра служыла.
Дабрадзейны і мужны стары быў, багаты;
Пан — адданы людзям, не як сёння магнаты;
Не пра ўсіх я кажу, а пра тых, што, у злоце
Жывучы, мыюць душы свае у балоце.

Удавец быў, ад жонкі застаўся адзіны
Скарб — дачка. Хто з тутэйшых не ведаў Люцыны!
Так уразіць магла прыгажосцю наўкольных,
Што пяром апісаць я ўсё гэта не здольны.

Гнуткі стан яе кволы, такі чараўнічы!
Бы ў анёлачка, тонкія рысы аблічча,
Вочы нібы блакіт, і у ім — бліскавіцы,
Іх агонь упрыгожвае панны зраніцы;
Вусны нібы каралі, як выбухнуць смехам
Ці як голас раскоціцца срэбраным рэхам,
Хай як лёд тваё сэрца, як камень, нямее,
Усё роўна ў хвіліну яно ўспалымнее!
А ружовыя шчокі, што гэтак прынадны!
Алебастр яе рук, нібы точаных, ладных,
Лебядзіная шыя, дзіцячыя ножкі!
А бяскрыўдныя жарты, свавольныя трошкі!
Не, ніяк я не ў стане, бракуе мне сілы
Перадаць яе вобраз, прыгожы і мілы!

Ой, шчасліва вялося ў былыя часіны —
На Літве жыў народ, ды такі дабрачынны!
Край быў вольны, заможны — жылі, не ўздыхалі,
Праўда, нашы прабабкі кніг модных не зналі,
Вера ў Бога была выхавання асновай,
Навучалі дзяцей сваіх Божаму слову,
Навучалі малітвы спяваць па кантычках,
Пра жыццё ўсіх святых пачытаць мелі звычку.

У дамах у заможных мусье і мадамы
Не вучылі дзяцей, каб чужымі вачамі
Паглядалі на свет, і нялюбасць да краю
Прышчапляць у той час шчэ не мелі звычаю;
І дзяўчаты не зналі Русо і Вальтэраў,
Не прымалі, як сёння, чужацкіх манераў
І французскае мовы таксама не зналі,
Каханоўскага мову яны ужывалі.

Мова родная! — часам як лірнік наш слынны
Песню аб сінявокай літоўскай дзяўчыне
Распачне мілагучна... Ну, як не здзівіцца!
Як жа сэрцу ў грудзях нашых моцна не біцца!
Верш чытаеш — і быццам бы Рым гераічны
Паўстае у вачах,— люд да подзвігаў звычны,
Што змагаўся ў Кейстута часы і Ягелы
І што перамагаў. Быль даўно ўжо сатлела,
Косці іх спарахнелі ў зямлі, але з імі,
Верш чытаючы, стрэнешся нібы з жывымі.
Прыгадаеш іх справы — на сэрцы салодка,
Кроў бурліць, ажывае ў табе мужнасць продкаў.
Не мілей хіба нам наша родная мова,
Дзе падкрэслена слава народу праз слова?
Прыгажосці яе мы часамі не знаем
І таму чужаземную мову ўжываем.

Гэтак наша Люцынка у доме старосты
На бацькоўскую ўцеху жыла сабе проста:
Паслухмянасць, страх Божы, да працы ахвота,
Гаспадарчыя справы... заўсёды работа.
Днём, бывала, маёвым з зарой яна ўстане,
Калі першы прамень у акенца загляне,
Ледзьве з ложка, а ўжо клапатліва гукае —
На малітву дамовую чэлядзь склікае.
А пасля «з добрым раннем» да бацькі мкне жыва,
Загадае падаць яму подліўку, піва,
Каб старэнькаму бацьку прыдаць болей сілы,
А тых зёлак кітайскіх, што ў час наш так мілы,

Ды турэцкага зерня тады і не зналі,
Хоць бацькі басурманаў у бойках знішчалі.

Пан староста ахвотна за ежу сядае,
А яна срэбным голасам распачынае
Пра сваю гаспадарку: дзе, колькі на грады
Зноў пасее гароху, пасадзіць расады;
А то раптам падласціцца, вочкі узносіць
І пяшчотным сваім галаском чула просіць,
Каб буланку на шпацыр дазволіў запрэгчы;
І стары пабурчыць для пачатку, пакрэкча
І дазволіць, бо як ёй, дачцэ, не дазволіць,
Калі так падступае лагодна і моліць?

Атрымаўшы дазвол ад старога, дзяўчына
З тварам, светлым ад радасці, тою ж хвілінай
Са шчасліваю песняй бяжыць да стадолы
Паглядзець, ці дагледжана добра жывёла?
Ці выконваюць бацькаў загад там дакладна?
Потым ёй сваё птаства адведаць прынадна,
Памятаючы мудрасць, што кожны з нас знае:
«Конь ад панскага вока сыцейшым бывае».
Хоць староста багата адданых слуг мае,
Тут яна ўсім кіруе і ўладу трымае.
Павяртае дадому, і там, каля ганка,
Сустракае Люцынку ірзаннем буланка.
А пры ёй і канюшы, шляхетны Даліва,
Той, што волю паненкі выконваў імкліва.
Божа мой ўсёмагутны! Падумаць не можна,
Што мінуў ужо час, калі яснавяльможны
Пан заўжды бацькам быў сваёй чэлядзі дворнай
(Але й чэлядзь была свайму пану пакорнай),
Што жылі яны так, ва ўзаемнай пашане,
Што за пана прымалі і смерць без вагання.
Несумленных, няўдзячных было небагата,
Была славай для чэлядзі ласка магната.
А слуга, што служыў свайму пану пачціва,
Меў пад старасць куток і кавалачак нівы.

Наш старэнькі Даліва, хаця ў яго скроні
Сівізны белым снегам абсыпаны сёння,
Хоць меў шрам не адзін за інтэрас магната,
Хоць яго надзяліў пан пад старасць багата
За сумленнае службы гады ўзнагародай,
Ды трымаючыся старасвецкае моды,
Ён, Даліва, хацеў век дажыць свой у пана
У двары, дзе служыў яму верна, аддана.
На зямліцы ж клінок, панам падараваны,
Жонку ён пасадзіў — сын у школу адданы,
Наязджаў да сям'і для парад для руплівых;
А ў двары падганяў гультаёў і санлівых.

А тым часам дзяўчо на буланку сядае,
У кабаціку зграбным, што стан аздабляе;
Села, коніка гоніць — гайда ў лес далёкі;
А шаноўны Даліва — за ёю ўслед крокам.
Дала шпоры каню і імчыцца свавольна,
Даганяе Даліва, крычыць ёй: «Павольна!»

Вось аднойчы, калі ўжо шмат вёрстаў згайсалі,
Ля сядзібы Далівы на момант прысталі,
І стары, пажадаўшы зайсці у хаціну,
Адпачыць тут паненцы параіў хвіліну.
Запрашае зайсці, малака выпіць шклянку,
А тым часам накормяць, напояць буланку.
А як рады ёй будуць! Сказаць немагчыма!
Пагадзілася быццам, ды вецер-дзяўчына,
Ў галаве яе сёння інакшыя планы,
Срэбным голасам кажа: «Даліва каханы!
Ты зайдзі сабе ў дом, я ж пад ліпай пабуду
І ў цянёчку яе разважаць-думаць буду!»

Ён не пэвен, як быць, паглядае пахіла,
А яна супакойвае ласкава, міла,
Быць слухмянай, разумнай яму абяцае
І старога наведаць свой дом прымушае.
Ледзь пазбылася толькі апекі старога,

Як адразу ж сабралася хутка ў дарогу,—
Яна план свой выконвае ў хвілю, з запалам,
Шпоры ў бок — паімчалася ўперад учвалам.

Бедуін на кані, што да бегу прывычны,
Не імчыцца так хутка ў стэпах за здабычай,
Ды і сокал на чаплю не так хутка рыне,
Як з вятрамі у спрэчках імчыцца Люцына.
Ледзь да лесу дапала, след далей ўжо значыць
І кляшторныя вежы здалёку ўжо бачыць.

Ад ляснога гушчару ляціць ашалелы
Воўк раз'юшаны; конь задрыжэў анямелы.
Бліскавіцам падобныя воўчыя вочы,
На дзяўчыну ашчэрыўся, вось зараз скочыць.

Задрыжэў добры конь, заірзаў у трывозе,
Скочыў раптам убок і ўжо не па дарозе —
Куды вочы — уперад імчыцца стралою.
І дарэмна дзяўчо анямелай рукою
Напінае паводдзе, і плача, і кліча...
Ледзь жывая ад страху, збялела аблічча,
Пот халодны — цурком, засцілае мрок вочы,
І змярцвела, калі конь нарэшце прыскочыў
Да ўзбярэжжа успененай рэчкі Люцыны.
Мусіць, смерць пакарае свавольства дзяўчыны!
Але дужай рукою зусім нечакана
Быў на беразе стромкім скакун сутрыманы.
То прыгожы юнак, тып сапраўдны літвіна —
Сакаліны пагляд і сабой малайчына —
Грудзі мужныя, моцныя, воласам русы,
Пурпуровыя вусны, над вуснамі вусы
Лёгкім пухам адзначаны, сінія вочы,
Як нябёсы вясной, а пагляд іх — дзявочы,
Рукі дужыя... дужасцю рук тых ягоных
І стрыманы скакун быў у лёце шалёным.

Ён дзяўчыну кладзе на траву асцярожна
І адзнакаў жыцця ў ёй шукае трывожна.

А пасля да ракі ўлёт кідаецца хлопец.
І, прынёсшы вады, ён чало яе кропіць.
Нават маці не болей дзіцёнку аддана,
Як юнак той дзяўчаці, ім уратаванай.
І расплюшчыла хутка павекі дзяўчына
І навокал глядзіць у здзіўленні. Ўспаміны —
Нібы рой мітуслівы. Здарэнне... няшчасце...
Але выратаванне ёй праўды не засціць:
Як жа блізка ад жарцікаў да небяспекі?
І сябе пакарала б і бацьку навекі.
Вочы засціць сляза. На хлапца паглядае,
Да збавіцеля рукі свае прасцірае,
Каб паціснуць далонь, што бяду адхіліла
Ад яе галавы. Цудадзейная сіла
У паглядзе і ў поціску рук захавана —
Хлопец нема стаіць, нібы зачараваны:

Першы раз яго сэрца так моцна забіла,
Першы раз пачуццё аб сабе заявіла
Незнаёмае. Водбліскам кволым, чырвоным
Пачуццё на абліччы ірдзела ягоным.
І юнак, што без страху мог з ворагам біцца,
Перад слабай дзяўчынкаю мусіў скарыцца.

І свавольніца ў момант адзін разгадала,
Што юначай душою яна заўладала,
Што любуецца ён яе анельскім тварам;
Хоць ёй сорамна, хоць палымнее пажарам,
Хоць вышэй і вышэй уздымаюцца грудзі,
Пачуццё юнака яна ўсё-такі будзіць
Кволым смехам, вачмі... вочы дзеўчына мружыць —
Штохвіліну мацней галаву яму кружыць.

«Дык каму ж я жыццём вінавата? — пытае.—
Як жа бацька мой шчыра яго прывітае,
Ратавальніка любай дачушкі адзінай,
Што прыйшоў з дапамогаю светлай хвілінай;
Каб не ён, смерць даўно б ніць жыцця абарвала,

А ці ж лёгка памерці, як жыў гэтак мала?
Не адмовіцца пан сёння ў дом наш заехаць?
Мне і бацьку было б гэта радасцю, ўцехай».

Тут дзяўчыне юнак адказаў з захапленнем:
«І жыццё я аддаў бы у гэта імгненне
За адзіны твой позірк. Не трэба падзякі,
Што зрабіў я сягоння, зрабіў бы і ўсякі;
Сорам мне, чырванею, якая патрэба
Гэтак дзякаваць? Крыўдна мне нават, не трэба...»

Як бы далей быць іхняй размове і справе,
Я не ведаю, але прыбег неўзабаве
Наш шаноўны Даліва; пот з твару сцякае,
Ён здалёку у роспачы нема гукае;
За канём бег услед у шалёнай пагоні,
Праляцеў, як страла, па люцынскім загоне
І да берага рэчкі дапаў, спалатнелы,
У здзіўленні спыніўся, нібы анямелы.
Бачыць тут сваю ўтрату. У стане спакойным
З юнаком размаўляе дародным, прыстойным.
І не ў стане сабраць свае думкі, сурова
Да хлапца ён звяртаецца, хмурачы бровы:

«Ну, а што ж ты, васпане, тут робіш на хвілі?
А ці гэткай маралі айцы вас вучылі?
Як! Я думаў, сядзіць над лацінай ды вучыць
Ці з айцом мой васпане рыторыку мучыць,
А ён тут ля паненкі час бавіць, нябога;
Не дастаць, сысунок, табе гэтых парогаў,
Не на тое айцам даў я сына ў навукі,
Каб ён там вывучаў непатрэбныя штукі».

Смех дзяўчыны спыняе папрокі старога,
І праз смех той бянтэжыцца хлопец-нябога,
Але, долу упяўшы свой зрок сарамлівы
І далонь паціскаючы моцна Далівы,

Пра здарэнне няшчаснае апавядае
І учынак хлапца да нябёс выхваляе.

Пасвятлела чало у старога Далівы,
Слёзы шчасця сплываюць на вус яго сівы,
Вочы ўзняўшы ўгару, памаўчаўшы хвіліну,
Ён, расчулены, квола гаворыць да сына:
«Мусіць, чула малітву бацькоўскую неба,
Што ў хвіліну, калі ў абароне патрэба
Тут была, прывяло яно сына для тога,
Каб зняславу і ганьбу зняць з бацькі старога.
Бо мяне аж да смерці б сумленне карала,
Што даручаны скарб пільнаваў так нядбала.
Пад шчаслівай, відаць, нарадзіўся ты зоркай,
Калі бацьку адвёў ад нядолі ад горкай».

Тут, расчулены моцна, ён змоўк на хвіліну,
Да грудзей сваіх кволых прыціснуўшы сына.
Схамянуўся, згадаў ён дзяўчыне рупліва,
Што дзесь бацька чакае яе нецярпліва.
І хлапцу падарыўшы пагляд палымяны,
Дзяўчо едзе ў задуме дамоў паслухмяна.

## Абразок 2

На дзядзінцы ў старосты рух і гоман жвавы.
Так здаўна тут вялося: дзе моладзь — забавы.
Малайцы пруць сцяной — шэраг валіць на шэраг,
Тут ляцяць іскры з меча, а тут — свіст сякеры,
Вось адна і другая за ёй — праляцелі
І, глядзі, ўжо тырчаць у сярэдзіне цэлі.
Там імчацца на конях, аж ззяюць падковы,
І, як макаўкі, сыплюцца доле галовы
З балваноў басурманскіх пад шабляю лоўкай,
Тут спрабуюць ружжо, там заняты вінтоўкай.
І ўсё робіцца спрытна, і лёгка даецца.

Калі ж хто да працiўніка моцна даткнецца,
Наракаць і не важся дый твару не зморшчы,
Бо «няўклюга» мянушку дадуць або горш шчэ.
Юнакам на карысць пойдзе гэта забава.
Моц краіны у ёй і народная слава.

Як жа моладзь сягоння час бавіць? Для ласкі
Мне скажыце, якія ў яе абавязкі?
Скрозь у модзе вялікай цяпер прэферансы,
Толькі й чуеш скрозь — злосныя плёткі, рамансы;
Ці юнак на кані сёння ў полі гайсае?
Шабля ў доме ўжо цуд, хто яе прыпасае?
Ці ж падойдзе яна, ну хоць, скажам, да фрака?
Не, то тых, хто кунтуш носіць, шабля адзнака.

Слугі з дому на ганак прынеслі тапчанік,
Сеў староста на ім у багатым убранні.
Кожны доказ адвагі страчае зычліва —
Вус пакруціць сівы і ўсміхнецца шчасліва.
Хто ж няздольнасць, нязграбнасць пакажа тут часам,
З нешчасліўца смяецца ён з іншымі разам.
І сардэчнасць і праўда ў старога на твары,
Не ляжыць на ім цень думы — чорнае хмары.
Нібы ў чыстай вадзе, на ім адлюстравана
Да самога сябе і да іншых пашана.

Побач бацькі сядзіць і ўздыхае Люцына.
Задуменная сёння чамусьці дзяўчына!
Ані рыцараў гульні, ні смех сярод шуму
Не зганяюць з чала яе цяжкую думу.
Часта кідае позірк за цёмныя межы
Стужкі лесу, туды, дзе касцельныя вежы,
Нібы сонца праменні, з-за хмары святлеюць;
Зноў зірнула, і вочы яе весялеюць,
Хваляванiя румянец шчаку яе значыць,
І нібы расцвітае — двух рыцараў бачыць,
Што сцяжынаю вузкаю едуць па гонях
І кіруюць у двор іх на ўзмыленых конях.

Вось ужо каля брамы... даехалі, годзе.
Вось да срэбнага кольца мацуюць паводдзе...
А пасля, свой убор апраўляючы просты,
Прывітацца з пашанай ідуць да старосты.

Малады — сын Далівы, нам малавядомы,
А стары — сам Даліва, наш добры знаёмы.
Ён з пашанай магнатаву выканаў волю
І прывёз сюды сына, каб даць яму долю.

«Шчыра дзякуй, юнак, што ўзяць маеш ахвоту
У двары маім бацькаву службу-работу.
Больш паўвека стары пад маёю рукою
Працаваў і цяпер пажадаў супакою.
Быў ён прыяцель мне ў злой і добрае долі,
Не адну лыжку супу з ім з'елі, груд солі
Не адзін спажылі мы ў ваенных паходах,
Адчувалі не раз на сабе смерці подых.
Ўратаваў ты дзіцятка маё дарагое,
Так і ён выратоўваў мяне ў часе бою.
Дык каму ж паспрыяю цяпер, калі надта
Засталося гадзін мне жыцця небагата?
Хто ж заменіць яго, калі гэта мажліва?
Сын заменіць яго, сын старога Далівы».

Так сумленнае сэрца старосты казала,
А на твары па зморшчках слязіна спаўзала,
Наш Даліва з тых слоў у цяжкім утрапенні
Перад панам у плачы згінае калені.
На дзяўчо ж каб хто кінуў пагляд раптам быстры,—
У вачах яе, пэўна, пабачыў бы іскры,
Пачуццё яе грудзі высока ўздымала,
У душы яе бура, відаць, бушавала.
Выцер слёзы староста, няўзнакі, вядома,
З кола слуг кліча ён да сябе мажардома:

«Гэй! Прашу, пан Анзгары, сюды на хвіліну!
Непрыемную маю сказаць я навіну:

Зажадаў наш Даліва стары адпачынку,
Хоча век свой дажыць ён пры цёплым камінку,
Каля Ганны сваёй, бач, утулку шукае —
Доўгі час з гэтай справаю мне дакучае,
Паляжаць, бачыш, хоча ва ўласным бярлогу
Ды маліцца і псалмы спяваць Пану Богу.
Аднак ён пра дабро маё дбае руплі́ва —
Сына замест сябе прапануе Даліва.
Хай жа стайня, а разам і ўсе мае цугі
Пад апекаю будуць яго. Мае ж слугі
Хай таварыша ў ім свайго добрага маюць,
Хай, як бацьку калісьці, яго паважаюць;
Бо ён варт таго, хлопец. Усім вам вядомы
Дабрародны і рыцарскі ўчынак ягоны».

«Ваша воля, вяльможны, як пан сабе зыча,
Толькі з даўніх часоў, пане, ёсць у нас звычай,
Калі новенькі хоча служыць разам з намі,
Хай экзамен здае перад таварышамі.
А ці шабляй дакладна валодаць умее?
Ці каня даглядаць як належыць здалее?
А ці трапна б'е ў цэль...»

«А чаму ж? Гэта — можна.
Па крыві ж ён — Даліва, мой пане вяльможны!
Сам вучыў сына рыцарскай справе я дбайна;
Хай вядуць гайдукі зараз з панскае стайні
Скакуна, што калісь ад татарына Гана
Прывялі ў падарунак для яснага пана.
Дзікі ён, выхаванец пустыні свавольны,
І ніхто на ім ездзіць дагэтуль не здольны.
Хай жа сын таго звера нам зробіць рахманым,
Каб не быў бескарысным адгэтуль для пана!»

Пан згадзіўся, ударыў Даліва ў далоні,
І хлапцы-гайдукі, што выходжваюць коні,
Скакуна перад ганак выводзяць. Ён быстры
І раз'ятраны — звер! — з-пад капыт яго — іскры;

Ён, разгневаны, косіць шалёнае вока,
Ён жалеза грызе, пыршча пенай навокал.

А юнак аж гарыць... неўгамонны, рухавы,
Кунтуша ён на плечы закінуў рукавы,
Срэбны пояс свой сціснуў, стаіць, пазірае,
Перад панам схіліўся — і ўжо ля каня ён!
Яго сэрца нібыта чагосьці чакала,
І юначае сэрца раптоўна зайграла,
Калі стрэў яе позірк. Юначая кемнасць
Адгадала у ім пачуцця узаемнасць.
І заззялі умомант арліныя вочы.
Не даткнуўшыся стрэмя, ў сядло ён ускочыў.

Сын пустыні здзівіўся: яздок быў гарэза.
Конь хацеў, каб як цугляў разгрызці жалеза.
Міг які, і здавалася, коннік наш бразне,
Як цяжар кайданоў з ног закутага вязня.
Выпінаецца конь, то стаіць як урыты,
А юнак нерухома сядзіць нібы ўліты,
Толькі канфедэратку часамі паправіць
Ды трымае паводдзе, аж пена крывавіць.

Зразумеўшы, што конніку рады не дасць ён,
Конь апошні фартэль свой спрабуе на шчасце:
Колькі сілы ў ім ёсць, да зямлі прысядае
І за браму, як з лука страла, вылятае.

Сполах сціснуў ёй грудзі, пагляд анямелы,
Пакаціліся слёзы на твар пабялелы;
Усміхнуцца б і рада са шчырай надзеяй,
Ды пакута на вуснах яе халадзее.
І не толькі яна, ўсё наўкол анямела,
Грамада паглядае за браму нясмела.
Цішыня скрозь пануе, нібы ў дамавіне,
Хіба часам Даліва слоў некалькі кіне —
У халодных вачах веры ў сына багата,—
Пасміхаецца ў вусы крадком, хітравата.

Чвэрць гадзіны мінула, і ўбачылі — быццам
Воддаль шэрае воблака пылу курыцца.
На кані ў белым мыле юнак наш шыбуе
І да ганка рахманага звера кіруе.
Ля дзяўчыны спыніўся, схіліўся нясмела,
І агульнае — брава! — наўкол загрымела.
А якая ж вясёласць на тварах заззяла,
Калі ён праімчаўся дзядзінцам удала
І калі на скаку стрэліў трапна па цэлі —
Крыкі, воплескаў гром, нібы ўсе ашалелі.

Стан дзявочай душы перадаць вам дакладна
Не бяруся, бо кожнаму будзе прынадна
Адгадаць: як, чаму і з якое прычыны
Чырвань шчок, звонкі голас і смех у дзяўчыны?
Калі ж бацька яе раптам хлопца паклікаў,
І абняў юнака ў знак пашаны вялікай,
І сказаў, як ён рады, без меж і без краю,
Што двор рыцара гэткага добрага мае,
Дык яна, калі б гэта было толькі можна,
Пачуццё б спавядала сваё перад кожным.

Але вось мажардом падыходзіць да пана,
Б'е паклон і гаворыць для ўсіх нечакана:
«Добры рыцар, дапраўды, але ж можа стацца,
Што не ўсе яшчэ ведае кшталты мастацтва!
Ці валодае шабляй? Хай спробай астатняй
Давядзе, ваша мосць. Хай з далонню ён братняй
І скрыжуе лязо. Дык няхай прыракае
І каго лічыць вартым — на бой выклікае».

«Добра, згода, няхай так і будзе, мой пане,
Не баіцца Далівы кроў выпрабавання.
Паканаць можа ўсё ён, ды сам абяру я
Супраціўніка сыну, няхай пан даруе,
Можа біцца з любым ён байцом самым шчырым,
Хоць бы з ротмістрам, панам маім Казімірам».

Але трэба вам знаць таго ротмістра Шчуку —
Быў рубака ой-ёй! Фехтавання навуку
Гэтак ведаў, як ведаем пацеры ўсе мы.
Ён трымаў першынство ў коле шляхты на сеймах,
Землякі — хто шануе, хто зайздрасць затоіць,
А як з ворагам б'ецца — ніхто з іх не ўстоіць.
Гартаваную шаблю яго добра зналі,
Шаблю ворагі нават касою празвалі.
Ой, пасек тою шабляй татараў паганых!
Ой, дрыжэлі ад бляску яе басурманы!
Ледзь махне ротмістр шабляй, глядзіш — вораг гіне
Або з поля, як статак спалоханы, рыне.

Вось з натоўпу пан Шчука ідзе задумёны,
З хлапчуком нейкім біцца — не ў гонар ягоны.
Зухаватасць хлапца яго вельмі здзіўляе,
Ён за дзёрзкасць узорна яго пакарае.
«Да ста бомбаў, гранатаў, ты малакасосе!
Сцеражыся, бо ўраз атрымаеш па носе!
Ты занадта разумны, занадта ўжо смелы,
Будзеш ведаць, што значыць баец пасівелы!»

«А хіба я на шаблі сам выклікаў пана? —
Адказаў хлопец ротмістру усхвалявана.—
Дзіва мне, што пан ротмістр такі нестрыманы;
То быў бацькаў загад, а я бацьку слухмяны!
Пахвальбу добры рыцар заўсёды мінае,
Я да бою гатовы, хай пан пачынае».

І абодва байцы у запале тым часам,
Не чакаючы болей, сышліся сам-насам.
Першы біўся за гонар — праціўнік ёсць вораг,
Юнака ён наважыўся сцерці на порах.
Другі мужным хацеў быць, згадаўшы каханне,
Веру бацькі старога, яго спадзяванне.
Гледачы не ў сабе — бой зацяты, бядовы,
Ашалелі байцы, аж курацца галовы.

Бачыць ротмістр: не лёгкаю будзе расправа
І яго праз гады ўсім вядомая слава
Пацямнее, пагасне і будзе ў загане —
Ашалелы, падвойвае ён намаганне.
Бачна ўсім, то не жарт — бой сапраўдны, імклівы.
А дзяўчо непрытомна глядзіць, палахліва.

Што там Гектара бойка са слаўным Ахілам,
Нават слава Баярда здалася б пахілай,
Сам здзівіўся б Завіша, ўлюбёнец палякаў,
Каб пабачыў удары зацятых ваякаў!

Бачыць ротмістр, што хлопец удары вяртае
Удвая, і шаленства яго агартае.
Сілы ўсе ён сабраў... Люд застыг — заўважае,
Што смяртэльны удар юнаку пагражае,
Але той адбівае удар небяспечны —
Ані кроку назад, стаў як дуб векавечны.
За праціўнікам сочыць арлінае вока,
У намеры яго прасякае глыбока;
Адбіваецца, зручнай чакае хвіліны,
Каб з праціўнікам скончыць ударам адзіным;
Нерухома стаіць, як літы, ў абароне.
Раптам выбіў ён зброю з жалезнай далоні...

Нават Храбрага колісь не так сустракалі
І Баторыя з чэсцю такой не віталі,
Як калонай прыйшлі баявыя атрады
Да сябе на радзіму, не так былі рады
Славе колісь, раней атрыманай пад Венай,
Як віталі хлапца з перамогай адменнай.
Ўсе паціснуць руку пераможцы жадалі,
Са здзіўленнем на шаблю яго паглядалі;
Нават ротмістр, як мужным належыць заўсёды,
Захаваўшы свой смутак, прыходзіць да згоды,
Разам з іншымі чэсць аддае і шануе,
Мір і вечную дружбу сваю прапануе.

«Малады яшчэ рыцар, ды выйшаў у людзі!
Хай жа дзень гэты добрым нам прыкладам будзе,
Хай жыве ў нашай памяці згодай і ладам.
Я складаю з сябе кіраўніцтва атрадам,
Юнаку саступаю, ён мужны і ўпарты,
Хай бярэ маю ўладу, бо ён таго варты».

Пана Шчуку сардэчна юнак абдымае,
Яго твар сарамліва зарою палае,
Звонкім голасам кажа: «Благая парада!
Не адважуся я... Ён начальнік атрада,
З ім памерці гатоў, калі будзе патрэба,
А мая перамога...— бяру ў сведкі неба —
Толькі просты выпадак, не рук маіх справа,
Хоць за гэта скажу Богу дзякуй ласкава».

Покуль спрэчка лагодна і міла трывае,
Іх абодвух староста к сабе падклікае.
Суд яго быў разумны, кароткі і правы:
«Пане ротмістр, паколькі ты ў бойках крывавых
Даказаў нашым ворагам моц тваёй сталі,
На чале нашых воінаў будзь сабе й далей.
А юнак хай за мужнасць сваю і трывогі
З тваіх рук атрымае штандар перамогі».

Пачуццём авалодаць не маючы сілы,
Узнімае дзяўчо голас звонкі і мілы
І, спыняючы бацькі старога прамову,
Пачынае нізаць свае ўласныя словы:

«Калі я за жыццё табе дзякуй казала,
Я тады ўжо павагу ў душы захавала;
Але сёння я бачу цябе наймужнейшым,
Пераможцам таго, хто быў самым дужэйшым;
Дык прымі ад мяне прывітанне малое,
Хай шчаслівая зорка кіруе табою,
Узнімай сваю зброю ў чэсць роднага краю,
А слабыя ў табе абарону хай маюць,

Тваю сілу хай вораг у бойках адчуе,
Каб ты быў маім рыцарам верным, хачу я.
Як апісана гэта ў старых кнігах шчыра,
Калі рыцар са славай выходзіць з турніра,
Падарунак цудоўны заўсёды прымае
З рук сваёй каралевы; няхай ажывае
Старажытны абрад,— дык, будзь ласкаў, прымі ты
Падарунак мой бедны, ён не самавіты,
Але не пагарджай, я хачу, каб дар гэты —
Знак пашаны маёй, меў заўжды пры сабе ты».

Рад шчаслівы юнак, ён калені згінае,
А дзяўчына ласкава яго ахінае
Падарункам сваім, шарфам, золатам тканым,
Дзіўных колераў светлых, мяккім, не каляным.
Ён — як думкі яе і як позірк дзявочы.
Задуменнымі сталі староставы вочы.

## Абразок 3

Шмат сышлося гасцей да старосты ў пакоі.
Разважаюць і шэпчуцца ўсе ў неспакоі:
Зюдэрман з сілай войска на польскай зямліцы!
Скрозь прарочаць краіне бяду, навальніцы.
Радзяць, судзяць вяльможныя — спрэчкі не ў меру,
Як ім лепш бараніць і дзяржаву, і веру.

Тут былі і такія, што гетману, пану
Казіміру Сапегу служылі аддана.
Інтарэсы агульныя іх з ім скруцілі,
Ганарыстаму пану яны прысвяцілі
Гонар свой, да радзімы любоў і сумленне.
І такія былі, што худыя кішэні
Той гадзінай цяжкою напоўніць жадалі
І шчадрэйшым магнатам сябе прадавалі.
І тады, як цяпер, ганарыстасці сіла

Нешчаслівы наш край марнавала, губіла.

І саноўнае панства, паводле закону,
Адбывае нараду *de publico bono;*
Кожны пан сваю думку давесці імкнецца,
А венгерскае хмельнай ракою ліецца —
Нашы прадзеды самаважнейшыя справы
Вырашалі за кубкам, у часе забавы.

Вось стары падкаморы ў багатым убранні
(У цудоўным кунтушы, атласным жупане,
Пояс — дзіва, шырокі, ўвесь золатам тканы,
На нагах ззяюць жоўтыя боты з саф'яну,
Похва шаблі, эфес — дар мастацтва багаты,
Голаў зграбна падголены, вус сіваваты)
Пачынае паседжанне зграбнай прамовай:
«Дарагія браты мае, ясны панове!
Строга Бог племя ляхаў сягоння карае,
Доўгі час стогне наша зямля дарагая,
Зюдэрман гаспадарыць на ёй і лютуе,
Паліць, нішчыць і люд абдзірае, рабуе.
Вольны люд пазбаўляе адвечнага права,
Пнецца новага даць караля Станіслава.
Што ж, Ляшчынскі паляк неблагі, я не схлушу,
Пан выдатны, шаноўны, сказаць гэта мушу,
Ды прысягу ламаць грэх вялікі, не гожа,
Бо законны кароль — ёсць памазанік Божы.
Я вам раю трымацца прысягі і трону
І ўзнімацца усім на яго абарону».

«Не, васпан, не дазволю і слова бяру я!
Не благое, о не, падкаморым кіруе,
Ён шануе айчыну, ёй служыць аддана,—
Гэта можа засведчыць, што ім тут казана,—
Але хай мне вяльможны на гэтым прабачыць —
Суд яго памылковы, магу растлумачыць.
Як кароль Ян наш слаўны спачыў ў Божым лоне,
Пасадзіў лёс Аўгу́ста Другога на троне.

Як за Янам было ў нас? Ці нашы свабоды
Тады не паважалі чужыя народы?
Польшча, Русь і Літва, шчырай дружбай з'яднаны,
Ці ж не сталі грудзьмі, ці ж не білі паганых,
А нашэсце Ксенжыца хіба не спынілі?
Хрысціянства крывёй сваёй не баранілі?
А цяпер — страх падумаць! Як Сас тут пануе,
Хто з народаў чужых нас баіцца, шануе?
Былі дужымі мы, а цяпер мы — як лісце!
Не, не гэтак было ў нас за Янам калісьці!
Чужаніца зямлю нашу не дратавала,
Каралеўская чэлядзь праў не адбірала.
Свой кароль быў — сваім даваў узнагароду
І не ўводзіў звычаяў чужога народу,
Бо і моды чужыя і звычкі — нам шкодзяць
І дзяржаву, айчыну да ўпадку прыводзяць.
Не, кароль з землякоў нас пазбавіць нядолі
І чужынцам у нас панаваць не дазволіць,
Будзе бацькам нам родным ён, а не айчымам,—
Хай жыве Станіслаў, хай мацнее айчына!» —
Так даводзіў падчашы... крануў вус паловы
І да дна кубак выпіў, сцвярджаючы словы.

Гаспадар, гэта ўчуўшы, свой голас узносіць,
І, абураны, ўзрушаны, слова ён просіць;
Атрымаўшы ж яго, да паноў апелюе:
«Што ж край траціць, як Сас сёння намі кіруе?
Не кароль-чужаземец вядзе край да згубы,
А пыхлівая шляхта, паны-самалюбы.
Кожны шляхціц-магнат зневажае законы,
Бо сябе лічыць вартым жазла і кароны,
І таму столькі партый, бязладдзе ўзрастае,
А кароль без улады, ён сілы не мае.
І зямляк наш, Ян Трэці, любімы бясконца —
Злая кара паганцаў, хрысціян абаронца,
Што зрабіў шмат дабра для народу, айчыны,—
Ці ж не меў наракаць на няўдзячнасць прычыны?
Не, з сваіх караля, хоць найлепей спрыяе,

Хоць за край свой аддаць ён жыццё пажадае,—
Шляхта пыхай сваёй усё роўна зганьбуе,
Скажуць так: чаму ён, а не я, каралюе?
Тут пытанне дзяржавы, не ўласнага густу.
Каралю аддаю перавагу, Аўгусту».

Так размовы вяліся на спрэчнай аснове,
І адны, за Ляшчынскага п'ючы здароўе,
А другія, за Саса ўздымаючы чарку,
Пачыналі бясконцую лаянку, сварку.
Калі ж кроў закіпала ад частых віватаў,
Спрэчку зброяй рашалі — ішлі брат на брата;
Гэтак шумна і тлумна рабілася ў залі,
Нібы дзе на вайне мечам лёс вырашалі.

Вось узняўся манах, паслядоўнік Лаёлы,
Хоча ўсцішыць іх кроў, устрымаць ад сваволі,
Хрысціць лоб, падымае руку, пачынае —
Яго голас, як водгулле грому, лунае:
«Божа мой! Дзе знаходжуся? Між басурманаў,
А ці то ў грамадзе хрысціянскіх васпанаў?
То такая нарада *de publico bono*?
Гэтак хочацца збавіць наш край утрапёны?
Кожны думае тут: я адзін толькі правы!
Зюдэрман жа працягвае страшныя справы,
Парушае спакой, раздзьмухае пажары,
У сялянскай хаціне разбэшчана шнарыць;
І ніхто з вас праз спрэчкі не чуе, не бачыць,
Што маленькія сіраты ў час гэты плачуць,
Клічуць вас, каб адпомсціць за бацьку і маці,
Каб у ворага выдзерці тое багацце,
Што цяжкой доўгай працай здавён здабывана,
А цяпер хцівым ворагам парабавана!
Каралю вы законнаму хочаце здрадзіць
І другога, па густу, на троне уладзіць;
Хто даў права такое — парушыць прысягу!
Ганарыстасці тым не ўтаймуеце смагу!
На шляху здрады хіба вам Бог дапаможа?

Заблудзіліся вы, ідучы ў бездарожжа!
Той, хто верыць у Карла, асекчыся можа —
У яго небяспечны праціўнік. Ён зможа!
Як нарэшце Аўгуст разаб'е Зюдэрмана,
Вы з якімі вачыма сустрэнеце пана?
Той, хто сёння яшчэ не адыдзе ад здрады,
Заўтра літасці будзе прасіць і спагады.
Хто не страціў сумлення, не будзе вагацца:
Да канца за Аўгуста належыць змагацца!
Сам я за караля пастаяць майго рады
І такія, панове, вам даў бы парады:
Каб, пакінуўшы сварку, ўсе сілы з'ядналі,
Каб наш кляштар гарматамі мы ўмацавалі
І, людзей назбіраўшы і зброі багата,
Пад апекай Марыі, аховай гарматаў,
Чужаніцам, што паляць і нішчаць айчыну,
Адпачыць не давалі ані на хвіліну;
Калі ж вораг святыню спрабуе парушыць,—
Прымем смерць і ўратуем тым грэшныя душы».

Так манах навучаў, духам верны Лаёле,
І чало яго ззяла, нібы ў арэоле;
Твар быў добры, ласкавы і позірк цвярозы,
А з вачэй буйна падалі кропелькі-слёзы;
Серабром сівізны ўсыпан голаў ягоны,
Нібы мучанік ён у зіхценні кароны.
Яго голас — о, дзіва! — прасякаў у душы,
Самых непрымірымых дарэшты узрушыў:
І адзін аднаго ўсе як ёсць абдымалі
І за Саса стаяць да канца прысягалі.

Тут староста даў знак, і на знак той ягоны
Так зайгралі музыкі, што нават калоны
Здрыгануліся. Ўтнулі ў тахт зладжаны, згодны
Польскі танец, усімі ўлюбёны — народны.

Жвавым крокам прысутныя рушылі ў залі,
Дзе даўно іх прыгожыя пані чакалі.

На чале — гаспадар, побач з ім — падкаморы:
Хто з іх першы увойдзе? У добрым гуморы
Паспрачаліся ветла якіх паўхвілінкі,
Госць нарэшце згадзіўся — і да гаспадынькі,
Да Люцыны, падаўся — прыгожай, як мара,
А за імі ўсе рушылі — пара за парай —
У пакой, дзе сталы з пачастункам стаялі
І гасцінна усіх да сябе запрашалі.

Божа мой, што за час наш мізэрны і дробны!
Як сыны да бацькоў да сваіх непадобны!
То, бывала, магнат, як гасцей запрашае,
Не шкадуе піць-есці, а ўсё прымушае.
І аднолькава шчыра прымае, пабожна
І багатых, і бедных, нязнатных, вяльможных.
А цяпер падысці да другога — не жарты!
Сам у даўняга пана слугой быць не варты,
А як прыме? Ласкава сустрэне магната,
І сардэчна, і шчыра, а беднага брата?
Покуль выйдзе — чакаеш не менш як гадзіну,
Гляне скоса, сярдзіта, пастроіўшы міну...
А калі ты патрэбны, дык ласку учыніць,
Да сям'і павядзе, да сваёй гаспадыні,
Край стала пасадзіўшы з пагардай, тым часам
І кілішак гарэлкі з табой вып'е разам;
А калі ж у цябе грошай хоча пазычыць,
Дык і ўсмешка заззяе ў яго на абліччы.
Калі прыйдзе бядак расказаць пра нядолю,
Хіба знойдзе спагаду да гора і болю?
Не, да скнары, каб смерць пагражала, нябога,
Не ідзі за парадай і за дапамогай.

Не пра ўсіх я кажу, ёсць і добрыя, дружа,
Так — між церня цвіце і прыгожая ружа.
Як і колісь, цяпер ёсць такія магнаты,
Што шануюць і любяць бяднейшага брата,
Ці то ў свіце хто шэрай, ці ў добрым адзенні,—
Ён аднолькава шчыра іх прыме, сустрэне.

Але гэтакіх мала, ой, мала, мой браце,
Днём з запаленай свечкаю трэба шукаць іх.

Адышлі мы ад справы. Пасля ўжо вячэры
Зноў капэла зайграла і зноў кавалеры,
Што да танцаў, да скокаў так спрытны, ахвочы,
Ў паланезе да залі з паненкамі крочаць.
Круг, другі абышлі, пакланіліся дамам
І да танцаў жвавейшых рыхтуюцца самі.
А ў той час за сталом разважаюць сарматы
І адзін за адным тосты ўзносяць, віваты.

У мазурцы віхром летучы безупынку,
Рэй вядзе гаспадыня, красуня Люцынка.
Ў валасах яе русых — пучок размарыну,
У кабацік прыгожы прыбрана з мусліну,
А спаднічка ў яе — скрозь карункі, хвальбоны —
Грубым золатам ткана па полі зялёным;
Квола-сіні кунтушык так зграбна пашыты,
Аксамітам чырвоным удала падбіты;
Чаравікі з атласу, на іх — пазалота...
Не адзін на дзяўчо хлопец дзівіцца ўпотай.

Ля прыгожай дзяўчыны харунжы Даліва,
Як і ў бойцы, у танцах рухавы, імклівы.
На ім боты з саф'яну, кунтуш з аксаміту
І жупан з градытуру, прыгожа пашыты,
А як часам у танцы гукне да капэлы
Дык як выпусціць звонкія прыпеўкі-стрэлы,—
Дык хаця б ты і быў засмучоны і млявы,
Акрыяеш і ўвойдзеш у гульні, забавы.

Хіба сённяшні танец назваць танцам можна?
Вось узяць хоць кадрылі... паўзуць асцярожна,
Нібы нейкім цяжарам знясілены пары —
Так павольна, марудна, як сонныя мары.
А калісьці ў часы незабыўныя тыя,
Як у мáзуры ўтнуць «галубка» маладыя —

Метэоры, здаецца, мільгаюць па залі,
Аж іскрацца абцасы, падкутыя сталлю.
Дык і ў тых, пра каго кажуць: душы іх з лёду —
Растае лёд у танцы жыцця і свабоды.

Кракавяк — за мазуркай. Наш хлопец шчаслівы
Творыць з паннай Люцысяю цуды і дзівы.
Грудзі дыхаюць лёгка, блішчаць яго вочы,
Калі стрэне какетлівы позірк дзявочы.
А як стан яе квола рукой абдымае
І далонь яе возьме, ад шчасця аж ззяе.
Ля капэлы стаіць, ледзь пачуцці хавае,
Вось прытоптваць пачаў — раз, два — тахту чакае.
Хоча ёй расказаць, як кахае ён квола...
«Знаю ўсякі кракавякі,
Да танцаў ахвочы.
Хочу дужа, мая ружа,
Глянуць табе ў вочы.
Я і ўдалы і трывалы
І ў жыцці, і ў танцы,
Мне шанцуе, як танцую,
На любой гулянцы».

Зразумела Люцына — пакрыўдзіць не хоча
І ў адказ заспявала, ўсміхнуўшыся ў вочы:
«Я дзяўчына, як маліна!
За мной хлопцы роем,
Мяне маці замкне ў хаце,
А я за гарою.
Але Янку за каханка
Я сабе абрала,
Выбачайце і не лайце,
Што вас не чакала».

То звычайная ў моладзі песня, здаецца,
Дык чаму ж яна гэтак на сэрца кладзецца?
Чаму ж хлопцы, дзяўчаты яе разумелі?
Бо казаць пра пачуцці калісьці не смелі,

Бо прыстойная моладзь была, сорам знала,
Воля бацькі іх лёсам тады кіравала.
А нядрэнна было: працавалі рупліва,
Паважалі старэйшых... жылося шчасліва.

Так да рання ішлі пачастунак і танцы,
І каханкам сваім маладыя абранцы
Прысягалі, што вернымі будуць да смерці,
І прысягі трымаліся моцна, паверце,
Бо не ўмелі маніць ды ілгаць недарэчна —
Калі раз пакахалі, дык, значыць, навечна,
Без якое рахубы, да самай магілы,—
Пачуццё паважалі як дар неба мілы.

А старыя тым часам за мёдам і брагай
Аб краіне сваёй разважалі з увагай.
І нарэшце ўсе келіхі ўзнялі на згоду:
Сам Аўгуст мусіць веры трымацца народу,
Кляштар трэ ўмацаваць ім і тою ж парою
Харч падвезці туды, і рыштунак, і зброю.
І паводле вядомага добра звычаю
Шведам шлях перарэзаць, пакуль выйдуць з краю.

## Абразок 4

З таго дня небагата і часу мінула,
А на край столькі гора, бяды навярнула!
Закружыў хіжы птах шведскі з чорнаю зграяй
Над Літвою і Польшчай — дзяўбе, раздзірае
Кіпцюрамі іх сэрца і кроў выпівае,
Нішчыць край і мардуе, людзей забівае;
Мала крыўдзіў, яму зажадалася больш шчэ:
Называе сябе ён «збавіцелем» Польшчы!

Быў не ў стане Аўгуст утрымаць абароны,
І, разбіты ў баях, ён адрокся кароны.

Хоць Саксонію прагнуў трымаць за сабою —
Таму й міру жадаў ён цаною любою.
А Ляшчынскі ужо апынуўся на троне,
Як законны кароль, ён у Пястаў кароне.
Мусіць, зорку Аўгуста бядой заімгліла,
Хоць яшчэ ў яго ёсць і прыхільнікаў сіла.
Бо трымае яшчэ іх моц слова, прысяга,
Хоць і цяжка — стаяць пад Аўгуставым сцягам.

А ў кляшторных мурах не пануе бязладдзе,
Хоць тры месяцы кляштар ужо у асадзе.
Прагнасць Густава Крэйца не ведае межаў,
Дзень і ноч б'е з гармат па мурах і па вежах.
Недарэмна ён смерць з кожным выстралам множыць,
І штурмуе, і паліць, бо дом гэты Божы,
Як маяк, нерухома стаіць сярод мора,
Сустракаючы ворага мужна, сувора.
Так, бывае, драпежнік у пушчы гушчэры,
Ухапіўшы здабычу, ўжо зяў свой ашчэрыць,
А тым часам ахвяра раптоўна знікае
З кіпцюроў яго вострых. Дарэмна рыкае
Звер драпежны, дарма свае грудзі ён трудзіць,
Гэты рык толькі пільнасць ахвяр яго будзіць.

Але глянем у кляштар у часе асады:
Як жыве гарнізон, як страчае напады?
Іх было каля тысячы, пэўна, адданых,
Верных вояў, супольнай бядой гартаваных,
А цяпер засталося не больш палавіны,
Вораг пяўся адняць іх жыццё штохвіліны.
Падкаморы й староста з дружынамі строга
Баранілі карону Аўгуста Другога,
Бо падчашы і скарбнік, не трацячы часу,
Кляштар кінулі ўночы і здрадзілі Сасу.

Падкаморы каманду прыняў над атрадам,
Бо ў павеце старэйшым належыць улада.
І спачатку ішла абарона нядрэнна,

Покуль лад быў і ворага білі адменна,
Але як пачалося ў атрадзе бязладдзе,
Калі тыл паказала ў час бою пазаддзе,
Калі, выгад шукаючы ўласных, прысягу
Парушалі штораз і ўцякалі з-пад сцягу.
Калі вораг гарматы наўкола паставіў,
Шмат байцоў пазнішчаў і муры падзюравіў,
Дык на радзе вайсковай тады ухвалілі,
Каб байцы з муроў вылазкі штодзень рабілі.

Вось аднойчы ў час вылазкі наш падкаморы
На чале юнакоў быў, каня ён прышпорыў
І на ворага рушыў. Ды мечам працяты,
А ці лёг бы касцьмі, ці ў палон быў бы ўзяты,
Каб на тую хвіліну адважны Даліва
Не прыкрыў яго целам уласным імкліва.
А пасля, колькі хлопцаў узяўшы з сабою,
Падкаморыя ў кляштар прывёз з поля бою.
Стаў староста начальнік. Да бою ахвочы,
Адбіваўся ад шведаў, як днём, так і ўночы,
І манеўрамі рознымі вельмі ж удала
Дастаўляў ён у кляштар прыпасаў нямала.
Ротмістр Шчука — адважны заўжды, зухаваты —
І плячом і мячом быў яму памагатым.
Вочы шведаў не раз ён атакай-спадманкай
Ўбок адводзіў, пакуль пад'язджала фурманка
З цяжкім грузам сваім да кляшторнае брамы,
Перашкоды не стрэўшы ніякай часамі.

Але выпала раз, што манеўр і не ўдаўся.
На зухавасць сваю вельмі Шчука паклаўся.
План яго быў, здавалася, просты бясконца:
Тут спадманны напад, а усім абаронцам
З тылу ўдарыць, усёю, што маецца, зброяй,
І між двух тых агнёў швед ніяк не устоіць.
Ротмістр так меркаваў, ды судзіў лёс іначай,
Даў навуку зухавасці іхняй юначай.
Папярэджан быў вораг, відаць, нечакана

Карты збылтаў усе, знішчыў ротмістра планы:
Як галоўны атрад апынуўся за брамай —
Напаткаў сілу ўсю самаго Зюдэрмана.
І пачаўся бой люты, дагэтуль нязнаны;
Густаў Крэйц на кані паляцеў, узлаваны
На адважнага Шчуку, які ва ўтрапенні
Біўся з думкай: ратунак іх у адступленні.
І нічога не бачачы перад сабою,
Скрыжавалі ў шаленстве бліскучую зброю;
Іскры сыплюць з вачэй, вусны сцятыя — ў пене,
Іх уласнай крывёю набракла адзенне.

Так два буйвалы б'юцца ў бязлюднай пустыні,
Аж пакуль з іх нарэшце адзін не загіне;
Кроў з іх хлешча, крывёю наліты іх вочы,
Ззяюць раны і шэрсць разам з мясам — у клоччы;
Вось слабейшы ляжыць нерухомы, забіты,
Ды ўсё топчуць яго пераможцы капыты.

Вывеў другі атрад сам староста у змроку,
Побач — пана Даліва пільнуе, як вока.
Але Ларс, шведскі ротмістр, ужо іх чакае —
Акружыў і знішчальным агнём спатыкае.
І староста пабачыў — назад шлях заняты,
Застаецца адно ім: пачаць бой зацяты.
А Даліва ўжо б'ецца, як тыгр ашалелы,
Поплеч сябраў-таварышаў гэткіх жа смелых,
Атачыў яго вораг, сцінае і цісне,
Ды фантанам б'е кроў там, дзе меч яго блісне.

На старосту ж сам Ларс, як віхор, налятае
І на голаў старога свой меч апускае;
Той падняў яшчэ зброю рукою упартай,
Але позна: смяротны быў Ларсаў удар той.

І староста упаў, нібы тая таполя,
І крывёй напаіў сваё ўласнае поле.
Ларсу ж мала таго, ён яшчэ неспакойны —

Уздымае зноў меч над старостам бяззбройным.
Гэта бачыць Даліва, не думае многа
І сваімі грудзьмі засланяе старога.
Адбіваючы ўдары, ён сам нападае,
Пераможцу да бойкі з сабой прымушае.

Разышліся, сышліся — як буры навала,
І здавалася, быццам зямля застагнала;
Кожны з іх пільна сочыць, расправіўшы плечы,
То нібы нападзе, то адступіць дарэчы;
Суняліся свае і чужынцы — за боем
Двух байцоў назіраюць з глухім неспакоем.
За свайго кожны ціхенька моліцца Богу,
Хто ж нарэшце з іх двух возьме верх, перамогу?
Вораг змогся ужо, гэта бачыць Даліва,
Намаганні падвоіў і — ўперад імкліва.
Ларс свой меч узнімае на выпад спадманны,
У чало яго быццам бы накіраваны,
А Даліва тым часам прызначыў удар свой
Не ў чало, але ў грудзі адкрытыя Ларса;
І, як дуб, ён упаў ад смяротнае раны,
Упусціўшы з рукі сваёй меч гартаваны.

Покуль з Ларсам зацята змагаўся хлапчына,
Падышла да старосты з падмогай дружына;
Паднялі яго слугі, прыкрылі сабою,
Непрытомнага вынеслі ўраз з поля бою.
Ўнеслі ў кляштар яго, у муры-камяніцы,
І дачка над ім слёз пралівае крыніцы,
У пакутах над бацькам душу сваю двоіць,
Бо яе і каханага лёс непакоіць.

А юнак, па апошняй сваёй перамозе,
Калі ўбачыў, што вораг зусім у знямозе
І збянтэжан,— адпомсціць наважыўся шведам,
А за ім і дружына ўся рушыла следам —
Кожны рады змаганню, адпомсціць жадае.
І дружына, як буры віхор, нападае;

Як маланкі, іх шаблі... Удар быў суровы —
Пазляталі, як макаўкі, шведаў галовы...

Дрогнуў вораг, нібы напалоханы статак,
А юнак накіроўвае ўдар свой зацяты
І на тых, хто забіў пана ротмістра Шчуку,
Ён і ім хоча даць назаўсёды навуку.
Да самога іх правадыра дападае;
Вось параніў яго, вось ізноў насядае...
І дарэмна раз'юшаны Густаў імкнецца
Зноў у бой. Ён прымушан сілком, як ні пнецца,
Да абозу вярнуцца. Ён лёс выклінае
І на іншых свой гнеў, сваю злосць спаганяе...

Чаму ж слёзы Даліва ракой разлівае?
Хіба лаўраў і славы яму не хапае?
Што ён голаў схіліў, паглядае так строга?..
Бо не танна далася яму перамога!
Ротмістр Шчука, баронячы маці-айчыну,
Абавязак свой выканаў, мужна загінуў...
Там смяротна паранены бацька каханай
У пакуце нябачанай і нечуванай...
Рыцар з поля вяртаўся ў задуме вялікай,
Калі служка яго да старосты паклікаў.

Каля ложка стаіць, не стрымаць хлопцу плачу.
Аб сваёй перамозе дае справаздачу.
Хоць старога і мучаць страшэнныя раны,
Але рады ён дужа, што бой не прайграны:

«Каб падзякаваць, слоў я такіх не знаходжу,
Што ты мне і айчыне служыў гэтак гожа!
Будзе жыць твой учынак у песнях народу,
Мне ж якую знайсці для цябе ўзнагароду?
Збіў ты з ворага пыху і гонар удала,
Ды наперадзе справы таксама нямала.
На цябе аднаго ўсю надзею мы маем,
На цябе аднаго абарону ўскладаем,

Даручаем табе і маёмасць, і сем'і,
Пад уладу тваю гарнізон аддаем мы.
Здабывай перамогу і волю народу,
Я ж для мужных заўсёды знайду ўзнагароду».

Так гаворачы, ён на дачку паглядае,
А ў Люцынкі аблічча пажарам палае.
Хоць хвалюецца наша дзяўчына бясконца,
Але твар яе шчасцем зіхціць, нібы сонца;
І Даліву гаворыць прачулае слова:
«Волю бацькаву выканаць буду гатова,
Згодна й сэрца маё, а таму — асабліва...
Толькі далей ідзі сваім шляхам шчасліва.
Калі ж выбавіш нас, давядзе сэрца ўладна,
Што я бацьку свайго зразумела дакладна.
Як цябе сваім рыцарам колісь абрала,
Што ты шчасце дасі мне, тады прадчувала».

Быў юнак ад слоў гэтых тады ў захапленні,
Уявіў сабе будучыню ў расчуленні,
Перад дзеўчынай любаю голаў схіляе
І быць вартым кахання яе прысягае:
Мужнасць, праўда, любоў... Покуль дыхаюць грудзі...
Ганарыцца яна сваім выбарам будзе!

Далучыў да іх голас староста зычлівы,
Але бацька хлапца, наш Даліва шчаслівы,
Вус сівы арасіўшы слязой расчулення,
Да прысутных сказаў: «На крыжы я збавення
Прысягну, што хвалой такой неасцярожнай
І залішняй хлапца сапсаваць нават можна.
Бо аддаць свае сілы, жыццё ўсё айчыне
І ахвочы з нас кожны і кожны павінен!
А калі ўжо, васпане, судзілі так лёсы,
Што кіруюць бацькамі ўжо малакасосы,
Буду слухаць загады твае, дабрадзею,
Ды глядзі ты, не здрадзь толькі нашай надзеі!
Калі суджана лёсам і голаў свой скласці,

Тваёй славы смерць нават не здолее засціць».
Быў стары ў расчуленні, з воч бегла слязіна —
Прытуліў да грудзей галаву свайго сына.
А набожны манах, што стаяў тут ля іх жа,
Юнака блаславіў словам добрым і крыжам.

* * *

Промні сонца угрэлі радзімы загоны,
Прэч прырода адкінула снегу заслоны,
Ў зеляніну прыбралася, ў яркія кветкі,
Ветрык цёплы дыхнуў на гаі і палеткі —
Свет увесь у святле і цяпле спачывае,
Толькі люд наш зямельку слязьмі аблівае:
Пакараў Бог — паслаў ліха, гора багата,
Адабраў сэрца, розум, пайшлі брат на брата,
Як на ворага; у грамадзянскіх тых войнах
Жыць не можна было ў сваёй хаце спакойна.

Гарнізон ледзь трымаецца. Дрэнныя справы.
Каб не хлопец, даўно б не мінулі зняславы —
Ці ў палоне б дзе згінулі ў шведаў нікчэмна,
Ці жыццё б сваё страцілі ў муках дарэмна.
Малады правадыр паказаў цуд адвагі —
Былі біты не раз Зюдэрмана бадзягі;
З кожнай бойкаю іхных салдат убывае,
Ды ізноў, як наліха, іх шмат прыплывае.
Змагароў жа герояў маленькая жменя,
Нібы снег, растае — з кожнай бойкай іх меней.

Ад упартасці іхнай быў Крэйц у трывозе —
Сцяў мацней яшчэ кляштар у шчыльнай аблозе.
А юнак не зважаў на моц шведаў, дый годзе!
І абозы з харчамі у кляштар праводзіў.
Але шведам падвезлі цяжкія гарматы,
Загрымелі яны, нібы грому раскаты;
Ад муроў тых нарэшце кляшторных, спрадвечных,

Груд каменння і друз засталіся б бясспрэчна.
Ухвалілі на радзе тады без вагання,
Каб атрад правадыр свой сабраў на світанні,
Каб, старых і жанчын у сярэдзіну ўзяўшы,
Паміж шведаў прабіўся, апошні бой даўшы.
І манахаў прасілі ісці разам з імі,
Ды яны не пасмелі пакінуць святыні.

Айцец рытар і скарбнік тутэйшых манахаў,
Баючыся на скарб з боку шведаў замахаў,
Патаемна дабро дзесьці ў лёхах схавалі
І прысягай святой сябе моцна звязалі:
Лепш пад катаў мячы іх галовам схіліцца,
Як парушыць прысягу, раскрыць таямніцу.

Дзень знішчэння святыні быў дзень векапомны,
Дзень, калі атрымалі пакуты кароны
Духавенства, манахі — прымаючы кару,
Свой касцёл і сябе аддавалі ў ахвяру
І каля алтара, як настала трывога,
Смерць сустрэлі, за ворагаў просячы Бога.

Ціхі ветрык світаньскі ў палях павявае,
Белы свет Творцу песню падзякі спявае.
Калі ж першы прамень з-за гары дальняй гляне,
Птах абуджаны сонцу пяе прывітанне.
Хто там раніцу будзіць у садзе кляшторным?
Грае квола на арфе, спявае мінорна?
Гэта голас напэўна яго, Ўладзіслава,
Ён пагутарыць хоча з каханай аб справах.

## Песня Уладзіслава Далівы

Добры дзень, радасць мая і каханне!
Промні сонца заззялі з-за цёмнае хмары,
Ночка мінула, з'явілася ранне,
І залівае зара скрозь абшары.

Ты ж, нібы ў чарах дзіўных, без турботаў
Спіш сабе, радасць мая і пяшчота.

Добры дзень, шчасцейка, добры дзень, кветка!
Спёкі не бойся, бо спёка не спаліць,
Спёка страшною бывае улетку,
Ўстань, мой анёлак, усе паўставалі.
Ты ж, мая соня, ты так разаспана —
Песцішся, думаеш, што яшчэ рана.

Добры дзень, чуеш — звястун ужо весні,
Бусел, паважна так ходзіць і звоняць
Птушкі на дрэвах шчаслівыя песні,
Трэлі ў нябёсы высокія гоняць;
Ты ж усё спіш; прачынайся, бо шкода —
Глянь, як прыгожа, якая прырода!

Ўстань, мая люба, ўжо лісцем трапеча
Весні каханак, зефір свавольны,
А над зямлёю вясёла шчабеча
Жаўрук маленькі, спявак наш вольны.
Ўстань, бо нам дорага кожная хвіля —
Вечарам, можа, заснем у магіле...

* * *

Тут дражніць пачало яго рэха: ма-гі-ле...
А пасля цішыню урачыстае хвілі
Спеў касцельны парушыў, узнёслы, спакойны:
«Ад хваробы і голаду, мору і войнаў!»
І пакаяўся хлопец, скарыўшыся Богу,
Адказаў: збаў нас, Божа, ў гадзіну трывогі!
Адхінулася ўрэшце ў акенцы фіранка,
Паглядзела дзяўчына у вочы каханка,
Позірк быў яе гэткі прывабны, вясёлы,
Што яму пазайздросцілі б нават анёлы.

То Люцыся была. Засвяціла, як сонца,—
Падала яму знак падысці да аконца.

«Добры дзень табе, любы! Што ўстаў гэтак рана?
І не спаў, можа, ты, пільнаваў нас аддана?
Ох, загубяць цябе гэты клопат і праца —
Каб не ты, не маглі б мы дагэтуль трымацца,
Можа б, дзе ў кайданах шведскіх енчылі нема;
За жыццё наша, гонар удзячны табе мы!
Скажаш, пэўна, што ў тым не вялікая слава:
Бараніць родны край — гэта рыцараў справа!
Але ж ты наш герой, і я ўдзячна нябёсам,
Што рука твая й сэрца мне дадзены лёсам.
Надышоў сёння час, жменька мужных, адданых
Хоча дзёрзка прабіцца праз моц Зюдэрмана.
І я ведаю — здзейсніцца план дзёрзкі гэты,
Веру моцна, што ты давядзеш іх да мэты;
За жыццё тваё, любы, адно ўсхвалявана...
Што тады, як разлука нам наканавана?
У кляшторнае келлі, я ў гэтым клянуся,
Для малітвы да самае смерці замкнуся.
Да спаткання цяпер... як з касцельнае вежы
На малітву паклічуць — сабрацца належыць.
І я з бацькам прыйду... Ў раз апошні хіба мы
І сустрэнемся там, ля заходняе брамы»,—
Так гаворыць дзяўчына да рыцара ў смутку
І ідзе ад акенца з слязамі ціхутка.

І рыкнулі гарматы сваім шматгалоссем,
І рыгнулі іх пашчы агністым калоссем,
Як цяжарныя полымем цёмныя хмары;
Кулі градам ляцелі, і чуліся ўдары.
Абваліліся раптам кляшторныя вежы,
З енкам рэха ляцела ў наўкольныя межы,
Ледзьве чутна гучаў спеў манахаў касцельны:
«Святы Божа і моцны, святы несмяртэльны!»

Пачалі шведы бойку за ўсходняй сцяною;
Ля заходняй жа брамы, прыкрыўшы сабою

Немаўлятак, жанчын, цяжкараненых, хворых,
Што маліліся Богу, каб згінуў іх вораг,—
Жменька мужных і пэўных, што шведа здалее,
Бо сам рыцар Даліва стаяў на чале іх.

Ксёндз у рызах праходзіў паміж грамадою,
Бласлаўляў усіх верных святою вадою.
Калі ж часам і мёртвым там-сям нехта падаў,—
Што ж за дзіва, як сыплюцца кулі тут градам!
Як на момант змаўкалі гарматныя жэрлы,
Чуцен спеў ціхі: «Вечная памяць памерлым!»
Зараз вылазка. Бубны усё заглушылі,
Насцеж браму заходнюю ўраз адчынілі,
Трыста воінаў рушыла мклівых, як бура,
На шляху што сустрэлі — змялі, як віхура.
На чале іх юнак, як вайны Бог, прыгожы,
Блісне меч — сцірты цел сваіх ворагаў множыць.

А тым часам на ўсходзе Крэйц Густаў здзіўлёны,
Што ніяк не сустрэў на мурах абароны,
У цэнтр кляштара ўвёў сваіх шведаў-ваякаў,
Ды ўжо нават слядоў не знаходзіў палякаў.
У касцёле спяваў «Пад тваю абарону...»
Клер, прымаючы мужна пакуты карону.
Мур кляшторны паў друзам у тую ж мінуту,
І манахі прынялі цяжкую пакуту,
Не аддаўшы той скарб, што схавалі ў касцеле.

І цяпер, дзе быў кляштар, там дзікае зелле,
А дзе храм быў — руіны ляжаць ды каменне...
Дык памолімся мы за душ мужных збавенне!
А пра лёс маладых, пра жыцця іх дарогу,
Хоць кароценька, знойдзеце вы ў эпілогу.

## Эпілог

О, зямелька мая дарагая, ці мала
Ад сваіх ты й ад ворагаў гора зазнала!
Як тапчу я нагою мурог твой зялёны
Ці з юначым свавольствам бягу па загонах,
Дык з трывогай мяне папярэджвае сэрца:
Асцярожна, каб веліч былога не сцерці!

Часта седзячы тут, калі позірк блукае
Па далінах, лясах, я у думках кранаю
Справы тых, што зямлю гэту мелі ва ўладзе;
Часта думаю аб Зюдэрмана нападзе —
Як тут жменька байцоў датрымала прысягу
І яшчэ — пра яго, Уладзіслава, адвагу...
Як гаворыць паданне, ён ва ўзнагароду
Атрымаў прыгажуню з багатага роду,
І з душою харошай і з добрым пасагам;
Пражылі яны тут год багата няблага,
Іх у Польшчы й Літве дужа ўсе паважалі,
Ўнукаў, праўнукаў нават сваіх прычакалі...

*Д. 13 мая 1857 года, Люцынка*

# ТРАВІЦА БРАТ-СЯСТРЫЦА

*Аповесць з мясцовай легенды*

Хочаш ты з дворкай жаніцца?
Ідзі лепш, братка, тапіцца!

## Частка 1-я

З нядзелі на панядзелак
Данілку бяда стала —
Малявана скрыня прапала,
Прапала скрыня малявана,
Дачушка кахана.
Я тую скрыню маляваную
За дзень прызабуду,
Сваёй дачушкі каханай
Павек не забуду!

*З мясцовай вясельнай песні*

Там, гдзе сіняю устужкай
Уецца па лугах Днепр стар,
Гдзе пастух з краснай пастушкай
Весела пасе тавар,
А зялёныя даліны
Стракаты дыван прыкрыў,
На ім красныя каліны,
На ім усякі цвет зацвіў,—
Пры рацэ да пры шырокай
Панскі хорам там стаіць,
А ў даліне глыбокай
Вяліка сяло гудзіць.

Ой, даўненька ж то, міленькі!
Мо'а гадкоў сотні з тры,
Тагды й народ быў глупенькі,
Не умны ж былі й паны!
Праўда! Нечага казаці,
Хоць розум вялік не быў,

Зато чэсць была ў хаці,
Пан, мужык праўдай суліў,
Не то, што цяпер, у свеця
Людзі хітрасцю жывуць,
Чы мужык, чы пан з вашэця,
Свайго бацьку к чорту шлюць.

Адно толькі розум справіў —
Бога людзям даў спазнаць,
Святой верай душу збавіў,
С'учыў Хрыста мілаваць;
Бо што Гасподзь Бог праўдзівы,
Рэдка хто тагды с'умеў,
Верылі у казкі, дзівы.
Малілісь, як хто прыспеў;
Ледзь дзесяты налучыўся,
Што рад кланяўся Хрысту,
Дый то цішкам прытварыўся,
Штоб не папасць у бяду.

У хораме белым жыў-быў добры пан,
Вялікага роду — з князей крывічан;
Барысам ён зваўся, у рыцарстве слыў,
З літоўскім мацарам, вось родны брат, жыў.

Бывала, князь Вольгерд вайну загадае,
Паляванне зладзіць,— вось Барыс стралой
К сваяку пусціўся — яму памагае;
Літоўскаму князю быў правай рукой!

Дарагім ён кладам дамашняй чалядцы;
Для мужычкоў бацькам,— усякі старацца
Аб панскае дабро сэрцам, дзеткі, рад!
Зато ў яго зямлі вялікі быў лад!

У пана Даніла ўкаханы служка,
Равеснік ён князю,— найвярнейшы дружка.

На вайне, бывала, чы ў гасцях гуляе,
Даніла ні шагам пана не кідае.

Вось Даніла смуты на старасць дажыўся:
Трэба ж,— як наліха,— трэці раз жаніўся.
Узяў маладзеньку жонку, разгаворну,
Красну, баш малінку,— бяда! — дзеўку дворну
Яна на ігрышчах гуляці любіла,
К сабе сінім вочкам дзецюкоў маніла,
Мужнінай хаціны, баш, не пільнавала,
Не раз яму ліха за каўнер нагнала!

Першыя дзве жонкі — аж успомніць міла!
З імі, як у раі, жыў бедны Даніла.
Ледзь з добрай папоўнай шчасна жыці стаў,
Вось Бог пашанцаваў — трое дзетак даў.
З другою ж — Матрунай — ён іх узрасціў,
А з трэцяй — на гора! — па свету пусціў:
Памеж чужых людзей пабралі служыць,
З матчыхай, баш, злою нельга дома жыць.

Даніла Краковіч — так яго манілі,
З Агапкай папоўнай Мірона, Хартона,
Двох сыноў дый трэцю дачушку прыжылі;
Ой, прыгожа ж была дочка іх Алёна!
Была б і шчасліва — нечага казаці!
Да асірацела — змерла родна маці;
Плакаў добры бацька, плакалі і дзеткі,
Што ж плач тут паможа? Божы Суд быў гэткі.

З другою злучыўся: добрая Матрона
Для мужніных дзяцей, баш маці радзона!
Да і та не доўга з Данілам пажыла,
І яе сырая узяла магіла.

Трэці раз жаніўся — папалася дворка!
Добра кажа, дзеткі, людска прыгаворка:
Пры дварэ не многа добрага навучаць,

З наровамі злымі пэўне цябе зручаць.
І смагла Усціння, хоць лічыкам красна,
Губкі, баш малінкі, вочкі — неба ясна!
Зато ж душа яе, як сажа, чарненька,
На ўсякія злыя прыхаці радзенька.

Пры добрым Барысу, у палацы, пякарні
Ахвіцялістых — вось сабак у псярні!
Усе рады князю праўдаю служыць,
Для яго ў дзеле жыццём налажыць.

Кукаль у пшаніцы, у жыце мятліцу,
Так меж добрых людзей знайдзеш злу травіцу;
А хоць панска вока ўсюды загляне,
Да выследзіць злое Бог толькі ў стане.

Быў у дварэ коман — зваўся ён Батог;
Перад панам — лісам, у сяле — крый Бог!
Так над мужычкамі здзекаваўся срога,
Усяк, баш гадзюкі, чураўся Батога.

Зато ж красны дзеўкі к яму прыліпалі,
У карчме ахвотна з команам гулялі.
Бо ён — як наліха! — сабой маладзенькі,
Відны, баш таполя, і ліцом міленькі.

Дзіва ж што Усціння яго палюбіла,
Яшчэ пакуль з ёю жаніўся Даніла;
Вось мела надзею з команам злучыцца,
Памеж мужыкамі шляхецтвам хваліцца.

Да коман не дурань! — любіў з ней гуляці,
Пакуль аб жанідбе не стала казаці;
Тут быццам маркотны — дзеўцы адмаўляе,
Кажа — ліхі бацька не благаслаўляе.

Гневалася доўга, слязьмі залівалась,
Аж з бедным Данілам на бяду звянчалась.

Пасля ж, на ігрышчы угледзя Батога,
Забыла прысягі — забыла і Бога!

У людскай натуры здаўна зло такое,
Што ляпей смакуе, дзетачкі, чужое;
Вось пакуль Усціння дзеўкай у дварэ жыла,
Патуль і команy не была так міла;
Не паспеў жа стары з жонкай абазнацца,
Палядзь! не на жарты коман стаў цягацца,—
Яны зноў з сабою гналі ветры ў полю,
А Даніла плакаў на сваю злу долю.

Бывала, Даніла пры князю ў пакою,
А Усціння сыноў пагоніць з сахою,
Гусей пасці кажа прыгожай Алёне,
Сама ж прыбярэцца — сядзець пры аконе
Дый, з тугой на сэрцы, комана чакае,
Яго нецярплівым вокам выглядае.

Вось напражыць каўбас, бліноў, верашчакі,
З мужнінай пшаніцы упячэць праснакі,
Гарэлкі прыдбае дый мёду насыціць,
Штоб міламу стала здаволь з'есці, выпіць.
А як муж ад князя прыбрадзе дахаты,
Сыны прыйдуць з поля,— вось яна багаты
Полудзень наскора ў клеці схаваець,
Кіне на стол хлеба дый яшчэ палаець:
«Вы, баш, дармаз'еды,— цяжка працаваці!
А да міскі скоры! — не трэба вас гнаці».
На таку гаворку плачуць бацька, дзеткі;
Да што ж плач паможа? Знаць, Божы Суд гэткі!

Жылась так тры годы,— сыны разбрыліся,
У чужбіну з сваім горам панясліся;
Пры Усцінні толькі асталась Алёнка,
Ой, на бяду ж расла сірата-дзяўчонка!
Матчыха часценька жадна паглядаець,

Што прыгожа дзеўка, відна, расцвітаець,
Яна ж, як наліха, збрыдла, пахудзела,
На ягадах краска ўжо пераспела.

Хітра была баба! Хоць, баш, наракала,
Што пагана старасць ужо прылягала,
Штоб коман не кінуў, у трывозе жыла,
А комана ж яна горача любіла!
Хоць на душы гора, да ў галаве ліха!
Вось якога піва наварыла сціха:
Нявінну Алёнку, быццам родна маці,
Начала галубіць, штобы прывязаці
Да сваёй злой долі,— штоб на старасць можна
Красою дзяўчыны таргаваць бязбожна.

Дагадаўся бацька — выбіў злую жонку,
Пачаў навучаці свавольну Алёнку;
Да, баш, маладзенькі розум не дзівота,
Не спазнае добра — да злога ахвота.

Жалілась Усціння на мужа Батогу,
Што беленькай спіне даў навуку срогу,
І коман за мілу — крый Бог! — разазліўся,
Да крыві з Данілам старым ён пабіўся.

Мужык не прапусціў такую сваволю,
Пажурыўся князю на сваю нядолю;
І пажалеў Барыс вярняка старога,
І прыказаў выгнаць са двара Батога.

Што ж Батог? — даў цягу — памінай як звалі!
Да разам з Усцінняй і Алёнку ўзялі!
Журыўся Даніла па дачцэ Алёнцы,
З ліхвой сотню чартоў слаў паганай жонцы,
Крывавыя слёзы ліў на стары леткі,—
Да што ж плач паможа? Божы Суд быў гэткі!

Старому на свеце і жыццё не міла,
Крахтаў, пакуль яго забрала магіла.
Батог жа з Усцінняй, Алёнкай прапалі,
Ні вестачкі аб іх — як у воду ўпалі!

## Частка 2-я

Сасновыя дошкі
Да сціснулі ножкі,
Да сціснулі ножкі — нельга мяне крануць;
Сырая зямля грудцы налягла — нельга крануць;
Жоўты пясочак засыпаў вочкі — нельга праглянуць;
Сырое каменне пазабоччу ляжыць — нельга павярнуць.

*З мясцовай вясельнай песні*

І ў старыну бывала,
Маўляў у нашу пару,
Вось людзям заўсёды мала,
Жадны чужому дабру.

Мер асмінай карбаванцы,
Каўшом сала на пратак,
Да ўсё мала! як паганцы,
Ім чужое ідзе ўсмак!

Мужычок жа й тагды ціха
Рад бы дома працаваў,
Да панкі тварылі ліха,
А наш бедны лоб трашчаў.

Маючы сваё мацарства,
Дзерлісь аб кусок раллі,
А прыйшла смерць — з гаспадарства
Тры локці бралі зямлі.

Вось Мсціслаў, сын Манамаха,
Як на Русі правіць стаў,

Крывічанам дзеле страха,
На Барыса ён напаў.

«Чаму процiў маёй волі
Збратаўся ты з літвіном?
Не рад хлебу, не рад солі,
Мінаеш мой князеў дом?

Не хочаш са мной злучыцца,
Заўсёды у дружбе жыць,
Пара ж табе навучыцца,
Як свайму пану служыць!

Бо твой пан,— то я! — князь можны;
Твае землі — то мой клад;
Досыць жа табе, бязбожны,
З літвінамі вясці лад.

Князь літоўскі, жальcя Божа!
Невяліку помач дасць,
Дый твой Мінск тут не паможа,
Ліхам пойдзе твая ўласць!»

Такую грамату вялікі Мсціслаў
Чэраз свайго служку да Барыса слаў;
Барыс іспугаўся, крый Бог! — паблядневў,
Ледзь князёву карту прачытаць успеў,
К літоўску мацару пасольства вядзе:
«Ратуй, мой лябедзька, у страшнай бядзе!
Я ж табе ў дзеле правай рукой быў,
Вось, як родны братка, дружбаю служыў.
Мае крывічане дый твае літвіны
Памяшаліcь, маўляў адных бацькоў сыны.
Прышлі ж ты мне помач у такім няшчасці,
Збаў жа прыяцеля ад ліхой напасці!»

Не так страшна ўвосень бурны ветры дуюць
І дняпроўскі воўны на вясну бушуюць,

Як Мсціслаў ў Барыса землях гаспадарыць,
Ліхога ж там піва крывічанам варыць!
Пакуль жа літоўскі князь помач прыслаў,
Вось горад Барысаў Ушэвалад забраў
Дый загнаў князёчка ў казіны рог,
Ледзь з сваімі ў Слуцку апынуцца змог!
Крыху абадрыўся — вось каля Бабройска
З літоўскаю сілай злучыў сваё войска.

У князя Барыса быў ваяк адзін,
Страшэнны ў дзеле! Данілін то сын;
Саколікам быстрым у рыцарстве слыў,
Бацьку ён у князя дзельна заступіў.

І сабой ён быў прыгожы,
З прыяцелем гульнуць рад,
Сэрца не дзяржаў ў старожы,
Смалой ліпнуў да дзяўчат!

Дзеўкі ж, быццам ненарокам,
Не адна міла зіркне,
Як на ігрышчы з падскокам
Мірон крутуху вядзе.

У Слуцку ратуш вялік,
Пры нём каменны палаты;
Там чы ўдзень, чы ўночы крык
Там сотнікі і салдаты
Весела час праважаюць,
Гарэліцу папіваюць!

Там, узяўшыся пад бокі,
З дзяўчатамі ладзіць скокі
Сотнік — ліха галава!
З ім наперадзе Алёнка
Завадзіць прыпеўкі звонка,
Аж душа млее радна!

Апанас — дзельны музыка!
Не жалее, браткі, смыка,
Аж са скрыпкі ляціць дым;
Гу! га! — ратнікі вясёлы
Крычаць, падкасаўшы полы,
А Мірон тут вядзе прым!

Гаспадары ж, маладзіцы
Па куточках у святліцы
Завідным вокам глядзяць;
Не адзін чупрыну гладзіць,
Не адна спаднічку ладзіць,
Хацелася б пагуляць!

А дзецюкі, штоб прымелі,
Мірона б у кашу з'елі,
Завісць муціць ім спакой,
Што ён усцяж пры Алёне,
Як агонь пры абалоне,—
Вось прыстаў к дзеўцы душой!

Не ад таго ж і дзяўчына
Вось краснее, баш маліна,—
Дзяцюк абняў тонкі стан;
Быццам на крылках нясецца,
А сэрца ж? — молатам б'ецца!
Міла з хлопцам вясці тан!

Не адзін з вас, мае дзеткі,
Чытаючы казкі гэткі,
Страх цікавы папытаць:
Адкуль узялась дзяўчонка,
Чарнабрывая Алёнка?
Усяк бы рад яе спазнаць.

Вось пры ратушы ў Слуцку
Стаяць каменны палаты,

То карчма! На згубу людску
У карчме шынкар багаты.

А хоць стара яго жонка,
Да, знаць, прыгожа была;
Зато ж дочка іх Алёнка,
Маўляў вісенька, цвіла!

Яе губкі — баш каралі,
А лічка — з малаком кроў!
Сіні вочкі сэрца бралі!
Волас чорны, чорна броў.

Дзецюкоў цэла грамада
К дзеўцы быццам лезе ў брод.
Што ж? Алёнка гуляць рада,
Да сэрца яе, баш лёд!

Не адзін грашмі хваліўся,
Штоб за сэрца яе ўзяць;
Дарма маці, бацька зліўся,—
Дзеўкі нічым не уняць.

Не адзін яснавяльможны
Селяжнём к ней падплываў;
Да дзяржыся астарожны,
Штоб зубоў не пазбіраў!

І яе ж прыйшла гадзіна,
Сэрца нашло галубца!
Вось зіркнула раз дзяўчына
На сотніка-маладца!

І з тых пор яны душою,
Сэрцам к сабе прыляглі
І з тых пор памеж сабою
Вечну міласць прысяглі!

Не раз, седзя пры Алёнцы,
Сотнік таку рэч казаў:
«Маё шчасце! Маё сонца!
Бог цябе са мной звязаў.

А калі б да людзі злыя
Хацелі нас разлучыць,
Сведкамі мне ўсе святыя!
Перастану ў свеце жыць».

«Ах, і мне не стане сілы
Дажыць разлукі з табой;
Я умру, мой лебедзь мілы,
Верна прысязе сваёй!»

Такія з сабою часценька
Разгаворы жадны весць;
Дый маці была радзенька —
То ж вяліка дочцы чэсць!

Бо і сотнік быў багаты,
У князевай ласцы стаў;
Дазволіла, штобы сваты
Ён да Алёнкі прыслаў.

І пайшло там дзела ладам,
Ручнікоў у дзеўкі цьма!
Бацькі, сваты, другі радам
З маладымі да ксяндза
Ідуць! Панас на скрыпіцы
Вясельну песню вядзе,
А дзяўчаты, маладзіцы,
Кожна з іх гэтак пяе:

«Закладайце сенца,
Паедзем да венца;
Няма ксендза дома,
Пасхаў да Львова

Ключыкі купляці,
Касцёл адчыняці,
Двое дзетак вянчаці.
Дзеткі не адналеткі,
Не аднаго айца;
Адно радзонае,
Другое сужонае.
Радзоны Міронка,
Сужана Алёнка,
Яна ж табе жонка!»

Дзед касцельны у званіцы
На малітву зазваніў
Дый маладым да капліцы
Насцеж дзверы адчыніў.
І, як галубок бяленькі,
У арнаце залатым,
Выйшаў ксёндз вельмі старэнькі
Благаславіць маладым.

Найперш, дзеткі, ён спытаўся
(Даўней абрад такі быў),
Як малады называўся
Дый з якіх старон прыбыў.

Тут сотнік уголас цэлай
Начаў так ксяндзу казаць:
«Мужык я із Русі-белай —
То ж мая раджона маць!

Па бацюшку я Краковіч,
Данілам маніўся ён;
А па матушцы Паповіч,
У сяле князя наш прытон.

Даўно змер стары Даніла,
Прагараваў ён век свой;

Асталась сястрыца міла,
З ёю, пэўне, брат радной».

Чаму ж маці пабляднела,
Як пачула рэч таку?
Чаму дочка абамлела,
З крыкам пала на зямлю?

Яна рукі заламала,
Горкі слёзкі стала ліць,
Пасля Мірона зазвала
Дый начала галасіць:

«Братачка ж ты мой родненькі!
Горку ж долю Бог нам даў,
Чаму ж ты мяне, міленькі,
Як сястрыцу не спазнаў?

Тагды б я цябе любіла
Братнім сэрцам і душой,
Тагды б і грэху не была
Жыць пры табе, братка мой!

Матчыха нас пагубіла,
Падмовіла кінуць дом;
Штоб яе гора пабіла,
Пабі ж яе Божы гром!»

Вялікі ж дзяўчаці мукі!
Ручонкамі цісне грудзь,
Упала дружкам на рукі,
Дый памінай як завуць!

Гоман, крык зрабіўся ў Божым касцеле,
Дарма сталі дзеўку вадою крапіць;
Вось якой прыгодай кончылась вяселле,
Няшчасна Алёнка перастала жыць.

Што ж зрабіў Мірончук? Ён маўляў збясіўся,
Уцёк із касцёла, к Случы падбяжаў,
Пры берагу шчыра Богу памаліўся
І, як цяжкі камень, у ваду ўпаў!
Да пакуль жа яму прыняслі спамогу,
Душа ўляцела — пайшла служыць Богу!

Злой матчысе совесць здароўя забіла,
У вялікіх муках года не дажыла;
А Батог із нуды гарэлкай запіўся,
Не мінуў і месяц — з Гапкай ён злучыўся.

Мірона ж, Алёнку усе жалавалі,
У адной магіле родных пахавалі;
Да на той магіле вырасла травіца,
І людзі назвалі яе «брат-сястрыца».
Дзеўкі ж маладзенькі траўку тую рвалі
І няшчасных песняй такой паміналі:

«А ў Слуцку на рынку
П'юць два браты гарэлку;
Адзін брацец гаварыць:
Перастаў Даніла жыць;
Ён з жонкаю дзетак меў,
А з другою узрасціў,
А з трэцяю распусціў,—
Род яго бяду сустрэў!
Ехаў сотнік Краковіч,
Па матушцы Паповіч,
Дый заехаў у стадолу,
Са стадолы ў камору:
«Шынкарачка малада,
Дай мне віна гарцы два!» —
«Кажу табе віна даць
Дый у цябе жупан зняць».—
«Нашто табе мой жупан?
Дам я табе грошы збан».—
«Калі ў цябе грошы збан,

Я за цябе дочку дам».
У суботу зручылі,
У нядзельку злучылі.
«Скажы, скажы, міленькі!
Галубочак сызенькі!
Як тваё назвіска?» —
«Па бацюшцы Краковіч,
Па матушцы Паповіч;
Бог жа мяне захаваў,
Што з табой к вянцу не стаў!»
Пайдзём жа на магілу,
Нарвём травы сілу,
А як будзем траву рваць,
Брата, сястру памінаць;
Скажам — то ж травіца,
Што «брат і сястрыца»!

*1857 года мая 3 д., Менск*

# БЫЛІЦЫ, РАСКАЗЫ НАВУМА

*Навум да братоў мужыкоў*

Паслухайце, браткі, Навума старога!
Ён у час дасужны дзянёчка святога
Будзе весці расказы аб розны быліцы,
Што здарылась намесь[1] у нашай зяміцы:
Аб братах Калетках і паганай жонцы,
Старым Забалотным і аб Шавалонцы,
Аб каранаванні, прыгодах маскоўскіх,—
Вы зроду не чулі аб дзівах такоўскіх!..

[1] Намесь — трэцяга дня; спосаб выказвання селяніна, калі апавядае пра мінулагоднія здарэнні.

## ЗЛАЯ ЖОНКА

Добра жонка — дома рай!
Злая — з хаты цягу дай!

### Песня 1

Дачушка — не цялушка,
Не досыць ёй пасаг даць:
Трэба ў чэсці гадаваць,
Трэба дурну навучыць,
Як мае Бога хваліць,
Шанаваць старых бацькоў,
Чурацца ліхіх нароў!

*Гутарка Навума*

### Браты

Прыгож край заморскі — дзівы там страшэнны!
Народ, кажуць людзі, разумны, пісьменны!
Мужычок багаты! — у чобатах ходзіць,
А Божая ніўка беленькі хлеб родзіць;
Усяк сабе панам — шчасліў быт дамовы!
Да не шукай сэрца — то ж народ тарговы!

Ой, нямаш зямелькі, як Літва радзона!
На лугах дыванам сцелецца зялёна
Травіца па пояс, кветкамі мігае!
А лес, вось тычынка, неба падпірае!

Мужык хоць убогі,— як вол, працавіты!
Гаруючы цяжка, рэдка калі сыты;
Зато ў позну восень, як з ніўкаю зладзіць
Дый святой нядзелькай на куце засядзіць,
Яго ж маладзіца, Домна чы Усціння,
Спражыць верашчакі, наварыць бацвіння;
Хоць хлябок чарненькі, часам і з карою,
Вясёл! пажывае з сваяшнай раднёю!

А госць паявіцца — то ж прыслан ён небам!
Рад з ім падзяліцца сэрцам, стравай, хлебам!
Дзякуй, што навясціў мой дамок старэнькі,
Пій, еш — пакуль змога, госцік дарагенькі!

Яно няма чаго! было б здаволь хлеба,
Стала б на ізбыткі, што душы патрэба,
Да за грэхі людзей сумеў Бог скараці,
Вось панам ахвоту даў карчмы стаўляці:
Яны ў карчмах жыдоў, наліха, садзілі,
Штоб нас абдзіралі, мужыцку кроў пілі!

Нехрысты ўсё дабро к сабе прыгарнулі,
І ўзяла моч погань — дзяруць да кашулі!
Хош купіць нарогаў, сярпа, касы, солі,
Гарчык-другі жыта з сваёй ўласнай ролі,
Хош здору, акрасіць бацвіння ліхоя,
Кланяйся паганцу — дый плаці удвоя;
Не саромеюцца ж валяць рукі ў сала,
Скора будуць самі есці напрапала.

Аб'явіў цар указ з карчом жыдоў гнаці,
Да не тут-та была! ўзялі хітраваці,
Яны там харчэўні быццам залажылі,
У карчмах шынкарак сваіх пасадзілі;
Толькі цяпер ўдвоя мужык плаціць чарку,
Бачыш, жыду трэба заплаціць шынкарку,
Дый і ацэсару трэба пакланіцца,
Рука руку мые — чаго тут дзівіцца?!
Ой, штоб эты п'яўкі кроў нашу не ссалі,
У нашай зямельцы бяды б мы не зналі!»

Так стары Акула, вячэрняй парою,
Седзячы на прызбе, бедаваў думою;
Ўлад наровіць думцы на западзе сонца,
І месячка смутна глядзіць у аконца.

На сэрцы старога налягла кручына,
Із вачэй ракою кацілась слязіна;

Уздыхне цяжэнька, на неба пагляне
Дый, штоб забіць гора, маліцца ён стане.

Тут скрыпнулі дзверы: старэнька Тацяна
Села пры Акуле — то ж жонка кахана!
Яны гадкоў сорак быццам пераснілі,
Ядыначку дочку, на бяду! прыжылі.

Чаго ж тут, здаецца, бедаваць старому?
Даў Бог шчасну долю,— дастатак у дому,
Ссудзіў яму, дзеткі! розум на дзівоту,
Да добрага дзела шчыру даў ахвоту:
Што ж тут ён на долю горку наракае?
Ой, ніхто з вас, дзеткі! таго не згадае!

Вось пры беразе Дняпровам,
Гдзе шыбуюць байдакі,
У сяле да у скарбовам
Жылі браты-рыбакі.

Іх прыгожанька хаціна,
Маўляў, цару на паказ!
Малявана — баш каліна!
Весела марочыць глаз!

Рыбак Апанас Калетак,
Што ў сяле багацтвам слыў,
Паставіў яе для дзетак
І галоўку там злажыў.

Па ім два сыны асталісь,
Старшы Тодар, меншы Сак;
Браты з сабой мілавалісь,
Маўляў з літвіном паляк.

Баш рукавіца з рукою,
А з тапарышчам тапор,

Так неразлучна з сабою
Вялі жыццё Сак, Тадор.

Бывала, да свету ўстане
Адзін — вось рыбу лавіць,
Другі ў гаршчок не загляне,
З ядой пры рацэ стаіць.

А хлапцы ж былі прыгожы,
Кветачкамі у сяле!
Любаваўся з іх свет Божы
На ігрышчах чы ў карчме!..

Тодар жа хлопец, як мала!
Для дзяўчаці, быццам клад;
Лісам к яму падсядала,
Аж дзела пайшло ў лад.

Не на жарты пакахаліс,
І сватоў к ней хлапец слаў,
І ў касцеле абвянчаліс;
Сак іх чэсна ў дом прыняў.

Чаму ж бы тут не зажыці?
Кахаў мужык, любіў брат,
Здаволь было есці, піці —
Вядзі толькі чэсна лад!

Да не тут-та, дзеткі, стала!
Як узяла правіць дом,
Весь дзянёчак лепятала
Сваім злосным языком.

І не адну там слязіну
Ураніў бедны рыбак,
І пачуў цяжку кручыну,
Гледзя на браточка, Сак.

Яшчэ ж як-кольвек цярпелі,
Штоб у хаце мець спакой,
І чэраз пал[ь]цы глядзелі
На лад гаспадыні злой.

Да прыйшла пара на Сака —
Так жаніўся, што Бог дай!
Тут завязалась крутня, драка,
Проста з хаты уцякай!

Вось пайшло з якой прыгоды:
Жыла ў сяле сірата,
Чэсна, ангельскай уроды,
Сэрцам, душой залата!

Семнаццаць гадкоў лічыла,
Як бацька яе памёр,
І па ім ад[д]зедзічыла
Кусок раллі, стары двор.

Зоська — імя сіраціне —
Стала ў хаце гараваць,
Сак жа добранькай дзяўчыне
Шчыра ўзяўся памагаць.

Так яны з сабой здружылісь,
Сэрцам, душой прыляглі
Дый скора вянцом злучылісь —
На сіроцтве зажылі.

Маўляў, гдзе чорт сам не зможа,
Туды ён бабу пашле;
Браты,— жыўшы што дай Божа! —
Разлучыліся ў тузе.

Бо Уляна сплятней многа
Ляпеча злым языком;

Раздорыла братоў срога,
Сак пакінуў родны дом.

Тодар жа, багат дабыткам,
На бацькаўшчыне зажыў,
Да і Акула з ізбыткам
Дачушцы пасаг ссуліў.

Красуюць яго палеткі,
Густы колас на раллі,
Ёсць і доля, ёсць і дзеткі;
Жыві дый Бога хвалі.

Да не тут-та, браткі, была!
Начаў з гора бедны піць;
Злая жонка, маўляў піла,
Дзень і ноч мужу скрыпіць.

Адчурыўся гаспадаркі
І з дому стаў уцякаць,
Часта заглядаў да чаркі,
Палюбіў ў карчме гуляць.

Што ж рабіла зла Уляна?
Кінула чэсць, сорам проч!
З дзецюкамі вось ад рана
Гуляла у позну ноч.

А ў хаце непарадкі,
На ніўцы пырнік густы;
Гдзе дзяваліся дастаткі?..
Вось і стадолы пусты.

. . . . . .

Бяда ў хаце — людзям смех!
Дарма бацькі памагалі —
Насып жа дзюравы мех!

Катаргай жыццё такое!
Часта браўся за тапор —
Збрыдла населля радное.
Ой, бедненькі ж наш Тадор!

Інакшая ж Сака доля —
Гараваў, дзеткі, як змог;
Дзейся, кажа, Божа воля!
А хто з Богам, з тым і Бог.

Вечарком, па працы, з нівы
Як волікаў прыжане,
З песняй вясёлы, шчаслівы
І га́дкі сабе не йме!

Яго з таской выглядае
Добра Зоська у варот,
Яго сэрцам прынімае,
Сцірае з галоўкі пот
Дый песціць мужа, галубіць;
Рай з жонкай такою жыць!
Яна душой яго любіць —
Як жа шчаслівым не быць?!

Хоць трудна было пачаці —
Працаю бяду змаглі;
Зоська лад вяла ў хаці,
Сак жа пільнаваў раллі.

І скора забагацелі,
Любаваўся з іх усяк;
І дзетачкі загудзелі —
Забыў гора добры Сак!!

## Песня 2

### Злая жонка

Засвяціла людзям багата нядзелька —
Дзянёк адпачыла родная зямелька;
Кранувўся люд Божы грамадой із сёла,
З шчыраю малітвай пайшоў да касцёла.

У гарсэціках красных вясёлы дзяўчата
Радасна страчаюць вялікае свята:
«Упляці ж мне каснік, родненькая маці,
Пойдам на ігрышча крыху пагуляці».

А хоць, баш, пры дзеле ног не жалавала,
З дзецюкамі скача ўсю ноч напрапала,
Не жалее ножак, з шчыраю ахвотай,
Хоць заўтра спаткацца зноў трэба з работай.

Пан ляндар Біёмін па карчме нясецца,
Ладзячы парадак, як не ўверадзецца!
То з пляхай, то з чашкай з кута ў кут лятае,
Крыкне на шынкарку, на шэйну міргае;
Та нясе закускі, селядзец, баранкі,
Ставіць гарчык піва, налівае ў шклянкі.

Расчыняты насцеж дзверы ў стадолу,
Раве там скацінка песеньку вясёлу;
А бахураняты — нячыстая сіла! —
Гуляюць з казою, аж паглядзець міла!

Адзін, баш на кані, сядзіць на казіне,
Той цягне за рогі, другі б'е па спіне,
Аж бакі запалі у беднай скаціны,
Дзярэцца, што крый Бог! у голас казіны.

З тонсенькай смаркачкай вось пяціпальцаты
Вісіць на палупе свячнік сярод хаты;

Пры печы ж у бабцы ваткнута лучына
Гарыць яркім жарам, баш красна дзяўчына.

За сталом паважны сядзяць гаспада́ры,
Балакаюць сабе, папівая га́ры;
Гладкі маладзіцы памеж мужыкамі
Частуюцца чаркай з кумкамі, кумамі,
А старыя ведзьмы і бабы касцельны
Брыдкі — аж страх глянуць! — маўляў, грэх смяртэльны,
На прыпечку седзя, шэпчуць злы урокі
Дый завідным вокам мераць пляшак бокі.

Пры дзверах каморы стаіць стол вялікі,
А на ім два столкі, на столках музыкі;
З пілачкай у зубах Астап прым заводзіць,
А сляпы Калейнік ўсцяж па басе водзіць.

Ідзе ладам, дзеткі, вясёла крутуха,—
Хлапцы падбіваюць, Астап рве з-за вуха!
Красны ж дзяўчаты хустачкамі машуць,
Ракой пот з іх льецца, да на убой пляшуць!

Маладзенькі Саўка пры музыцы стане,
Міленькай Агатцы у вочкі загляне,
Тупне нагой трэйчы, аж уздрыгнуць дзеўкі,
Дый вядзе пад скрыпку гэтакі прыпеўкі:

«Цвіце ў агродку ражычка,
Ў полі васілёчкі,
Да ярчэй красуюць лічка,
Агатчыны вочкі!
Гу! га! — не бяда,
Агатчыны вочкі».

Сарамліва дзеўка хустачкай закрылась,
Твар аблілась жарам, сэрца ёй забілась,—
Хлапцу кулак суліць, гневацца б хацела,
Да не стала часу, крутня закіпела.

Нясуцца, дый годзе! Тут з Настай Міронка
Стане пры музыцы дый завядзе звонка:

«Калі любіш — дык любі,
А не любіш — не мані,
Я другую дзеўку маю,
Яе любіць папытаю.
Гу, га! — не бяда,
Яе любіць папытаю».

І пайшлі круціцца... страх! дзіва вяліка!
Вось за кружком трэцім, гдзе была музыка,
Стала нова пара — п'яная Уляна,
Яна за сабою валачэ Багдана.

«Выгнала ж я із хацінкі мужыка ліхога,
Частавала цэлу ночку маяго мілога;
Прынёс жа мне ён учора чырвоную стужку,
Прапіла ж я з ім, радзенька, апошню цялушку.
Гу, га! — не бяда,
Апошню цялушку!»

Гадка, страшна слухаць! — воласы прыўсталі,
У вочы злой кабеце усе там плявалі;
На прыпечку толькі ведзьмы зарагочуць,
Яны душу грэшну к чорту загнаць хочуць.

Уляна ж ні гадкі! — круціцца па хаці,
Валочыць Багдана, рада з ім гуляці;
Усе адчурылісь ад чартоўскай пары,
Дзеўкі, маладзіцы, чэсны гаспадары.

Аж тут скрып з надвор'я, дзверы расчынілісь.
І новыя госці ў карчму паявілісь:
Наперадзе Тодар, за ім Сак з таскою,
Ідучы за братам, круціць галавою.

На Тодара гледзя, аж душа балее —
Малады гадамі без пары старэе;

Гдзе краса, што даўней на шчоках гуляла?
Сярдзечна вяселле, што за сэрца брала?
Гдзе тыя васількі, што ў вачах мігалі?
Гдзе для смеху губы, гдзе на іх каралі?

Твар поўна запала, губы пасінелі,
Валасы чарненькі суздром асівелі;
Вочы ізпадлоб'я мутна паглядаюць.
Лепшых у магілу, дзетачкі, кідаюць.

Мігам пры Уляне рыбак паявіўся,
Так швырнуў Багданка, што той пакаціўся;
Ухваціў ён жонку за руку кляшчамі,
Глянуў на музыку дый тупнуў нагамі:
«Не смей, воўча племя, з чужой жонкай гадзіць!
Не смей на ігрышчах танцы з ёю ладзіць!
Я ж першае права гуляці тут маю
І песеньку лепшу жонцы заспяваю».

Пагана Улянка вырвацца б хацела,
Палатном са страху яна пабляднела,
Торгне сюды-туды, да, як рак кляшчою,
Рыбак жонку дзержыць сільнаю рукою.

«Ты, вялікі Божа! і вы, добры людзе!
Судзіце, яка тут справа мужа будзе
З ліхою кабетай, што Бога забыла,
Ў гроб дзетак вагнала, мужыка згубіла!

Вось у нашым сяле я з Сакам, браточкі,
Душой мілавалісь, быццам галубочкі;
Злым языком ты нас раздорыць успела,
Братавай ты добрай горка надаела!

Рассталісь мы з братам, стаў я гаравaці,
А ты ветры гоніш, госцяю у хаці;
Не было спакою з табой ні дзянёчку,
І бацькі не змаглі уняць злую дочку.

Мужыка, бывала, прагоніш з валамі,
Сама напрапала гуляеш з хлапцамі;
Дзеткі крычаць хлеба — галодны зязюлькі!
Каравы, абдзёрты на бедных кашулькі.

З недагляду твайго дабро нам прапала,
Рэшту — частаванне, гарэлка забрала:
Не было жыцця ў нас, парадку ў дому,
Бязладдзе! ўсё к чорту пайшло і к Біёму.

Пабегла й сягоння, кінула хаціну,
Уткнуўшы у шчэлку смольную лучыну;
Згарэлі астаткі дый родненька хатка,
А з хаткай паследня нашая дзіцятка.

Чы чуеш? дзіцятка! ты, гадзюка злая!
То ж твая утроба, твая кроў радная!
У вялікіх муках бедненька згарэла,
Радуйся, пагана! гэта ж тваё дзела!!»

Так заводзіць Тодар; крывавы слязіны
Коцяцца із вачэй, быццам дождж з-пад рыны;
Запеклыя губы пенаю бялеюць,
Грудкі цяжка стонуць, а хоць ногі млеюць,
Як бешаны круціць жонкай па святліцы;
Спужаліся хлопцы, дзеўкі, маладзіцы,
А старыя мужы смутна уздыхаюць,
На Тодара глядзя, слёзы выліваюць.

Бяспамятны рыбак швырнуў назем жонку,
Сільнаю рукою ухваціў дубёнку,
Дый ахрыплы голас падняў ён у хаці:
«Га! жмяіна племя! годзя бушаваці
Па беламу свету, досць, мая ядына!
І на цябе прыйшла апошня гадзіна!»

Моланняй к Уляне мужык падбягае,
Цяжкую дубіну ўгору паднімае,

Пагана кабета трасецца, чуць жыва!
А ведзьмы рагочуць — то ж чартоўска жніва!

Добры Бог іначай запісаў у небе,
Малітвы, знаць, маці ў цяжкай патрэбе
Ізбавілі дочку пякельныя мукі:
Вось ад страшнай месці брата сільны рукі
Тодара здзяржалі, ён братаву збавіў,
Процію бешанага сваё жыццё ставіў.

«Сатры яе ў порах!» — голас адазваўся
Пры дзверах з падвор'я — усяк іспугаўся!
«Валі ў лоб дубінай! Я за то атвечу,
Годзе забіваць ёй долю чалавечу!
Годзе несці сорам і бацьку і маці!
Ліхое ж мы племя выпесцілі ў хаці!
Што прыжылі дочку, лепш бы смерць сустрэлі!
За пазухай змяю ядавіту грэлі.
Выракаюсь благой! забыць папытаю,
Сведкамі Бог, людзі — яе праклінаю!»

Так крычыць Акула пры дзвярах святліцы,
А горкі слязіны, быццам із крыніцы,
Із вачэй старога па барадзе льюцца,
А рукі, а ногі асінай трасуцца.
Чаго ж тут дзівіцца, мае вы міленькі,—
Ліхой ядыначкі то ж бацька радненькі!

Старшына, ўсе мужы із лавы прыўсталі,
К злашчаснаму бацьку гурмам падбяжалі,
Увялі у хату, вось на куце садзяць
Дый у цяжкім горы цешаць яго, радзяць;
Да трудная ж рада у такім няшчасці,
Пацеха старому ў Божай хіба ўласці.

І Бог змілаваўся! мужа, бацькі мовы
Уразумілі ліху на ўсе злы наровы:
Спазнала няшчасна, што цяжка грашыла,

Што здуру дзіцятка паследня забіла,
Залілась слязамі, нішкам, як стаяла,
Добрынькаму бацьку да ножак прыпала.

«Бацечка мой родны, бацечка ядыны!
Прабач жа ты дочцы горкія слязіны,
Прабач, што чэсць тваю брыдка замарала,
Што тваёй галоўкі не ушанавала!
У маім няшчасці, утрапенні срогам,
Прысягаю табе перад людзьмі, Богам,
Што ад гэтай пары буду я старацца,
Калі б табе дочкі не прыйшлось стыдацца,
Буду шанаваці твой волас сівенькі,
Даруй раз апошні, бацечка радненькі!»

Плачуць бацька, людзі, галосіць Уляна,
Аж адкуль вазьміся старая Тацяна.
Пры нагах Акулы з матчынай слязінай!
Сплялася з нагамі, маўляў хмель з тычынай!

«Добры мой Акула, дарагі мужочак!
Саракавы на днях кончыўся гадочак,
Як Гасподзь злучыў нас, як з табой зажыла,
Чы ж я калі табе вока запрушыла?
Было ўсяк на свеце, чы ж я наракала,
Маўляў, душой, сэрцам цябе не кахала?
Заклінаю ж цябе на спакой твой ўласны,
На дні нашы горкі, на дні нашы шчасны,
Не праклінай дочкі, забудзь усё злое,
То ж тваё няшчасна дзіцятка радное!
Лепш бы я галоўку ў зямельцы злажыла,
Як такой пацехі з дачушкі дажыла.
Вы, добрыя людзі! І ў вас ёсць дзяціны,
Пажалейце ж горкай матчынай слязіны
Дый з яе мальбою і свае злучыце,
Вы срогага бацьку мо'а ўгаманіце;
Калі ж і вас слухаць не йме ў страшнай злосці,
Няхай кляне разам і матчыны косці!»

Заравелі ўголас усе добры людзе,
Вось душы пякельны на вялікім судзе;
А Акула жонцы на грудках прыляжа,
У жаласці дочцы гэтакі суд кажа:

«Не мяне прасіце, не мяне маліце,
Да вунь там пры лаве у кут загляніце —
Там муж твой няшчасны, суддзя твой ядыны.
А бацькава сэрца — маўляў васкавіны,—
Я табе прабачу, калі ён прабачыць.
Ой, крывавай слёзкай на цябе ён плачыць!
Ідзі, кінься ў ногі, рві зямлю зубамі,
Злітуецца мо'а над табой, над намі».

А Тодар няшчасны закрыў твар рукою
Дый цяжка рыдае крывавай слязою;
Сак з Зоськай, забыўшы злосць ліхой кабеты,
За братаву чыняць святыя абеты.

Уляна ледзь толькі з зямелькі прыўстала,
Так вось на калені перад мужам пала;
Яна накрыж пальцы свае залажыла
Дый таку прысягу яму учыніла:

«Мужок дарагенькі, саколік мой красны!
Злым жыццём смуціла я твае дні ясны.
Да прабач мне, зорка, даруй, мой ядыны!
Ліхія наровы, смяртэльныя віны!
То ж і Бог прабачыў нячыстай кабеце,
Як змазала грэхі пакутай на свеце.
Няхай жа Бог судзіць мяне ў Страшным Судзе,
Сведкамі тут бацькі, сведкамі тут людзе:
Калі я натуру не змагу пагану,
Калі добрай жонкай я табе не стану,
Шанаваць не буду тваёй добрай чэсці,
З табою, з тваімі ціха жыццё весці,
Тады злой галоўкі няхай гром не міне,
Пабі мяне, Божа, у кожнай гадзіне!»

Тацяна ж на грудзі зяцёчка упала,
Галосячы, таку просьбу завязала:
«Тадорка каханы, саколіку ясны!
Горка твая доля, да і мы ж няшчасны;
Цябе злая жонка на чэсці забіла,
Табе ўсё дабро дый дзетак зглуміла,
А нам жа, мой родны, нам, зорка ядыны! —
Чы ж не больна глядзець на дачушкі віны?
На душы ж не цяжка злашчасная доля?
Яе злы наровы, пакасна сваволя
Каменем на сэрцы — дзіця ж то раднóя!
Вер, дарагі зяцёк, нам баліць удвóя,
Да мой жа ж лябедзька! Мой ты каласочак!
Ушануй ты бацькоў сівы валасочак
Дый паслухай просьбы няшчасныя маці,
Прабач раз апошні горкаму дзіцяці.
Цяжкае няшчасце яе ўразуміла,
Яна, як Бог кажа, будзе з табой жыла».

Такі просьбы маці камень бы разбілі,
Дзіва ж што Тодару сэрца размякчылі.
Уздыхнуў ён цяжка дый сказаў да маткі:
«Чаму ж не дзяржала у гразе дзіцяткі?
У баязні Божай яе не хавала?
І я б меў бы шчасця, ты б не гаравала;
А цяпер ты плачаш, і я з табой плачу.
Дзей жа воля Божа! Яшчэ раз прабачу;
Калі ж ёй навука гэта не паможа,
Няхай злу галоўку дзержыць у старожы!»

Так сказаўшы, Тодар працяг к жонцы рукі,
Забыў сваё гора, крывавыя мукі,
У яго мутных вочах горка жаласць блісне,
Блудную авечку да сэрца прыцісне,
Дый усё забыта! Людзям вочы трущца,
Да ўжо радасныя слязінкі там льюцца.

Астапка, упёршы ў бруха скрыпіцу,
Ён, дзеткі, з-за вуха рвануў «Мецяліцу»!

Да ніхто не ўзяўся, хоць ахвоту чуюць,
І на душы цяжка, й ногі не статкуюць.

Калі чалавеку здарыцца упіцца,
А назаўтра зможа чаркай пахмяліцца,
Яно лягчэй быццам — жывату цяпленька,
Да на сэрцы млосна і нагам цяжэнька.
Так і з маладымі: дарма Астап рвецца,
А хітры Біёмін каля хлапцоў трэцца,
Дзяўчат намаўляе — няма, браткі, ладу,
Вось напала змора на цэлу грамаду.

Старшына паважны з сівай барадою
Пашаптаў з другімі, кіўнуў галавою
Дый уголас кажа: «Пане аляндару!
Дай нам гарчык піва і вяліку чару,
Накінь там закусак у белы тарэлкі;
Акула і ў губу не бярэ гарэлкі,
Няхай жа хоць півам крыху пакрапіцца,
Трэба ж тут як-небудзь нам развесяліцца!
А калі ахвоты гуляці не стала,
Лень на маладзенькіх якаясь напала,
Ты, пане Акула, пакінь нараканння,
Слухай лепш расказу аб каранавання,
У Маскве якія аглядаў я дзіва,
Як мне ў дарозе вялося шчасліва.
Прашу ж цябе, кумок, сядзь тут са мной разам,
Аб усім, што бачыў, пацешу расказам».

Акула сеў на кут, кулаком падпёрся,
Выпіў шклянку піва, палою абцёрся
Дый вокам туманным павёў па грамадзе;
Усякі, гдзе зможа, скоранька прысядзе,
Цікава, што стары будзе ім казаці.
Астап кінуў скрыпку; прыціхла у хаці.

# ХАЛІМОН НА КАРАНАЦЫІ

## Песня 1

## Дарога

Як рыбак з уткай над прудам,
. . . . . .

Ў строп старшына упёр глаз;
Штосьці ён на вус матае,
Знаць, дзівы прыпамінае,
Вось начаў такі расказ:

«Унялась бура страшэнна,
Мінула граза ваенна,
Устаў цяжкі матак стон!
Спрыкрылася людзям драцца,
Ўзяліс з сабой цалавацца,
Пранцуз дахаты галён!

І апалчэнцы з крыжамі
Вялікімі грамадамі
Радзенькі брадуць к даму;
Адзін гасцінец з сабою,
Другі рад, што хоць з душою
Ў сваю верне старану.

А раненыя салдаты
Хоць на кулях, да багаты!
У крыжах стальная грудзь!
Свае іх чэсна страчаюць,
Хлебам, соллю прынімаюць,
Дзяўчаты вянкі плятуць.

Зямелька павесялела,
І песенька загудзела,

Аразвела кожна твар;
Мужык стаў за ніўку брацца,
Нечага у лес хавацца,—
Рад малады, рад і стар.

Вялікі, баш, цар маскоўскі
Аб'явіў указ такоўскі,
Што абойме бацькаў трон;
Уложыць царскія кароны,
Падданых сваіх паклоны
У сталіцы прыме ён.

Да не то што людзі свойскі,
Вось, браткі, паны заморскі
Сталі той указ чытаць;
Спужаліся небажата!
Слалі пасольства багата
У Маскву — паклон аддаць.

Падумаў царок дабрэнькі,
Што вось Халімон старэнькі,
Гарадэцкі старшына,
На прозвішча Забалотны,
Мо'а б, дзеткі, быў ахвотны
Спазнаць сваяго цара.

Зазваў вялікі паняты
Дый у Імушчэств Палаты
Прыказаў пісаць указ,
Штоб старшыну адшукалі,
На дарогу грашэй далі,
У Маскву выслалі ўраз!

Як указ той прачыталі,
Вóласы на сабе рвалі
Ўсе палатныя чыны;
Акружны ледзь не збясіўся,

Яго пісар аж упіўся,—
Така чэсць для старшыны!!

Дзве нядзелькі чыняць рады,
Яку к старшыне грамады
Бумагу ім напісаць?
Штоб, баш, ён не разазліўся,
Ў Маскве цару не журыўся;
Дзела б за сэрца уняць!

І прыдумалі — ў прыказе,
На златабрэзнай бумазе,
Такія рэчы вядуць:
Штоб старшына Забалотны
Прыбыў у горад хоць пяхотны,
Яго ў Палаце ждуць.

Добра прыгаворка кажа:
Вяліць пан, то скачы, ўража! —
На то ж старшыною стаў.
Вось запрог я каламажку,
Наліў квасочку баклажку,
Талакна ў гаршчок наклаў
Дый у Магілеў пусціўся,
Ў канцаралію явіўся,
Проста к трэцяму сталу;
Там панок вельмі чыноўны,
Вёрткі, наліха размоўны,
Чыніў мне просьбу таку:

«Дарагенькі мой старшынка!
Вось расчынятая скрынка
І царска міласць табе;
Бяры грошы, сколька стане,
Паедзь на каранаванне —
Цар у госці жджэ к сабе».

Нечага, браткі, казаці,
Панкі добрыя ў Палаці,—

Навучалі мужыка:
«Ты у Маскве не лякайся,
На царамонью яўляйся,
Крычы з другімі “ура!”».

Думалі, што Забалотны
Галавой не абаротны,
Згадзіць беларуську чэсць.
Нябось!.. мы самі з вусамі,
Знаем, як ладзіць з панамі,
Умеем парадак весць.

Згроб карбованцы у шапку,
Хваціў бумагі ў ахапку,
Панкам нізкі паклон даў,
На квацеры апынуўся
Дый кажухом апрануўся,
Ўсе рэчы свае звязаў.
Чакаю, саўсім гатовы,
Аж вось і пісар пачтовы
Глянуў, дзеткі, з-за вакна;
Боязка шапку знімае,
А пасля, чы тут, пытае,
Гарадэцкі старшына.

Да тут, кажу, ён у хату
Глядзіць, чы клажу багату,
Аслі цяжак мой снарад?
Далей лісам, астарожна,
Папытаў, гдзе падарожна,
Пакланіўся дый назад.

Чакаць — мужыцка прывычка;
Аж тут два кані і брычка
Пад ганак стралой ляціць;
Быццам для яснавяльможна,

Ладзяць рэчы астарожна,
Пайшоў!.. і званок звініць!

Стралой конікі ляцелі,
Шашой калёсы гудзелі;
На дарожцы ні браду,
Ні гарбочка, ні даліны,
Раўчука, ні каляіны —
Едзеш быццам па ляду.

Маўляў звёздачкі сіяюць,
Так па старанам мігаюць
Маляваныя дамкі;
Пры іх з кветкамі садочкі,
Тут жа з варывам градочкі,
Лесам на іх буракі!

Ўміг на станцыю прымчалі,
Там ужо, дзеткі, чакалі
Із Гарадка старшыну:
Пісар падарожну справіў,
Свежых конікаў паставіў,—
Кіпела! — вось у агню.

Ямшчык па трыгельт явіўся,
Ўзяў шастак дый пакланіўся,—
Ты Забалотнага знай!
Мы чэсці сваёй не здрадзім,
Там, гдзе трэба, не падгадзім,
Толькі ж каней паганяй!

Ды пачтовыя ж там хаты,
Быццам царскія палаты!
Боязка па іх хадзіць;
Ты ў лапцях не пакажыся,
Плюнуць назем сцеражыся!
Там і пол красна блішчыць.

Так едучы дзень і ночку,
К вялікаму гарадочку
Прыляцелі не ў агляд;
Там станцыя пачтавая —
Дзіва, браткі! люстравая!
Золатам блішчыць снарад.

Смаленскам горад той зваўся;
Там, на шчасце, я спазнаўся
Са Стахоўскім старшыной:
Базылём яго хрысцілі,
Шавалончыкам манілі,—
Ён з Пінска вядзе род свой.

Знайце ж, дзеткі, павет Пінскай,
Зямля губерніі Мінскай —
Вяліка там нізіна;
А ўюноў — мае міленькі! —
Лаві прыполам радзенькі,
Што роў, то прыстань ўюна!

Думаю, дзельна прычына!
То ж чужой зямлі старшына,
Трэба ж нам тут не ўвазнак
Паказаць чэсць беларуску,
Паднясці чарку, закуску,—
Гдзе дзела, не грош шастак!

Індыком начапурыўся,
Важна ў пояс пакланіўся,
Пусціў яму рэч таку:
«Пойдам харчэўню праведаць,
Выпіць чарку дый паснедаць —
Я за ўсё, братка, плачу».

Пан Шавалончык ахвотна
Уважыў чэсць Забалотна —
Пайшлі горла прамачыць.

Харчэўня ж пры почце блізка;
Уходзім, кланяемся нізка,
Просім квацерку наліць.

Там маляваны палаты!
Дый ляндар, відна, багаты,
Із зямелькі ён чужой,
Языком не хрысціянскім,
Заморскім, якімсь паганскім,
Балбоча, быццам ліхой.

Думаю,— ты шварнудзёнак!
Забалотны, Шавалонак —
То ж не простыя чыны!
А ты мелеш небыліцу,
Не бачыш, што у святліцу
Важны прыйшлі старшыны!

Дый крыкнуў — селядца справіць!
Перцу, цыбулі дабавіць,
Абрусом тут стол накрыць!
Аляндар, відна, спужаўся,
Падбяжаў к нам, засмяяўся,
*«Кеске, кішке?»* — гаварыць.

Ах ты, ліхая чарціна!
Хош, штоб з Гарадка старшына
Пайшоў к злому на пахмель?
Ў пятніцу скорам валочаш,
Накарміць нас кішкой хочаш? —
Баш ты яго, мудрагель!

Ляндару ў вочы плюнуў,
З Базылём на почту сунуў,
Узяў там з гаршка талакна,
А Базылі Шавалончык
Дабыў уюноў ражончык —
То ж, брат, царская яда!

Так мы ў дальшую дарогу
З Базылём вось — хваліць Богу! —
Ў адной брычцы пацяглі;
І нам было весяленька,
Да і кішэні схадненька —
Папалам мы кошт вялі.

Ранкам багатай нядзелі
Пад Барадзін прыляцелі.
Страх! магілы там блішчаць;
Да ўсё, дзеткі, не прастыя,
Камянныя, залатыя,
Міла ж там панкам ляжаць!

Мы і ў Вязьме пабывалі,
Пернікаў там накуплялі;
А пернікі ж?! дзівісь ты!
То пявункі, то салдаты,
То казельчыкі рагаты,
То паненкі залаты!

Шавалонка ж, Забалотна
Ўсюды страчаюць ахвотна,
Не малыя ж то чыны!
Ледзь у падарожну глянуць,
Так зараз кратацца стануць —
На каранацью едзем мы!!

Вось сэрца рускай зямейкі,
Благачасцівай сямейкі,
Масква засвяціла нам!
А мае браткі міленькі!
Мае зоркі дарагенькі!
То ж ліку нямаш царквам!

Ўсяка манерам інакша,
Адна ад другой багатша,
Золата каплець з дахоў!

Як у кожную заглянеш,
Святым неўнарок ты станеш,
Маліся толькі здароў!

Ўязджаем! Горад багаты!
Свецяць каменны палаты,
У вуліцах хмара людзей!
Тут жа пры кожным дамочку,
Як мурашкі пры гняздочку,
Буркуе цьма галубей!

Вось і кончылась дарога.
На сэрцы якась трывога —
Дзіва ж, браткі! Царскі госць!
Трэба ж нам тут не падгадзіць,
Віншаванне цара зладзіць,
Да на то ж галоўка ёсць!»

Тут стары крыху прыстане,
На грамаду важна гляне,—
Страх, браткі! — людзі дрыжаць;
Вось хацелі б падзівіцца,
Канца расказу дабіцца —
Усе, баш рыбкі, маўчаць!

## Песня 2

### Каранацыя

«Над горадам зорка ясна засвяціла,
Настаў дзянёк важны,— і Масква ажыла!
Крычыць на ўсё горла народ весяленькі,
Што навясціць горад царочак дабрэнькі.

Не адзін прыбудзе у сваю сталіцу,
Ён прывязе з сабою красную царыцу;

А як рой за маткай, за царком паночкі,
Радня, ан[а]ралы, заморскі князёчкі,
Парадкам уедуць, і места па чыне;
Ў залатых карэтах белыя княгіне,
А на іх брылянты, маўляў на абразках.
Гэтакае ж дзіва чуваць толькі ў казках!

Ад Тверскіх рагатак да сама Крэмліна
Убраны палацы, баш к вянцу дзяўчына!
На вокнах, на ганках атласы, дываны,
У квяцісты ўзоры дзіўна маляваны!
Часам калі летам мак раскрасіць градкі,
Так цвіце ад Крэмля да Тверскай рагаткі.

А народу ж, дзеткі, адкуль узялося?
Вось на бальшом полі густое калосся;
Стоўпіцца пры Крэмлі, па вуліцы мнецца,
Адзін на плот лезе, другі на дах пнецца;
На ганках палацаў, штоб места здабылі,
Карбованцаў дваццаць ахвотна плацілі.

З вялікага жару курацца чупрыны,
Аж дожджык з дзевятай стаў прышчыць гадзіны
Людзі аразвелі, усяк рот разінуў,
Рад, што хоць капальку вадзіцы праглынуў.

На гарадской вежы выбіла дзесята,
І вось адазвалась вяліка гармата.
Яна разы дзевяць страшна заравела,
І новым вяселлем Масква закіпела.

Па вуліцы войскі шыкавацца сталі,
І народ цікавы набок разагналі;
Ў Чудоўскім касцеле да вышня мацара
Ксяндзы шлюць малітвы за доўгі дні цара.

Трэці час ударыў, зноў гудзе гармата,
Званы па ўсёй Маскве вясцяць людзям свята;

У Пятроўскім дварцы князі сабраліся,
І царок сеў на конь, ў горад паняслiся.

Пад'язджаюць к месту; гарматы гульнулі
Семдзесят выстралаў і адзін плюнулі;
Тут цара ваенны губернатар стрэціў,
У яго сталіцы чэсцію прывеціў.
З землянога ж граду гарадскія чыны
Спатыкаюць госця, вядуць да Крэмліны.

Вось к гораду белу царок прыхіліўся,
І шляхецкі маршал яму пакланіўся,
А пры Васкрасенскіх варотах прысталі,
Злезці з каня госцю, хто змог, памагалі.

Там Іверска Мацер — быццам у святыні,
Памалілісь крыху цар, князі, княгіні
Да ізноў на места свае прысядаюць
І к Спаскім варотам важна пад'язджаюць.

Камендант чакае царыцу, царочка,
З кучай анаралаў, ад бела дзянёчка,
Пры Успенскай цэркві санацкі вяльможы
Праважаюць гасцей у прыбытак Божы.

І знову гармата агню даваць стала,
Восемдзесят і пяць разы закрычала;
Моліцца цар з князьмі ў касцеле Успення,
Быццам ангельская ляціць адтуль пення.

Далей яны пайшлі з кучай багамолаў
Чэсць Гасподню чыніць да другіх касцёлаў;
А народ вясёлы на дварэ бадзецца,
А свята малітва да неба нясецца!

Мы вось з Шавалонкам на дварэ Крэмліна
Глядзелі на дзіва; якаясь кручына

Налягла на сэрцы, стала мне маркотна,
Што царок дабрэнькі забыў Забалотна.

Няма чаго казаць! — чэсна прынімалі,
Па два карбованцы у дзень нам давалі,
І квацера наша малявана, красна,
Чыста, весяленька, абалона ясна.
Да вот бы хацелась зблізка падзівіцца
Добраму царочку, з ім разгаварыцца:
Сказаў бы я смела, як мы таму рады,
Што, маючы дзетак нясметны грамады,
Ён паляку, рускім, сынам Русі-белай
Без выбару бацькай для грамады цэлай.
Яму б са слязінай ў ногі пакланіўся,
Прасіў да маліў бы, вось пакуль дабіўся,
Штоб над мужычкамі шчыру меў апеку,
Вялеў справіць розум цёмну чалавеку,
Штоб дзетачак нашых чытаць навучылі,
Штоб Бога па ксёнжцы за цара малілі.

І панкі б хацелі разумных мець людзі,
Да чакаюць, яка царска воля будзі.
Згаварыцца б рады з саседамі ўсполкі
Для мужыцкіх дзетак стаўляць малы школкі,
Ды боязка самім начаць таку справу,
Царскую паруку хочуць мець ласкаву.
А тагды б нам доля лепша засвяціла!
Вось якая мяне дума марачыла,
Да пасля ў галоўцы така мысль даспела:
Царок вельмі занят — вось з чужымі дзела;
Няхай толькі кончыць ён каранаване,
Тагды з Забалотным рады чыніць стане.

Скончылась малітва добранькага па́нка,
Паказаўся людзям у краснага ганка,
Да быстрае ж вока ён, дзетачкі, маець,
Анельскае сэрца ў грудцах яго таець!
Глянуў — дый адразу спазнаў Забалотна,

Без фандабэрыі скланіўся ахвотна;
А народ радзенькі, што цар міла глянуў,
Так у адзін голас — «ура, ура!» грануў.

Сабяры ўсе стрэльбы у адну стральбочку
Дый са ўсяго свету усып парашочку,
Прыбі яго моцна льном з цэлай зямейкі
Да выстралі на бор, мае салавейкі! —
Ад страшнага гуку усе б абамлелі,
Ды галасней людзі то «ура» грымелі;
І я ж, дзеткі, драўся, са мной Шавалонка,
Жываты парвалі, так равелі звонка!

Чаго ж мы так дзерлісь? згадаць я не ў стане.
Чы што цар прыехаў на каранаване?
Аслі што ў багату адзежку убраўся
Дый на красным ганку людзям паказаўся?
Досыць, што крычалі са ўся галасочка,
Аглушылі, пэўне, беднага царочка.

А што ж было далей, мае вы міленькі!
Як папытаў хлеба, солі цар дабрэнькі?
Сколькі ёсць ў Маскве званоў, загудзелі,
Сколькі было гармат, усе заравелі.
Разжаліўся царок, міргнуў на царыцу,
Са ўсімі князямі пайшоў у святліцу.

Вечарам паўсюды агні заблішчалі —
Міла ж пагуляці, дый людзі ж гулялі:
«Czy już się oczyściły niebieskie sklepienia?»
Ledwo uspokojony po minionej burzy,
Ze swym antagonistą znowu sprzeczki wtórzy.

Po ochoczej biesiadzie i miłej zabawie
Szlachty, już rozmarzonej — do północy prawie,
Uprzejmość gospodarzy i lipczyk spleśniały,
Pomimo ciemnej nocy, wyjazd zatrzymały.
Swieboda,— chóć mu konie najpierwiej podano,
Opuścił dom gościnny aż nazajutrz rano:
Bo gdy usiadł na bryczce,— Mucha zaperzony
Dowodził że najlepiej w szerokie zagony
Usposabiać do siejby poletki borowe;
Swieboda na wspak twierdził, że grunta jałowe
Potrzebują wyrobu,— rownie jak nizina,
Zwłaszcza gdy na poletek paść ma ozimina.
Tak dalece w rozprawy ziemianskie zabiegli,

Że wschodzącej jutrzeńki nawet nie dostrzegli;
I gdyby zanudzony woznica ich sprzeczką,
Tego antagonizmu nie przerwał ucieczką —
Niechybnie sprzeciwięstwa pod noc by ściągnęli,
I zdań swych z flegmą broniąc na miejscu posnęli.

## Rozdział V

Łaskawy czytelniku! — czuję żeś ciekawy,
Wertując tę ramotę zajrzeć i w me sprawy:
Myślisz,— człek, co w swych bliźnich nicuje szeroko,
Musi czystą mieć duszę,— nie sprószone oko;
Wszakże inaczej bywa na ziemskim padole,
I mnie policz,— niestety! — pomiędzy kąkole!

Ktoś — z ośmiu mędrców świata,— pono Josiel z Klecka,
Dowodził że nie pewną jest prawda strzelecka:
Otoż, Cny Czytelniku! — szepnę Ci bez grzechu,
Śmiało do strzeleckiego zapisuj mię cechu.
Drugi ze sławnych mędrców — rabin z Wołożyna,
W pamiętnikach, mających wyjść na świat, wspomina,
Że każda, wabnym oczkiem, nadobna dziewica
Sprowadzić na kraj świata potrafi szlachcica:
Jeśli wierzyć mędrkowi? — klejnot mój nie młody!
Od jednego z dwónastu idzie wojewody!!

Ze szklankową jam nie rad zabawiać się sprawą,
Chyba ta napełniona herbatą, lub kawą;
Zato też do roboty na zielonej niwie
Żyłkę mam nie zwalczoną,— chociaż nieszczęśliwie
Zawsze z onej wychodzę; — często grosz ostatni
Zmuszony jestem dobyć z kieszeniowej matni.
Do pracy jam nie skory,— trudy mi nie znane;
Wiekowi przypisuję lenistwo kochane,
Bo ciężko już na starość człeku się mozolić:
Wszakże wolę próżnować,— a nawet grezmolić,

Niżeli z Sobkowiczem tworzyć w głowie spiski,
Jakby z kłopotów bliźnich ciągnąć dla się zyski.
Więcej żadnych wad nie mam,— jak mi Pan Bóg miły!
Łzy ludzkie na sumnieniu mojem nie ciężyły:
Chcesz więc streścić me życie? — zastosuj nie nową,
Ot z nie wielką odmianą piosenkę ludową:

*Ach kalib mnie z ranku*
*Harbaty choć szklanku,*
*I ciuciunu lulku,*
*Dziaŭczynu Annulku;*
*Harbatu ja piŭ by,*
*Ciuciuniec kuryŭ by*
*Dziauczynu Annulku*
*K siercu prytuliŭ by!*

* * *

Jeszcze Cię do jednego domu zaprowadzę
Cierpliwy Czytelniku,— poznać się z nim radzę:
Dom ten patryarchalne cnoty ojców święci,
Gościnność, aż do zbytku, sąsiadów doń nęci;
Ludzkość, miłość bliźniego widzisz, jak na dłoni!
Stroskany za pociechą na pewno tam goni,
Chory znajduje pomoc,— przytułek sierota;
Tam każda z Chrystusowych uświęcona cnota!

Pani Sędzina Browska, ruchliwa,— nad lata!
Chociaż z siódmym krzyżykiem wkrótce się rozbrata,
Jednakże, gdy nad rankiem jaskrawe słoneczko,
Swym ożywczym promieniem, strzeli w okieneczko,
Patrz! — gospodarna jejmość drepcze, zrzędzi, radzi,
Prawi morały dzieciom,— ospałej czeladzi;
Każdy jej rozporządzeń z namaszczeniem słucha,
Wszakże najczęściej bywa w domu zawierucha,
Bo, słuchając staruszki,— jako gospodyni,
Według zwykłego trybu każdy, co chce czyni.
Niby pod cieniem lipy słabiutkie powoje,

Pod opieką staruszki kwitną trzy dziewoje,
Przykładem zacnej matki w cnoty przodków strojne,
Prawości nieskalanej,— tkliwe, bogobojne.

Błogosławieństwo Boskie poczciwa Sędzina
Ma w synach,— których pono liczy pół tuzina;
Starsi służą krajowi — młódszy w Ojców chatce,
Pracą wyręcza siostry,— dopomaga matce.

Pod tą gościnną strzechę urok jakiś wiedzie,
Dziwo! — toż w roskochanych liczę się czeredzie:
Młódsza córka Sędzinej,— Florcia hoża, miła!
Zawładnęła mą duszą,— serce me podbiła;
Lecz nie myśl czytelniku gdyby te zapały
Bez rozgrzeszenia mojej jejmości się stały,
I ona, równie zemną dziewcze te miłuje,
Jej anielskim przymiotom gorąco hołduje.
Bo też piękną ma duszę,— jak piękną jest sama,
Żadna, choć by najmniejsza, nie kazi ją plama;
Serduszko przepełnione bez miary tkliwością,
Dla cierpiących ją czyni z nieba opatrznością.
Jak lilia, swą bielą oko twe zachwyca,
Równąż jaśnieją barwą anielskie jej lica,
Szyjka jej edredonu puchem miękkim świeci,
Uśmieszek czarujący miłość w sercach nieci,
Ząbki, niby perełki,— zrzenice,— niestety!
Słodyczą napojone ostre dwa sztylety;
Bo gdy ciśnie spójrzenie z oczął lazurowych,
Lub podrażni uśmiechem ustek koralowych,
Taki urok na duszę twoją naprowadzi,
Że czas, wszystko niszczący, nawet go nie zgładzi.

Zajeżdżam więc pod ganek — serce jakoś wróży
Że mię w przysionku spotka kwiat cudownej róży!
I nie zmyliło serce,— z uśmiechem anioła,
Cisnąwszy błyskawice z pod wzniosłego czoła,
Wita mię najserdeczniej i uściskiem darzy;
Zna filutka moc swoją,— wie co jej do twarzy:

Jakoż wdziękiem swych oczął — urokiem uśmiechu,
Wciągnęła mię,— niestety! — do szalonych cechu.

«Poczciwa ma Floruniu! — wykrzyknę w zapale,
Jakże dziś czarującą jesteś,— ideale!
Przed potęgą twych wdzięków klękam — moj aniele!
Tylko poczekaj trochę, chusteczkę rozscielę»:
I sięgam do kieszeni; — psotnica swawolna,
Tuż,— niemal mi pod nosem, rozpościera zwolna
Batystową chusteczkę, pachnącą, nie dużą:
«Nuż klękaj mój rycerzu,— jeślić siły płużą!»
Wyrzekła srebrnym głoskiem.— Co tu począć proszę?
Już by utrzymać balans i ręce podnoszę,
Gotując się do czynu; — w tem jakoby z procy!
Wylatuje z pokojów Edwin ku pomocy.

Pan Edwin, syn najmłódszy zacnej gospodyni,
Bystrością swego wzroku różnicy nie czyni
Między olbrzymim wołem, a małą ptaszyną,
Z przed oczu mu przedmioty najbujniejsze giną.
Raz przyszła mu ochota w myśliwstwo się wdrożyć,
Nabywa więc strzelbeczkę,— nuż zwierzynę trwożyć!
Miesi po polach błoto prawie od świtania:
Szczęście! — postrzega kamień,— na tym siedzi kania;
Skrada się więc powoli,— rozgorączkowany,
By gadzina po trawie,— ślizga się przez łany,
I gdy rozmierzył metę,— do zbrodniarza strzela,
Rad że zgładzi ze świata kurcząt dusiciela,—
W tem o dziwo! — na miejscu gdzie wróg żeru chciwy,
Usłyszał, zalękniony, ryk wołu płaczliwy:
Trafił więc pracownika,— który tam spokojnie
Na miedzy bujną trawką uraczał się hojnie.

Roztargniony Edwinek srzód dziarskiej młodzieży,
Słysząc turkot powozu, w przedsionek wybieży,
By powitać łaskawych,— wprowadzić do domu,
Grzeczności gospodarza nie przyczynić sromu;
A patrząc na przedmioty, gdyby przez zasłonę,

Zdało mu się postrzegać we mnie moją żonę,
Nuż więc prawić grzecznoście,— frantowsko się zwijać,
Niby pielgrzym z północy, pokłony odbijać,
Nuż sypać komplementa jednym tchu oddechem,
Aż sardonicznym z Florcią parsknęliśmy smiechem,—
Wówczas poznał omyłkę,— więc by nie szydzili,
Tłumaczył się że w jednej rozpoznał mię chwili,
Lecz chciał małą nauczkę dać tem ze swej strony,
Grzecznie mię upikować żem nie przywiózł żony.

Uprzejmie mię przyjmuje szanowna matrona,
«Czemu, pyta nie rada, zacna pańska żona
Nie raczyła zawitać w pokorne me progi?»
Zwalam więc całą winę na zabójcze drogi,
Nie chcąc wykryć przypadku z niefortunną babą,
Tłumaczę że po trudach jest trochę za słabą.

Po sutym podwieczorku dziarska młodź z podskokiem,
Rzuciła się do dziewic posuwistym krokiem;
Każdy starał się wybrać przedmiot porządany:
Stanął na pierwszym planie mazur ukochany,—
Polonez zostawiono dla starszych w odwodzie,
Którzy wiodąc dyskursa przy szlacheckim miodzie,
Na słaby wschód ozimy głośno narzekali
Rokując głodną zimę, kielichy spełniali.

Rozmarzony pan Edwin tworzył w głowie plany
Z różową sukieneczką rozpoczynać tany:
Srzód wielu pięknych dziewic ta mu wpadła w oko,
I w duszę, pełną wrażeń, wpiła się głęboko;
Trzebaż, jak na nieszczęście, los pełen przekory!
Kazał pannie Sliwiance jaskrawe kolory
Przekładać nad stosowne do letniego wieku;
Już to gdy los zawistny zechce dopiec człeku,
Zwykle na każdym kroku szle mu przeciwnoście.
Zabrzmiał ochoczy mazur,— szykują się goście;
W kole dziewic Edwinek, szukając bohdanki,
Miasto tej, nieogłędnie przybiegł do Sliwianki,

Porywa ją za rękę,— do koła wprowadza;
Szansa ta starą pannę zdaje się odmładza,
Dożywszy już pół wieku, myślą nie zgrzeszyła,
Gdyby ją niespodzianka spotkała tak miła.
Spostrzegł wreszcie omyłkę bohater,— niestety!
Przerwać koła nie można podług etykiety:
Wybija młodź hołubca,— aż kurzy czupryna,
Jeden tylko Edwinek swe losy przeklina.

Cudnież było na dworze! — słonko, przy zachodzie,
Wtórzyło zbawczem ciepłem wiosennej przyrodzie,
Obficie rozsiewając jaskrawe promienie,
Pórpórą nieboskłonu barwiło sklepienie.
Myśmy wyszli na ogród,— bo po tęgim miodzie
Zbyt rozmarzone głowy orzeźwić na chłodzie.
Edwinek przewidując szyderstwo młodzieży,
Tłumaczył że pierszeństwo starszym się należy,
Dla tego ze Sliwianką rozpoczął mazura.
«Daj pokój, ktoś odrzeknie, jesteś slepa kura;
Ot gdybyś okulary zawiesił na nosie,
Wziął byś piękną Helunię, albo wabną Zosię:
Jeżeli masz wzrok bystry,— jak spójrzenie kocie,
Zgadnij jakie tam ptastwo zasiąda na płocie?»
«Niesłuszne,— przerwie,— czynisz oczom mym przytyki,
Tożby i slepy poznał że siedzą indyki,
Na dowod rzucę kamień,— gdy mety doleci,
W poważnym tym szeregu wielki popłoch wznieci».
I, by stwierdzić dowody,— silnem swem ramieniem
Ciska w niewinne garnki dość sporym kamieniem.
Garnki tam od mleczywa schły rzędem na płocie,
Zabrzękły więc czerepy,— Edwinek w kłopocie!
Nie tylko że bystrości oczom nie przypłurzył,
Lecz u młodzi na nowe szyderstwa zasłużył.
Stał przez chwilę w omroku,— a gdy się ocucił,
Zwiesiwszy nos na kwintę,— do komnat powrócił.

Szybko czas ulatuje w gościnnej zagrodzie!
Żegnaliśmy staruszkę aż o słonka wschodzie;

A wracając do domu przez zielone łany,
Wspolnie z rannym skowronkiem dank Panu nad pany
Nieśliśmy — w dobrej wierze że On dobrotliwy!
Po tylu przeszłych klęskach da nam rok szczęsliwy.

Koniec częsci 1-ej

# З-НАД ІСЛАЧЫ, АБО ЛЕКІ НА СОН

*Апавяданне Навума Прыгаворкі ў 2-х частках*

## Частка 1-я

### Заклік

Вы, барэі, ветры нашы,
Перастаньце дзьмуць у кашу,
На Карпат сівым улонні
Перастаньце мітусіцца,
Як дзяўчаты-балаўніцы
Ля Марскога вока[1] тоні.
Вось вам тутка корм гатовы —
Набірайцеся ахвоты,
Бо ў мяне намер ёсць новы
Ў свет адправіць вершасплёты.

Папугаеўскія дзюбы,
Гарбузовы ляпы-зубы
Расчыніце вы і ўсюды
На крыжовыя дарогі
Весткі вышліце пра цуды
Для людской перасцярогі.

[1] Марское вока — возера ў Карпацкіх гарах.

Творы хай мае чытаюць
І хай слёзы праліваюць.

Гаваркая лішне дама,
Для цябе тут ёсць таксама
Дастаткова моўнай стравы.
Не трубі ты чалавеку
Аб усіх прагрэсах веку,
Лепш разнось паэта славу!

## Просьба пра натхненне

О музы, вы яснавяльможныя багіні!
Заапякуйцеся вы тым, хто праз вас гіне.
Ён, шчыра вас шануючы, замест мамоны
Ў кішэні запакоўваў Зоркі і Рубоны[1].

Пра хлеб не дбаючы, за рыфмай толькі гнаўся
І вас праславіць одамі заўжды стараўся.
Дык вось, калі другія сёння ў пазалоце,
Ён марамі багаты, а раўня — галоце.
Калі ў кішэнях пуста, ён пры сціплай міне
Вынюхвае, ці лёс чаго скуль не падкіне.

О Апалон-бажок! У дрэнным я настроі,
Ты, можа, развяселіш, лютню мо настроіш?
Складзі геройскі гімн, чароўныя ўскінь тоны
На пусташ нашу, на Люцынскія загоны.
Няхай жа вуха тую музыку пачуе,
Бо перадаць яе маім братам хачу я.

Пісакі вечныя, браты па Апалоне!
І вы мне памажыце, я прашу, сягоння!

---

[1] Зоркі і Рубоны — перыядычныя часопісы, якія ў добрыя часы запаўнялі замест бальзакаў і гюгаў столікі салонаў нашых грамадзян.

Цень Крышталевіча, праслаўленага Бакі!
Пазыч адзін пегаса, а другі кульбакі,
Каб я ў Парнас ускочыў, нібы з прашчы камень,
Багаслаўлёны вашымі, сябры, рукамі,
Пры дапамозе сіняга чарніла, пер'я.

Дык вось за стол натхнёным сяду ўжо цяпер я,
Наносячы на лісцік Гелікону росы.
Чытач, я *на сон лекі* для цябе прыношу!

## Уступ

Дамок мой любы! — бачу з кожнаю хвілінай,
Што нашы дні жыцця ідуць к зямлі няспынна.
Мы разам пастарэлі, час той недалёкі,
Калі ахопяць нас з табой нябыту змрокі.
Як той марак, які з надзеяй на нябёсы
Стыхіям здрадным часта давярае лёсы,
Сваім гандлёвым справам поўнасцю адданы
І смела сустракае буры й ураганы,—
Так мы з табой тут розныя сустрэлі часы,
Былі ў нас буры і дні майскае акрасы,
А ўсё мінулае, як быццам воч імгненне,
Як сноў прыемных ці нядобрых летуценне.
Так любы мне тут кожны кут між сцен пахілых,
Бо шмат ён памятак гадуе сэрцу мілых.

Прыгожыя ў зямлі Аўзонаў букі і яліны,
Аж неба дасягаюць мо іх верхавіны,
Ды ліпа, уласнаю пасаджана рукою,
Мне здасца прыгажэйшай і прытым такою,
Што часта горкія хвіліны асалодзіць
І потнае чало па працы ахалодзіць.
Яе густое голле хмарам не ўгражае,
Дык хай яго паўночны вецер не пужае,
Хай ліпе гурбы снегу не гнятуць карэнне,
І хай яна нас цешыць зеленню й цвіценнем.

Дазволь свабодны ход яе жывучым сокам,
Тады й яе чало ўзнімецца высока.

Пры розных клопатах або пры злой нагодзе
Тугу сваю ганю блуканнем па гародзе,
І тут пад груш ці яблыняў шырокім ценем,
Як пад смарагдавым з квадратных шыб скляпеннем,
Кватэры матухны-зямелькі дыванамі
Чало расхмараць. Тут працоўнымі рукамі
Пасаджаныя розных форм і фарбаў кветкі,
Як быццам пад наглядам чулай маці дзеткі,
Калі красы дасцігнуць, песцяць вочы міла,
Сказаў бы, ўдзячнасць нам іх гэтак акрыліла.

Калі мне пасля спёкі з'явіцца ахвота
Благі настрой прагнаць, выходжу за вароты.
Там мне прырода ўся ўсміхаецца шчасліва,
Там коласам удзячным прывітае ніва,
Там селянін, змарыўшыся на працы чорнай,
«Хай будзе пахвалёны» скажа мне пакорна.
Спявак вясны наладзіць мне канцэрт прыгожы —
Пачую гімн жаўронка дзеля славы Божай.
О ніва! маці добрай ласкі і апекі,
Прытуліш неўзабаве ты мяне навекі.

Даўней мы тут жылі, гуляючы вясёла,
Бывала часта, што сяброў збярэцца кола,
Хоць мой дамок і цесны, сціплы, небагаты,
Аднак у ім з душою кожны быў прыняты.
Сярод вясёлых смехаў, дружнае гаворкі
Гулялі весела, пакуль не згаснуць зоркі.
Сягоння ўсё інакш, змяніліся і людзі,
Сягоння спекуляцыя — хто больш дабудзе —
Валодае людзьмі; нямецкія рахункі
Адносіны ўвялі ўжо ў іншыя кірункі.
Сягоння сэрца не шукай — яно ў манеце,
І пры сустрэчах — холад, як на белым свеце!
А край збяднеў, і каб здабыць кавалак хлеба,

Не раз крывавым потам аблівацца трэба.
Ды толькі слабы плача, як адчуе болі,
Не падае на духу той, хто сільнай волі!
Ды Бог ласкавы! знойдзеш і ў ліп нашых ценю
Людзей, што хочуць сэрцам жыць, а не кішэнню.

## Раздзел I

Эх, міла ж чалавеку з прошласці ўспамінам
Змагацца, зручна ўсеўшыся перад камінам,
І, дым пускаючы з цыгары, што пад носам,
Дражніцца добрай думкай з неспакойным лёсам!
Як цёпла ў хаце, а навокал снегу горы,
Калі ў стадоле поўна, досыць і ў каморы,
І як адзін самотнай думкай блудзіш недзе,
Прыемна, як сусед у прыцемак над'едзе.
Тут пойдзе гутарка сардэчная такая,
Калі адзін гаворыць, іншы не змаўкае,
Калі бяседа будзіць мілыя ўспаміны,
Дык момантам здадуцца вечара гадзіны.
А кут наш, дзякуй Богу! на сяброў багаты,
Яшчэ шляхецка шчырыя тут стрэнеш хаты,
Якім гасціннасць і старыя Польшчы цноты
Прад госцем не дазволяць зачыніць вароты.

Бывае, што і ў нашым чарадзейскім коле
У чыстым збожжы сустракаюцца куколі,
Аднак не шкодныя; хай Бог мяне скарае!
Каб я каго чарніў, бо дружба ў нас старая!
Калі ж хто спатыкнецца, не судзіце строга:
Хто без граха, кінь камень — грэх ёсць у любога.

Што ж, скажыце, напрыклад,— наш сусед Шалюта?
Паважны і праўдзівы, хоць дзялок падкуты,
І аж на дзве нагі! — дыярыуш айчынны!
Усе яго баяцца, а найбольш жанчыны.

Усякія ў суседстве спрэчкі, непаладкі,
Грашкі паненак, злых людзей учынкі, ўхваткі
Раскрые як на далані, нібы газета,
Зло з-пад зямлі дабыць — яго такая мэта.
Яго я спекулянтам Барскім называю
І веданні яго пакорліва прымаю.

Другі яснавяльможны пан з паноў Сабковіч,
Ахрышчаны ў суседстве імем Дарабковіч.
Гадоў таму са дваццаць — бедачок хлапчына
У выцертай сярмяжцы, збедненая міна,
Бывала, гоніць статак хмызнякамі з пугай,
Пасля ўжо гаспадарыць, тэпае за плугам,
Далей, асветы хцівы, штораз разумнее,
Ужо чытае кніжку, падпісацца ўмее.
Праз колькі год, глядзіш, уцёрся ў аканомы,
За тымі ўдачамі ў магнацкі дом вядомы
Якімісьці там спосабамі ўшрубаваўся
І так замыліў вочы, што замацаваўся
На неблагой арэндзе. Справа паказала,
Што скарыстаў з навук Метэрніха нямала,
Бо вёў палітыку сваю ён там разумна,
Нібы сваё, збіраючы з палёў і гумнаў.
Хоць між людзьмі пра гэта шмат хадзіла плётак,
Але каму, сябры, капацца ў іх ахвота?
Той-сёй у ім чарта пыхлівага ўгледзеў,
Другія кажуць: лоб яго скляпаны з медзі.
Мо зайздрасцю разносіцца такая слава,
А ўсё ж чаму панка прымаюць так ласкава?
Сягоння поўная ў Сабковіча шкатула
І розум ёсць. Каб можна, дык была б цыдула
І на маёнтак. А ў цяперашнія часы,
Як жыд у шабас, ён адною думкай ласы
Уціснуцца ў сяброўства да паноў багатых
І стрыгчы іх цішком, як бараноў кудлатых.
І, каб набіць кішэні больш яшчэ пуката,
Са знатнай марыць ажаніцца і багатай.

Вось гэта кукалі́, чытач, ці не — не знаю,
Пытанне гэта я на суд твой адкладаю,
Бо дзе ж тут мой куколь, што зразу мо палохаў?
Язык завостры ў гэтага, а той — прайдоха.

Далей суседзей іншых стаўлю ў панараме,
І вер, чытач, маны не будзе тут між намі.

Не далей як за дзве вярсты ад нас ёсць хата
Вядомага палкоўніка, вось там заўзята
Пры століку зялёным б'ёмся мы, бывае —
Адзін хавае ў торбу, а другі вымае.
Сам мілы гаспадар, тлумачачы гатовы
З брашуры друкаванай нам закон вістовы,
Штораз — то прайграе, мы ж, сціпла ў часе гэтым
З навукі карыстаючы, грабём яго манеты.

Адну загану мае той слуга марсовы:
Хацеў бы ён усе Ізраіля галовы
На порах сцерці, за людзей ён іх не мае
І ў найчысцейшай справе дома не прымае.
Сабковічу і то, хоць быў ім ашуканы,
Аказвае часамі нават больш пашаны.
Пра іх жа як гаворыць, аж трасецца грыва,
За што забілі Бога?! — ускрыквае гняўліва.
Надарма доказы, дарма і ўсе ўгаворы,
Што ані з Ракава яўрэй, ні той, каторы
У Івянцы жыве, не забівалі Бога,
Усё роўна не дакажаш ты яму нічога,
На ўсе аргументы, любыя словы, фразы
Свае ў яго, даўно гатовыя, адказы.

Там кветачкі прывабныя дзве вока песцяць —
Адна яшчэ ў пучку; як думкай ходзіць дзесьці,
Галоўку ўзняўшы, вось, здаецца, затрапеча
Малымі крыллямі для ўзлёту ў бесканечнасць.
Другая ўжо расцвіўшая, у поўнай сіле,
Нібы матыль, калі сваё распусціць крылле.

Як промнямі вачэй у твой бок гляне,
Хай сэрца будзе з лёду, момантам растане!
Дык і не дзіва, што аматараў на ўцехі
Прыцягвае той кут і вабяць тыя стрэхі.

А далей Эскулап на глебе небагатай,
Як курыца ў зямлі, капаецца заўзята.
Хоць сем дзесяткаў мае за плячыма
І хоць сівы і слабы, але нейкім чынам
Ён моцны духам, пры палаючым гуморы,
Як на ратунак бліжніх, да амураў скоры.
Дзе ўзблісне вочка да яго ці ўсмешку ўбачыць,
Ужо ён поўны мар, размоўны і гарачы.
Няхай замужняя, ўдава або дзяўчына —
У яго на камплімента знойдзецца прычына.
Пакінуць кветачак прыгожых ён не скоры,
Хіба пакліча хто ў бядзе ці цяжка хворы.

А дом яго, як сёння ў нас ужо не кожны,
Гасцінны аж праз меру, шчыры і набожны.
Калі часамі да яго скіруеш коні,
Сястра яго ўжо з сэрцам, быццам на далоні,
Спаткае з хлебам-соллю, усім, чым мае, прыме
І пільна сочыць за жаданнямі тваімі.

Направа за лясочкам — кандыдат на мужа.
Паненкі! з чараваннем не марудзьце дужа,
Мо з вас каторая яго апутаць зможа,
Злавіць. Зірніце толькі на яго прыгожа,
І іскарка вачэй глыбока ў ім утоне,
І сэрца ўзрушыцца ў яго халодным лоне.
Тут варта пастарацца — гаспадар ён знатны!
Вучоны, праўда, але чэсны, акуратны.
А хоць не вельмі шчодры, але ж і не ўпарты,
І белыя, як снег, ягоных лёсаў карты.

## Раздзел II

Як добра на душы ў цябе, чытач шаноўны,
Калі вясной прыгожай рой тых дум шматслоўных,
Што ў час зімы цябе нярэдка прыгняталі,
Настрой пакіне добры, паляцеўшы ў далі!
Найперш ты прагным вокам прывітаеш сонца,
Якога цёплы промень зазірне ў аконца.
Ты сочыш за прыродай — вось яна жвавее
І, белы скінуўшы абрус, нясе надзеі.
І чуеш гарманічныя птушынак песні,
Якіх мелодыі, занёсшы ў паднябессі,
Зефір лагодны ля ступнёў тварца складае,
А з той малітвай птаства і твая ўзлятае,
Падзяку найвышэйшаму складзеш міжволі
За тое, што вясны ён дачакаць дазволіў.

У хрысціянаў важнае падходзіць свята.
Сваім уваскрасеннем Бог нам даў багата:
Злых духаў перамог, ад пекла збавіў людзі!
Дык дзякуйма яму за гэты цуд над цуды!

Там, дзе ёсць гаспадыні, рух не знае межаў,—
Стук, галас, мітусня,— як Вавілона вежа!
У кожнае з іх з бабкай выступіць ёсць мара,
На парасят і індыкоў — як з неба кара!

Ў маёй убогай хатцы — як сканчэнне свету,
Ганцы бягуць адтуль, вяртаюцца адгэтуль.
Бягуць з пакоя ў кухню, з кухні ў пакоі
Як апантаныя! На жонцы сёння строі
Сапраўды рамантычныя — нібы рымлянка
Чакае з нецярпеннем мілага каханка.
У старынныя сандалы ўзброеныя ногі,
Фартух яе ўкрывае кшталтам рымскай тогі,
Чапец, як шлем, завешаны над правым вухам,
Як быццам збіты пікаю якогась зуха.
Закасаны рукавы, рукі снежнай белі
Качаюць цеста, быццам жакаў у купелі.

А потым ціша ў хаце, нібы ў той грабніцы,
І толькі шэпты ўсё не могуць запыніцца.
Расце ў магутнасць бабка целам пышным, свежым,
Памалу паднімаецца і, быццам вежа,
Глядзіць згары на свет, ды... ой ты, доля злая!
Заступніца няшчасных! воля хай святая
Нам прыйдзе на падмогу ў скрусе чалавечай:
Як гэтакую вежу зараз выняць з печы?
Ратунак ёсць! Адбілі некалькі цаглінаў
І бабу дабылі. Тут сэрцы страх пакінуў,
Дык сціхлі ляманты, замоўкла нараканне,
Аднак жа мітусні хапіла да світання.

Вясёлы ўжо нам дзень настаў — народ спявае
І радасна касцёл з малітвай запаўняе.
Хоць наш касцёлак Шайскі цесны, невялічкі,
Ды льюцца галасы ў ім стройна, гарманічна.

Пасля імшы ксяндза ўсім гуртам акружаем,
Усёю грамадой вясёлых свят яму жадаем,
Парадак гэтакі захоўваем старанна —
Духоўнаму заўжды пяршынства і пашана.
Пасля таго бяздумнай, гучнай грамадою
Віншуем, абнімаемся паміж сабою,
Ды гэтак горача з пакораю глыбокай,
Што тыя шчырасці слязою муцяць вока.

Тут выступіў наперад губернатар Шаяў,
Пачцівы пан Антоні, і так пачынае:
«Шаноўныя і мілыя браты, панове!
Зусім не дапускаю ў думках ані слове,
Каб тутка вось мяне на землях прынцыпала
Грамадства скрыўдзіць, засмуціць бы пажадала.
Дамок мой старапольскі рукі прасцірае
Да вас, сябры мае, кампанія старая,
І просіць вас зайсці, не адмаўляць суседу
І, чым багата хата, распачаць бяседу».

Сардэчнай той прамовы пан Антоні Муха
Найперш з увагай пільнай, пачуццёва слухаў,
Ды гэта ўжо, відаць, прысуджана спрадвеку,
Што дух пярэчання існуе ў чалавеку.
Дык вось Антоні Муха і Антон Свябода
Жылі заўсёды ў дружбе, іх яднала згода,
Як пару галубкоў, а ў спрэчках выступаюць
Заўзята, хоць адзін другога паважаюць.

Антоні Муха двух маёнткаў панам звaўся,
Свайго не папускаў і за чужым не гнаўся,
А як пагнаўся часам, дык не меў карысці,
Трапляў у сітуацыі амаль без выйсця.
Ды ўсё ён, як філосаф, раўнадушна зносіў,—
Праследвацелям часта дараваць прыйшлося.
Адна ў яго прывычка: любіць паляванне,
Але ў чужых лясах; для сэрца хвалявання,
Хоць мае жонку прыгажуню, ловіць зрокам
Усякую, якую стрэне ненарокам.
Каб мець сабе пацеху ў гэтым сталым веку,
Ва ўладзе пастараўся і ўзяў пад апеку
Ў суседстве дзве ўдавы, прыгожыя кабеткі
І дзве сястры-сіроты ўжо не малалеткі.

Яго антаганіст — той пан Антон Свябода.
Калі б не спрэчкі тыя, а святая згода,
З жыцця іх вывады зрабіць было б магчыма,
Што ў двух адна душа зжылася нейкім чынам.
Абодва кветачку адну заўжды кахаюць,
Хоць гэтым жа адзін другому дакучаюць.
Ад ружы да фіялкі ў спосаб матыліны
Лятаюць, не прапусцяць здатнае хвіліны.
Аднак, калі цяпер так зайздрасці багата,
Яны старыя цноты зберагаюць свята.

Паслухаўшы Свяболы гэтых слоў нямнога,
Нагой пан Муха тупнуў і марсова, строга

«Не дазваляю! — крыкнуў.— Мілыя суседзі,
Мая душа скрывавіцца напэўна недзе,
Калі вы не ўшчаслівіце шляхоцкай хаты
Пакорнага слугі, дзе будзеце прыняты
З вялікай радасцю, дык запрашаю ў госці!»
«Заўсёды пан Антоні вышукае штосьці
Супроць суседскай згоды»,— кажа пан Свябода.
І тут пайшлі між імі спрэчкі і нязгода,
Адзін крычыць грымотна, той, як муха, звоніць,
І спрэчка мучае ўсіх, ледзь іх не разгоніць.
І каб у тую спрэчку пробашч не ўмяшаўся,
Напэўна б, лад між шляхтаю зусім парваўся.
«Вы знаеце, панове, што тут за прычына
Сяброўскай спрэчкі? Вось другая ўжо гадзіна,
Як пуста ў страўніку,— тады гумор дзівачыць!
Няхай жа пан Свябода нам маршрут назначыць
У самы блізкі порт — ва ўласную гасподу,
А там, як падмацуемся, і вернем згоду.
А заўтра пана Мухі зоймем дом хвалёны,
Няхай расшырыць толькі ён сталоў загоны».
«Віват, каханы пробашч! Мудрая парада!» —
Ускрыкнула ўся шляхта, спрэчку скончыць рада,
Хваліць ксяндзову мудрасць сталі, як заўсёды,
І жвава крокі скіравалі ў дом Свябоды.

Ён рады з перамогі! ды не злоўжывае
Той перавагай. Гутарка ідзе жывая
Між імі, і, пад рукі ўзяўшыся, ў дарозе
Шукаюць першынства ўжо ў іншай перамозе:
Свябода дождж прарочыць, засуху — пан Муха,
Але цяпер памалу, ціхенька, на вуха,
Бо спрэчкі іх пачуць суседзі не павінны,
Каб зараз не паднялі зноў на смех і кпіны.

Другія справы ля касцельнай агароджы.
Шаноўныя матроны звычай свой прыгожы,

# WSTĘP.

Mogiło dawców życia!—naddziadów siedzibo!
Witam cię, choć wspomnieniem, rodzinna ma skibo!
Duchem poglądam na twe poświęcone niwy,
Pamięcią sięgam w przeszłość—wiek złudzeń szczę-
Z roskoszą myślą cofam w młodociane lata, (śliwy!
Pieszcząc cię w wyobraźni, nie wzdycham do świata.
Co mi wykwintny Paryż—co Rzymu skulptury,
Co Italskie pomniki i Szwajcarskie góry,
Co Wiedeń, Berlin, Madryt i Londyn zamglony,
Ja nad wszystko przekładam kraj mój ulubiony!
Tu roskoszniej oddycha całe przyrodzenie!
Tutej rzewniejsze ptasząt ojczystych kwilenie!
Tu i słonko weselej naturze przyświeca!
Tu i miłość gorętszy w sercach ogień wznieca!—
Tu gdy przyroda zrzuci srogiej zimy pleśni,
A skowronek rozpocznie wesołe swe pieśni,

*Што мне пекны Парыж, Рым прыгожы і слынны,*
*Што швейцарскія горы, старыя Афіны.*
*Што мне Вена, Мадрыд, што мне Лондан туманны,*
*Больш за ўсё я бацькоўскаму краю адданы!*

Паэтычнае (і пажыццёвае!) *credo*
Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча,
надзённае ва ўсе часы і для кожнага народа

Księgozbiory
100
Jana Łochowskiego

# CIEKAWYŚ?
# PRZECZYTAJ!

**Trzy powiastki i wierszyk ulotny.**

PRZEZ

*Wincentego Dunin Marcinkiewicza.*

MIŃSK.
Drukiem Jokiela Dworzeca.
1856.

«Цікавішся? — Прачытай!» (1856). Трэці паэтычны зборнік (і чацвёртая пасля «Ідыліі» аўтарская кніга)

## PIEŚŃ 1.

## SARA MICHAELA.

W mieście Radaiku—Serbów stolicy,
Cicho, jak w grobie!—tylko w świetlicy
Księcia Miłosza gwarnie i wesoło,
Jaskrawym ogniem zamek płonie w koło. —

Młody tam poseł Sylistryi baszy
Ochoczo gości—choć firmanem straszy
Wassala Porty—Książęcia Miłosza. (1)
Ten go przyjmuje z pokory znakami,
Nie skąpi darów, nie żałuje grosza,
Choć w gniewie nie raz zgrzytnie zębami,
Choć duszę ognie nienawiści palą,
Korzy się jednak przed dumnym Abdalą.—



«Славяне ў XIX стагоддзі» — твор, у якім услаўлена змаганне сербаў з іншаземным прыгнётам

DUDARZ
BIAŁORUSKI,
CZYLI
WSZYSTKIEGO POTROSZE.
TREŚĆ
*Wincentego Dunin Marcinkiewicza.*
MIŃSK.
Nakładem i Drukiem I. Ducwicza
1857.

«Беларускі Дудар, або Усяго патроху» (1857). Чацвёрты паэтычны зборнік



Юзаф Завадскі — заснавальнік віленскай друкарні, сапраўднай аднайменнай родавай фірмы, якая жывіла тутэйшы край кніжнымі выданнямі ад першых паэтычных зборнікаў А. Міцкевіча, а потым і кнігамі Беларускага Дудара



Ігнат Легатовіч (1796 — 1867) — беларускі і польскі паэт; яму прыпісваецца аўтарства антыпрыгонніцкага верша «Скажы, Вяльможны пане...» (1838)

Дэатыма (*Deotyma*) — псеўданім польскай пісьменніцы Ядвігі Лушчэўскай (1834 — 1908), якая ў дваццацігадовым узросце выдала зборнік «*Improwizacje i poezje Deotymy*»



Антон-Эдвард Адынец (1804 — 1885) — польскі паэт і публіцыст, у маладосці віленскі філарэт, сябра А. Міцкевіча



Размежавальны план фальварка Люцінка (1830), папярэдняга ўладальніка А. Сялявы

«Памылкі друку» — рукою аўтара (?!). Асобнік захоўваецца ў Інстытуце літаратурных даследаванняў (Варшава). Друкуецца ўпершыню

«Люцынка, альбо Шведы на Літве» (1857). Гістарычная паэма, выдання якой паэт чакаў чатыры гады (1861)


LUCYNIKA

SZWEDZI NA LITWIE

OBJAWIENIA HISTORYCZNE

w 4-ch obrazkach

PISZE

WINCENTEGO POL

WILNO

NAKŁADEM I DRUKIEM A. STRAUSA

1861.

90

Czyny władców tej ziemi, tak wzniosłe, tak święte!
I owe Sudermana napady zawzięte,—
Dzielną obronę garstki téj ziemicy synów,—
Męznego Władysława tyle świetnych czynów!
I, jak mówi podanie,—owę to nagrodę,
W otrzymaniu bogatéj w cnoty i urodę,
A również w znaczne mienie uroczéj dziewicy,—
Jak później,—szanowani w całéj okolicy,
Co mówię?—w Polsce, Litwie,—długo z sobą żyli,
Poczciwych synów, wnuków, prawnukow spłodzili;...

z. 18 maja 1857 roku
LUCYNKA

KONIEC.



Міхал Грушвіцкі (1828 — 1904) — слынны сусед (валодаў маёнткам Выганічы пад Ракавам), паплечнік, кампазітар. Напісаў музыку да «Дзядоў» А. Міцкевіча, «Вясковага Лірніка» У. Сыракомлі

Аскар-Генрык Кольберг (1814 — 1890) — польскі этнограф і фальклярыст. У сваёй працы «Беларусь — Палессе» падаў паасобныя нотныя запісы з Люцінкі (дажынкавая песня, танец «Мяцеліца»)



Велікоднае паслание суседцы Скіндэравай

## CZYŻ JA STARY?—

### II.

Mówicie żem ja stary — mój jedyny Boże!—
Ja stary—czyż to prawda?—nie!—to być nie może!—
Próżno myślą się biedzę — próżno suszę głowę,
Bo gdy badam me siły ciała i duchowe,
Wszystko mi zapowiada że to potwarz dzika,
Nie jednego uczuciem przescignę młodzika!—

Czemuż twarz mi młodzieńczym rumieńcem zapłonie?
Czemu z duszy ognistej westchnienie uronię,
Gdy me oko utopię w spójrzeniu anioła,
Który urokiem wdzięków czaruje dokoła?—

Czemu, gdy Ją oglądam, z piersi wulkan bucha?
Dla czego serce pęka, kiedy Jej do ucha
Ot jakiś tam sowizdrzał komplementa prawi,
A Ona się uśmiecha — snać że to Ją bawi?—

Wy powiecie to zazdrość szaleńca starego;
Wszakże zazdrość pochodzi z uczucia mocnego,



O!—dla was, moje panie, szkoda kmiecej mowy,
A i dla was, panowie, których mądre głowy,
Że światowej ogłady potrosze liznęły,
Już na się obowiązek krytyki przyjęły
Wyszydzać co na swojskiej odradza się niwie,
A co obce, choć płaskie, podnosić skwapliwie.—

Mnie wasz sąd nie zastrasza—co mi tam że skomli
W budzie złośliwy brytan!—ja niby nie słyszę,
Na złość w narzeczu kmiotków, jak pisałem, piszę,
Słuchając zdrowej rady wieszcza Syrokomli.
Wyzaś szukajcie wszelkiej w mych wierszach przywary,
I krzyczcie — brednie pisze! — ał zdziecinniał stary"!—

KONIEC.

*Mińsk, Lutego 16 d. 1856 roku.*

«Хіба я стары?» — праграмны верш (на польскай мове; 1856)

## WĘDROWIEC.

Jakiż to gładki połysk jeziora!
Jakie wspaniałe słonko z wieczora
Strudzone lica za lazur kryje,
I słodkie wody jeziora pije.
Oto i kaczek dzikich gromada,
Gdzie niegdzie gęsi wędrownych stada,
Tam wodna czajka na samca huka,
Wszystko spoczynku nocnego szuka,
I wieśniak, krzepiąc strudzone siły,
We snie znajduje spoczynek miły.
Wszędzie wesołość — tylko wędrowiec,
Ujrzawszy zdala smętny grobowiec,
Wniebo utkwione łzą oko zrosił,
O błogi pokój dla Lubej prosił;
A pieszcząc w duszy słodkie wspomnienia,
Stał w Jej siedzibę tęskne westchnienia.

Mozyr, 6 Czerwca 1854 r.

16

Верш «Вандроўнік» (Мазыр, 1854)



Уладзіслаў Сыракомля (1823 — 1862) — паплечнік і сябра. Гэта ён пазайздросціў Вінцэнту, прыгадаўшы выслоўе Юлія Цэзара: маўляў, лепш быць першым паэтам у «ціхай» Літве, чым у сталічнай Варшаве другім

Dnia 25 Września
Który bez liku
Serc tu zbolałych
Cały zachwycił
Świata cząstkę całą
Wyjął z kraiku mego,
I między gwiazd,
Smutki ziemskich trosk,
Złagi dziecinnej
I kwiat młodości
Wieczny nasz mity!
Dzięki ci mity
Za cichy mile
Z sobą, poniekąd:
Chwy w niebie żyjki,
Chwy nektar pili
Słuchając ciebie.
Błago w tem niebie
Brat nam się mili.

Dobry dzień Tobie!
Czy w rannej Tobie
Dawne swe imię?
Czy tej bolejesz

Паэтычны зварот
Навума Прыгаворкі
да слыннага Вясковага Лірніка

Яўстах Піеў Тышкевіч (1814 — 1873) —
археолаг, этнограф, заснавальнік
Музея старажытнасцей у Вільні (1855 — 1865),
аўтар даследавання «Апісанне Барысаўскага павета»
(1847)





OPISANIE

POWIATU BORYSOWSKIEGO

Z dodaniem wiadomości o Obyczajach, Śpiewach, Przysłowiach i Zbiorach Ludu, Gustach, Zabobonach i t. d.

WILNO.

1847

Авантытул і тытул
слыннага выдання
пра Барысаўшчыну



Халімон на каранацыі.

Песня I.

Дарога.

Як рыбак с уткай над прудам,
. . . . . .
Ўстрог старшына купір шаг;
Штосьці ён на вусе матае,
Спаць дзівы прыпамінае:
Вось нагаў такі разказ.

Унялась буга страшэнна,
Мінула зраза вясна,
Устаў цяжкі матак стен!
Спрыкрылася людзям спацца,
Узялісь с сабой цалавацца,
Працуць да хаты галін!

Быліца «Халімон на каранацыі» (1857),
двойчы забароненая царскай (1858)
і падсавецкай (1930) цэнзурамі.
Вядома на копіі, падрыхтаванай
прафесарам І. Замоціным (1873 — 1942)

«Травіца брат-сястрыца» —
адна з быліцаў паэта,
якая ацалела дзякуючы копіі
І. Замоціна



Травіца
Брат-Сястрыца
Ченсьць 1-ма.

Хочэш ты с Дворкай жаніцца? —
Ідзі лепш братка таліцца! —

С нядзелі на панядзелак
Данілку бяда стала, —
Малявана скрыня прапала,
Прапала скрыня малявана,
Дачушка кахана. —
А тую скрыню малявану
За дзень прывабуць
Сваёй дачушкі каханай
Па век на забуду!



З песьні гмінней весельней

53.

Песьня 2-я

Каранація

...горадам зорка ясна засвяціла,
...тай дзянёк важны, і Масква ажыла!
...нуць на ўсе горла народ вясяленькі,
... навясціць горад Царочак дабрэнькі
...дзін прыбудзя у сваю сталіцу,
...прывязе с сабою красную Царыцу;
...к рой за маткай, за Царком паночкі,
...ня Анраты, заморскі князёчкі,
...адкам уедуць, і места па чыне;
...залатых карэтах белые княгіне
...на ніх брылянты, маўляў на абразках.
...такаяж дзіва чуваць толька ў казках.

А ты, злая дочка, помні ту науку,
Што Бог справедлівы сашле страшну муку
Калі злых нароваў сваіх ня пакінеш,
Калі зноў паганай жонкаю праслынеш.

Тут снова Ульляна ногі бацькі, мужа
Шчыра цалаваці узялась дасужа.
Усеж на прашчаньня кланялісь Біёмы
С вясёлай думою пабралі да дому.

Конец

Августа 20 дня
1867 року.
Мінськ.

Паўстанцы 1863 года. Косы супраць гармат

Гурток аднадумцаў.
Вінцэнт (у першым радзе трэці злева) з дачкой Камілай і сябрамі-мінчукамі

Кастусь Каліноўскі (1838 — 1864).
Здымак Ахілеса Банольдзі



Ян Карловіч (1836 — 1903) — філолаг і этнограф, славіст, фальклярыст, глыбока цікавіўся беларускай культурай. Рабіў захады, каб апублікаваць марцінкевічаўскі пераклад «Пана Тадэвуша». Менавіта ў яго ным архіве захаваўся адзіны вядомы сёння аўтэнтык «Пінскай шляхты», напісаны рукой камедыёграфа



Юзаф Ігнацы Крашэўскі (1812 — 1887).
З ім перапісваўся В. Дунін-Марцінкевіч



Для поощренія бѣлорусскихъ крестьянъ къ просвѣще-
нію, я болѣе 10 лѣтъ трудился, сочиняя въ ихъ
простонародномъ нарѣчіи повѣсти, изображаю-
щія ихъ домашнюю жизнь, преданія и обычаи.
[illegible] Этотъ приноситъ намъ обоюдную пользу-
[illegible] поощрая къ чтенію таковыхъ сочиненій,
[illegible] вмѣстѣ къ обученію азбуки и тѣмъ
[illegible] просвѣщаетъ ихъ, - мнѣ же приноситъ
[illegible]тельную пользу.- Нынѣ я снова взду-
[illegible] возвратиться къ моей цѣли; - а какъ
[illegible] лучше періодическіе журналы могутъ
[illegible]вать таковой, а болѣе журналъ
[illegible] народонаселенія [illegible], то-
[illegible] предлагаю Виленскому Вѣст-
[illegible] я буду присылать
[illegible] сочиненія, а Господинъ Редакторъ
[illegible]ника платитъ мнѣ за всякую по-
[illegible].- И вотъ на пробу посылаю на-
чало повѣсти подъ заглавіемъ Быль-
цы, разсказъ Наума Приговорки.-за
которую желаю получить вознагражде-
нія 75. руб. сер.- Если Редакція со-
гласится на мое предложеніе, то при-
шлю и цѣлую повѣсть, если же мнѣ не
вѣдать, то прошу уведомить меня,
въ то время я сносился съ другимъ какимъ-
либо журналомъ.- Адресъ мой: Его Бла-
городію Викентію Ивановичу Марцинкевичу.
въ Минскѣ - на Захарьевской улицѣ,
въ домѣ Пейсаха Перельмана-

Остаюсь съ истиннымъ почтеніемъ
Покорный слуга

В: Марцинкевичъ

6. февраля
1867. года
Люцинка

Ліст у рэдакцыю
акупацыйнай газеты
«Віленскі веснік»
з запытам-просьбаю
на друкаванне
беларускамоўных твораў
(06.02.1867)

# Развітальная элегія. Аўтографы паэмы «З-над Ісланчы, або Лекі на сон» (Люцінка, 1868)



Аляксандр Ельскі (1834 — 1916) — пісьменнік, гісторык, краязнаўца. Адны з першых энцыклапедычных артыкулаў пра В. Дуніна-Марцінкевіча належаць яму



Адам Ганоры Кіркор (1818 — 1886) — выдатны гісторык, публіцыст, выдавец і асветнік. Памёр у эміграцыі (Кракаў)


11070
„ТАРАСЪ НА ПАРНАСѢ"

Да благога — благое, а да добрага — усё добрае ліпне. Аўтарства «Тараса на Парнасе» (Віцебск, 1896) у XIX ст. прыпісвалі… В. Дуніну-Марцінкевічу!

Дыямэнты

Беларускага прыгожага пісьменства.

№ 1.

БЕЛАРУСКАЕ ВЫДАВЕЦТВА
"ЗОРКА"

«Дыямэнты». Вокладка літаратурнага альманаха (Кіеў, 1919) з творамі драматурга. Як можна праўдзівей выказацца пра тое, што пакінуў нам у спадчыну пісьменнік?!



Ту́пальнічына — месца апошняга спачыну. Тут хвоі гамоняць з вечнасцю, а прыступкі вядуць у неба

Які не дазваляе не мінуць нікога,
Праводзяць у жыццё — жадаюць шчасця многа
Адна другой, чуваць іх голас салаўіны.
Пра поспех кулінарны судзяць з кожнай міны.

Мая каханая з трыумфам і вясёла
Вачамі ганарыстымі глядзіць наўкола,
Бо бабка ў яе, як Медніцкая вежа!
Дык і гасціннасці яе няма ўжо межаў,
Расказвае пра клопат дабывання з печы
І ў госці запрашае юных і старэчых.

Падходзіць Эскулапава сястра паволі,
Чало яе намеціла пячаць нядолі.
Гняце старушку сёння пачуццё благое,
Нібы дзіця сваё хавала сёння дарагое.
«Каханая суддзёва! Век мо, не іначай,
Не бачыліся мы! І ўсіх, каго тут бачу,
Вітаю ветліва! О, пані мо не чула,
Скажу табе ўсю праўду — я нагу звіхнула!
Мяне, што слаўлюся на ўсё мо наваколле,
Спаткала, пані мілая, благая доля!
О, пані дарагая! Бог скараў сурова!»
«А ў чым жа справа? Раскажы, саветнікова!» —
Пытаецца мая. «Вось тут і безгалоўе,
Што дрожджы падвялі, забралі шмат здароўя!
Мучыца, пані дарагая, аж з Ялецка,
І новая начовачка, ніхто не спэцкаў,
І малачко ад нашых жа каровак, пані,
Брат цеста падбіваў, і формачкі не зганіш.
І што ты скажаш, пані? Як мне гэта знесці?!
Як быццам куры выграблі!.. дзіра ў тым цесце!!!»

«Што ж зробіш, пані,— кажа Мухава жанчына,
Хоць юная, але ж суддзёва! з той прычыны,
Што Муха колісь атрымаў суддзёўства ў спадку,
Аднак пасуддзяваць не меў яшчэ выпадку,—

Хай вам, саветнікова, усё ж пацехай будзе,
Што тым, каго Бог любіць, крыж даць не забудзе.
О, панечка суддзёва, каб у гэтым часе
У гэткай гаспадыні! бабка не ўдалася!
Выпадак нечуваны! Але ж вось бывае!
Канец, напэўна, свету, пані дарагая!»

Скажу табе я праўду, мой чытач шаноўны,
Што ў нашым цесным коле тытулаў тых поўна,
Якія з месцам перайшлі або па спадку —
Саветнікаў, падсудкаў, суддзяў для выпадку.
Гадоў таму са трыццаць пан майго фальварка
Ян Сліва быў суддзём гранічным. Гаспадарку
Яго купіўшы і прыняўшы ва ўладанне,
Прыйшлося мне прыняць суддзі былога званне.

## Раздзел III

Галодная кампанія ўжо есць не ў меру.
Без жонкі, ну звычайна, як у кавалера,
А так сталы застаўлены багата мясам
І пірагоў усякіх велічным запасам!
Вось тут індык, галушкай кормлены старанна,
Як быццам нейкі бедны грэшнік пакаянны,
Прынадна заклікае, дражніць паднябенне,
А там расстаўлены ўсялякія пячэнні.
У цэнтры бабка ўсю красу сваю адкрыла,
Нібы какетка, што ўсміхацца ўмее міла.
І яйкі чырванню цудоўнай вабяць вочы,
Як той пачырванелы мілы твар дзявочы,
Калі дзяўчо табе з галоўкаю сагнёнай
«Люблю» прашэпча першы раз безабаронна.
А пад сталом бутэлькі строяцца радамі,
Налітыя старашляхоцкімі мядамі.

Што ім не мала год, відаць па плесні знаку,
Вось нібы ўзводы два рыхтуюцца ў атаку.

Гасцінны пан Свябода ў шклянкі падлівае
І да ўзнімання тостаў шчыра намаўляе.
Такою працай стомлен, аж абліўся потам.
Пасля трынаццатае пляшкі так пайшло там,
Што, ўпаўшы на калені, са слязою ў воку
Крычаў сардэчным голасам навокал:
«Браточкі родныя, ласкавыя суседзі!
Бяда ў лес хай ідзе і чорт на ёй хай едзе!
А мы тут грамадою гэтай шчырай нашай
Праводзьма весела дзянёчак з поўнай чашай!
Яшчэ бацькоўскіх тостаў мы не ўзялі.
«Кахаймася!» няхай грыміць у нашай залі.
Яшчэ чакае дзесяць пляшак не распітых,
Старашляхоцтва ўспомнім, вось тады мы — квіты!»
«Не дзесяць, а пятнаццаць!» — закрычаў пан Муха.
Аж дзіва! што Свябода не спрачаўся, слухаў.
Антаганіста думка радуе сягоння,
Бярэ руку ён Мухі у свае далоні
І, сціснуўшы сардэчна, са слязой ляпеча:
«Мяне ты вельмі ўцешыў гэтым, чалавеча!
Калі б такія спрэчкі ў нас былі заўсёды,
Дык не было б паміж суседзямі нязгоды».
Адзін Сабковіч толькі збоку заставаўся,
Да чаркі і да шклянкі ён не вельмі рваўся,
Але напружваў розум, як схітрыць умела,
Кішэнь напоўніць коштам шляхты, што п'янела,
І спакушаў размораных раскашаліцца,
Пакуль у стос не выйграў рублікаў са трыццаць.
Ён так, як цэзар Ціт, лічыў дарма пражытым
Той дзень, што не ўпрыгожан кушам знакамітым.

А збоку пан Шалюта з мінаю суровай,
Вус строячы ўгару, займаецца размовай
З Дэмбіцкім Апанасам, лоўчым панскай пушчы.
Праводзіў дыскурс ціха, каб з сяброўскай гушчы
Не чуў хто-небудзь іншы, але хваляваўся,
І голас, зразу ціхі, штораз то ўзмацняўся
І, быццам рэха ў лесе, загудзеў шматслоўна.
«О, пан Дэмбіцкі! — крыкнуў з радасцю раптоўнай,
Што вось яго навінай тайнаю надзеліць.—
Скажу табе, што чуў я ў Вербную нядзелю:
Вось хітры наш Сабковіч Чанскага аблытаў —
Пазыку даў яму, каб ратаваць нібыта,
Аднак пазыка, знаю, косцю ў горле стане...»
«А мо, суседзе мілы, дасць выратаванне?» —
Дэмбіцкі кажа.
«Не, пабойцеся вы Бога! —
Тут Барскі выкрыкнуў.— Такая дапамога
Не аднаго ўжо з нашых горам надзяліла.
Сябе я ў прыклад стаўлю: колісь злая сіла
Прымусіла мяне ўзяць ссуду, ну дык я — да Крэза!
Прашу яго на раны, што цярпеў наш Езус:
Як толькі збагацею з продажу насення,
Вярну яму той доўг ад чыстага сумлення
І за такую ўслугу буду вельмі ўдзячны.
Дык пан Сабковіч кажа: «Каб зрабіць больш значнай
Паслугу гэту добраму майму суседу
І ўратаваць ад непрыемнасцяў і бедаў,
Прыму тавар твой па цане рынковай».
Вось золата, не чалавек! даю вам слова!
Падумаў я. Руку б пацалаваў, здаецца,
Тады. Не знаў, што плакаць давядзецца.
Льнасемя мне ўрадзіла, мех бяру тавару
І з пробай той, вясёлы, да суседа шпару.
Тавар цану трымаў, і людзі мне казалі,
Што дваццаць карбаванікаў за бочку бралі.
Прыбыў я, а паніч на іншы лад спявае:
Вітае холадна, маўчыць і пазяхае,
У пробе, што прывёз я, брак якісьці ўгледзеў,

У Прусію льнасемя, кажа, ужо не едзе...
Нарэшце, як сказаў сваю цану я,
Па дзесяць мне рублёў за бочку прапануе.
І то яшчэ прыедзе ён пераканацца,
Ці добры ўвесь тавар, ці будзе падабацца.
Вяртаюся дамоў, а тут, нібы з бядою,
Купцы па тое семя едуць чарадою.
Дае мне той па дваццаць, два той набаўляе,
Аднак прадаць сумленне мне не дазваляе —
Я ж скрыўджу дабрадзея, дык чакаю тыдзень,
Сабковіча няма. Што ж, думаю, тут выйдзе?
Нарэшце не ўцярпеў, зноў еду ў тыя госці
Пагутарыць яшчэ раз шчыра з ягамосцем.
Ды дзе там! Зноў маячыць, стогне, наракае
І быццам з-за граніцы новых цэн чакае.
Вяртаюся дадому ў незвычайнай скрусе,
Што з гэткім дабрадзеем лёс звязацца змусіў.
Назаўтра Лейба з Івянца ка мне з'явіўся,
І торг у нас без стогнаў, без журбы адбыўся,
Што ён на гэтай куплі прагарыць ці страціць,
Але па дваццаць два рублі за бочку плаціць
І грошы аддае мне ўсе што да капейкі.
Дык да Сабковіча праз час кароткі нейкі
Паехаў, доўг плачу, ён нехаця вітае
І, ці тавар прывожу, холадна пытае.
«Дык ты ж купіць яго не захацеў, суседзе,
На цэны наракаў, што ўпалі ў Прусах недзе»,—
Кажу яму, а ён ад злосці аж чырвоны,
Нібы індык, крычыць, дзярэцца, як шалёны,
І на маю няўдзячнасць наракае ўпарта,
Даказвае, што бліжнім памагаць не варта,
Пасля ўжо, накрычаўшыся, рублі згартае.
Вось так між намі дружба скончана святая.
Такія міжсуседскай дапамогі спробы,
Скажыце, калі ласка, як вам даспадобы?»

Пасля такой прамовы, цалкам збіты з тропу,
Пабег без развітання пан, як чорт з укропу,

З гасціннага Свяboды дому, сеў на коней
І, быццам баючыся за сабой пагоні,
Загад даў гнаць сівых, аж пыл курыўся,
А па бліскучай лысіне пот рэчкай ліўся.

Каб ты, адважны Гектар, мог прадбачыць,
Што згінеш у баі, лёс мог бы перайначыць —
Сядзеў бы ў Троі. І Ахіл не пайшоў бы ў схватку,
Каб знаў, што нехта там стралой прашые пятку,
Напэўна б, сталлю акаваў спярша сандалы.
І ты, мая палова, свой прадмет пахвалаў
Замкнула б на замок, дзяжой прыкрыла б чула,
Каб бабкі-вежы лёс прадбачыла, адчула!
Ды выйшла па-другому, бо відаць, што Богі
Чамусьці вас вялі на блудныя дарогі.

З гасціннага банкету ад таго Свяboды
Вярнуўшыся дамоў, гляджу: з якой нагоды
Я раптам застаю агульны плач і смутак?
Аж вочы спухлі ў жонкі, узлезшы ж у закутак,
З ламаннем рук пляменніца-падлетак Зося
Стараецца, каб не рыдаць поўнагалоссем.

Дык я пытаю ў страху — што тут раптам стала?
Якое ж нас няшчасце сёння напаткала?
І жонка, тут жа ўпаўшы ў слёзную экстазу,
З вялікім жалем прыступае да расказу:
«Уяві сабе ты толькі, мілы гаспадару,
Якога дачакацца мне прыйшлося ўдару!
Сцярпець яго не ў сілах, робіцца мне слаба —
Мой гонару прадмет, праслаўленая баба
Ужо больш не існуе, вось яе аб'едкі!
Не будуць мне зайздросціць гонару суседкі,
А нават, знаю, стануць спадцішка смяяцца,
Што я пасмела ўдалай бабкай выхваляцца.
Прычына гора — наш сабака-ненажэра!
Або ўтаплюся я, або павесце звера!

Павінен кару атрымаць за ўчынак гэты,
Дык хай і развітаецца ён з белым светам!»

І Саламон, як рассудзіць прыйшлося матак,
Якой аддаць дзіцятка — Гімена задатак,
Не гэткі клопат меў, як гэты твой мучыцель,
Чытач мой дарагі, паперы злы нішчыцель.
Не дзіва, бо ўвесь дом хвалюецца і плача,
А жонка смерці дамагаецца сабачай.
Баліць мне гора жонкі, і шкада сабаку,
Што ж вінен ён, што бабка трапіла да смаку?
Стараюся як-небудзь пані гнеў раззброіць
І жартам тыя жалі трохі супакоіць.
Як вынік красамоўства, доўгіх угавораў,
Настала ў хаце ціша, хоць не вельмі скора.
Каб цуд праславіць той, элегію складаю
І для нашчадкаў будучых вякоў тут пакідаю.

## Элегія на смерць Велікоднай бабы

Гурманы, плачце! плач, люцынскі людзе!
Няма ўжо бабкі! больш такой не будзе!
Мая пацеха! гонар мой і слава!!!
Ты стала ласуна сабакі стравай.
Старанна гэтак я мясіла цеста,
І дрожджы ажно з двух дастала местаў,
І яек паўтары капы набіла,
Каб паў-Еўропы ты красой дзівіла!!
Фатальны момант! — і цябе не стала!
Суседства ў нас цябе не скаштавала.
Дык спачывай жа! быццам у грабніцы,
У пузе ворага... а я забыцца
Не ў сілах пра цябе аж да сканання,
Дык буду ўспамінаць, пакуль сіл стане!!!

## Раздзел IV

Чаму ж прапалі ў забыцця глыбокай тоні
Шчаслівыя дні тыя, пане мой Антоні!
Калі бацькі твае вось тут, амаль пад бокам,
Глядзелі на Люцынку добрым чулым вокам?
І не было часіны гэткай мо ніколі,
Каб мы не сабіраліся ў адным застоллі.
То пад страхой гасціннай прымуць нас старыя,
То зноў у нашай хаце жонка стол накрые,
Збярэцца ўся радня сказаць, паслухаць слова.
Бывала, у часы спёкі першая суддзёва
Ў павозцы з'явіцца, абтулена ў капоты,
Ты, мілы мой суддзя! абцёршы з твару поты,
З той аркі выціскаешся, як быццам з печы,
І вось шырокія ўжо падстаўляеш плечы,
Каб хутка паню вызваліць сваю з цямніцы;
Суддзі ад звычкі даўняй нельга адхіліцца:
Ён трэпле пацеры і пехатою крочыць,
Хоць спёка дакучае ці хоць дождж мочыць.

Вось так ствараем круг. Суддзя наш чалавечны
Галоўным чынам для жанчын — не раз спрадвечны
Страляў ім мадрыгал, і ручкі пацалуе,
І перапросіць, і табачкай пачастуе.
А як пачнецца ў ім аратара замашка —
Яго на слова выклікаць было не цяжка,—
Пачне расказваць аб трыумфах у каханні,
Як колісь да сваёй ён заляцаўся пані,
І як яна яго з усмешкаю ласкавай,
Прыгожа апрануўшыся, чакала з кавай,
І як... Суддзёва пальцам тут яму пагрозіць
І ўміг яго аратарскі запал змарозіць.

Любіў пан Казімір заняцца прэферансам.
Супроць яго гуляла пані з большым шансам —
Нягледзячы што грошы йшлі з адной кішэні,
Яна, бывала, чырванее ад натхнення
І радасці, як мужа ў карты абыграе.

А той тады пацее, жонку дакарае
І, плацячы свой пройгрыш воляю-няволяй,
Гудзіць, што больш гульнёй не зоймецца ніколі.

Ды хітры пан Антоні дыскурс выклікае,
І пан суддзя ў той міг свой пройгрыш забывае,
І тэзісы свае пачне сцвярджаць упарта,
І не заўважыць, як падсуне сын зноў карту.
Бярэ яе са століка, зноў сядзе да гуляння,
Зноў пройгрышам няма канца і накарання.

Ужо ён з Лібітынаю сустрэўся строгай,
Жыў для людзей, дабра зрабіў ім многа!
Суддзя наш мілы! адышоў ты ў край далёкі,
І ў той краіне роднай ты не адзінокі.
Няма суседа ў нас, што кіраваўся сэрцам,
Цяпер капшук важней, а сэрца ў паняверцы!
Ды хопіць сумаваць нам, пане мой Антоні!
Каб ты за мора ўцёк, і там цябе дагоніць
Ніжэйшы твой слуга, Навум той Прыгаворка,
Вось гурт яго пегасаў узлятае к зоркам.

Прыбыў я на дзядзінец — чым тут люд заняты?
Сядзіць хтось на кані маленькі і пузаты,
Такі забаўны і настолькі смеху варты,
Што я падумаў у душы, што нехта жарты
Тут, пэўне, строіў, а пан Муха паўтарае
І для суседзяў новую гульню стварае.
Ды дзе там! пазнаю, што важна пан Антоні,
Як рыцар на турніры, высіцца сягоння
На коніку, а на сядле яшчэ й падушка,
А ён, нібы трапляючы ў кальчугі вушка,
Павесіў урачыста на далоні правай
Шпіцрутэн, быццам піку для вайны крывавай.
А збоку ля вудзілаў, з гаспадарскай згоды,
Трымаюць за вуздэчку аж два каняводы
У стра́ху, каб пегас не ўносіў наравісты
І каб не скінуў пана дзесьці ў полі чыстым.

Для большай пэўнасці абапал ля падпругі
Падтрымваюць героя ў ліўрэях слугі,
Каб ён на тым сваім становішчы ўтрымаўся,
Не зганьбіў прозвішча і рыцарам застаўся.

А пан суддзя, дзядзінцам едучы наўкола,
У ладкі плешча і з усмешкаю вясёлай
На ганак верне зрок — усё ў адну старонку.
«А што, мая Галюня? — ён пытае жонку,
Якая бачыць скачкі ў гэтым дзіўным змесце.—
Што мне зусім не страшна, бачыш ты нарэшце?
А ты ж казала ўсім, што я каня баюся,
Што, ўбачыўшы яго, са страху калачуся,
Дык вось даказваю, дзеля тваёй уцехі,
Што сесці на каня і гэтыя вось стрэхі
Змагу абараняць не горш, чым продкі нашы,
Дык хай цябе цяпер ужо нішто не страшыць».

Мяне ўбачыўшы, загад даў, каб ссадзілі
Яго з каня, а верхавога б павадзілі.
«Вось бачыш, мой Навуме, жонка мне казала,
Што конна ездзіць здольны я надзвычай мала,
Дык вось прызнала ўжо сваю несправядлівасць.
А ты ці бачыў спрыт мой і маю мажлівасць?»
«Татарын,— я сказаў,— не лепей, пэўне, скача.
Ты здаўся мне арлом на той старэчай клячы».

Яшчэ ў суддзі мне якасць важнаю здалася:
Калі з'яўлялася патрэба ў нейкім часе
Герою нашаму падацца ў падарожжа,
Дык як без зброі рыцар вырушыць не можа,
Каб стаць насупраць ворага адважна, смела,
Так ён у амулеты ўзбройваў усё цела.
На возе зразу перахрысціцца набожна,
У руку крыж возьме, а другою асцярожна
Бярэ святы званочак і з такою зброяй
Адважна ў шлях пускаецца любой парою.
А як яго застане гром ды бліскавіца,

Дык крыжам тым прабуе ўвесь час засланіцца,
А той званочак звоніць пільна і заўзята,
Трапеча сэрца ў ім, нібы матыль крылаты.
А пан суддзя ўсё ў руху, і ажно пацее,
І трэпле пацеры, якіх не разумее.

Бывала, што да Мухі шмат гасцей наедзе,
Частуюцца па густу. Ведаюць суседзі,
Што дом гасцінны тут, дык запрашае, вабіць
То шынка, то цяляціна, пячонка, мабыць,
Прыпраўленая кшталтам і на смак дзічыны,
Паштэт прыцягвае, кумпяк з лясной звярыны.
І проста з печы на стале ў яснай хмары,
Нібы зямля пасля дажджу, яшчэ ўся ў пары
У самым цэнтры распаложыцца бабіна,
Прыгожая і стройная, нібы дзяўчына,
У ружы, астры, васількі да шлюбу ўбрана,
Так кветкамі яна ўпрыгожана старанна.
Ніхто яе, не скаштаваўшы, не пакіне,
Бо пульхная яна, як ручкі гаспадыні!

Усе ўжо сытыя, ды ветлівасць змушае —
Суддзёва так сардэчна, шчыра запрашае:
«Дык будзьце ж ласкавы, суседзі, дзеля Бога!
І пакаштуйце пірага, ну хоць нямнога,
Сама я расчыняла, цеста я мясіла,
Калі адмовіце, дык будзе мне няміла
І мой настрой цяперашні мяне пакіне,
Падумаю, што я благая гаспадыня».

Не смелі не паслухаць гаспадыні госці,
Дык і была ж яна анёльскай прыгажосці!
Хай пільным сваім вочкам у бок нечый гляне,
Дык здасца, што заранка засвяціла зрання
І ў возеры крыштальным твар свой абмывае,
Прытым яе ўсмешка нейкі чар хавае,
А гутарка — прывабнасць; мей душу са сталі,
Яна сярэбраным слаўцом яе ўміг спаліць.

Дык і не дзіва, што, каго яна сурочыць,
Той на ківок яе ў агонь гатоў ускочыць.
Таму што кожны супрацьстаць ёй быў заслабы,
Дык уплятаў праз сілу пірагі і бабы.

Пасля такога падвячорка ў кожным разе
Дабрак пан Муха зноў меў кожнага на ўвазе,
Дык вельмі ўсім старанна падліваў у шклянкі
І ковенскім мядком ахвоціў да гулянкі.
Па смаку й колеру той мёд — не з нашых часаў,
Напэўна, помніў ён яшчэ Аўгуста Саса.

Падвыпіўшы, памалу госці разышліся
І, хто чым мог,— гульнёй, бяседай заняліся.
Дык гоманна было там, весела і міла,
На групкі розныя гульня ўсіх падзяліла.
Мы са старой суддзёвай, з доктарам шаноўным,
Мінулага стагоддзя звычаем саслоўным,
Паклікаўшы палкоўніка на дапамогу,
Гулялі ў вісціка старога панямногу.
А доктар грае дрэнна, машынальна карты
Кладзе, жаночыя ўсё ловіць шэпты, жарты.
А тут яшчэ Каруся, пакаёўка пані,
Свядомая таго, што, ў чый бок гляне,
Прашые сэрца,— чаем доктара частуе
І стрэламі вачэй сваіх яго ніцуе.
Вось цалкам зазяваўся, дык палкоўнік строга
Даказваць стаў, што чалавек той варт не многа,
Які страляе вокам, бо законы віста,
Запісаныя ў кніжцы, вучаць урачыста,
Што ён не зможа важных вырашаць заданняў.
А ў часе той прамовы, поўнай хвалявання,
З казырным каралём адкрыўся йшчэ зарана,
А доктар тузам б'е, ды гэтак нечакана,
Што вытрываць таго не мог стары ваяка,
Устаў і выйшаў вон з пакоя небарака.

Дарма чакаем чвэрць гадзіны, паўгадзіны,
Нарэшце ўстаць ад століка былі павінны,
Каб згубу адшукаць. Глядзім — непадалёку
Вядзе ўжо з іншымі людзьмі гаворку збоку.
Дык падыходжу к групе й ветліва пытаю:
«Каханы пан палкоўнік, як жа справа тая,
Што кінуў ты гульню, павінна завяршыцца?» —
«Я з кніжачкі скажу, і нельга вам забыцца:
Хто караля свайго казырнага б'е тузам,
Той можа прапароць нажом партнёру пуза,
Дык вось я ўцёк ад ворага свайго такога».
«Палкоўнік! — крыкнуў доктар.— Ты пабойся Бога!
А што было зрабіць мне з гэтакай абузай,
Калі ўсяго і меў я голенькага туза?» —
«Ну што ж, як так, прабач, іграў ты чыста,
Інакш быць не магло, хадзем закончыць віста!»
І зноў працягваўся той віст звычайным торам —
Няўважным доктар быў, палкоўнік граў з задорам.
А ў зале побач пан суддзя, звычайным ходам,
Спрачаецца, як і заўсёды, са Свябодам,
Якому злосна паўтарае, што Гаварда плугам
Зямлю палепшыць можна, што яго заслугам
Прагрэс прыпісваць трэба, новыя бо моды
У земляробстве павялічваюць даходы.
Свабода з ім не згодзен, ганіць тыя змены,
Якія ўводзяцца, кляне і пладазмены,
Даказвае, што край наш быў датуль багаты,
Пакуль к нам не прыйшлі чужынцы, рэнегаты
І тут свае не сталі ўводзіць паляпшэнні
Ды ачышчаць наіўным тоўстыя кішэні.
Кампанія спрачаецца, няма ў ёй згоды,
Як быццам насупроць два вырушылі ўзводы,—
Адны з суддзёю згодны, іншыя з Свябодам,
Дыскусія вядзецца цэлым карагодам.
І вось у хмарным небе раптам загрымела.
Той гоман сціх, глядзяць... суддзю дзе ліха дзела?
І кожны з канверсантаў думае-гадае,

Дзе дзеўся гаспадар, і вокал разглядае.
А як грымоты сціхлі, Муха запацелы
Перш голаў высунуў, пасля і корпус цэлы
З-пад століка й пытае голасам дрыжачым:
Ці болей хмар на небе мы ужо не бачым?
Ледзь толькі супакоіўся пасля той навальніцы,
Далей прадоўжыць спрэчку ў крэсла зноў садзіцца.

Пры гэтакай бяседзе, пры гульні ахвочай,
Хоць стала цёмна і падходзіў час паўночы,
Аднак гасціннасць пані і мядкі сівыя
Разморанае шляхты затрымалі выезд.
Свябода, хоць падалі воз яго парою,
Пакінуў дом гасцінны з ранняю зарою,
Бо толькі ўсеўся ў брычку, Муха, як натхнёны,
Пачаў даказваць, што ў шырокія загоны
Найлепей рыхтаваць палеткі баравыя,
Свябода ж думку меў, што дзірваны старыя
Не трэба апрацоўваць, як палі нізінаў,
Што толькі так расці азімыя павінны.
Ды так у гэтай спрэчцы не маглі спыніцца,
Што не заўважылі ўзыходзячай зарніцы.
Каб не фурман, якому спрэчка так дадзела,
Напэўна б, тую спрэчку без канца цягнулі
І ў час дыскусіі на месцы б там паснулі.

## Раздзел V

Табе цікава, пэўне, мой чытач ласкавы,
Зірнуць таксама й на маёй асобы справы.
Мо думаеш, што той, хто бліжніх так шырока
Малюе, сам павінен чыстае мець вока,
Але ж усяк бывае на зямной юдолі —
Залічвай і мяне няйнакш як у куколі!

Адзін з сусветных мудрацоў, мо Ёсель з Клецка,
Казаў, што шмат маны ў праўдзівасці стралецкай,
Дык вось, чытач шаноўны, ты запісвай смела
Мяне ў стралецкі цэх, я там душой і целам.
Другі мудрэц, валожынскі, здаецца, рабін,
У дзённіку сваім, якім выдаўцаў вабіў,
Сцвярджаў, што кожная прыгожая кабета
Завесці можа шляхціца на ўскраек света.
А мо й не лжэ мудрэц? Мой герб такога роду,
Які налічвае дванаццаць ваяводаў!!

Я не люблю займацца шклянкавай забавай,
Хіба што чаем шкло напоўнена ці кавай,
Затое мне зялёная чамусьці ніва
Прывабнаю здаецца, хоць нелітасціва
Абходзіцца яна са мной, бо чынам нейкім
Вымае з кішані апошнія капейкі.
Да працы я не сквапны, ды сваёй чаргою
Гады апраўдваюць гультайства дарагое,
Бо ўжо нялёгка ў старасці сябе мазоліць.
Дык лепей мне бяздзельнічаць або грымзоліць,
Чым абмяркоўваць план з Сабковічам якімсьці,
Як з клопату суседзяў дабываць карысці.
А больш заган не маю, жыў па Божай волі,
Людскіх слёз на сумленні я не меў ніколі.
Каб коратка сказаць, хто я, мне неабходна
Звярнуцца к варыянту песенькі народнай:

*Ах, калі б мне зранку*
*Гарбаты хоць шклянку*
*І цюцюну люльку,*
*Дзяўчыну Аннульку,—*
*Гарбату я піў бы,*
*Цюцюнец курыў бы,*
*Дзяўчыну Аннульку*
*К сэрцу прытуліў бы.*

* * *

Хачу цябе, цярплівы мой чытач, нарэшце
Яшчэ ў адзін, дастойны ўвагі, дом завесці.
Дом гэты старыну надзвычай паважае,
Гасціннасцю сваёй суседзяў спакушае.
Тут бачыш к блізкаму любоў як на далоні!
Збянтэжаны заўжды сюды скіруе коні,
Тут знойдзе дапамогу сірата і хворы,
Тут знойдзеш прыклад хрысціянскае пакоры!

Суддзёва Броўская жывая не па ўзросце!
Хоць сем дзесяткаў год, не часы маладосці,
Аднак калі засвеціць ранішняе сонца
Сваімі промнямі святла ў яе аконцах,
Зірні! ужо там ходзіць, топчацца старая,
Мараль чытае дзецям, чэлядзь дакарае.
І кожны слухае яе ўрачыста, уважна,
Аднак у доме так бывае пераважна,
Што, выслухаўшы настаўленні гаспадыні,
Хто што захоча, робіць, што захоча, кіне.
Нібы пад ценем ліпы кволыя расліны,
Пад пільнай той апекай тры жывуць дзяўчыны.
Па прыкладу матулі, гэта скажа кожны,
Жывуць яны цнатліва, сціпла і набожна.

Багаславенства мае і ў сынах суддзёва,
Якіх налічваецца тузіна палова,
Старэйшыя на службах, а малодшы ў хаце
Дапамагае сёстрам, выручае маці.

Пад гэту вось страху вядуць якіясь чары;
Не дзіва, бо з такіх, што навяваюць мары,
Малодшая з тых дочак, Флёрця, цуд-дзяўчына!
Яна маіх уздыхаў і ўсіх дум прычына.
Ды ты, чытач мой, ведай, што дазвол на гэта
Дала здаўна ахвотна мне мая кабета,
Бо і яна паненку любіць маладую
І слоў пахвальных для дзяўчыны не шкадуе.

Прыгожая душа ў яе, як і сама прыгожа,
Ніхто ў яе заган ні ў чым знайсці не можа,
Бо сэрца ў яе бязмежна палымнее,
Яна калек і хворых даглядаць умее,
Яна паміж усіх, як белая лілея,
І твар яе якімсьці светам прамянее,
А шыйка ў яе пушком пакрыта светлым,
Усмешачка яе чароўная і ветла
І зубкі быццам перлы, вочы ж — два джыгалы
Ці соладдзю напоўненыя два кінжалы,
Бо як паглядам стрэліць з тых блакітных вочак
Ці падражніць усмешкаю сваёй захоча,
То на душу тваю чар гэтакі накіне,
Што ён, хоць з часам нікне ўсё, павек не згіне.

Пад ганак пад'язджаю, сэрца мне варожыць,
Што ў сенцах ружа-кветка мне сустрэцца можа!
Не ашукаўся я, з усмешкаю анёла
І, вочак бліскавіцай стрэліўшы вясёла,
Вітае радасна мяне ўсмешкай чару,
Бо ведае, гарэзніца, што ёй да твару.
Так вочак грацыяй, смяшком, што сэрца кратаў,
Яна ўцягнула і мяне ў цэх вар'ятаў.

«Ах, мілая Фляруня! — я крычу з запалам.—
Ты стала для мяне сапраўдным ідэалам!
Перад табой я ўкленчу тут вось за хвілінку,
Ды пачакай нямнога — рассцялю хусцінку!»
І мацаю кішэнь. Гарэзніца ж малая
У той жа момант мне хусцінку падсцілае,
Хусцінку добрую, пахучую, з батысту.
«Ну кленч жа, рыцар!» — мне загадвае ўрачыста
Сярэбраным, паважным галаском. Бяруся
Здзяйсняць намер, падняў і рукі, што здаюся,
І вось, як з прашчы ці як на сігнал трывогі,
Бяжыць з пакояў хутка Эдвін для падмогі!

Пан Эдвін — сын наймаладзейшы гаспадыні:
Перад яго вачыма розніца загіне

Паміж птушынай дробнай і валом рабочым —
Аж так падводзілі яго звычайна вочы.
Аднойчы ўздумаў ён заняцца паляваннем,
Дык стрэльбачку купіў і вырушыў світаннем
Таптаць балоты, поле ды чакаць удачы.
Вось шчасце! Канюка сярод каменння ўбачыў,
Дык да яго паўзком пасунуўся па полі,
Як гад паміж травы, няспынна, хоць паволі.
І стрэліў, як была адлегласць добра ўзята,
Рад вельмі быў, што знішчыць куранятак ката.
Аж вось на месцы, дзе сядзеў той вораг хцівы,
Пачуўся рык вала працяглы і страхлівы.
Так трапіў у працаўніка, які травіцай
З расою на мяжы задумаў пажывіцца.

Пачуўшы стук калёс, пан Эдвін пакідае
У пакоях моладзь і ў сенцы выбягае,
Каб прывітаць ласкавых і ў кватэру ўвесці,
Бо ён за гонар дому ўсё ж адказны ўрэшце.
Ды гледзячы на ўсе прадметы, як праз пленку,
Ён ува мне чамусьці ўбачыў маю жонку
І стаў у ветлівасці тут жа рассыпацца
І, быццам пілігрым, з паклонамі ўвіхацца.
Стаў сыпаць камплімента розныя са спехам,
Што аж мы з Флёрцяй пырснулі вясёлым смехам.
Уцяміўшы памылку, каб мы больш не кпілі,
Тлумачыў, што пазнаў мяне ў той самай хвілі,
Ды мне даваў навучку тым вітаннем звонкім
І ветліва ўпікнуў, што я прыбыў без жонкі.
Мяне сардэчна і пані дому сустракае,
Чаму прыехаў я без жонкі, папракае:
«Чаму ж не прыбыла яна ў мае парогі?»
Дык звальваю віну на дрэнныя дарогі,
Не хочучы адкрыць выпадку з тою бабай,
Кажу, што чуецца яна сягоння слабай.

Па добрым падвячорку панічы з падскокам
Пабеглі да паненак, шастаючы крокам,
І кожны выбіраў з іх свой прадмет жаданы,
Найперш за ўсё з мазуркі пачалі каханай,
Старэйшым паланез пакінуўшы, па модзе.
А тыя дыскурс свой вялі ў той час пры мёдзе,
На ўсходжасць слабую азімых наракалі,
Прадказвалі злы час і чаркі прапускалі.

Адданы марам Эдвін так план размяжоўваў,
Каб танец распачаць з сукеначкай ружовай.
Паміж дзявіц шматлікіх гэта ўпала ў вока
І развярэдзіла душу яго глыбока.
І трэба ж, як сумысле лёс на жарты скоры,
Загад даў і Слівянцы такія ж уборы
Насіць, хоць не падходзілі ўжо ёй па ўзросце.
Але калі няўдала спутае кагосьці,
Тады на кожным кроку ўжо рыхтуе ўдары.
Мазурка грымнула, становяцца ўсе ў пары,
Дык Эдвін, між дзяўчат шукаючы выбранкі,
Заместа да яе падскочыў да Слівянкі,
Хапае за руку і ў круг яе выводзіць;
А гэты шанс старую панну ўміг малодзіць.
Пражыўшы паўстагоддзя, думкай не грашыла,
Што лёс з ёй абысціся можа гэтак міла.
Заўважыў потым ён сваю памылку гэту,
Ды нельга кола рваць паводле этыкету.
Дык моладзь тупае, ў туманах мар лунае,
Адзін Эдвінак толькі лёс свой праклінае.

Прыгожа на дварэ! там сонца пры заходзе
Цяплом сваім спрыяла веснавой прыродзе,
Багата рассяваючы свае праменні
І ў чырвань красячы нябеснае скляпенне.
Мы выйшлі з дому грамадою ў сад фруктовы,
Каб асвяжыць пасля мядоў свае галовы.
Эдвінак, прадчуваючы, што будуць кпіны,
Казаў, што ўсе старэйшых шанаваць павінны,
Таму ён са Слівінскай распачаў мазурку.

«Няпраўда,— ўставіў хтосьці,— ты сляпая курка,
А каб павесіў акуляры ты на носе,
Тады б мо Гэлю-прыгажуню ўзяў ці Зосю.
Калі ў цябе зрок быстры, дык вось, пры ахвоце,
Згадай, якія птушкі там сядзяць на плоце?»
«Няслушна,— кажа Эдвін,— робіш мне прытычкі,
Сляпы б убачыў нават, што сядзяць індычкі.
На доказ кіну камень, зараз ён між імі
Перапалох зусім неспадзяваны ўзніме».
І, каб даць доказ моцны сілы свайго зроку,
Шпурнуў даволі значным каменем здалеку.
І тут збаны, якія сохлі там на плоце,
Гукнулі чарап'ём. Пан Эдвін — у страхоцці!
Не толькі ад напасцей не абараніўся,
А горш яшчэ перад сябрамі асмяшыўся.
Стаяў, азмрочаны гісторыяй такою,
Пасля, спусціўшы нос, падаўся ў бок пакояў.

Мінае хутка час у радасці і згодзе!
Развітваліся мы ажно пры сонца ўсходзе,
А едучы дамоў паміж палёў зялёных,
Спявалі разам з жаваронкам гімн натхнёны
Узвышняму ў надзеі, што Ён, дабратлівы,
Пасля такіх няшчасцяў год пашле шчаслівы!

Канец 1-й часткі

*Люцынка, 1868 год*

# Wersty

## LITWINKA.

Jam sobie z dziadów Litwinka!
Rumiana, hoża dziewczynka;
Choć pracuję w pocie czoła,
Alem raźna i wesoła.

Szczera praca, w życiu statek,
To majątek, to dostatek.
Póki sił mi starczyć będzie,
Znajdę kawał chleba wszędzie.

Jakże miło gdy w niedzielę,
Wysłuchawszy Mszy w kościele,
Na zabawę, wystrojona,
Ruszam w pośród dziewcząt grona.

I piękniejszy mój bukiecik,
I kraśniejszy mój gorsecik,



...ren ziemskie koleje,
...kże uśmiech jaśnieje:
...ciu miłości chwilka,
...nadzieja lat kilka,—

...Lwowie, dnia 15 dnia 1849 roku.

* * *

...Czas w chyżym przelocie
Zniszczył szczęście moje,
Tylko marzeń krocie
Z oczu cisną zdroje.
Smutek pierś mą tłoczy,
Smierć w zbolałej duszy,
Oko we łzach broczy,
Rozpacz życie kruszy!..

## [ПЕСНЯ З АПЕРЭТКІ «РЭКРУЦКІ ЖЫДОЎСКІ НАБОР»]

...Час зусім нечакана
Знішчыў шчасны мой лёс,
Па радзіме каханай
Я праліў многа слёз.
Пазірае мне ў вочы
Гора чорнаю хмарай,
Плачу ўдзень я і ўночы
Над разбітаю марай...

## MODLITWA NA DZIEŃ ZADUSZNY

Nędzny prochu! człowieku, ty nicości maro!
Ukorz się w tym przybytku przed Boga ofiarą;
A wznosząc głos za zmarłych ojców swoich cienie,
Wejdź we własne przestępstwa i oczyść sumnienie.

W tym dniu wspomnień, dniu przeszłości,
Racz nas wysłuchać, o Panie!
Weź zmarłych na Twe staranie,
Nam sprostuj dnie następności;
Bośmy bardzo zawinili,
Bardzo Ciebie obrazili.

Lecz dobroć Twoja bez końca,
Wyrzekłeś tak przez Proroka[1];
W niej wiernych cała opoka,
A Syn Twój wiernych obrońca.

Przez Jego się więc wstawienie,
Odpuść nam i daj zbawienie.

*Mińsk, 1848 r. Oktobra 20 d.*

## МАЛІТВА НА ПАМІНАЛЬНЫ ДЗЕНЬ

Ты толькі пыл мізэрны, чалавеча мара!
Скарыся ў доме Божым прад святой ахвярай,
А ўзняўшы голас за бацькоў памёршых цені,
Грахі свае пазнай і ачышчай сумленне.
А ў дзень памяці былога
Ты нас выслухай, о Пане!
Папрастай Ты нам дарогі,
Бо мы вельмі саграшылі,
Шанаваць Цябе забылі.

[1] W Psalmie 14 Dawida.

Што Ты добры к нам бясконца,
Знаем гэта праз прарока,
Ты для нас уся апока.
Сын Твой верных абаронца,—
Праз Яго багаслаўленне
Нам даруй і дай збаўленне.

*Менск, 1848 г[ода] кастрычніка 20 д[ня]*

## DZIECIĘ I MATKA

Objaśnij, proszę, mamuniu kochana!
Czemu przy wstaniu, lub gdy spać idziemy,
Codzieńnie korne zginając kolana,
Z mamą paciórki mówiemy?

Gdzie ten Bóg mieszka, którego prosiemy
O chleb powszedni i Rodziców zdrowie,
Czemu Go nigdy okiem nie ujrzemy?
Niechaj mamunia mi powie.

Czy to On świat ten, tak piękny, zbudował,
Gdzie wszystko życiem oddycha, roskoszą?
Czy to On kwiatki, te lasy hodował,
Co się pod niebo aż wznoszą?

On że to słonkiem rażących promieni,
Gwiazdkami upstrzył niebo lazurowe?
Czy to przez Jego miesiąc w nocnej cieni
Rozlewa swiatło grobowe?

Na te ciekawej dzieciny badania
Odpowie matka: «Dam ci kciążkę nową,
W której, na wszystkie twoje zapytania,
Znajdziesz odpowiedź gotową.

Бóг створзыў wszystko swą potężną siłą;
Kto wierzy w Boga pewno się nie myli:
Ja wierzę duszą, bo i wierzyć miło,
I tak Ojcowie wierzyli».

*Мінск, Maja 3 dnia 1849 roku*

## ДЗІЦЯ І МАЦІ

«Скажы, прашу, мне, мама дарагая,
Чаму і ўстаўшы й позняю парою
Штодзённа на каленях Бога мы благаем,
Гаворым пільна пацеркі з табою?

А дзе жыве той Бог, якога просім,
Каб нам здароўе даў усім і хлеба?
Чаго сустрэць Яго нам не прыйшлося?
Скажы мне, мама, бо мне ведаць трэба.

Ці Ён пабудаваў свет наш прыгожы,
Дзе ўсё жывое роскашшу абнята?
Ён кветкі тыя вырасціў, быць можа,
І гадаваў той лес, высокі і кашлаты?

Ён сонца мо ўзняў на нябёс скляпенне
І зоркамі багата ўкрыў блакіты?
Ці праз Яго, прагнаўшы ночы цені,
Нам месяц шле свой бляск несамавіты?»

На гэтыя дзяціны шчабятанні
Адкажа маці: «Вось у кніжцы новай,
Што дам табе, на ўсе свае пытанні
Адказ заўсёды знойдзеш ты гатовы.

Усё Бог сатварыў сваёй магутнай сілай,
Хто ў Бога верыць, той не ашуканы.
Душой я веру, бо мне верыць міла,
І верылі ж бацькі так пастаянна».

*Менск, траўня 3 дня 1849 года*

## WIOSNA!

Mały zwiastunie niebieskiej wiosny,
Skowronku! wzbij się wysoko wgórę,
Niech głos twój wdzięczny, głos twój donośny
Ocuci martwą naturę.
Jako zbudzona nadobna dziewica
Z przyjemnych marzeń, pocałunku echem,
Zdobiąc szkarłatem anielskie swe lica,
Darzy kochanka wstydliwym uśmiechem;
Tak i natura, wiosny uściśnieniem
Szczęśliwa, barwę nadziei przywdziewa,
Zefir jej wtórząc swym łagodnym tchnieniem,
O nowem życiu, o miłości śpiewa.
I słowik wspólnie łącząc rzewne tony,
Przysięga miłość dla swej ulubionej.
Wszystko na ziemi swobodą oddycha,
I słonko nawet weselej uśmiecha,
A promieniami złotemi
Niszcząc zuchwałe resztki śnieżnej bieli,
Zielony dywan na ziemi
Ściele, na którym gdzie niegdzie wystrzeli
Kwiatek, szukając ożywnego tchnienia,
Rad że się dobył z mroźnego więzienia.
O Boże! jakże dobroć Twa bez miary,
Kiedy na lud Twój, co Cię tak obraża,
Twoja prawica, zamiast srogiej kary,
Takiem go dobrem obdarza.

*Olpień, Maja 12 dnia 1849 roku*

# ВЯСНА!

Жаўруча, сіняй вясны вястуне!
Высока ў неба, малы, узбіся,
Збудзі прыроду, жыцця пяюне,
Удзячнаю песняй з высяў.
Як прыгажуня, што з мар-летуценняў
Збуджана ўраз пацалункавым рэхам,
Квецячы твар свой анёльскі ірдзеннем,
Дорыць каханка цнатлівым усмехам;
Так і прырода ў абдымках вясновых
Барвай надзеі красуе шчасліва,
Рэха Зефіру жадае ёй новых
Дзён і кахання лагодным матывам.
Тут жа ліе салавей апантана
Песню прызнання ў каханні абранай.
Воляю дыхае ўсё навакола,
Сонейка нават смяецца вясёла,
Стрэламі промняў знішчае
Рэшткі зухвалыя снежнае белі,
Хваляй цяпла ачышчае
Дол, на якім час ад часу ды стрэліць
Кветка ў шуканні жывільнага тхнення,
Радая, што не ў марозным вянзенні.
О Божа! бясконцы дабра крыніцы,
Калі твой люд, што цябе абражае,
Заместа кары з тваёй жа дзясніцы
Такое багацце мае.

*Альпень, траўня 12 дня 1849 года*

## PRYPEĆ

Witajcie szumne wody Prypeci!
Szmer waszych fali daleko leci!
Bieżysz w objęcie swego kochanka,
Dumnego Dniepru pokorna branka.
Miłość cię wiecznie z twym władcą jedna,
Choć w bystrych falach zaginiesz biedna!
Jednak by umrzeć u jego boku,
Na śmierć niechybną przyspieszasz kroku.
Tak i dziewica niedoświadczona,
Gdy młode serce miłość pokona,
Wrząca namiętność bieg życia skróci,
Ona szczęśliwa! tem się nie smuci,
Tylko wzajemnej miłości żąda,
I na zabójcę słodko pogląda;
A choć duch rzuca ziemskie koleje,
Na ustach wszakże uśmiech jaśnieje:
Bo lepsza w życiu miłości chwilka,
Niżeli bez niej nudnych lat kilka.

*Na wodach Prypeci; Maja 13 dnia 1849 roku*

## ПРЫПЯЦЬ

Вітайце халодныя Прыпяці хвалі,
Іх шум, не змаўкаючы, коціцца далей.
Бяжыць да Дняпра, у абдымкі каханка,
Пакорна сяброўка — яго паланянка.
Адвечна каханне іх рушыць, яднае,
Хоць Прыпяць у хвалях дняпроўскіх канае.
Яна, праплываючы шлях свой далёкі,
Свядома да смерці прыспешвае крокі.
Вось так і ў дзяўчыны бракуе стрымання,
Як сэрца ў юнацтве агорне каханне.

Няшчадна яе так віруе і круціць,
А шчасце дзявочае ўсё ж не засмуціць.
Гарыць нестрыманае любасці прага,
А да забойцы — салодкая ўвага.
І дух яе мкнецца па шляху жыццёвым,
Усмешка на вуснах, пяшчотныя словы.
Хвіліна кахання, ясноты і згоды
Куды даражэй нам за нудныя годы.

*На водах Прыпяці; траўня 13 дня 1849 года*

## LITWINKA

Jam sobie z dziadów Litwinka!
Rumiana, hoża dziewczynka;
Choć pracuję w pocie czoła,
Alem raźna i wesoła.

Szczera praca, w życiu statek,
To majątek, to dostatek.
Póki sił mi starczyć będzie,
Znajdę kawał chleba wszędzie.

Jakże miło gdy w niedzielę,
Wysłuchawszy Mszy w kościele,
Na zabawę, wystrojona,
Ruszam wposród dziewcząt grona.

I piękniejszy mój bukiecik,
I kraśniejszy mój gorsecik,
Bielutka, jak śnieg, spodniczka,
Srebrna u szyi petliczka.

A wkoło mnie chłopców roje,
Ten prawi androny swoje,

Tamten słodziutko pogląda,
Ten znów ręki mojej żąda.

Słowem uczciwość i praca,
W świecie drogo się popłaca;
I mnie na niczem niezbywa,
Pókim rządna i poczciwa.

*Wilno, Października 2 dnia 1850 roku*

## ЛІТВІНКА

Я ад прадзедаў літвінка,
Ружашчокая дзяўчынка.
Хоць да поту я працую,
А ніколі не смуткую.

Праца рупная — багацце
І набытак шчодры ў хаце.
Покуль б'ецца сэрца ў грудзях,
Мне кавалак хлеба будзе.

Дачакаюся нядзелі,
Памаліўшыся ў касцеле,
У адзенні новым зранку
Я спяшаю на гулянку.

Прыгажэйшы мой букецік,
І найлепшы мой гарсэцік,
І бялюткая спаднічка,
І срабнюткая пятлічка.

На гулянках роем хлопцы
Увіхаюцца, малойцы.
З асалодай паглядаюць
І маёй рукі жадаюць.

А за вынік рупнай працы
Вельмі шчодра ў свеце плацяць.
Я ў жыцці за гэту прагу
Атрымоўваю павагу.

*Вільня, кастрычніка 2 дня 1850 года*

## FANTAZYA
## ANTONIEMU KĄTSKIEMU OFIAROWANA

### Introdukcya — Geniusz

Twórca wywodząc świat z nicości toni,
I dając człowiekowi nad nim panowanie,
Wlał mu cząstkę swojego bóstwa.— Przekonanie
To najdowodniej stwierdza nasz Kątski Antoni.

### Thema — Powitanie

Stugębna fama gruchnęła po mieście,
Kątski przyjechał!! — bracia! Cześć mu nieście!
Kątski przyjechał! pianista Antoni!
Cieszcie się bracia! całe miasto dzwoni.
Witamyć kwiatku! któryś wzrósł szczęśliwie,
Na pobratymczej nam, Sarmackiej niwie,
Witamy sercem pełnem uwielbienia,
Chłubo, zaszczycie Lechitów plemienia!

### Waryacye — Radość

U zielonego stolika,
Zdala od trosk i kłopotu,
Po groszu w preferansika

Cięliśmy się aż do potu;
I właśnie kiedy z zapałem
Osim bez atu grać miałem,
Aż tu ktoś wbiega zdyszany,
Rzęsistym potem oblany:
Panowie, grą tu zajęci
Niewiecie, rzekł, co się święci?
Kątski was Antoni wita;
Przyjechał? każdy wnet pyta.
A ja z radości niestety!
Postawiłem aż trzy bety.

## Adagjo — Dzień Imienin

Przegraną jednak będąc nie zrażony,
Lecę do Mistrza by hołd uniżony
Złożyć w pokorze — i przez wspólne pienia,
Uczcić z innymi dzień Jego imienia.

## Al[l]egro — Powinszowanie

Obyś wiek długi
Niósł swe usługi
Dla dobra kraju, ludzkości.
Zdrowia czerstwego,
Mienia dobrego
Niechaj Ci wróg Twój zazdrości.
Niech kraśnolice,
Hoże dziewice
Wieńce Ci chwały splatają:
Wdzięczne Twe tony
Niechaj miljony
Dukatów Ci przysparzają.

### Фінал — Пожегнанне

Мистрзу! — коś nas zachwycił cherubów śpiewami,
Jakże krótko, niestety! gościsz między nami;
Ledwośmy Cię pojęli...— jużeśmy w żałobie:
Odjeżdzasz,— w sercach naszych tęsknota po Tobie
Na wieki nie wygaśnie.— Żegnaj Mistrzu drogi!
Niech szczęśliwieć prowadzą przyjazne Ci Bogi!

*Mińsk, Lipca 3 dnia 1853 roku*

## ФАНТАЗІЯ, ПРЫСВЕЧАНАЯ АНТОНІЮ КОНЦКАМУ

### Інтрадукцыя — Геній

Творца, свет снуючы з хаосу прадоння,
Чалавека ўзносячы панам сусвету,
Частку боства яму перадаў.— І гэта
Найлепш пацвярджае Концкі Антоні.

### Тэма — Вітанне

Разнесліся ўмомант па горадзе весці:
Концкі прыехаў — спяшайцеся ўчэсціць!
Концкі прыехаў! Музыка Антоні!
Радасць якая! Увесь горад звоніць.
Вітаем жа квет, што вырас шчасліва
На пабратымскай сармацкай ніве,
Вітаем ад сэрца. Любасна вельмі
Стрэць славу й гонар ляшскага племя!

## Варыяцыя — Радасць

Засеўшы за столік зялёны,
Ўбаку ад жыццёвых турботаў
Мы ў прэферанс утрапёна
Гулялі да сёмага поту.
І вось калі мне давялося
Без аднае ставіць восем,
Як хтосьці імкліва ўбягае,
Запыханы, паведамляе:
«Гульнёю сваёй вы заняты —
А чулі, якое ў нас свята?
Вас Концкі Антоні вітае».
«Прыехаў?» — тут кожны пытае.
Ад радасці я з імпэтам
Паставіў тры ажно бэты.

## Адажыо — Дзень імянінаў

Пройгрыш, аднак, не крануў за жывое —
Маэстра ўшаноўваць лячу я затое,
Каб разам з іншымі ўславіць сягоння
Спевамі дзень імянінаў ягоных.

## Алегра — Віншаванне

Каб жа век доўгі
Ты не чуў змогі,
Краю служыў бы і людзям,
Май жа здароўе,
Славу назоўя —
Зайздрасць хай вораг набудзе.
Хай жа заўсёды
З добрай нагоды
Ўюць табе кветкі дзяўчаты.
Хай табе гранне,

Талент, старанне
Шмат назапасяць дукатаў!

## Фінал — Развітанне

Маэстра, які зачароўваў музыкай дзіўнай,
Як жа кароткія ў нас твае пагасціны;
Толькі цябе мы спасціглі..., як ужо ў смутку:
Едзеш — прыгасне туга ў нашых сэрцах не хутка.
Што ж, дарагі наш, бывай, шчаслівай дарогі!
Хай жа цябе ашанцуюць прыязныя богі!

*Менск, ліпеня 3 дня 1853 года*

# GOŁĄBKI

Szesnastoletnia Alinka,
Wdzięczna, świeża, jak malinka,
Raz w wieczornej lata dobie,
Gdy paciorki odmówiła,
U okienka nucąc sobie,
Marzeniom się powierzyła:
I nuż swe lata dziecinne,
Wszystkie zabawki niewinne,
Życie bez trosk i goryczy
Pełne anielskiej słodyczy
Porównywać z nowym bytem,
Tak w dziwne myśli obfitem!
Nuż odgadywać przyczynę
Jakiejś tęsknoty, pragnienia,
Które niewinną dziecinę
Nieraz dziś budzą z uspienia.
I kiedy dziewczę dumało,
Zkąd ta nuda, żądza, trwoga,
Tak się swej matki spytało:

«Powiedz mi mamuniu droga
Co też to się ze mną dzieje?
Ja chora, mamo, bydź muszę,
Jakieś chęci i nadzieje
Ciągle trapią tęskną duszę;
Ni mnie dziś bawią laleczki,
Ni zachwyca śpiew ptaszeczki,
Ni strumyczek, ni zielona
W kwiatki łączka ubarwiona
Nie nęcą swoją pięknością;
Wszystko dziś dla mnie nicością!
I ciągle mi się wydaje
Jakoby czegoś nie staje».

Na te jej dziecinne żale
Z uśmiechem matka odpowie:
«Nie jest to choroba wcale,
Lecz te dumania w twej głowie
Rozum z latami przywodzi,
On ci tę mysl tęskną rodzi».

«Ach, prawda mamo jedyna!
Jam nie tak tępa dziewczyna»,—
Naiwnie córka odpowie,
«Doniosę mamie zdarzenie,
Które mi dziwne marzenie
Usnuło onegdy w głowie.
Chcąc się rozerwać, zawczora
Przechadzałam się z wieczora;
I długom sobie chodziła,
I mysliła i nuciła;
Aż ujrzę, gołąbków dwoje
Usiadło sobie w bliskości,
Jeden z nich piosenkę swoję
Z uwdziękiem drugiemu grucha,
Ten jej zda się chętny słucha,
I pełen jakiejś lubości
Zbliża się ku niemu w chwili

I wdzięcznie mu się przymili,
Ale on czegoś nalega,
Ten się usuwa, odbiega,
Potem znów się razem schodzą,
I całuskiem z sobą godzą.
Myślę... coby też to było ?
Co ich nęciło, bawiło?
A patrząc na te pieszczoty,
Nabrałam jakiejś ochoty
Tej ich zabawki spróbować:
I kiedy August przyjedzie,
Rzeknę mu, miły somsiedzie!
Proszę też mnie pocałować!!!»

Na to matka — «moje dziecie!
Co też w głowie twej się plecie,
Ach to grzech! ach to myśl zdrożna!
Próbować ci jej nie można».

«Nie można?.. a czemuż mama
Taki grzech popelnia sama
Kiedy tatunia całuje?»
«Tatunia!.. to co innego,
Ja męża całuję swego,
Tego Bóg nie zakazuje».

«Rozumiem!.. Ależ mój Boże!
Dla czegóż August nie może
Bydź także mężem z mej woli,
I kiedy mama pozwoli?»

«Tyś jeszcze młoda, kochanie!
Nie wiesz jakie są w tym stanie,
I jak wielkie obowiązki;
A najprzód, idąc w te związki
Trzeba wzajemnej miłości».
«Miłości?.. przerwie, tej zgoła
Obójgu nam nie brakuje,

Ta oddawna u nas gości,
Niech się mama nie frasuje:
A dalsze małżeńskie związki,
Te tam wielkie obowiązki,
Któremi mama zastrasza,
Łatwiuteńko pójdą sobie,
Uręczam mamuniu tobie,
Bo to już rzecz wspólna nasza.
Niech tylko droga mamunia
Przyczyni się nam do szczęścia,
I wyprosi u tatunia
By nam nie bronił zamęścia;
Otóż będziem się cieszyli,
Całowali i bawili!!!»

*Mińsk, 25 Maja 1854 r.*

## ГАЛУБКІ

Год шаснаццаці Алінка,
Быццам свежая малінка,
Раз улетку ў вечар дзіўны
Ля акна аб нечым пела.
Пад спеў песні пераліўны
Думка горкая наспела.
І дзяцінства свайго справы,
І нявінныя забавы,
І жыццё ўсё без турботы,
Не кранутае гаркотай,
Параўнала неахвоча
З новым побытам дзявочым.
Пачала шукаць прычыну
Прагі нейкай, смутку, млосці —
Яны бедную дзяўчыну
Непакояць часта штосьці.
Калі сілы больш не стала

Зладзіць, справіцца з тугою,
Яна ў маці запытала:
«Мама, што гэта са мною?
Сэрца поўніць чымсьці дзіўным
І жаданні мяне душаць,
І ў трывозе штогадзіны.
Няўжо, мама, я нядужа?
Не хачу цяпер я лялек,
Птушак спеў не захапляе.
Ні вада крыніцы чыстай,
Ні зялёны луг квяцісты
Больш не маюць прыгажосці —
Не знаходжу ў іх чагосьці.
І спакою, прызнаюся,
Не хапае мне, мамуся».
На дзіцячыя ўсе скаргі,
Смеючыся, кажа маці:
«Разважанні, твае думкі
Не хваробай называці —
Гэта розум твой сталее,
Вось таму і сэрца млее».—
«Ах, мамуся дарагая,
Я дзяўчына не тупая,—
Ёй чуцён адказ наіўны,—
Аб здарэнні скажу дзіўным.
Абудзіла яно мару —
З ёй расстацца сілы мала.
Захацела пазаўчора
Пагуляць я адвячоркам.
Вельмі доўга я гуляла,
Разважала, напявала,
Ажно бачу — поруч, блізка
Галубкоў прысела двое.
Вось адзін з падзякай нізка
Нахіліўся галавою,
Сваю песеньку буркоча
І глядзіць другому ў вочы.
А другі прыхільна слухаў,

Поўны любасці, самотны,
І крыла імгненным рухам
Спевака кранаў пяшчотна.
Буркаваць спявак ледзь скончыў,
Ад яго другі адскочыў.
Не, ізноў душа адна ў іх,
Пацалунак аб'яднаў іх.
І мне думаць стала міла:
Што ж іх гэтак захапіла?
Галубіныя пяшчоты
Надалі і мне ахвоты
Іхняй спрабаваць забавы.
І калі Аўгуст прыедзе,
Любы мой, скажу, суседзе,
Пацалуй жа, будзь ласкавы!»
Кажа маці: «Ох, дзіцятка!
Розуму ў цябе няхватка.
Гэтак думаць не набожна!
Спрабаваць таго не можна».—
«Чаму ж, мамачка, сама ты,
Як цябе цалуе тата,
Не спрачаешся ніколі?» —
«Тата? О, не тое, дружка!
Я цалую свайго мужа
І нікога ў свеце болей».—
«Разумею!.. Ды, мой Божа!
А чаму Аўгуст не можа
Быць мне мужам з маёй волі,
Калі мама нам дазволіць?» —
«Не спяшайся! Час настане,
Больш уцяміш пра каханне.
Памятай, мая галубка:
Перш чым вам ісці да шлюбу,
Трэба любасці ўзаемнай».—
«Любасці?.. Я гэта знаю.
Нам даўно яе хапае.
Разам быць нам так прыемна!
Хай жа маму не турбуе,

Бо ў жыцці сямейным нашым
Абавязкі нам не страшны,
Самі ўладзяцца сабою,
Паручуся галавою.
То ўжо справы толькі нашы...
Хай жа дарагая мама
Выпрасіць, каб тата любы
Быў згаворлівы таксама
І не перашкодзіў шлюбу.
Тады станем пацяшацца,
Цалавацца, мілавацца».

*Менск, 25 траўня 1854 г[ода]*

## ВІНШАВАННЕ ВОЙТА НАВУМА

*У дзень імянін панны В... С...*

Нех бэндзе Езус Хрыстус пахвалёны!
А цэлы дом гэты,
Мужы да кабеты,
І дзеткі маленькі,
Служкі весяленькі,
На векі векаў Ім благаславёны!

Яшчэ не збудзіў пявун,
А ўжэ са двара цівун
Прынёс мне такі урад,
Штоб людзям чыніць загад.

Я жэ бытцэм захвараў,
А як у двор ён вярнуўся,
Вот! світкаю апрануўся
Дый у горад цягу даў.

Які ж тут грэх мае быць,
Што пабадзяўся зарання

Ад грамады віншаванне
Нашай паненцы чыніць?
Няхай камісар сярдзіцца,
Няхай акамон зласціцца,
Я павіннасць сваю знаю,
З нізкім паклонам к Табе прыступаю.

Імяніннiца ты, баш! сягодня;
Ўсяляка воласць — цэлая сродня
Моліць Бога за вашэці,
Штобы доўга вельмі жыла
Да ў тым жыцці не тужыла,
Штоб парадак мела ў клеці;
Штоб табе заўжды вялося
У канапельках калоссе,
Ад каровачак бычкі,
А ад цябе, паненачка, ладны мужычкі.
Вясёла будзь — як сват на вяселлі,
Прыгожа — маўляў у небе анелі!
Рублявікі ты мерай на капы,
Сала каўшом, а локцям каўбасы;
Пацехай будзь у старасці бацькам,
А маткай роднай сваім мужычкам;
Розуму мей, як у дабрадзея
Нашага ксяндза Мацея:
Ён у касцеле як возьме казаць,
То й чаркай гарэлкі яго не уняць!
А так вачмі ён міргае,
А так рукамі матае,
Што і сам чорт не паймець!
Так на розум ён бярэць.

Скончыў! — А за віншаванне,
Сярдзечнае прэмаўлянне,
Паднясі ж, паненачка! дый з белай тарэлкі
Чарачку мескай гарэлкі!
Я гарэлачкі нап'юся,
Ў пояс табе пакланюся,

Назад дамоў пабраду,
Грамадзе нашай скажу,
Яке было прыймаванне,
Прынука дый частаванне.

Нех бэндзе пахвалёны,
Ад усялякія строны,
Наш Збавіцель сярдзечны,
На векі векаў вечны,
Амэн!!!

*Менск, 1854 года чэрвеня 23 дня*

## WSPOMNIENIE!

Pamiętasz, Luba! te chwile,
Niestety! chwile rozstania,
Gdyśmy, wsród uczuć wylania,
Czas przepędzali tak mile?

Ty rzewnem, łzawem spójrzeniem
Sledziłaś gwiazdki w obłoku,
A ja gwiazdeczki w Twem oku
Podziwiałem z uwielbieniem.

Pamiętasz? łzami zalany,
Błagałem w ducha pokorze,
Powiedz mi, o cnoty wzorze!
Czy w zamian jestem kochany?

Wtem z ust anioła życzliwy
Wyrok do ucha mi leci:
I dla cię szczęście zaświeci,
Bądź tylko wierny... cierpliwy.

*Mińsk, Września 22 d. 1854 r.*

## УСПАМІНЫ!

Ці згадваеш, любая, хвілі?
На жаль, то хвілі расстання!
Як час ляцеў у каханні
Й пачуцці нас паланілі?

Ты чула — слязлівым зрокам
Сачыла зорачкі ў хмарах,
А я захапляўся з жарам
Зоранькамі ў тваім воку.

Ці згадваеш? разрыданы,
Маліў я ў духа пакоры,
Скажы мне, о цноты ўзорык,
Ці я ўзамен каханы?

І вырак я ўчуў зычлівы
З анёльскіх вуснаў: «На свеце
Шчасце табе йшчэ засвеціць,
Будзь толькі верны... цярплівы».

*Менск, верасня 22 д[ня] 1854 г[ода]*

## PORTRET STEFCI

Jeśli spotkasz gdzie w krainie,
Kędy wspaniały Dniepr płynie,
Dziewczę naiwne i hoże,
W której licach kwitną róże,
Twarz pełna rajskiej osłody,
To pięknej Stefci jagody.

Jeśli wabnem oczkiem strzeli
Prosto w serce — jak do celi,
I serce ogniem zapłonie;

Kiedy poczujesz w swem łonie
Jakieś dla Niej uwielbienie,
To będzie Stefci spójrzenie.

Kiedy głos słodki, pieszczony,
Zabrzmi anielskiemi tony,
Z Jej usteczek koralowych;
Gdy doświadczysz uczuć nowych,
I zamąci ci się głowa,
To pewno będzie Jej mowa.

Gdy wdziękami pokonany,
Wdziejesz różanne kajdany,
I u nóg, pełen żałości,
Będziesz błagał Jej litości,
A Ona się nie użali,
To serce Stefci — ze stali!!!

*Mińsk, 12 Października 1854 r.*

## ПАРТРЭТ СТЭФЫ

Калі стрэнеш у краіне,
Дзе Дняпра сінеюць плыні,
Ты прыгожую дзяўчынку —
Шчокі — ружа, рот — малінка,
Асалоды райскай чаша,—
Гэта будзе Стэфа наша.

Як прывабным вочкам стрэліць,
Проста ў сэрца табе цэліць.
Задрыжыць яно, заб'ецца,
Нібы птушка, страпянецца,
І адчуеш ты ў імгненне —
Гэта воч яе праменне.

Калі ж голасам чароўным,
Прыгажосці кволай поўным,
Звонкай песняй адгукнецца,
Не стрымае ваша сэрца —
Зачаруе тое слова,
Заварожыць яе мова.

А спрабуй жа, ёй адданы,
Ўздзець з бялюткіх руж кайданы,
Дык ля ног яе ў прызнанні
Будзеш плакаць аб каханні.
А яна ж не ўчуе жалю —
Сэрца Стэфіна са сталі!!!

*Менск, 12 кастрычніка 1854 г[ода]*

## NIESTAŁOŚĆ

Kiedyś tam! — za dawnych czasów
Słowik... wieszcz litewskich lasów,
Czytając w czułej zrzenicy,
Nadobnej, pięknej szszyglicy,
Przyjazne dla się życzenie;
Szczęściem własnem zachwycony,
Wyśpiewał rzewnemi tony
Wdzięków boskich uwielbienie;
Pokochał Ją nieboraczek!
Odtąd każdy w lesie krzaczek
Był świadkiem jak wieszcz w zapale,
Podnosząc ku wdzięków chwale
Głos pełen rzewnej czułości,
Śpiewał o czystej miłości.
Ale niestała szczyglica,
Jakby kobieta — wietrznica!
Gdy się dobrze przeświadczyła,
Że czułem, wabiącem okiem,

Anielskich wdzięków urokiem,
Już śpiewaka usidliła:
Bez żadnej zgoła przyczyny,
Bez najmniejszej jego winy,
Późno, niestety! wyznała,
Że sercem wieszcza igrała.

Odtąd on, rzewnemi tony,
W zaciszu boleść swą głosi,
Zefir, litością wiedziony,
Szeroko żal ten roznosi.

*Mińsk, 11 Października 1854 r.*

## НЯСТАЛАСЦЬ

На Літве, у час паганскі,
Салавей — вястун пушчанскі,
Раз убачыў, як паціху
Позірк пекнае шчыгліхі
Слаў яму жаданняў мноства;
Ўласным шчасцем здавалёны,
Сыпаў ён чуллівa тоны
Аб яе павабах боскіх;
Закахаўся, небарачак!
Кожны чуў хмызок, няйначай,
Як салоўка у запале
Харaство чуллівa хвале
І пяе ў замілаванні
Гімны чыстаму каханню.
Ды нясталая ўлюбёнка,
Нібы пані-ветрагонка,
Як сябе пераканала
Ў тым, што зрэнкаю сваёю
І анёльскай пекнатою
У сіле яго трымала,

Тым жа часам без прычыны
(Салавей у тым нявінны)
Позна, ах! яму сказала:
«Сэрцам я тваім гуляла».

Салавей свой боль дагэтулі
Выгалошвае чуллівa,
І Зефір даносіць свету
Яго жалю пералівы.

*Менск, 11 кастрычніка 1854 г[ода]*

## WĘDROWIEC

Jakiż to gładki połysk jeziora!
Jakie wspaniałe słonko z wieczora
Strudzone lica za lazur kryje,
I słodkie wody jeziora pije.
Oto i kaczek dzikich gromada,
Gdzie niegdzie gęsi wędrownych stada,
Tam wodna czajka na samca huka,
Wszystko spoczynku nocnego szuka,
I wieśniak, krzepiąc strudzone siły,
We śnie znajduje spoczynek miły.
Wszędzie wesołość — tylko wędrowiec,
Ujrzawszy zdala smętny grobowiec,
W niebo utkwione łzą oko zrosił,
O błogi pokój dla Lubej prosił;
A pieszcząc w duszy słodkie wspomnienia,
Słał w Jej siedzibę tęskne westchnienia.

*Mozyr, 6 Czerwca 1854 r.*

## ВАНДРОЎНІК

Які ж ты гладкі, глянец азёрны!
Дзе сонца дзіўнае ў час вячорны
Свой твар стамлёны за сінь хавае
Й п'е слодыч водаў ля небакраю.
А вось і качак чародка дзікіх,
Гусей вандроўных чуюцца крыкі,
Кігіча каня, самца гукае,
Усё спачынку ўначы шукае.
Вяскоўцу сон, адпачынак мілы,
Па цяжкай працы мацуе сілы.
Усюды радасць — адно маркотны
Вандроўнік, згледзеўшы крыж самотны,
Ўзняў вочы ў неба, зрасіў слязою:
«Дай, Божа, любай маёй спакою...»
І слаў уздыхі ў яе хаціну.
Ён песціў згадкі аб ёй, адзінай.

*Мозыр, 6 чэрвеня 1854 г[ода]*

## TRZEBA SIĘ KOCHAĆ!

Co to jest życie nasze w nieczułości stanie?
Są to odwieczne nudy, śmiertelne konanie;
Miłość tylko jedynie ożywia człowieka,
Przed nią ucieka smutek, w niej niebo nas czeka.

Kochać się zatem potrzeba,
Ktoby chciał dostąpić nieba.

*Mińsk, 1 Września 1854 r.*

## ТРЭБА КАХАЦЬ!

Што нашае жыццё ў апатычным стане?
Адвечная нуда, смяротнае кананне;
Адно каханне чалавека ажыўляе,
І уцякае сум, і неба нас вітае.

Значыць, нам каханне трэба,
Каб знайсці дарогу ў неба.

*Менск, 1 верасня 1854 г[ода]*

## ONA!

Jak Ona zachwycająca!
Jaki powab w Jej spójrzeniu;
Cóż wyrówna uwielbieniu,
Którem dusza maja wrząca
Tchnie dla pięknego Anioła,
Czarującego dokoła!

*Mińsk, Września 10 d. 1854 r.*

## ЯНА!

Захапленне дых займае,
Як яна павабна гляне!
З чым зраўняць замілаванне,
У якім душа лунае
Да найпекнага анёла,
Што чаруе ўсё наўкола!

*Менск, верасня 10 д[ня] 1854 г[ода]*

# TĘSKNOTA NA OBCZYŹNIE

O luba ma chatko,
Rodzinna gromadko!
Jakże tu nudno — wy tego nie wiecie:
Oko we łzach tonie,
Ot! — niby po zgonie
Drogich mi istot na tym biednym świecie.

Jeszczeż gdyby Ona,
Moja ulubiona,
Czarowny uśmiech, czułe Jej spójrzenia
Troskę mi słodziły,
A to,— Boże miły!
Snują się wkoło jakieś nudne cienie.

Zajrzę ja w okienko,
Za chmurką malęko
Niby z dziewicy oka, światło leci,
To mała gwiazdeczka,
U Jej okieneczka,
Swawolna! prosto w modre oczka świeci.

Poczciwa gwiazdeczko,
Moja ty duszeczko!
Powiedz też czy śpi Aniołek mój drogi?
Jeśli w nocne cisze
Morfej Ją kołysze,
Niechajże będzie sen Jej cichy, błogi.

A jeśli zbudzona,
Urok snu pokona,
I tęsknem okiem jutrzeńkę powita:
Pędź chmurki z oblicza,
Niech roskosz dziewicza,
Na pięknem czole Aniołka rozkwita.

Gwiazdeczko,— ma duszko!
Zajrzyj tam w serduszko,

Докąд теж лецą Jej myśli... marzenia?
О Boże mój miły!
Gdybyż zaświeciły
Dla mnie najpierwsze w duszy Jej wspomnienia.

*Bobrujsk, 6 Grudnia 1854 r.*

## СМУТАК НА ЧУЖЫНЕ

О, любая хатка!
Ты — родная матка,
Якою нудотаю поўніцца сэрца.
І слёзна я плачу,
Здаецца, што бачу
Выганнікаў любых на тым бедным свеце.

Яшчэ калі б зранку
Дзяўчыны-каханкі
Усмешку адчуць і пагляду праменні,—
Была б асалода,
А то, Божа, шкода
Глядзець навакола, дзе нудныя цені.

Загляну ў аконца —
З-за хмары, як сонца,
Святло воч дзявочых зычліва прывеціць.
То зорка малая
З аконца заззяе,
Блакітныя вочкі гарэзна засвецяць.

О, зорка-галубка,
Скажы, мая любка,
Ці сплюшчыў анёлак мой вочы?
Калі ёй да ранку
Пяе калыханку
Марфей,— пажадай добрай ночы.

Калі ж яна ўстане,
Навокал пагляне
І ранак самотна сустрэне за звычай,
Згані ты хмурынкі,
Прывабнасць дзяўчынкі
Няхай расквітнее на любым абліччы.

О, зорачка-любка,
Скажы мне, галубка,
Куды яна марамі, сэрцам імкнецца.
О Божа, мой Божа,
А як было б гожа
Пазнаць яе думкі ўсхвалёваным сэрцам.

*Бабруйск, 6 снежня 1854 г[ода]*

## CZYŻ JA STARY?

*Wierszyk ulotny*

### I

Mówicie, żem ja stary — mój jedyny Boże!
Ja stary — czyż to prawda? — nie! — to być nie może!
Próżno myślą się biedzę — próżno suszę głowę,
Bo gdy badam me siły ciała i duchowe,
Wszystko mi zapowiada że to potwarz dzika,
Nie jednego uczuciem prześcignę młodzika!

Czemuż twarz mi młodzieńczym rumieńcem zapłonie?
Czemu z duszy ognistej westchnienie uronię,
Gdy me oko utopię w spójrzeniu anioła,
Który urokiem wdzięków czaruje dokoła?

Czemu, gdy Ją oglądam, z piersi wulkan bucha?
Dla czego serce pęka, kiedy Jej do ucha

Ot jakiś tam sowizdrzał komplementa prawi,
A Ona się uśmiecha — snać że Ją to bawi?

Wy powiecie to zazdrość szaleńca starego;
Wszakże zazdrość pochodzi z uczucia mocnego,
A stary maż uczucie? — rozwiążcie pytanie!
Milczycie! — odpowiedzieć nikt mi nie jest w stanie.

No! — dla czegoż onegdaj przy wspólnej zabawie,
Gdy Ona kilka słówek rzekła mi łaskawie,
Serce, dotąd uśpione, mocniej cóś zabiło,
W duszy już zapomniane uczucie ożyło?
Dalibóg jam nie stary? — ręczę — nikt nie zdoła,
Jak ja — z takim zapałem pokochać anioła!!

## II

Mówicie, żem ja stary — to skaranie Boże!
Czemże mię przekonacie? — czyż starości łoże
W próżnowaniu zalegam? — Czyliż nie hoduję
Dziatek jak Bóg przykazał — krwawo nie pracuję?

Jeżeli to młodością niebacznie zowiecie,
Że niektórzy bez celu na tym Bożym świecie,
Ot rzekłbyś marnotrawcy, swej młodości chwile,
Niestety! — nie powrótne, przecież cenne tyle,
Na próżnowaniu pędzą i zdrowie marnują,
Zdrowie, którego stratę w przyszłości uczują?
Że płocho, nie oględnie z wiary stroją żarty,
Od rana do wieczora zabawiają w karty,
Albo, w przystępie szału, z kielichem szampana,
Szydzą z nędzy bliźniego — urągają z Pana!
Że, zaprawni w lenistwie — przy szklance, bilardzie,
Szturmują po kawiarniach, imponując hardzie,
Lub — zakochani w sobie — łamią tępą głowę,
Jakby zręczniej usidlić słabą białogłowę,
A dopiąwszy swojego, oczernią — porzucą,

I serce im oddane niewiarą zasmucą:
Jeżeli to młodości nie ochybna cecha? —
O dla Boga! jam stary — i w tem ma pociecha!!!

## III

Mówicie, żem ja stary! — wszak ledwo w połowie
Piąty mi krzyż zaświecił — widzicież na głowie
Nie udolnej starości cechę nie zgładzoną?
Jeszcze mi oko jasne, nie zaszło obsłoną!
I ręka dosyć mocna — nie drg[n]ęłaby w boju,
I siły nie zawiodą przy pracy i znoju!

Wszakże to w starych książkach nie raz wyczytałem,
Że nasi praojcowie w tym wieku z zapałem
Szli do boju — a ufni w miłosierdziu Boga,
Gromili dzielnie wiary — własnych siedzib wroga!
Czyż poczciwe prababki nasze z nich szydziły?
Czyż gorącem uczuciem serca im nie biły,
Gdy któren z bohaterów zażądał prawicy,
Młodej wiekiem, lecz starej rozumem dziewicy?

Nie raz tam w modrem oczku duma zaigrała,
Gdy mąż — choć szpakowaty — ale mina śmiała!
W kontuszu — przy szablicy — pokręciwszy wąsa,
Wykrzyknie, odbijany!!! — i tuż obok pląśa!

A dzisiaj — strach pomyśleć! — wszystko dziś na opak!
Ledwo który ze szkoły wyśliźnie się chłopak,
Patrz! — rozlazły jak baba; — cały rozmarzony;
Mizdrzy się do południa — wieczorem salony
Odwiedza wychuchany — a zamiast szabelki,
Lornetka, lub źwierciadło wisi u kamizelki:
Bohater kontradansów, prefercia i czary,
Parluje na potęgę! — rzekłbyś indor stary;
Dźwięki ojczystej mowy nieboraka wstydzą,
Snać w strachu że go modne salony wyszydzą.

Kiedy więc płeć niewieścia — oddana próżności,
Takiej właśnie najczęściej hołduje młodości,
Ja również, podziwiając świetne te zalety,
Nie gniewam się że starym zowią mię kobiety!

## IV

Mówicie, że przez starość pono dziecinieję,
Ot jakieś gminne wiersze niedorzecznie kleję;
Jakże światowa dama łamać ma swą głowę mowę
Podszytą francuzczyzną — trudzić pańską głowę
Gminnemi wyrazami— fi! to nie uchodzi!
To obraza salonów — modny gust zawodi! —
Po co mamy się łączyć z chłopstwem ścisłym związkiem?
Wszakże pracować dla nas jest ich obowiązkiem,
Myśmy za grosz kupili ich trudy; ich znoje:
Lud natrętny! — ot ciągle kołace w podwoje,
Dawaj mu zapomogę, nakarmij głodnego!
Nieś pociechę w niedoli! — A nam co do tego?

Żeby uznać swym bliźnim nędznego charłaka,
By z niedoli wydźwignąć każdego biedaka,
Tożby nam nie starczyło ni worka, ni czasu!
A pieniądz jak kanfora! — Ot trzeba atłasu
Na sukienkę z baskinem — brabantski czepeczek,
Do tego tuzin, drugi z batystu chusteczek;
A futra ż sobolowe — broże — fermoary?
A obiady — pikniki — assamble — maszkary?
Patrz! — już roczna intrata z wiatrem uleciała!
I jeszcze gdyby nędza czyjaś nam bolała!!! —
Fi donc! — stary sfiksował — Bóg wie co tam plecie!
Gwałtem nam każe czytać jakieś brednie kmiecie! —
O! — dla was, moje panie, szkoda kmieciej mowy,
A i dla was, panowie, których mądre głowy,
Że światowej ogłady potrosze liznęły,
Już na się obowiązek krytyki przyjęły

Wyszydzać co na swojskiej odradza się niwie,
A co obce, choć płaskie, podnosić skwapliwie.

Mnie wasz sąd nie zastrasza — co mi tam że skomli
W budzie złośliwy brytan! — ja niby nie słyszę,
Na złość w narzeczu kmiotków, jak pisałem, piszę,
Słuchając zdrowej rady wieszcza Syrokomli.
Wy zaś szukajcie wszelkiej w mych wierszach przywary,
I krzyczcie — brednie pisze! — at ździeciniał stary!!!

Koniec

*Mińsk, Lutego 16 d. 1856 roku*

## ХІБА Я СТАРЫ?

*Вершык крылаты*

### I

Я — кажуць — стары ўжо, мой адзіны Божа!
Не, гэта няпраўда, гэта быць не можа!
Дарэмна састарыць мяне захацелі,
Шмат я маю сілы і ў душы і ў целе.
Гаворыць усё мне, што яшчэ другога
Заткну я за пояс хлопца маладога.

Чаму твар мой юным румянцам палае?
Чаму і душа па-юнацку ўздыхае,
Калі маё вока пабачыць анёла,
Які ўсіх красою чаруе наўкола?

Чаму боль у сэрцы, гэтакая скруха,
Калі нейкі блазен шапоча на вуха
Камплімент бяздумны ёй з ліслівым смехам
І яна смяецца — значыць, ёй пацеха?

Вам гэта не рэўнасць шаленца старога,
Бо рэўнасць расце з пачуцця маладога.
Ці мае стары яго? Вось запытанне.
Ніхто мне на гэта адказаць не ў стане.

Чаму ж, калі ўчора з ёй была размова
І яна сказала ветлівае слова,
Дык тыя пачуцці, што забыў, здаецца,
Прымусілі моцна біцца маё сэрца?
Дальбог, не стары я, бяру неба сведкай —
Ніхто не палюбіць, як я, з сілай гэткай!

## II

Я — кажуць — стары ўжо. Мой каханы Божа!
Чым пераканаць іх? Ці старасць не можа
Працаваць як трэба? Ці я не гадую
Дзяцей сваіх мілых, хіба не працую?

Хіба маладымі назавём мы гэтых,
Што бродзяць па свету беламу без мэты?
Вось марнатраўцы, якія бесклапотна
Гады маладыя трацяць беззваротна,
Не робяць нічога й здароўе марнуюць,
Яго яны страту пад старасць адчуюць.
Над вераю строяць непачціва жарты,
Ад рання да ночы рэжуцца ўсё ў карты.
Альбо, ашалеўшы, з келіхам шампана,
Кпяць з гора людскога і смяюцца з пана.
Більярд ім ды чарка, ці драмаць ляніва,
Ці па рэстаранах швэндаць ганарліва.
Сябелюб ламае галаву тупую,
Як лепей жанчыну ашукаць слабую.
Свайго ён даб'ецца, а пасля пакіне,
Адданае сэрца ў засмучэнні гіне.
Мо гэта юнацтва? Дык тады без смеху
Стары я і ў гэтым маю сваю ўцеху!

## III

Стары я — гавораць,— бо палову веку
Ужо давялося пражыць чалавеку.
Хто гэтак гаворыць, бачыць неглыбока:
Глядзіць яшчэ вельмі зорка маё вока,
Рука яшчэ мае дастаткова моцы,
Спатрэбіцца ў працы, прыгадзіцца ў бойцы!

Чытаў і не раз я ў кнігах, бывала,
Што продкі ва ўзросце, вось як мой, з запалам
На бой ішлі мужна, ворагаў грамілі,
Айчыну з адвагай сваю баранілі.
І нашы прабабкі адкідалі жарты,
Калі хто з герояў тых, пашаны вартых,
Браў жонкай дзяўчыну векам маладую,
Але толькі векам — розумам старую.
Часта ў мудрым вочку думка мігацела,—
Хай муж пасівелы, ды глядзіць ён смела.
І кунтуш і шабля, бярэ рукі ў бокі,
Прытупне ды гікне і пайшоў у скокі!

Не тое сягоння, нават думаць сумна,
Ледзь школу закончыць хлопец неразумны,
Як баба, раскісне, марай паланёны.
Удзень шпацыруе, увечар салоны
Наведвае гэты ветрагон аслаблы
І носіць ларнетку замест вострай шаблі.
Герой бальных танцаў і чаркі звінчастай,
Нібыта індык, выхваляецца часта.
Аб мове бацькоў ён пачаў забывацца:
Баіцца, што будуць ў салонах смяяцца.

Калі ж ахвяруюць жанчыны пустыя
Такой маладосці пачуцці святыя,
Дык я не злуюся тады з той прычыны,
Што клічуць старым мяне часта жанчыны.

## IV

Я — кажуць — здзяцінеў праз старасць і вершы
І стаў вершаплётам у воласці першым.
Не будуць жа знаўцы французскае мовы
Мужыцкай гаворкай засмечваць галовы:
«Сялянскія словы, фі, як непрыгожа,
Абраза салонаў, нам гэта нягожа!
Навошта нам трэба з мужыком яднацца?
Служыць абавязан ён нам сваёй працай.
Аддаць свой здабытак — вось доўг селяніна.
Нахабны народ, усе просяць няспынна.
Давай дапамогу галодным, убогім.
Якая ж карысць нам ад той дапамогі?
Каб бліжнім сваім зрабіць кожнага старца
Ці долю для кожнага даць галадранца,
Для гэтага грошай не хопіць і часу.
Без грошай ні кроку. Вось трэба атласу
Купіць на сукенку. Вось трэба па густу
Набыць пару тузін батыставых хустак;
А футры каштоўныя, шоўк і саеты,
Балы, маскарады, абеды, банкеты?
І ўсё, што за год атрымаў, паляцела.
Яшчэ каб нам нэндза чыясьці балела!
Стары звар'яцеў, што пляце, сам не знае,
Халопскія вершы чытаць прымушае!»
Для вас, паны, шкода халопскай мне мовы,
Для вас, чые мудрыя надта галовы,
Манеры салонаў засвоіўшы ўмела,
Смяюцца з таго, крытыкуючы смела,
Што тут адраджаецца на родных глебах,
Чужое ж, хай кепскае, ўзносяць да неба.

Ваш суд мне не страшны, хай злосна скавыча
У будцы сабака, увагі на пса не звярну я.

Як раіць пясняр Сыракомля, пішу я
Цяпер, як заўсёды, на мове мужычай.
Вы, ў вершах шукаючы ва́ды ўсялякай,
Крычыце: «Здзяцінеў стары небарака!»

*Менск, лютага 16 д[ня] 1856 года*

## DO POCZCIWYCH BIAŁORUSINÓW!

Bracia! — gościć u Was miło!
W życiu mi się ani śniło
Bym, urosłszy wsrzód Litwinów,
Pokochał Białorusinów!

Lecz gdy mię przyjazne bogi
W te gościnne Wasze progi
Przywiodły,— jak mi Bóg miły!
Opuszczać Was brakło siły.

U Was kraj cnotą bogaty,
I gościnność starej daty,
I staropolska szczerota,
I wesołość — i ochota;
Rozkosznie z Wami czas leci,
Istny raj dla piewcy kmieci!

Juliuszu,— drogi bracie!
Tyś ugościł w swojej chacie,
Biednego kmieci lirnika,
Jakby możnego królika!
Nad tem dzisiaj głowę męczę,
Czemże ja Tobie odwdzięczę?
Weź serce! — wiem że to mało,
Ależ mi więcej nie stało!

I Tobie, miły Arturze!
Też same dzięki powtórzę,
Boś i Ty, pełen szczeroty,
Naśladujesz brata cnoty!

Zacny Panie Tadeuszu!
Znany z Sławian animuszu!
Janie, Pawle, dwaj Józefy,
Typy Białoruskiej strefy,
Edwardzie, Stachu,— Wiktorze!
Ty artystów z duszą wzorze!
Dla Was pieśń ma — dla Was leci
Dank z piersi lirnika kmieci!

I jeszcze serce me rwie się
Do Was,— gdziem poznał Olesię,
Do Was Panie z Chociuchowa!
Tam, choć rządzi białogłowa,
Taka gościnność w zagrodzie,
Że człeka chęć jakoś bodzie,
Wsrzód Waszej poczciwej strzechy,
Szukać w strapieniu pociechy.

Wszakże mi się ani śniło
By, srzód Was goszcząc radośnie,
Serce uczuciem zabiło,
Jakby w życia mego wiośnie:
Lecz,— niech się czytelnik śmieje,
Pytam, czyż serce starzeje?..

Gdybyście, o bracia mili!
Zawsze przyjaźnie myślili
O dudarzu,— jego pieniu;
W cnej Białorusi imieniu
Przyjmcie dar, co Wam przynoszę,
Oto — WSZYSTKIEGO POTROSZE.

# ДА ПАЧЦІВЫХ БЕЛАРУСАЎ!

Вас, браты, я помніць буду,
Я не сніў такога цуду,
Каб, вырасшы між літвінаў,
Палюбіў беларусінаў!

Рады я, што воляй лёсу
Завітаць к вам давялося,
Пакідаць жа — Божа мілы! —
Не хапае ў мяне сілы.

Край ваш цнотаю багаты,
І гасціннасць старой даты,
Старапольская зычлівасць,
І вясёласць, і пачцівасць;
З вамі час праводзіць слаўна —
Песняру тут рай сапраўдны.

Юлі, дарагі мой браце,
Частаваў ты ў сваёй хаце
Лірніка, што зведаў многа,
Нібы караля якога.
Доўга думаю, мяркую,
Чым аддзякаваць змагу я?
Сэрца я аддаць жадаю,
Гэта — лепшае, што маю.

І табе, Артур, скажу я,
Паўтару падзяку тую,
Бо і ты такі ж надзіва
І прыветны, і пачцівы.

О, Тадэвуш, любы пане!
Два Юзэфы, Стась і Яне,
Павел, Эдуард і Віктар! —
Тыпы роднага мне краю —
Ты — для іх узор і прыклад,

Вам я песні прысвячаю
І ад сэрца ўсіх вітаю.

І туды шчэ сэрца рвецца,
Дзе з Алесяй змог сустрэцца,
Да вас, пані з Хацюхова!
Хоць кабета, а талкова
Гаспадаркай там кіруе,
А гасціннасцю чаруе;
Я ахвочы ў вашым доме
Адпачыць ад тлуму, стомы.

Не магло мне і прысніцца,
Што у вас я буду госцем,
Што там можа сэрца біцца,
Як калісьці ў маладосці.
Што ж? Няхай чытач смяецца,
Ці ж старэе з часам сэрца?

Шлю, браты, вам прывітанне,
Помніце павек спяванне
Дудара, што к вам імкнуўся.
Ад цнатлівай Беларусі
Дар прыміце — вершаў ношку,
Ёсць тут *УСЯГО ПАТРОШКУ.*

## ВЕРШ НАВУМА ПРЫГАВОРКІ

*На прыезд да места Менска Апалінарага Концкага, Уладзіслава Сыракомлі і Станіслава Манюшкі*

Засвяцілі тры звездачкі ў пару нам шчасліву!
Заляцелі тры сакалы дый на нашу ніву!
Ня звездачкі ж то нябесны, што ярка мігаюць,
Ня сакалы, што шырока бушуюць у полі;
А прыбылі тры дудары — так пяюць, іграюць,
Што ангелы надзівіцца не ў сіле здаволі!

Адзін дудар з Ляцкай нівы,— то ж братняя ніва!
Другі з Вітавай[1] усадзьбы — быццам адной маці!
Госцікі ж то дарагенькі! — нечага казаці,
Сэрцам, душой іх прымайце! — то ж, мілянькі, дзіва!
А трэці дудар меж намі узрос, ён нам братка,
Яму Мінская зямелька родненькая матка!

Адзін смыкам як пацягне па сваёй скрыпіцы,
То салодкі брызнуць слёзкі, маўляў із крыніцы;
Душа жарам абальецца, ад роскашы млее,
Баш па працы чарка водкі жывот абагрэе.

Другі дудар як запяе пад дудку сваячу,
Вось і добры пан заплача — і я з ім заплачу.
Із губ сыплець ён славечка, як краскі прыгожы,
Рубіць пярцом, як тапарцом, праўдай на свет Божы.
Чаму ж гудуць яго песні, быццам салавейкі? —
Бо усе пад свойску дудку, ўсё з роднай зямейкі!

Трэці дудар як загудзе песенькі радненькі,
Бяды дый гора забудзеш, станеш весяленькі!
А так думкі прыуныўны соладка спявае,
Што за сэрца, баш кляшчамі, дзетачкі, хватае!

Злосна вам, сыны заморскі, завідна, панята!
Што славянская зямелька у розум багата;
Вы б хацелі ўсе розумы — і свае і нашы,
Маўляў саранча на ніве, паесці у кашы,—
Не даждання ж, мудрагелі! — і нашая ніва
Вялікімі дударамі уздаволь шчасліва!
Біця ж чалом тром сакалом, хлапцы, маладзіцы!
Гэта ж кветкі з свойскай веткі, Славянскай зямліцы!!

*25 кастрычніка 1856 года*

---

[1] Вітавай — Вітаўтавай, або Вільна.

* * *

Заўтра Спаса, кажуць людзе,
У Тарасэвічах кірмаш будзе:
Трэба ехаць, падзівіцца,
Ў цэркві Богу памаліцца;
Потым шмыгнуць да двара,
Павіншаваць гаспадара.
«Паночку Яночку! дай табе Божа
За год даждаці святога Спаса,
Каб, як лес, расло ўсякае збожжа,
Дык будуць пірогі і густая каша;
Не купляй мяса, а з сваей гавяды,
Здаровай, маладой і тлустай, як лані,
Кармі сямейку, гасцей і чаляды,
Дык ўжо ж тады будзеш панам на ўсе сані!
У бочках, яндоўках і ўсякай пасудзе
Каб не выбіралась гарэлка, мёд, піва,
Няхай п'юць ўдоваль добры і злы людзе,
На завісць непрыяцелям і ўсім надзіва.
Кінь жыццё бурлацкае, а пашукай жынкі,
Маладой, прыгожай і любяшчай цебе,
Каб ўсі зайздравалі і глыталі слінкі.
Тады будзеш шчасліў, жывучы як ў небе.
А за такое, хоць дурное, маё павітанне
Дай чарку гарэлкі ды палюбі шчыра — то з мяне і стане».

*5 серпня 1868 року, Корытна*

# Publicystyka

mienującą. — Wówczas to wykrzyknąłem
ośnie: Bóg z tym ludem mieszka! — nie
ska tu, lecz ojcowska rządzi prawica!

Komuż więc najwłaściwiej mam przypisać
moją pracę, jeśli nie opiekunowi słabych,
i nie ojcowi kmieci? — a dumnym się po-
ę, kiedy szanowne Jego nazwisko pracę
uzacni.

iechaj co chcą mówią—ja przecież piér-
y poezyę naszego wieśniaczego ludu przy-
iałem w szatę rodowej estetyki, w wio-
n na scenę życia i postawiłem w szere-
h utworów piśmiennictwa rodowego,
zego się chlubię; łaskawa albowiem kry-
a Sielanki, Hapona i Wieczernic przez
ów, P. M... w codziennej Warszawskiej,
dysława zaś Syrokomli, naszego Wieszcza,
Warszawskiej gazetach umieszczona,

odgadła cel, do którego, przez moje pis
smiem dążyć. — Bo, czyż nie słusznie w
skuję, że przez nie, zachęconym będąc n
wieśniak do nauki czytelnictwa, rozwi
powoli swój umysł, pogrążony dotąd w cie
nocie, a łagodząc obyczaje, pozbędzie
wkorzenionych złych nałogów i zachęci
wypełnienia posłannictwa trudnego w swo
życiu. — A małąż to będzie dla mnie nagr
dą?—ta wszakże wdwójnasób się powiększ
jeżeli to dziełko przez Pana łaskawie prz
jętem zostanie.

Mam honor pisać się,
Jaśnie Wielmożnego Pana
Najniższym sługą,
*W. M.*

# ПРАДМОВА ДА ЗБОРНІКА «ГАПОН»

## Да чытача

Znajdując w wielu peryodycznych pismach skreślone obyczaje i zwyczaje naszych wieśniaków, postanowiłem, obrawszy treść z prawdziwego zdarzenia, puścić w świat, w języku białoruskiego ludu, powiastkę. Pisząc ją, miałem na celu ażeby obywatele nasi, w wyborze do pomocy sobie oficyalistów, czujną zwracali uwagę na ich charakter i obyczaje: ci albowiem, nadużywając niekiedy powierzonej sobie władzy, dla własnych widoków gnębią lud pracowity i przez to, najniewinniej częstokroć, ściągają nienawiść jego na panów.

Dla tego zaś w języku kmiotków ją pisałem, żeby czasami, w dzień świąteczny im przeczytana, mogła pociągnąć serca ich do panów i interesem wspólnych korzyści ściślej zjednoczyć; również by zniszczyć tę, niemal wrodzoną, niechęć, z jaką kmiotek nasz staje na posługę krajowi. Tu albowiem znajdując że trzeźwy, obyczajów nie poszlakowanych, do tego mężny, pracowity i pilny w służbie chłopek, zawsze u ojcowskiego Rządu odbiera nagrodę, nie jeden, z ochotą odda się krajowej posłudze, rokując sobie również w przyszłości powodzenie.

Szczęśliwym się policzę jeżeli powieść ta, przynosząc Czytelnikowi chwilę rozrywki, odpowie zamierzonemu celowi.

Трапляючы ў шматлікіх перыядычных выданнях на замалёўкі звычаяў і нораваў нашых сялян, вырашыў я, узяўшы выпадак з праўдзівага жыцця, пусціць у свет, на мове беларускага люду, апавяданнейка. Пішучы яго, меў за мэту, каб землеўласнікі нашыя, выбіраючы сабе ў дапамогу аканомаў-паслугачоў, пільную ўвагу звярталі на іх характар і норавы, паколькі яны, злоўжываючы часам нададзенай ім уладай, дзеля ўласнай выгоды прыгнятаюць працоўны люд і праз гэта, найчасцей беспадстаўна, выклікаюць агоную нянавісць на паноў.

Пісаў жа гэты твор у мове мужычай таму, каб часамі, прачытаны ім святочным днём, мог прыцягнуць іхнія сэрцы да спадароў і дзеля агульнай карысці шчыльней іх з'яднаць; таксама каб знішчыць тую амаль прыроджаную непрыхільнасць, з якой наш мужык становіцца на паслугу краю. Бо менавіта тут можна спадзявацца, што цвярозы, беззаганных звычаяў, да таго мужны, працавіты і старанны ў службе селянін заўсёды ў бацькоўскай улады атрымае ўзнагароду, з іх не адзін, ахвотна аддасца слугаванню краю, адначасова прарочачы сабе будучы поспех.

Шчаслівым палічу сябе, калі гэтая аповесць, прыносячы чытачу хвілінку забавы, паслужыць прызначанай мэце.

# ПРАДМОВА ДА ЗБОРНІКА «ЦІКАВІШСЯ? — ПРАЧЫТАЙ!»

Jaśnie Wielmożny Panie!

Każde Boże stworzenie przywiązuje się do rodzimego śmietniska, na którem, wychodząc z rodzicielskiego łona, pierwsze kwilenie wydało; na którem, troskliwością opiekuńczej ręki dawców życia prowadzone, pierwsze stawiało kroki. — Ja przeto, wychowaniec Bobrujskiego Powiatu, w późniejszym już czasie zwiedzając kilkakrotnie rodzinną ziemię, z interessem przyglądałem się bytowi kmiotków, zalegających Bobrujskie niwy.

W tych wędrówkach, przejeżdżając przez majątki Pana, z roskoszą oko moje nieraz spoczęło na porządnych zabudowaniach gospodarczych poczciwego ludu; weselem pierś mi zabiła! — gdy dośledzilem tam obfitość wszystkiego, zamożność mieszkańców znamienującą.— Wówczas to wykrzyknąłem radośnie: Bóg z tym ludem mieszka. — Nie pańska tu, lecz ojcowska rządzi prawica!

Komuż więc najwłaściwiej mam przypisać tę moją pracę, jeśli nie opiekunowi słabych, jeśli nie ojcowi kmieci? — a dumnym się policzę, kiedy szanowne Jego nazwisko pracę tę uzacni.

Niechaj co chcą mówią — ja przecież pierwszy poezyę naszego wieśniaczego ludu przywdziałem w szatę rodowej estetyki, wwiodłem na scenę życia i postawiłem w szeregach utworów piśmiennictwa rodowego, z czego się chlubię; łaskawa albowiem krytyka *Sielanki, Hapona* i *Wieczernic* przez Panów, P. M... w *codziennej Warszawskiej*, Władysława zaś Syrokomli, naszego Wieszcza, w *Warszawskiej gazetach* umieszczona, odgadła cel, do którego, przez moje pisma śmiem dążyć. — Bo, czyż nie słusznie wnioskuję, że przez nie, zachęconym będąc nasz wieśniak do nauki czytelnictwa, rozwinie powoli swój umysł, pogrążony dotąd w ciemnocie, a łagodząc obyczaje, pozbędzie się wkorzenionych złych nałogów i zachęci do wypełnienia posłannictwa trudnego w swem życiu. — A małąż to będzie dla mnie nagrodą? — ta wszakże wdwójnasób się powiększy, jeżeli to dziełko przez Pana łaskawie przyjętem zostanie.

Mam honor pisać się, Jaśnie Wielmożnego
Pana Najniższym sługą

*W. M.*

Яснавяльможны спадар!

Кожнае Божае стварэнне прывязваецца да роднага кута, у якім, выходзячы з мацярынскага лона, выдала першыя гукі, у якім, падтрымнае чулымі, клапатлівымі рукамі бацькоў, ставіла першыя крокі. Таму я, выхаванец Бабруйскага павета, ужо ў пазнейшыя часы, неаднаразова наведваючы зямлю бацькоў, з цікавасцю прыглядаўся да побыту сялян, якія насялялі бабруйскія нівы.

У тых вандроўках, праязджаючы праз маёнткі спадара, вока маё не раз з асалодай спачывала на дагледжаных гаспадарчых пабудовах руплівага народа. Радасцю поўнілася сэрца, калі ўбачыў там усялякі дастатак, які сведчыў пра заможнасць жыхароў. У той час усхвалявана выгукнуў: «Бог жыве з тымі людзьмі! Не панская тут, але бацькоўская кіруе рука!»

Каму ж тады, уласна, магу прысвяціць гэтую працу, як не апекуну слабых, як не бацьку сялян? І палічу за гонар, калі яго шаноўнае прозвішча ўпрыгожыць гэтую працу.

Няхай што хочуць гавораць, але ж гэта я першы паэзію нашага вясковага люду апрануў у шаты народнай эстэтыкі, увёў на сцэну жыцця і пакінуў у шэрагу твораў айчыннага пісьменства, чым і ганаруся. Таму ласкавая крытыка *«Ідыліі»*, *«Гапона»* і *«Вечарніц»*, зробленая спадарамі *П. М...* у *«Штодзённай газеце»*, а Уладзіславам Сыракомлем, нашым вялікім паэтам, у *«Варшаўскай газеце»* змешчаная, адгадала мэту, да якой сваімі творамі я адважыўся імкнуцца. Бо ці ж не слушна думаю, што праз іх наш селянін, будучы заахвочаны да навукі чытання, паволі разаўе свой розум, ахоплены дагэтуль цемрай, а змякчаючы звычаі, пазбудзецца ўкаранелых дрэнных заган і заахвоціцца да выканання цяжкога прызначэння ў сваім жыцці. Ці ж малая гэта будзе для мяне ўзнагарода? — Аднак яна павялічыцца ўдвая, калі твор гэты будзе Вамі ласкава прыняты.

Маю гонар пісацца Яснавяльможнага
пана найніжэйшым слугой

*B. M.*

## ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ «GAZETY POLSKIEJ»

Żyjąc śród ludu, mówiącego białoruskiem narzeczem, wcielony w jego sposób myślenia, marząc o doli tego szczepu bratniego, w niemowlęctwie i ciemnocie odrętwiałego, postanowiłem, dla zachęty go do oświaty, w duchu jego zwyczajów, podań i

zdolności umysłowych, pisać we własnym jego narzeczu; jakoż ze zdumieniem dostrzegłem wkrótce, że wydaną przezemnie *Sielankę,* dalej *Hapona, Wieczernice, Dudarza, Kupałę* i t.d. lud z największem przyjął upodobaniem, a młodzież z zapałem poczęła się uczyć czytać i napamięć moje, tak dla niej miłe, powtarzać utwory. Skutkiem czego upowszechnia się już dzisiaj w części nad Wilią i Niemnem, nad Swisłoczą, Berezyną, Dzwiną, Dnieprem i t.d. czytanie pisma białoruskiego, a obudzona chęć i zapał do karmi umysłowej znajdzie sobie obfitsze materiały w ojczystej już mowie.

Ten mój pomysł i dążności, pojęte i ocenione zostały w Królestwie, nie pojętemi na Litwie, jakoż na zgromadzeniu literackiem u pana K... posłyszałem zdanie: «że pisząc w białoruskiem narzeczu między ludem wieśniaczym prowincjonalizm szczepię»; na co zmuszony jestem odrzec:

Nieszczęsna przeszłość nasza doprowadziła lud wieśniaczy do upadku, nie myśląc zgoła o umysłowem i moralnem wykształceniu jego, chociażby przez pamięć, że to dzieci jednej matki, że to upośledzeni bracia i chrześcianie, mający prawo do wiedzy jak do niebieskiego chleba.

Jeżeli żaden organ polski nie potrafił, mimo usiłowań przez wiek niemal cały dźwignąć tego ludu, czyliż dziwić się należy? Mógłżeli jakibądź organ trafić do ucha, do przekonania kmiotka, któremu środki nauczenia się polskiej mowy tak były utrudzone, który krwawym oblewając potem łany swych panów, niemiał czasu do zajęcia się umysłowego? Jeżeli czasem dźwięk matczynego narzecza obił się o spragnione ucho biedaka, był to potok gróźb i łajanek, wyrzeczonych do pogardzonej sieroty.

Otóż postrzegając zgubne usiłowania do zniechęcenia od nas ludu, postanowiłem przez pisma w narzeczu jego, odpowiedne pojęciom, będącym jeszcze w kolebce i ułatwiające mu sposoby oswojenia się z naszą literaturą, zachęcić go niejako do oświaty i moralnie poprawić. Jak zbawienny te pisma wpływ nań wywarły i stąd wnosić należy, że dzisiaj książki w narzeczu ludowem już się zupełnie wyczerpały, a nowe się nie drukują.

Czas jeszcze żeby się obywatele spostrzegli, a przez zakładanie szkółek, domów ochron i inne możebne ofiary starali się tę młodszą

bracię swoją, umiejącą być wdzięczną, przygarnąć do serca i dla zobopólnego dobra ściśle się z nią zespolić.

*Naum Pryhaworka*

Жывучы сярод люду, які размаўляе па-беларуску, прасякнуты яго ладам думак, марачы пра долю гэтага братняга племені, што яшчэ змалку анямеў ад цемры, вырашыў я дзеля заахвочвання яго да асветы у духу ягоных звычаяў, паданняў і разумовых здольнасцей пісаць на яго ўласнай гаворцы; са здзіўленнем заўважыў неўзабаве, што выдадзеную мной *«Ідылію»*, далей *«Гапона»*, *«Вечарніцы»*, *«Дудара»*, *«Купалу»* і г. д. люд прыняў з найвялікшай прыхільнасцю, а моладзь з запалам пачала вучыцца чытаць і завучваць на памяць мае так мілыя ёй творы. У выніку чаго ўжо цяпер часткова над Вяллёй і Нёманам, над Свіслачай, Беразіной, Дзвіной, Дняпром і г. д. распаўсюджваецца чытанне беларускіх твораў, а абуджанае жаданне і запал да духоўнага жыцця знойдзе сабе багатую спажыву на роднай мове.

Гэтая мая задума і памкненні былі зразуметыя і ацэненыя ў Каралеўстве, але засталіся незразуметымі ў Літве; неяк на літаратурным сходзе ў пана К... пачуў меркаванне: «пішучы на беларускай гаворцы, я насаджваю сярод вясковага люду правінцыялізм», на што вымушаны адказаць:

Наша нешчаслівае мінулае давяло вясковы люд да заняпаду; зусім не думаючы пра яго разумовае і маральнае выхаванне, трэба хоць памятаць, што гэта дзеці адной маткі, што гэта пакрыўджаныя браты і хрысціяне, якія маюць права на веды, як на нябесны хлеб.

Ці ж трэба здзіўляцца, што ніводзін польскі орган, нягледзячы на амаль стогадовыя намаганні, не здолеў зрушыць гэтага люду? Мог жа які-небудзь орган дайсці да слыху і пераканаць селяніна, якому спосабы авалодання польскай мовай былі гэтак ускладнены, які, паліваючы крывавым потам нівы сваіх паноў, не меў часу для разумовых заняткаў? Калі іншы раз гук матчынай гаворкі даходзіў да прагнага вуха бедака, дык была гэта плынь пагроз і лаянак на пагарджаную сірату.

І вось, назіраючы згубныя намаганні адштурхнуць ад нас народ, вырашыў я праз творы на ягонай гаворцы, адпаведна паняццям, знаёмым яму змалку, і якія палягчаюць яму спосабы азнаямлення з нашай літаратурай, заахвоціць яго неяк да асветы і ўдасканаліць маральна.

Які жыватворны ўплыў аказалі на яго гэтыя творы, можна меркаваць па тым, што сёння кніжкі на народнай гаворцы ўжо зусім разышліся, а новыя не друкуюцца.

Яшчэ ёсць час, каб нашы грамадзяне спахапіліся і, утвараючы школкі, прытулкі і прыносячы іншыя магчымыя ахвяры, імкнуліся гэтую малодшую браццю сваю, якая ўмее быць удзячнай, прытуліць да сэрца і для ўсеагульнага дабра з ёю моцна аб'яднацца.

*Навум Прыгаворка*

# Listy i pasланні



Pierwo, abym wiedział zdrowie z mowy
ctrem. — Proszę co ty tam prędko
Pana. P.

Co wprawdzie mam honor przed
Mchnowiczem Panu dobrodzieju,
z Pobolicz Pacanckiem

Najniższy sługa
Wincenty Pacanicki

## 1. МАЎРЫКІЮ АРГЕЛЬБРАНТУ

à Monsieur Monsieur Olgebrandt

Upraszam Szanownego Pana Olgebranda wydać mej *Sielanki* 25 sztuk. I przyszlij mi, bądź łaskaw, ten numer «*Biblioteki Warszawskiej*», gdzie o dzieciach mowa – uwiadomiając co on kosztuje, może jak zdobędę się na odkupienie onego.

Jutro zobaczę się z Panem, bo d[z]iś jestem cierpiący.

*Sługa Marcinkiewicz*

Czy niema Volua [wilmerza?]?

*1851*
*14/II*

*14 лютага 1851 г.*

à Monsieur Monsieur Olgebrandt

Прашу шаноўнага спадара Альгебранта выдаць маёй «*Ідыліі*» 25 штук, і прышлі мне, будзь ласкаў, той нумар «*Biblioteki Warszawskiej*», дзе пра дзяцей размова, — з паведамленнем, колькі ён каштуе, можа, як адважуся адкупіць яго. Заўтра пабачуся са спадаром, бо сёння хварэю.

*Слуга Марцінкевіч*

Ці няма Volua [wilmerza?]?

## 2. АДАМУ ЗАВАДСКАМУ

*1851, 17/III*

Upraszam z Magazyna W[ielmożneg]o Zawadzkiego wydać mojej *Sielanki* Exemplarzy trzydzieścia — i na dziś pozwolić mi Exemplarza «*Biblioteki Warszawskiej*» za 9-ber miesiąc 1850 r. Tam

właśnie jest recenzya o grze mych dzieci — ja jutro odniosę, tylko chcę przeczytać.

*Wincenty Marcinkiewicz*

*17 сакавіка 1851 г.*

Прашу з магазіна вяльможнага Завадскага выдаць трыццаць экземпляраў маёй *«Ідыліі»* і на сёння дазволіць мне экземпляр *«Biblioteki Warszawskiej»* за лістапад месяц 1850 г. Там, уласна, ёсць рэцэнзія пра ігру маіх дзяцей. Я заўтра аднясу, толькі хачу прачытаць.

*Вінцэнт Марцінкевіч*

## 3. ВІЛЕНСКАМУ ВАЙСКОВАМУ ГУБЕРНАТАРУ ІЛЛІ БІБІКАВУ

Его высокопревосходительству господину виленскому военному губернатору, гродненскому, минскому и ковенскому генерал-губернатору, генерал-адъютанту и кавалеру Илье Гавриловичу Бибикову

Дворянина Минской губернии и уезда
Викентия Иванова сына Марцинкевича

**Прошение**

Отец многочисленного семейства, но бедного состояния, в двух старших детях, 14-летней дочери Камилле и 13-летнем сыне Мирославе, нашел я большие музыкальные дарования, о чем киевские, виленские и варшавские периодические письма удостоверяют.

Желая, чтобы сии дети приобрели для себя европейскую славу, по совету первых артистов Варшавы, я обратился к стопам всеавгустейшего монарха, прося их отправить в Парижскую консерваторию и до совершенного окончания высшей музыкальной науки содержать там на казенном щету. На таковое прошение получил я посредством его сиятельства стат[с]-секретаря графа Голицына резолюцию, чтобы о взятии паспорта за границу я

обратился к министру внутренних дел, а на дорогу и содержание на месте во время науки мне ничего не определено.

Опасаясь, чтобы по причине недостатка не затратить в забвении два так блестящие таланта, я ныне отдаю детей под покровительство его императорского высочества наследника престола, всепокорнейше прося ходатайства у всеавгустейшего монарха, чтобы по милости своей велел отпустить на дорогу за границу и на содержание детей в Париже какую сумму, и посему-то дочь моя Камилла осмеливается первые свои музыкальные труды повергнуть к стопам его императорского высочества, чрез посредство вашего высокопревосходительства. Ныне слава и участь детей артистов находится в руках вашего высокопревосходительства, а благородное сердце ваше легко угадает, с каким страхом мы ожидаем решения оных.

*Викентий Иванов сын Марцинкевич*

*Мая 5 дня 1851 года*
*Жительство просителя в городе Минске*

Яго найвяльможнасці спадару віленскаму вайсковаму губернатару, гарадзенскаму, менскаму і ковенскаму генерал-губернатару, генерал-ад'ютанту і кавалеру Іллі Гаўрылавічу Бібікаву

Двараніна Менскай губерні і павета
Вінцэнта Янава сына Марцінкевіча

## П р а ш э н н е

Бацька шматлікага сямейства, але беднага стану, у двух старэйшых дзецях, 14-гадовай дачцэ Каміле і 13-гадовым сыне Міраславу, знайшоў я вялікія музычныя здольнасці, пра што сведчаць кіеўскія, віленскія і варшаўскія перыядычныя выданні.

Жадаючы, каб гэтыя дзеці набылі для сябе еўрапейскую славу, кіруючыся парадаю першых артыстаў Варшавы, я прыпаў да ног яскравяльможнага манарха, просячы адправіць іх у Парыжскую кансерваторыю і ўтрымоўваць там на казённы кошт да паспяховага заканчэння вышэйшай музычнай адукацыі. На такое прашэнне атрымаў я пры

пасярэдніцтве сіяцельства статс-сакратара графа Галіцына рэзалюцыю, каб адносна атрымання замежнага пашпарта я скіраваўся да міністра ўнутраных спраў, а на праезд і ўтрыманне на месцы падчас навучання мне анічога не прызначана.

Асцерагаючыся, каб з прычыны нястачы не змарнаваць у забыццё два гэтак бліскучыя таленты, я цяпер аддаю дзяцей пад заступніцтва яго імператарскай высокасці спадчынніка пасаду, найпакорлівей просячы хадайніцтва ў яснавяльможнага манарха, каб па літасці сваёй загадаў даць на праезд за мяжу і на ўтрыманне дзяцей у Парыжы пэўную квоту, і таму дачка мая Каміла адважваецца першыя свае музычныя працы пакласці да ног яго імператарскай вялікасці, за пасрэдніцтвам вашай вяльможнасці. Цяпер слава і доля дзяцей-артыстаў знаходзіцца ў руках вашай найвяльможнасці, а высакароднае сэрца ваша лёгка адгадае, з якім страхам мы чакаем лёсавырашэння іх.

*Вінцэнт Янаў сын Марцінкевіч*

*Траўня 5 дня 1851 года*
*Жыхарства просьбіта ў горадзе Менску*

## 4. АДАМУ ЗАВАДСКАМУ

Upraszam W[ielmożneg]o Zawadzkiego wysłać z Xięgarni swojej Exemplarzy *Sielanki* mojej wiele na pud wejdzie z pierwszą pocztą do Miasta Mińska pod adressem W[ielmożneg]o Scypiona Bielinowicza podporucznika, mieszkającego przy ulicy Kojdanowskiej w domu Szapiry — podaję tę tylko uwagę, że od pospiechu w przesłaniu najwięcej mi zależeć będzie, upraszam więc po otrzymaniu tego pisma wraz przesłać.

*Sługa Wincenty Dunin Marcinkiewicz*

*1852 Roku. 1 Lutego. Mińsk*

Na przesyłkę tych Exemplarzy dołącza się cztery ruble srebr. Jeśliby zaś można było pierwiey przysłać do Mińska niżeli poczta odchodzi, to bardzo byłoby dobrze, bo te Xiążki koniecznie potrzebne na 9 dzień tego m[iesią]ca.

*Менск, 1 лютага 1852 г.*

Прашу вяльможнага Завадскага выслаць са сваёй кнігарні гэтулькі экземпляраў маёй «*Ідыліі*», колькі ўвойдзе на пуд, з першай поштай у горад Менск на адрас вяльможнага Сцыпіёна Беліновіча, падпаручніка, які жыве на Койданаўскай вуліцы ў доме Шапіры. Раблю толькі тую заўвагу, што ад поспеху ў перасылцы шмат чаго ў мяне залежыць, таму прашу выслаць адразу пасля атрымання гэтага ліста.

*Слуга Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч*

На перасылку гэтых асобнікаў далучаюцца чатыры рублі срэбрам. Калі ж можна выслаць у Менск раней, чым адыходзіць пошта, было б вельмі добра, бо гэтыя кніжкі неабходны мне на 9-ы дзень гэтага месяца.

## 5. УЛАДЗІСЛАВУ СЫРАКОМЛЮ

*[Чэрвень 1855 г.?]*

Władysławowi Syrokomli *alias* Ludwikowi Kondratowiczowi od Nauma Pryhoworki

### Prośba № 1

Drogi Ludwiku!

Któryś bez liku
Serc tu zhołdował,
Oby zachował
Twórca Cię zdrowo;
Byś słodką mową,
I mądrą głową,
Swoich rodaków,
Braci Litwiaków
Nadal czarował.

Wieszczu nasz miły!
Zda się że sniły

Rozkoszne chwile,
Ktoreśmy mile
Z Tobą przebyli:
My w niebie żyli,
My nektar pili
Słuchając Ciebie.
Błogo w tem niebie
Czas nam się mili.

Dobry dzień Tobie!
Czy w rannej dobie
Dusza Twa śmieje?
Czy tez boleje
Za swą gromadką,
Dziećmi, czeladką,
Bogdanką gładką? —
Nie racz się spieszyć,
Daj nam nacieszyć
Chwilą tak rzadką.

Daruj nam jeszcze na kilka chwil siebie! Wiem, że Ci bydź musi tęskno za domową strzechą; ależ zważaj tylko, moj drogi! Ty nie należysz do siebie, jesteś własnością całej Litwy, pozwol więc i nam, dzieciom tejże Litwy, nacieszyć się swym bratem, — a jakim bratom? — chlubą!!!

Oto w pensyonie Montegrandego kilkadziesiąt serc siostryczych bije dla Ciebie, pragnie Cię oglądać; nie odmów więc im tej łaski, a jak przyjdzie Montegrandi Cię prosić, przyrzecz mu swą bytność, i spełń te przyrzeczenie.

*Vale et me ama.*

*Twoj Naum Pryhaworka*

Уладзіславу Сыракомлю *alias* Людвіку Кандратовічу
ад Навума Прыгаворкі

## Просьба № 1

Наш Людвік мілы!

Які штосілы
Сэрцы палоніць;
Хай Бог заслоніць —
Каб быў здаровым,
Мудрагаловым;
Каб ясным словам
Ўсіх пупавінных
Братоў-літвінаў
Век зачароўваў.

Вяшчуне мілы!
Нібыта снілі
Дзівосы-хвілі,
З Табой што міла
Мы ўсё чынілі:
Ўзляталі ў неба —
Была ж патрэба
Чуць Тваё «срэбра».
Шчасна ў тым небе
Час мы губілі.

Дзень добры, братка!
Ці ўсё ў парадку?
Душа ў гуморы?
Ці брат наш «хворы»:
Шкада грамадкі,
Дзятвы, чэлядкі,
Каханкі гладкай? —
Нашто спяшацца?
Дай наўцяшацца
Цуд-хвіляй, братка.

Падаруй нам Сябе яшчэ на колькі хвілін! Ведаю, што Табе павінна быць тужліва па роднай страсе, але ж вазьмі толькі пад увагу, мой дарагі! — ты не належыш сабе, ты ўласнасць усёй Літвы, дазволь жа і нам, дзецям гэтай жа Літвы, нацешыцца сваім братам — і якім братам? — славаю!!!

Вось і ў пансіёне Мантэграндзі некалькі дзесяткаў сястрыных сэрцаў б'юцца дзеля Цябе, прагнуць Цябе бачыць; дык не адмаўляй ім у гэтай ласцы, а як прыйдзе Мантэграндзі Цябе запрашаць, абяцай яму сваю прысутнасць і выканай гэтае абяцанне.

*Vale et me ama.*

*Твой Навум Прыгаворка*

## 6. УЛАДЗІСЛАВУ СЫРАКОМЛЮ

*[Чэрвень 1855 г.?]*

Czy ty pojmujesz, Ludwiku drogi,
Jak nam przy Tobie w tej chwili błogo?
Przybycie Twoje w te biedne progi
Umila szczęściem chatkę ubogą!

Patrz drogi Wieszczu! — nawet dziecinne
Serca swą radość z innymi głoszą,
Wdzięczne! — za Ciebie modły niewinne
Przed tron Wszechwładcy gorąco wznoszą.

Jakie też dla Cię mam nieść ofiary?
Czem uczęstuję, gdy pusta suma?
Ot przyjacielu napij się hary,
A na zakąskę — serce Nauma!

О Людвік любы, каб толькі ведаў,
Як нас усцешыў Ты — даастатку!
Калі наш сціплы парог наведаў,
Запоўніў шчасцем бедную хатку!

Нат сэрцы дзетак, — чуеш, Прароча, —
Як і астатніх, шчасна галосяць.
За Цябе модлаў слодыч ахвоча
Прад Усявышнім горача ўзносяць.

Для Цябе ўскласці б царскі частунак!
З сумы парожняй — якая сума?
Вось, дружа, выпі вясёлы трунак,
А на закуску — сэрца Навума!

## 7. ЮЗАФУ СІКОРСКАМУ

*[Рукою Станіслава Манюшкі]*

Kochany Józefie!

Polecam Twojej opiece młodą firmę wydawcy i księgarza mińskiego. Pour la rarete de fait uczyń dla niego, co da się. Poczciwi ludziska na poczciwej drodze wybierają się szukać kawałka chleba. Więc Ty naturalnie z nimi.

Uściskam Ciebie serdecznie i wyjeżdzam do Wilna.

*1855. M. Lipiec 25 d[nia]. Mińsk*

*[Рукою В. Дуніна-Марцінкевіча]*

Ja, będąc przytomnym temu pismu, zanoszę moje prośby za protektorami moimi, to jest wydawcami mych bazgranin. Zostałem albowiem na starość piewcą białoruskiego ludu. Miej, drogi Panie Józefie, ich w swej protekcji.

Kłaniaj znajomym.

Dziatki me Cię ściskają.

*Twój Marcinkiewicz*

*Менск,*
*25 ліпеня 1855 г.*

*[Рукою Станіслава Манюшкі]*

Любы Юзэфе!

Даручаю тваёй апецы маладую фірму Менскага выдаўца і кнігагандляра. *Pour la rarete de fait* зрабі для яго, што ўдасца. Сумленныя людзі на сумленнай дарозе збіраюцца шукаць кавалка хлеба. Так што ты, натуральна, з імі. Абдымаю цябе сардэчна і выязджаю ў Вільню.

*[Рукою В. Дуніна-Марцінкевіча]*

Будучы прысутным пры напісанні гэтага ліста, і я заношу свае просьбы за сваіх пратэктараў, гэта значыць выдаўцоў маёй пісаніны. Бо я пад старасць зрабіўся песняром беларускага народа. Май, дарагі пане Юзаф, іх у сваёй пратэкцыі. Кланяюся знаёмым. Мае дзеткі цябе абдымаюць.

*Твой Марцінкевіч*

## 8. АДАМУ ЗАВАДСКАМУ

Wielmożny Mości Dobrodzieju!

Ponieważ zręczność się dobra nadarza upraszam więc W[ielmożnego] Pana o odesłanie mi pozostałych u Niego exemplarzy *Sielanki* z regestrem wiele każdą razą było wzięto od Pana, abym mógł zgodzić z moim regestrem? A może co się tam przedało i u Pana?

O co upraszając mam honor pisać się Wielmożnego Pana Dobrodzieja, z Głębokim szacunkiem

*Najniższy sługa*
*Wincenty Marcinkiewicz*
*21-go 9-bra 1856 r.*

*21 лістапада 1856 г.*

Вяльможны спадар дабрадзей!

Паколькі надараецца добрая нагода, то прашу вяльможнага пана адаслаць мне экземпляры *«Ідыліі»,* што засталіся ў вас, з рэестрам,

колькі кожны раз было ўзята ў вас, каб я мог узгадніць з маім рэестрам. А можа, што там прадалося ў вас?

Просячы пра гэта, маю гонар з глыбокай павагай падпісацца вяльможнага пана дабрадзея

*Найніжэйшы слуга*
*Вінцэнт Марцінкевіч*

## 9. АДАМУ ЗАВАДСКАМУ

*Grudnia 4 d[nia] [1856 r.]*

Wielmożny Mości Dobrodzieju!

Bój się Pan Dobrodziej Boga! Musiałeś Pan czyjś inny, zamiast mojego, rachunek, przez omyłkę, mi przysłać! Ja albowiem najprzód z Mińska przysłałem trochę pieniędzy Panu, a potem, będąc w Wilnie, odebrałem od Wołodźki 200 rub. i z tych Pana Dobrodzieja w zupełności zaspokoiłem; wówczas to Pan doradzał abym wszystkie książki moje zabrał, a ja prosiłem aby część onych została u Pana w Komissie — i żadnego długu za mną nie pozostało.

2-[do]. Pan Dobrodziej liczy za przesyłkę 150-[u] exemplarzy 2 rub. 65 kop., a wszakże na koszta przesyłki posłano Panem Bielinowiczem wówczas r[ubli] sr[ebrnych] 4-[ry] i pan wskutek posłanych przez nas tych 4-[ch] rubli przysłał potrzebowane 150-[t] exemplarzy — więc jerzeli przesyłka onych kosztowała 2 [rubli] 65 k[op.], to mnie jeszcze należy reszta od 4-[ch] rubli. Niech Pan dobrze swe rachunki przejży.

Upraszam Pana Dobrodzieja o przysłanie mi pierwszą pocztą *Sielanek* 40-[a] exemplarzy — bo Białoruś poczciwa na zabój potrzebuje tego dziełka i żebym miał jego choćby ze 300 exemplarzy, tobym wyprzedał.

Rachunki nasze i książkowe nawet nie zgadzają się, ale cóż robić. Nielicz Pan Dobrodziej tylko na mnie to, co już opłacono.

Zostaję Wielmożnego Pana Dobrodzieja z głębokim szacunkiem

Najniższym sługą
*Wincenty Marcinkiewicz*

Adress mój: *Викентию Ивановичу Марцинкевичу в Минске — в доме Новаковскаго.*

*4 снежня 1856 г.*

Вяльможны спадар дабрадзей!

Бойся, спадар дабрадзей, Бога! Мусіў спадар чыйсь іншы, замест майго, рахунак мне памылкова прыслаць! Таму што я спачатку з Менска прыслаў вам трохі грошай, а потым, будучы ў Вільні, атрымаў ад Валодзькі 200 руб. і з іх спадара дабрадзея цалкам задаволіў; то тады вы параілі, каб я забраў усе свае кнігі, а я прасіў, каб частка іх засталася ў вас у камісіі,— і ніякага доўгу за мной не засталося.

2. Спадар дабрадзей лічыць — за перасылку 150 экземпляраў 2 руб. 65 кап., але ж на кошт перасылкі спадар Беліновіч паслаў тады 4 руб. срэбрам, і вы ў выніку пасланых намі тых 4 рублёў прыслалі запатрабаваныя 150 экземпляраў. Такім чынам, калі перасылка іх каштавала 2 руб. 65 кап., то мне яшчэ належыць рэшта з 4 рублёў. Хай спадар добра прагледзіць свае рахункі.

Прашу спадара дабрадзея выслаць мне першай поштай 40 экземпляраў *«Ідыліі»*, бо шчырая Беларусь шалёна патрабуе гэтага твора, і калі б я меў яго хоць 300 асобнікаў, дык распрадаў бы.

Рахункі нашы і кніжныя нават не супадаюць, але ж што рабіць. Толькі не лічы, спадар дабрадзей, на мяне тое, што ўжо аплочана.

Застаюся з глыбокай пашанай вяльможнага спадара дабрадзея найніжэйшым слугой

*Вінцэнт Марцінкевіч*

Мой адрас: *Вінцэнту Янаву Марцінкевічу ў Менску — у доме Навакоўскага.*

# 10. У ГАЛОЎНАЕ ЦЭНЗУРНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ

В Главный цензурный комитет

Дворянина Минской губернии и уезда
Викентия Иванова Марцинкевича

## Объяснение

Отсылка Виленскою цензурою в Главный цензурный комитет «*Pana Tadeusza*», переведенного мною на белорусский диалект, для разрешения, можно ли книжки сии выпустить в свет по причине, что напечатаны польскими буквами, заставляет ныне меня почтительнейше объяснить следующее:

Во-первых: в предписании, данном цензурам для руководства, сказано токмо о малороссийском диалекте, а белорусский совершенно розн от малороссийского, ибо как первый, находясь под натиском русского языка, много заимствовал от оного, так, напротив, белорусский более помешался с польским, и часто встречаются слова, кои затруднительно выразить русскими буквами.

Во-вторых: всеавгустейший монарх наш, обратив особенно отцовское внимание на крестьян, желает как физического, так равно и морального улучшения их быта, а просвещение есть первою степенью к таковому. Я, действуя в духе правительства, впал на мысль для поощрения темного и с натуры ленивого нашего крестьянина к науке описывать его обычаи, обряды, традиционные предания и то в собственном его же диалекте; и так в 1846 году выпущена Главным цензурным комитетом в свет пиэса моя «*Sielanka*», далее «*Hapon*», «*Wieczernicy*», «*Kupallo*» и «*Dudarz Bieloruskij*». Впоследствии, переведя на сей диалект «*Pana Tadeusza*» и получив дозволение Виленской цензуры печатать его, употребив на топографию значительный капитал, вырученный мною частью из пренумераты, а частью кровавыми моими трудами приобретенный, и ныне, когда 1-я книжка (*sposzyt*) перевода «*Tadeusza*» представлена была в Виленскую цензуру для получения на выпуск билета, то цензор г. Мухин не дозволил пустить ее в свет и представил в Главный комитет.

3-е. В наших провинциях из ста крестьян, наверно, можно найти 10, которые хорошо читают по-польски, когда, напротив, из тысячи насилу сыщется один, знающий русский язык. То, напечатав какое-либо белорусское сочинение русскими буквами, смело можно запереть оные в сундук, ибо высший класс общества, имея под рукою русскую, польскую, французскую и немецкую литературы, не возьмет и в руки простонародной книги, а крестьяне хотя бы и желали читать повести и рассказы, для исправления их нравов и поощрения к учению написанные, но не зная русских букв, не в состоянии удовлетворить своего желания.

Представляя все вышеприведенные причины на благоуважение Цензурного комитета, почтительнейше упрашиваю: ежели уже не все будущие сочинения, то по крайней мере те, которые уже оцензурованы, дозволить выпустить в свет, — ибо я, в полном доверии будучи, что рукописи, цензурою пропущенные, можно смело печатать, выложил 724 руб. капитала на топографию и бумагу. Ежели же Главному комитету не благоугодно будет принять в резон вышепоставленные мною причины, на которых обеспечаю мою просьбу, то чувствительнейше упрашиваю разрешения, на кем именно я имею поискивать издержек, понесенных мною на топографию, ибо, оставшись без вознаграждения за таковые, а принужден будучи совестью возвратить пренумераторам их деньги, с многочисленным моим семейством доведен буду до крайнего разорения.

Объяснив чистосердечно мое положение и поручив участь мою и семейства моего благородным чувствам членов Главного цензурного комитета, с упованием ожидаю разрешения моей участи.

*Викентий Дунин Марцинкевич*

*1859 года сентября 8 дня Минск*
*Жительство мое Минской губернии и уезде, в деревне Люцынке*

У Галоўны цэнзурны камітэт

Двараніна Менскай губерні і павета
Вінцэнта Янава Марцінкевіча

**Тлумачэнне**

Дасылка Віленскаю цэнзураю ў Галоўны цэнзурны камітэт «*Пана Тадэвуша*», перакладзенага мною на беларускі дыялект, для дазволу, ці можна кніжкі гэтыя пусціць у свет з прычыны надрукавання іх польскімі літарамі, прымушае цяпер мяне найпачцівей растлумачыць наступнае:

Па-першае: у загадзе, дадзеным цэнзурам для кіраўніцтва, гаворыцца толькі пра маларасійскі дыялект, а беларускі цалкам розніцца ад маларасійскага, бо як першы, знаходзячыся пад націскам расейскай мовы, шмат запазычаў ад яе, гэтак, наадварот, беларускі больш памяшаўся з польскім, і часта сустракаюцца словы, якія цяжка выказаць расейскімі літарамі.

Па-другое: яснавяльможны манарх наш, звярнуўшы асаблівую бацькаўскую ўвагу на сялян, жадае як фізічнага, гэтак аднолькава і маральнага паляпшэння іх побыту, а асвета ёсць першай прыступкай да такога. Я, дзейнічаючы ў духу ўрада, запаў думкаю для заахвочвання цёмнага і з натуры гультаяватага нашага селяніна да навукі апісваць яго звычаі, абрады, традыцыйныя паданні і ўсё гэта на ўласным ягоным жа дыялекце; і таму ў 1846 годзе выпушчаная Галоўным цэнзурным камітэтам у свет п'еса мая «*Ідылія*», далей «*Гапон*», «*Вечарніцы*», «*Купала*» і «*Беларускі Дудар*». Потым, пераклаўшы на гэты дыялект «*Пана Тадэвуша*» і атрымаўшы дазвол Віленскай цэнзуры друкаваць яго, скарыстаўшы на тапаграфію значны капітал, згарушчаны мною часткова з падпіскі, а часткова крывавымі маімі натугамі здабыты, і цяпер, калі 1-я кніжка (сшытак) перакладу «*[Пана] Тадэвуша*» пададзена была ў Віленскую цэнзуру для атрымання на выдачу пропуска, дык цэнзар сп. Мухін не дазволіў пусціць яе ў свет і падаў у Галоўны камітэт.

Па-трэцяе: У нашых закутках з сотні сялян, мусіць, можна знайсці 10, якія добра чытаюць па-польску, калі ж, наадварот, з тысячы насілу адшукаецца адзін дасведчаны ў расейскай мове. Дык, надрукаваўшы якое-небудзь бесларускае пісанне рускімі літарамі, смела можна замкнуць іх у куфар, паколькі вышэйшы клас грамадства, маючы пад рукою расейскую, польскую, французскую і нямецкую літаратуры, не возьме і ў рукі прос-

танароднай кнігі, а сяляне хоць бы і жадалі чытаць аповесці і апавяданні, напісаныя для выпраўлення іх нораваў і заахвочвання да навучання, але, не ведаючы расейскіх літар, не ў стане задаволіць свае жаданні.

Падаючы ўсе вышэйпрыведзеныя чыннікі на добрапашану Цэнзурнага камітэта, найпачцівей упрошваю: калі ўжо не ўсе будучыя пісанні, дык, прынамсі, тыя, якія ўжо ацэнзураваныя, дазволіць выпусціць у свет, паколькі я, будучы ў поўным даверы, што рукапісы, цэнзураю прапушчаныя, можна смела друкаваць, выдаткаваў 724 рублі капіталу на друкарню і паперу. Калі ж Галоўнаму камітэту не добрапрыдатна будзе палічыць слушным вышэйпрыведзеныя мною прычыны, на якіх угрунтавана мая просьба, дык чулліва ўпрошваю вызначыць, на кім менавіта я маю спаганяць выдаткі, затрачаныя мною на друкарню, бо, застаўшыся без узнагароды за такія і будучы змушаны сумленнем вярнуць падпіснікам іх грошы, з шматлікім маім сямействам даведзены буду да крайняй галечы.

Патлумачыўшы чыстасардэчна маё становішча і даручыўшы лёс мой і майго сямейства высакародным пачуццям чальцоў Галоўнага цэнзурнага камітэта, з спадзяваннем чакаю высвятлення маёй долі.

*Вінцэнт Дунін Марцінкевіч*

*1859 года верасня 8 дня Менск*

*Жыхарства маё ў Менскай губерні і павеце, у вёсцы Люцінцы*

## 11. МІНІСТРУ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ ЯЎГРАФУ КАВАЛЕЎСКАМУ

Его высокопревосходительству господину министру народного просвещения действительному тайному советнику и кавалеру Евграфу Петровичу Ковалевскому

Дворянина Минской губернии Минского уезда
Викентия Иванова сына Марцинкевича

**Прошение**

Вследствие предписания вашего высокопревосходительства от 22-го октября прошедшего года за № 2154, данного Виленскому цензурному комитету по делу о недозволении выпуска в свет

переведенного мною на белорусский диалект *«Pana Tadeusza»* и в части уже напечатанного польским шрифтом, честь имею почтительнейше пояснить следующее:

Виленский цензурный комитет, исполняя предписание вашего высокопревосходительства, не сообразился хорошо с пунктом такового в отношении обсуждения, с какой суммы может простираться вознаграждение за убытки, понесенные издателем поименованной книги по напечатании оной, ибо Виленский комитет (не спросив меня, который ныне безвинно должен понести значительные издержки, а именно: 1-е) удовлетворить типографщика за отлитие новых букв со знаками ударения, которые токмо служить могут к напечатанию на белорусском наречии; 2-е) будучи очень бедного состояния и единственно трудами своими содержа и воспитывая значительное семейство, я на *«Pana Tadeusza»*, пропущенного Виленскою цензурою, объявил пренумерату и часть собранных денег обратил на себя в полном доверии, что за труды свои могу пользоваться вознаграждением, ныне же, когда *«Pana Tadeusza»*, не знаю, по какому поводу, воспрещено пускать в свет, совесть наказывает мне возвратить пренумераторам деньги) обратился прямо с вопросом к типографщику Сыркину, который и показал за напечатание 1-й книги расхода всего 176 руб. 60 коп. серебром, не положив даже в расчет денег, полученных от меня на задаток, и ныне утруждает меня, чтобы платил за отлитие букв и нанятым работникам, всего простирая претензии на 600 руб. сереб[ром]. И потому, полагаясь на правосудие вашего высокопревосходительства, принимаю смелость утруждать моею просьбою, дабы ваше высокопревосходительство, вникнув в справедливость моей жалобы, предписали кому следует, дабы возвращены мне были издержки количеством на 724 руб., ибо я, не имея средств расчитаться с пренумераторами, безвинно доведен буду до крайней нищеты.

*Викентий Иванов Марцинкевич*

*Генваря 14 дня 1860 года*
*Местожительство просителя в г. Минске*

Яго найвяльможнасці спадару міністру народнай асветы сапраўднаму таемнаму дарадцу і кавалеру Яўграфу Пятровічу Кавалеўскаму
Двараніна Менскай губерні Менскага павета
Вінцэнта Янава сына Марцінкевіча

## Прашэнне

З прычыны загада вашай найвяльможнасці ад 22 кастрычніка мінулага года за № 2154, дадзенага Віленскаму цэнзурнаму камітэту па справе пра забарону выпуску ў свет перакладзенага мною на беларускі дыялект «*Пана Тадэвуша*» і часткова ўжо надрукаванага польскім шрыфтам, маю гонар найпачцівей патлумачыць наступнае:

Віленскі цэнзурны камітэт, выконваючы загад вашай найвяльможнасці, не суаднёсся добра з пунктам такога адносна абмеркавання, з якой сумы можа зыходзіць узнагарода за страты, выдаткаваныя выдаўцом названай кнігі пасля яе надрукавання, бо Віленскі камітэт (не спытаўшы мяне, які цяпер бязвінна павінен панесці значныя выдаткі, а менавіта: 1-е) задаволіць друкара за адліццё новых літар са знакамі націску, якія толькі служыць могуць да надрукавання на беларускай гаворцы; 2-е) будучы вельмі беднага стану і адзіна працамі сваімі ўтрымоўваючы і выхоўваючы значнае сямейства, я на «*Пана Тадэвуша*», прапушчанага Віленскаю цэнзураю, абвясціў падпіску і частку сабраных грошай выдаткаваў на сябе ў поўным даверы, што за высілкі свае магу карыстацца ўзнагародай, цяпер жа, калі «*Пана Тадэвуша*», не ведаю, на якой падставе, забаронена пускаць у свет, сумленне змушае мяне вярнуць падпісчыкам грошы), звярнуўся наўпрост з пытаннем да друкара Сыркіна, які і паказаў за надрукаванне 1-й кнігі выдаткаў агулам 176 руб. 60 кап. срэбрам, не прыняўшы нават у разлік грошай, атрыманых ад мяне як задатак, і цяпер даймае мяне, каб плаціў за адліццё літар і найманым працаўнікам, усяго распасціраючы прэтэнзіі на 600 руб. срэбрам. І таму, разлічваючы на правасуднасць вашай найвяльможнасці, набіраюся адвагі турбаваць маёю просьбаю, каб ваша найвяльможнасць, углыбіўшыся ў справядлівасць маёй скаргі, загадалі каму належыць, каб вярнулі мне выдаткі колькасцю на 724 руб., бо я, не маючы сродкаў разлічыцца з падпіснікамі, бязвінна даведзены буду да крайняй галечы.

*Вінцэнт Янаў Марцінкевіч*

*Студзеня 14 дня 1860 года*
*Месца жыхарства просьбіта ў г. Менску*

# 12. АДАМУ КІРКОРУ

Zacny Panie Adamie!

Z interesu wypada konieczna potrzeba widzenia się z Zahorskim, a że jestem cierpiącym więc poproś go aby wczasie swiąt przyjechał do mnie do Lucynki, niechaj mych starych pożałuje kości, wszak to nie bardzo daleko, — przez Lebiedziew, Chożów, Izabellin do Grudka, a stamtąd na dorohi do Lucynki Marcinkiewicza — oto i marszrut — jednego dnia ze Smurgoń przyjechać można.

Proszę cię o szkółkach w Mińsku dla biednych rzemieślników Kamilli Marcinkiewiczówny, a w Lucynce mojej, przez Cezarynę i Elodyę Mar[cinkiewiczanek] podtrzymywane, napisz czule, — może to zachęci innych obywateli, który są w tem względzie nie czuli. Dowiedź się w Kancellaryi wojennego [gubernatora] czy nie było od Ministra jakiego zapytania z powodu skargi mojej na Kowieńską policyą za wyprawę z Kowna.

*Kochaj kochającego Cię Nauma*

*23 marca [1862] Lucynka*

*Люцінка,*
*23 сакавіка 1862 г.*

Высакародны пане Адаме!

У сувязі са справамі з'явілася пільная патрэба бачыцца з Загорскім, а паколькі я хворы, то папрасі яго, каб на святы прыехаў да мяне ў Люцінку, няхай пашкадуе мае старыя косці, гэта ж не вельмі далёка — праз Лебедзева, Хожава, Ізабелін да Гарадка, а адтуль — дарогай у Люцінку Марцінкевіча. Вось і маршрут — за адзін дзень са Смаргоні даехаць можна.

Прашу цябе, напішы спачувальна пра школкі ў Менску Камілы Марцінкевічанкі для бедных рамеснікаў і тыя, што ў Люцінцы маёй падтрымліваюцца Цэзарынай і Элёдыяй Мар[цінкевічанкамі]. Можа, гэта заахвоціць іншых памешчыкаў, якія ставяцца да гэтага абыякава. Даведайся ў канцылярыі ваеннага [губернатара], ці не было ад міністра якога запытання ў сувязі з маёй скаргай на ковенскую паліцыю за высылку з Коўні.

*Любі любячага цябе Навума*

# 13. У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «ВИЛЕНСКИЙ ВЕСТНИК»

Для поощрения Белорусских крестьян к просвящению, я более 10-и лет трудился, сочиняя в их простонародном наречьи повести, изображающие их домашнюю жизнь, предания и обычаи. Труд этот приносил нам обоюдную пользу — их, поощрая к чтению таковых сочинений, поощрал вместе к обучению азбуки и тем самим просвящал их, мне же приносил матерьяльную пользу. Ныне я снова вздумал возвратит[ь]ся к моей цели; а как всего лучше периодические журналы могут содействовать таковой, а более журнал, среди сего народонаселения выходящий, то — ежели угодно — предлагаю «Виленскому вестнику» следующее: я буду присылать свои сочинения, а господин редактор «Вестника» плотить мне за всякую повесть. И вот на пробу посылаю начало повести под заглавием *«Былицы, разказ Наума Приговорки»*. За которую желаю получить вознаграждения 75 руб. сереб[ром]. Ежели редакция согласится на мое предложение, то пришлю и целую повесть, ежели же мое не влад, то прошу уведомить меня, в то время я снесусь с другим каким-либо журналом. Адрес мой: Его бла[городию] Викентию Ивановичу Марцинкевичу в Минске, на Захарьевской улице, в доме Пейсаха Перельмана.

Остаюсь с истинным почтением

*Покорный слуга В. Марцинкевич*

*6 февраля 1867 года. Люцынка*

*Люцінка,*
*6 лютага 1867 г.*

Для заахвочвання беларускіх сялян да асветы я больш 10-і гадоў працаваў, складаючы на іх простанароднай гаворцы аповесці, якія паказваюць іх хатні побыт, паданні і звычаі. Праца гэтая прыносіла нам узаемную карысць — іх, заахвочваючы да чытання такіх пісанняў, заахвочвала адначасова да навучання азбукі і тым самым асвячала іх, мне ж прыносіла матэрыяльную карысць. Цяпер зноў заманілася мне вярнуцца да маёй мэты; а паколькі перыядычныя выданні найлепш

могуць садзейнічаць гэтаму, а найбольш часопіс, які сярод гэтага народанасельніцтва выдаецца, дык — калі прыдатна — прапаноўваю «Віленскаму весніку» наступнае: я буду прысылаць свае пісанні, а спадар рэдактар «Весніка» плаціць мне за кожную аповесць. Дык вось на спробу дасылаю пачатак аповесці пад загалоўкам «*Быліцы, апавяданне Навума Прыговоркі*». За якую жадаю атрымаць узнагароды 75 рублёў срэбрам.

Калі рэдакцыя пагодзіцца на маю прапанову, дык дашлю і ўсю аповесць; калі ж маё не ў лад, дык прашу паведаміць мне, тады я ў міжчассе звяжуся з іншым якім-небудзь часопісам.

Адрас мой: Яго высакагоднасці Вінцэнту Іванавічу Марцінкевічу ў Менску, на Захараўскай вуліцы, у доме Пэйсаха Перальмана.

Застаюся з праўдзівай павагай

*Пакорлівы слуга В. Марцінкевіч*

## 14. ЯНУ КАРЛОВІЧУ

Zacny Panie!

Prawdziwie! z wielką a wielką przyjemnością uścisnąłem w myśli wyciągniętą do mnie poczciwą dłoń współpracownika na niwie ludowej literatury. Tem przyjemniej mi było odczytywać wyrazy jego listu, że ten podany mi został na polu, w chwili gdy na zagony maluczkiej mej roli najprozaiczniej rozrzucałem kijaszkiem gnój, aby — da Bóg! na przyszłe lato pozyskać wdzięczniejszy plon, gdyż ten rok, niestety! fatalnie mi nie dopisał.

Czytając ciepłe, braterskie wyrazy Pana pusty mię śmiech porwał,— pomyślałem w duchu: mój miły Boże! tam gdzieś w Bruxeli drukują moje wierszydła, a ja tu w krwawym pocie urabiam prozaiczniejszą od literackiej niwę, aby wydobyć z niej nie chleb dla duszy, lecz ciała. Dosyć wszakże tych orzekań, — przystąpmy do rzeczy.

Najprzód chcę wyświecić Panu cel, dla którego gorliwie zająłem się uprawą ludowej niwy; widząc, niestety! że bracia młodsi jednej i tej że matki, w części może i słusznie, wszakże nie z ogólnej winy, silniej w ostatnich czasach poczęli okazywać do starszej swej braci zakorzeniałą oddawna już w sercach swych nienawiść, jakową ludzi

zlej woli, korzystając z jej ciemnoty, fałszywemi podszepty starali się więcej ją rozdmuchiwać, jedyny środek zbliżenia ku sobie tych dwóch, przeciwnych, żywiołów upatrywałem w oświacie pierwszych; przez nią przejrzy ślepy nasz kmiotek, pozna że częstokroć, były dziś, pan jego, przycisniony ze wszech stron rozmaitemi materjałnemi naciskami, pragnąc się z takowych otrząść, czasami mimowoli nadurzył swej nad nim władzy. Lecz przynaglić lud nasz, z natury rozleniwiony i zdemoralizowany, do oświaty, jest to pręcikiem góry przewracać; wpadłem więc na myśl zachęcić go do takowej powiastkami z ich domowego życia, w ich że własnem narzeczu osnutemi. Dla tego jedynie drukowałem takowe polskimi literami, dla tego, wyrzekając się wszelkich estetycznych form, kładłem tuż obok zupełnie proste, przystępne wyobrażeniom jeszcze nie okrzesanym, polskie powiastki i własne wierszyki, aby ciemny kmiotek, rozciekawiony podaniami, własnem jego narzeczem, rozrobionemi, z ochotą, ucząc się polskich liter, aby mógł czytać ustępy z własnego życia uczył się razem i polskiej, macierzystej literatury,— a z przyjemnością spożywszy kłos rodzinny, przeszedł tuż obok i niwę polską, i tem samem wdrażał się powoli i kompletnie się oznajmiał z macierzystem piśmiennictwem. Niech więc to Pana nie gorszy kiedy w pismach moich napotka Pan *quasi* poezye polskie, odarte z wszelkich form estetyki,— ja, pisząc powiastki nie dla doktorów filozofii, lecz dla kmiotków, ubierałem te dziatki mego ducha nie w estetyczne sukienki, lecz w proste ludowe siermiężki, by lud ten ciemny nie strachał się z niemi popieścić.

Najpierwsze moje dziecko w świat wyszłe, była *Sielanka*, komedio-opera (mieszanina narzeczy). Znajdzie ją Pan w księgarni Zawadzkiego, przez niego albowiem była drukowaną. 2-gą *Hapona* Pan masz. 3-e *Ciekawyś? — Przeczytaj*! czyli *Kupało*, poszukaj Pan w Olgebranta księgarni. 4-e *Dudarza* Panu posyłam, także nie zaniedbam przysłać. *Wieczernice*, których dziś nie mam pod ręką, lecz dostanę. 5-a *Lucynka*, (posyłająca się) miała być drukowaną z ludową powiastką *Karanacya*, lecz — niestety! ostatniej nie przepuszczono przez Cenzurę, sama więc jedna w świat powędrowała. 6-a Tłumaczenie *Pana Tadeusza*, zupełnie ukończone, próbowałem drukować u Syrkina, ale dwie pierwsze pieśni tak nędznie wyszły, że opadły mi ręce, do tego jeszcze Minister zabronił drukować polskiemi literami. Znalazła się wszakże jedna osoba, która przyjęła była na się trud wydrukowania przenicowanego *Tadeusza* w Bruxeli, dałem

(przez ostrożność) kopię i dobrze zrobiłem, bo dotąd o tej osobie ani słuchu nie powziąłem. Szczęściem został się u mnie oryginał tłumaczenia którego, że cały pierwszy tom przeszedł przez Cenzurę, a więc ocalał, drugi zaś tom został przy rewizyi mi zabrany i przepadł bezpowrotnie. Otóż, jeżeli Pan masz związki z Cenzurą Wileńską, to poproś tam exemplarz dwuch pierwszych pieśni, tam ich dużo się pod stołem wala, gdyż, jako drukowane literami polskiemi, zostały z rozporządzenia Ministra zabrane. Kiedy Pań tam nie dostanie, to proszę udać się do p. Alexego Wiszniewskiego, mieszkającego w domie Biskupa Krasińskiego, on zda się ma exemplarz, a więc Panu udzieli. W Lidzie u powiatowego doktora Cywińskiego jest mój własny, który, za okazaniem tego pisma, da Panu do przepisania, a Pan, po skopiowaniu, racz mi go odesłać. Dalszych pieśni I-go tomu będę Panu (dla przepisania) udzielał z tem, aby mi przez też samę okazyą, (nie przez pocztę) odsyłać; gdyż ta pamiątka mej pracy jest dla mnie drogą, a kopij już nie mam. O nadesłanie prac Pańskich najczulej upraszam, będą one pomieszczone w pamiątkach drogich mojemu sercu, obok pamiątek od Kraszewskiego i nieboszczyka Korzeniowskiego. Właśnie jedzie jeden poczciwy szlachcic z naszych stron, który doręczy Panu *Dudarza* i *Lucynkę*, a do Wiszniewskiego wiezie dla przeczytania *Pinskaja Szlachta* i *Szkice prowincyonalne*; poznajom się Pań z zacnym Wiszniewskim i, póki szlachcic wyjedzie z Wilna, zbierzcie się w Kółko domowe, przeczytajcie tę bazgraninę razem, dajcie o niej swój sąd razem z odesłaniem tych pism. Pan bardzo będzie rad ze znajomości P. Wiszniewskiego i on nie mało, a zwłaszcza wspólny nasz przyjaciel Mamert Renier, mogę dać Panu materjałów [do] ludowej literatury, u Reniera może Pan i *Kupałę* znajdziesz.

Ściskam Pana serdecznie a oczekując dzieł Jego i listowej pogadanki zostaję z szacunkiem

brat i sługa

*W. Marcinkiewicz*

*15-go 7bra. Lucynka*

*Люцінка,*
*15 верасня 1868 г.*

Шаноўны спадар!

Праўдзіва! з вялікай і вялікай прыемнасцю паціснуў у думках працягнутую да мяне пачцівую руку супрацоўніка на ніве народнай літаратуры. Мне тым прыемней было чытаць словы Вашага ліста, бо ён пададзены мне быў на полі ў хвіліну, калі на загоны маёй малюсенькай раллі найпразаічней раскідваў я кіёчкам гной, каб — дасць Бог! — на будучы год мець больш удзячны плён, бо гэты год, на жаль! фатальна мяне падвёў!

Чытаючы цёплыя, братэрскія словы спадара, разабраў мяне пусты смех — падумаў у душы: «Мілы мой Божа! дзесь там у Бруксэлі друкуюць мае вершасплёты, а я тут крывавым потам урабляю празаічнейшую ад літаратарскай ніву, каб здабыць з яе хлеб не для душы, а для цела».

Аднак досыць тых нараканняў — прыступім да справы.

Найперш хачу высветліць перад спадаром мэту, дзеля якой я горача заняўся апрацоўкай народнай нівы. Бачачы, на жаль, як малодшыя браты адной і той самай маткі, часткова, можа, і слушна, аднак не з агульнай віны, апошнімі часамі мацней пачалі выказваць да старай брацці сваёй здаўна ўжо закаранелую ў сваіх сэрцах нянавісць, якую людзі злой волі, карыстаючыся з іхняй цемнаты, хлуслівым нашэптваннем стараліся яшчэ больш раздзімаць. Адзіны сродак збліжэння паміж сабою тых дзвюх супрацьлеглых стыхій бачыцца мне ў адукацыі першых; дзякуючы ёй наш сляпы селянін стане відушчым, спазнае, што часта былы пан ягоны, сёння прыціснуты з усіх бакоў рознымі матэрыяльнымі цяжкасцямі, прагнучы з такіх атрэсціся, часамі міжволі злоўжываў над ім сваёй уладай. Аднак прыспешыць наш люд, ад прыроды разгультаены і здэмаралізаваны, да асветы — гэта прутком горы перакульваць. Таму надумаўся я заахвоціць яго да яе апавяданнейкамі з ягонага хатняга жыцця, на ягонай уласнай мове заснаванымі. Дзеля таго друкаваў іх польскімі літарамі, выракаючыся ўсялякіх эстэтычных формаў, тут жа побач змяшчаў зусім простыя, даступныя ўяўленням яшчэ не акрэсленым, польскія апавяданні і ўласныя вершыкі, дзеля таго толькі, каб цёмны мужык, зацікаўлены паданнямі, замешанымі ягонай уласнай мовай, з ахвотаю, вучачыся польскіх літараў, мог чытаць урыўкі з уласнага жыцця, вучыўся разам і польскай, айчыннай літаратуры, а з прыемнасцю спажыўшы родны колас, спазнаў бы

адначасова і польскую ніву і тым самым паступова звыкаў і ўсё больш знаёміўся з родным пісьменствам. Няхай, аднак, не злуе спадара, калі ў маіх творах напаткаеце *quasi* польскай паэзіі, абдзёртую з усялякіх форм эстэтыкі,— я, пішучы апавяданнейкі не для дактароў і філасофіі, а для сялян, прыбіраў тых дзетак майго духу не ў эстэтычныя сукенкі, а ў простыя народныя сярмяжкі, каб цёмны той народ не баяўся з імі пазабаўляцца.

Найпершае маё дзіцятка, што з'явілася на свет, была «*Ідылія*» — камедыя-опера (мешаніна гаворак). Спадар яе знойдзе ў кнігарні Завадскага, таму што ім была выдадзеная. 2. «*Гапона*» спадар маеш. 3. «*Цікаўны? — Прачытай!*» або «*Купала*» пашукай, спадар, у кнігарні Альгебранта. 4. «*Дудара*» спадару дасылаю, таксама не праміну даслаць «*Вечарніцы*», якіх сёння пад рукою не маю, але дастану. 5. «*Люцінка*» (якая дасылаецца) мелася быць друкаваная з народным апавяданнем «*Каранацыя*», ды, на жаль! апошняя не была прапушчаная цэнзураю, таму зусім адна ў свет павандравала. 6. Пераклад «*Пана Тадэвуша*», цалкам скончаны, спрабаваў друкаваць у Сыркіна, ды дзве першыя песні выйшлі так убога, што ў мяне апусціліся рукі; да таго ж міністр забараніў друкаваць польскімі літарамі. Знайшлася, праўда, адна асоба, якая ўзяла на сябе клопат друкавання перакладзенага «*Тадэвуша*» ў Бруксэлі. Даў я (праз асцярожнасць) копію і добра зрабіў, бо дасюль ад той асобы ані слуху не атрымаў. На шчасце, застаўся ў мяне арыгінал перакладу, якога ўвесь першы том прайшоў праз цэнзуру і таму ўцалеў, а другі том пры вобыску быў у мяне забраны і беззваротна знік. Дык вось, калі, спадар, маеш сувязі з віленскай цэнзурай, дык папрасі там экземпляр дзвюх першых песняў, іх там пад сталом шмат валяецца, бо, як друкаваныя польскімі літарамі, былі забраныя па загаду міністра. Калі спадар у іх не дастане, то прашу звярнуцца да сп. Аляксея Вішнеўскага, які жыве ў доме біскупа Красіньскага; ён, здаецца, мае экземпляр, дык пазыча спадару. У Лідзе ў павятовага лекара Цывіньскага ёсць мой уласны, які, калі пакажаце яму гэты ліст, дасць спадару перапісаць, а спадар, пасля скапіравання, зробіць ласку мне яго адаслаць. Наступныя песні I тома буду даваць спадару (каб перапісаць) з тым, каб спадар праз тую ж самую аказію (не праз пошту) мне адсылаў; таму што гэта памятка маёй працы для мяне дарагая, а копіяў я ўжо не маю. Аб прысылцы Вашых прац прашу найласкавей. Яны будуць змешчаны сярод дарагіх майму сэрцу падарункаў побач з памяткамі ад Крашэўскага і нябожчыка Кажанеўскага. З нашых краёў

акурат едзе адзін пачцівы шляхціц, які ўручыць спадару «*Дудара*» і «*Люцінку*», а да Вішнеўскага вязе на прачытанне «*Пінскую шляхту*» і «*Правінцыяльныя нарысы*». Пазнаёмся, спадар, з пачцівым Вішнеўскім, і, пакуль шляхціц выедзе з Вільні, збярыцеся хатнім колам, супольна прачытайце гэтую крамзаніну, выкажыце пра яе сваё меркаванне разам з вяртаннем тых твораў. Спадар будзе вельмі рады знаёмству з Вішнеўскім, і ён нямала, а асабліва наш супольны прыяцель Мамэрт Рэніер. Магу даць спадару матэрыялаў для народнай літаратуры. У Рэніера, спадар, можа, і «*Купалу*» знойдзеш.

Сардэчна абдымаю спадара і, чакаючы прац Вашых ды далейшага ліставання, застаюся з павагай

брат і слуга

*В. Марцінкевіч*

## 15. ЯНУ КАРЛОВІЧУ

Zacny Panie!

W nagrodę że tak długo nie było okazji do Wilna, oto druga już przybywa mi na pomoc, chwytam więc tę zręczność aby choć kilką słowami rozmówić się z Panem. Bądź tak dobrym a uwiadom mię czy dostałeś według wskazówek w uprzednim mym liście wymienionych, tłumaczenie pierwszych dwóch ksiąg *Pana Tadeusza*? Jeżeli nie, to będę się starał powoli skopiować i z każdą okazyą częściami przesyłać Panu. Radzę Mu także poszukać u Zawadzkiego księgarni mojej *Sielanki*. Miłośniki naszej literatury przyznawali, z racji mnogości przysłów, tę pracę klasyczną. Zresztą upraszam Pana nie zapomnieć przysłać mi swe prace.

Zostaję z szacunkiem Pana Dobrodzieja sługą

*W. Marcinkiewicz*

*17 listopada. Lucynka*

[Адрас:] *Его Высокоблагородию Ивану Александровичу Карловичу*
*Вильно — на Татарской улице дом благотворительного общества.*
*В квартире г. Малаховца.*

*Люцінка,*
*17 лістапада 1868 г.*

Шаноўны спадар!

Ва ўзнагароду, што гэтак доўга не меў аказіі ў Вільню, нарэшце, і другая прыйшла мне на дапамогу. Таму хапаюся за гэтую мажлівасць, каб хоць у некалькіх словах перакінуцца з спадаром. Будзь гэтак добрым ды паведамі мне, ці атрымаў, згодна з пададзеным у маім папярэднім лісце ўказаннем, пераклад першых дзвюх кніг «*Пана Тадэвуша*»? Калі не, дык буду намагацца спакваля іх перапісваць і з кожнай аказіяй, па частках, перасылаць спадару. Я раіў таксама Вам пашукаць у кнігарні Завадскага маю «*Ідылію*». Аматары нашай літаратуры, з увагі на мноства прымавак, прызнавалі гэты твор класічным. Зрэшты, упрошваю спадара не забыць даслаць мне свае працы.

Застаюся з павагаю спадара дабрадзея слугою

*В. Марцінкевіч*

[Адрас:] *Яго дабрароднасці Яну Аляксандраву Карловічу*

*Вільня — на Татарскай вуліцы дом дабратворнага таварыства. У кватэры сп. Малахаўца*

## 16. МЕНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ

Его превосходительству господину минскому губернатору

Помещика Минского уезда
Викентия Иванова Марцинкевича

**Прошение**

Проказы дочери моей, отделившейся впротчем от меня, пренебрегши отцовскою опекою, довели меня до полицейского надзора в 1865 году и тем самым отняли у меня возможность отлучиться из своего хутора.

Именице мое так малое, что я, единственно занимаясь разными делами по доверенностям, был в состоянии, хотя и скудно, содержать мое семейство, но по назначении надо мною поли-

цейского надзора я, не смея отлучаться из места жительства, лишился доверенностей, а вместе не только жизненных средств, но даже возможности уплачивать казенные повинности.

Господин минский губернский предводитель дворянства, зная мою благонадежность, год тому назад учинил ходатайство к увольнению меня из-под надзора, однако же я не только не получил сей милости, но даже не было справок о моей благонадежности в стане, не знаю, по какому поводу.

Ныне случается мне доверенность Коржонтковского о вытребовании в разных местах в законных копиях документов, относящихся к его происхождению, и за представлением таковых посредством министра иностранных дел в Америку должен буду заняться изысканием значительного наследства, оставшегося после дяди его, умершего в Филядельфии. Эта доверенность не токмо поставить меня в возможности избавиться голодной смерти, но даже совершенно улучшить быт моего семейства.

Я, исходатайствовав у соседствующих помещиков поручительное свидетельство и удостоверение местного станового пристава в неимении препятствия отлучиться в места, в которых находятся нужные мне по сему наследственному делу документы, вышесказанное поручительство и удостоверение станового пристава представил г. минскому уездному исправнику, прося выдачи мне в предназначенные места годичного паспорта, а г. исправник представил мою просьбу на благоуважение вашего превосходительства, — в канцелярии же сказано мне, что ваше превосходительство представите эту просьбу на разрешение начальнику края.

Я, не в состоянии будучи долго ожидать в городе высшего разрешения, можно сказать, моей участи, к тому опасаясь потерять выгодную доверенность, просил г. исправника снабдить меня четырехнедельным билетом на проезд в г. Свенцяны впредь до разрешения начальником края выдачи мне годичного паспорта, но г. исправник в том мне отказал, велев ожидать резолюции высшего начальства, а потому, будучи доведен сим отказом до крайне невыгодного положения, принимаю смелость утруждать ваше превосходительство покорнейшею моею

просьбою предписать г. минскому исправнику выдать мне четырехнедельный билет на отлучку в сумежный уездный город Свенцяны.

*Помещик коллежский регистратор*
*Викентий Марцинкевич*

*Генваря 15 дня 1870 года*
*Жительство мое 1-й части города Минска временно,*
*а постоянное — Минского уезда 2-го стана в хуторе Люцынке*

Яго вяльможнасці спадару менскаму губернатару
Памешчыка Менскага павета
Вінцэнта Янава Марцінкевіча

## Прашэнне

Свавольствы дачкі маёй, якая, зрэшты, аддзялілася ад мяне, грэбуючы бацькоўскай апекай, давялі мяне ў 1865 годзе да паліцэйскага нагляду і тым самым адабралі ў мяне магчымасць адлучацца з сваёй сялібы.

Маёнтачак мой гэткі малы, што я, адзіна займаючыся рознымі справамі па даверанасцях, быў у стане, хоць і нэндзна, утрымоўваць маё сямейства, але пасля прызначэння нада мною паліцэйскага нагляду я, не смеючы адхінацца з месца жыхарства, пазбавіўся даверанасцяў, а разам з тым не толькі жыццёвых сродкаў, але нават магчымасці выплачваць казённыя павіннасці.

Спадар менскі губеранскі маршалак, ведаючы маю добранадзейнасць, год таму распачаў хадайніцтва да звальнення мяне з-пад нагляду, аднак жа я не толькі не атрымаў гэтай літасці, але ў паліцэйскім стане, не ведаю, на якой падставе, не было нават даведак пра маю добранадзейнасць.

Цяпер надараецца мне даверанасць Каржанткоўскага, каб выпатрабаваць у розных месцах у законных копіях дакументы, якія адносяцца да ягонага паходжання, і за паданнем такіх у Амерыку, пры пасярэдніцтве міністра замежных спраў, павінен буду заняцца пошукам значнай спадчыны, пакінутай пасля дзядзькі ягонага, памерлага ў Філядэльфіі. Гэтая даверанасць не толькі зробіць магчымым збавіцца ад галоднай смерці, але нават цалкам палепшыць побыт майго сямейства.

Я, выклапатаўшы ў суседніх абшарнікаў даручальнае сведчанне і пасведчанне мясцовага станавога прыстава ў адсутнасці перашкод наведаць месцы, у якіх знаходзяцца патрэбныя мне па гэтай спадчыннай справе дакументы, вышэйсказанае даручальніцтва і пасведчанне станавога прыстава падаў сп. менскаму павятоваму спраўніку, просячы выдачы мне ў прызначаныя месцы гадавога пашпарта, а сп. спраўнік прадставіў маю просьбу на добрапашану вашай вяльможнасці,— у канцылярыі ж сказана мне, што ваша вяльможнасць прадставіце гэтую просьбу на дазвол начальніку края.

Я, не будучы ў стане доўга чакаць у месце вышэйшага дазволу, можна сказаць, маёй долі, да таго ж асцерагаючыся страціць выгодную даверанасць, прасіў сп. спраўніка забяспечыць мяне чатырохтыднёвым пропускам на праезд у м. Свянцяны ў чаканні далейшага дазволу начальнікам края выдачы мне гадавога пашпарта, але сп. спраўнік у гэтым мне адмовіў, загадаўшы чакаць рэзалюцыі вышэйшага начальства, а таму, будучы даведзены гэтай адмовай да вельмі невыгоднага становішча, прымаю адвагу турбаваць вашу вяльможнасць найпакорнай маёю просьбаю загадаць сп. менскаму спраўніку выдаць мне чатырохтыднёвы пропуск на знаходжанне ў сумежным павятовым месце Свянцяны.

*Памешчык калежскі рэгістратар*
*Вінцэнт Марцінкевіч*

*Студзеня 15 дня 1870 года*
*Жыхарства маё ў 1-й частцы горада Менска часова,*
*а сталае — Менскага павета 2-га стана ў сялібе Люцінцы*

# 17. ГАЛОЎНАМУ НАЧАЛЬНІКУ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЮ

Его высокопревосходительству господину главному начальнику Северо-Западного края

Помещика Минской губернии и уезда
Викентия Иванова Марцинкевича

## Прошение

Дряхлый 63-летний старец осмеливаюсь утруждать ваше высокопревосходительство всепокорнейшею моею просьбою, умоляя правосудия и милости вашей!

По причине дерзости моей дочери, жившей не при мне, и пронырства моих врагов, успевших оклеветать меня в 1863 году перед правительством, надо мною назначен был полицейский надзор, который не снят и поныне. Это обстоятельство заставило меня не отлучаться из места моего жительства. Хутор мой так мал и ничтожен, что единственным средством пропитания моего семейства было по 1863 год занятие доверенностями, чего я ныне, сидя дома, совершенно лишился, чем доведен до крайне бедственного положения.

Ныне дворянин Коржонтковский дал мне доверенность, которой копию при сем представляю, хлопотать о получении для него наследства в Америке, после умершего дяди его Генриха Коржонтковского, и тем дал средство исправить мое нищенское состояние.

Доверенность эта требует моей поездки в разные места, чтобы выхлопотать метрические выписи и прочие документы, доказывающие ближайшее родство моего верителя с умершим в Америке дядею. На таковую поездку нуждаясь паспорта, я, упросив соседствующих трех помещиков снабдить меня поручительством, таковое с удостоверением полиции о неимении препятствия к упомянутой моей отлучке в Царство Польское, губернии Виленскую и Ковенскую, а также и в столицу, просил его превосходительства г. минского губернатора [относительно] выдачи паспорта, но в сем мне отказано.

Такой необыкновенный случай исправления домашнего быта раз в жизни мне достался, то, желая оным воспользоваться, осмеливаюсь упрашивать ваше высокопревосходительство, приняв в уважение поручительство трех помещиков, которые ручаются за меня не только своим достоянием, но даже и личностью, а также удостоверение полиции о неимении препятствия к моей отлучке, разрешить мне выдачу годичного паспорта ежели уже не в С.-Петербург, то по крайней мере в Царство Польское, тоже в Виленскую и Ковенскую губернии, этим спасете почти от голодной смерти бедное семейство.

Ваше высокопревосходительство, будьте великодушный! Дозвольте мне заработать кусок хлеба! Поверьте, что я, при старости моих лет, и для себя желаю спокойствия, и моим поручителям не имел бы сердца причинить хлопот. Единственная цель моей поездки — выхлопотать законные документы, доказывающие ближайшее родство моего верителя с умершим в Америке его дядею, а вместе и наследство по нем, существующее в Американском банке, о чем многократно и газеты оповещали.

*Викентий Марцинкевич*

*Февраля 16 дня 1870 года*
*Жительство просителя Минской губернии и уезда 2-го стана в имении Люцынке*

Яго найвяльможнасці спадару галоўнаму начальніку Паўночна-Заходняга краю

Памешчыка Менскай губерні і павета
Вінцэнта Янава Марцінкевіча

## Прашэнне

Лядашчы 63-гадовы старча адважваюся турбаваць вашу найвяльможнасць найпакорлівай маёю просьбаю, умольваючы правасуддзя і літасці вашай!

З прычыны дзёрзкасці маёй дачкі, якая жыла не пры мне, і прайдзісвецтва маіх ворагаў, якія паспелі напаклёпнічаць на мяне ў 1863 годзе перад урадам, нада мною прызначаны быў паліцэйскі назірк, які

не зняты і дагэтуль. Такая акалічнасць прымусіла мяне не адхінацца з месца майго жыхарства. Сяліба мая гэтак малая і нікчэмная, што адзіным сродкам пракармлення майго сямейства да 1863 года быў занятак даверанасцямі, чаго я цяпер, седзячы ў хаце, цалкам пазбавіўся, чым даведзены да вельмі гаротнага становішча.

Цяпер дваранін Каржанткоўскі даў мне даверанасць, копію якой пры гэтым далучаю, клапатаць пра атрыманне для яго спадчыны ў Амерыцы, пасля памерлага дзядзькі яго Генрыха Каржанткоўскага, і тым даў сродак направіць мой жабрацкі стан.

Даверанасць гэтая патрабуе маёй паездкі ў розныя месцы, каб выстарацца метрычных выпісаў і іншых дакументаў, якія даказваюць найбліжэйшае сваяцтва майго даверніка з памерлым у Амерыцы дзядзькам. Патрабуючы на такую паездку пашпарт, я, упрасіўшы суседніх трох абшарнікаў забяспечыць мяне даручальніцтвам, такія з пасведчаннем паліцыі пра адсутнасць перашкоды да згаданага майго ад'езду ў Царства Польскае, губерні Віленскую і Ковенскую, а таксама і ў сталіцу, прасіў яго вяльможнасць сп. менскага губернатара адносна выдачы пашпарта, але ў гэтым мне адмоўлена.

Такі незвычайны выпадак наладзіць хатні побыт трапіўся мне раз у жыцці, таму, жадаючы гэтым скарыстацца, адважваюся ўпрошваць вашу найвяльможнасць, прыняўшы да ўвагі даручальніцтва трох абшарнікаў, якія пэўняцца за мяне не толькі сваёй маёмасцю, але нават і асабіста, а таксама пасведчанне паліцыі пра адсутнасць перашкоды да майго ад'езду, дазволіць мне выдачу гадавога пашпарта калі ўжо не ў С.-Пецярбург, то, прынамсі, у Царства Польскае, таксама ў Віленскую і Ковенскую губерні. Гэтым выратуеце амаль ад галоднай смерці беднае сямейства.

Ваша найвяльможнасць, будзьце вялікасэрныя! Дазвольце мне зарабіць кавалак хлеба! Паверце, што я, пры старасці маіх гадоў, і для сябе жадаю спакою, і маім даручальнікам не меў бы сэрца нарабіць клопатаў. Адзіная мэта маёй паездкі — выклапатаць законныя дакументы, якія даказваюць найблізкае сваяцтва майго даверніка з памерлым у Амерыцы ягоным дзядзькам, а разам і спадчына пасля яго, прыналежная Амерыканскаму банку, пра што і газеты шматкроць абвяшчалі.

*Вінцэнт Марцінкевіч*

*Лютага 16 дня 1870 года*
*Жыхарства просьбіта Менскай губерні і павета 2-га стана ў маёнтку Люцінцы*

# 18. ВЕЛІКОДНАЕ ПАСЛАННЕ СУСЕДЦЫ СКІНДЭРАВАЙ

*15 kwietnia*

Wielmożnej Pani Skinderowej
Pani i Dobrodziejce w Lucynie

Niech będzie pochwalony Jezus Chrystus!

Wprędce Chrystus z martwych wstanie!
Więc przy szynce i przy chrzanie
(Choć też gorzka nasza dola).
Niech się stanie Boża wola!
Przepędzimy święta wesoło —
Zwłaszcza gdy somsiedzkie koło
Nasze maluśkie, ubogie,
Hołdując nadzieje błogie
Niezbędnego zmartwychwstania,
Pełne szczerego wylania,
Przez braterskie, wdzięczne pienie,
Wywróży nam odrodzenie!
Stąd się wyradza oxioma taka:
Szlę wam chrzan gorzki — proszę o prosiaka!

Pięknej mojej nieprzyjaciółce i poczciwemu Fonsiowi braterskie winszowanie. Eugieńcia poruczyła mi napisać że Panny niegrzeczne — nie wiem dlaczego?

Łaskawej pani mój głęboki szacunek!

*[Sąsiad?] Marcinkiewicz*

*15 красавіка*

Вяльможнай іх міласці пані Скіндэравай
Пані і Дабрадзейцы ў Люцыне

Няхай будзе пахвалёны Езус Хрыстус!

Хрыста хутка ўваскрашэнне,
Дык пры шынцы і пры хрэне
(Хоць і горкая ў нас доля),
Хай жа стане Божжа воля!
Правядзём дні свят вясёла,
Асабліва калі кола
Наша ўбогае, малое
Спадзяецца скрозь на тое,
Што ўсё ж дзень змёртвыхпаўстання
Абавязкава настане
І праз брацкае збліжэнне
Выварожыць адраджэнне!
Скуль аксіёма выводзіцца гладка:
Шлю вам хрэн горкі — прашу парасятка!

Прыгожай маёй непрыяцельцы і пачціваму Фонсю брацкае віншаванне. Эўгеньця даручыла мне напісаць, што паненкі непаслухмяныя,— не ведаю чаму?

Ласкавай пані маё глыбокае шанаванне!

*Сусед Марцінкевіч*

# Пераклады



3.

Pāmiatniki Ateŕyžny, dziadōŭ nāszych wiēry!
Ach! – skōlkaż at kuyniēckaj, maskōŭiēckaj' niaŭlēry
Pahinuć mus! – janā to, biēć bajācźni Bōha!
Pawīdna ŭvāsaj ezēci; ŭdziēkuyecca vrōha!
Ta śpiawakā lasnōha nia kīnie źvaleni,
Ta dudarā lasōcka, ŭzlōb dūmaŭ u eiēni. –

3. Lictapada 1858. roku uvoŭnd pryjezdu
uryadnikaŭ ekśtrayźa Winceuty Marcinkieviź. –



# ПАН ТАДЭВУШ

*Дванаццаць шляхецкіх быліц*

*Напісаў АДАМ МІЦКЕВІЧ*

*Пераварнуў на беларускую гаворку*
*Вінцэнты Дунін Марцінкевіч*

ZIEMIANOM I KMIOTKOM
Z nad Dniepru, Dzwiny, Berezyny;
Świsłoczy, Wilii i Niemna
Tę Pracę orbaruje

*Tłumacz*

## Przedmowa Tłumacza

Powieść Adama Mickiewicza, pod tytułem *Pan Tadeusz*, malująca tak wybitnie charakter, obyczaje i zwyczaje naszych Litewskich Ziemian z czasów Napoleonowskich, kiedy już dzisiaj tłumaczy się na język Rossyjski,— dla czegożby Lud prosty, złączony towarzyskiemi ogniwy z Ziemianstwem, dla czegożby ta zaściankowa nasza Szlachta, której ojców zmarły Wieszcz w tak szlachetnej wyobraził tu barwie, a która, żyjąc w lesistej gdzieś zaciszy i nie posiadając sposobów do oświaty, wysłówia się, w domowem pożyciu, najczęściej ludowem

narzeczem,— dla czegożby, mówię, nie miała oznajomić się z obyczajami swych ojców?

Ta właśnie uwaga podała mi myśl przełożenia Pana Tadeusza na białoruskie narzecze.

Prace moje w tem narzeczu, mające na celu zachętę naszego kmiotka, toż biednej Litewskiej i Białoruskiej Szlachty do uczenia się, nie znalazły dotąd, oprócz kilku osób, sympatyi w tej zamożnej klasie społeczeństwa naszego, która, według Boga i sumnienia, najwięcej powinna się przyczyniać do oświaty ciemnej współbraci.

To też dzisiaj Pana Tadeusza, obleczonego przezemnie w chłopską siermięgę, ofiaruję Ziemianom i prostemu Ludowi z nad Dniepru, Dzwiny, Berezyny, Świsłoczy, Wilii, a w części i Niemna. Może też Lud ten, prostotą obyczajów zbliżony do matki natury, gorętszem sercem przyjmie podarek swojego dudarza,— który zamierzył pozostałe chwile swego istnienia poświęcić jedynie pracy, mającej na celu pożytek Jego duchowy.

*W. M.*

ПАНАМ і СЯЛЯНАМ з-над Дняпра,
Дзвіны, Беразіны, Свіслачы, Віліі
і Нёмана гэту працу ахвяруе

*Перакладчык*

## Прадмова перакладчыка

Аповесць Адама Міцкевіча пад назвай *«Пан Тадэвуш»*, якая так выдатна малюе характар, норавы і звычаі нашых літоўскіх гаспадароў у напалеонаўскія часы, ужо цяпер перакладаецца на рускую мову. Чаму б простаму народу, злучанаму сяброўскімі сувязямі з землеўласнікамі, чаму б тая наша засцянковая шляхта, бацькоў якой памёршы прарок намаляваў у такой высакародная форме, а якая, жывучы дзесьці ў лясным зацішшы і не валодаючы магчымасцямі для асветы, найчасцей выказваецца ў

хатнім ужытку народнай гаворкай,— чаму б, кажу, яна не магла азнаёміцца са звычаямі сваіх бацькоў?

Уласна гэтая заўвага натхніла мяне думкай перакласці «Пана Тадэвуша» на беларускую гаворку.

Мае творы на гэтым дыялекце, якія маюць на мэце заахвочванне нашага селяніна, а таксама беднай Літоўскай і Беларускай Шляхты да навучання, не знайшлі дасюль, апрача некалькіх асоб, прыхільнікаў у гэтых заможных колах нашага грамадства, якія паводле Бога і сумлення найбольш павінны былі б далучыцца да асветы непісьменных суайчыннікаў.

Таму сёння «Пана Тадэвуша», апранутага мною ў мужыцкую сярмягу, ахвярую Панам і простаму Люду з-над Дняпра, Дзвіны, Бярэзіны, Свіслачы, Вілii і часткова Нёмана. Можа, таксама Люд гэты, набліжаны прастатой звычаяў да маткі прыроды, з больш гарачым сэрцам прыме падарунак свайго дудара, што вырашыў апошнія хвіліны свайго існавання прысвяціць толькі працы, якая мае на мэце ягоны духоўны прыбытак.

*В. М.*

## Быліца першая

## ГАСПАДАРКА

### Што стаіць у быліцы

Паніч варочаецца дамоў.— Першая стрэча ў святліцы, другая пры стале.— Важная навука суддзі аб грэчносці.— Падкаморага разумная гаворка аб модах.— Пачатак спірання аб Кусага і Сакала.— Паследні возны трыбунала.— Узгляд на тагдашняе быццё Літвы і Еўропы.

Літва! — родна зямейка![1] Ты, маўляў, здароўе,—
Той цябе ашанцуе, каму безгалоўе!
Хто жыў калісь на ніўцы твaёй, як у раі,
І вось крывавы роніць слёзкі ў чужым краі!

Цяпер-то, як ты красна, я чую, я бачу
І апішу, бо горка ўсцяж па табе плачу!
Ты, Панна! што сцеражэш яснай Чанстаховы[2],
Што свеціш у Вострай Браме, што горад замковы
Навагродскі бароніш, яго народ жылы,
Як мяне ты падняла, маўляў із магілы
(Вось цябе бедна маці ў вачах са слязінай
Маліла, штоб апеку мела над дзяцінай,—
І з немачы падняўся,— і пайшоў у дарогу,
Што б у твоіх касцёлах падзякаваць Богу),
Так нас дзівам павернеш у зямельку родну.
Пакуль жа блісне шчасце, хоць душу нягодну
Звярні да гор лясістых, шырокіх пракосаў,
Што дыва́нам пры Немне свецяць з-пад нябёсаў,
Да ніў родных, калоссем ярка маляваных,
Залочаных пшаніцай, жытам пасрабраных,
Гдзе жоўтая свірэпка, гдзе грэчка бяленька,
Гдзе дзяцеліна гарыць, вось красна паненка;
А ўсё мяжой прыбіта, бачыцца устужкай,
Там-сям быццам к адзежцы прышпілена грушкай.

Меж такімі палямі, намесь, пры ручаі,
На узгорку невялікім, ў бярозавым гаі
Свяціў шляхецкі хорам, кругом дзеравяны,
Да на падмураванні, увесь пабяляны;
Тым бялейшы, што таполь спераду і збоку
Сцерагла ад сіверу у восень глыбоку.
Дом жылы невялікі, чысты на прыглядку!
Да зато гумно важна! пры нём стажкі ўжатку
Не стоўпілісь ў гарудах, пабачыш з намеку,
Відна, што ніўка — маці тутка чалавеку!
Відна з густых коп сена, што на сенажатца
Звёздачкамі мігаюць, з сох, што там бадзяцца
Па шырокіх палетках, проста чарназёму,
Каторы прылягаюць к беленькаму дому,
Узораных парадкам агародных градак,
Што там цвяцець дастатак, праўда і парадак.
Брама насцеж у будні дзянёк чы у свята
Кажыць, што гасцям рада гаспадарна хата.

І вось у каламажцы, запрэжанай парай
Конікаў невялікіх, пры закрутні старай
Паказаўся паночак відны, маладзенькі,
Абляцеўшы падвор'е, пад ганак маленькі
Заехаў, вылез з брычкі,— конікі, пад плотам
Шчыплючы буйну траўку, пацяглі к варотам.
У двары пуста, бо дзверы на зашчапку ўзяты
І калочкам заткнуты ад ганка да хаты.
Падарожны ў пякарню не йшоў распытацца,
Адчыніў — убег да дому — жадзён распазнацца.
Здаўна яго не бачыў — ў горадзе далёка
Браў на розум у панскіх навуках глыбока.
Убег — і вокам жадным на сцены старэнькі
Глянуў — да праслязіўся панок маладзенькі:
То ж стары прыяцелі! — той жа прыбор ў хаці,
З каторым дзіцем было так міла гуляці;
Да ўжо не так вялікі, не так, баш, прыгожы;
І тыя ж абразочкі глядзяць на свет божы!
Вось Касцюшка[3] у світцы кракаўскай, з вачамі,
Упёртымі у неба, дзержыць меч рукамі.
Далей ў польскай адзежцы Райтан[4], повен чэсці,
Што пацяраў край вольнасць, таскуе ў балесці;
Ў руцэ нож — к грудкам востра звернута старона,
А пры ім кніжкі: «Фадон» і «Жыццё Катона».
Там малады Ясінскі, прыгожы, што дзівы!
Тут жа Карсак[5], таварыш яго нешчаслівы.
Стаяць на валах Прагі, а маскалёў сіла
У копачкі смятаюць, аж паглядзець міла!
У маладзенькіх грудках удзельная атвага!
Рубяць, хоць аблілася агнём уся Прага!
Спазнаў ён той загарак, што грае быліцы,
У дзеравянай скрынцы, пры дзвярах святліцы,
І з радасцяй дзяцінай пацяг за шнурочак,
І пайшоў Дамброўскага[6] гудзець мазурочак.

Лётаў па цэлым доме — шукаў сваёй клеткі,
Гдзе весела зажываў у малады леткі.

Уходзіць. Дзіва! — зрэнкай водзіць па каморы,
То ж святліца кабецця — жаноцкі прыборы;
Хто ж бы тут жыў? бо дзядзька яго не жанаты,
А цётка піцербурскі залягла палаты.
То ж пакой не хмістрыні, вось і хвартап'яна,
На ім ноты і кніжкі — ўсё параскідана
У бязладдзі, да, бачыш, бязладдзе то міла,
Відаць, што маладзенька ручка натварыла.
Вось сукеначка бела із калочка знята,
Згатоўлена к убору, на крэсле распята,
А на вокнах дайнічкі, у іх розны кветкі:
Герань, ляўкоя, астры, пралескі, нагеткі.
Паніч стаў пры аконцы; то ж новае дзіва!
Пры беражку у садзе, гдзе расла крапіва,
Угледзеў агародчык, сцежкамі распяты,
Повен кветкаў, стракатай травіцы дый мяты:
Платок нізкі, ўзорамі воку прыглядаўся,
Стакроткамі, баш стужкай, ён падперазаўся.
Градкі свежа паліты шчодраю рукою,
Тут жа стаіць бляшана дайніца з вадою;
Толькі агароднічкі не бачыць ў дасадзе,
Выйшла на ніву: дзверцы калышуцца ў садзе.
Угледзеў на дарожцы слядок, як патычка:
Відна, што без панчошак і без чаравічка
Лётала па пясочку, бялейшым ад снегу,
Ледзь к зямлі прылягала ў вялікім бегу.

Падарожны стаў доўга ў раздум'і глыбокам,
Па ўсіх кутках садочка вадзіў блудным вокам,
Красным ліцом к пралескам жадна прылажыўся,
Разглядаў сцежачкі, усяму дзівіўся;
То прыляг да слядочка, што ўтаптаў дарожкі:
Чые ж бы там блудзілі дробненькія ножкі?
Неўзнарок глядзь угору! — ёсць чаму дзівіцца:
На плоце красна панна, у яснай спаднічца,
Снегавою сарочкай грудкі закрываець;
Паніч жадна на шыйку белу паглядаець.

Часам нашы літвінкі у гэтакім строю
Чураюцца ад хлопцаў ранняю парою.
То ж хоць ніхто не бачыў, ручкі залажыла,
Штоб свае лебядзіны грудкі лепш закрыла.
Волас ёй не развіты, звязан у вузёлкі,
Маўляў стручкі ў гаросе, бачыцца круцёлкі,
Дзіўна красіў галоўку, сонца там як меціць,
Здаецца, што карона на абразку свеціць.
Лічыка не пабачыш; цікавае вока
Меціла там за чымсьці у поле далёка;
Угледзела, засмяялась і ў далоні біла,
Вось бела птушка назем лёганька ступіла,
І сунула па градках сваю ножку скору,
І на досцы упала акном у камору,
Спяваючы, хваціла сукеначку ясну,
Пры люстры любавацца стала лічку красну;
То ж угледзела хлапца — із ручак упала
Сукеначка, са страху дзеўка бледна стала.
А як жарам, твар панка аблілась румяна.
Маўляў з соненькам хмара сустрэлася зрана.
Сарамлівы панічок далоньмі закрыўся,
Думаў штось ёй сказаці, толькі пакланіўся
І даў цягу ў куточак, а дзеўка дабыла
Крыкам голас няўнятны, маўляў штось прысніла.
Спужаўся падарожны, глядзь! — аж уляцела
Паненка,— толькі сэрца крэпка закіпела.
Сам не знаў, чы з спаткання таго смяяцца,
Чы радавацца сэрцам, аслі дзівавацца?

Аж там і на хвальварку народ дагадаўся,
Што новы госць пад хорам панскі прыбадзяўся;
Каней у стайню ўзялі, аўса, сена далі,
Ведама, у добрых паноў аб парадак дбалі,—
Бо суддзя не рабіў так, як цяпер бывае,
Другі ў карчму гасцінных каней адпраўляе.
Калі ж стрэціць не прыйшлось тут гасця нікому,
Не думай, што служылі кепска ў панскім дому:
Служкі чакалі, пакуль пан войскі[7] прыбраўся,

А той у садзе шчыра вячэрай заняўся;
Ён заступае пана — і як той не дома,
Прынімаець гасцей ён у панска харома
(Ведама, сваяк панскі, прыяцель ад сэрца);
Як забачыў ён гасця, пацяг у шпанцэрца
На хвальварак, штоб ў адзежку нядзельну прыбрацца
Бо не дзела ж так госцю ліха паказацца.
Ранкам яшчэ адзежку сумеў ён прымераць,
Бо ведаў, што з гасцямі прыйдзецца вячэраць.
Пан войскі спазнаў хлапца, раскрыжаваў рукі
І з крыкам абняў яго, цалаваў да мукі,
І гаворкай без ладу, парадку мянялісь,
Як бывае, калі вось доўга не відалісь.
А як войскі здаволі хлапца напытаўся,
Так зараз, што у дварэ, гаварыць узяўся:

«Добра, мой Тадавушку (так, бачыш, манілі
Дзецюка, бо Касцюшкі іменем хрысцілі
На памятку, што ў тую вайну ён радзіўся),
Добра, мой Тадавушку, што ты паявіўся
Дамоў ў пору, як дзяўчат многа тут бывае;
Пабачыш, табе дзядзька вяселле сыграе;
Ёсць з чаго выбраць, гасцей, баш снапоў ў гарудзе,
З'ехаліcь намесь судзіць у гранічным судзе,
Штоб з графам спор сумежны да канца прывесці;
Да і пан граф вось заўтра тут на месці;
Падкаморы[8] ўжо з'ехаў з дочкамі і жонкай.
Маладзеж пабадзялась у лес са стральбёнкай,
А старыя й кабеты жніва аглядаюць
І стральцоў там пад лесам весела страчаюць.
Пабрадзём, калі хочаш, а пэўна за гаем
І дзядзьку, падкаморых і дзяўчат спаткаем!»

Войскі з хлапцом, дарогай ідучы паволі,
Яшчэ нагаварыцца не могуць здаволі.
Соненька ж на западзе хоць менш дапякае,
Зато ярчэйшым вокам з-за гор выглядае,
Чырвоная,— вось калі шчыраю рукою

Гаспадар кончыў дзела вячэрняй парою,
Дый з ліцом, хоць па працы красней ад каліны,
Вясёл брадзе да ўласнай на спакой хаціны.
І паважны круг сонца з мутнымі лучамі
Спускаецца нязначна за бор, а снапамі
Туманнымі лес ўкола абняўшы высокі,
З бору, маўляў, стог сена творыць адзінокі;
І пачарнеў бор, кажысь вісельнік са страху,
І красіць над ім сонца, вось пажар на даху,
І схавалася за лес, бачыш, з-пад галіны
Там-сям блісне, як агонь ад тонкай лучыны,
І загасла; тут сярпы бразжаць перасталі,
Парабкі із пракосаў на плеч граблі ўзялі;
Сціхла у полі, бо гэтак прыказаў пан стары,
Штоб з канцом дня кончылі дзела гаспадары.
«Бог ведае, як доўга працаваці трэба;
Сонца, яго работнік, калі сойдзе з неба,
Тагды й мужык па дзеле павінен спачыці»,—
Так заўсёды пан добры прывык гаварыці;
А што суддзя прыкажа, то каману свята,
Бо і вазы, ў каторы дабро клалі зжата,
Варочаліс да гумна у лёганькай упражы,
Волікі ж радавалісь невялікай клажы.

Варочаліс із лесу вясёлы дружыны,
Да ў парадку: напярод малыя дзяціны
З дарэктарам, ту ж суддзя йдзе рука з рукою
З яснага падкамора добраю жаною;
За імі падкаморы, пасярод дарогі
З сваякамі ён важна стары суне ногі;
За старшымі паненкі, хлапцы тут жа збоку,
За паннамі, асталісь быццам незнароку
(Так следуе); ніхто там аб то не спіраўся
Дзеля парадку; свайго ўсяк места дзяржаўся,
Кожан таго парадку пільнаваў ў сароме,
Бо пан свяціў абычай стары ў сваём доме:
Навучаў ён заўсёды векам маладзейшых,
Штоб шанавалі вяльмож, кабет і старэйшых.

«Такім ладам,— гаварыў,— народ цвіце ў чэсці,
Загіне ён, і народ прападзе без весці!»
І прывыклі к парадку сваякі і служба;
Вось калі госць прыедзе, аслі панска дружба
Навясціць дамок суддзі, крыху там пабудзе,
Прывыкне да парадку, маўляў, як у судзе.
Каротка з братанічам суддзі павітаня:
Даў яму важна руку да пацалаваня
І, цмокнуўшы ў голаву, прыняў, вельмі рады,
А хоць нядоўгі рэчы вёў, дзеля грамады,
Да із слёз, баш, каторы рукавом кантуша[9]
Абцёр, відна, як любіў пана Тадавуша.
Усё за добрым суддзёю з ніў, лугоў і бору
Варочалась ахвотна да панскага двору.
Бляючы, куча авец ў вуліцу нясецца,
За імі туман пылу ўгору стаўбом ўецца;
Далей грамада цяліц з званочкамі скора
Бяжыць, пабрыкуючы, гдзе стала абора;
Там бачыш стада каней, што з пракосаў мчыцца,
Звярнула да каладца́, штоб вады напіцца;
Асвір жа пры калодцы скрыпіць безустанку.
Суддзя, хоць гасцей многа, прыстаўшы на ганку,
Ўсюды кіне вокам, пры каладцы́ стане,
Паглядзіць на аборку, аслі ў добрым стане,
Дазору таго служкам ніколі не зручыць,
Ведае ён, што панска вока каня тучыць.

У сенях возны[10] Пратазы разам войскі стары,
Стоючы са свечкамі, вялі ціхі свары:
Бо як войскі з панічом шоў гасцям настрэчу,
Возны сталы з вячэрай, там непадалечу,
Вынес у пусты хорам, што замкам[11] маніўся,
Каторы аж пад чорны лес бокам падшыўся.
Нашто ж то пераселле? — Войскі глядзеў крыва
І перапрашаў суддзю за такія дзіва,
Да ўжо трудненька рада ў гэтым бесталкоўі,
І суддзя вядзе гасцей у стары пусткоўі;
Па дарозе ўсцяж пану Пратазы то правіў,
Чаму процію войскага на сваём паставіў.

«У дварэ,— кажа,— ізбы цесны, баш у гарудзе.
Для гасцей і так важных выгады не будзе;
У замку сені вялікі, к дзелу прыдаліся,
Строп цэлы, а хоць сцены крыху разышліся,
Балоны хоць пабіты, да летам гадзяцца,
Скляпы блізка, ёсць службе гдзе там пабадзяцца».
Так кажа да на суддзю міргне — відна з міны,
Што змяніў ён парадак ля другой прычыны.

Са дваццаць соцен будзе шагоў вось ад хаты
Суддзінай, гдзе стаялі замковы палаты,
Відны сабой, вялікі,— дзядзіна Гарэшкі;
Апошні вотчыць згінуў ў народны замешкі,
А наліха ўсім дабром скарб распарадзіўся.
У бязладдзі апякун дый суд пажывіўся,
Якась злыдня прыйшлася й сваім па кудзелі,
А рэштай падзялілісь добры прыяцелі.
К замку ж ніхто не рваўся: нясметны выдаткі,
Штоб паддзяржаць будоўлю, патрэбны дастаткі
Не шляхецкі! — Трэба ж, граф, сусед недалекі
Суддзіны, пан багаты, як выйшаў з апекі,
Баш дзелам, што раднёю Гарэшкам маніўся,
І што ён па замор'і доўгі час насіўся,
І бачыў да замковых схожы там палаты,
Упадабаў пусткоўя лепш уласнай хаты;
А хоць суддзя бумагай даказаў там скора,
Што замак стаўляў муляр з Вільні, не з-за мора,
Да графу, як наліха, замак спадабаўся,
І суддзя да пусткоўя невесь чаго рваўся:
Пайшлі ўправа да земства, галоўна судзення,
У санат, зноў у земства, губерска праўлення,
Падняўшы ж труд вялікі і кошты бязлічны,
Вярнуліся нанова у суды гранічны.
Добра гаварыў Прataз: ў замку сені стары
Памясцілі б і гасцей і пісараў хмары —
Доўга сень, вось стадола, строп у кружок збіты,
На стаўбах, памост выслан каменнымі пліты;
Сцены не маляваны, да чысты у сені,

На іх віселі рогі сарні і ялені,
З надпіс'ю, гдзе забіты, ў якім паляванні,
Пад імі там шляхецкі значкі[12] у маляванні,
І ўсякі тут запісан, як, бачыш, маніўся,
Гарэшкаў знак, паўказы, аж пад строп узбіўся.

Госці ўвышлі парадкам, к сталу прыступілі,
Яснага падкаморага на кут пасадзілі;
Ведама, ён старэйшы і ў чыне, і ў веку;
Ідучы, ён кланяўся кожну чалавеку.
Пры ім квастар барнадын[13], далей суддзя трэці.
Барнадын памаліўся, выпіў да вашэці,
І мужчыны парадкам водку падавалі
І халадзец літоўскі моўчкам заядалі.

Тадавуш, як прыбылы, маўляў правам госця,
Высока сеў пры паннах, бокам ягамосця;
А памеж ім і дзядзькай пуста места стала,
Яно быццам кагосьці у тузе чакала.
Дзядзька часта на места дый на дзверы глянуў,
Чакаючы напэўна, сядзення не крануў.
І Тадавуша вока да дзвярэй бадзецца,
То нехаця к пустому сядзенню нясецца.
Дзіва! ўсе месты пры ём займалі дзяўчаты
Прыгожы, у шляхецтва і розум багаты,
Каралю на іх глянуць не было б сарому.
Да вока брадзе к месту нехаця пустому.
Загадкай то сядзення, ён любіць загадкі;
Ледзь прамолвіў славечка да суседкі гладкі,
Падкаморага дочкі, быццам мала цэніць,
Не лье вады у шклянку, тарэлкі не зменіць,
Забаўляць дзяўчат малвой забыў важну штуку,
Катораю б даказаў сталічну навуку:
Толькі пуста сядзення яго занімае —
Ўжо не пуста — бог невесь, каго там сажае.
Мыслі ў голаве скачуць няведаць якія,
Вось па дажджу ў пракосах жабкі маладыя;
Ў іх адзін расцвятаець образ, як пралеска,
Свежыць грудзь маладзеньку, баш раса нябеска.

Тут яму прыманілась, як шоў у святліцу
Пусту, глядзеў на кветкі, рабую травіцу,
То ізноў слядзіў мысляй маленькую ножку,
Што у садзе таптала беленьку дарожку;
І не смеў на строп глянуць, песціў думу шчасну,
Што пэўне там угледзіць сукеначку ясну,
Кручаны валасочак у стручкі маленькі,
На грудках лебядзіных ручонкі бяленькі.

Прыняслі трэця данння — стары падкаморы,
Як баш, служыць кабетам заўсёды быў скоры,
Падаў дочцы Разальцы крыху віна ў шклянцы,
А малодшай падсунуў агуркі ў бляшанцы
І сказаў: «Я паслужу вам, мае дачушкі,
Хоць стары і не згодзен, толькі да падушкі».
І кінулісь малады, усё, што там жыла,
У сораме дзяўчатам скора услужыла.
А суддзя срога глянуў вось на Тадавуша
І, закінуўшы набок рукавы кантуша,
Наліў віна дый кажа: «Другія звычаі
Цяпер у нас; шлём дзяцей у заморскі краі
Навучыцца чужога розуму глыбока,
Да шкода! — не пільнуе іх бацькава вока.
Даўней панам вучыці шляхту было ў модзе,
Я сам лет дзесяць служыў пану ваяводзе[14],
Бацьку яснавяльможна пана падкамора»
(Кажучы, пакланіўся ён вяльможу скора).
«І, як служыць народу, вучыў ён намекам,
Не выпусціў з апекі, зрабіў чалавекам,
Памяць яго у сэрцы — да Страшнага Суду,
Павек за яго душу я маліцца буду.
А калі ж я, служачы, чыноў не дабіўся,
Зато шанаваць старшых, кабет навучыўся;
Грэчным быць — то навука бачыцца нямала,
Бо штоб нагою скробнуць, не ў тым сіла стала.
Не ў тым, штоб выскіляцца зубамі красіва,
Навука та прыгожа ля купецка жніва.
Усім следуе грэчнасць, да ўсяку іначай:
Інакшая павіннасць грэчнасці дзіцячай,

Друга мужа для жонкі пры людзях і пана
Для служак — словам, розна ля ўсякага стана;
Трэба доўга вучыцца, штобы не зблудзіці
І кожнаму парадкам чэснасць учыніці;
І старыя вучылісь: панскія гаворкі,
То быліцы у краі, а ў шляхецкі дворкі
Як з'едуцца саседы,— да белага свету
Гамоняць — то быліцы сваяго павету.
І што ўсе яго знаюць, кожан шляхціц чуець,
То ж кожан чэсць высока сцеражэць, шануець.
А цяпер не пытайся, з каго ён радзіўся,
Адкуль прыйшоў, як жыве дый з кім ажаніўся;
Вось калі не даносчык, калі не ў сярмязе,
З чэсцію прынімаюць яго ў кожным разе».

Так кажучы, павёў ён ўкруг вочы цікавы,
Бо хоць праўдай свяцілі старага расправы,
Да ведаў, што маладзеж то не спадабае,
Калі хто хоць разумну, да доўгу рэч мае.
Але ўсе у раздум'і слухалі глыбокам;
Суддзя падкаморага папытаўся вокам,
Падкаморы і маўчаў, да відна ж то была,
Што такая рэч суддзі вельмі яму міла.
Змоўкнуў суддзя, ён ківаў яшчэ галавою,
То ж суддзя налье чаркі шчыраю рукою
Дый цягне зноў паважна: «Грэчнасць — рэч не мала;
Вось калі ўсяк спазнае, як каму прыстала,
Шанаваць чалавеку чэснасць, век і чыны,
Сам сябе ашанцуе дзеля той прычыны;
Калі часам хто сваю вагу хоча знаці,
То на праціўну важку звык каго сажаці;
Бардзей жа маладыя павінны вучыцца,
Як чэсна з кабетамі трэба абхадзіцца,
Кабетамі, каторых род яснавяльможны,
Каторых чэсць вяліка, абычаі збожны.
Так вязалісь жанідбай, шчасна зажывалі
Маладыя — бацькі нас гэтак навучалі,
І дзеля...» Тутка стары на братанка гляне,

Відна, срогу навуку казаць яму стане.
Штоб перабіць гаворку, кончыць дзядзькі свары,
Вось скрыпне табакеркай падкаморы стары
Дый кажа: «Суддзя мілы! — ой! — даўней горш была,
Бачыцца, што й нас мода лепшымі зрабіла.
Чы малады кінулі прыхаці нягодны?
Я помню то няшчасця, як у край наш родны
Набяжаў дур пранцузкі, маўляў бурна туча,
Як панкі маладыя, баш нехрыстаў куча,
Адчураліся Бога, пайшлі блуднай сцежкай
Дый узгардзілі праўдай, польскаю адзежкай.
Жалосна было глядзець на малакасосаў,
Як шваргаталі носам, а часта без носаў,
Як заморскі пісулькі ўсюды разнасілі,
К новым законам, веры, адзежцы манілі,
Як здзекавалась хмара над народам знаці,
Бо Гасподзь, калі хоча край які скараці,
Адбярэ пярвей розум у сваім Страшным Судзе!..
І пацяглі разумных за нос дурны людзе.
Спалохаўся іх народ, маўляў джумы страшнай,
Бо пачуў ў сабе зарад немачы няшчаснай;
На панічыкаў модных усюды крычалі,
Самі ж веру, гаворку, адзежку мянялі.
Было то зло распуцця, вяліка сваволя,
Па каторых прыйшоў к нам страшны пост — няволя!

Помню, яшчэ дзіцяцяй бадзяўся па свеце,
Калі да бацькі ў Ашмянскім павеце
Прыехаў пан падчашыц[15] у вазку пранцузску,
Ён першы зашваргатаў не па-беларуску.
Першы ён ўвёў ў Літву заморску гаворку.
Ўсе завідывалі, к катораму дворку
Засхала двукольна бяда, чы драндуля,
Катора па-іхняму звалась карыюля.
За лякаяў дзве малы сталі сабачонкі,
На козлах сядзеў мемец, як дошчачка, тонкі,
Жураўліныя ногі, бачыцца дзве тыкі,
У панчошках,— з пражкамі яго чаравікі,

На галаве чужыя воласы і з мехам;
Старыя дзівіліся чучалу са смехам,
А мужыкі хрысцілісь і шапталі ціха,
Што ў вазку заморскім ванэцкая ліха.
Сам падчашыц быў пахож спераду і збоку
На заморскую малпу аслі на сароку.
Чужы волас каўтуном на галаве віўся,
Трасяні — пылок з мукі пад сам строп узбіўся!
Калі ж хто тагды й думаў, што адзежка польска
Прыстоіць чалавеку ляпей, як заморска,
То маўчаў у куточку, бо паны крычалі,
Што вучыцца розуму мы сваім мяшалі.

Пан падчашыц усёды пушчаў таку гадку,
Што новага розуму, заморску парадку
Землякоў вучыць стане. Вось хітрасці поўны,
Выдумалі пранцузы, што ўсе людзі роўны.
Дзіва! — то ж стаіць аб тым ў божым прыказанні,
І ксяндзы вясцяць аб тым на ўсякім казанні.
Навука даўна, толькі слухаць штоб ахвота,
Да быццам на ўсіх пала курына сляпота:
Што толькі у пранцузскім пісьме ні стаяла,
Хоць дзела найстарэйша, веры не імала.
Вясціў падчашыц роўнасць людзям,— сам назваўся
Маркізам,— баш чын такі у модзе казаўся;
Як жа з летамі чыны выгналі з Парыжа,
Ён чалавекам вольным хрысціўся з маркіза,
Далей за Напалёнам, ўсёмагучым панам[16],
Із-за мор'я прыехаў якімсьці баранам[17].
Што б пажыў больш на свеце, барана б чураўся
І вольным чалавекам зноў ахвотна б звaўся.
Бачыш, торгам на моды у замор'і жылі,
А што пранцуз уздумаў, палякі любілі.

Дзякуй богу, што прайшла ў нашай маладзежы
Ахвота лётаць за дом па модны адзежы,
І чужога парадку ў купцоў дабівацца,
І па шынках заморскіх мовы навучацца.

Бачыш, цяпер Напалён, як наліха, скоры,
Не дае часу гнацца па модны узоры;
Цяпер ваяваць мода! — а нам сэрцы б'юцца,
Што ізноў аб паляках гутаркі нясуцца.
Ёсць слава! — тож ускрэсне і Рэч Паспаліта[18]!
Стане вольнасць, як зямля вайной будзе сыта.
Толькі ж маркотна, што й мы разам не працуем,
Аб сваіх і вестачкі добрай не пачуем;
Ах, чакаці! — а сэрца рвецца па навіну.
«Отча Рабаку! — ціха кажа барнадыну.—
Чуў я, што із-за Нёмна меў, вашэ, бумагу.
Скажы аб войску нашым яку вестку благу!»
«Нічога,— кажа ціха Рабак да грамады
(Відна, што той гаворцы не вельмі быў рады),—
Палітыка[19] нудой мне; а калі з Аршавы
Грамату меў якую,— то вось дзеля справы
Барнадынскай,— расказы аб тым не цікавы,
Ёсць тут людзі — ім не ў смак гэтакія стравы».

Так кажучы, ён крыва зіркнуў ў куток столу,
Гдзе маскаль Рыкаў вядзе гаворку вясёлу.
З салдатамі ён блізка двара меў квацеру,
Добры суддзя і яго клікнуў на вячэру.
Рыкаў, баш, па-маскоўску шчыра к ядзе браўся,
Пачуўшы ж аб Аршаве, вось як абазваўся:

«Ой, пане падкаморы! — вы усе цікавы
Весці аб Банапарце[20] — вам, баш, да Аршавы,
Вам хочыцца атчызну[21] бачыць ў вольным быці!
Я хоць маскаль, да аб тым не стаў данасіці.
Вы паляк, а я рускі,— цяпер не ваюем,
Ёсць перамір'я, так мы весела піруем.
Часта і з пранцузамі, стоючы на стражы,
П'ём гарэлку, а вяляць — скачы, сыне ўражы!
Мужыцка прыгаворка кажа, штоб, як душу,
Любіць жонку, а трасці яе, маўляў грушу.
Я кажу, будзе вайна — да Плута маёра
Ад'ютант штаба прывёз указы заўчора

Гатовіцца к паходу. Пойдам чы на турка,
Чы пранцуза,— Банапарт цвёрдая то скурка!
Без Суварава згрызці яго — трудна справа!
Кажуць, з пранцузамі будзе ліхая расправа!
Банапарта — то знахар! — да і наш Сувараў
Чараўнік; то ж былі бы чары процію чараў.
Раз на вайне Банапарт загінуў — ні знаку!
Перакінуўся ў ліса, Сувараў — ў сабаку.
Як дапёк Банапарту, той катом хрысціўся
Дый дзярэ! — баш! — Сувараў ў кусага змяніўся;
Што б было...» (Тут гаворку Рыка перабілі.)
Ўняслі чацвёрта данння — дзверы расчынілі.
Ўходзіць якаясь пані, малада, прыгожа,
Яе румяна лічка вось цвяціста рожа!
Багатае убранне усе аглядалі,
Усе, кром Тадавуша, паклон ёй аддалі.
Тоненька, як тычынка, грудкі баш тачоны,
Сукеначка багата, цвет крэпка чырвоны,
Каўнерык павуцінай бачыўся здавацца,
Веяла чымсь на лічка, штоб прахаладацца
(Хоць не было гарача), да веер злачоны
Рассыпаў яркі іскры на усе староны.
Галоўка без чапочка, ў кружкі волас звіты,
У стужачкі, баш дзіця у пялёнкі, спавіты;
Пасярод брылянтова шпонка біла ў вочы,
Блішчала, баш звёздачка блішчыць сярод ночы.
На вяселле, здаецца, убралась; шапталі,
Што такое ўбранне на баль толькі клалі.
Хоць каротка спаднічка — ножак не ўказала,
Бо па зямлі бягучы дробненька шагала,
Як лялечкі батлейны у Божа нараджэння
Паказываюць хлапцы на увесяленння.
Штоб пустое мясцечка заняць там бяспечна,
Бягучы, кланялася сюды-туды грэчна;
Трудна ж было дабіцца, бо праход занялі,
Лавы дый крэслы з гасцьмі у два рады сталі.
Чы лаўку пераскочыць, чы сядзення цэла
Рушыць з места,— да яна ўбіцца там умела

Памеж стала і гасцей, як галачка мала,
Круцілась сюды-туды — аж пры месце стала;
Вось толькі па дарозе кагось зачапіла,
Спёрлась на Тадавуша дый перапрасіла,
Пасля на крэсле сваём лягонька прысела
Тут жа меж хлапца, дзядзьку,— нічога не ела:
Часам махне веерам, з чараном гуляе,
Часам дарагі каўнер на грудках спраўляе,
А часам белу ручку пад стужачку садзіць,
Штоб паглядзець убрання, галоўку прыгладзіць.
Гаворка там, унята дзеля кабяціны,
Парадкам завязалась зноў памеж дружыны;
І пайшлі кругом суды, громка распраўляння
Дзеля сягодняшняга ў лесе паляванння.
Ацэсар там з раентам[22] спор вялі упарты,
Заеліся аб свае праслаўныя харты:
Раент крычаў, што яго Кусы зайца згладзіў,
Ацэсар — што з шараком яго Сокал зладзіў.
Да людзей пайшлі на суд,— і усе дакола,
Адны бралісь за Куса, другі за Сакола:
Адны дзеля знахарства, другія баш сведкі;
Суддзя ціханька шапнуў да сваёй суседкі:
«Даруй, сястра, што цябе з вячэрай не ждалі,
Думалі, што не прыйдзеш, а прагаладалі».
Так кажа, падкамора чарку налівае
Дый аб навінах ў краі ціха распраўляе.

Калі така гаворка укруг стала ходзіць,
Тадавуш з кабяціны і вачэй не зводзіць;
Успомніў аб то места, залатыя гадкі,
То ж мела быць сядзенне яго ненаглядкі!
Прыпомніў — і сярдзечка моцна закіпела!
Шчасліва развязалась та загадка цэла;
Відна ж, то Бог прызначыў, што пры яго боку
Прысела та пралеска, што бачыў у памроку.
Праўда, здаецца, ад той вышша ростам стане
Да ўбрана, а людзей змяняе убранне;
Волас у той казаўся ясна-залачоны,

А у суседкі кручы і доўга спляцёны;
Пэўне, ту перамену соненька зрабіла,
Бо красней пры западзе, здаецца, свяціла.
Лічка той не дагледзеў сумеркам учора:
Як мігам паказалась, так уцякла скора;
Думаў, што прыкідаліс углям яе вочкі,
Маўляў вішанькі — губкі, баш малако — шчочкі.
І у суседкі схожы губкі, шчочкі, вока.
Што ж, гэтай век, здаецца, старэйшы далёка?
Агароднічка, кажысь, дзяўчоначка мала,
А суседка у лятах крэпка даспявала;
Да маладзеж аб гады кабет не пытае,
Каторая прыгожа, та і маладая.
Дзецюку яна векам равейніцай ймецца,
Нявіннаму кабета паненкай здаецца.
Тадавушу хоць дваццаць лет ужо даспела
І у Вільні вясёлам правёў жыццё цэла,
Ксяндза меў дарэктарам; той пільнаваў срога,
Не папускаў на кепства, вучыў хваліць Бога,
І малады Тадавуш ў сваю зямлю родну
Прывёз сэрца нявінна, душу чысту, годну;
Да ведама ж, малады розум — не дзівота!
На сяле пагуляці прыспела ахвота.
Ведаць, што прыгож сабой, малады дый крэпкі,
Што зваўся ён Сапліцай, Сапліцы ж не злепкі —
Яны мужчыны цвёрды — сільны маюць рукі,
Да жаўнеркі ахвотны — тупы да навукі.

Тадавуш ад праатцоў сваіх не чураўся,
Дзельна на кані ездзіў, пехты не баяўся
І туп не быў, хоць з кніжак не вучыўся пільна,
Хоць дзядзька за навукай яго глядзеў сільна;
Ён лепш рваўся да стрэльбы, з шабляй рад гуляці,
Ведаў, што да ваячкі яго мелі гнаці,
Што така ў тастамэнце стала бацькі воля,
Гнаўся мысляй за бубнам, седзячы у школе;
Да дзядзька змяніў волю бацькаву да разу,

Вялеў прыехаць дамоў у сваём прыказу,
Учыцца гаспадаркі пакуль да вяселля,
Пакуль багата сяло дасць на наваселля.

Пагляд на Тадавуша, шчасны віды гэткі,
Манілі блудныя мыслі прыгожай суседкі,
Прыкінуўся рост хлапца цікаваму воку,
Абліла ўзглядам жадна яго грудзь шыроку
І па твары блудзіла,— тая вось гарэла,
Як толькі яе вока ў пралёце сустрэла.
Ён прыгожай суседкі ужо не баяўся,
Наліха, баш, з ахвотай у лічка прыглядаўся.
Дай яна прыглядалась,— вось чатыры зрэнкі
Гарэлі, баш звездачкі на небе маленькі.
Найперш з ім па-заморскі стала шваргатаці,
Ведама — прыбыў з места, аб чым жа пытаці?
То ж пусціла гаворку аб кніжках разумных,
Аб пісарах тых кніжак дый аб людзях умных;
Што ж — як пайшла шчабятаць зноў аб маляванні,
Аб музыцы, аб разьбе, далей танцаванні!
Паказала, што знае ўсе прыгожы штукі.
Дзіва ж! — хлапец, змякнуўшы вялікі навукі,
Перад кабетай аб свой розум пабаяўся,
Маўляў, стаіць дарэктар,— краснеў, заікаўся.
Ладам, што той дарэктар прыгожы, не строгі.
Уняла з ім гаворку дзеля той дарогі,
Павяла другой сцежкай: вось аб сельскім быцці,
Якой шукаць забавы ў невясёлым жыцці.
І Тадавуш смялейшы павёў разгаворы;
Не прайшло паўгадзіны, з кабяцінай скоры
Пусціліся у жарты, пачалі спірацца;
Суседка да дзецюка пайшла заляцацца:
Ставіла тры галачкі,— бліжэйшу на долю
Хваціў,— а падкамора дочкі, на сваволю
Таку гледзя, моршчылісь, быццам змагла колька;
Суседка ж не сказала, хто ў той галцы, толька
Засмяялась уголас дый пачырванела,
Маўляў красна малінка на сонцы даспела.

Інакша ў другім канцы стала йдзе забава,
Там, бачыш, пайшла гарэй Сакаліна справа.
На ахвотных да Куса ўсе угрунь усселі,
Завязаўся спор дзелам, аж яды не елі.
Гоман вялік, усякі як не ўверадзіўся;
А страшэнна пан рэянт зацецеравіўся,
Як пайшоў такаваці, такаваў без меры,
Знакамі даказваў свае мовы шчэры
(Балеста баўбатуном зваўся меж суддзямі,
І для таго страшэнна махаў ён рукамі).
Цяпер яны пры баках, узад локці выгнуў,
Вось з-пад плячэй рукамі дый ногцямі спрыгнуў,
Паказуючы такім знакам хартоў змычку,
Прылёг на стол дый крыкнуў, бачыцца ў наклічку:
«Выжга! — пусцілі разам з ацэсарам змоўна,
Вось два замкі шчоўкнулі з дзвюх стральбочак роўна.
Выжга! пайшлі,— а заяц струной ў поля мчыўся,
Сабакі тут жа». (Раент пальцамі насіўся
Па стале — баш сабачы паказываў скокі.)
«Сабакі тут жа, пад лес гналісь недалёкі;
Сакол, нечага казаць, знахар на то дзела,
Выцягся перад Кусым на далоння цэла;
Ведаў я, што спудлуець,— зай, цікун вялікі!
Чгаў, быццам проста ў поле,— за ім усе смыкі;
Цікун шарак! — як пачуў, што ў кучы сабакі,
Пстрык управа, даў казла — за ім глупы сакі,
А ён ізноў налева ударыць два сусы,
І сабакі налева. Зай у лес! Мой Кусы —
Цап!!» — Так раент дабываў сваю мову звонку,
Дый на другу ён стала ўзабраўся старонку
І то «цап» Тадавушу над вухам як крыкне!
Ён дый суседка к крыку такому не звыкне;
Спадтайка, перапугам вялікім абліты,
Адчурылі галоўкі свае ў кучу збіты;
Маўляў вярхі дзярэўя, к сабе пахілёны,
Развеяў вецер; рукі ж, пад сталом спляцёны,

Ледзь у такой прыгодзе расплясцісь успелі,
А два красныя лічка больш пачырванелі.

Тадавуш, штоб не здрадзіць сваёй няўвагі,
Такой гаворкай з сябе дабываў адвагі:
«Кусы відны! — у полі, баш віхар, нясецца,
А калі ж ён да звера дзельна так бярэцца...»
«Бярэцца! — то ж сабака, якіх у свеце мала!»
Тут падаспеў Тадавуш, як бачыш прыстала,
Хваліў, што без нароваў,— знахар ў сваём дзеле,
Жалаваў, што не бачыў, як зайца ён змеле.
Аж задрыжаў ацэсар — пусціў з рук кялішак,
Глянуў на Тадавуша, маўляў базылішак[23].
Ацэсар не крыкала, дый не так рухлівы,
Ад раента ў рост нізшы, ў славах не так жывы,
Да на сабраннях усім даваўся у знакі,
Язык меў ядавіты, баш жала вужакі.
Так разумны ён слаўца умеў падпускаці,
Што смела ў календары можна іх спісаці;
А ўсе злосны вяліка. Меў долю багату,
Цэлую бацькаўшчызну, дый што ўзяў па брату,
Прапусціў вось чэраз сіта, на вялікім свеце.
І прыняў службу царску у сваём павеце.
Любіў ён паляванне, раз дзеля забавы,
То ж звонкі голас трубкі — вялікі аблавы,
Прыпаміналі яму гадкі маладыя,
Калі меў стральцоў дзельных, сабакі удалыя.
Цяпер меў пару хартоў із цэлай адправы,
І аднаму з тых сабак унімаюць славы!!
Дый трэба ж дагадацца, што і Талімена,
Маўляў камень на сэрцы,— кахаўся страшэнна!
Зліўся, што з кабяцінай кепска ідзе справа,
Згадаў, што лепш з другімі міла ёй забава.
Вось падходзіць, гладзячы вусы самавіты,
Засмяецца, а смех той вельмі ядавіты,
І кажа: «Акадэм'ю[24] слаўну Вільна маець
Да аб сабаках яна там не навучаець.
Друга аб іх ў Аршаве, Кракаве[25] гаворка

І на сяле. Вучыць нас стара прыгаворка:
Як без хваста сабака, так шляхціц без чына;
Хвост сабацэ да бегу нямала прычына,
А пан хваліш сабаку, што без хваста ходзіць.
Няхай цётка панская суд памеж нас зводзіць.
Хоць пані Талімена жыла у сталіцы
І намесь засвяціла ў нашай акаліцы,
Да суд ёй аб ахвоце праўдаю засвеціць,
Бо навука з летамі ў адно з сабой меціць».

Хлапцу, на каторага неўзнарок напала
Така граза, са злосці гаворкі не стала.
Глянуў на ацэсара — да кулакоў скоры,
Шчасцям, вось кіхнуў моцна стары падкаморы.
«На здароўя» крыкнулі,— той, з паклонам, слухаў,
Забубніў у табакерку, табакі панюхаў;
Табакерка ж ў брылянтах, золатам свяціла,
На ёй кароль Станіслаў[26] прыглядаўся міла.
Падкаморага бацьку кароль ссудзіў ў дары,
Па бацьку яе хаваў падкаморы стары.
Як забубніць, дае знак, што гаварыць будзе;
Усе замоўклі, ціхасць, баш на Страшным Судзе,
Ён кажа: «Шляхта, браты, мае дабрадзеі!
Судзіцца аб сабакі следуе у кнеі.
Ладна ж спірацца дома, гдзе гарыць забава?
На заўтра аб то дзела ў адклад ідзе справа;
Я дальш спірацца добрым людзям не дазволю:
Возны! абвясці указ да заўтра, у полю.
Заўтра і граф з стральцамі тутацька прыедзе,
І Вашэ пойдзеш з намі, суддзя, мой суседзе!
І пані Талімена, панны і кабеты —
То ж будзе паляванне слаўна на ўсе леты!
І войскі, калі на то ахвоту пачуе»,—
Так кажа — і старага табакай частуе.

Войскі, сідзя на вострым канцы, меж стральцамі,
Моўча вадзіў па сені блуднымі вачамі,
Хаця яго й пыталі, які ў тым суд, воля,
Бо пан войскі то місцюк вялікі да поля!

Да ён важна той справы у раздум'і слухаў,
Доўга важыў у пальцах табаку — панюхаў
Дый чхнуў — аж сцены стары укруг затрасліся,
І такі з яго губы рэчы панясліся:
«Мой Божа! яка ж туга на мяне напала;
Што бы грамада стральцоў старэнькіх казала,
Пачуўшы, што вяльможы і шляхецкі сыны
Вядуць гарачы споры аб сабак хвасціны?
Стары Райтан, штоб ажыў,— на таку навіну
Вярнуўся б да Ляховіч ў сваю дамавіну.
Штоб сказаў Несялоўскі, ваявода даўні[27],
Каторы й цяпер дзержыць сабакі праслаўны,
І сотні мае стральцоў абычаем панскім,
І сотні вазоў сеці ў замку Варанчаньскім,
Да сядзіць адзінокі дома, на дзівоту;
Ніхто, баш, не прыманіць яго на ахвоту.
На такое мысліўства ён дзеля сарому
Белапятровічу даў адказ самому.
Вяліка ж чэсць для пана так багатай долі
За шараком бадзяцца па шырокім полі?
У старыну за зверам грубым паны гналісь,
Бо дзік, мядзведзь то штукі шляхецкія звалісь,
А звер без клоў, без ногцяў, пуглівы, пакорны,
Наравіўся мужыкам дый чалядзі дворнай.
Ніхто бы там із паноў не ўзяў стрэльбы ў рукі,
Тонкім шротам набітай, на малыя штукі.
Праўда, дзяржалі хартоў для дзяцей забавы,
Штоб панкоў маладзенькіх ўпраўляць да аблавы,
Да бацькі не хацелі, баш, і падзівіцца,
Не то штоб яшчэ мелі аб кепства сварыцца.
Дзеля такой прычыны ясне падкаморы
Прабачыць, што прыказу слухаць я не скоры.
У жыцці маём цэлам прысяг я душою —
На такую ахвоту не крануць нагою.
Завуся я Грачэхай,— ад караля Леха
Ні адзін за зайцамі не гнаўся Грачэха!»

Маладыя смяялісь з войска за абедам,
Пасля ад стала ўсталі, падкамора следам,
Следуе та увага важну чалавеку:
Ён старшы і па чыну, старшы і па веку.
Ідучы, ён кланяўся ўсякаму па чыне,
За ім квастар, а суддзя шоў па барнадыне.
Падкаморага жонцы суддзя пры парозе
Падаў руку дый павёў у двор па дарозе.
Тадавуш Талімену, ацэсар Крайчанку,
Раент на канцы павёў войску Грачашанку.

Тадавуш з маладымі пайшоў да стадолы;
Зол страшэнна! — на душы вельмі невясёлы.
Што было — занімалі яго мыслі гэткі,
Вось спаткання, вячэра пры баку суседкі.
Ой! — прыкра ж слова «цётка» яму каля вуха
Усцяж бурчала, здаецца паганая муха:
Хацеў бы у вознага лепей распытацца
Аб Талімене, да, баш, не мог з ім спаткацца
І войскага не ўгледзеў,— той дзеля парадку,
Штоб гасцям даць выгаду, прапаў не ў аглядку,
Паброў дагледзець службы, штоб пасцелі слалі.
Старэйшыя, кабеты у будынку спалі,
А маладых Тадавуш, па дзядзькавай волі,
Вёў на сена, штоб маглі спачыці здаволі.

У дварэ ўсё прыціхла — бачыцца, не жылі,
Маўляў званы ў кляштары на пацер званілі;
Толькі стоража голас часам адазваўся;
Спалі ўсе, адзін суддзя заснуць не пытаўся.
Галава гаспадаркі, ладзіў ён адправу
У поле, заўтрашнюю для гасцей забаву.
Даў прыказы кому, войтам і гуменным,
Пісарам, ахмістрыні, стральцам і стаенным,
Далей з падзённікамі сумеў расшчытацца,
Урэшце сказаў вознаму, што хоча праспацца.

Возны адвязаў пояс слуцкі, увесь літы[28],
Пры ім вісяць кутасы вялікі, баш кіты,
Зверху, золатам шыты, блішчаць кветкі лоўкі,
Навыварат серабро да мяккія шоўкі.
Такі пояс завяжаш на старонкі обе —
Залатую у свята, чорну у жалобе.
Сам возны сумеў ладзіць з поясам прыборку,
То ж яго адвязаўшы, кончыў так гаворку:
«Што ж злога, што перанёс я сталы да замка?
То ж нам карысць, а ўрагам запала ўжо клямка,
Бо, калі аб той палац з графам суды водзім,
Мы цяпер у дзяржання праўна яго ўходзім.
Хоць брытаном праціўнік з намі заядаўся,
Дакажам, што той палац за намі астаўся;
Вось калі хто ў замку гасцей прынімае,
Рэч пэўна, што то менння сваім уважае:
Саміх жа праціўнікаў зазавём у сведкі.
Помню — за маіх часаў былі справы гэткі...»

Заснуў суддзя, і возны цішкам шоў у сені,
Сеў пры свечцы, кніжачку выняў із кішэні,
Каторую шануе, як малітвы Богу,
Катору носіць з сабой дый бярэ ў дарогу.
Спісан там трыбунальскіх спраў ляестр вялікі[29],
З катора узымаліс па парадку клікі:
Простым людзям то прозвішч ляястровы карты,
Вознаму — то па працы гарэлкі паўкварты.
То ж чытаў у задум'і: Агінскі з Візгірдам,
Дамініканы з Рымшай, Рымша з Вышагірдам,
Радзівіл з Варашчакай, Гейдрайц з Радалтоўскім,
Абуховіч з кагалам, Юрага з Пятроўскім,
Малеўскі з Міцкевічам; тут і граф ўпісаны,
З Сапліцаю. Чытае, і думы каханы
Вядуць яго у той час, як справы вялікі
Судзіліс ў трыбунале,— чуе свае клікі,
Бачыць сябе ў кантушы, у жупане белым,
Як важна — «прыціхніце» — крычыць горлам цэлым.

У тых думах, пацеры шэпчучы памалу,
Заснуў паследні ў Літве возны трыбуналу.

Такія, пры ахвоце, справы ў прошлы лета
Вялі ў ціхім дварэ,— калі рэшта света
Залівалась слязамі (кажа гадка стара).
Бачыш, той муж вялікі[30],— яго палкоў хмара,
Ўзяўшы з сабой ваенны арлы залатыя,
Разам з сярэбранымі, у краі чужыя
Беглі із пушч Лібійскіх пад Альпы высокі[31];
Іх громы заляталі ў зямелькі далёкі,
Гдзе стаўбы каменныя старчаць па заморы,
Што піраміды звуцца,— роўна ж пры Таборы,
Пры Марэнга, Аўстарліц, Ульм войска навала
Шла гразою на поўнач дый пры Немне стала.
Адбіла, баш ад сцяны, іх сіла Маскоўска,
Катора бараніла берага літоўска,
Страшней вось ад заразы Маскве весць такоўска.

Часам і спадзе вестка, маўляў камень з неба,
У Літву чы дзед стары, жабруючы хлеба,
Без рукі чы без нагі, прыме падаянне,
Прыстаўшы,— сюды-туды астарожна гляне
І, як не маш у дварэ маскоўска жаўнера,
Жыдоўскія ярмолкі, чырвона каўнера,
Скажа, што ён із войска польска,— неўзначаі
Прыбадзяўся, штоб косці злажыць ў родным краі,
За каторы ваяваць не ў сілах рукою.
Кожан яго прымае сэрцам і душою.
Ён рад за стол садзіцца, уроніць слязіну
Дый дзіўнейшу ад казкі прашэпча навіну.
Раскажа, што адважны анарал Дамброўскі
З чужой зямлі у сваю вядзе сілы польскі,
Сваякоў сабірае ён на чужой ролі;
Як Княжэвіч прыказы дае ў Капітолі[32]:
Гарой ён! — выдзертыя урагам Цазараў,
Кінуў пранцузу ў вочы сто слаўных штандараў.
Як Яблоноўскі[33], забег, гдзе перац усходзіць,

Гдзе цукровае зелле лесам зямля родзіць,
Гдзе ўсцяж вясна красуе,— з Дунайскаю сілай
Б'е чорных, а да ніўкі уздыхае мілай.

Такія то гаворкі па краі хадзілі,
Яны з палацаў дый з хат дзецюкоў манілі.
Не адзін, то пачуўшы, сваіх адчураўся,
Штоб маскаль не угледзеў, па лесе бадзяўся;
Дабег к Немну, даў нурка — палядзь! — даплывае
На другую старонку, землякоў вітае;
А пасля, зняўшы шапку, маскалям з прыгора
Кажа: «Будзьце здаровы! пабачымся скора!»
Так шлі ўпрочкі Гарэцкі, Пац і Абуховіч,
Пятроўскі, Абалеўскі, Ражыцкі, Яновіч,
Мяжаеўскі, Брахоцкі, Гедымін — і многа,
Усякі даваў цягу, каму толькі змога.
Кідалі бацькоў, матак, радзімую ролю
І дабро, катора цар браў на сваю долю.

Часам на Літве квастар з кляштара далёка
Прыбадзецца да двара, зашыту глыбока
Выпара із шкаплера карту друкавану
Дый лічыць сілу войска народна спісану,
Чытае ахвіцэраў прозвішча, іх справу,
У якім дзеле, другіх смерць слаўну чы крываву.
Так кроўныя, пачуўшы аб сваіх навіну,
Вось адны дзякавалі за добру вясціну,
А другія журылісь, плача сына, брата.
Не адна там жалобу прынімала хата.
А ў аколіцы ціха,— жаласць добрых панаў
Чы радасць,— пэўны весткі для бедных зямянаў.
Такім квастарам Рабак маніцца здаваўся,
Часта ён у каморы з суддзёй замыкаўся,
І па доўгіх гаворках сакрэтных ў святліцы
Рассыпаліс вестачкі розны ў акаліцы.
Да й квастар хоць каптуром ксяндзоўскім накрыўся,
Відна, што у кляштары доўга не нажыўся.
Насіў ён знак над вухам і ў барадзе рану,

Стральбою аслі пікай ясна напісану.
Не толькі ж то па ранах, згадаеш па міне,
Што ён служыў жаўнерам,— мо'а у чужбіне.

Калі пры службе божай, угору з рукамі,
Абернецца к народу, штоб сказаць: «Бог з вамі!»,
Здаецца, што то жаўнер, выцягшысь струною,
Стаіць прад ахвіцэрам з паднятай стральбою.
І слаўца ён святыя так голасна правіць,
Вось, бачыцца, ваякоў у парадак ставіць.
І расказы лепш вядзе аб навінах стары,
Чым малітвы чытае ў сваём бравіяры[34].
А бадзяясь там да сям,— ведама па квесце,
Часта жыве нядзельку ў павятовым месце:
Робіць там антарэсы — а лістоў, вось смеці!
Адбярэ дый, замкнуўшысь, чытае у клеці.
Часам шле ён пасланцаў да нікому ў вочы
Не скажа, куды іх шле; часта сам у ночы
Бяжыць у двары панскі — з шляхтай распраўляе;
Па сялах да па карчмах, бачыцца, гуляе,
З мужычкамі гамоніць аб розны навіны.
І цяпер суддзі кажа — дзеля той прычыны,
Што не можыць у дварэ заўтра мшы адправіць,
У клябанью паедзе, штоб навуку правіць,
Пасля стральцоў у карчме будзе дажыдацца,
Не вернуцца ж — пад лесам рад з імі спаткацца.

Канец першай былiцы

## Быліца другая

# ЗАМАК

### Што стаіць у быліцы

Паляванне з хартамі напэўна.— Госць у замку.— Паследні слуга панскі шляхціц расказуе быліцу аб пасляднім з Гарэшкаў.— Пагляд на сад.— Дзеўка ў агурках.— Полудзень.— Пані Талімены расказ аб Піцярбургу.— Новае спіранне аб Кусага і Сакала.— Ксёндз Рабак умяшаўся ў ту справу.— Гаворка войскага.— Заклад.— Ну ж у грыбы!

Хто з нас не помніць гадкоў, вось як маладзенькі,
На плячах са стральбою шоў у лес радзенькі,
Гдзе ніяка прыгода ног не утружая;
Не глядзіш, аслі ніва свая чы чужая:
Бо на Літве мыслівы, як на рацэ човен,
Бадзяецца; усякі оступ яму ровен.
Ён знахар, відзіць ясна, гаворку згадае
Лясную, за карысцю, напэўна, шагае.

Вось драчык адазваўся; дарма яго следзіш:
Як шчупака у Немне[1],— ў траве не дагледзіш;
Далей над галавою пачуў ты званочак,
То жаўронка з-пад неба ляціць галасочак;
Там арол зашалясціў крыллямі — вось гэта
Ён страшыць варабейку, як цароў камета[2];
А ястраб пад строп неба чыстага узвіты,
Выглядае, баш матыль, шпількаю прыбіты;
Як даследзіць ён птушку чы зайца пугліва,
Звездачкай на дабычу кідаецца жыва.

Калі ж нам Бог дазволе шчасліва вярнуцца
На родзіну, гдзе сэрца, гдзе думы нясуцца,
Папытаць на шаракоў, птушак палявання,
Не чытаць другіх навін, акром рахавання?

Над Сапліцовам сонца узышло і свеціць,
З-пад страхі яркім лучом у стадолу меціць;
Луч той пракраўся к сену зялёну скрозь шчэлі,
З каторага маладзеж зрабіла пасцелі.
Рассыпаліся яго залаценькі кружкі
З-пад страхі, вось з-пад касы рабыя устужкі,
І сонца дражніць сонных, маўляў губы, зрэнкі
Сваіх мілых калоссем дзеўкі маладзенькі.
Ужо трэйчы закрычаў гусак, чарадою
Шваргочаць варабейкі угрунь пад страхою;
Адазваліся разам качкі і індыкі,
І пагнанай у поля скацінкі чуць крыкі.

Усталі маладыя, памаліліс Богу;
А Тадавуш пакойна, вось мядзведзь у логу,
Спіць, зарыўшыс у мяккай із сена пасцелі;
Баш заснуў ён не скора — аж пявуны пелі:
Аб апошняй пры стале ўсё думаў навіне.
Аж дзверы расчынілісь насцеж у адрыне,
І барнадын, на бяду! дзеля плячэй гладка
Махнуў паскам дый крыкнуў: «Уставай, дзіцятка!»

Ужо чуць на падвор'і стральцоў громкі клікі;
Вядуць каней стаенных, пад'язджаюць брыкі;
Ледзь стоўпіцца на дварэ такая навала.
Зазванілі у трубкі, псярня заіграла,
Харты вылазяць з буды дый скомляць вясёла,
Пабачыўшы мысліўскі прыборы дакола;
Гончыя сваявольна, угледзя свет божы,
Лётаюць, пасля шыі кладуць у аброжы.
Усё варожыць, што будзе шчаслівая доля.
Падкаморы прызволіў; кронуліся ў поля:
Напярод даязджачы, вядучы ў парадку
Ахвотных прыглядацца, стралецку грамадку;
Пасярэдзіне раент з ацэсарам сталі,
Цішком на сябе злосна часта паглядалі
Да вялі рэч пакойна, мэрам чэсны людзе,
Калі смяртэльна бойка меж іх зараз будзе;
Ніхто із слоў іх месці угадаць не зможа.

Раент — Куса, Сакала вёў другі ў аброжэ.
За імі, тут жа, ў брычках кабеты гамоняць
З хлапцамі, што на канях за брычкамі гоняць.

Вось дабродзей ксёндз Рабак па дварэ бадзецца,
Пад строп неба малітва з губ яго нясецца,
Да хоць моліцца шчыра, з укоса зіркае,
На Тадавуша хітрым вокам ён міргае;
Пасля па носе пальцам хлапцу пагразіўся;
Тадавуш дабрадзея як не напрасіўся,
Штоб сказаў, дзеля якой сварыцца прычыны,
Да слаўца не дабудзеш вось ад старавіны:
Сцягнуў каптур на вочы дый маліўся Богу,
То ж дзяцюк за стральцамі пусціўся ў дарогу.

Ў ту пору стральцы мігам здзяржалі сабакі,
Усяк прыстаў, палядзь! — мэрам дарожныя знакі,
Адзін другому ціхасць міргам заляцае,
Усе глядзяць на камень; тут суддзя махае
Рукою: дае прыказ, як пачаць ахвоту.
Стральцы ладзяць парадак на таку работу.
Раент з Кусым, з Сакалом ацэсар гатовы,
Пад'язджаюць да суддзі, штоб напачаць ловы.
Тадавуш выперадзіў усіх, баш нарокам,
Стаў пры суддзі, на дзіва жадным глядзіць вокам,
Даўно бачыў ахвоту; а на раллі шэрай
Зайчыка выглядаеш дарма зрэнкай шчэрай;
То ж суддзя яго ўкажа; шарачок без душы
К каменю прылёг шчыльна дый наставіў вушы,
Чырвоным стрэціў вокам стральцоў ліхі зрэнкі,
Быццам урок хтось кінуў; ах! пачуў бядненькі
Сваю гібель: боязка усім прыглядаўся,
Пад каменем лежачы, каменем казаўся.
Аж разам мяцель пылі пад неба ўзаб'ецца,
Ляціць стралою Кусы, дый Сакол нясецца,
Тутка ж ацэсар, раент голасу дабылі:
«Выжга! выжга!» — дый з псярняй загінулі ў пылі.

Калі так за шараком гнаўся кожан бесам,
Ясны граф паказаўся тутачка ж пад лесам:
Вясціма, пан вялікі,— панам то прыспела
Ніколі не стаўляцца у пару да дзела;
І цяпер праспаў зорку; то ж на служак зліўся,
Як жа стральцоў угледзеў, на кані пусціўся.
Світку белу, ў замор'і шыту, за калены
Развеяў бапал вецер, бачыцца пялены.
За ім на канях служкі, маўляў грыбкі спелы:
Капялюшы маленькі блішчаць, штаны белы
Дый шпанцэрка каротка — баш як убяруцца,
Нікеі чы жакеі[3],— невесь як завуцца!

Як чарада ўехала там на паляніну,
Графок угледзіў замак дый здзяржаў каніну.
Упершыню прыкідаўся замак так красіва,
Вясціма ранкам ясным усё свеціць жыва.
Ў раздум'і графска міласць ўсяму дзівавалась,
Яму й вежа замкова вышэйша казалась,
Бо над туманам яна угары старчала,
На даху, бляхай крытым, страшэнна блішчала:
Балоны хоць пабіты, да рэшту зукоса
Лучы соненька красяць, маўляў цмок нябёса.
Усе шчэлі, груз цэлы у замку прыкрыўся
Туманам, што вось плотам ўкруг палацу віўся;
А галасы стралецкі сям-там наклікалісь,
Бачыш гарох, ад сцяны замка адбівалісь:
Прысягнуў бы ты смела, што гоман той цэлы
Із новага палаца ляцеў на свет белы.

Граф душой любаваўся усякаму дзіву,
Паглядаў ён мілосна на красную ніву,
Яго вочы па новым відам ўсцяж блудзілі.
Зато ж дзіваком яго ўсе людзі манілі.
Часта ён хітра ліса чы шарака тропіць,
Разам здзержыць каніну, слёзна вока ўтопіць
Ў неба, маўляў каток на дзярэўях саду
Жаласным вокам следзіць вараб'ёў грамаду.

Часценька без сабакі, стральбы́ ён у гаі
Сядзіць, вось збеглы некрут, пры ціхім ручаі,
Упёршы жадна ў воду цікавыя зрэнкі,
Быццам чапля сцеражэць рыбкі весяленькі.
Такія дзіўны справы графа заляцалі,
Што ўрачоны, усе там спадцішка шапталі,
Да шанавалі яго, бо, праатцоў следам,
Для мужычкоў ён бацькай, добрым быў суседам,
То ж і з жыдамі ладзіў!
Графскі конік сівы
Проста звярнуўся з поля пад замак красівы.
Пан жаласным гнаў вокам па замковых сценах,
Вынуў папер, палажыў яго на каленах,
Меў рысаваць; аж разам вокам ён спаткаўся
З чалавекам, што замку таму ж любаваўся,
Паглядаў, улажыўшы рукі у кішэні,
Бачыцца лічыў вокам ў палацы камені.
Спазнаў граф чалавека, вось нескалька разы
Крыкнуў, аж пачуў яго старэнькі Гарвазы.
Шляхціц то, ён апошні Гарэшкавы служка,
Апошняя пана замка найвярнейшы дружка.
Стар ужо, волас сівы, ліцом вельмі строгі,
Да здаровы рукою, статкам ладзяць ногі.
Любіў калісь меж шляхтай гульнуць на вяселле,
Да як пан яго згінуў у страшэнным дзеле,
Гарваз змяніў натуру, усім на дзівоту,
Не заглянуў на кірмаш, вясёлу ахвоту
Шляхецкую пакінуў; людзі на пацеху
Не чулі яго жартаў, не бачылі смеху.
Насіў Гарэшкаў роду любрэю заўсёды,
Кароткую шпанцэрку, жоўту, дзеля моды
Па берагах абшыты залаты галёны,
Ад старасці не спазнаць, што яны злацоны;
Шоўкам дакола шыты значкі паўказіцы,
То герб панскі; і дзеля таго ў акаліцы
Паўказіцай Гарваза звалі; й такія былі,
Што ад гутаркі яго Мапанкай хрысцілі,
Часам Шчэрбай, бо цэла лысіна у шчэрбах.

Ён жа зваўся Рамбайлай; не пытай аб гербах!
Ná руку, што ключнікам яго празывалі,
Ў такім чыне на замку даўней яго зналі;
Дзеля таго ён насіў за пояс затканы
Пук ключоў на аборцы, кутас пасрабраны.
Хоць не было там чаго яму адчыняці,
Бо папсованы дзверы у кожнай палаці,
Найшоў жа двое дзвярэй, сваім коштам справіў,
Штоб зачыняць што бы́ла, у палац уставіў.
Адну ізбу на жыццё выбраў з сваёй волі,
Хоць граф яму не жалеў ні хлеба, ні солі.
Ах!— усюды ж маркотна, ўсюды нездарова,
Толькі на душы лягчэй паветра замкова.
Як угледзеў ён графа, зняў шапку з галоўкі,
За калені адвесіў яму паклон лоўкі
І засвяціў лысінай, што блішчыць здалека,
На каторай баразды, бачыцца пасека.
Пагладзіў яе рукой, падышоў кусочак,
Зноў схіліўся дый кажа: «Мапанка, паночак,
Прабач жа няўвагу маю, ясны пане!
Така мая гутарка, да не ўшанаванне:
Мапанка,— так Гарэшка кожан адзываўся,
Стольнік, пан мой, гутаркай такой заляцаўся.
Праўда ж гэта, мапанка! што грошы жалееш
На суды? — ладзіць права з Сапліцам не смееш?
Я не верыў, да гадка ўкруг ходзіць ціхенька».
Тут глянуў ён на замак, уздыхнуў цяжэнька.
«Дзіва ж то? — граф адкажа.— Нуда з коштам ў пары;
Хацеў бы кончыць дзела; шляхціц вядзе свары,
Не спяшыцца: ведае, што марудствам зладзіць;
Прыму такую згоду, яку суд нарадзіць».
«Згоду? — крыкнуў Гарвазы.— З Сапліцамі згоду?!
З Сапліцамі, мапанку! не зведаўшы броду!»
Так кажа дый моршчыцца — вось дапякла болька,
Чы блёкату аб'еўся, аслі змагла колька.
«З Сапліцамі угода, мапанка, паночак!
Жартуець пан? то ж замак, Гарэшкаў кусочак,
Сапліцу пойдзе ў рукі?! — урагу Сапліцу?!

Злезь, пан, з каня да агледзь кожную святліцу.
Адурэў пан! — то ж будзе няшчасця бярэмя!
Злезь бо, пан!» — дый штоб зсесці, прытрымаў ён стрэмя!

Увышлі яны ў замак; Гарваз пры парогу
Стаў дый кажа: «Тут даўней паны, хваліць Богу,
З цэлаю чарадою дворскае грамады,
Разбіралі мужычкоў споры, няслі рады
Чы, скончыўшы полудзень, з гасцьмі забаўлялісь,
Аслі вялі расказы, жартамі мянялісь.
Маладзеж, вось на вайне, ў ражонкі гуляла[4]
Чы на падвор'і каней панскіх уязжала».

Увышлі далей. Гарваз кажа: «Тут у сені,
Каменямі засланай, сколька ёсць камені,
Болей лопнула бочак з віном пры ахвоце;
Шляхта цягнула куфы, пацела ў рабоце,
Як сабралась на раду, аслі віншавання
Дзеля імянін панскіх, чы на палявання.
Пры абедзе нагары музыка тут стала,
На варганах, на дудках, на скрыпках іграла.
Ледзь парадкам здароўя праглынуць успелі,
Трубы аж падрывалісь, так шчыра гудзелі.
Найперш там каралеўска здароўя вясцілі,
Дабрадзея прымаса[5], каралевы пілі,
Далей шляхты і цэлай Рэчы Паспалітай,
А на канцы, па пятай чарцы ўжо выпітай,
Равелі «Кахаймыся!»[6], горла забалела,
То кахання, пры чарцы, вялі да дня бела.
То ж кожнаму падвода была ўжо гатова,
Вязці ў хату праспацца, штоб напачаць знова».

Прайшлі нескалька святліц,— Гарваз блудзіць вокам,
То на сцены замковы, на строп гляне бокам;
Добра чы зла прыгода ў мыслі яму стала,
Бачыцца, казаць хоча, што усё прапала!
Махне ў смуце рукамі, качне галавою,
Здаецца і спамінак яму ўжо мукою;
Хацеў бы усе прагнаць з галавы быліцы.

Аж сталі ў люстравой нагары святліцы.
Із выдзертых там люстраў вісяць толькі рамкі,
Вокны без абалонак, а дзверы без клямкі.
Тутка стары, прыстаўшы, уздыхнуў цяжэнька,
Закрыў ён твар рукамі, меж пальцаў слязенька
Выкацілась, аж графа слязьмі зайшло вока,
І настала меж імі ціхасць там глыбока;
Аж разам крыкне стары, патрасшы рукамі:
«Няма ж згоды Сапліцам, няма з Гарэшкамі!
А у пана Гарэшкаў плыве кроў па маці
Лаўчыне[7]; стольнік блізкі сваяк графскай знаці:
Яна родзіцца з дочкі ясна кашталяна,
Каторы, як ведама, дзядзька майго пана.
Паслухай, пан, сваякоў няшчасных быліцы,
Катора стала намесь у гэтай святліцы.

Нябожчык пан мой, стольнік, найпершы ў павеце,
Пан можны дый багаты, якіх мала ў свеце,
Меў толькі адну дочку, маўляў анялочак!
То ж шляхта, паны бралісь — жадны то кусочак!
Із шляхты маладзенькай адзін шчыра браўся,
Гарачка, гад на сваркі! меж сваімі зваўся
Ваяводай, жартам то яго так манілі,
Бо акалічна раднёй быў ў вялікай сілі.
Яцкам Сапліцай зваўся; са тры сотні ставіў
Сваіх на раду, трысту галасамі правіў,
Хоць гол быў, маўляў бізун: акром куска ролі,
Шаблі, вусоў вялікіх, нішто не меў болі.
Пан мой, стольнік, прыняў шляхціца, быў рады,
Балазе сабіраліс ў замак на парады.
Хоць пан вялік, ўгашчае, маўляў сабе роўных,
Самога, другоў яго, усялякіх кроўных;
То ж і згардзеў вусач наш, ўлезшы меж паночкі;
Уздумаў ён сватацца да панскае дочкі:
Не прашоны, часценька да замку прыбіўся,
Вось у сваёй хацінцы, ў палацы разжыўся
І хацеў ладзіць свадзьбу; да баш угадалі,
Яго чорнаю юшкай там пачаставалі[8].

Сумеў ён, як наліха! дочцы спадабацца,
Толькі баялась вельмі бацьку ў тым прызнацца.

Было то за Касцюшкі; стаяў пан каханы
Пры законе, што ў трэцім маі быў пісаны[9].
Збіраў канфадаратам шляхт дзеля памочы:
Аж маскаль укруг абняў замак адной ночы.
Ледзь успелі з гарматы стрэліць на трывогу,
Пазамыкаць ўсе дзверы, завалiць дарогу.
Былі толькі у цэлым замку я дый панны,
Кухар, кухцікаў двое, усе трое п'яны,
Дабродзей, пяць лякаёў; ў бойцы не драмучы,
Хваць за стрэльбы! да акон! аж маскалёў тучы;
Крычаць «ура» — ў замковы ціснуцца аруды.
Мы іх са стрэльбак ніжам дый крычым: «А куды!»
За дымам нельга бачыць: вось знізу стралялі
Служкі дзельна, мы згары жарка дапякалі;
Ладам ішла расправа, хоць страху нямала.
Вось тутка, на памосці, дваццаць стрэльб ляжала:
Выстралілі мы адну, інакшу сулілі;
Ксёндз-дабродзей, другія службу ту чынілі,
І пані, і паненка, і дворныя панны;
Трох стральцоў, да агонь там ідзе неустанны.
Знізу сыпала кулі маскоўска пяхота.
Мы хоць рэдка, да цэльна! — ладам шла работа.
Тры разы аж пад дзверы замка падступалі,
Мы кожан раз трох назем маскалёў кідалі,
То ж уцяклі за скарбец — а ўжо свяціў ранак.
Вясёл стольнік са стрэльбай выйшаў аж на ганак.
І, як каторы маскаль із-за вугла гляне,
Ён стрэліць, палядзь! маскаль ў лоб куляй дастане.
За кожным разам шапка кацілась ў пракосы.
Вось аж Масква са страху паспускала носы.
Відзіць стольнік, што маскаль думае даць цягу,
І блізка яму дапякці сільну ўзяў адвагу
І дзеля таго з ганка служкам даў прыказы,
Пасля мне ёмка кажа: «Пойдам-ка, Гарвазы!»

Аж хтось з-за варот стрэліў; стольнік пахіліўся,
Пачырванеў, паблядиеў дый кроўю заліўся.
Глядзь я! — куля папала яму ў грудку саму,
Пан хіліцца, пальцамі укажа на браму:
Ах! спазнаў я паганца, бардзей за дня бела;
То ж згінуў пан каханы ад Сапліцы стрэла!
Яго рост, яго вусы — разбойнік угору
Падняў стрэльбу, з каторай дым шоў у ту пору.
Выцаліў я да збоя, стрэліў — у балесці
Не трапіў! — маўляў камень, ён стаяў на месці;
Кепска мерыў: жаль вочы замуціў слязамі;
Аж пачуў крык жаноцкі, пан расстаўся з намі!»

Змоўкнуў Гарваз дый слязьмі горкімі заліўся,
Далей кажа: «Ужо маскаль да замка дабіўся,
Бо, як стольнік наш памёр, я розум загáчыў,
Што дзеялась каля нас, нічога не бачыў,
Шчасцям прыйшоў на помач нам Параф'яновіч,
Міцкевічаў дзве сотні прывёў з Гарбатовіч,
Дзельна шляхта! — чалавек, баш, у чалавека,
А злобна на Сапліцаў, кажысь, што ад века.

Так згінуў пан вялікі, пабожны, чыноўны,
Катораму у краі рэдка хто быў роўны.
Мужычкам быў ён бацькам, шляхце — брат сярдзечны
І не аставіў сына, каторы б жаль вечны
За смерць бацькі гадаваў у душы дзяціннай,
Напомніў бы Сапліцам ён крові нявіннай.
Да меў вернага служку! — я у яго рану
Памачыў маю шаблю, сцызорыкам звану.
(Пэўне, аб сцызорыку чуў, пан, вясцей многа?
Ўсім на сеймах, кірмашах дакучыў ён срога.)
На Сапліцавых шыях, учыніў прысягу,
Суздром яго вышчарбіць, дапякці урагу.
То ж двух зрубіў ў пасварках, двух у паядынку,
Аднаго ў дзяравяным падпаліў будынку,
Як з Рымшам Карэлічы наехалі людна,
Баш цецярук упёкся; да тых злічыць трудна,

Каторым абцяў вушы. Ах — адзін астаўся,
Каторы з сцызорыкам маім не спаткаўся,
Родны брат разбойніка вусача Сапліцы,
Да яшчэ ж найбагатшы ў нашай акаліцы!
Ён да Гарэшкаў замка сягае рукою
І ўсіх тут за нос водзіць,— мае чын, суддзёю.
І пан уступіш замак? — Не паломіш косці?
Дазволіш, штоб кроў панску на гэтым памосці
Таптаў ўраг Гарэшкаў? Не! Гарваз удушыць
Паганца тут на месце, пакуль пальцам рушыць,
Вось пакуль сцызорыкам правіць рук дастане,
Сапліца у камору гэту не загляне!»

«Ой, чула ж маё сэрца! — графок адазваўся.—
Нядарам мур замкавы так мне прыглядаўся;
Хоць не знаў, што хавае клад, вялікі шкоды,
Жаласныя прыгляды, страшэнны прыгоды.
Дзелам! калі Сапліцу замак я заграблю,
На жыццё тут пасаджу цябе — вось мургграблю[10].
Рэч твая спадабалась вельмі, мой Гарвазы!
Ах, штоб ты ночкай гэты вясціў мне расказы!
Я апрануўся б світкай, прысеў на руіне,
А ты б страшэнны казкі вёў ў начной гадзіне.
Шкода, што ты не ўмееш цікава казаці.
Не раз аб такіх дзівах слухаць дый чытаці
Давялося; ў замор'і грузы́ замкавыя
Абліты людской кроўю, вось двары мясныя.
Ў кожным шляхецкім родзе, ўсякай акаліцы,
Ёсць свае страшны казкі, крывавы быліцы,
Па каторых ўпамінак сынам ідзе ў спадку.
Ў Польшчы я першу чуў яшчэ так страшну гадку.
Чую, што гарэшкаўска кроў ў сэрцы іграе!
Ведаю, што для мяне кроўных чэсць святая.
Ах, трэба ж мне з Сапліцам дзелам расшчытацца:
Чы на шпагі спытаем, чы будам страляцца?
Чэсць так кажа!» — ён молвіць, выйшаўшы з палаца.
Гарваз ідзе за графам, рад з сваёй ён працы.
Пры варотах граф прыстаў, з сабою гамоніць;

На коніка уссеўшы, мысляй ў палац гоніць
Дый таку шле увагу мыслям удагонку:
«Шкода, што стар Сапліца; ах, калі б меў жонку
Чы прыгожы дачушкі! — вось чы закахаўся,
На злосць стару Сапліцу, сватанням заняўся,
А ён бы даў адправу; дзеля радоў свара,
То ж была б страшна казка, вось быліца стара!» —
Так шэпча у раздум'і, пугай маша срога.
Верне каня ў сторану, гдзе у двор дарога;
Да ледзь стральцоў угледзеў, гадак адчурыўся!
Забыў усё, за імі моланняй пусціўся.
Мінуў варота, платы, агарод — звярнуўся,
Глядзіць! — аж вось пры плоце якімсь апынуўся.

То сад. Яблыні, грушы, сажаны у рады,
Кідалі цень на поля, ў сярэдзіне — грады.
Вось тут капуста свеціць лысінай старою,
Кажыся, аб варыве занялась думою;
Там боб, маўляў тычына, спутаўся стручкамі
З махоўнікам дый глядзіць тысяччу вачамі:
Тутка, з залатой кітай, стырчыць кукуруза;
Далей, баш пан, выпучыў гарбуз сваё пуза;
Хіцёр! нац'ю ў далёку дарогу пусціўся,
Быццам госць няпрошан, меж буракі ўбіўся.
Грады ж мяжой расцяты; ўкруг барозд глыбока
Стырчаць, быццам на варце, каноплі высока;
То ва́рыўны таполі, просты і зялёны,
Іх лісткі служаць градкам дзеля абароны,
Бо меж канопна лісця і змей не сягае,
Ад паху канапелькі чарвяк уцякае.
Там бадылі макавы краскамі багаты,
На іх, кажыся роем, матылі стракаты
Трапечуцца крылкамі,— дзівіся, радзенькі!
Баш нябесна вясёлка заглядае ў зрэнкі,
Так яркімі краскамі мак на градках свеціць,
Быццам месяц меж звездак, укруг лучы меціць.

Круглы шчыр, баш лучына з агнём за аконцам,
Ад усходу на захад бадзецца за сонцам.

Пад плотам вузкі, доўгі і высокі грады,
Непрыкрыты; там жывуць агуркоў грамады;
Прыгожа разрасліся на усе староны,
Кажысь, на ніве дыван разаслан зялёны.

Сярод град ішла дзеўка ў беленькай адзежцы,
Ў зялёнай па калені утанула сцежцы,
З град зніжы́ўшысь, ў баразды яна не ступала
Да мэрам вось па лістках зялёных плывала.
Капелюшом з саломы прыкрыта галоўка,
З-пад яго красны стужкі развеялісь лоўка,
З-пад убрання валоссе руса выглядаець,
На руцэ вісіць кошык; вочы ўніз спускаець;
Падняла праву ручку, вось лавіць казалась,
Манісь, у рацэ дзеўка за рыбкай ганялась,
Катора з яе ножкай гуляла бяленькай,
Збірала агурочкі, угледзеўшы зрэнкай
Чы ножкай натаптаўшы на градцы зялёный.

Графок выпучыў вочы, быццам урачоны;
А пачуўшы, што служкі за ім каней гналі,
Махнуў на іх рукою, штоб ціха стаялі;
Сам, выцягнуўшы шыю,— вось, повен трывогі,
Сцеражэць сваю статку жураў даўганогі;
На адной стоя ножцы, быстра паглядае,
Штоб не заснуць, у другой камень ён трымае.
Зашалясціла графу на плячах дакучна,
То дабродзей ксёндз Рабак дзяржаў абаручна
Паднятыя угору бяленькі шнурочкі:
«Агуркоў хочаш, вашэ? — маеш агурочкі[11]!
Не лезь, панок, у шкоду — памеж гэтай наці
Агурок не для цябе, зася ад дзяўчаці!»
Пасля загразіў пальцам, справіў каптур, ўрэшці
Адышоў; графок крыху пастаяў на месці,
Засмяяўся, стаў клясці гэтаку прыгоду

Дый паглядзеў цікава укруг агароду;
Да ўжо дзеўкі нямашка, толькі у аконца
Мігнула сукеначка, маўляў лучы сонца.
Відзеў яшчэ на градках слядок ёй дарожкі,
Бо лісток натоптаны ад крышачнай ножкі
Падскочыць, крыху дрогне дый пакойна стане,
Вось калі птушка крылом ваду ў лёце кране,
На месце, гдзе стаяла, кошык із лазочкі
Дном угору абернут, пры ім агурочкі
Раскінуты у бязладдзі, па градках бадзялісь,
Зялёным, у сораме, лістком прыкрываліс;
Скора на месце стала цішына глыбока,
Граф слухаў у раздум'і,— вёў за домам вока,
Стральцы ж, стоючы за ім, пакойна драмалі.
Аж гоман, крык вясёлы заляцеў із далі;
Відна, што ўжо вярнулісь госці з палявання,
Што служкі прыбіралі сталы да снядання.

Ладам ішла па ізбах шчырая работа,
Пры ядзе, то ж пры чарках вясёла ахвота!
Мужчыны, як увышлі у зялёных строях,
З тарэлкамі, чаркамі там-сям у пакоях,
Елі, пілі чы, спёршысь на акон ушаках,
Гаманілі аб стральцах, зайцах і сабаках.
Падкаморы з суддзёю — пры стале, ў куточку,
Паненачкі шваргочаць, вось птушкі ў кусточку;
Нямашака парадку дзеля новай моды,
Які у польскіх дамах бывае заўсёды
Пры полудні; што ж! суддзя прызволіў на тое,
Хаця ў душы не хваліў бязладдзе такое.

Ўсякі былі для кабет і для мужчын стравы,
Тут служкі разнасілі прыборы да кавы,
Вялікі кружкі, ў кветкі розны маляваны,
На іх з парай аж пад строп ямбрычкі бляшаны.
Із заморскае гліны місачкі дый чаркі,
Тут жа гаршчэчкі малы, наверху прыгаркі.
Такой кавы не пытай у заморскім краі.

У Полышчы здаўна ужо ёсць у абычаі,
Што з той кавай асобны ладзяць кабяціны,
Кавяркамі завуцца; яны чы з віціны[12],
Чы з места купяць зярно панам на пажытак,
Знаюць сякрэт, што лакам будзе той напітак.
Ён чорненькі, баш вугаль, краска дзягцявая,
Пахам дзіўна, а маўляў патака густая.
Ведама, чым для кавы салодка смятана;
То ж кавярка прыставіць бляшанкі дый зрана
Варыўню праведае, гладышы збірае,
У маленькіх гаршчочках к агню прыстаўляе,
Пры кожнай чарцы ставіць гэтакі гаршчочак
З прыгарам — а той прыгар завуць «кажушочак».

Вось старэйшыя пані выпілі ту каву,
То ж дзелам узяліся за другую страву,
Гарачэнькая піва,— пабела з смятаны,
А тварог на кусочкі малы пакраяны.

Для мужчын, хто што любіць, розныя вандзонкі,
Тлусты гускі, кумпякі да языкоў дзвонкі,
Смачныя! — вандзоныя ў коміне з пакроўцам,
Дымам з смольна дзярэўя, разам з пад'ялоўцам.
Пасля секана мяса на апошня данння.
Такое было ў суддзі на ранак снядання.

У дзвюх ізбах дзве ў кучкі сабраліс грамадкі,
Старэйшыя ж пры ма́лым стале вялі гадкі
Аб сяклетах у краі новых гаспадарскіх,
Што раз новых указах вельмі срогіх, царскіх.
Падкаморы увагі аб вайне выводзіць;
Яку карысць парадак новы яна зродзіць,
Вайшчанка ж ў акулярах, скончыўшы снядання,
Падкаморага жонцы кладзе з карт гадання.
У другой святліцы панкі маладзейшы
Аб мысліўстве расказы ўзымаюць цішэйшы,
Бо ацэсар і раент на гаворку гады!
Знахары у мысліўстве, сідзя меж грамады,

Нахмурыўшысь, спадлоб'я на сябе глядзелі.
То ж оба шчулі зайца і пэўнасць ту мелі,
Што харты іх паймаюць шарака шчасліве,
Да нашлася мужыцка ярына на ніве;
Туды ж зай! — ужо Кусы, Сакол даганялі,
Аж суддзя даязджачым кажа, штоб прысталі;
Не рады, да стрымаліс ь, хоць на душы гнеўна;
Вярнуліся сабакі; не згадаць напэўна,
Аслі шарак даў цягу, чы даждаўся згубы,
Чы Сакалу, чы Кусу папаўся у зубы,
А мо'а з'елі ўзгодзе? — усяк там судзілі
Дый на другі раз справу тую адлажылі.

Стары войскі па ізбах ціхонька бадзяўся,
Цікавымі зрэнкамі укруг сцен ён гнаўся;
Не ў час яму стралецкі, ні старых забавы.
Відна, ён у галаве мае важны справы.
Скураную лапатку носіць — часам стане,
Падумае... дый муху заб'е, дзе прыгляне.
Тадавуш з Таліменай тутацька ж стаялі
Памеж ізб на парозе — сябе забаўлялі.
Не вялікі іх дзяліў ад гасцей кусочак,
Дзеля таго шапталі. Праведаў паночак,
Што Талімена слыве багацтвам высока,
Што хоць яму сваяшна, да вельмі далёка,
Што злучыць іх ксёндз можэць, вось бы чужых роўна,
Дый не пэўна, чы яна Тадавушу кроўна,
Хоць дзядзькавай сястрою бацькі яе звалі:
Чаму ж ад сябе векам так яны адсталі?
Што вось цётка, жывучы доўга у сталіцы,
Учыніла вяліку прыслугу Сапліцы,
Для таго яе дзядзька шанаваў душою
І дзеля той прычыны называў сястрою;
Яна ж таго братання дзядзьку не бароніць.
Спазнаўшы то, радасну панок слёзку ўроніць,
Лягчэй стала на сэрцы. Ён навін нямала
Чуў ад цёткі, хоць крыху толькі пашаптала.

У ізбе жа направа, з ацэсара жарты
Строючы, вось падводзіць раент наш упарты:
Кажа, што паляванне удацца не можа,
Пакуль на ніве будзе нязнятае збожжа
І ярына мужыцка на шнурах не зжата;
То ж і граф не прыехаў дзеля таго свята,
А граф да палявання то місцюк вялікі!
Знае кнеі, умее стралецкія клікі;
Пражыў у замор'і ён дзяцінства цэла,
Кажа, што людзям чыніць шкоду, то не дзела!
Паляваць без увагі, як у нас бывае,
Не глядзець, аслі ніва свая чы чужая,
Вясною чы ўлетку бадзяцца па кнее,
Забіваць тагды ліса, калі ён лінее,
Цярпець баш, пакуль самку заячую злучаць
Чые харты на руні дый бедну замучаць,—
То ж звярына загіне! — так граф адзываўся,
І маскаль бы таку шкоду чыніць пабаяўся!
Бачыш, і указ царскі то забараняе,
Паліцыя пільнуе, віноўных карае.

Талімена налева галоўкай прыляжа,
Махне хустачкай белай дый гэтак адкажа:
«Далібог, што увагі графскі праўду мераць!
Знаю добра Расею! — панкі мне не вераць?
Я ж не раз то казала, як у іх шануюць
Ураднікі указы царскі, іх пільнуюць.
Была я у Пецярбургу[13] не раз, не два разы,
Міла ўспомніць, як святы царскія наказы!
Ніхто ж з вас не быў ў гэтай маскоўскай навінцы?
Хочыце бачыць карту? — маю карту ў скрынцы!
Летам піцерскі паны на дачы нясуцца,
То на сяле палацы (дачамі завуцца),
Жыла я ў такой дачы — блізка над ракою
Пры горадзе, рака та завецца Нявою,
На узгорку, сыпанам узнарок пры ручаю,
Дамок прыгожы! — ў скрынцы план яго хаваю...»

Паны ў смех! ледзь жыватоў там не падарвалі:
Баш суддзя з барнадынам у мар'яш іралі,
І суддзя падняў карту — пацеў барнадынак!
Аж стары заслухаўся аб гэны ўспамінак
Да такжа ж шчыра слухаў цікавыя рэчы,
Што з галавой задзёртай, а з картай над плечы,
Вось не жывы! — а ксяндзок у вялікім страху;
Дачакаліся канца, дый суддзя з размаху
Б'е памфілям і кажа: «Хваліце з наглядак
Мемцаў вялікі розум, маскалёў парадак.
Няхай вучацца ў Польшчы закону ад шваба:
Судзіцца аб лісёнка, зваць дзесяцка драба,
Штоб гнаў у часць сабаку, што ў чужыя гаі
Заброў; на Ліцьве другі саўсім абычаі;
Здаволь звярыны маем для сябе, суседства,
Не пойдам к ацэсару вясці аб тым следства,
І хлеба маем годзе,— сабакі не ўшкодзяць,
Вось калі па ярыне крыху і паходзяць,—
На шнурах жа мужыцкіх — грэхам паляванне».
Тут коман абазвецца із кутка: «Маспане!
Бо й дорага пан плаціш усялякі шкоды,
Мужыкі таму й рады, калі ў агароды
Убягуць панскі харты: каласоў дзесятак
Утопчуць, пан даш капу, да яшчэ ў прыдатак
Мужычкі карбованца ад пана дастануць;
Вер, панок! такой справай яны горды стануць,
Калі...» Рэшту увагі коман, хоць не рады,
Не скончыў, бо памеж там вясёлай грамады
Завязаліся дзелам громкі разгаворы,
Разумныя гутаркі, крыклівыя споры.
Тадавуш з Таліменай, вельмі з сябе рады,
Адчурыліс ў куточак ад цэлай грамады,
Мянялісь, та розумам хлапца забаўляе,
Дзяцюк жа красны слаўца ўзамен выпускае.
Талімены галасок штораз прыціхаўся,

Дзяцюк цікун! — узнарок глухім прыкідаўся;
Ён, шэпчучы, так блізка прыстаў к кабяціне,
Што лічка загарэлась, вось смоль на лучыне;
Губамі лавіў жадна яе ўздох міленькі,
А вокам хватаў іскры із гарачай зрэнкі,
Аж памеж губ мігнула, бачыцца з прыпадка,
Перш муха, а за ёю войскага лапатка.

На Літве мух багата: ўсялякі пладзяцца.
Ёсць мухі, што шляхецкім прозвішчам маняцца;
Яны, кажыся, на ўзгляд схожы другім мухам,
Да ад мужыцкіх шырэй груддзю, таўсцей брухам;
Лётая па святліцы, бурчаць, што крый Божа!
Іх, баш, і паучына у ляту не зможа;
Калі ж і ўплутаюцца, бзыкаюць дзень цэлы,
Ў баруканні ім рады не дасць павук смелы.
Ўсё то войскі [гаварыў] ды і не раз бажыўся,
Што із шляхецкіх мушак род меншы радзіўся,
Што яны такім мушкам вось для раю маткі;
Выбі дочыста шляхту, загінуць астаткі.

Няма чаго казаці! — Дабродзей, хмістрыня
Войску не ймелі веры у такой навіне,
Дый часценька дзеля мух вялі з яго жарты;
Стары ж сваіх даказаць трымаўся упарты,
Пасцярог гдзе мушонку, гнаўся за ей духам,
Балазе цяпер шляхціц зазваніў над вухам,
Ён двойчы мах лапаткай насупроціў сонца;
Не трапіў, зноў ударыў, ледзь не збіў аконца,
Аж муха адурэла: у скорай дарозе,
Пабачыўшы двух людзей тут жа пры парозе,
Бедненька! кінулася меж іх губ са страхам,
А за ёю войскага лапатка з размахам.
Ударыў вельмі крэпка, аж дзве галавінкі
Адчурылісь ад сябе, вось дзве палавінкі
Дзерава, у катора пярун стрэлам меціў;
Кожан з іх, адчурыўшысь у баязні, стрэціў

Ушак, з каторым поразнь збеглісь галавамі,
І выскачылі на іх гузакі з сінцамі.

Шчасцем ніхто на тое не звярнуў увагі,
Бо гаворкі, даселя ідучы без звягі,
Змяніліся ў вялікі пасваркі і крыкі.
Часам на паляванні стралецкія смыкі
Асочаць лес — пачуеш стралы, сабак лаі,
Аж даязджач на дзіка натрапіць у гаі,
Дае знак, і вось стральцы угрунь закрычалі,
Жаласна, дзеля страху, сабакі загралі;
Так і з гаворкай: яна спачатку — без крыка,
Пакуль дойдзе да гадкі, пахожай на дзіка.
Дзікам стралецкіх гадак быў спор той упарты
Раента з ацэсарам аб праслаўны харты.
Коратка было дзела, да гара́ча бралісь,
Маўляў перапячайкі лаяннем мянялісь,
Заеліся, аж горлы ад крыку сіпелі;
Да ужо і кулакамі частавацца ймелі.

То ж к ім з другой святліцы усе пабяжалі,
Маўляў на рацэ воўны, перад сабой гналі
Маладзенькую пару, што там, на парозе
Стоючы, замінала людзям па дарозе.
Калі часам на вайну маладых папросяць,
Крык вялікі! — па шынках матачкі галосяць.

Пакуль з паняю дзяцюк справілі галоўкі,
Прыціхлі громкі свары, злосныя прымоўкі;
Гоман вясёл са смехам па святліцы мчаўся;
Настала перамір'я; квастар за то ўзяўся;
Чалавек хоць ён стары, да сілач вялікі:
Вось ацэсар з раентам, баш сярдзіты быкі,
Падступілі да сябе, штоб пачаць бой шчэры;
То ж ён мігам ухваціў чыноўны каўнеры,
Двойчы ударыў крэпка голавы шалёны,
Як стоўпяць у Вялікдзень яечкі чырвоны,
Дый раскрыжаваў рукі, баш дарожны знакі,

Кінуў у куткі праціўны абоіх; табакі
Панюхаў; з распятымі абапал рукамі
Пастаяў, пасля кажа: «Пакой, дзеткі, з вамі!!»

Тут ацэсар з раентам оба засмяялісь,
Дзеля ксяндза павагі гневацца баялісь,
Спытаўшы яго сілы, не хацелі звады.
Так дабродзей прыцішыў іх сярод грамады,
Дый аб тое пахвалак ён, браткі, чураўся,
Больш на злосных сварыцца, ні лаяць не браўся,
Толькі каптур насунуў, залажыўшы рукі,
Пацяг із хаты ціха, рад з данай навукі.

Падкаморы з суддзёю меж старон убіўся;
Баш, і войскі з раздум'я быццам ашчурыўся,
Убег сярод грамады, сівы вус прыгладзіў,
З капотай, штоб прыкінуць павагі, ён зладзіў;
Загарэліся вочы (цямілі то людзе,
Вось калі аб мысліўстве рэч вясці ён будзе).
Сыпаліся ж там іскры із блісцяшчай зрэнкі!
Штоб прыціхлі, лапаткай махнуў дзед старэнькі,
Падняў чараны ўгору, штоб прытушыць звягу,
Дый крыкнуў: «Прыціхніце! — мейце ж ту увагу
Вы, каторых першымі ў павеце стральцамі
Завуць людзі, скажыце, што дзеецца з вамі?
Маладзеж, на катору вялікі спадзеі
Кладзе зямелька-маці! маладзеж па кнеі
І так ужо не вельмі любіць пабадзяцца,
Глядзя на вас, мысліўства рада адчурацца,
Пабачыўшы, што людзі, з каторых узоры
Мае браць, да пасварак гарачых так скоры.
Мейце ж, дзеткі, увагу на мой волас сівы!
Я знаў лепшых мыслівых,— быў то век шчаслівы!
Калі памеж стральцамі суд вясці я браўся,
Хто ж у літоўскай пушчы з Райтанам зраўняўся?
Чы асачыць аблаву, чы звяра сустрэціць?
Хто ж з Белапятровічам змог у адно меціць?
Гдзе найсці такіх стральцоў, як шляхціц Жагота,

Што з кароценькай стральбы ў бягу трапляў кота?
Тэраевіча знаў я; ідучы на дзікі,
Не браў ніякай стральбы, апрыч ручной пікі;
Будрэвіча, каторы й з мядзведзем бароўся;
Судзіце ж! цяпер такі стралец чы б нашоўся?
Калі ж прыйшлося спорыць, як жа спор гадзілі?
Вось абіралі суддзей дый аб заклад білі.
Агінскі сотню валок прайграў за ваўчонка,
Несялоўскі два сяла даў за барсучонка.
І вы, панкі, ідзіце следам старых людзі,
Няхай хоць не вялікі заклад у вас будзі;
Лаянкі ж — пусты вецер! — ім канца не стане,
Шкода малоць языком аб то паляванне,
То ж суддзей абярыце, няхай спор развяжуць,
Каторы з сабак лепшы, шчыру праўду скажуць.
Я буду прасіць суддзю, штоб ў нашай граніцы
Дазволіў палявання хоць бы меж пшаніцы.
Думаю, пойдзе ладам старога суд гэны?»
Скончыў дый пакланіўся суддзі за калены.
Аж раент ўзыме голас: «Пойдзем закладацца!
Каня стаўлю з прыборам; гатоў распісацца
У земстве,— а пярсцёнак суддзі падарую».
«А я,— кажа ацэсар,— мысліўскую збрую,
Яшчурам наложану, кальцы залатыя,
К таму ж смыч, шыты шоўкам, ўзоры не прастыя,
Так дзіўны, як брылянт той, што аж вочы цеміць.
Меў я смыч ту пакінуць для дзяцей на памяць,
Калі б толькі жаніўся. Дараваў мне яе
Князь Дамінік, як са мной паляваў па кнее,
З Сангушкаю-маршалкам, а з намі бадзяўся
Анарал Маен ў полі; з імі закладаўся
Я аб маю сабаку; падышоў іх штукай:
Надзіва, пяць шаракоў ушчуў адной сукай.
Справа та на Купіскай дзеялась даліне;
Князь Радзівіл[14] даседзець не мог на каніне.
Ссеўшы, абняў ён шчыра харціцу ту лоўку
І пацалаваў трэйчы у саму галоўку,

Пасля трэйчы ударыў каля морды блізка
Дый сказаў: «Будзь вялікай княгіняй з Купіска!»
Так Напалён князямі анаралаў ставіў
Ад мест тых, на каторых сябе хто праславіў».

Талімена не рада слухаць гэны свары,
Хацела ісці ў поля і шукала пары;
Ўзяла лубку дый кажа: «Відна, што паночкі
Рады сядзець у хаці, я іду ў рыжочкі.
Ч'я ласка ісці са мной?» Тут сваю галоўку
Напранула хустачкай із мяккага шоўку
Дый падкамора дочку за рука хваціла,
Другую сукеначку крыху падхіліла.
Моўчкам ў грыбы Тадавуш за ёю пагнаўся.
Суддзі такі лад пані вельмі спадабаўся;
Ёсць спосаб адчурацца крыклівага спору.
То ж гукне: «Ну ж, паночкі! па грыбы да бору!
Хто ў лесе рыжочак здаровы прыглядзе,
Той возля краснай панны пры вячэры сядзе;
Сам выбера прыгожу; а калі ж паненка
Найдзе рыжок,— дзецюка выбера радзенька.
Ну ж у рыжкі! — а вашэ, ротмістр, тут займіся
Вячэрай,— толькі ж з сталом ў замак не нясіся».

Канец другой быліцы

## [Быліца чацвёртая]

## [ДЫПЛАМАТЫКА І ЛОВЫ]

...Памятнікі Атчызны, дзядоў нашых веры!
Ах! сколька ж ат купецкай маскоўскай сякеры
Загіне Вас! — яна-то без баязні Бога!
Завідна Вашай чэсці, здзекуецца срога!
Для спевака ляснога не кіне зялені,
Для дудара лясочка, штоб думаў у цені...

### ТАЛКАВАНЬНЯ БЫЛІЦЫ ПЕРШАЙ

[1] [1] Віленьськая, Ковеньськая, Часьць Гродзеньськай і Міньськай губэрній,— да ў Польшы Аўгустоўськая,— тож палавіна амаль Пруськай зямлі твораць ста́рую Літву, с катораю яшчэ за даўніх Літоўськіх князей Гадыміна, Вольгерда, Віта (Вітольда) і другіх чорная, белая і малая Русі пабра́таліся, вось родные і жылі так, сліўшыся ў адно аж да нашых дзядоў. Чырвоная жэ Русь, каторую мямецкае Царства забрала із да́ўніх-да́ўна, яшчэ за караля Польськага Казімера вялікага, случылася с Польшаю.

[7] [2] Усе ў Польшы дый у чужых зямля́х за́ марам ведаюць аб цудоўным образе Чанстахоўськай Божай Маці. У Літве слывуць цудамі образы Віленьськая Вастрабрамськая, замкава́я Навагродзкая, Жырові́цкая і Баруньськая Найсвентшая Панна.

[61] [3] К а с ь ц ю ш к а — анарал Польські, каторы за дзядоў нашых ваяваў с Маскоўськаю і Мямецкай сілай за вольнасьць Польшы, Літвы і Ру́сі.

[63] [4] Р а й т а́ н ь — пан із чорнай Ру́сі. Ён то на радзе (сэйме), праведаўшы, што другіе паны згадзіліся, штоб Польшу с Літвою сумежные царства разабралі, із жаласьці па вольнасьці ўтраце разпароў сабе нажом бруха. Кніжкі «Фадон» і «Жыцьцё Катона» вельмі разумные, вы іх, дзеткі, ня паймёце. Першая пішэць аб душы чалавеччай, а другая апісуець жыцьцё праведнага чалавека, каторы, як атчызна яго паціра́ла вольнасць, с вялікага жалю атабраў сабе жыцьцё.

[67—68] [5] Ясіньські і Карса́к — польськіе ахвіцэры; яны баранілі Прагу, што перэд Аршаваю, ат анарала Маскоўськага Суворава.

[76] [6] Д а м б р о ў с ь к і — анарал польські, вельмі атважны і разумны чалавек.

[151] [7] Войські — гэта такі быў у Польшы чын. Як бывала ўся шляхта выцягне проціў непрыяцеля (што называлась тагды «паспалі́тая рушэ́нья»), то яго дзелам было аставаца дома бараніць кабет і дзяцей і журы́ца

аб іх дабро. У нас часта, дзеля грэчнасці, людзе самавольна хрысьцілі сусе-даў і знакомых якімсь чы́нам, што пасьля ўжэ пашло ў абы́чай.

[177] [8] П а д к а м о р ы — вялікі то чын калісьці ў Польшы. Ён маніўся старшэйшым у сваём павеце памеж шляхтай. Як Масква стала правіць Польшаю, то ўжэ чын гэны ня меў ніякай сілы; дзеля грэчнасьці часам кагось тым чынам манілі. Якісь час яшчэ Падкаморы судзіў мяжавые справы, а пасьля і то прапала. Тож заступаў ён часам Маршалка і Каморнікаў ставіў.

[235] [9] К а н т у́ ш — такоя ўбраньня даўней Палякі насілі, яно было вельмі красівая.

[251] [10] В о́ з ь н ы, іначай а н а р а́ л,— малы то чын у польшы. Суд ставіў возьнага із дробнай шляхты, каторая мела свой кусок раллі.

[255] [11] З а́ м а к — быў то вялікі ка́мянны палац, са ўсімі гаспадарскімі прыстройкамі: ён, для абароны ад непрыяцеля, быў ка́мяннаю сцяною, чы ва́лам, сыпаным із зямлі і астраколам умацованым, кругом баш поясам абвядзёны.

[302] [12] З н а ч к і́ ш л я х э ц ь к і е — то гарбы́. У старыну каралі́ сулі́лі гарбы людзям за заслугі; а хто меў такі значок, асьлі герб, той ужэ і весь яго род маніўся шляхціцам.

[309] [13] К в а с т а́ р Б а р н а д ы́ н — вось як барнадынські за́кан ня маець ніякага меньня, то ёсьць у ніх такі абычай, што адзін із ксяндзоў езьдзіць памеж добрых католікаў і просіць падаяньня; і так адзін дае аве́ча́чку, другі — барана́, той мерку, другую збожа, хто што можэ. Так яны на цэлы год сабіраюць сабе на жыцьцё, дый за дабрадзеяў сваіх шчыра моляцца Богу.

[360] [14] В а я в о д а — вялікі чын даўней у польшы, ня раўнуючы цяпер губернатарські, да кажыся яшчэ большы.

[439] [15] П а д ч а ш ы — тож даўнейшы чын у польшы. Падчашага сына манілі Падчашыцам. Так было і с другімі чынамі.

[475] [16] Н а п а л ё н — быў то магучы Цар пранцузькі. Ён у два-надцатам гаду с вялікаю сілай шоў на Маскву, да баш цьвёрдая зіма памаразіла ту сілу, ледзь якаясь злыдня вярнулася дамоў.

[476] [17] М а р к і з, Б а р о н — то чыны заморськія пранцузоў і ме́мцаў. Даўней некаторые із нашых паноў, маючы больш грашэй, як розуму, езьдзілі за́ мара, штоб купляць гэные чыны, то і цяпер, на бяду нашу, часам робяць то кепства.

[489] [18] Рэчпаспаліта — Польш с Літвою і Русьсю звалась Рэчпаспаліта. Дзеле таго яе (Польшу) так манілі, што народ быў вольны, правіўся за́канам, а кароль нічоа ня мог зрабіць, што ў том за́кане не стаяла, толькі сцярог, штоб людзе ат таго за́кану ня адступалі.

[499] [19] П а л і т ы к а — што дзеецца ў сваём краі і ў заморыі, як каралі́ правяць народамі,— добрае чы благое жыцьцё людзей пад яго праўленьням завецца палітыкай.

[510] [20] Банапарт а Напалён — усё адзін чалавек. Напалён імя, а Банапарта прозвішча. Ён атвагай сваёй і вялікім розумам с простага чалавека стаўся магучым царом пранцузáў.

[511] [21] А т ч ы з н а — Зямля, на каторай мы радзíлісь, каторую ўпраўляем сваёй працай, на каторай пахаронены косьці бацькоў, дзядоў дый праатцоў нашых; паветрыя, каторым мы атдыхаем, то завецца атчызна.

[573] [22] Р а é н т — чын такі, ня раўнуючы цяперашні сяклятáр. Раéнты правілі канцараліяй дый пісáлі судавые прыгаворы. Б а л е с т а — то імя Раéнта, аб каторым тут успамінак. А дзеля таго Раентаў часта завуць «баўбатуном» (Адвакатамі), што яны перад судом выводзяць громка рэчы аб дзелах.

[716] [23] Б а з ы л і ш а к — звер такі. Яго хоць ніхто яшчэ с людзей ня бачыў, да кажуць, што ён маець так страшэнныя вочы, што як гляне на каго, той мігам памірае.

[739] [24] А к а д э м ' я — то школа, у каторай вучаць вялікага розуму.

[741] [25] К р а к а ў — першы сталічны горад польськi, старэйшы ат Аршавы.

[758] [26] К а р о л ь  С т а н і с л á ў — пасьледні ён правіў польшаю, Літвою і Русьсю. За яго то праўленьня сумежные Царства разабралі польшу.

[789] [27] Н е с я л о ў с ь к і  Я з э п — пасьледні Ваявода Навагродзкі. Ён у 1794 гаду правіў польшаю, хоць ня быў каралём.

[849] [28] У Слуцьку пан Тызангауз, каторы для палякоў зрабіў многа добрага, справіў фабрыку вельмі красівых і багатых поясаў, каторымі палякí падпірáзывaліся.

[871] [29] Т р ы б у н á л — то суд выжшы, у нім важные судзіліся справы, каторые возьны па ляестры выклікаў.

[890] [30] Той муж вялікі — гэта Напалён Банапарта, цар пранцузькі.

[893] [31] Б е г л і  і з  п у ш ч  Л і б і й с к і х  п а д  А л ь п ы — гэта ўсё заморскіе краі, ат нас далёка.— П і р а м і д ы — то стаўбы кáмянные, вельмі вялікіе і старые. Іх яшчэ перэд нараджэньням Хрыста вымуровалі.— Дальшые прозвішча зямель усё заморскіх.

[917] [32] К н я ж э в і ч — анарал польськi.— Пад названьням Ц а з а р а ў разумець трэба Рымськую і ўсю Італянськую зямлю, каторай калісьці першым магучым каралём быў Цэзáр; ат яго то і пашло прозвішча цароў.— Ш т а н д á р — то знамя, каторая носяць перэд палком.— К а п і т о л ь — была то крэпасьць у горадзе заморськам Рыме. Усё гэта далёкіе і чужые крáі.

[920] [33] К н я з ь  Я б л а н о ў с ь к і — анарал польськi; ён правіў Наддунайськімі казакáмі, помер зá марам далёка, дый і яго войська там жэ загінула на вайне.

[967] [34] Б р а в і я р — то ксяндзоўськая да малітвы ксёнжка, пісана па-латыні.

К а н е ц  т а л к а в а н ь н я  Б ы л і ц ы  п е р ш а й

## ТАЛКАВАНЬНЯ БЫЛІЦЫ ДРУГОЙ

[10] [1] Не́ман — гэта вялікая на Літве рака: яна плыве чэ́раз Міньскую, Гродзеньскую, Віленьскую, Ковеньскую губэрніі, пасля ўходзіць у цяперашнюю Прускую зямлю і каля Мемля губіцца ў балтыцкам моры.

[14] [2] Камэта — звязда, што часам паказываецца на небе; вось як бачылі мы і ў цяперашням 1858 гаду, што бадзялася доўга па небе с вялікім хвастом.

[106] [3] Жакéі — гэтак паны, што жывуць на манер заморські, ма́няць сваіх лякаёў.

[216] [4] У ражонкі гуляла — гэта шпагі, што цяпер пяхотныя ахвіцэры носяць пры бака́х.

[229] [5] Прыма́с — найста́ршы ў польшы ксёндз Біскýп; ён, па смерці караля, пакуль другога, бывала, выбяруць, правіў польшаю.

[232] [6] У польшы быў абычай, што за абедам чы вячэрай, калі начнуць піць за здароўя, то на каньцы крычаць «Кахаймыся!», п'юць дый абнімаюцца.

[253] [7] Лаўчына — жана Лоўчага: гэта чын польські, тож Стольнік, Кашталян і другія.

[279] [8] Чорная юшка, падана за абедам чы вячэрай маладому чалавеку, каторы сватаецца да дзеўкі, значыла, што із сватаньня нічога ня будзе, што яму атмаўляюць панны.

[283] [9] За́кан Трэцяга мая быў пісаны ў 1793 гаду: гэны за́кан быў вельмі мудры і для ўсех людзей меў прынясьці шчасьця. У том за́кане стаяла, што калі хто, хаця б із чужой зямлі ступіць нагой на польськую, той мае быць вольным чалавекам. Сумежныя царствы ня згадзіліся на тое, штоб у палякоў быў такі за́кан, і сталі з імі ваяваць, вось уся амаль шляхта сабралася ў грамаду, штоб бараніцца. Грамада жэ такая звалася канфадэрацiа, а хто быў у той грамадзе — канфадэратам.

[369] [10] Мурграбля правіў цэлым замкам і глядзеў за парадкам у дамý.

[453] [11] Кожан Барнадын падпіразываецца белым шнурком, на каторым завязаны ўзялкі завуцца агуркамі.

[497] [12] Віцiны — гэта вялікія чаўны з ма́штамі, імі на вялікіх рэках купцы сплаўляюць усялякі тавар.

[592] [13] Піцярбурх — то другі сталічны горад Маскоўські; там жыве Цар Расійскі. Першы ж і старэйшы горад Масква.

[777] [14] Князь Дамінік Радзівіл вельмі багаты пан Літоўські, любіў ён мысліўства. Як пранцузы і палякі біліся с Маскоўскаю сілай, то ён сваім коштам паставіў полк уланаў. Памёр у пранцузкай зямлі.

Канец талкаваньня Другой быліцы

# DUBIA

## ПЛЫНУЦЬ ВЯТРЫ...

*[Паэма]*

### Cząść 1-ja

Płynuć wiatry at paŭnoczy,
Zasypajuć snieham woczy;
Honiać tuczy aławiany,
Nanosiać aznob pahany.
Tož nia wietry burawye,
To ž nia tuczy sniehawyje —
Maskoŭśka to siła walić,
Marozom, woś pryskom, smalić!
Czaho ž jana zakipieła?
— U Arszawu polecieła,
S harmatami, so strelbami,
Czy wajować s Palakami?

### I

Arszawa! maci nasza! ty polskaja sonca!
Łuczy twai, pałacy i sielski akonca
Woś matczyna hrudź, dzietak roŭno usich hrejuć,
Karonie, Litwie, Rusi swietłaść roŭnu siejuć.
Jak zoroczka jaśnieńka, woś kraska pryhoża!
Szto s taboju zrabili? na szto ty pachoża?
Hdzie twoj homan wiasioły? hdzie hołas piawuczy?
Nad taboju staŭpiliś hramawyje tuczy!..
Hlaniesz ciapier na ciabie — woś u piekle czorna,
Ciomna ŭ duszy — na siercu kažnamu nia zdorna,
Maŭlaŭ, sažaj, pakryta biedna twaja niwa,
Czahož ty dažyłasia, maci niaszczasliwa!

## II

Na Krakoŭskam predmieści lik božyja maci
U kraski, ahni strojny — woś obraz u chaci;
Cudoŭnaja to pani, kažuć dobry ludzie,
Chto jaje szczyra prosiŭ, toj łaski dabudzie.
Pad chwihuru staŭpiacca, maŭlaŭ kuraniata,
Pad krylla czutkaj matki: žydy i paniata,
Mužyczki, dzieci, starcy, panny i kabiety,
Usi smieszaliś i czyniać swiatye abiety:
Kažysia, sabralisia dzietki ŭ hramadce
Pamalicca i dabranoc rodnieńkaj dać matce.

## III

Czy rasparoliś tuczy i hrazu krawawu
Chłynuli s piarunami na biednu Arszawu,
Czy małanka hramadzie woczy wypiekaje,
Ne... to Maskal po swojemu u miesci hulaje.
Bywała u starynu (dziady tak kazali),
Kali niechrysty ziamlu naszu wajawali,
Ŭsiak bywała,— s dabytkam, chłopcaŭ i dziaŭczaty
Pałonili, sztob wykup brać za nich bataty,
Da ludziej pry malitwie strelboj nie hłumili,
Wobrazy szanowali, kryžoŭ nie rubili,
Hladź że Maskal szto robić!.. a jon chryścijanin
Horsz zdziekujecca ŭ Polszczy, jak lichi pahanin.

## IV

Paladź, czaladka boža, stoja na kalenach
Bez ružnicy ŭ atłasach, czy ŭ lichich pialenach,
Žydy, pany, mužyczki — ŭsi smiaszaliś razam,
Ŭ adzin hołas pred Matki haspodniej abrazem,
Spiewajuć «Swiaty Bože! Swiaty niasmiartelny!» —
Na pieradzie Dabrodziej dzieržyć kryž kascielny —

Ni kamieńczyka ŭ rukach nikto nie trymaje —
A Maskal, woś z zawuhła da ŭraha, strelaje,
Rubić, kole hramadku — kroŭ rakoju ljecca,
Tam kazak na kaniu s petleju niasetcca,
Hdzie upadnie czaławiek, jak sabaku troczyć,
Žyŭ, czy miortwy, biednaho na zamak wałoczyć,
Hołowa po kamieniach hudzie, woś u rohu,
Mazhi bryzžuć na pałacy, kroŭ znaczyć darohu.

## V

Tam idzie baćka s doczkaj — to kraska pryhoža!
Ledź paczała razcwietać — woś u puczku roža —
Kula jaje trapiła ŭ ruku — biedna mleje,
Baćka z žałosci doczki padniać nie paspeje,
Aż czatyroch kazakoŭ strałoj pryskakali,
Bednieńkuju dziciatku na petlu uziali.
Baćka da noh pahańcam — kryj Boh jak hałosić!
Kinuŭ miaszok s hraszyma, dyj — «niaruszcie» — prosić!
Hdzie tam! miaszok padniali, a baćku zabili,
Paśla aboich razem ŭ zamak pataszczyli.
Tut dzietaczak maleńkich koluć, tam stralajuć
Kabiet, tutka adziežku czornuju zdzirajuć,
Dalej czysciać kiaszeni — miaszoczki, zaharki,
Woś swai, na harełku hrabiać dla szynkarki.

## VI

Na pieradzie hramadki, szto maliłaś Bohu,
Ŭ sieredzinie xiądz s kryžam zahaczyŭ darohu,
Nia czurajecca smierci — k niebu padniaŭ zrenki,
Slozy barazdziać szczoki, a hołas stareńki
Zwonku wiadzie malitwu, jak abyczaj każe,
Nia zważaja na strelby i piki ŭraže.
Tolku jak ŭ susedztwie chto ŭpadzie z hramady,
Liaŭszoju kryž mocno imie, prawaj daje rady,
Sztob na toj swiet darohu ŭpratać szczaśliwu
Na razhreszenia ruku ŭžymie litaściwu.

## VII

Nia marskaja to woŭna ziamlu naciskaje,
Nia sarancza dar boży na poli zmiataje,
Heta maskoŭski zastup na kaniach haraczych.
Ŭse ŭ sinich mundzirach u szapkach bliściaczych,
S wierchu szapki chwost koński, wieciar razwiewajeć —
Kažon straszennu szablu u ruce trymajeć —
Režeć, kaho papała, nanosić trawohu
Mež ludziej, szto pakojna molucca tam Bohu.
Kaho nia swalić szabla, taho topczuć koni.
Najpiersz ksiandza srubili, szto kryž u d[a]łoni
Trymaŭ silnoj rukoju — ŭwieś kroŭju abliŭsia,
Jak srublena tapola, k ziamli pochiliŭsia,
I kryž s nim pachinuŭsia. Tut padskoczyŭ smieły
Nawakoŭski, chwaciŭ kryž — hladź! — u rubcach cały,
Hreszny ruki pasmieli na Boha padniacca:
I toj Chrystom nia paspeŭ doŭha lubawacca,
Jaho na zem swalili — paladź!.. cud hatowy:
U abaronie kryža staŭ czaławiek nowy,
Żydok — czuli ž wy heta, dobry chryscijanie?
Tož Maskali horszyje ad żydoŭ pahanie?
Liande jamu prozwiszcza — u straszennu poru
Chwaciŭ kryž ŭ obie ruki, padniaŭ jaho ŭ horu,
Kalib dobrye ludzie baczyli to dziwa,
Bohu chyba pryci mohła mysl taka szczasliwa;
Widać, chacieŭ, sztob cały s[w]iat podziwowaŭsia,
Szto Maskal at niechrysta horszym pakazaŭsia.
Zastrelili i jaho — upaŭ — da lik boży
Nakryŭ saboj — pa śmierci sztob być na staroży.

## VIII

Tak Maskali hulali pa biednaj Arszawie.
Za sztož jany rezali ludziej — u jakoj sprawie
Narod im prawiniŭsia? za szto chryscijanski
Car wialeŭ zdziekawacca, woś turak pahański?

Palak to pierszy silna paczaŭ naklikacca,
Szto, bacz, para mužyczku z wolnasciu spaznacca,
I jak Haspodź za ludziej na kryž atdaŭ ruki,
Palak za nas achwotno pryniaŭ straszny muki,
Za nas cierpić kryž pański — za wieru, swabodu.
Razkazać papytaju wam taku pryhodu. —

## Cząść 2-ja

Jak pasłaŭsia,
Tak praspaŭsia!
— Kruci nia wiarci,
A treba ŭmiarci!

Nazad tamu dziesiać let,
Zahniewaŭsia cały swiet
Na Maskoŭskaho Cara,
Szto jon wielmi pyszny staŭ,
Usim padnos panam kiwaŭ,
Tož uniać jaho para!

Prancuzoŭ Car Napalonn
Kryknuŭ na swaich «hulon»!
Maszyr Turku pamahać!
S nimže zamarski pany,
Szto ich kliczuć brytany —
Paszli Maskwu wajuwać.

Car Maskoŭski aż pacieŭ,
Swaho wojska nia žaleŭ.
Hdzież durnomu wiasci boj?
Idzi lepsz łapci placi,
Za dur życiom zapłaci,
Potrasi, brat, miaszok swoj!

Po im syn hołowarez
Na tron maskoŭski uzlez,
Staŭ kłaniacca prancuzu.

«Мój lebiedźka darahi!
Prabacz baćkawy hrechi,
Szto choczesz, usio zrablu!»

I sabralisia stary
Sa ŭsich zemieł pisary,
Paszli miru wiaści ład;
Nuž Maskalu dapiakać,
Nuž palcam pad nos kiwać.
Oj nie wielmi byŭ jon rad!

Najpiersz staŭ kazać prancuz,
Naduŭszysia, jak harbuz —
Rukoj hrozić, kułakom,
Až zatrossia Maskalok,
Woś asinawy listok,
Wołosy aż stali dybom.

«Ŭsia wasza czynoŭna znać,
Zwykła narod abdzirać,
Jaki wasz zakon, da sud?
Chto maje hroszy, toj praŭ,
Choć abdziraŭ, chacia kraŭ,
Cześć wasza — to hnoj, to brud». [...]

## Часьць 1-я

Плы́нуць вя́тры ат паўночы,
Засыпаюць снегам вочы;
Гоняць тучы алавяны,
Наносяць азноб паганы.
Тож ня ветры буравые,
То ж ня тучы снегавыя —
Маскоўська то сіла валіць,
Марозом, вось прыском, смаліць!
Чаго ж яна закіпела?

— У Аршаву поляцела,
С гарматамі, со стрэльбамі,
Чы ваёваць с палякамі?

## I

Аршава! маці наша! ты польская сонца!
Лучы тваі, палацы і сельскі аконца,
Вось матчына грудзь, дзетак роўно ўсіх грэюць,
Кароне, Літве, Русі светлосьць роўну сеюць.
Як зорочка ясьненька, вось краска прыгожа!
Што с табою зрабілі? на што ты пахожа?
Гдзе твоїй гоман вясёлы? гдзе голас пявучы?
Над табою стаўпілісь грамавыя тучы...
Глянеш цяпер на цябе — вось у пекле чорна,
Цёмна ў душы — на сэрцу кажнаму ня здорна,
Маўляў са́жай, пакрыта бедна твая ніва,
Чагож ты дажылася, маці няшчасліва!

## II

На Кракоўскам прэдмесьці лік Божыя Маці
У краскі, агні стройны — вось образ у хаці;
Цудоўная то пані, кажуць добры людзе,
Хто яе шчыра просіў, той ласкі дабудзе.
Пад хвігуру стаўпяцца, маўляў куранята,
Пад крылля чуткай маткі: жыды і панята,
Мужычкі, дзеці, старцы, панны і кабеты,
Усі смешаліс і чыняць святые абеты:
Кажыся, сабраліся дзеткі ў грамадцэ
Памаліцца і дабраноц родненькай даць матцэ.

## III

Чы распаролісь тучы і гразу крававу
Хлынулі с пярунамі на бедну Аршаву,
Чы маланка грамадзе вочы выпекае,
Не... то маскаль по-своему у месці гуляе —

Бывала ў старыну (дзяды так казалі),
Калі нехрысты зямлю нашу ваявалі,
Ўсяк бывала,— с дабыткам, хлопцаў і дзяўчаты
Палонілі, штоб выкуп браць за ніх багаты,
Да людзей пры малітве стрэльбой не глумілі,
Вобразы шановалі, крыжоў не рубілі,
Глядзь жэ маскаль што робіць!.. а ён хрысьціянін
Горш здзекуецца ў Польшчы, як ліхі паганін.

## IV

Палядзь, чалядка Божа, стоя на каленах
Без ружніцы ў атласах, чы ў ліхіх пяленах,
Жыды, паны, мужычкі — ўсі смяшалісь разам,
У адзін голас прэд Маткі Гасподней абразэм,
Спеваюць *«Святы Божэ! Святы нясмяртэльны!»* —
На перадзе Дабродзей дзержыць крыж касцельны —
Ні каменьчыка ў руках нікто не трымае —
А маскаль, вось з-за вугла да ўрага, стрэляе,
Рубіць, коле грамадку — кроў ракою льецца,
Там казак на каню с петлею нясецца,
Гдзе упадне чалавек, як сабаку трочыць,
Жыў чы мёртвы, беднаго на замак валочыць,
Галава па каменях гудзе, вось у рогу,
Мазгі брызжуць на палацы, кроў значыць дарогу.

## V

Там ідзе бацька с дочкай — то краска прыгожа!
Ледзь пачала разцветаць — вось у пучку рожа —
Куля яе трапіла у руку — бедна млее,
Бацька з жаласці дочкі падняць не паспее,
Аж чатырох казакоў стралой прыскакалі,
Бедненькую дзіцятку на петлю узялі.
Бацька да ног паганьцам — крый Бог як галосіць!
Кінуў мяшок с грашыма, дый — «нярушце» — просіць!

Гдзе там! мяшок паднялі, а бацьку забілі,
Пасьля абоіх разэм ў замак паташчылі.
Тут дзетачак маленькіх колюць, там страляюць
Кабет, тутка адзежку чорную здзіраюць,
Далей чысцяць кяшэні — мяшочкі, загаркі,
Вось сваі, на гарэлку грабяць для шынкаркі.

## VI

На перадзе грамадкі, што малілась Богу,
Ў серэдзіне ксёндз с крыжам загачыў дарогу,
Ня чураецца смерці — к небу падняў зрэнкі,
Слёзы бараздзяць шчокі, а голас старэнькі
Звонку вядзе малітву, як абычай кажэ,
Ня зважая на стрэльбы і пікі ўражэ.
Тольку як ў суседзтве хто ўпадзе з грамады,
Ляўшою крыж моцно іме, правай дае рады,
Штоб на той свет дарогу ўпратаць шчасьліву
На разгрэшэня руку ўжыме літасьціву.

## VII

Ня марская то воўна зямлю націскае,
Ня саранча дар Божы на полі змятае,
Гэта маскоўскі заступ на канях гарачых.
Ўсе ў сініх мундзірах, у шапках блісьцячых,
С верху шапкі хвост коньскі вецяр развеваець —
Кажон страшэнну шаблю у руцэ трымаець —
Рэжэць каго папала, наносіць трывогу
Меж людзей, што пакойна молюцца там Богу.
Каго ня сваліць шабля, таго топчуць коні.
Найперш ксяндза срубілі, што крыж у д[а]лоні
Трымаў сільной рукою — ўвесь кроўю абліўся,
Як срублена таполя, к зямлі пахіліўся,
І крыж с нім пахінуўся. Тут падскочыў смелы
Навакоўскі, хваціў крыж — глядзь! — у рубцах цэлы,

Грэшны рукі пасмелі на Бога падняцца:
І той Хрыстом ня паспеў доўга любавацца,
Яго на зем свалілі — палядзь!.. цуд гатовы:
У абароне крыжа стаў чалавек новы,
Жыдок — чулі ж вы гэта, добры хрысціяне?
Тож маскалі горшые ад жыдоў пагане?
Ляндэ яму прозвішча — у страшэнну пору
Хваціў крыж ў обе рукі, падняў яго ў гору,
Каліб добрые людзе бачылі то дзіва,
Богу хіба прыці могла мысль така шчаслива;
Відаць, хацеў, штоб цэлы с[в]ят подзіваўся,
Што маскаль ат нехрыста горшым паказаўся.
Застрэлілі і яго — упаў — да лік Божы
Накрыў сабой — па сьмерці штоб быць на старожы.

## VIII

Так маскалі гулялі па беднай Аршаве.
За штож яны рэзалі людзей — у якой справе
Народ ім правініўся? за што хрысціянскі
Цар вялеў здзекавацца, вось турак паганьскі?
Паляк то першы сільна пачаў наклікацца,
Што, бач, пара мужычку з вольнасцю спазнацца,
І як Гасподзь за людзей на крыж атдаў рукі,
Паляк за нас ахвотно прыняў страшны мукі,
За нас церпіць крыж паньскі — за веру, свабоду.
Разказаць папытаю вам таку прыгоду.

## Часьць 2-я

Як паслаўся,
Так праспаўся!
— Круці ня вярці,
А трэба ўмярці!

Назад таму дзесяць лет
Загневаўся цэлы свет
На маскоўскага цара,
Што ён вельмі пышны стаў,
Усім пад нос панам ківаў,
Тож уняць яго пара!

Пранцузоў цар Напалён
Крыкнуў на сваіх «гулён»!
Машыр турку памагаць!
С німжэ замарскі паны,
Што іх клічуць брытаны,—
Пашлі Маскву ваяваць.

Цар маскоўскі аж пацеў,
Сваго войска ня жалеў.
Гдзеж дурному вясці бой?
Ідзі лепш лапці пляці,
За дур жыццём заплаці,
Патрасі, брат, мяшок свой!

По ім сын головарэз
На трон маскоўскі узлез,
Стаў кланяцца пранцузу.
«Муй лебедзька дарагі!
Прабач бацькавы грэхі,
Што хочэш, усё зраблю!»

І сабраліся стары
Са ўсіх земель пісары,
Пашлі міру вясьці лад;
Нуж маскалю дапякаць,

Нуж пальцам пад нос ківаць.
Ой не вельмі быў ён рад!

Найперш стаў казаць пранцуз,
Надуўшыся, як гарбуз —
Рукой грозіць, кулаком,
Аж затросся маскалёк,
Вось асінавы лісток,
Воласы аж сталі дыбом.

«Ўся ваша чыноўна знаць,
Звыкла народ абдзіраць,
Які ваш закон да суд?
Хто мае грошы, той праў,
Хоць абдзіраў, хаця краў,
Чэсьць ваша — то гной, то бруд». [...]

## ГУТАРКА СТАРОГА ДЗЕДА

Ej, skażycie, dobry ludzi!
Szto heta na świecie budzie?
Czy Boh nie zmiłujetsia nad nami
I daść pahinuć pad Maskalami?..
Oj nie, bratcy! nia tużycie;
Na tu poru ŭspamianicie,
Jak pred daŭnimi hadami
Biŭsia Palak z Maskalami.
Za szto ż jany wajawali,
Stolki krowi razliwali?
Oj za toja, szto narodu
Palak chacieŭ dać swabodu!
Jak Maskal taho daczuŭsia,
To na Polszczu nawiarnuŭsia,
I Niemiec staŭ pamahaci,
Sztob Palaka zwajawaci.

I bilisia, wajawali,
Pakul Palaka prahnali;
Oj da panios swajo hore,
Biedny Palak aż za more,
Da słaŭnaha, da narodu,
Szto sam wyszaŭ na swabodu,
Szto cały świet jaho znaje
I Prancuzom nazywaje.
Prancuz pryniaŭ ich za braci,
Ale nia moh ratawaci,
Bo sam ciażka z Niemcom biŭsia,
Ad niawoli baraniŭsia.
Maskal u Polszczy razsieŭsia,
Oj da zaraz u kości wjeŭsia,
Staŭ padatki wybierać,
U rekruty zabierać.
Wialeŭ sypać magazyny,
Niby dla hetaj pryczyny,
Kab jak zdarycca patreba —
Mużyk moh tam dastać chleba.
A jak sam staŭ wajawać,
Wialeŭ magazyn zabrać,
U aboz wiaźci ŭsio zboże,
A narod — choć hiń, niaboże!
A jak woźmieć usio z chaty,
Jaszczo sam idzi ŭ sałdaty,
Kidaj żonku, dzietki ŭ domu,
Jedź u kałodce da pryjomu.
Jak wojska użo nia treba,
To sałdat sam szukaj chleba;
Szleć ŭsich damoŭ — nie pytaje,
Ci katory dom swoj maje.
Tolki wialić nie szatacca,
Na prykaz tojczas jaŭlacca;
Nasi boty da halisia,
Choć ziamlu hryzi — żywisia.
Daŭniej ludzi dobra żyli
I druhich dobra uczyli;

Maskal sam dabra nie znaje,
To i licha nauczaje.
Staŭ Kaścioły adbierać,
Zaczaŭ ksiandzoŭ razhaniać,
Druhim wialeŭ być Papami,
Chadzić u ryzach z baradami.
Bić pakłony i uczycca,
Jak pa maskoŭsku malicca,
Choć paciery, szto jon maje,
To ich nichto nie zhadaje.
Niechaj że chto słowa skażyć,
Maskal jaho zaraz zwiażyć,
I zdaroŭja adbiraje,
I na Sybir pasyłaje.
A hdzie żandar zwankom zwiahnie,
Ludziej dobrych ŭ turmu ciahnie,
Ci ubohi, ci bahaty,
Wałaczeć ad siamji z chaty!
Czynoŭniki ŭsie zbytkując,
Abdzierając i katując,
Hłumiać, kryŭdziać, raźbiwając
I płakać nie pazwalając.
Za Palakom, to bywała
I padatka płacisz mała,
A chto mieŭ pana lichoha —
Paszoŭ sabie da druhoha.
Jak maskali k nam nastali,
Usich u skazki papisali,
Szlachcicoŭ [ża] z mużykami
Hłumiać, jak zachoczuć sami.
Z duszy rekrut i padatki,
Choć ty hiń, a daj astatki,
I kab usich zahubić,
Daj akcyzu stanawić.
Ale ż, bratcy, nia tużycie!
Lepiej u Boha prasicie
Miłasiernaha, kab skora
Pieramianiŭ nasze hora!

Palak usio heta znaje,
Ciapier siły nabiraje:
I Prancuzoŭ padmaŭlaje,
Pary sobie wyhladaje.
Jak Palakoŭ zwajawali,
Da Prancuza jak prahnali,
Prancuzy chacieli sami
Iści nazad z Palakami.
I paszli i Maskwu ŭziali,
Palakom Polszczu addali,
No Maskal tut spachwyciŭsia,
Daj z Niemcami zhawaryŭsia.
I siudy-tudy krucili,
Wajawali i płacili,
Pakul Prancuz nie paddaŭsia,
Znoŭ ŭ niawolu nie dastaŭsia.
Jak Prancuz paszoŭ u niawolu,
Tady Maskal zmohsia ŭ wolu.
Znoŭ zaczoŭ narod hłumić,
Pa swajmu ludziej hubić.
Prancuz tymczasam pawoli
Staŭ wybiracca z niawoli,
Prahnaŭ Karala lichoha,
Da wybraŭ sabie druhoha.
A jak tolka zmacawaŭsia,
To z Maskalom i zadraŭsia.
Zaczaŭ bici, wajewać,
Swaju kryŭdu ŭspaminać.
Oj biŭ, dakul wojska stała,
I atniaŭ ziamli niemała,
Aż Maskal musieŭ prasicca,
Sztob z Prancuzom pahadzicca.
A Prancuz, jak pisaŭ zhodu,
To zaściaroh, kab narodu
Usiakamu wolność daci,
Nikoha nie prymuszaci.
Maskali choć abiecali,
Da taho nie datrymali,

Bo Prancuz nia mieŭ spakoju,
Paszoŭ na Niemca wajnoju.
Bo i Niemiec ŭ chitrość ŭszyŭsia,
Za Maskala nie zastupiŭsia,
Da staŭ inszych zabierać,
Na swoj zakon prymuszać.
Prancuzy heta jak zaznali,
Tahdy na Niemca napali,
Daj znoŭ bicca, kab narodu
Usiakomu dać swabodu.
Niemca saŭsim zwajawali,
Z czużoj ziamli pierahnali,
I na wieczny czas wialeli,
Kab Niemcy tam jści nia śmieli,
Kab bolsz złoha nie rabili
Da narodu nie hłumili,
Kab Cary nia mieli woli,
Brać nikoha da niawoli.
Pa ŭsim świecie raspisali,
Sztob usie ludzi skazali,
Jak katory chocze być,
Pad jakim zakonam żyć?!.
Papy ciapier durać-muciać,
Prosty narod bałamuciać,
Maskal, każuć, maje wolu,
Palachczyć nam naszu dolu.
Oj! nia wiercie tamu ludzi,
Niczoha z taho nia budzie,
Kali b chacieŭ tak zrabić,
Daŭno b to musiało być.
Maskal ciapier wolu maje,
Jak zachocze, tak upraŭlaje,
A jak tolki szto nakaże,
Musisz zrabić, jak prykaże.
Katoryje pany spahadali,
Wolność ludziam dać żadali,
Tych u kleszczy Maskal żaŭ,
A nas na Skarb zabieraŭ.

Najeżdżajuć prosta zhraja,
Asesaraŭ, czort ich znaja,
Bjuć, da duszać, da miesiać,
Na adnaho panoŭ dziesiać.
Wot jakuju jon swabodu
Choczyć rabić dla Narodu.
Wot jak ludziam spahadaŭ,
Pakul Prancuz na kark siaŭ.
Jak prycisnuli Maruchu,
Jak zadali ŭ Krymie duchu,
Jak wialeli nie mieszać,
Wolność usim ludziam dać.
To ciapier Maskal piaje
Mudraheliki swaje,
Ciapier kryczyć: heta Ja!
Chicier Dmicier jak źmieja!
Choć mudraki wymyślajuć,
Szto pany pieraszkadżajuć,
Szto krucili i płacili
I Maskala padkupili.
Na szto ż jamu podkup brać,
Kali tak, jak wialić dać,
Skażuć — zapłaci, niaboże,
Tam krucielstwa nie pamoże.
Hdzie tam pany prarabili?
Ich u Sybir wałaczyli,
Usiu szlachtu kasawali,
I majątki adbirali...
Budzie tak i z mużykami,
Bo Maskali choczuć sami,
Kab Mużykoŭ pilnawać,
Ŭ niczom woli nie dawać.
Sztob ŭsiakaha najci ŭ poru
Da rekruckaha naboru,
Kab schadniej było ławici
Da i u pryjom wadzici.
A jak pryducca padatki,
Zdziaruć z każdaha astatki;

Niechaj pany choć jak prawiać,
Ŭsio ŭ dwor ahzakuciu stawiać.
Uważajci ż dobra ludzi:
Z Maskalom tołku nie budzie,
A wiedajcie ż szto rabić,
Kab Ajczyznu baranić?!
Na wiasnu — jak daść Boh — hranieć
Prancuz, Palak z żaŭnierami,
I jak Polszcza ŭsia ustanieć —
Idziom i My z Palakami.
Kali staniem z Palakami,
Budziem roŭnymi z panami,
Usim szczaście Boh nam daść,
I prapadzie Maskoŭska właść!

Эй, скажыце, добры людзі!
Што гэта на сьвеце будзе?
Чы Бог не змілуецца над намі
І дасьць пагінуць пад маскалямі?
Ой не, братцы! ня тужыце;
На ту пору ўспамяніце,
Як прэд даўнімі гадамі
Біўся паляк з маскалямі.
За што ж яны ваявалі,
Столькі крові разлівалі?
Ой за тоя, што народу
Паляк хацеў даць свабоду!
Як маскаль таго дачуўся,
То на Польшчу навярнуўся,
І немец стаў памагаці,
Штоб паляка зваяваці.
І біліся, ваявалі,
Пакуль паляка прагналі;
Ой да панёс сваё горэ
Бедны паляк аж за морэ,

Да слаўнага, да народу,
Што сам вышаў на свабоду,
Што цэлы сьвет яго знае
І пранцузом называе.
Пранцуз прыняў іх за браці,
Але ня мог ратаваці,
Бо сам цяжка з немцом біўся,
Ад няволі бараніўся.
Маскаль у Польшчы разсеўся,
Ой да зараз у косьці ўеўся,
Стаў падаткі выбераць,
У рэкруты забераць.
Вялеў сыпаць магазыны,
Нібы для гэтай прычыны,
Каб як здарыцца патрэба —
Мужык мог там дастаць хлеба.
А як сам стаў ваяваць,
Вялеў магазын забраць,
У абоз вязьці ўсё збоже,
А народ — хоць гінь, нябоже!
А як возьмець усё з хаты,
Яшчэ сам ідзі ў салдаты,
Кідай жонку, дзеткі ў дому,
Едзь у калодцэ да прыёму.
Як войска ўжо ня трэба,
То салдат сам шукай хлеба;
Шлець ўсіх дамоў — не пытае,
Ці каторы дом свой мае.
Толькі вяліць не шатацца,
На прыказ тойчас яўляцца;
Насі боты да галіся,
Хоць зямлю грызі — жывіся.
Даўней людзі добра жылі
І другіх добра вучылі;
Маскаль сам дабра́ не знае,
То і ліха навучае.
Стаў касьцёлы адбіраць,
Зачаў ксяндзоў разганяць,

Другім вялеў быць панáмі,
Хадзіць у рызах з барадáмі.
Біць паклоны і вучыцца,
Як па-маскоўску маліцца,
Хоць пацеры, што ён мае,
То іх ніхто не згадае.
Няхай жа хто слова скажыць,
Маскаль яго зараз звяжыць,
І здароўя адбірае,
І на Сыбір пасылае.
А гдзе жандар званком звягне,
Людзей добрых у турму цягне,
Ці ўбогі, ці багаты,
Валачэць ад сям'і з хаты!
Чыноўнікі ўсе збыткуюць,
Абдзіраюць і катуюць,
Глумяць, крыўдзяць, разьбіваюць
І плакаць не пазваляюць.
За палякам, то бывала,
І падатка плаціш мала,
А хто меў пана ліхога —
Пайшоў сабе да другога.
Як маскалі к нам насталі,
Усіх у сказкі папісалі,
Шляхціцаў з мужыкамі
Глумяць, як захочуць самі.
З душы рэкрут і падаткі,
Хоць ты гінь, а дай астаткі
І, каб усіх загубіць,
Дай акцызу станавіць.
Але ж, братцы, ня тужыце!
Лепей у Бога прасіце
Міласэрнага, каб скора
Перамяніў наша гора!
Паляк ўсё гэта знае,
Цяпер сілы набірае:
І пранцузоў падмаўляе,
Пáры собе выглядае.

Як палякаў зваявалі,
Да пранцуза як прагналі,
Пранцузы хацелі самі
Ісьці назад з палякамі.
І пайшлі і Маскву ўзялі,
Палякам Польшчу аддалі,
Но маскаль тут спахвыціўся
Дай з немцамі згаварыўся.
І сюды-туды круцілі,
Ваявалі і плацілі,
Пакуль пранцуз не паддаўся,
Зноў у няволю не дастаўся.
Як пранцуз пайшоў ў няволю,
Тады маскаль змогся ў волю.
Зноў зачаў народ глуміць,
Па-свайму людзей губіць.
Пранцуз тым часам паволі
Стаў выбірацца з няволі,
Прагнаў караля ліхога
Да выбраў сабе другога.
А як толька змацаваўся,
То з маскалём і задраўся.
Зачаў біці, ваяваць,
Сваю крыўду ўспамінаць.
Ой біў, дакуль войска стала,
І атняў зямлі нямала,
Аж маскаль мусіў прасіцца,
Штоб з пранцузом пагадзіцца.
А пранцуз, як пісаў згоду,
То засьцярог, каб народу
Усякаму вольнасьць даці,
Нікога не прымушаці.
Маскалі хоць абяцалі,
Да таго не датрымалі,
Бо пранцуз ня меў спакою,
Пайшоў на немца вайною.
Бо і немец у хітрасьць учыўся,
За маскаля не заступіўся,

Да стаў іншых забераць,
На свой закон прымушаць.
Пранцузы гэта як зазналі,
Тагды на немца напалі
Дый зноў біцца, каб народу
Усякаму даць свабоду.
Немца саўсім зваявалі,
З чужой зямлі перагналі
І на вечны час вялелі,
Каб немцы там йсьці ня сьмелі,
Каб больш злога не рабілі
Ды народу не глумілі,
Каб цары ня мелі волі
Браць нікога да няволі.
Па ўсім сьвеце распісалі,
Штоб усе людзі сказалі,
Як каторы хоче быць,
Пад якім законам жыць?!
Папы цяпер дураць-муцяць,
Просты народ баламуцяць,
Маскаль, кажуць, мае волю,
Паляхчыць нам нашу долю.
Ой! ня верце таму, людзі,
Нічога з таго ня будзе,
Калі б хацеў так зрабіць,
Даўно б то мусяло быць.
Маскаль цяпер волю мае,
Як захоча, так упраўляе,
А як толькі што накажа,
Мусіш зрабіць, як прыкажа.
Каторыя паны спагадалі,
Вольнасьць людзям даць жадалі,
Тых у клешчы маскаль жаў,
А нас на скарб забіраў.
Наяжджаюць проста зграя
Асэсараў, чорт іх зная,
Б'юць, да душаць, да мéсяць,
На аднаго паноў дзесяць.

Вот якую ён свабоду
Хочыць рабіць для народу.
Вот як людзям спагадаў,
Пакуль пранцуз на карк сяў.
Як прыціснулі маруху,
Як задалі ў Крыме духу,
Як вялелі не мяшаць,
Вольнасьць усім людзям даць.
То цяпер маскаль пяе
Мудрагелікі свае,
Цяпер крычыць: гэта Я!
Хіцер Дміцер — як зьмея!
Хоць мудракі вымысьляюць,
Што паны перашкаджаюць,
Што круцілі і плацілі
І маскаля падкупілі.
На што ж яму подкуп браць,
Калі так, як вяліць даць,
Скажуць — заплаці, нябожэ,
Там круцельства не паможэ.
Гдзе там паны прырабілі?
Іх у Сыбір валачылі,
Усю шляхту касавалі
І маёнткі адбіралі...
Будзе так і з мужыкамі,
Бо маскалі хочуць самі,
Каб мужыкоў пільнаваць,
Ў нічом волі не даваць.
Штоб ўсякага найці ў пору
Да рэкруцкага набору,
Каб схадней было лавіці
Да і у прыём вадзіці.
А як прыдуцца падаткі,
Здзяруць з каждага астаткі;
Няхай паны хоць як правяць,
Усё ў двор агзакуціў ставяць.
Уважайце ж добра, людзі:
З маскалём толку не будзе,

А ведайце ж, што рабіць,
Каб Айчызну бараніць?!
На вясну — як дасьць Бог — гранець
Пранцуз, паляк з жаўнерамі,
І як Польшча ўся ўстанець —
Ідзём і мы з палякамі.
Калі станем з палякамі,
Будзем роўнымі з панамі,
Усім шчасьце Бог нам дасьць,
І прападзе маскоўска ўласьць!

## ГУТАРКА ДВУХ СУСЕДАЎ

### № 1

Józaf

Niachaj bendzie pachwalony
Jezus Chrystus! Jak sien macie,
Czy zdarowy ŭsenki ŭ chace
I što čuwać z wašaj strony?

Mateuš

Oj, zdarowy, ŭsenki żywy,
Da spytajce, čy ščasliwy...

Józaf

Ej wy, dziadźku, nie tužyce,
Lepej Boha paprasice,
Bo haworać miežda nami,
Szto car zrobić nas panami.
Wialeŭ, kab ziamlu kupili,
Jamu hrošy zapłacili,
To mužyk, jak šlachcic, budzie,
Ŭsieje biedańki zabudzie.

Mateuš

A ja ot jak čuŭ, niaboža,
Szto car nic zrabić nie moža,
Tylka choča ašukaci,
Ŭsieńki hrošy ad nas ŭziaci,
Kab było čem padkupici
Dej z prancuzam ŭ zhodzie życi.
Bo jak prancuzy uznali,
Szto maskali wyčaŭplali,
Jak narod wieś pahłumili,
Ŭsieńki dwory spustašyli
I lud polski — katalicki
Prewiarnuli ŭ syzmatycki,
To prancuz za heta ŭziaŭsia:
Zaraz pred Bohem zakłaŭsia
Maskala nie darawaci
I z ziamli našej prahnaci.
Tak ot moskal uchitryŭsia
Dej na krucelstwa puściŭsia:
Choča zemlu ŭsiu pradaci,
Kab nie žal było kidaci.
Otuž posłuchaj, susiedzie:
Jak rond polski, daść Boh, budzie,
To tahdy ŭsiamu narodu
Daść Boh ziemlu i swabodu.

Józaf

Czy ž palaki z prancuzami
Maskala zwajujuć sami?

Mateuš

I prancuzaŭ nam nie treba,
Bo nam Buh najwyššy z nieba
Dapamoža wajawaci
I maskaloŭ proč prahnaci.
Bo ŭže wielmi nahrašyli,
Mnoha ludziej pahłumili,
A ŭ Waršawie Boskaj Matki

Obraz podrali na šmatki,
Kryž z Chrystusam parubali,
A što ludu nastralali,
Jak šatani, odpuść winy,
A ŭsio biez žadnej pryčyny:
Za to, što lud chryscijański
Szanuje swiaty kryž Pański.
To nam Pan Buh dapamoža
Prahnać maskaloŭ, niaboža.

Józaf

Ach, daj, Boža, ach, daj, Boža!
Ale jak polak, niaboža,
Nie daść mužyku apieki,
To my zhiniem na wiek-wieki!

Mateuš

Oj, nie tak, moj ty susiedzie,
Siemdziesiat let tomu budzie,
Jak palak ŭsiamu narodu
Chacieŭ było dać swabodu.
A maskal jak to dačuŭsia,
Zaraz z niemcam zhawaryŭsia,
Dej na polaka napali
I ŭsiu zemlu adabrali,
Kab ludziej nie naučyli
I wolnymi nie zrabili.
Bo nie było b z kaho draci
I ŭ rekruty kaho braci.
A ciapier, jak biedu čuje,
To i wolnaść deklaruje.

Józaf

O, ciapier to ŭseńka znaju
I što Boha prasić maju,
Prasić budu, kab Buh miły
Prohnać maskaloŭ daŭ siły,
Kab bolš kryžoŭ nie łamali,

Nas ŭ niawoli nie trymali.
Bo nihdy dabra nie budzie,
Poki moskal rondzić budzie.

## № 2

Józaf

Muj sakoliku susiedzie,
Musi koniec swieta budzie,
Bo ŭže nadta car hulae
I ludziej, jak psoŭ, stralae.
Чuwać, što ŭ ruskaj hubierni,
Hdzie narod byŭ jamu wierny,
Дzesiać tysiač rasstralali
Za to, što praŭdy iskali.
A ŭ Waršawie ŭse kascioły,
Nawat use žydoŭske školy
Abadrali, abakrali
I lud z kosciołoŭ zabrali
Dej u niawolu zasadzili,
Kab bolš Boha nie chwalili,
A ŭsio pa ukazu cara.
Moža jon, niačysta wiara,
Antychryst, što, kažuć ludzi,
Perad końcom swieta budzie.
Bo jon wielmi krucić-mucić,
Narod Boży bałamucić,
Siabie Boham nazywae,
Kto nie wieryć, tych stralae.

Mateuš

Otož bačyš, moj mileńki,
Car tak hłumić narod ŭseńki,
Czy lud polski, čy maskoŭski,
Katalicki, čy žydoŭski,
Дziare skuru, to stralae,
To znoŭ ŭ Sibir wysyłae,

A za što, kab zapytaci,
Sam nie znaŭ by, što skazaci.

Józaf

Oj, to praŭda, što maskali
Mała skury nie zadrali!
Daŭniej byŭ chleb i da chleba,
Była upraž, jak patreba,
Muki i krup poŭny ɸasy,
Poŭny swieran byŭ akrasy.
Домik, praŭda, byŭ stareńki,
Da ščasliwy byli ŭseńki.
A jak moskale nastali,
To my, jak myšy, prapali...
I ziamla ciapier nie rodzić,
Choć paseješ, to nie schodzić,
A choć zyjdzie, hrad papsuje,
I žywinka nie šychuje...

Mateuš

Чemu ž daŭniej ŭsio radziła,
Bo syzmy daŭniej nie była,
Pana Boha ŭse chwalili
I ščasliwy ŭseńki byli.
Daŭniej każdy byŭ bahaty,
Bo płacili z każdaj chaty
Po piać złotych na padatki,
A maskal dziare astatki...
A jaki jon chitry, brace!
Kab lepej moh z ludziej draci
I kab ludzi to nie znali,
Na jaho nie narakali,
To jon z panoŭ draŭ što siły,
A pan skul woźmie, moj miły,
Z mužyka pan musiŭ draci
I carewi ŭsio addaci.
A kab Boh nie zlitawaŭsia
I za swoj narod nie ŭziaŭsia,

Wialeŭ syzmu zawadzici,
Kab nas ad Boha adbici,
Tak ciapier nas Boh karae
I ŭse biedy nasyłae
Za to, što my zahrašyli,
Boskaj chwały ŭže zabyli.

Józaf

Ot jak car zhubiŭ nawieki,
Z boskaj wyrwaŭ nas apieki.
To kto ž ciapier nam pamoža!
Musi zhiniemo, niaboža!

Mateuš

Otož posłuchaj, mileńki,
Kab nie byli durni ŭseńki,
A kryknuli ŭ adno słowa:
Niachaj Polska budzie znowu,
Hodzie tobie, car praklenty,
Hubić narod Polski swienty,
Brać rekruty, drać padatki,
Zabirać astatki z chatki,—
To nie moh by nic zrabici
I musiaŭ by ustupici.
A jak to nie zrobiać ludzi,
To swabody ŭ nas nie budzie,
Bo choć panščynu skasuje,
A jak zemlu ačynšuje
Dej paličyć rekrutowie
I padatki, i čynšowie,
I za duši miortwy j żywy,
To što zrobiš nieščasliwy?

Józaf

Zrobim, dziadźku, jak skazali,
A ŭ nas budzie raj,
Pojduć proč ad nas maskali,
Szto nam Boža daj.

## № 3

Józaf
Hej, bratočki, zahulajmy
De wiasioła zaspiawajmy;
Hodzie tužyć, narakaci,
Pan nie budzie skuru draci!

Mateuš
A muj Józafe mileńki,
Jaki ty jašče durnieńki!
Rad, što cebie ašukali
I niby swabodu dali.

Józaf
Эj, dziadźku, nie wymyslajce
I mianie wielmi nie łajce!
Bo ja nie ŭmieju čytaci,
To skuł ža mahu što znaci?

Mateuš
Praŭda, što ty ni čytaci
Nie umieješ, ni pisaci,
To swaej biady nie znaeš
I rad, što pana nie maeš.
Ale kab na rozum ŭziaci
I parondnie razabraci,
To za adnaho lichoha
Ciapier maem panoŭ mnoha:
Bo staršyny i pisary,
Pasredniki, sakratary,
Asesory i spraŭniki,
I ŭse carske čynoŭniki,
Ŭsio heta pany pad nami,
Neščasnymi mužykami.
A jak kryŭdu mužyk mae,
Moža praŭdy dapytae?
Oj, nie! muj ty niaboža!

Każdy wydziere, što moža;
A jak nie maeš što daci,
To nie ŭsedziš ŭ swaej chace.

Józaf

Praŭda, što ŭse čynoŭniki
Welmi kruceli wialiki;
Każdy dziere što sił mae.
Musi toho car nie znae?

Mateuš

Oj, car ŭseńka heta znae
Dej sam ešče pamahaje,
Bo ŭsim swoim senatoram,
Ministram, hubiernatoram
Tysjoncami płacić hrošy —
Tamu bolš, chto złodziej horšy,
Kab jamu nie preškadzali
I z ludziej drać pamahali.
Oto ž dla hetoj pryčyny
Mučać lud biez žadnaj winy
I padatki pawyšajuć,
I litosci nic nie majuć.
Jaku ž ty swabodu maeš?
Rastałkuj mnie, jak sam znaeš.

Józaf

Dalboh, dziadźku, ja zduryŭsia
I z rozmumu čysta zbiŭsia,
Bo nam nabrachaŭ asesar,
Szto ŭže daŭ swabodu cesar.

Mateuš

Praŭda, panščyny nie budzie,
To čy ŭže swabodny ludzi?
Za to panu tre płacici,
A choć pan nie budzie bici,
Nie dahodzi sakrataru,

A jak jon pa pryhaworu
Zadaść tobie za dzwie sotni,
Toj j sabaka z padwarotni
Nie zabreša «škoda, škoda» —
Otuž tobie i swaboda!

Józaf

Našto ž ab'jawili ludziam,
Szto ŭže my swabodny budziem?

Mateuš

Bo rond musiŭ tak zrabici
I nam wolnaść ab'jawici,
A ty mysliŭ, z dobraj woli?
Ne! — Francuz ŭ Sewastopoli
Jak staŭ Moskwu wajawaci,
Našy kryŭdy paminaci,
To maskal až staŭ prasicca,
Kab prancuz pierestaŭ bicca.
A prancuzy im skazali:
Kab narodu wolnaść dali
I kab čeraz let dwanaśce
Brać rekruta nie mieŭ ŭłasci,
I kab wojska mniej trymali,
I padatak mniejšy brali,
Takža Uniju Swiatuju
Kab wiarnuli.

Józaf

Szto ja čuju!

Mateuš

Tak maskal lisem padšyŭsia
I na ŭsio niby zhadziŭsia:
Wialeŭ sołdat raspuscici,
Liudziam wolnaść ab'jawici
I rekruta darawaci,
Kab prancuza ašukaci.

A jak zhodu ŭže zrabili,
To padatki padwyšyli,
I rekruta ŭziaci majuć,
I swabodu adkładajuć
Z roku na rok, biez pryčyny.

Józaf
Oto podle! ŭraže syny!
A ja myslu, kab nie daci
Maskalu rekruta ŭziaci?

Mateuš
I tak treba, kab nie dali,
To by prancuzy paznali,
Szto car nie datrymaŭ słowa,
I zadali b jamu znowa.

Józaf
Czy ž druhi raz prancuz pryjdzie?

Mateuš
Nie biaduj! muj ty susiedzie,
Jon ŭže začaŭ wybiracca,
Tolka chočaš raspytacca,
Czy my budziem pamahaci
Maskala zhetul prahnaci.

Józaf
Ach, daj, Boža, ach, daj, Boža!
Każdy pojdzie, kto z čem moža:
Kto z siakeraj, kto z kasoju,
Tak jak by trawu z rasoju
Kasić woraha što siły!

Mateuš
Pamaży nam, Boža miły!

## № 4

Józaf

Ach, muj dziadźku daraheńki!
Ciapier to paznali ŭseńki,
Szto nas pohancy maskali
Jak chaceli ašukali.
Musi pany padkupili,
Kab my panščynu chadzili.
To što ciapier nam rabici
I jak nam na swiece žyci?

Mateuš

Ja čy ž ja wam radziŭ mała?
Kali ž wy durni, jak sała,
Nie mahli taho paniaci,
Szto car choča ašukaci.
Bo kab chcieŭ wolnosci našaj,
To by jon zrabiŭ inačaj
I podkupu nie chacieŭ by,
Ale ŭsim panom wialeŭ by
Mužykam ziamlu addaci,
I pan musiŭ by maŭčaci.
Ale car ab nas nie dbae
I na mysli tolka mae,
Kab jak usich ašukaci
I kab hrošy bolš nadraci,
Bo ŭže zholeŭ horš jak horšy,
Koli žydy robiać hrošy.
Skul ža wy ciapier paznali,
Szto nas jany ašukali?

Józaf

Chiba durań nie paznaŭ by
De jašče im wiery daŭ by,
Bo hdzie ž zemla, hdzie ž swaboda,
Szto dać mieli dla naroda?
Tolka hramatu prysłali

I wialać, kab padpisali,
Szto ŭže my kantenty ŭseńki,
Paradźce nam, muj mileńki!

M a t e u š
Ktu ž was pryniawolić moža?

J ó z a f
Чort jakiści, adpuść, Boža!
Hubiernataram nazwaŭsia
I da ludziej prywiazaŭsia.
A jak začaŭ krucić, łhaci,
Kryčać, prasić, namaŭlaci,
Kab hramotu padpisali,
Szto swabodu ŭže dastali.
Ale ž kruce horaj žyda,
A jaki siardzity bryda,
Bo jak nic nie moh zrabici,
To začaŭ ludziej strašyci,
Szto jon jak našle sałdataŭ
Po dwaccać na każdu chatu,
To ŭsim skuru pazdzirae.

M a t e u š
Czy ž jon tyle wojska mae,
Kab ŭsich mužykoŭ na swiece
Bić moh jak małyja dzieci?
Z hetych strachaŭ tre smiajacca
I ničoha nie bajacca,
Bo jak schopiać kosy ludzi,
To i koniec Moskwie budzie.

J ó z a f
To čaho ž nam doŭha ždaci,
Maskalu kpić pazwalaci?

M a t e u š
Kali chočam być ščasliwy,
Treba kab byli ciarpliwy,—

Da pary panom służyci
Albo čynšy im płacici,
A jak naša słońca zyjdzie,
Jak palak z prancuzam pryjdzie,
To tahdy my zahulaem,
U ostry kosy jak zahraem,
To maskal nie budzie znaci,
Jak i kudy uciakaci.
I tahdy ŭže nie pamoža
Podkup nijaki, niaboža,
A palaki za nahrodu
Daduć zemlu i swabodu,
I nie budzie ašukanstwa,
Ani zdzierstwa, ni paddanstwa,
Bo wieś lud, jak est na swiece
Ŭse adnoho Boha dzieci,
To i roŭny budziem ŭseńki.

Józaf

A muj dziadziušku mileńki,
To čaho palak čakae?

Mateuš

Bo palak sumlennie mae,
Choča ŭseńka razuznaci,
Kab złych ludziej ukaraci;
Bo byli pany lichija
I čynoŭniki takija,
Szto mužycke slozy pili
I z maskalom u zhodzie žyli.
To palaki nie darujuć,—
Oj, pany to dobra čujuć!
Ale i takija byli,
Szto pa-ludsku z ludźmi žyli,
To kab hetakim, broń Boža,
Kryŭdy nie zrabić, niaboža!
Bo rond Polski naš ŭłasciwy
Chce, kab ŭse byli ščasliwy. —

Otuž treba ab'jawici:
Kto choča ščasliwym byci,
To niachaj pryhataŭlae
Nožy, kosy, kto što mae,
Kab hatowy byli ŭseńki,
Bo, jak widziš, muj mileńki,
Tak prancuzy i palaki
Zadaduć Maskwie tabaki,
A jak im pamohuć ludzi,
To ŭsiej biedzie koniec budzie.

## Ab'jaŭlennie

Rond Polski ab'jawiŭ manifestam, što ŭsim mužykam skarbowym i panskim addaść ziamlu na wiečnuju ŭłasnaść, i to zaraz jak tolka maskaloŭ wyžanie. Da wojska budzie brać z mužykoŭ i ze šlachty pa adnamu z tysjonca i służby budzie tolka šeść let; a car maskoŭski wialeŭ hety manifest spynić i, nic nam dobraha nie zrabiŭšy, wialeŭ ŭziać rekruta pa piać z tysjonca, i to tolka z mužykoŭ.

Bratki mae! pasłuchajce mianie, staroha mužyka, woźmiemsia za ruki i nie dajmy našym dzietkam prapadać u Kaŭkaze i ŭ Sibiry, biez spowiedzi i baćkoŭskaha błahasławienstwa, bo kali damo, to nas Pan Buh pakarae!

*Mateuš*

## № 1

Ю з а ф
Няхай бэндзе пахвалёны
Езус Хрыстус! Як сен маце,
Чы здаровы ўсенкі ў хаце
І што чуваць з вашай строны?

М а т э у ш
Ой, здаровы, ўсенкі жывы,
Да спытайце, чы шчаслівы...

Ю з а ф

Эй вы, дзядзьку, не тужыце,
Лепей Бога папрасіце,
Бо гавораць межда намі,
Што цар зробіць нас панамі.
Вялеў, каб зямлю купілі,
Яму грошы заплацілі,
То мужык, як шляхціц, будзе,
Ўсее беданькі забудзе.

М а т э у ш

А я от як чуў, нябожа,
Што цар ніц зрабіць не можа,
Тылька хоча ашукаці,
Ўсенкі грошы ад нас ўзяці,
Каб было чэм падкупіці
Дэй з французам ў згодзе жыці.
Бо як французы узналі,
Што маскалі вычаўплялі,
Як народ весь паглумілі,
Ўсенькі дворы спусташылі
І люд польскі — каталіцкі
Прэвярнулі ў сызматыцкі,
То француз за гэта ўзяўся:
Зараз прэд Богем закляўся
Маскаля не дараваці
І з зямлі нашэй прагнаці.
Так от москаль ухітрыўся
Дэй на круцельства пусціўся:
Хоча землю ўсю прадаці,
Каб не жаль было кідаці.
Отуж послухай, суседзе:
Як ронд польскі, дасць Бог, будзе,
То тагды ўсяму народу
Дасць Бог землю і свабоду.

Ю з а ф

Чы ж палякі з французамі
Маскаля звающоць самі?

Матэуш

І французаў нам не трэба,
Бо нам Буг найвышшы з неба
Дапаможа ваяваці
І маскалёў проч прагнаці.
Бо ўжэ вельмі награшылі,
Многа людзей паглумілі,
А ў Варшаве Боскай Маткі
Образ падралі на шматкі,
Крыж з Хрыстусам парубалі,
А што люду настралялі,
Як шатані, одпусьць віны,
А ўсё без жаднэй прычыны:
За то, што люд хрысціяньскі
Шануе святы крыж Паньскі.
То нам Пан Буг дапаможа
Прагнаць маскалёў, нябожа.

Юзаф

Ах, дай, Божа, ах, дай, Божа!
Але як поляк, нябожа,
Не дасць мужыку апекі,
То мы згінем на век-векі!

Матэуш

Ой, не так, мой ты суседзе,
Семдзесят лет тому будзе,
Як паляк ўсяму народу
Хацеў было даць свабоду.
А маскаль, як то дачуўся,
Зараз з немцам згаварыўся,
Дэй на поляка напалі
І ўсю землю адабралі,
Каб людзей не научылі
І вольнымі не зрабілі.
Бо не было б з каго драці
І ў рэкруты каго браці.
А цяпер, як беду чуе,
То і вольнасць дэкляруе.

Юзаф

О, цяпер то ўсенка знаю
І што Бога прасіць маю,
Прасіць буду, каб Буг мілы
Прагнаць маскалёў даў сілы,
Каб больш крыжоў не ламалі,
Нас ў няволі не трымалі.
Бо нігды дабра не будзе,
Покі москаль рондзіць будзе.

## № 2

Юзаф

Муй саколіку суседзе,
Мусі, конец света будзе,
Бо ўжэ надта цар гуляе
І людзей, як псоў, страляе.
Чуваць, што ў рускай губэрні,
Гдзе народ быў яму вёрны,
Дзесяць тысяч расстралялі
За то, што праўды іскалі.
А ў Варшаве ўсе касцёлы,
Нават усе жыдоўске школы
Абадралі, абакралі
І люд з косцёлоў забралі
Дэй у няволю засадзілі,
Каб больш Бога не хвалілі,
А ўсё па указу цара.
Можа, ён, нячыста вяра,
Антыхрыст, што, кажуць людзі,
Перад коньцом света будзе.
Бо ён вельмі круціць-муціць,
Народ Божы баламуціць,
Сябе Богам называе,
Хто не верыць, тых страляе.

Матэуш

Отож бачыш, мой міленькі,
Цар так глуміць народ ўсенькі,
Чы люд польскі, чы маскоўскі,
Каталіцкі чы жыдоўскі,
Дзярэ скуру, то страляе,
То зноў ў Сібір высылае,
А за што, каб запытаці,
Сам не знаў бы, што сказаці.

Юзаф

Ой, то праўда, што маскалі
Мала скуры не задралі!
Даўней быў хлеб і да хлеба,
Была упраж, як патрэба,
Мукі і круп поўны фасы,
Поўны сверан быў акрасы.
Домік, праўда, быў старэнькі,
Да шчаслівы былі ўсенькі.
А як москале насталі,
То мы, як мышы, прапалі...
І зямля цяпер не родзіць,
Хоць пасееш, то не сходзіць,
А хоць зыйдзе, град папсуе,
І жывінка не шыхуе...

Матэуш

Чэму ж даўней ўсё радзіла,
Бо сызмы даўней не была,
Пана Бога ўсе хвалілі
І шчаслівы ўсенькі былі.
Даўней кажды быў багаты,
Бо плацілі з каждай хаты
По пяць злотых на падаткі,
А маскаль дзярэ астаткі...
А які ён хітры, браце!
Каб лепей мог з людзей драці
І каб людзі то не зналі,
На яго не наракалі,

То ён з паноў драў штосілы,
А пан скуль возьме, мой мілы,
З мужыка пан мусіў драці
І царэві ўсё аддаці.
А каб Бог не злітаваўся
І за свой народ не ўзяўся,
Вялеў сызму завадзіці,
Каб нас ад Бога адбіці,
Так цяпер нас Бог карае
І ўсе беды насылае
За то, што мы заграшылі,
Боскай хвалы ўжэ забылі.

Юзаф

От як цар згубіў навекі,
З боскай вырваў нас апекі.
То хто ж цяпер нам паможа!
Мусі, згінемо, нябожа!

Матэуш

Отож послухай, міленькі,
Каб не былі дурні ўсенькі,
А крыкнулі ў адно слова:
Няхай Польска будзе знову,
Годзе тобе, цар праклены,
Губіць народ польскі свенты,
Браць рэкруты, драць падаткі,
Забіраць астаткі з хаткі,—
То не мог бы ніц зрабіці
І мусяў бы уступіці.
А як то не зробяць людзі,
То свабоды ў нас не будзе,
Бо хоць паншчыну скасуе,
А як землю ачыншуе
Дэй палічыць рэкрутовэ
І падаткі, і чыншовэ,
І за душы мёртвы й жывы,
То што зробіш нешчаслівы?

Ю з а ф
Зробім, дзядзьку, як сказалі,
А ў нас будзе рай,
Пойдуць проч ад нас маскалі,
Што нам Божа дай.

## № 3

Ю з а ф
Гэй, браточкі, загуляймы
Дэ вясёла заспяваймы;
Годзе тужыць, наракаці,
Пан не будзе скуру драці!

М а т э у ш
А муй Юзафе міленькі,
Які ты яшчэ дурненькі!
Рад, што цебе ашукалі
І нібы свабоду далі.

Ю з а ф
Эй, дзядзьку, не вымысляйце
І мяне вельмі не лайце!
Бо я не ўмею чытаці,
То скуль жа магу што знаці?

М а т э у ш
Праўда, што ты ні чытаці
Не умееш, ні пісаці,
То сваей бяды не знаеш
І рад, што пана не маеш.
Але каб на розум ўзяці
І парондне разабраці,
То за аднаго ліхога
Цяпер маем паноў многа:
Бо старшыны і пісары,
Пасрэднікі, сакратары,

Асэсоры і спраўнікі
І ўсе царске чыноўнікі,
Ўсё гэта паны над намі,
Няшчаснымі мужыкамі.
А як крыўду мужык мае,
Можа, праўды дапытае?
Ой, не! муй ты нябожа!
Кажды выдзерэ, што можа;
А як не маеш што даці,
То не ўседзіш ў сваей хаце.

Ю з а ф

Праўда, што ўсе чыноўнікі
Вельмі круцелі вялікі;
Кажды дзерэ што сіл мае.
Мусі, того цар не знае?

М а т э у ш

Ой, цар ўсенька гэта знае
Дэй сам ешчэ памагае,
Бо ўсім своім сенаторам,
Міністрам, губернаторам
Тысёнцамі плаціць грошы —
Таму больш, хто злодзей горшы,
Каб яму не прэшкадзалі
І з людзей драць памагалі.
Ото ж для гэтой прычыны
Мучаць люд без жаднай віны,
І падаткі павышаюць,
І літосці ніц не маюць.
Яку ж ты свабоду маеш?
Расталкуй мне, як сам знаеш.

Ю з а ф

Дальбог, дзядзьку, я здурыўся
І з розуму чыста збіўся,
Бо нам набрахаў асэсар,
Што ўжэ даў свабоду цэсар.

Матэуш

Праўда, паншчыны не будзе,
То чы ўжэ свабодны людзі?
За то пану трэ плаціці,
А хоць пан не будзе біці,
Не дагодзі сакратару,
А як ён па прыгавору
Задасць тобе за дзве сотні,
Той й сабака з падваротні
Не забрэша «шкода, шкода» —
Отуж тобе і свабода!

Юзаф

Нашто ж аб'явілі людзям,
Што ўжэ мы свабодны будзем?

Матэуш

Бо ронд мусіў так зрабіці
І нам вольнасць аб'явіці,
А ты мысліў, з добрай волі?
Не! — Француз ў Севастополі
Як стаў Москву ваяваці,
Нашы крыўды памінаці,
То маскаль аж стаў прасіцца,
Каб француз перэстаў біцца.
А французы ім сказалі:
Каб народу вольнасць далі
І каб чэраз лет дванасьце
Браць рэкрута не меў ўласці,
І каб войска мней трымалі
І падатак мнейшы бралі,
Такжа Унію Святую
Каб вярнулі.

Юзаф

Што я чую!

Матэуш

Так маскаль лісэм падшыўся
І на ўсё нібы згадзіўся:
Вялеў солдат распусціці,
Людзям вольнасць аб'явіці
І рэкрута даравацi,
Каб француза ашукаці.
А як згоду ўжэ зрабілі,
То падаткі падвышылі,
І рэкрута ўзяці маюць,
І свабоду адкладаюць
З року на рок, без прычыны.

Юзаф

Ото подлэ! ўражэ сыны!
А я мыслю, каб не даці
Маскалю рэкрута ўзяці?

Матэуш

І так трэба, каб не далі,
То бы французы пазналі,
Што цар не датрымаў слова,
І задалі б яму знова.

Юзаф

Чы ж другі раз француз прыйдзе?

Матэуш

Не бядуй! муй ты суседзе,
Ён ўжэ зачаў выбірацца,
Толька хочаш распытацца,
Чы мы будзем памагаці
Маскаля згэтуль прагнаці.

Юзаф

Ах, дай, Божа, ах, дай, Божа!
Кажды пойдзе, хто з чэм можа:
Хто з сякерай, хто з касою,

Так як бы траву з расою
Касіць ворага штосілы!

Матэуш
Памажы нам, Божа мілы!

**№ 4**

Юзаф
Ах, муй дзядзьку дарагенькі!
Цяпер то пазналі ўсенькі,
Што нас поганцы маскалі
Як хацелі ашукалі.
Мусі, паны падкупілі,
Каб мы паншчыну хадзілі.
То што цяпер нам рабіці
І як нам на свеце жыці?

Матэуш
Я чы ж я вам радзіў мала?
Калі ж вы дурні, як сала,
Не маглі таго паняці,
Што цар хоча ашукаці.
Бо каб хцеў вольносці нашай,
То бы ён зрабіў іначай
І подкупу не хацеў бы,
Але ўсім паном вялеў бы
Мужыкам зямлю аддаці,
І пан мусіў бы маўчаці.
Але цар аб нас не дбае
І на мыслі толька мае,
Каб як усіх ашукаці
І каб грошы больш надраці,
Бо ўжэ зголеў горш як горшы,
Колі жыды робяць грошы.
Скуль жа вы цяпер пазналі,
Што нас яны ашукалі?

Ю з а ф

Хіба дурань не пазнаў бы
Дэ яшчэ ім веры даў бы,
Бо гдзе ж земля, гдзе ж свабода,
Што даць мелі для народа?
Толька грамату прыслалі
І вяляць, каб падпісалі,
Што ўжэ мы кантэнты ўсенькі,
Парадзьце нам, муй міленькі!

М а т э у ш

Кту ж вас прыняволіць можа?

Ю з а ф

Чорт якісьці, адпусць, Божа!
Губернатарам назваўся
І да людзей прывязаўся.
А як зачаў круціць, лгаці,
Крычаць, прасіць, намаўляці,
Каб грамоту падпісалі,
Што свабоду ўжэ дасталі.
Але ж круцель горай жыда,
А які сярдзіты брыда,
Бо як ніц не мог зрабіці,
То зачаў людзей страшыці,
Што ён як нашле салдатаў
По дваццаць на кажду хату,
То ўсім скуру паздзірае.

М а т э у ш

Чы ж ён тыле войска мае,
Каб ўсіх мужыкоў на свеце
Біць мог, як малыя дзеці?
З гэтых страхаў трэ смяяцца
І нічога не баяцца,
Бо як схопяць косы людзі,
То і конец Москве будзе.

Ю з а ф
То чаго ж нам доўга ждаці,
Маскалю кпіць пазваляці?

М а т э у ш
Калі хочам быць шчаслівы,
Трэба, каб былі цярплівы,—
Да пары паном служыці
Альбо чыншы ім плаціці,
А як наша слоньца зыдзе,
Як паляк з французам прыйдзе,
То тагды мы загуляем,
У остры косы як заграем,
То маскаль не будзе знаці,
Як і куды уцякаці.
І тагды ўжэ не паможа
Подкуп ніякі, нябожа,
А палякі за нагроду
Дадуць землю і свабоду,
І не будзе ашуканства,
Ані здзерства, ні падданства,
Бо весь люд, як ест на свеце,
Ўсе адного Бога дзеці,
То і роўны будзем ўсенькі.

Ю з а ф
А муй дзядзюшку міленькі,
То чаго паляк чакае?

М а т э у ш
Бо паляк сумленне мае,
Хоча ўсенька разузнаці,
Каб злых людзей укараці;
Бо былі паны ліхія
І чыноўнікі такія,
Што мужыцке слёзы пілі
І з маскалём у згодзе жылі.
То палякі не даруюць,—

Ой, паны то добра чуюць!
Але і такія былі,
Што па-людску з людзьмі жылі,
То каб гэтакім, бронь Божа,
Крыўды не зрабіць; нябожа!
Бо ронд Польскі наш ўласцівы
Хцэ, каб ўсе былі шчаслівы. —
Отуж трэба аб'явіці:
Хто хоча шчаслівым быці,
То няхай прыгатаўляе
Ножы, косы; хто што мае,
Каб гатовы былі ўсенькі,
Бо, як відзіш, муй міленькі,
Так французы і палякі
Зададуць Маскве табакі,
А як ім памогуць людзі,
То ўсей бедзе конец будзе.

## Аб'яўленне

Ронд Польскі аб'явіў маніфэстам, што ўсім мужыкам скарбовым і панскім аддасць зямлю на вечную ўласнасць, і то зараз як толька маскалёў выжане. Да войска будзе браць з мужыкоў і зэ шляхты па аднаму з тысёнца і службы будзе толька шэсць лет; а цар маскоўскі вялеў гэты маніфэст спыніць і, ніц нам добрага не зрабіўшы, вялеў узяць рэкрута па пяць з тысёнца, і то толька з мужыкоў.

Браткі мае! паслухайце мяне, старога мужыка, возьмемся за рукі і не даймы нашым дзеткам прападаць у Каўказе і ў Сібіры, без споведзі і бацькоўскага благаславенства, бо калі дамо, то нас Пан Буг пакарае!

*Матэуш*

# BICHA

Wisna hoład pierepała —
Ani soli, ani krup;
I skacinie kormu mała,
I samomu — ani ŭ zub.

Na pałaciach dochnuć dzieci,
Zonka try dni z duru p'eć,
I daŭno parožna ŭ kleci,
I parožniaja aseć.

Kalita ležyć pad łaŭkoj,
A pry joj parožni hlak —
Ad kalad my z kumom Saŭkoj
Pacirali ŭ hubie smak.

Ali hora — ni z poŭhora,
Cyc, niaboha, trošku, cyc!
Užo wolność daduć skora,
I jak ptuški budzim žyć.

K čortu žonka, łasa baba!
Biary čort i kalitu,
A papuści wožki słaba
I daj wolu chamutu.

Budzim roŭnye z panami,
Sami budzim my pany,
I harełku pić zbanami,
I hulać tak, jak jany.

Perestanuć našym bratom,
Jak skacinoj, tarhawać —
Napuskacca lichim matom,
Skuru z noh da karku drać.

Choć chałodna, choć hałodna,
Choład, hoład nipačom!
Эch! kab tolka nam swabodna!
Na swabodzie adžywiom.

Wot panam nie tak to łoŭka:
Samim treba pracawać!
Pabalić ni raz hałoŭka,
Kali prydziecca arać.

Nie adzin to papaceić
I zaskačeć drapaka...
Bo sam tolka eść umieić,
Ду drać skuru z mužyka.

Jak by byŭ jakij skacina
Aby horšy ad jaho,
Bili puhaj da dubinaj,
A ciapier, brat, oho-ho!

Mužyk budzić nia skacina,
Ni raz skažeć pan z panoŭ:
«Panie Hryška, panie Mina!
Jak že waspan? ci zdaroŭ?»

Вісна голад перэпала —
Ані солі, ані круп;
І скаціне корму мала,
І самому — ані ў зуб.

На палацях дохнуць дзеці,
Жонка тры дні здуру п'ець,
І даўно парожна ў клеці,
І парожняя асець.

Каліта ляжыць пад лаўкой,
А пры ёй парожні гляк —
Ад Каляд мы з кумом Саўкой
Паціралі ў губе смак.

Алі гора — ні з поўгора,
Цыц, нябога, трошку, цыц!
Ужо вольносьць дадуць скора,
І, як птушкі, будзім жыць.

К чорту жонка, ласа баба!
Бяры чорт і каліту,
А папусьці вожкі слаба
І дай волю хамуту.

Будзім роўные з панамі,
Самі будзім мы паны,
І гарэлку піць збанамі,
І гуляць так, як яны.

Перэстануць нашым братом,
Як скаціной, таргаваць —
Напускацца ліхім матом,
Скуру з ног да карку драць.

Хоць халодна, хоць галодна,
Холад, голад ніпачом!
Эх! каб толька нам свабодна!
На свабодзе аджывём.

Вот панам не так то лоўка:
Самім трэба працаваць!
Пабаліць ні раз галоўка,
Калі прыйдзецца араць.

Не адзін то папацеіць
І заскачэць драпака...
Бо сам толька есьць умеіць
Ды драць скуру з мужыка.

Як бы быў якій скаціна
Абы горшы ад яго,
Білі пугай да дубінай,
А цяпер, брат, ого-го!

Мужык будзіць ня скаціна,
Ні раз скажэць пан з паноў:
«Пане Грышка, пане Міна!
Як жэ васпан? ці здароў?»

## «БОЖА, ШТО ПОЛЬШЧУ ЧЭРАЗ УСЕ ВЕКІ...»

Bože szto Polszczy prez douhije wieki
Dawaŭ cześć, sławu, scieroh od niewoli.
I nie žaleŭwszy Ojcowskaj opieki
Dawaŭ paciechu u nieszczasnaj doli.
Piered ołtary malitvu prynosim
Ojczyznu, wolność, woroci nam, prosim.

[Ty pažaleŭszy jaje v złoj pryhodzie,
Nieraz pobici vroha davaŭ siłu.
Siered nieszczaścia u praviem rodzie
Dabaviŭ chvały, choć poszła u mahiłu.
Piered ałtarom malitvu prynosim
Volnu Atczyznu varaci nam, prosim.]

Bože kotoryj właść koronowanych
Jak by pylinku łomisz w swoim sudzie,
Satry u porach tyranów pohanych,
Krapi nadziejaj, szto Polszcza żyć budzie.

Wiarni jej sławu takuju jak była,
I daj uražae na radnieńkaj mieży.
Sztob u pokoju szczasliwie zacwiła,
I błahasławi naszaj maładzieży.

Ty Preśviataja Ostrabramskaja Dziewa
Jadyna maci cierpiącego rodu
Litwy i Polszczy nasza Korolewa
Uprosi Syna, sztob daŭ nam swobodu.

Let bolsz 60 jak Polszcza u zaboru
Hłumiać nas, kryŭdziać usich u hetu poru
Adwodziać od wiery, boroniać nauki,
Pożalej nas, Boże, uznosim k Tobie ruki.

I ciapier u Warszawie muki i hołady
Hubiać naszych braci szto choczuć swobody,
Dziakujem Tobie Boże szto choć daw nadzieju
Szto wolność nam budzie da i Polszcza z nieju.

Daj jeszcze Chrystu kab my chryscijanie
Szlachta z mużykami żyli w jadności
Daj usim rouność j adno nazwanie
Dzietki Ojczyzny u Bożej miłości.

Koniec

Божа, што Полыпчы праз доўгія векі
Даваў чэсьць, славу, сьцярог ад няволі
І, не жалеўшы айцоўскай апекі,
Даваў пацеху ў няшчаснай долі.
Перад алтары малітву прыносім,
Айчызну, вольнасьць вараці нам, просім.

Ты, пажалеўшы яе ў злой прыгодзе,
Няраз пабіці врога даваў сілу.
Сярод няшчасьця ў правым родзе
Дабавіў хвалы, хоць пайшла ў магілу.
Перад алтары малітву прыносім,
Вольну Айчызну вараці нам, просім.

Божа, каторы ўласьць каранаваных,
Як бы пылінку, ломіш ў своім судзе,
Сатры ў порах тыранаў паганых,
Крапі надзеяй, што Польшча жыць будзе.

Вярні ёй славу такую, як была,
І дай ураджаі на радненькай межы.
Што б у пакою шчасьліва зацьвіла,
І благаславі нашай маладзежы.

Ты, Прасьвятая Вастрабрамская Дзева,
Ядына маці церпячага роду,
Літвы і Польшчы наша Каралева,
Упрасі сына, што б даў нам свабоду.

Лет больш 60 як Польшча ў забору.
Глумяць нас, крыўдзяць усіх у гэту пору,
Адводзяць ад веры, бароняць навукі,
Пажалей нас, Божа, узносім к Табе рукі.

І цяпер у Варшаве мукі і голады
Губяць нашых браці, што хочуць свабоды,
Дзякуем Табе, Божа, што хоць даў надзею,
Што вольнасьць нам будзе да і Польшча з нею.

Дай яшчэ, Хрысту, каб мы, хрысьціяне,
Шляхта з мужыкамі, жылі ў ядносьці.
Дай усім нам роўнасьць й адно назване —
Дзеткі Айчызны ў Божай мілосьці.

Канец

# ПЕРАДСЬМЯРОТНЫ РАЗГАВОР ПУСТЭЛЬНІКА ПЯТРА, КАТОРЫ ЖЫЎ У ПУШЧЫ ДЗЕВЕЦЬДЗЕСЯТ ЛЕТ, А ПАМЁР, МАЮЧЫ СТО СОРАК ЛЕТ

Wo Imia Otca i Syna i Swiatoho Ducha. Amen.

Leta mojei starości zawuć mienie k mohile, smierć moja zawie mienie pred strasznyj sud Bożyj, hdzie my za usio otwieczać budziem.

Pieredsmierciju chaczu pohoworyć z wami, na szto ja czerez sto sorok let h[l]iadzieu, i piereskazać usio — szto Miłosiernyj Boh dla Polskoj ziemli pryhatowiu.

Wiecznaja cześć i chwała Bohu Atcou naszych, a synam całoj ziemli Polskoj wiecznaja swaboda!

Miłyje Dzietki!

Byu czas kali usi ludzi na Polskoj ziemli byli rounyje, i pod opiekoju Boha żyli zhodno i szczaśliwo, jak dzieci odnoho Otca Niebiesnoho. Tahdy nie było — ni szlachty, ni panou, ni mużykou, bo usi byli braty, a braty zausiody sobie rounyje.

Ale złyje susiedzi pozawidowali nam hetaho szczaścia, stali napadać predkou naszych sztoby zabrać ich u niewolu. Tahdy pradziedy naszy stali raić, stali prydumywać sposoby — jak od złych susiedou boronić sie, i postawili takij zakon: sztob kożnyj mołodyj czaławiek służyu u żaunierach i wojowau prociu niepryjaciela.

Usich ludziej wojennych nazwali szlachciczami, bo jany po szla[cha]ch ciekli jak wada i odhaniali niepryjaciela. A hospodarou żonatych nazwali mużami — pośla mużykami. Dobryje i czesnyje syny mużykou z achwotaju szli u żaunjiery, bo wiedali szto służać całomu narodu, szto boroniać swoich Atcou, swoich matok, i wieru swoich predkou.

Za takuju zasłuhu cełyj narod daryu żaunieram ziemlu, katoraja pierechodziła na ich patpmstwo, i uwolniali ich od usiakich powinnościej.

Haspadary — mużyki, katoryje nie służyli żaunierami, płacili na cełyj hod podatku — złotyj z komina, a nie z duszy, bo dusza sobstwenność Boża, i za jeje podatkou nikto brać nie smieje.

Naszy pradziedy wojowali wielmi czasto; bo na bohatuju ziemlu Polskuju napadali: niewiernyje Turki, hałodnyje Niemcy i Maskali.

Ale Boh błahosłowiu predkam naszym, bo jany bajali sie Boha, lubili Jaho, u złoj niedoli druhim pomahali, czużoho nie żadali, a tolki swoju ziemlu, i wolność bronili.

Nakoniec — pahanyje susiedzi: Austryjak, Prusak i Maskal zhawarylisie, razom u troch napali pradziedou naszych, zwijawali ich, a cełu ziemlu Polskuju pomiż siebie rozdzielili. Dzwie cząści zabrali hałodnyje Niemcy, a treciu Maskal.

Siwaja haława moja, i waszyje dziedy pamietajuć od czaho naczałasie nasza niewola. Napiérsz stali kasować naszy unijackije cerkwy; pataptali Ałtary Boży wiery predkou naszych, u cerkwach Bożych pastroili carskije worota, i prestoły; siłoju hnali narod i ksiendzou za processijeju prociu sonca, gwałtom powiernuli narod u kazionnuju wieru, katoru nazwali prawosłaunoju, i prykazali modlićsie caru maskouskamu, a nie Bohu. Niepazwolili narodu uczyćsie, prykazali służyć panszczynu popam, i pazwolili im razom i dziakami obdzirać narod nieszczasnyj. Ale hetaho mało.

Z wieku ludziej wolnych zapisali u skazki i niepazwolili pierechodzić z odnoho miesca na druhoje. Zasłużanym żaunieram odobrali ziemlu, popisali ich u Odnodworcy, na cełyj narod — pa maskouski nałożyli ciażkije podatki z duszy, stali brać u rekruty i hnali ich za kraj świeta; prykazali robić panszczynu po inwentaru, jakoho nikto nie znau na ziemli Polskoj. Zasłużonych żaunierou starszych, katoryje stajali za narod, i mnoho mużykou, szto stojali za swoju wolność i ziemlu, zahnali u Sibir i stali hłumićsie nad narodem.

I nastała dzietki ciażkaja niewola, jakoj od sotworenija świeta na Polskoj ziemli nie bywało! Bo i żydou nieszczasnych, katorych predki naszy jak hościej pryniali na swoju ziemlu, stali brać u rekruty, stali odziewać po maskouski, i gwałtom naworoczać na kazionnuju wieru.

Tahdy cełyj narod zapłakau! Reki niewinnoi krawi pociekli na mohiły predkou naszych, slozy wdou i sirot poworoszyli ich kości, usia ziemla zastohnała i wyzwała malitwu k Bohu — sztob Jon pierestau karać hresznych.

Miłosiernyj Boh wysłuchau modlitwu naszu; slozy sirot pryniau za pokutu, i posłau wielikoho Prancuza sztoby naszu ziemlu uwolniu. Prancuz, pobiuszy Maskala pod Sewastopolem a Niemca koło Rzymu, podpisau dla cełoj ziemli Polsko i narodu wolność, i prykazau

Maskalu: brać podatki nie z duszy — a z chaty po złotomu, jak było za Polszczy; prykazau pozwolić pierechodzić narodu z odnoho miesca na druhoje, stroić unijackije cerkwy, i modlićsie u nich nie caru maskouskamu, a tolki Jedynomu Bohu.

Niepazwoliu wybirać narod u rekruty i hnać za kraj świeta, a tolki pasylać małady ch ludziej u Polskije żauniery, na czatyre hody — i u swajom Powiecie.

Wielikij Prancuz prykazau: kupić dla mużykou od Panou ziemlu; żaunieram, i tym szto u maskalach, dawać na zimu każuchi, douhije boty, funty dwa biełoho chleba, poutora funta miasa i pietnanceć hroszy u dzień [...].

Objawiuszy heto starym sałdatam, Prancuz prykazau odpuścić ich do domu, sztob jany usio rozkazali narodu. Ale car maskouskij rozdumausie — szto maje sobstwennyje majontki z poddanymi, katoryje płaciać jamu c[z]ynsz i podatki z duszy. Rozhledzieusie szto z takoju woleju, jakaja była za Polszczy, kazna jaho zapustuje.

Nuż czerez popou i sudomych duryć i tumanić narod,— woleju, a Prancuzu pisać: szto dla mużykou kupiu uże ziemlu, szto odnodworcy i mużyki nie płaciać podatkou, szto ich popy i sudowyje nie obdzirajuć, szto maskali pa wioskach nie objedajuć, i szto narod żywie sausiem szczaśliwyj. I poradowausie Prancuz, szto pamoh naszomu narodu, a car maskouskij tamu — szto obmanuu myżukou i Prancuza.

Ale obmanom świet pierejdziesz, a nazad nie wierniesz. Narod stau żalićsie, i stau narekać szto nie maje polohki, a Prancuz, ahledzieuszejsie szto jaho abmanuli, naczau sabirać wojsko sztoby cełyj narod uwolnić.

Uznauszy ob hetom car pierepałochausie; nasłau k nam maskalou, sztoby niepozwolili narodu śpiewać u kościołach i płakać ob swajom hory, a sam po niemnohu stau ustupać wartu, starożu i panszczynu, katorych za Polszczy naszy predki nie znali, i spodziejetsie szto narod scichnie. Ale wy, miłyje dzietki, pryzawićcie Boha na pomoszcz i cierpiećcie. Nie wierćcie popam i sudowym, kali wam hawaryć stanuć, szto car maskouskij podarujeć dla was ziemlu. Popytajcie takich ludziej — czamu car niepodarowau kazionnym mużykam ziemli? Nie wiercie tamu, kali was k lichomu podmaulać stanuć, i nie wiercie tamu szto car ob was dumaje, bo jon dumaje tolki ob podatkach i hetych wam niepodaruje.

Niepryjaciel wiery naszych predkou nie może dobra zyczyć narodu.

Miłisiernyj Boh prywiedzie k wam korola Polskoho z wojskom Polskim i Prancuza, a wy idzicie pomahać im prohnać maskala iz ziemli waszych predkou! Tahdy usiakomu żaunieru daduć ziemlu, jak heto było za waszych predkou.

Statkujcie i słuchajcie ludziej rozumnych, katory wam dobra zyczać,curajciesie ludziej pahanych i żywicie zhodno so usiemi susiedami waszymi. Nie nazywajcie nikoho — ni panom, ni żydom, ni Tataram; bo usie wy braty, bo usie wy dzieci odnoho Boha i odnoi ziemli Polskoj.

Wy, braty szlachta! pokażycie całomu świetu szto wy syny daunich żaunierou, katoryje stajali za wolność narodu i ziemli Polskoj.

Wy, dzieci moi mużyki! Idzicie za szlachtoju i pomahajcie Polakam, bo czerez ich tolko dostaniecie ziemlu i wolność wo wieki wiekou.

Ale usiakoje dzieło, jak i waszy predki, naczynajcie z Bohom. Podajcie sabie ruki, jak braty, i idzicie razom, a Niemcy i Moskali buduć uciekać pred wami.

A kali prydzie pora, Atcy i matki błahosławicie synou waszych i posyłajcie ich na pomoszcz korolu Polskomu, a Boh pobłahosławić wam, i wy kości swoi położycie na sobstwennoj i wolnoj ziemli! Tahdy Boh predkou waszych poradujetsie waszemu szczaśćju, a wy pred Jaho Ałtarami zaspiewajecie malitwu radości, szto Boh was uwolnić wo wieki wiekou, Amen.

Во імя Отца і Сына і Святого Духа. Амэн.

Лета моей старосьці завуць мяне к магіле, смерць мая заве мяне прэд Страшны Суд Божый, гдзе мы за ўсё отвечаць будзем.

Перэд смэрцію хачу пагаварыць з вамі, на што я чэрэз сто сорак лет глядзеў, і перэсказаць усё — што Мілосэрны Бог для Польской зямлі прыгатовіў.

Всчная чэсьць і хвала Богу атцоў нашых, а сынам цэлой зямлі Польской вечная свабода!

Мілые дзеткі!

Быў час, калі ўсі людзі на Польской зямлі былі роўные і пад апекаю Бога жылі згодна і шчасьліва, як дзеці аднаго Отца Небесного. Тагды не было — ні шляхты, ні паноў, ні мужыкоў, бо ўсі былі браты, а браты заўсёды сабе роўные.

Але злыя суседзі пазавідавалі нам гэтага шчасьця, сталі нападаць прэдкоў нашых, штобы забраць іх у няволю. Тагды прадзеды нашы сталі раіць, сталі прыдумываць способы — як ад злых суседаў бараніцца, і паставілі такі закон: штоб кожны малады чалавек служыў у жаўнерах і воёваў проціў непрыяцеля.

Усіх людзей военных назвалі шляхцічамі, бо яны по шляхах цяклі, як вада, і адганялі непрыяцеля. А гаспадароў жанатых назвалі мужамі — пасьля мужыкамі. Добрые і чэсные сыны мужыкоў з ахвотаю шлі ў жаўнеры, бо ведалі, што служаць цэлому народу, што бароняць своіх атцоў, своіх маток і веру своіх прэдкоў.

За такую заслугу цэлы народ дарыў жаўнерам зямлю, каторая пераходзіла на іх патомство, і ўвальнялі іх ад усякіх павіннасьцей.

Гаспадары — мужыкі, каторые не служылі жаўнерамі, плацілі на цэлы год падатку — злоты з коміна, а не з душы, бо душа собственносьць Божа і за яе падаткоў ніхто браць не смее.

Нашы прадзеды ваявалі вельмі часто, бо на богатую землю Польскую нападалі: няверные туркі, галодные немцы і маскалі.

Але Бог благаславіў прэдкам нашым, бо яны баяліся Бога, любілі Яго, у злой нядолі другім памагалі, чужого не жадалі, а толькі сваю зямлю, і вольносьць бронілі.

Наконец — паганые суседзі: аўстрыяк, прусак і маскаль згаварыліся, разом у трох напалі прадзедоў нашых, зваявалі іх, а цэлу зямлю Польскую паміж себе раздзялілі. Дзве часьці забралі галодные немцы, а трэцюю маскаль.

Сівая галава мая і вашыя дзяды памятаюць, ад чаго началася наша няволя. Напе́рш сталі касаваць нашы уніяцкія цэрквы; патапталі алтары Божы веры прэдкоў нашых, у цэрквах Божых пастроілі царскія варата і прэстолы; сілою гналі народ і ксяндзоў за працэсіею проціў сонца, гвалтам павернулі народ у казённую веру, катору назвалі праваслаўною, і прыказалі модліцца цару маскоўскаму, а не Богу. Не пазволілі народу учыцься, прыказалі

служыць паншчыну папам і пазволілі ім разам з дзякамі абдзіраць народ няшчасны. Але гэтага мала.

З веку людзей вольных запісалі ў сказкі і не пазволілі пераходзіць з аднаго месца на другое. Заслужаным жаўнерам адабралі зямлю, папісалі іх у аднадворцы, на цэлы народ — па-маскоўскі налажылі цяжкія падаткі з душы, сталі браць у рэкруты і гналі іх за край сьвета; прыказалі рабіць паншчыну па інвентару, якого ніхто не знаў на зямлі Польскай. Заслужоных жаўнероў старшых, каторые стаялі за народ, і много мужыкоў, што стоялі за свою вольносьць і зямлю, загналі ў Сібір і сталі глуміцьца над народам.

І настала, дзеткі, цяжкая няволя, якой ад сатворэнія сьвета на Польскай зямлі не бывала! Бо і жыдоў няшчасных, каторых прэдкі нашы як гасьцей прынялі на свою зямлю, сталі браць у рэкруты, сталі адзяваць па-маскоўскі і гвалтам наварачаць на казённую веру.

Тагды цэлы народ заплакаў! Рэкі нявіннай крыві поцяклі на магілы прэдкоў нашых, слёзы ўдоў і сірот паварушылі іх косьці, уся зямля застагнала і вызвала малітву к Богу — штоб Ён перастаў караць грэшных.

Міласэрны Бог выслухаў мадлітву нашу; слёзы сірот прыняў за пакуту і паслаў вялікага пранцуза, штобы нашу зямлю ўволь-ніў. Пранцуз, пабіўшы маскаля пад Севастопалем, а немца каля Рыму, падпісаў для цэлай зямлі Польскай і народу вольнасьць і прыказаў маскалю: браць падаткі не з душы — а з хаты па злота-му, як было за Польшчы; прыказаў пазволіць пераходзіць народу з аднаго месца на другое, строіць уніяцкія цэрквы і модліцца ў ніх не цару маскоўскаму, а толькі Едынаму Богу.

Не пазволіў выбіраць народ у рэкруты і гнаць за край сьве-та, а толькі пасылаць маладых людзей у польскія жаўнеры, на чатыры годы — і ў сваём павеце.

Вялікі пранцуз прыказаў: купіць для мужыкоў ад паноў зямлю; жаўнерам і тым, што ў маскалях, даваць на зіму кажухі, доўгія боты, фунты два белаго хлеба, паўторы фунта мяса і пят-наццаць грошы ў дзень [...].

Аб'явіўшы гэта старым салдатам, пранцуз прыказаў адпусь-ціць іх да дому, штоб яны ўсё разказалі народу. Але цар мас-коўскі раздумаўся, што мае собственные маёнткі з падданымі,

каторые плацяць яму чынш і падаткі з душы. Разгледзеўся, што з такою волею, якая была за Польшчы, казна яго запустуе.

Нуж чэрэз папоў і судомых дурыць і туманіць народ,— волею, а пранцузу пісаць: што для мужыкоў купіў ужо зямлю, што аднадворцы і мужыкі не плацяць падаткоў, што іх папы і судовыя не абдзіраюць, што маскалі па вёсках не абедаюць і што народ жыве саўсім шчасьлівы. І парадаваўся пранцуз, што памог нашаму народу, а цар маскоўскі таму — што абмануў мужыкоў і пранцуза.

Але абманам сьвет пярэйдзеш, а назад не вернеш. Народ стаў жаліцьца і стаў нарэкаць, што не мае палёгкі, а пранцуз, агледзеўшыся, што яго абманулі, пачаў сабіраць войска, штобы цэлы народ увольніць.

Узнаўшы аб гэтым, цар перапалохаўся; наслаў к нам маскалёў, штобы не позволілі народу сьпяваць у касьцёлах і плакаць аб сваём горы, а сам панемногу стаў уступаць варту, старожу і паншчыну, каторых за Польшчы нашы прэдкі не зналі, і спадзяецца, што народ сціхне. Але вы, мілые дзеткі, прызавіце Бога на помашч і цярпеце. Не верце папам і судовым, калі вам гаварыць стануць, што цар маскоўскі падаруець для вас зямлю. Папытайце такіх людзей — чаму цар не падараваў казённым мужыкам зямлі? Не верце таму, калі вас к ліхому падмаўляць стануць, і не верце таму, што цар аб вас думае, бо ён думае толькі аб падатках і гэтых вам не падаруе.

Непрыяцель веры нашых прэдкаў не можа добра зычыць народу.

Міласэрны Бог прывядзе к вам караля польскага з войскам польскім і пранцуза, а вы ідзіце памагаць ім прагнаць маскаля із зямлі вашых прэдкаў! Тагды ўсякаму жаўнеру дадуць зямлю, як гэта было за вашых прэдкаў.

Статкуйце і слухайце людзей разумных, каторы вам добра зычаць, цурайцесе людзей паганых і жывіце згодна са ўсемі суседамі вашымі. Не называйце нікога — ні паном, ні жыдом, ні татарам, бо ўсе вы браты, бо ўсе вы дзеці аднаго Бога і адной зямлі Польскай.

Вы, браты шляхта! пакажыце цэламу сьвету, што вы сыны даўніх жаўнераў, каторыя стаялі за вольнасьць народу і зямлі Польскай.

Вы, дзеці мае мужыкі! Ідзіце за шляхтаю і памагайце палякам, бо чэрэз іх толькі дастанеце зямлю і вольнасьць ва векі вякоў.

Але ўсякае дзело, як і вашы прэдкі, начынайце з Богам. Падайце сабе рукі, як браты, і ідзіце разам, а немцы і маскалі будуць уцякаць прэд вамі.

А калі прыйдзе пара, атцы і маткі, благаславіце сыноў вашых і пасылайце іх на помашч каралю польскому, а Бог паблагаславіць вам, і вы косьці свае паложыце на собственнай і вольнай зямлі! Тагды Бог прэдкаў вашых порадуецца вашаму шчасьцью, а вы прэд Яго алтарамі засьпяваеце малітву радасьці, што Бог вас увольніць ва векі вякоў, Амэн.

# ЖЫЦЦЯПІС ВІНЦЭНТА ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА Ў КАНТЭКСЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ XIX СТАГОДДЗЯ

## 1808

*23 студзеня (4 лютага).* У «біскупскім» фальварку Панюшкавічы, непадалёк ад Бабруйска (таму яшчэ лічылася, што Панюшкавічы падпарадкоўваліся Бабруйскай «бенефіцыі»), які належаў сваяку Марцінкевічаў, мітрапаліту ўсіх рымска-каталіцкіх касцёлаў Расійскай імперыі Станіславу Богушу-Сестранцэвічу, у сям'і шляхціца Яна Марцінкевіча (меў тытул наваградскага падчашага) і Марцыяны з Нядзведскіх нарадзіўся сын. У той жа дзень ксёндз Ігнат-Якуб Даліва-Садкоўскі ў Бабруйскім парафіяльным касцёле ахрысціў яго імёнамі ***Вінцэнт-Якуб.*** «Чын» кананічны святар зыначыў: здзейсніў адной вадою «дзеля небяспекі жыцця». Дзіцятка з'явілася на свет гэткім кволым, што магло ў кожнае імгненне пайсці на неба няхрышчаным. Самы адметны штрых першага афіцыйнага дакумента, звязанага з нараджэннем на свет будучага нацыянальнага класіка,— хроснай мамай (маладой кумой) была... сястра нованароджанага Юлляна Марцінкевічанка. Кумам — «яго міласць» Гіпаліт Паўловіч. Пра абаіх звесткі ў марцінкевічазнаўстве адсутнічаюць. Тытульнае імя немаўляці далі паводле каталіцкай традыцыі, «з календара»: на 22 студзеня прыпадаюць імяніны Анастаса; Вінцэнта. *«Анёлку, анёлку, дай яму добру дольку»* — так традыцыйна маглі пажадаць нованароджанаму пры хросце.

*25 ліпеня.* У Бабруйскім касцёле адбыўся другі паўнавартасны хрост. «Я, Адальбэрт (Альбэрт) Шчасновіч, [...] ахрысціў асвячаным алеем і даверш ыў іншыя абрады над дзіцем Якубам-Вінцэнтам Марцінкевічам, сынам яго міласці Яна і Марцыяны з Нядзведскіх Марцінкевічаў. Хроснымі былі спадар Вінцэнт Стафаноўскі з Людвікай Вайзбунавічанкай, Ян Пацына з спадарыняй Каетанай Вайзбунавічанкай».

## 1810—1819

Разам са старэйшаю (на два гады) сястрою Гэленай гадуецца ў родных Панюшкавічах пад наглядам маці. [*Находится при матери, по переписи 1811 года. Доказательства о дворянстве у дяди, живущем в*

*Слуцком повете. (Женский пол): Винцента Иванова мать Марцияння Марцинкевичева, 40 (лет). Дочь ея Гелена Иванова, 11 (лет).*] Бацька Ян у перапісных дакументах не згадваецца. Памёр?

## 1812

*13 сакавіка.* На Беларусі-Літве царызмам уведзены вайсковы стан. Бо яшчэ з пачатку 1811 г. «выяўна адчуваўся варожы настрой» між Расіяй і Францыяй. Расейцы яшчэ больш умацоўвалі Рыгу, распачалі будаўніцтва новай фартэцыі ў Бабруйску. Як раслі муры апошняй крэпасці, Вінцэнт дзіцём мог бачыць на ўласныя вочы. Такія былі рэаліі ягонага маленства...

*10(22) чэрвеня.* Францыя аб'явіла вайну Расіі. Вялікае спусташэнне прыйшло на палеткі былога Вялікага княства Літоўскага.

## 1813

*30 лістапада.* На Беларусі (у Менскай губ.) зняты вайсковы стан.

## 1816

*Улетку.* Пасля крывавага спусташэння паўночных абшараў царызм праводзіць перапіс насельніцтва. Маці будучага пісьменніка (падпісвалася як *Marcianna Marcinkiewiczowa*) запісала ў пасямейным спісе, што сын Вінцэнт выхоўваецца ёю ў маёнтку Панюшкавічы. Да агульнай Панюшкавіцкай «рэвізскай сказкі»-справаздачы «прыклаў руку» ўладальнік «духоўнага маёнтка Ян Янаў сын Сестранцэвіч» (братанец згаданага мітрапаліта).

Дзякуючы тым перапісным дакументам можна падлічыць страты (народзіны і смерць) паміж 1811-м і 1816 г. Пабачыць увачавідкі, колькі сялянства загінула (не вярнулася з рэкрутаў) падчас напалеонаўскай навалы 1812 г. Так, у саміх Панюшкавічах, па апошняй рэвізіі 1811 г., было 23 душы (мужчынскіх), у 1816-м — усяго 13. У суседняй вёсцы Красна з 69 двароў-сямей засталося 50 (знішчана 19). І прабягае мароз па скуры ад неадчэпнай думкі: колькі ж талентаў нашых звялося і тады, і пазней...

*4 лістапада.* У вёсцы Кублічы на Ушаччыне нарадзіўся Арцём Вярыга-Дарэўскі — адзін з надзейных паплечнікаў Вінцэнта; возьме сабе сугучны з ім псеўданім «Наддзвінскі дудар».

## 1817

*1 кастрычніка.* У Вільні сем маладых дзецюкоў-студэнтаў тамтэйшага універсітэта (Т. Зан, Ф. Малеўскі, А. Міцкевіч, В. Палюшынскі, А. Петрашкевіч, Б. Сухецкі, Юзаф Яжоўскі) заснавалі Таварыства філаматаў (г. зн. сяброў навукі); верылі ў магчымасць удасканальвання чалавека і маральнага ўздзеяння на свет, людзей.

*10 кастрычніка.* У далёкай Швейцарыі, у выгнанні, памёр Тадэвуш Касцюшка (а на радзімай Літве стала больш на адзін «кенатаф» — пустую, сімвалічную магілу). Разам з легендарным ваяром, нацыянальным героем Амерыкі, Польшчы, Францыі (але толькі пакуль не на радзіме) скончылася эпоха «жывой надзеі» на дзяржаўнае адраджэнне Рэчы Паспалітай, а разам з ёй — Літвы-Беларусі.

## 1818

*12 лістапада.* Па аб'яве, пададзенай у Слуцкі і Пінскі земскія суды, належала выканаць патрабаванне *«градской полиции»* — займець ад дзядзькі «малолетняго» Вінцэнта, ротмістра Ігната Марцінкевіча, сямейныя дакументы з пасведчаннем на шляхецтва.

## 1819

*12 студзеня.* Марцінкевічаў дзядзька Ігнат даслаў са Случчыны тлумачэнне, паводле якога калі ён і мае дакументы на шляхецтва — дык выключна на сябе і сваіх дзяцей, і нікому іншаму падаваць не абавязаны. Так што пазней, на пачатку 1830-х гг. Вінцук меў усе падставы напісаць: *«З дзяцінства асірацелы і маючы нядбайную радню...»*

Вінцэнтаў бацька сярод сямейнікаў не запісаны. Адказ просіцца сам па сабе: памёр. І доўгі час укладальнік быў упэўнены ў гэтым, пакуль не трапіў на згадку пра шляхецкае пасведчанне, выдадзенае Яну Мікалаевічу з Віленскай шляхецкай зборні ў... 1819 г. Значыць, напрыканцы 1810-х гг. Вінцэнтаў бацька яшчэ жыў? Апроч шляхецкіх матэрыялаў, у судовым справаводстве па Менскай губерні [Алфавитный список лиц, привлекавшихся к суду за 1800—1870 гг.] пад датаю 31.10.1819 г. названы *«Марцинкевич Иван.— За самоуправство»*. Вельмі верагодна, што бацька класіка! На жаль, самі дакументы не захаваліся, а толькі іх пералік-рэестр. Паказальна, што ў ім на наступным аркушы названы сам Вінцэнт!

*19 снежня.* Віленскі дваранскі дэпутацкі сход пацвердзіў Яну Марцінкевічу (бацьку Вінцэнта) ягонае шляхецкае паходжанне.

*У гэтым годзе.* Маці Вінцэнта адсылае сына з Панюшкавіч у сталічны Пецярбург пад апеку *«рымска-каталіцкіх цэркваў біскупа Сестранцэвіча».*

У Менску ўзнікла «Таварыства шасці». Узначаліў «міньшчанін» Тамаш Зан.

## 1819—1826 (?)

Жыве ў Пецярбургу на ўтрыманні дзядзькі, біскупа ўсіх рымска-каталіцкіх касцёлаў у Расіі Станіслава Богуша-Сестранцэвіча. Пецярбургскія салоны адкрыты перад пляменнікам уплывовага рэлігійнага і дзяржаўнага саноўніка з еўрапейскім імем.

У тым, што Марцінкевічы даводзіліся сваякамі Сестранцэвічам,— сумненняў няма. А дакладней — па якой лініі? «Па мячу ці па кудзелі»? Напачатку (ці не з маёй лёгкай рукі) павандравала ў свет меркаванне, што Сестранцэвічы былі сваякамі па маці Ваўчацкай-Нядзведскай. Ад гэтага цяпер давядзецца адмовіцца. Хутчэй за ўсё сваяцтва ішло «па мячу». Паводле пэўных генеалагічных крыніц вынікае: Ян Богуш-Сестранцэвіч (1687—1771), староста Міхнеўскі, меў за жонку Карнэлію Адынцовую (1701—1773), дачку вількамірскага стражніка, герба Ліс. Дзед Карнэліі Адынцовай быў вількамірскі чашнік Пётра, а бабка Кацярына Дунінова, дачка віленскага падсудка, герба Лебедзь...

## 1821

*26 снежня.* У роднага брата Ігната, які жаніўся ў Санкт-Пецярбургу на княгіні Л. Валконскай, нарадзіўся сын Сцяпан (*alias* Станіслаў; паводле метрык, выдадзеных у Пецярбургу з царквы Святой Роўнаапостальнай Марыі-Магдалены).

## 1823

*17 (29) верасня.* Нарадзіўся Людвіг Кандратовіч — будучы слынны Уладзіслаў Сыракомля. Паплечнік, аднадумца і мажлівы сааўтар паэмы «Плынуць вятры...».

*26 кастрычніка.* Адам Міцкевіч назаўсёды развітаўся не толькі з Вільняй, але і з роднай зямлёй. Праз некалькі дзён ён будзе ўжо ў Пецярбургу, стане сведкам катастрафічнай паводкі стагоддзя. Ці пабачыў маладога паэта-літвіна падлетак з Панюшкавіч?

## 1825

*6 красавіка.* У роднага брата Ігната ў Санкт-Пецярбургу нарадзіўся сын Міхал.

*Снежань.* З усіх падзей пецярбургскага жыцця перад маладым Дуніным-Марцінкевічам яркай маланкай палыхнуў снежаньскі за́калат 1825 г. (пры ўмове, што наш герой яшчэ жыў пад апекай біскупа). Нябачаны раней сполах агарнуў не толькі палац мітрапаліта. Звыклы да дварцовых пераваротаў, як злодзей да непазбежнай турэмнай вязніцы, Пецярбург скаланулуся перад іншым: адкрытым бунтам. Колькі нахабства і непавагі да найяснейшага манарха меўся набрацца малады Бястужаў, каб тачыць шаблю аб гранітны край помніка Пятра перад вокнамі сената?!! Тыя некалькі гадзін на Сенацкай плошчы мелі права называцца ў гісторыі Паўстаннем...

## 1826

*1 снежня.* У Пецярбургу, на 96-м годзе жыцця, памірае С. Богуш-Сестранцэвіч — сваяк і найуплывовы апякун Дуніна-Марцінкевіча. Ідучы ў доўгай жалобнай працэсіі ажно ў касцёл Св. Станіслава (тады на ўскрайку Пецярбурга), Вінцэнт асэнсоўваў: «Чужая яечня не вечна» і васемнаццаць гадоў — той узрост, калі час думаць пра ўласны хлеб і кар'еру, нават калі ў цябе незайздроснае здароўе і універсітэцкая навука з-за гэтага не ладзіцца. (Легенда, нібы ў анатамічным пакоі Вінцэнт «пры першым рэзанні трупа абамлеў», мае пад сабой нейкі грунт.) Прыказкі пра абодвух: «Старасць — не радасць і горб не ў карысць. Што змоладу навучышся, на старасці як знойдзеш». Вінцэнт навучыўся расійскай мове, зграбна і выразна пісаць, трымацца на людзях, ведаць, што далёкая старана — не радня. Род твой застаўся там, над Беразіною, Дняпром, Свіслаччу…

*7 снежня. «Санкт-Петербургские ведомости»* падалі некралог. *«1-го числа сего месяца скончался здесь на 96-м году от рождения... Станислав Сестренцевич-Богуш. Он родился в нынешней Виленской губ. в Троцком повете(!!) в родительском поместье, называемом Замком(?!), ...от благородной литовской фамилии...»* (№ 98, ліст 1150;

газета мела суцэльную пагінацыю лістоў, як кніга-серыял; і ў тым вялікая рацыя: мінаюць гады, ужо стагоддзі, і, пранікаючы ў той незваротна далёкі час, раптам пераконваешся, што найлепш пазнаць, адкрыць, зразумець далёкую гісторыю дапамагаюць не дзесяткі манаграфій ці яркіх мастацкіх твораў, а... гартаючы тагачасную перыёдыку — найлепшы раман кожнай эпохі).

## 1827

Знаходзіцца ў Менску пры губернскім менскім каморніку Міхалу Наркевічу, удасканальваецца ў «геаметрычнай тэорыі і практыцы».

## 1828

*8 красавіка.* У роднага брата Ігната ў Санкт-Пецярбургу нарадзіўся сын Мікалай.

Уладкоўваецца памочнікам каморніка пры Менскім межавым судзе. Такім чынам дваццацігадовы Вінцэнт распачаў чыноўніцкую кар'еру.

## 1829

*26 лістапада.* Атрымаў на рукі пасведчанне з добрымі адзнакамі «па геаметрычнай практыцы» і інш.

*29 лістапада.* Падаў прашэнне пра зацвярджэнне на новую пасаду каморніка Менскага апеляцыйнага межавага суда.

*30 лістапада.* Склаў прысягу на годнасць каморніка.

## Пачатак — сярэдзіна 1830-х гг.

Працуе каморнікам у Менскім павятовым межавым судзе (паводле *«Копии постановления Минского уездного межевого суда о исправлении должности землемера в оном суде и о выполнении присяги на должность его Викентием сыном Ивана Марцинкевичем»*).

## 1830—1831

У беларускім краі неспакойна ад паўстання, узнятага лістападаўскай ноччу 1830 г. у Варшаве. Рэха яго пралунала і над беларускімі абшарамі.

## 1831

*Студзень — чэрвень.* Працяг Лістападаўскага паўстання на Літве-Беларусі. Сумна вядомая *ашмянская рэзь 1831 г.*, наладжаная царскімі карнікамі, падчас якой па вулках мястэчка «кроў дзяцей плыла проста як чалавечая кроў». На Ашмяншчыне жылі Марцінкевічавы сваякі (у тамтэйшы касцёл па метрыкі ўласнага хросту звяртаўся старэйшы Вінцэнтаў брат Ігнат-Мацей).

У часопісе «*Молва*» (№ 21), які пачаў выдавацца ў Маскве, надрукаваны тэкст беларускай песні з дадаткам разважання пра асаблівасці беларускай мовы. Верш падпісаны *«Беларус К. К.»*. Гэта быў Каэтан Касовіч, ураджэнец Беларусі, пазней выдатны расійскі вучоны і перакладчык.

*18 снежня.* Пабраўся з маладзенькай Юзэфкай Бараноўшчынкай, употай ад бацькоў апошняй, што былі для Вінцэнта хлебадаўцамі.

## 1832—1834

Даводзіць свой шляхецкі радавод, падаючы прашэнні ў адпаведныя ўстановы; неаднаразова піша заявы ў Менскую шляхецкую дэпутацкую зборню і ад імя сваякоў, якія жылі ў Пецярбургу, на Ашмяншчыне, Наваградчыне, Случчыне. Пераходзіць на пасаду перакладчыка касцельных актаў пры Менскай рымска-каталіцкай кансісторыі (з польскай на расійскую мову). Распачынаецца татальная русіфікацыя краю.

## 1832

*6 студзеня.* Жонка Юзэфа пазычае 30 руб. срэбрам у свайго дзядзькі Юрыя Гацыскага ў фальварку Вязынь. «Сведкам» прысутным быў «муж, Вінцэнт Марцінкевіч».

*16 жніўня.* Падае ў Менскую дваранскую дэпутацкую зборню грунтоўна падрыхтаванае прашэнне пра зацвярджэнне ў шляхецкай годнасці роду Дунінаў-Марцінкевічаў. *«З дзяцінства асірацелы і маючы нядбайную радню, я зусім не меў нікога, хто б заняўся радаводнымі справамі нашага роду. Цяпер жа, дажыўшы да сталых гадоў, я ледзьве змог здабыць ад сваякоў нашы паперы, якія маю гонар падаць у тутэйшую дэпутацыю...»*

*19 жніўня.* Менская шляхецкая дэпутацкая зборня сваёй пастановай пацвердзіла «шляхецкую годнасць роду Дунінаў-Марцінкевічаў».

Сам просьбіт у ёй названы каморнікам Менскага павятовага межавога суда.

*29 жніўня.* З Менскай шляхецкай дэпутацкай зборні атрымлівае пасведчанне пра шляхецкае паходжанне сваяка — Станіслава, сына Язэпа Марцінкевіча.

*9 кастрычніка.* Для перакладу «на расійскі дыялект» атрымаў радаводныя дакументы, прыкладзеныя да прашэння ад 16 жніўня 1832 г. Дзеля чаго ўсе гэтыя намаганні? Бо царызм жорстка душыць шляхту на землях літоўска-беларускіх. Каланізацыйны ўрад усведамляе, адкуль для яго ідзе найбольшая небяспека.

## 1834

*30 студзеня.* Піша прашэнне ў Менскую шляхецкую зборню з просьбай на далучэнне да шляхецкага (дваранскага) роду роднага брата Ігната, які жыве ў Санкт-Пецярбургу, і ягоных сыноў Сцяпана-Станіслава, Міхала і Мікалая.

*У гэтым месяцы.* Падае прашэнне «*об определении меня*» на пасаду перакладчыка Менскай рымска-каталіцкай кансісторыі. Што ж, хоць пасада малаплатная, ды не цяжкая. А «*лёгкай працай зарабіць і грош добра*». Ён не ведаў, што залатымі літарамі ўпіша сваё імя як тлумачальніка, перакладаючы іншыя старонкі. Бо якраз у гэтыя дні ў далёкім Парыжы дапісваліся апошнія старонкі апошняй, дванаццатай, быліцы нашай нацыянальнай эпапеі: паэмы «Пан Тадэвуш».

*15 лютага.* У Менскай шляхецкай дэпутацкай зборні складаецца грунтоўны вопіс дакументаў «на дворянское происхождение рода Дунинов-Марцинкевичов».

*20 (28?) лютага.* Менская шляхецкая зборня высылае (за № 426) справу пра шляхецтва Вінцэнта «в Правительствующий сенат по Герольдии» ў Пецярбург. Трэба думаць, у горадзе ягонай маладосці заставаліся знаёмцы, што паспрыяюць адносна хуткаму і, галоўнае, станоўчаму разгляду.

*28 чэрвеня.* У гэты дзень скрупулёзныя французскія бібліёграфы занатавалі выхад у свет «Пана Тадэвуша». Наклад выдання склаў тры тысячы асобнікаў.

*Ліпень.* Перапіска паміж Менскай рымска-каталіцкай калегіяй і біскупам М. Ліпскім пра немажлівасць выканання Вінцэнтам абавязкаў перакладчыка.

*Лістапад.* Часова выконваючы пасаду (*«занимающий должность»*) перакладчыка Менскай рымска-каталіцкай кансісторыі, В. Дунін-Мар-

цінкевіч (*«жительствующий в городе Минске на Полицейской улице»*) падае чалабітную на імя Мікалая Паўлавіча, каб загадана было ягоную справу як найхутчэй вырашыць у сенаце па Герольдыі. *«На сие мое прошение благосклонное немедля учинить постановление»*. Вы бачыце, як размаўляе з царом! Не марудзячы выдаць адказ-пастанову!

*У гэтым годзе.* Выкладанне ў школах Літвы-Беларусі пераводзіцца з польскай на расійскую мову. Тым самым, на думку акупацыйнага чынавенства, «дадзены ў мясцовым краі выхаванню моладзі новы кірунак, выратавальны як для сямейнага шчасця, так і для дабрабыту народнага...».

*У гэтым годзе (?).* Нарадзілася дачка Каміла.

## 1835

*31 кастрычніка.* Нарадзілася дачка Эмілія.

## 1836

*1 ліпеня.* Ахрышчана дачка Эмілія. Кумы: тытулярны радца Мацей Бардскі і Ганна Каменская. Вінцэнт выбраў кума не толькі з пасады сакратара тамтэйшай шляхецкай зборні, але ці не з павагі да Бардскага як мясцовага паэта-аматара (аўтара паэмы «Галька»).

*2 кастрычніка.* Нарадзіўся сын Міраслаў-Эдвард.

*7 лістапада.* Маладая сям'я Марцінкевічаў набывае «ў губернскім месце Менску на Салдацкай слабадзе» два пляцы «з забудовамі, садам і агародам» на вуліцы Захараўскай. Калі ж быць шчаслівымі, як не ў маладосці?!

## 1837

*16 траўня.* Хрост Міраслава, першага сына. Шчаслівы бацька замовіў ажно чатыры пары кумоў — хросных бацькоў. «З-пад Залатой Горкі. Року тысяча восемсот трыццаць сёмага мая шаснаццатага дня кс. Вавжынец Лукашэвіч, дамініканін, вікарый, ахрысціў з вады і св. алеяў немаўля імёнамі Міраслаў-Эдвард, народжаных Вінцэнта і Юзэфы з Бараноўскіх Марцінкевічаў, перакладчыка рымска-каталіцкага кансісторыя, шлюбных малжонкаў. Хрысцілі сына, народжанага ў року тысяча восемсот трыццаць сёмым у месяцы кастрычніку дня другога,

уроджаны Казімір Ваньковіч, суддзя 1-га дэпартаменту, з уроджанай Тэафіляй Спасовічавай, інспектаркай». Далей у дакуменце ідзе пералік яшчэ шасці асоб.

## 1838

*9 сакавіка.* Зацверджаны ў шляхецкай годнасці паводле канфірмаванага царом меркавання.

*Перад 27 ліпеня.* Звярнуўся з прашэннем у Дырэкцыю вучэльняў Менскай губерні прыняць яго на пасаду справавода Дырэкцыі.

*28 ліпеня.* Дырэктар вучэльняў А. Арлоў накіраваў папячыцелю Беларускай навучальнай акругі ў Вільню «прадстаўленне аб прызначэнні» Дуніна-Марцінкевіча справаводам Дырэкцыі.

*5 жніўня.* Папячыцель навучальнай акругі прызначыў Дуніна-Марцінкевіча справаводам Менскай дырэкцыі.

*29 жніўня.* Дунін-Марцінкевіч звярнуўся да дырэктара вучэльняў з прашэннем звольніць яго з пасады справавода па прычыне хваробы.

*12 верасня.* Звольнены з пасады справавода.

*10 кастрычніка.* Памёр цесць Юзаф Бараноўскі.

*25 снежня.* «Калядны падарунак» з нябёсаў сямейству Марцінкевічаў: нарадзілася дачка Аўгіння-Эмілія. Другім імем бацькі назвалі яе ці не ў памяць аб старэйшай дачцэ, на той час ужо памерлай (?). У жыцці яна засталася вядомай як Аўгіння-Яўгенія. Перш чым выйсці замуж разам з малодшай Цэзарынай настаўнічала ў знакамітай Люцінскай школцы. Падчас закрыцця апошняй па даносе ўвосень 1876 г. Яўгенія ў Люцінцы адсутнічала: паехала ў Сібір адведаць Камілу. Верагодна, там і пазнаёмілася са сваім будучым мужам Альфонсам Бандзынскім (ссыльным).

## 1839

*14 лютага.* Піша прашэнне выконваючаму абавязкі губернскага маршалка шляхты Фларыяну Ржавускаму, каб выдалі пасведчанне пра шляхецкую годнасць у сувязі з «узнагароджаннем чынам».

*17 лютага.* Патрэбнае пасведчанне атрымаў.

*25 сакавіка.* На Беларусі адбылося гвалтоўнае скасаванне Уніі.

*21 лістапада.* У Менску памёр каталіцкі біскуп Мацей Ліпскі, прыяцель Богуша-Сестранцэвіча, пэўны час апякун В. Дуніна-Марцінкевіча. Канец чыноўніцкай кар'еры. *«У нас в России кто не служит, тот еще не родился, а кто службу оставил, тот, считай, помер».*

*У гэтым годзе.* У Парыжы выйшла «наддунайская» аповесць-раман польскага пісьменніка-эмігранта Міхала Чайкоўскага *«Kirdżali»* («Кірджалі»), якая пазней паслужыць асновай для стварэння паэмы «Славяне ў XIX стагоддзі».

## 1840

*9 лютага.* Судовымі ўладамі ў Менску заведзена справа «По выяснению претензий, простираемых к покойному епископу Липскому», па якой адным з галоўных сведкаў «праходзіў» Вінцэнт.

*18 лютага.* Камісія па справе Ліпскага падае просьбу губернатару, каб той загадаў перакладчыку кансісторыі Марцінкевічу даць *«все те сведения, какие ему известны и какие могут служить доказательством к обнаружению злоупотреблений»*.

*9 (21) сакавіка.* У фальварку Свіраны на Віленшчыне нарадзіўся будучы класік Францішак Багушэвіч. Беларуская зямліца спаквaля, патаемна рэгенеравалася пасля чарговага паўстання, напаўнялася жыццядайнымі крыніцамі, рыхтуючыся да чарговага адкрытага збройнага супраціву.

*12 сакавіка.* Нарадзілася дачка Зофія-Аліцыя.

*Сакавік — красавік.* Выконваючы абавязкі менскага павятовага маршалка шляхты павятовы суддзя Бржазоўскі хадайнічае перад менскім губернатарам пра выдачу Дуніну-Марцінкевічу гадавога пашпарта для паездкі на мінеральныя воды ў Карльзбад і Эмс з жонкаю Юзэфай і дачкой Камілай. Сваім парадкам выконваючы абавязкі менскага губернатара Чмыхаў накіроўвае рапарт пра гэта віленскаму генерал-губернатару князю М. А. Далгарукаву, дадаўшы, што Дунін-Марцінкевіч «к беспорядкам 1831 года прикосновен не был». Далгарукаў наклаў на рапарце Чмыхава рэзалюцыю: «Спытацца згоды графа Бенкендорфа». У міжчассе на месца губернатара Даўгарукава прызначаецца генерал-лейтэнант Хведар Мірковіч.

*6 красавіка.* Памерла цешча, удава Марыля Бараноўская.

*8 красавіка.* Ад Алойзія Сялявы, Юліі Скржэтульскай і Апалоніі Янкоўскай набыў фальварак Люцінка. Так жадалася займець для немалой сям'і сталы кут, а для сябе — вясковыя пенаты. Менавіта тут новая беларуская літаратура матэрыялізуецца ў таленавітых, а таму несмяротных творах пісьменніка-драматурга.

Гэтым жа днём датаваная пазыковая распіска Ганне і Элеаноры Драздоўскім на 150 руб. срэбрам пад працэнты.

*24 красавіка.* Нестар Кукальнік на адной з літаратурных вечарынаў накінуўся на толькі што выдадзеную кніжыцу *«Кобзарь»*. У дзённіку адзін з украінскіх літаратараў занатуе: «Кукольник уже напал на

Мартоса, критиковал Шевченка. Уверял, что направление его «Кобзаря» вредно и опасно...»

*17 траўня.* В. а. менскага губернатара Сушкоў вяртае пашпарт Дуніна-Марцінкевіча ў Вільню, бо пісьменнік быў патрэбны ў Менску ў сувязі са следствам па справе Ліпскага. Дуніну-Марцінкевічу забаронена «всякая отлучка из Минска».

*18 траўня.* Камісія па справе біскупа Ліпскага звярнулася да Дуніна-Марцінкевіча з патрабаваннем даць паказанні па 13 «прадметах» (пытаннях), якія цікавілі следства.

*21 ліпеня.* Ахрышчана дачка Зофія-Аліцыя. Кумамі былі надворны радца Даніла Спасовіч з Марыляй Маскалёвай, палкоўнік Крачэтнікаў і інш.

*У гэтым годзе.* Падпісаўся на «Незабудку» Я. Баршчэўскага.

У Парыжы выйшла кніга Алеся Рыпінскага «Беларусь» (*«Białoruś»*). Так у самым цэнтры Еўропы людзі маглі даведацца пра нашу радзіму больш, чым тыя, хто заставаўся жыць на берагах Дняпра і Нёмана пад ярмом.

Таксама ў Парыжы ў *College de France* Адам Міцкевіч пачынае чытаць курс лекцый (1840—1844) пра славянскія літаратуры, дзе непаўторна і дакладна ўзважыць моц і харство роднага слова, змалку чутага над Нёманам.

## 1841

*1 красавіка.* Антрэпрэнёр меставага тэатра Ян Хэлмікоўскі запрасіў Вінцэнта кумам на хрост сваёй дачкі.

*16 жніўня.* Нарадзілася дачка Цэзарына.

*23 верасня.* У Менску падчас выбараў шляхты намаганнямі аматараў «правінцыйнага» тэатральнага актыву адбылася на карысць дзіцячага прытулку пастаноўка «камічнай оперы ў адной дзеі» «Рэкруцкі жыдоўскі набор»; лібрэта (і музыка) В. Дуніна-Марцінкевіча і К. Крыжаноўскага. Адну з галоўных роляў (Ёгана Бенатана) сыграў Дунін-Марцінкевіч. Рэшта актораў выглядала наступным чынам: палкоўніка Міраслава іграў Мядынскі; жаўнера Вільгельма — Расадоўскі; дачку Ёгана Бената Сару — панна Валатоўшчынка; Юнкеля (нарачонага Сары) — Семянкевіч, удаўца Ізраіля — Крыжаноўскі; хор жыдоў — Дамашэўскі, Корбут, Кучынскі, Петрапаўлаўскі і інш.

*10 кастрычніка.* «Минские губернские ведомости» (№ 41) змясцілі водгук пра дабрачынны спектакль. Пераказваўся змест «Рэкруцкага жыдоўскага набору», ацэньвалася ігра артыстаў. Адзначалася: *«Сочинитель Марцинкевич был забавнее всех».*

## 1842 — 1844

Напісаны драматычныя сумесныя творы (не захаваліся) Дуніна-Марцінкевіча, К. Крыжаноўскага і С. Манюшкі — аперэты «Спаборніцтва музыкаў», «Чарадзейная вада». Напісана камічная опера *«Sielanka»* («Ідылія»).

## 1842

*17 студзеня.* Чэрыкаўскі павятовы маршалак шляхты Рашкоўскі выслаў у Менскую дваранскую дэпутацкую зборню «Посемейный список дворянина 2-го разряда Викентия Иванова сына Марцинкевича». Пра пісьменніка сказана: «Состоит на службе у частных лиц».

*13 траўня.* У Траецкім касцёле ў Менску ахрышчана дачка Цэзарына. Хроснымі былі палкоўнік Ян Язвекаў і губернатарша Ганна Чмыхава.

## 1843

*10 траўня.* Пазычыў у купца Чорнага 300 руб.

## 1844

*5 траўня.* Цэнзурны дазвол віленскага цэнзара А. Мухіна на друкаванне асобнай кнігай оперы «Ідылія».

## 1845

*27 студзеня.* III Аддзяленне ўласнай Яго Вялікасці канцылярыі (у асобе чыноўніка А. Урэля) ухваліла для пастаноўкі на сцэне «Ідылію».

*Сакавік.* Менская паліцыя наклала забарону на маёмасць Дуніна-Марцінкевіча ў сувязі з патрабаваннямі купцоў Чорнага і Шапіры за пазыкі больш чым на тысячу рублёў. Вінцэнт з жонкай Юзэфай прадалі як сумесную маёмасць дом у Менску на Захараўскай вуліцы. Набыла (за 1000 руб. срэбрам) тытулярная радніца Ф. Пацейкава.

## 1846

*Лістапад.* Складзены статыстычны вопіс Люцінкі для будучага закладу ў Менскі прыказ грамадскай апекі.

*У гэтым годзе.* У Віленскай друкарні Ю. Завадскага пабачыла свет лібрэта «*Sielanki*» («Ідыліі»).

## 1847—1850

У Менску, Вільні, Кіеве, Гародні, Варшаве з поспехам прайшлі гастролі «малолетних» Камілы і Міраслава. «Эти дети поистине уже лучше многих и многих»,— з захапленнем пісаў адзін з музычных рэцэнзентаў.

## 1847

*21 сакавіка.* Пра музычныя здольнасці і выканальніцкія поспехі дзяцей Дуніна-Марцінкевіча напісалі «Минские губернские ведомости».

*21 чэрвеня.* «Виленские губернские ведомости» (№ 25) змясцілі артыкул пра канцэрт Камілы і Міраслава Марцінкевічаў у Вільні.

*20 жніўня.* Вексель жонкі пісьменніка Юзэфы Марцінкевіч Фэліцыяне Пржаўлоцкай на пазыку 80 руб.

*29 жніўня.* Пазычыў у Тадэвуша (Фадзея) Гейдукевіча 100 руб.

*Да 23 верасня.* Доўг купцу Івану Ракаву «за набранные товары» 78 руб. 68 кап. срэбрам.

*23 верасня.* Менская палата цывільнага суда засведчыла, што маёнтак Люцінка свабодны ад якіх-небудзь іскаў і казённых спагнанняў і можа быць закладзены ў Прыказе грамадскай апекі. Названы прыватныя даўгі Марцінкевічаў Драздоўскім, Ляхоўскаму, купцу Ракаву.

*2 кастрычніка.* «Объявление» Вінцэнта і Юзэфы Марцінкевічаў у Менскі прыказ грамадскай апекі з просьбай прызначыць пад заклад маёнтка Люцінка пазыку на 27-гадовы тэрмін з разліку па 60 руб. срэбрам за кожную прыгонную душу.

*13 кастрычніка.* «Объявление» Вінцэнта і Юзэфы Марцінкевічаў у Менскі прыказ грамадскай апекі з просьбай аплаціць з пазыковых грошай доўг купцу Шапіру на 100 руб. срэбрам.

*27 лістапада.* Менская палата цывільнага суда паведаміла ў Прыказ грамадскай апекі пра пазыковыя абавязацельствы Марцінкевічаў Ф. Гейдукевічу і Ф. Пржаўлоцкай.

## 1848

*20 красавіка.* Канчатковае афармленне ў Менскім прыказе грамадскай апекі пазыкі 700 руб. срэбрам на 26 гадоў пад заклад маёнтка Люцінка.

*20 кастрычніка.* Напісаны верш «Малітва на памінальны дзень» (Менск).

## 1849

*9 студзеня.* Артыкул у «Киевских губернских ведомостях» (№ 5) пра канцэрт дзяцей Дуніна-Марцінкевіча ў Кіеве, іх музычныя здольнасці і выканальніцкае майстэрства.

*3 траўня.* Напісаны верш «Дзіця і маці» (Менск).

*12 траўня.* У Альпені (на Палессі, паблізу Давыд-Гарадка) піша верш «Вясна».

*13 траўня.* Верш «Прыпяць» з пометкай: *На водах Прыпяці.*

*22 чэрвеня.* Выплачвае 25 руб. за заклад Люцінкі.

*19 і 24 жніўня.* Каміла і Міраслаў Марцінкевічы паспяхова выступаюць з канцэртамі ў Гародні. Паведамленне пра гэта змешчана ў *«Tygodniku Petersburskim»* (№ 69 за 13 (25) верасня). У ім адзначана: «...наша публіка з прыемнасцю правяла некалькі гадзін, слухаючы фартэпіянную ігру дваіх дзяцей-артыстаў — дванаццацігадовага Міраслава і трынаццацігадовай Камілы Марцінкевічаў, якія прыехалі ў наш край з губернскага Менска. Мы нікольк не перабольшваем, называючы іх артыстамі. Хоць ігра на фартэпіяна вымагае цяпер шмат умоў, каб мець права выступаць з ёю публічна, аднак, паводле думкі знаўцаў, музычны талент Марцінкевічаў, бясспрэчна, упаўнаважвае іх на гэта». Сярод рознага выконвалі: фінал з оперы Даніцэці «Лукрэцыя Борджа», мелодыі Ліста, варыяцыі Гензельта і «самой Камілы Марцінкевіч...». «Матэрыял невядомага гарадзенскага карэспандэнта ў *«Tygodniku Petersburskim»* пашырае наша ўяўленне пра геаграфію выступленняў піяністаў-вундэркіндаў (не толькі ў Менску, Вільні, Кіеве, Варшаве) і пацвярджае, што ў сям'і Дуніна-Марцінкевіча панаваў дух высокай музычнай культуры» (У. Мархель).

*20 кастрычніка.* Унёс у Прыказ грамадскай апекі 24 руб. 97 кап. срэбрам — першы гадавы ўзнос ва ўплату працэнтаў па пазыцы 1848 г.

*3 снежня.* С. Манюшка — А. Валіцкаму: *«Падбярэскі закончыў выданне першага тома «Памяцтніка...», здаецца, што ён будзе рэдактарам беларускага часопіса, пра які мы зноў пачынаем гаварыць...»*

## 1850-я гг.

Падчас паездак у Вільню наведвае літаратурныя вечары ў салоне Адама Кіркора, дзе сустракаецца з пісьменнікамі У. Сыракомлем, В. Каратынскім, М. Акялайцісам, А. Адынцом, І. Ходзькам, кампазітарам С. Манюшкам, археолагам Я. Тышкевічам, гісторыкам М. Малеваным і інш. «Літаратурны сход у пана К...» успамінаў пазней у лісце ў рэдакцыю *«Gazety Polskiej»* (гл. 20.04.1861).

## 1850

*28 студзеня.* Канцэрт дзяцей Дуніна-Марцінкевіча ў Менску на карысць Менскага дабрачыннага таварыства.

*31 сакавіка.* У «Минских губернских ведомостях» (№ 13) надрукаваны артыкул «О двух концертах в Минске, данных малолетними артистами Марцинкевичами в зале Благородного собрания» з пометкай: *«Сообщено на польском Гр...м Б...ким».*

*20 чэрвеня.* Вінцэнту перададзена позва ў суд з Ю. Русецкім.

*15 і 23 жніўня.* Каміла і Міраслаў Марцінкевічы выступаюць з канцэртамі ў Варшаве.

*15 жніўня.* С. Манюшка ў пісьме да музычнага крытыка Ю. Сікорскага пісаў з захапленнем: «Што ж ты скажаш пра Марцінкевічаў, маіх землякоў!!»

*25 верасня.* Аплачвае ў Менскім прыказе грамадскай апекі чарговую рату платы за заклад Люцінкі: 34 руб. 30 кап.— адсоткі і 2 руб. 26 кап.— як асноўны капітал.

*2 кастрычніка.* У Вільні піша верш «Літвінка».

*Лістапад.* У часопісе *«Biblioteka Warszawska»* (т. 4) артыкул музычнага крытыка Ю. Сікорскага «Канцэрт малалетніх фартэпіяністаў Камілы і Міраслава Марцінкевічаў...» пра гастролі дзяцей Дуніна-Марцінкевіча ў Варшаве.

## 1851

*14 лютага.* Піша ліст М. Аргельбранту з просьбай выдаць 25 экземпляраў «Ідыліі» і прыслаць нумар *«Biblioteki Warszawskiej»* з артыкулам пра канцэрты яго дзяцей у Варшаве.

*17 сакавіка.* Піша ліст да А. Завадскага з просьбай выдаць 30 экземпляраў «Ідыліі» і пазычыць нумар *«Biblioteki Warszawskiej»* з артыкулам пра канцэрты яго дзяцей.

*Да 5 траўня.* Звяртаецца да цара Мікалая I з прашэннем накіраваць яго дзяцей Камілу і Міраслава ў Парыжскую кансерваторыю для навучання за казённы кошт. Праз статс-сакратара графа Галіцына Дунін-Марцінкевіч атрымаў рэзалюцыю звяртацца па пашпарт да міністра ўнутраных спраў, а на дарогу і ўтрыманне падчас навучання «ничего не определено».

*5 траўня.* Прашэнне віленскаму генерал-губернатару І. Г. Бібікаву пасадзейнічаць, каб дзецьмі заапекаваўся цэсарэвіч, наследнік прастола, якому Каміла пасылае «первые свои музыкальные труды».

*25 траўня.* Адпаведнае пісьмо І. Г. Бібікава обер-гофмайстру двара цэсарэвіча.

*9 чэрвеня.* За адсутнасцю обер-гофмайстра шталмайстар І. М. Талстой перадаў прашэнне Дуніна-Марцінкевіча цэсарэвічу (будучаму імператару Аляксандру II), але той не пагадзіўся накіраваць Камілу і Міраслава ў Парыж і прыняць кампазіцыі Камілы.

Адпаведнае пісьмо І. М. Талстога І. Г. Бібікаву. Рэзалюцыя: «Объявить просителю с возвращением нот».

*6 ліпеня.* Ноты Камілы з адпаведным пісьмом І. Г. Бібікава высланы ў Менск губернатару.

## 1852

*1 лютага.* Ліст А. Завадскаму з просьбай выслаць у Менск экземпляры «Ідыліі».

*9 лютага.* Прэм'ера «Ідыліі» ў Менску. Дунін-Марцінкевіч бліскуча выконвае ролю Навума Прыгаворкі.

*Пасля 9 лютага.* Паводле ўспамінаў, пасля прэм'еры пастаноўка «Ідыліі» была забаронена. Пасля яна ставілася ў Менску на прыватных кватэрах (Свіды, Лапіцкай), а таксама ў правінцыі: Бабруйску, Слуцку, Глуску.

*11 (23) лютага.* У карэспандэнцыі з Менска ў *«Dziennik Warszawski»* за подпісам Ц. Л. высока ацэньваліся драматургічны талент і акторскія здольнасці Дуніна-Марцінкевіча: «Ніхто не стане адмаўляць здольнасцей Дуніна-Марцінкевіча як у галіне драматургіі, так і паэтыкі, калі б яго творы былі пастаўлены на вялікай сцэне, ад гэтага, бясспрэчна, была б карысць як для тэатра, так і для аўтара».

*Снежань.* Паліцыя апісала дом Марцінкевічаў *«за неоспоренный долг купца Шапиры»*. Што ж, вядома здаўна: мастацтва патрабуе ахвяр. Крылаты выраз стаўся для Марцінкевічаў не пустымі словамі.

## 1853

*14 студзеня.* Дае паказанні пра шляхцянку Вароніч (жонку былога заканома, некалі прыслуживала Марцінкевічам у Менску), памылкова запісаную ў «рэвізскую сказку» маёнтка Люцінка.

*31 студзеня.* Рапарт менскай гарадской паліцыі Прыказу грамадскай апекі пра тое, што прыстаў за шматлікія пазыкі апісаў дом Марцінкевічаў, ацэнены на 1020 руб.

*10 сакавіка.* Юзэфа Марцінкевіч прадала дом у Менску на Плябанскай вуліцы настаўніку А. Андрыеўскаму за 1200 руб. срэбрам.

*3 ліпеня.* У Менску піша верш «Фантазія, прысвечаная Антонію Концкаму» (у сувязі з гастролямі вядомага польскага піяніста і кампазітара).

*25 верасня.* У Менску адбыўся аматарскі драматычна-інструментальны канцэрт для збору сродкаў на рэстаўрацыю кафедральнага касцёла. Паводле водгукаў прэсы (гл. наступны запіс), у праграму ўваходзілі «першы акт з оперы «Спаборніцтва музыкаў» п. Марцінкевіча, музыка Крыжаноўскага», «колькі арый з хорамі з камічнай оперы «Жыды» п. Марцінкевіча, музыка Крыжаноўскага». Выступалі таксама («гралі на фартэпіяна») дзеці Дуніна-Марцінкевіча Каміла і Міраслаў.

*20 кастрычніка.* П. М. [Павел Малышэвіч] паведаміў пра канцэрт, які адбыўся ў Менску 25 верасня, у карэспандэнцыі ў *«Dziennik Warszawski»*: «Музыка ў гэтых операх выдатная, аматарскае выкананне было дасканалае».

*31 кастрычніка.* Менскі карэспандэнт *«Dziennika Warszawskiego»* J. A. (крыптанім не расшыфраваны) напісаў пра вераснёўскі канцэрт (гл. вышэй): «Аматарскія пастаноўкі былі вельмі цікавыя, арыгінальныя задумы пана Марцінкевіча, аздобленыя музыкай пана Крыжаноўскага, падабаліся публіцы. Хаця высмейванне жыдоў на сцэне не здаецца нам паступовым».

## 1854

*22 траўня.* У Менску напісана драматычная сцэна ў адным акце «Неспадзяванка для майстрыні».

*25 траўня.* Верш «Галубкі».

*Травень.* Памірае жонка — Юзэфа Бараноўская. Пахавана на Кальварыйскіх могілках у Менску.

*6 чэрвеня.* У Мазыры напісаны верш «Вандроўнік».

*23 чэрвеня.* Піша ў Менску беларускі верш «Віншаванне войта Навума. У дзень імянін панны В... С...».

*Чэрвень.* «Беларускі (Менскі) пісьменнік В. Дунін-Марцінкевіч» і яго «вядомая народная аперэтка «Ідылія» згадваюцца ў нарысе П. Шпілеўскага «Ігрышчы» з цыкла «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных павер'ях».

*1 верасня.* У Менску напісаны верш «Трэба кахаць!».

*10 верасня.* Верш «Яна!» (Менск).

*22 верасня.* У Менску піша верш «Успаміны!».

*11 кастрычніка.* Напісаны верш «Нясталасць» (з пameткай: Менск). А таксама верш «Партрэт Стэфы».

*6 снежня.* У Бабруйску напісаны верш «Смутак на чужыне».

## 1855

*20 лютага.* Цэнзурны дазвол віленскага цэнзара П. Кукальніка на друкаванне кнігі «Гапон».

*12 красавіка.* Цэнзурны дазвол П. Кукальніка на друкаванне кнігі «Вечарніцы і Апантаны».

*4 чэрвеня.* Разам з вялікай групай мінчан удзельнічаў ва ўшанаванні У. Сыракомлі, які наведаў Менск, у доме Ю. Гарайна. Падставы для датавання: паводле ўспамінаў Гарайна, «назаўтра» быў такі ж вечар у Дуніна-Марцінкевіча.

*5 чэрвеня.* Падчас гасцявання ў Менску У. Сыракомля наведаў дом Дуніна-Марцінкевіча, уганараваў беларускага пісьменніка вершам «Тост у доме Марцінкевіча». Адказам Дуніна-Марцінкевіча на гэты верш быў, мабыць, вершаваны зварот да Сыракомлі *«Czy ty pojmujesz...»*.

*Каля 5 чэрвеня.* Дунін-Марцінкевіч звярнуўся да Сыракомлі з «Просьбай № 1», напісанай вершам і прозай, каб той наведаў пансіён Мантэграндзі. Подпіс — Навум Прыгаворка.

*23 чэрвеня.* Пасля вяртання з Менска У. Сыракомля напісаў рэцэнзію на «Вечарніцы» Дуніна-Марцінкевіча. Надрукавана 4 (16) ліпеня ў *«Gazecie Warszawskiej»*.

*9 ліпеня.* У карэспандэнцыі з Менска ў *«Dziennik Warszawski»* Паўла Малышэвіча (крыптанім П. М.) паведамлялася пра выхад «Гапона» і «Вечарніц», добразычліва ацэньвалася творчасць Дуніна-Марцінкевіча, прыводзіўся верш У. Сыракомлі «Тост у доме Марцінкевіча».

*25 ліпеня.* Прыпіска на пісьме С. Манюшкі Ю. Сікорскаму — падтрымлівае просьбу Манюшкі апекавацца менскімі кнігарамі Бейлінамі, «выдаўцамі маёй пісаніны».

*26 ліпеня.* У спісе выкладчыкаў Менскага пансіёна Мантэграндзі за 1854/55 навучальны год пазначаны: *«...учителя музыки: Павловский, Марцинкевич и Яновский...»*.

*14 жніўня.* У Люцінку прыбыў паліцэйскі прыстаў 2-га стана і прыступіў да апісання маёнтка за нядоімкі па пазыцы 1848 г. Пасля таго як арандатар маёнтка Каладзінскі заплаціў за ўладальнікаў 50 руб. нядоімак, прыстаў звярнуўся ў Прыказ грамадскай апекі з рапартам на дазвол спыніць апісанне.

*17 жніўня.* У. Сыракомля ў Барэйкаўшчыне напісаў рэцэнзію на кнігу Дуніна-Марцінкевіча «Гапон»: «Пан Марцінкевіч мае цудоўны дар вобразна маляваць народ — ручаюся напэўна, бо добра ведаю гэты шчыры народ беларускага племені».

*18 жніўня.* Прыказ грамадскай апекі адказаў прыставу, што апісанне маёнтка не можа быць спынена, бо за Марцінкевічамі засталіся яшчэ 31 руб. 27 кап. нядоімак па пазыцы.

*10 верасня.* У Менску напісана беларуская вершаваная аповесць «Купала» (на матэрыяле святкавання Купалля ў Лошыцы — маёнтку Прушынскага каля Менска). Увайшла ў кнігу «Цікавішся? — Прачытай!».

25 *лістапада.* У далёкім Канстанцінопалі, дзе фарміраваліся апальчэнцы на змаганне з расійскім войскам, пры загадкавых абставінах (вельмі хуткацечна) згасае Адам Міцкевіч. Цела вялікага Адама ляжала на знятых з завесаў дзвярах, як на катафалку. Паабапал грамнічныя свечы. І ляжаў той вялікі Літвін у чамарцы, з канфедэраткай на галаве, як ваяр. На Беларусі стала больш яшчэ на адзін кенатаф — сімвалічную, пустую магілу-курганок, паколькі на радзіму геній больш не вярнуўся: у студзені наступнага года быў пахаваны ў Парыжы. У 1890 г. прах перавезены ў Кракаў і змешчаны ў Вавелі.

## 1856

*16 лютага.* Напісаны публіцыстычны верш «Хіба я стары?» з праграмным credo: «Як раіць пясняр Сыракомля, пішу я цяпер, як заўсёды, на мове мужычай».

*Да 9 сакавіка.* Напісана польскамоўная аповесць «Багаславёная сям'я».

Напісана польскамоўная гістарычная паэма «Славяне ў XIX стагоддзі».

*9 сакавіка.* Цэнзурны дазвол П. Кукальніка на друкаванне кнігі «Цікавішся? — Прачытай!».

*Пасля 9 сакавіка.* У Менску выйшла кніга Дуніна-Марцінкевіча *«Ciekawyś? — Przeczytaj! Trzy powiastki i wierszyk ulotny».* Друк Ё. Дворца. Прысвечана бабруйскаму маршалку шляхты А. Лапу.

*19 (31) траўня.* У артыкуле польскага публіцыста Ф. Скібіцкага «Творы на простанародных гаворках», надрукаваным у *«Gazecie Warszawskiej»*, выказвалася сумненне ў карыснасці стварэння літаратуры на беларускай мове, як і на іншых літаратурна не распрацаваных мовах, што запозніліся ў сваім развіцці.

*26 жніўня.* Каранацыя цара Аляксандра II у Маскве. Мяркуючы па ўсім, Дунін-Марцінкевіч прысутнічаў на каранацыі, па свежых успамінах напісаў вершаваную аповесць «Халімон на каранацыі» з цыкла «Быліцы, расказы Навума».

*13 (25) кастрычніка.* Піша на беларускай мове «Верш Навума Прыгаворкі. На прыезд да места Менска Апалінарага Концкага, Уладзіслава Сыракомлі і Станіслава Манюшкі» (яны збіраліся прыехаць на так званыя кантракты). Дата пад вершам — 25 кастрычніка — відавочна, новага стылю.

Зачытвае верш падчас прыняцця ў сваім доме А. Концкага і С. Манюшкі (У. Сыракомля ў Менск не прыехаў).

Прымае запрашэнне Юлія і Артура Рашкоўскіх, якія завіталі ў Менск на кантракты з Магілёўшчыны, прыехаць на свята дажынак у Шчаўры, маёнтак Юлія.

Пасля гасцявання ў менскім доме Дуніна-Марцінкевіча А. Плуг падтрымаў асветніцкую працу Беларускага Дудара вершам «Да В. Марцінкевіча, аўтара твораў на беларускай гаворцы».

*18 (30) кастрычніка.* Ю. Гарайн піша пра Дуніна-Марцінкевіча ў карэспандэнцыі з Менска ў газету *«Kronika wiadomości krajowych i zagranicznych»*. Надрукавана 2 (14) лістапада.

*19 кастрычніка.* Дунін-Марцінкевіч удзельнічае ў свяце дажынак у Шчаўрах (цяпер Крупскі р-н). Яго прымаюць там як беларускага пісьменніка. Назаўтра гасціваў у суседнім Хацюхове, дзе ўмацоўвае сяброўства з «Алесяй» — Марыляй Паўлаўнай Грушэўскай, будучай жонкай.

*11 лістапада.* У пецярбургскім часопісе «Сын отечества» надрукаваны артыкул «Беларуская літаратура», прысвечаны разгляду творчасці Дуніна-Марцінкевіча. Тон артыкула цалкам добразычлівы. Аўтар не ўказаны (магчыма, сам рэдактар часопіса А. В. Старчэўскі, кансультаваць мог П. Шпілеўскі).

*21 лістапада.* Пісьмо А. Завадскаму з просьбай прыслаць рэшту тыражу «Ідыліі».

*28 лістапада.* А. Плуг згадаў Дуніна-Марцінкевіча ў карэспандэнцыі, апублікаванай у *«Gazecie Codziennej»*.

*4 снежня.* Пісьмо А. Завадскаму — спрачаецца з нагоды грашовых разлікаў па продажы «Ідыліі».

*10 снежня.* У Менску напісаны «Літаратарскія клопаты» з прысвячэннем У. Сыракомлю.

*Каля 10 снежня.* Напісаны «Шчароўскія дажынкі: Аповесць у 2-х абразках».

*17 снежня.* У. Сыракомля ў артыкуле *«Hebdomadalia»*, напісаным у Барэйкаўшчыне, абараняе права беларускага народа на ўласную літаратуру і аналізуе новую беларускамоўную аповесць Дуніна-Марцінкевіча «Купала».

*У гэтым годзе.* У зборніку *«Gawęd, rymów ulotnych i przekładów Władysława Syrokomli poczet czwarty»* (Вільня) надрукаваны верш «Тост у доме Марцінкевіча» (гл. вышэй 05.06.1855).

## 1857

*6 (18) студзеня.* У *«Gazecie Warszawskiej»* друкуецца артыкул У. Сыракомлі *«Hebdomadalia»* пра творчасць Дуніна-Марцінкевіча.

*Перад 31 студзеня.* Напісаны верш «Да пачцівых беларусаў!» — паэтычны ўступ да кнігі «Беларускі Дудар, або Усяго патроху».

*31 студзеня.* Цэнзар Кукальнік ухваліў 4-ы паэтычны зборнік Дуніна-Марцінкевіча «Беларускі Дудар, або Усяго патроху».

*Пасля 31 студзеня.* У Менску выйшла кніга Дуніна-Марцінкевіча *«Dudarz białoruski, czyli Wszystkiego potrosze»*. Выданне і друк Ё. Дворца. Прысвечана «высакародным беларусам».

*Да 22 лютага.* У Пецярбургу асобнай кнігай апублікаваны сцэнічны твор П. Шпілеўскага «Дажынкі» — пераробка «Ідыліі» Дуніна-Марцінкевіча. Спасылка на першакрыніцу адсутнічала. (Дожинки: Белорусский народный обычай: Сценическое представление в двух действиях, с хорами, песнями, хороводами и плясками белорусскими. Соч. П. М. Шпилевского. СПб., 1857.) Дата ўдакладнена паводле дарчага подпісу аўтара на экземпляры кнігі ў бібліятэцы Вільнюскага універсітэта.

*3 траўня.* Дунін-Марцінкевіч скончыў працу над аповесцю «Травіца брат-сястрыца».

*13 траўня.* У Люцінцы закончана праца над гістарычным апавяданнем у 4-х абразках «Люцынка, альбо Шведы на Літве».

*20 жніўня.* Дунін-Марцінкевіч скончыў працу над нізкай вершаваных аповесцей «Быліцы, расказы Навума» («Злая жонка» і «Халімон на каранацыі»). Твор прысвячаецца магілёўскаму прыяцелю, грамадскаму дзеячу Т. Чудоўскаму.

*Пасля 20 жніўня (да 23 чэрвеня 1858 г.).* Т. Чудоўскі зрабіў на рукапісе «Быліц, расказаў Навума» надпіс пра згоду на прысвячэнне яму твора.

*2 верасня.* Арандатар Каладзінскі плаціў у Менску за Люцінку чарговую рату пазык 50 руб. 2 кап.

*9 верасня.* У Менску дае паказанні пра шляхцянку Вароніч, памылкова ўнесеную ў «рэвізскую сказку» Люцінкі (параўн.: 14.01.1853).

*26 кастрычніка.* Цэнзар П. Кукальнік даў дазвол на друкаванне аповесці «Травіца брат-сястрыца».

*У гэтым годзе.* У зб. Ю. Гарайна «Страчаныя хвіліны» (Вільня) перадрукоўваецца артыкул «Фізіялогія прыказак» са згадкамі пра Дуніна-Марцінкевіча і яго «Ідылію».

*Ці не ў гэтым годзе (?).* Бярэ шлюб з другой жонкаю — Марыляй Грушэўскай.

## 1858

*7 лютага.* «Минские губернские ведомости» назвалі «памешчыка Марцінкевіча» сярод асоб, што выехалі з Менска ў Вільню за перыяд з 31 студзеня да 7 лютага.

*23 траўня.* Складзена «рэвізская сказка» «имения Люцинки, помещиков Викентия Иванова и Юзефы Марцинкевичей, о состоящих мужеского и женского пола дворовых людях и крестьянах». 17 чэрвеня дакумент пададзены ў казённую палату пры адпаведным «объявлении» ўладальнікаў.

*28 траўня.* Віленскі цэнзурны камітэт ухваліў першы сшытак перакладу «Пана Тадэвуша», пададзены Дуніным-Марцінкевічам.

*23 чэрвеня.* Рукапіс «Быліц, расказаў Навума» пададзены Дуніным-Марцінкевічам цэнзару П. Кукальніку.

*30 чэрвеня.* Цэнзарскі дазвол на друкаванне «Быліц, расказаў Навума» за выключэннем ці не самай важнай і арыгінальнай аповесці «Халімон на каранацыі», адносна якой цэнзарам зроблены надпіс: *«Эта вся статья не может быть пропущена, а потому ее должно исключить. П. Кукольник».*

*8 (20) ліпеня.* У карэспандэнцыі з Менска ў газету *«Kronika wiadomości krajowych i zagranicznych»* (№ 203) нехта М. К. паведаміў пра працу Дуніна-Марцінкевіча над перакладам «Пана Тадэвуша»: «Некалькі песень падрыхтавана ўжо да друку, а рэшта завяршаецца».

*Да 30 кастрычніка.* У небе над Менскам стаяла камета. Дунін-Марцінкевіч згадаў гэтую прыродную з'яву ў «талкаваннях» да

2-й быліцы перакладу «Пана Тадэвуша»: «Камета — звязда, што часам паказываецца на небе; вось як бачылі мы і ў цяперашнім 1858 гаду, што бадзялася доўга па небе з вялікім хвастом».

*30 кастрычніка.* Эпіграфам з «Ідыліі» пачыналіся «Заходнерускія нарысы» П. Шпілеўскага ( Иллюстрация, 1858, № 43).

Віленскі цэнзурны камітэт ухваліў другі сшытак перакладу «Пана Тадэвуша», пададзены Дуніным-Марцінкевічам.

*Кастрычнік (?).* А. Плуг расказаў пра Дуніна-Марцінкевіча і яго творчасць, сустрэчы інтэлігенцыі ў менскім доме песняра ў нарысе «Некалькі ўражанняў з падарожжа па Літве», напісаным у форме пісьма да Ф. Пяткевіча. Услед за У. Сыракомлем А. Плуг прызнаваў за беларускай мовай права на самастойнае літаратурнае развіццё, адпрэчваў скептычную пазіцыю Скібіцкага.

*2 лістапада.* Каміла Марцінкевіч упісвае ў альбом А. Вярыгі-Дарэўскага, які наведаў Менск, вяртаючыся з Вільні ў Віцебск, фрагменты музычнага твора.

*3 лістапада.* Дунін-Марцінкевіч упісаў у альбом А. Вярыгі-Дарэўскага «Некалькі ўрыўкаў з перакладу «Пана Тадэвуша» Міцкевіча на беларускую гаворку» (тры шасцірадкоўі патрыятычнага гучання).

*У гэтым годзе.* У спісе выкладчыкаў Менскага пансіёна Мантэграндзі за 1858 г. пазначаны: *«Учителя музыки: Павловский, Яновский, Марцинкевич и девицы: Марцинкевич и Сикорская».*

Паэт і публіцыст Э. Жалігоўскі (А. Сава) прыхільна згадаў Дуніна-Марцінкевіча і яго творчасць у кнізе «Сёння і ўчора» (Sowa A. Dziś i wczoraj: Rysy biograficzno-obyczajowe i bajki... Pbg., 1858).

У паэтычным зборніку А. Плуга «Хатнія памяткі» надрукаваны яго верш «Да В. Марцінкевіча, аўтара твораў на беларускай гаворцы» (Pług A. Pamiątki domowe. Warszawa, 1858).

## 1858—1863 (1860—1862?)

Дунін-Марцінкевіч не адзін раз выязджаў па гадавых пашпартах у Ковенскую губерню (у прыватнасці, у маёнтак Нарова Ковенскага павета) па справах памешчыц графіні Грабоўскай, Буйвід і іх сваякоў Пржаленцкіх, а таксама віцебскага памешчыка Слаўты. Па гэтых справах яму даводзілася бываць таксама ў Вільні, Вілейцы, Дзісенскім павеце і Пецярбургу.

## 1859

*7 студзеня.* Віленскі цэнзурны камітэт ухваліў трэці сшытак перакладу «Пана Тадэвуша», пададзены Дуніным-Марцінкевічам.

*17 лютага.* М. Акялайціс у пісьме да Ю. І. Крашэўскага абгаворваў план выдання народных бібліятэчак для Літвы, Беларусі і іншых частак былой Рэчы Паспалітай: «Каратынскі і Дунін-Марцінкевіч узяліся б за справу з боку Русі, а я пісаў бы для Літвы...»

*26 красавіка.* Распіска Дуніна-Марцінкевіча пра атрыманне з Прыказа грамадскай апекі новага разліку па пазыцы 1848 г. у сувязі з пераразмеркаваннем яе выплаты з 26-гадовага на 28-гадовы тэрмін.

*8 чэрвеня.* У Віленскім цэнзурным камітэце атрымана пастанова Галоўнага ўпраўлення цэнзуры пра забарону друкаваць маларасійскія творы польскімі літарамі. Гэты дакумент адыграў фатальную ролю ў лёсе марцінкевічаўскага перакладу «Пана Тадэвуша».

*Да 22 жніўня.* Друкар Сыркін надрукаваў два першыя сшыткі перакладу «Пана Тадэвуша» і прадставіў гатовую кнігу ў Віленскі цэнзурны камітэт для атрымання білета на выпуск у свет.

*22 жніўня.* Віленскі цэнзурны камітэт звярнуўся да міністра народнай асветы з запытам, ці пашыраецца забарона друкаваць маларасійскія творы польскімі літарамі таксама на беларускую гаворку.

*9 верасня.* Устрывожаны цэнзурнымі ўскладненнямі, Дунін-Марцінкевіч накіраваў у Галоўнае ўпраўленне цэнзуры разгорнутае «Объяснение» з просьбай дазволіць выпусціць у свет ужо надрукаваны пераклад «Пана Тадэвуша» або вярнуць выдаткі ў памеры 724 руб.

*26 верасня.* Галоўнае ўпраўленне цэнзуры пастанавіла не дапускаць ужывання польскага алфавіта пры друкаванні твораў на беларускай гаворцы, пераклад «Пана Тадэвуша» ў свет не выпускаць, паабяцаўшы разгледзець у сувязі з гэтым пытанне пра кампенсацыю стратаў выдаўца.

*22 кастрычніка.* Міністр народнай асветы Я. П. Кавалеўскі паведаміў пра пастанову Галоўнага цэнзурнага камітэта папячыцелю Віленскай навучальнай акругі.

*7 лістапада.* Распараджэнне Віленскага цэнзурнага камітэта на імя друкара Сыркіна «немедленно» здаць у Камітэт усе надрукаваныя паасобнікі перакладу «Пана Тадэвуша» і прадставіць рахунак выдаткаў па іх надрукаванні.

*9 лістапада.* «Объявление» Сыркіна ў Віленскі цэнзурны камітэт з прадстаўленнем 1000 паасобнікаў перакладу і рахунка на 176 руб. 60 кап., затрачаных на друкаванне (апрача таго, паводле Сыркіна, 600 руб. пайшло на выраб шрыфту і набыццё паперы для астатніх частак перакладу).

*27 лістапада.* Пісьмо Віленскага цэнзурнага камітэта міністру асветы з разгорнутым тлумачэннем прычын, чаму быў дадзены дазвол на друкаванне перакладу «Пана Тадэвуша». У якасці ўзораў ранейшых цэнзурных дазволаў такога кшталту прыкладзены зборнік Чачота «Сялянскія песенькі...» 1846 г. і кнігі Дуніна-Марцінкевіча «Ідылія», «Гапон», «Цікавішся? — Прачытай!», «Беларускі Дудар...».

*У гэтым годзе.* У кнізе А. Плуга «Голас з Літвы», якая выйшла ў Менску за кошт братоў Бейлінаў, «кнігароў менскіх», надрукаваны верш «Да В. Марцінкевіча, аўтара твораў на беларускай гаворцы» і пераклад на польскую мову верша Дуніна-Марцінкевіча «Да Апал. Концкага, Манюшкі і Германа».

## 1860

*4 студзеня.* «Ідылія» Дуніна-Марцінкевіча пад назвай «Розная мілосць бывае» перапісана для Я. Сабалеўскай. Рукапіс у фондах Беларускай бібліятэкі і музея імя Ф. Скарыны ў Лондане. Датуецца паводле вершаванага звароту В. Мержаеўскага да Я. Сабалеўскай у канцы рукапісу.

*14 студзеня.* Прашэнне Дуніна-Марцінкевіча на імя міністра асветы Я. П. Кавалеўскага аплаціць выдаткі па надрукаванні перакладу «Пана Тадэвуша» ў памеры 724 руб.

*15 лютага.* Галоўнае цэнзурнае ўпраўленне пастанавіла аплаціць страты выдаўцоў перакладу «Пана Тадэвуша» ў мінімальным памеры 176 руб. 60 кап. 24 лютага міністр Я. П. Кавалеўскі паведаміў пра гэта Віленскаму цэнзурнаму камітэту для аб'яўлення «гг. Марцинкевичу и Сыркину, из коих первый живет в г. Минске, а второй в г. Вильне».

*5 сакавіка.* Адносіна Віленскага цэнзурнага камітэта Дуніну-Марцінкевічу з паведамленнем, што міністэрства дазволіла вярнуць страты па выданні «Пана Тадэвуша» ў памеры 176 руб. 60 кап.

*4 красавіка.* Сумесная заява Дуніна-Марцінкевіча і Сыркіна пра размеркаванне паміж імі прызначаных на кампенсацыю грошай: першаму — 76 руб., другому — 100 руб. 60 кап.

*11 красавіка.* Галоўнае ўпраўленне цэнзуры вяртае Віленскаму цэнзурнаму камітэту кнігі Дуніна-Марцінкевіча і Чачота, дасланыя ў якасці прыкладаў ранейшых цэнзурных дазволаў.

*26 ліпеня.* Цэнзурны дазвол П. Кукальніка на друкаванне кнігі «Люцынка, або Шведы на Літве».

*17 жніўня.* У маёнтку Скрундзеўшчына, непадалёк ад Люцінкі, Дунін-Марцінкевіч разам з гаспадарамі Шышкамі і іншымі сябрамі

дома (Плявака, Комары) удзельнічае ў прыняцці біскупа Міхала Галубовіча, які па запрашэнні палкоўніка А. Шышкі прыехаў пагасцяваць з Менска. Паводле ўспамінаў Галубовіча, пісьменнік спяваў урыўкі з *«Żydka pieczętowanego»* (магчыма, мелася на ўвазе аперэта «Рэкруцкі жыдоўскі набор»).

*9 снежня.* У газеце *«Kurjer Wileński»* (№ 97), у бібліяграфічных звестках пра новыя кнігі за лістапад 1860 г., пад № 6 адзначана кніга Дуніна-Марцінкевіча «Люцынка, альбо Шведы на Літве». Канчаткова выйшла ў свет кніга, відаць, у пачатку 1861 г., бо на тытульным лісце пазначана 1861 г.

## 1861

*Пачатак года.* У Вільні выйшла кніга Дуніна-Марцінкевіча *«Lucynka, czyli Szwedzi na Litwie. Opowiadania historyczne w 4-ch obrazkach»*. Выданне і друк А. Сыркіна. Кніга прысвечана магілёўскаму губернскаму маршалку шляхты князю С. Любамірскаму.

*Канец студзеня.* Прыязджаў у Варшаву нібыта для пераканання сына Міраслава, які вучыўся там у музычным інстытуце, не ўдзельнічаць у палітычных беспарадках.

*19 лютага.* Аляксандр II падпісаў Маніфест пра скасаванне прыгону.

*7 і 10 сакавіка.* У газеце *«Kurjer Wileński»* друкуецца аглядны артыкул У. Сыракомлі «Працы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча».

*18 сакавіка.* Дачка Цэзарына атрымала атэстат пра заканчэнне поўнага курса навук у прыватным пансіёне шляхетных паненак Мантэграндзі.

*27 сакавіка (8 красавіка).* Расстрэл у Варшаве бяззбройнай дэманстрацыі. Забіта да 200 чалавек.

*28 сакавіка (9 красавіка).* У. Сыракомля атрымаў у Коўна пашпарт і выехаў у Варшаву. Відаць, існавала дамоўленасць паміж ім і Дуніным-Марцінкевічам пра сумесную паездку. Меркавалася, што Дунін-Марцінкевіч дагоніць яго па дарозе.

*Канец сакавіка — пачатак красавіка.* Дунін-Марцінкевіч прыехаў у Вільню і спыніўся ў доме Монтвілы. У газеце *«Kurjer Wileński»* (№ 27) за 4 красавіка пісьменнік называецца сярод асоб, што прыбылі ў Вільню ў перыяд з 31 сакавіка да 3 красавіка. (У кнізе У. Мархеля «Крыніцы памяці» [Мн., 1990. С. 98] са спасылкай на той жа нумар газеты перыяд прыбыцця акрэсліваецца інакш — з 9-га да 15 красавіка).

*3 (15) красавіка.* У Вільні акцёр Б. Навінскі перадаў Дуніну-Марцінкевічу, які ўслед за У. Сыракомлем ехаў у Варшаву, ліст для Вясковага Лірніка. Паводле слоў Навінскага, Дунін-Марцінкевіч вельмі спяшаўся.

*Да 14 (26) красавіка.* Дунін-Марцінкевіч і Сыракомля прыбылі ў Варшаву. Пад уражаннем аповедаў пра расстрэл дэманстрацыі Дунін-Марцінкевіч піша паэму «Плынуць вятры...», дзе вельмі дакладна ўзнавіў карціну расстрэлу.

*20 красавіка.* Пад псеўданімам «Навум Прыгаворка» апублікаваў адкрыты ліст у рэдакцыю *«Gazety Polskiej»*, у якім тлумачыў асветніцкія мэты сваёй творчасці. Ліст Навума Прыгаворкі поўніцца заклікам: *«Сляпыя! Працягніце руку селяніну!»*

*27 красавіка.* Літоўскі грамадскі дзеяч і пісьменнік М. Акялайціс, будучы ў Варшаве, напісаў рэцэнзію на забаронены царскай цэнзурай пераклад «Пана Тадэвуша». Хутчэй за ўсё рэцэнзія прызначалася для *«Gazety Polskiej»*, якую рэдагаваў Ю. І. Крашэўскі. У друк з невядомых прычын не трапіла, захавалася ў архіве Крашэўскага.

*Красавік. «Gazeta Polska»* (№ 115) паведаміла пра выданне і паступленне ў продаж музычнай кампазіцыі Камілы Марцінкевіч «У летуценні мінулага», прысвечанай графіні Марыі Тышкевіч.

*Травень.* Прыязджаў у Варшаву для сустрэчы і суправаджэння сваёй даверніцы — графіні Грабоўскай, якая вярталася з-за мяжы.

*6 чэрвеня. «Kurjer Wileński»* (№ 44) называе Дуніна-Марцінкевіча ў ліку асоб, што прыбылі ў Вільню 1—5 чэрвеня. Спыніўся ў доме Красоўскага. Выезд занатаваны ў № 46 за 16 чэрвеня.

22 *чэрвеня.* Менскі губернскі жандарскі штабс-афіцэр палкоўнік Рэйхарт накіраваў у III Аддзяленне спіс асоб, якія бралі ўдзел у спяванні патрыятычнага гімна. Першым стаяла імя Камілы: «1. Дзяўчына Марцінкевіч, дачка былога настаўніка [так у дакуменце], яна займаецца выкладаннем урокаў музыкі і першая пачала спяваць гімн [...] у катэдральным касцёле».

*Пасля 22 чэрвеня.* Па распараджэнні губернатара Келера Каміла змяшчаецца ў бальніцу для вар'ятаў. Паколькі гэта выклікала дэманстрацыйныя хваляванні мінчан, Каміла з бальніцы вызваляецца.

*10 жніўня.* Тайны агент III Аддзялення Ю. Бярнацкі паведаміў сваім шэфам у Пецярбург пасля паездкі па Менскай губерні, што антыўрадавая «Адозва сына айчыны да братоў літвінаў», атрыманая ў красавіку віленскім губернскім маршалкам шляхты А. Дамейкам з Баброруйска, напісана Дуніным-Марцінкевічам. «За ним бы следовало хорошенько присмотреть, потому что это опасное лицо, он имеет... чрезвычайное влияние на крестьян...» Ім жа, гаварылася ў данясенні, напісана

бунтоўная «Гутарка старога дзеда» і перакладзены на беларускую мову патрыятычны гімн «Божа, што Польшчу...».

*Кастрычнік.* Уладамі ў Менску атрымана звестка, што пасля вяртання з Варшавы Дунін-Марцінкевіч праз яўрэя Ш. Лейнара, суседа па Люцінцы, пераслаў сваёй сям'і з Вільні пакет з падазронымі рэчамі. Пры вобыску ў Люцінцы нічога падазронага не было знойдзена, «кроме одного печатного и двух литографированных революционных гимнов».

*Перад 26 снежня.* Прадставіўшы даверанасці графіні С. Грабоўскай і памешчыка У. Слаўты па іх цывільных справах, Дунін-Марцінкевіч звярнуўся да часовага ваеннага губернатара Менскай губерні генерала Кушалева з просьбай выдаць гадавы пашпарт для паездкі ў Ковенскую губерню і гарады Віцебск і Вілейку.

*26 снежня.* Выдаўшы пісьменніку пашпарт, генерал Кушалеў «з перасцярогі» паведаміў пра гэта віленскаму генерал-губернатару і віцебскаму губернатару.

Выходзіць паэма «Люцынка, або Шведы ў Літве»; апошняя друкаваная кніга Дуніна-Марцінкевіча.

## 1862

*Пачатак года.* Звесткі пра Дуніна-Марцінкевіча з данясення Ю. Бярнацкага ўнесены ў справаздачу III Аддзялення за 1861 г. Пры чытанні справаздачы цар Аляксандр II насупраць гэтага месца зрабіў паметку: *«Впоследствии донести».*

*3 студзеня.* Цыркуляр віцебскага губернатара паліцмайстру г. Віцебска і павятовым спраўнікам пра сакрэтны нагляд за Дуніным-Марцінкевічам у выпадку яго з'яўлення.

*12 студзеня.* Менскі віцэ-губернатар Лучынскі паведаміў генерал-губернатару Назімаву, што выдаў пашпарт Каміле для праезду ў Вільню і Віленскую губерню, дзе яна збіраецца выкладаць музыку.

*20 студзеня.* Назімаў распарадзіўся выслаць Дуніна-Марцінкевіча і Камілу назад у Менск. Паведамляюцца звесткі пра пісьменніка, атрыманыя з III Аддзялення (паводле даносу Бярнацкага).

*17 лютага.* Менскі губернскі жандарскі штабс-афіцэр палкоўнік Рэйхарт паведаміў у Пецярбург пра ўдзел у вызваленчым руху Камілы Марцінкевіч, пра тое, што яна апякуецца ссыльнымі, якіх вязуць праз Менск з Варшавы, і дадаў: *«...характера [яна] дерзкого и решительного, а идеи наследовала от отца. Этот мелкопоместный помещик Минского уезда пишет и распространяет патриотические сочинения...».*

*1 сакавіка.* У пісьме да Рэйхарта ўпраўляючы III Аддзяленнем Патапаў распарадзіўся: «Звесткі пра дзяўчыну Марцінкевіч і пра бацьку яе прапануюць вам... перадаць світы яго вялікасці генерал-маёру Кушалеву з тым, ці не знойдзе ён неабходным прыняць якія-небудзь меры супраць дзеянняў гэтых асоб».

*5 сакавіка.* Генерал Кушалеў паведаміў віцебскаму губернатару, што, па атрыманых звестках, Дунін-Марцінкевіч напісаў на беларускай гаворцы «Гутарку старога дзеда» і пераклаў гімн *«Boże coś Polskę».*

*Да 9 сакавіка.* Будучы высланым паліцыяй з Коўна, Дунін-Марцінкевіч накіраваў скаргу на дзеянні ковенскіх улад міністру ўнутраных спраў.

*9 сакавіка.* Скарга Дуніна-Марцінкевіча ў МУС перасылаецца генерал-губернатару Назімаву.

*23 сакавіка.* Пісьмо А. Кіркору — просіць перадаць Загорскаму, каб прыехаў на святы ў Люцінку, а таксама напісаць спачувальна пра народныя школкі ў Менску і Люцінцы, якія вядуцца яго дочкамі, і даведацца, ці не было запытання ад міністра ў сувязі з яго скаргай на ковенскую паліцыю.

*30 сакавіка.* У сваім адказе ў МУС на скаргу Дуніна-Марцінкевіча генерал-губернатар Назімаў падрабязна апісаў «шкодную дзейнасць» пісьменніка. «Хадайніцтва Марцінкевіча пра адмену гэтага распараджэння не падлягае з майго боку задавальненню».

*22 лістапада.* Менскі губернатар Кажэўнікаў паведаміў генерал-губернатару Назімаву пра беспарадкі ў Менску на дваранскіх выбарах і ў «Списке неблагонадежных лиц, присутствие коих внутри губернии вредно», назваў Дуніна-Марцінкевіча і яго дачку Камілу.

## 1863

*Пачатак года.* Фатаграфуецца ў атэлье менскага фатографа Прушынскага. Зроблены партрэтны здымак у паўстанцкай чамарцы і групавая фатаграфія — 19 асоб (Дунін-Марцінкевіч, дачка Каміла, Ф. Чапялінскі і інш.), многія з якіх удзельнічалі ў паўстанні і вызваленчым руху.

*3 лютага.* Арышт Камілы.

*7 лютага.* Губернатар Кажэўнікаў паведаміў генерал-губернатару Назімаву пра арышт Камілы Марцінкевіч, якая навучанне ў народнай школцы ў мястэчку Гарадок, паблізу Менска, спалучала з рэвалюцыйнай агітацыяй сярод сялян і салдат. Прапануецца выслаць яе з краю *«вместе с ее отцом, который ко всем порокам, свойс-*

*твеным его дочери, владеет довольно бойким пером и иезуитским настроением...».*

*Пасля 7 лютага.* Тэлеграма ў Менск губернатару: *«Арестовать отца Марцинкевичевой впредь до особого распоряжения. Ген.-адъютант Назимов».*

*22 лютага.* Данясенне губернатара Кажэўнікава Назімаву: «У выніку зробленых пошукаў аказалася, што памешчык Менскага павета Марцінкевіч выбыў для хадайніцтваў па даручэннях у Віцебскую губерню, і таму я паведаміў начальніку Віцебскай губерні пра адшуканне і ўтрымліванне Марцінкевіча пад строгім арыштам...»

*8 сакавіка.* Прашэнне генерал-губернатару Марылі Марцінкевіч: ні ў чым не вінаватая дачка «ўжо шосты тыдзень пакутуе пад ключом у пакоі, які сырасцю наносіць шкоду яе здароўю...».

*Канец сакавіка — пачатак красавіка.* Паводле сялянскіх паказанняў, у Люцінцы адбыўся вялікі сход, прысутнічалі фельчар Трасцянка, дваране Андрэй і Яфім Цымерманы, ксёндз Камянецкі, якія з Люцінкі паехалі ў лес да мяцежнікаў. Іх праводзілі жонка Марыя і дачка Цэзарына.

*Пачатак красавіка.* Дунін-Марцінкевіч употай пакідае Люцінку і пад выглядам арандатара пасяляецца на Мядзельшчыне, у маёнтку Дабраўляны памешчыцы Мацільды Бучынскай, вядомай філантропкі.

*29—30 красавіка.* На Магілёўшчыне ў ходзе падаўлення паўстання салдатамі і сялянамі забіты прыяцель Дуніна-Марцінкевіча Т. Чудоўскі, якому пісьменнік прысвяціў свае «Быліцы, расказы Навума».

*Да 15 ліпеня.* Дуніна-Марцінкевіча шукаюць у Люцінцы. Сваякі сказалі, што ён у красавіку выехаў у Вілейку.

*15 ліпеня.* Адпаведны запыт губернатара Кажэўнікава ваеннаму начальніку Вілейскага павета не даў вынікаў.

*30 ліпеня.* Прашэнне (паводле тону — патрабаванне) Камілы з турмы генерал-губернатару хутчэй скончыць яе справу.

*5 жніўня.* З акна турэмнай камеры Каміла Марцінкевіч кінула кветкі асуджанаму паўстанцу Я. Жмачынскаму, калі яго вялі на пакаранне смерцю.

*17 жніўня.* Прашэнне Камілы перасылаецца ў Вільню, генерал Мураўёў зрабіў рэзалюцыю: «Спытаць пра бацьку, а Марцінкевіч — у Перм».

*24 жніўня.* Генерал-губернатар Мураўёў прапанаваў менскаму губернатару *«выслать Камилу Марцинкевич как женщину вредную и совершенно неблагонадежную в политическом отношении на жительство под строгий надзор в Пермскую губернию».* Адначасова рабіўся запыт пра вынікі пошукаў яе бацькі.

*28 жніўня.* Пад канвоем двух жандараў Каміла накіравана з Мінска ў Вільню для далейшай адпраўкі да месца высылкі. Адначасова губернатар Кажэўнікаў паведаміў Мураўёву пра беспаспяховыя пакуль што пошукі яе бацькі-пісьменніка.

## 1864

*21 студзеня.* Сакрэтная адносіна менскага губернатара Кажэўнікава начальніку Гродзенскай губерні Скварцову: *«сделать распоряжение в случае появления Марцинкевича пробирающимся со Жмуди в Минскую губерню немедленно арестовать его...».* Прыкладзены прыкметы. 29 студзеня Скварцовым разасланы адпаведны цыркуляр па губерні.

*22 студзеня (па іншых звестках — у сакавіку)* Пасля секвестру Дабраўлянаў царскімі ўладамі Дунін-Марцінкевіч перабраўся на жыццё ў суседняе мястэчка Свір.

*19 траўня.* Менскае павятовае казначэйства даставіла ў Прыказ грамадскай апекі ва ўплату пазыкі 1848 г. 50 руб. сялянскіх аброчных грошай па маёнтку Люцінка.

*22 чэрвеня.* Вайсковы начальнік 4-га ўчастка Свянцянскага павета паручнік Харламаў выдаў Дуніну-Марцінкевічу пасведчанне, што, жывучы ў Дабраўлянах і Свіры, паводзіў сябе «тихо» і ў «мятеже» не ўдзельнічаў.

*Канец кастрычніка.* Дунін-Марцінкевіч арыштаваны ў мястэчку Свір і пад канвоем дастаўлены ў Менск. Там ён зняволены ў астрозе, пачынаецца следства.

*З канца кастрычніка (да 13 ліпеня 1865 г.).* Следства па справе Дуніна-Марцінкевіча: паказанні пісьменніка, адстаўнога унтэр-афіцэра Ф. Іванова (суседа па Люцінцы), старасты С. Клімовіча і іншых люцінкаўскіх сялян, служанкі М. Сяняўскай, Марыі, Цэзарыны і Міраслава Марцінкевічаў, сялян у Дабраўлянах, Свіры і Нарове Ковенскага павета, дзе бываў Дунін-Марцінкевіч, фельчара У. Трасцянкі, дваран Васіля і Антона Доўнараў, Уладзіслава Слаўты, памешчыка М. Пржаленцкага, вочныя стаўкі, запыты ў Варшаву і інш.

*8 снежня.* На Люцінку, маёнтак Дуніна-Марцінкевіча, накладзены секвестр.

*18 снежня.* Віленская следчая камісія прадставіла Мураўёву справу пра ўдзел у «беспарадках» жонкі пісьменніка Марылі Марцінкевіч.

*У гэтым годзе.* Звесткі пра Дуніна-Марцінкевіча як беларускага пісьменніка, у выглядзе асобнага кароткага артыкула без подпісу, змешчаны ў польскай Энцыклапедыі С. Аргельбранда.

## 1865

*13 ліпеня.* У Менску закончана следства па справе Дуніна-Марцінкевіча.

*24 ліпеня.* Менскі губернатар генерал Шалгуноў прадставіў віленскаму генерал-губернатару справу Дуніна-Марцінкевіча і прапанаваў пакінуць яго ў краі з устанаўленнем паліцэйскага нагляду і спагнаннем з маёнтка ўзмоцненага 10-працэнтнага збору.

*7 кастрычніка.* Справа Дуніна-Марцінкевіча паступіла на разгляд Часовага палявога аўдытарыята пры штабе войскаў Віленскай ваеннай акругі. На справе зроблена паметка-рэзалюцыя: *«Рассмотреть немедленно».*

*Перад 4 снежня.* Памочнік палявога обер-аўдытара А. Няелаў склаў падрабязную выпіску па справе Дуніна-Марцінкевіча.

*4 снежня.* Заключэнне палявога аўдытарыята па справе Дуніна-Марцінкевіча: спагнаць з маёнтка ўзмоцнены 30-працэнтны збор і аддаць пісьменніка пад строгі нагляд паліцыі. Заключэнне падпісалі генерал Фамін, палкоўнікі барон Тызенгаўзен і Леантовіч, в. а. палявога обер-аўдытара П. Няелаў, змацаваў памочнік апошняга А. Няелаў. У той жа дзень на дакуменце з'явілася канфірмацыя памочніка камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі генерала Манюкіна: «Согласен».

*6 снежня.* Часовы палявы аўдытарыят паведаміў менскаму губернатару рашэнне па справе Дуніна-Марцінкевіча.

*19 снежня.* Над вызваленым з турмы Дуніным-Марцінкевічам устанаўліваецца строгі «галосны» паліцэйскі нагляд.

*У гэтым годзе.* Дачка Каміла пабралася ў Салікамску з павятовым лекарам Казімірам Асіповічам.

## 1866

*27 траўня.* У Салікамску нарадзіўся ўнук Юзаф.

*31 траўня.* Зняцце секвестра з маёнтка Люцінка.

*25 чэрвеня.* «Минские губернские ведомости» адзначылі прыезд у Менск Дуніна-Марцінкевіча.

*19 ліпеня.* Пасля зацвярджэння выкупнога акта па маёнтку Люцінка Прыказ грамадскай апекі залічыў сялянскія выкупныя грошы ў кошт пагашэння пазыкі 1848 г. і дазволіў выплату астатняй сумы ў колькасці 174 руб. 42 ¾ кап. растэрмінаваць на 37 гадоў.

*27 лістапада.* Прыехаў у Менск з Люцінкі.

*У гэтым годзе.* Напісаў на пінскай гаворцы камедыю «Пінская шляхта».

## 1867

*6 лютага.* Выслаў у рэдакцыю «Виленского вестника» пачатак «Быліц, расказаў Навума», перапісаны кірыліцай, і выказаў гатоўнасць і далей пасылаць свае творы.

*16 лютага.* У «Виленском вестнике» пад рубрыкай «Адказы рэдакцыі» змешчаны адказ на прапанову В. Дуніна-Марцінкевіча: «У Менск. В. І. М-чу. Верш ваш не будзе надрукаваны, а прапанова не можа быць прынята. Рэдакцыя з прыемнасцю дасць месца ў сваёй газеце помнікам беларускай народнай творчасці ці творам накшталт Кальцова, калі б такія былі магчымыя; але яна лічыць больш чым бескарыснымі спробы стварэння беларускай штучнай літаратуры».

*15 сакавіка.* У сувязі з секвестрам Люцінкі (гл. 08.12.1864) губернскае кіраванне дзяржаўных маёмасцей звярнулася ў дэпутацкую дваранскую зборню з просьбай прыслаць звесткі пра Дуніна-Марцінкевіча і яго дачок. Рэзалюцыя: *«Сообщить, что Викентий Марцинкевич утвержден в дворянстве, а дочери не сопричислены».*

*16 верасня.* Сусед Марцінкевічаў па Люцінцы, калежскі асэсар Рамуальд Жаброўскі ўнёс у касу Прыказа грамадскай апекі 10 руб. 44 кап., плацячы марцінкевічаўскую пазыку 1848 г.

*28 верасня.* У Менску памёр паэт і педагог І. Легатовіч, прыяцель Дуніна-Марцінкевіча.

## 1868

*11 лютага.* У Салікамску нарадзілася ўнучка Валерыя.

*5 жніўня.* У вёсцы Карытнае Бабруйскага павета (цяпер Асіповіцкі р-н Магілёўскай вобл.) Дунін-Марцінкевіч піша верш «Заўтра спаса, кажуць людзе...», звернуты да Яна Луцкевіча, бацькі выдатных дзеячаў беларускага нацыянальнага руху Івана і Антона Луцкевічаў. Пад вершам, паводле публікацыі 1924 г., была паметка: *5 жніўня 1868 року, Корытна.* Арыгінал не захаваўся.

*15 верасня.* Ліст Я. Карловічу (відаць, у адказ на просьбу прыслаць свае творы): расказвае пра мэты сваёй творчасці, пералічвае выдадзеныя кнігі, пасылае з аказіяй кнігі «Беларускі Дудар...» і «Люцынка, або Шведы на Літве», падказвае, дзе можна адшукаць астатнія творы, гаворыць пра спробу надрукаваць пераклад «Пана Тадэвуша» ў Бруселі.

*17 лістапада.* Ліст Я. Карловічу: пытаецца, ці знайшоў адрасат пераклад «Пана Тадэвуша» і «Ідылію», чакае прысылкі абяцаных прац адрасата.

*У гэтым годзе.* Напісаў у Люцінцы першую частку вершаванага твора «З-над Іслачы, або Лекі на сон: Апавяданне Навума Прыгаворкі ў 2-х частках». Другая частка невядомая.

## 1869

*11 студзеня.* Я. Карловіч адпісвае на лісты Дуніна-Марцінкевіча ад 15 верасня і 17 лістапада 1868 г. Ліст Карловіча не захаваўся.

*23 студзеня.* У ведамасці пра паднаглядных асоб за 1868 г. менскі павятовы спраўнік А. Я. Сараеў паведаміў, што Дунін-Марцінкевіч жыве ў Люцінцы: *«Поведения хорошего и скрытного образа жизни».*

*Студзень.* Менскі губернскі маршалак шляхты хадайнічаў перад губернатарам пра вызваленне Дуніна-Марцінкевіча з-пад паліцэйскага нагляду, але ўлады не далі гэтаму хадайніцтву ходу.

## 1870

*Да 15 студзеня.* Дваранін І. Каржанткоўскі выдаў Дуніну-Марцінкевічу даверанасць на росшук дакументаў для атрымання спадчыны пасля дзядзькі яго, які памёр у Філадэльфіі (Амерыка). Заручыўшыся падтрымкай трох суседзяў-памешчыкаў і мясцовага станавога прыстава, пісьменнік звярнуўся да павятовага спраўніка А. Сараева з просьбай пра выдачу гадавога пашпарта для неабходных паездак. Сараеў перадаў просьбу па інстанцыі губернатару. У канцылярыі губернатара Дуніну-Марцінкевічу сказалі, што просьба будзе перададзена на вырашэнне галоўнаму начальніку краю. У сувязі з пільнай патрэбай пісьменнік прасіў спраўніка выдаць хаця б чатырохтыднёвы білет на праезд у Свянцяны, але Сараеў адказаў, што трэба чакаць рэзалюцыі вышэйшага начальства.

*15 студзеня.* Прашэнне Дуніна-Марцінкевіча менскаму губернатару загадаць спраўніку пра выдачу чатырохтыднёвага білета на праезд у Свянцяны.

*20 студзеня.* Запыт губернатара спраўніку пра добранадзейнасць пісьменніка і магчымасці вызваліць яго з-пад нагляду.

*25 студзеня.* Пісьмо губернатара Токарава віленскаму генерал-губернатару пра адсутнасць перашкод для выдачы Дуніну-Марцінкевічу гадавога пашпарта ў Пецярбург, Каралеўства Польскае, Ковенскую і Віленскую губерні па справах Каржанткоўскага.

*6 лютага.* Спраўнік А. Сараеў у рапарце губернатару знаходзіць вызваленне Дуніна-Марцінкевіча з-пад нагляду заўчасным.

*9 лютага.* Памочнік віленскага генерал-губернатара князь Багратіён у пісьме менскаму губернатару не прызнаў магчымым звольніць Дуніна-Марцінкевіча «из места его постоянного жительства».

*16 лютага.* Прашэнне Дуніна-Марцінкевіча галоўнаму начальніку Паўночна-Заходняга краю выдаць гадавы пашпарт калі не ў Пецярбург, то, прынамсі, у Каралеўства Польскае, а таксама ў Віленскую і Ковенскую губерні. Рэзалюцыя ад 5 сакавіка: «Отказать».

*22 лютага.* У Салікамску нарадзілася ўнучка Мар'я.

*8 снежня.* Скончыў працу над фарсам-вадэвілем у адным акце «Залёты».

## 1872

*27 чэрвеня.* У вершы «Вінцуку Дунін-Марцінкевічу, беларускаму паэту», напісаным у Замосці, Аляксандр Ельскі заклікаў Дуніна-Марцінкевіча працягваць працу ў галіне беларускай літаратуры, для надрукавання твораў прапаноўваў звярнуцца да выдаўца Бракгаўза ў Лейпцыгу.

*29 лістапада.* Губернскія ўлады паведамілі менскаму спраўніку, што Дунін-Марцінкевіч, згодна з царскім указам, вызвалены ад паліцэйскага нагляду з забаронай жыць у сталічных губернях. (Спраўнік пісьменніку пра гэта не паведаміў, прынамсі, паведаміў не адразу.)

*У гэтым годзе.* Звесткі пра кнігі Дуніна-Марцінкевіча прывёў у сваёй вядомай бібліяграфіі К. Эстрайхер.

У шостым томе пасмяротнага выдання паэтычнай спадчыны У. Сыракомлі надрукаваны верш «Тост у доме В. Марцінкевіча». У каментарыях выдавец В. Каратынскі прывёў кароткія звесткі пра Дуніна-Марцінкевіча.

## 1873

*4 студзеня.* У Салікамску нарадзілася ўнучка Ванда.

*У гэтым годзе.* У кнізе А. Валіцкага «Станіслаў Манюшка» паведамлялася пра раннія сумесныя творы кампазітара і Дуніна-Марцінкевіча.

У друкаваным каталогу імператарскай публічнай бібліятэкі ў Пецярбургу адзначана наяўнасць у ёй кніг Дуніна-Марцінкевіча «Гапон» і «Беларускі Дудар...».

## 1874

А. Кіркор паведаміў пра творчасць Дуніна-Марцінкевіча ў кнізе «Пра літаратуру братніх славянскіх народаў» (курс кракаўскіх лекцый).

## 1875

*12 траўня.* Калежскі асэсар Ігнат Ясіноўскі плаціў чарговую рату пазыкі за закладзены маёнтак Люцінка (10 руб. 23 кап.). Засталося сплаціць 151 руб. 30 кап.

*У гэтым годзе.* Ва «Успамінах з паўстання Менскага ваяводства ў 1863 годзе» ўдзельніка менскай рэвалюцыйнай арганізацыі В. Валодзькі (В. Кошчыца), надрукаваных у адным з кракаўскіх зборнікаў і прысвечаных гісторыі вызваленчай барацьбы, давалася вельмі высокая ацэнка асабістых якасцей Камілы Марцінкевіч, яе заслуг перад вызваленчым рухам.

## Да 1876 г.

*15 красавіка.* Велікоднае пасланне (вершам і прозай) суседцы Скіндэравай. Год не пазначаны. Падстава для датавання: у пасланні згадваецца дачка Аўгіння, якая ў 1876 г. выехала ў Салікамск да Камілы.

## 1876

*Да 25 траўня.* Дунін-Марцінкевіч звярнуўся да новага павятовага спраўніка В. М. Дабравольскага з просьбай выдаць гадавы пашпарт ва ўсе гарады Расійскай імперыі на той падставе, што нагляд над ім зняты яшчэ ў 1874 г.

*25 траўня.* Запыт спраўніка Дабравольскага ў канцылярыю губернатара, ці сапраўды над Дуніным-Марцінкевічам зняты паліцэйскі нагляд.

*28 траўня.* Канцылярыя губернатара паведаміла спраўніку, што Дунін-Марцінкевіч вызвалены з-пад нагляду яшчэ ў 1871—1872 гг.

*23 ліпеня.* У Салікамску, у сям'і Камілы і Казіміра Асіповічаў, нарадзіўся сын Станіслаў.

*Не пазней 6 кастрычніка.* Папячыцель Віленскай навучальнай акругі Сергіеўскі атрымаў ліст за подпісам «Иван Не....ов» (аўтарства

не ўстаноўлена) пра тое, што ў маёнтку Люцінка Вінцэнта Марцінкевіча адкрыта, без дазволу ўладаў, вучэльня для дзяцей.

*6 кастрычніка.* Сакрэтны ліст Сергіеўскага губернатару пра неадкладнае закрыццё вучэльні і прыцягненне вінаватых да адказнасці.

*10 кастрычніка.* Прадпісанне менскага губернатара В. І. Чарыкава павятоваму спраўніку правесці адпаведнае дазнанне і закрыць вучэльню ў Люцінцы. За Дуніным-Марцінкевічам зноў устанаўліваецца паліцэйскі нагляд.

*13 кастрычніка.* Менскі павятовы спраўнік сумесна з прыставам 2-га стана і пяршайскім валасным старшыною праводзіць у Люцінцы дазнанне пра вучэльню, адкрытую без дазволу ўладаў. Складзены адпаведны пратакол. Знойдзеныя падручнікі і кнігі спакаваны і апламбаваны пячаткамі «помещика Марцинкевича» і прыстава.

*19 кастрычніка.* Сакрэтнае паведамленне губернатара Чарыкава папячыцелю навучальнай акругі пра закрыццё школы ў Люцінцы, прыкладзена копія пратакола ад 13 кастрычніка. «...Подлинное дознание передано судебному следователю... а учебные пособия переданы в дирекцию народных училищ».

*10 лістапада.* Пра закрыццё школы ў Люцінцы паведаміў папячыцелю дырэктар вучэльняў Менскай губерні. «...Книги в опечатанном печатью исправника мешке в количестве 54 экземпляров препровождены в дирекцию».

*13 лістапада.* Школа ў Люцінцы была прадметам заклапочанага ліста міністра народнай асветы Д. А. Талстога папячыцелю навучальнай акругі (пра школу Талстому паведаміў міністр унутраных спраў).

*19 снежня.* У ведамасці пра паднаглядных за 1876 г., складзенай менскім павятовым спраўнікам В. М. Дабравольскім, Дуніну-Марцінкевічу дадзена атэстацыя: жыве ў Люцінцы, *«где занимается хозяйством... Поведения хорошего»*.

## 1877

*21 траўня.* Дунін-Марцінкевіч даў распіску прыставу 2-га стана Менскага павета, што своечасова заплаціць 10 руб. 20 кап., якія патрабуе ад яго Менская казённая палата.

*4 чэрвеня.* Распіска станавому прыставу, што належныя грошы 10 руб. 20 кап. перададзены *«чрез доктора Чаплинского, едущего в Минск...»*.

## 1878

*18 снежня*. «Перадкалядны падарунак»: Марцінкевічы змаглі спляціць чарговую рату за Люцінку. Плаціў калежскі асэсар Ігнат Ясіноўскі. Толькі гэтым разам як пратэрмінаваную, і таму не належных 10 руб. 20 кап., а 10 руб. 60 кап.

*У гэтым годзе*. Паводле раскладкі (г. зв. працэнтнага збору) з маёнткаў «польскіх памешчыкаў» Менскага павета на трохгоддзе з 1878 г., па маёнтку Люцінка ўстаноўлены збор 6 руб. 2,5 кап. (пры агульным прыбытку 38 руб. 47 кап.).

## 1879

*13 чэрвеня*. Чарговая рата за Люцінку. Плаціў той самы калежскі асэсар Ігнат Ясіноўскі (10 руб. 30 кап.).

## 1880

*30 верасня*. Зяць Дуніна-Марцінкевіча Казімір Асіповіч пасля 20-гадовай службы павятовым лекарам у Салікамску атрымлівае адстаўку. Неўзабаве сям'я пераязджае ў Вільню.

*17 снежня*. Чарговая рата за Люцінку. Плаціў калежскі асэсар Валенты Рымашэўскі (10 руб. 20 кап.).

## 1881

*1 сакавіка*. Выбух на Кацярынінскім канале скалануў сталіцу Расійскай імперыі. Рэха ад бомбаў нарадавольцаў разляцелася да самых глухіх закуткаў. Цара — вызваліцеля сялян і душыцеля паўстання 1863—1864 гг.— пакараў Ігнат Грынявіцкі (менавіта ягоная бомба сярод паўдзесятка падрыхтаваных стала смертаноснай). Ці па тым шляху пайшлі «нарадавольцы» да Волі і Свабоды?

*Верасень — кастрычнік*. Сябры «Беларускага зямляцтва», створанага са студэнтаў Пецярбургскага універсітэта, заявілі пра свой намер арганізаваць народніцкую групу і выступіць на барацьбу за вызваленне беларускага народа. Беларуская фракцыя ў народніцкім руху звяртаецца з адозвай *«К белорусской молодежи»*.

*23 кастрычніка.* У артыкуле «Менск», надрукаваным у варшаўскім часопісе *«Tygodnik Powszechny»* (№ 43) пад крыптанімам «s.» (нерасшыфраваны), узнёсла характарызаваўся марцінкевічаўскі пераклад «Пана Тадэвуша»: «...Нашы даследчыкі кнігадрукавання памыляюцца, калі за пачатак друкавання ў Менску лічаць з'яўленне ў гэтым горадзе камедыі Яна Ходзькі ў 1812 г. Бо ведаем кніжачку, перакладзеную вядомым у свой час Букатым, якая выйшла ў Менску ў 1791 г. пад назваю «Натхнёны брамін». Пазней там з'явілася даволі шмат набожных кніг, а гадоў дваццаць назад менская друкарня выдавала літаратурныя творы Кандратовіча, Шышкі, Марцінкевіча. Некалі ў гэтых школах настаўнічалі заслужаны збіральнік беларускіх народных песень Ян Чачот, а таксама адзіны ў прамым сэнсе эпіграматыст, варты месца ля Каханоўскага і Патоцкага, Ігнат Легатовіч. Тут часта бываў другі неацэнны гумарыст Ю. Гарайн, а таксама жыў раней згаданы Вінцэнт Марцінкевіч, перакладчык «Пана Тадэвуша» на беларускую мову. Трэба ведаць тую мову, каб належна ацаніць сілу і мастацкі каларыт цудоўнага перакладу, часткова друкаванага ў Вільні».

*2 снежня.* Чарговая рата платы за Люцінку. Плаціў Міхал Пратасевіч (10 руб. 58 кап.).

*У гэтым годзе.* У шостым, дадатковым томе сваёй «Польскай бібліяграфіі XIX ст.» К. Эстрайхер прывёў звесткі пра «Ідылію» Дуніна-Марцінкевіча, прапушчаныя ў трэцім томе бібліяграфіі (гл. 1872 г.).

## 1882

*19 сакавіка.* У Парыжы Вайніслаў-Казімір Савіч-Заблоцкі (*«польскі шляхціч-пан, а ў Гудаў графф»*), пераймаючы шмат у чым паэзію А. Міцкевіча і В. Дуніна-Марцінкевіча, піша найлепшы свой верш-прысвячэнне, адрасаваны польска-ўкраінскаму паэту Юзафу-Багдану Залескаму:

*Гэй, Баяне Вукраіньскій! Гутарку Табе*
*Я сказаў бы, Беларусін, штобы была мілай...*
*Толька ў нашай хаце сядзіць у куце́*
*Маскаліска тугый с чорнай сваёй сілай!*
*Маскаліска тугый вяжэць нам язык,*
*Ў беларускай хаце дыхнуць ня даець...*
*А хацеў бы я, гудар-маладзік,*
*Для Багдана, Польшчы сёння пагудзець...*

Гэты твор рэдкі і малахарактэрны не толькі ў спадчыне Вайніслава, але і ва ўсёй беларускай паэзіі XIX ст., станаўленне якой распачаў Вінцэнт. Подпіс пад беларускамоўным панегірыкам *«быўшый галава Крывіцькаго Вязку»* сведчыць пра існаванне беларуска-літвінска-крывіцкай арганізацыі, абсалютна не вядомай сучасным гісторыкам.

*Да 16 снежня.* Творчасць Дуніна-Марцінкевіча як аднаго з выдатных прадстаўнікоў беларускай культуры характарызавалася А. Кіркорам у трэцім томе «Живописной России». Асаблівай удачай пісьменніка, на думку Кіркора, быў зроблены ім пераклад «Пана Тадэвуша»: *«Переводчик победил непреодолимые трудности. Перевод не только верен, но язык везде гармоничен, понятен и особенно мягок».*

*16 снежня.* Імя Дуніна-Марцінкевіча як знакавай постаці «чисто белорусского творчества» названа ў нелегальным выданні беларускіх студэнтаў-народнікаў.

*16—18 снежня.* Пецярбургскі студэнт С. Нясцюшка-Буйніцкі складае рукапісны зборнік беларускай літаратуры, у якім галоўнае месца займалі творы Дуніна-Марцінкевіча («Гапон» і інш.).

*У гэтым годзе.* Звяртаецца з пісьмом да рэдактара польскага пецярбургскага часопіса *«Kraj»* з просьбай паспрыяць публікацыі твораў (пераклад «Пана Тадэвуша», «Ідылія»).

## 1883

*20 чэрвеня.* У Менскі прыказ грамадскай апекі паступіла частка пазыкі за закладзеную ў 1847 г. Люцінку. Плаціў сусед з маёнтка Тупальшчына Эдвін Вінцэнтаў Жаброўскі — 21 руб. 24 кап. Аднак гэта была не «чарговая рата», а дзве зарáз, паколькі ў 1882 г. ніхто не заплаціў. Пісьменніку заставалася жыць апошні год, а пазыка ў 126 руб. 18 кап. здавалася нясплатнай. Не раз давялося прасіць даравання ў сваякоў за тое, што ўцягнуў іх у фінансавае падняволле.

## 1884

*1 студзеня.* Першым днём апошняга года зямнога жыцця Дуніна-Марцінкевіча пазначана *«Послание к землякам-белорусам Щирого Белоруса».*

*15 (27) студзеня.* У польскім штотыднёвіку «*Kraj*» (№ 3) друкуюцца мемуары А. Кіркора «З віленскіх успамінаў». Чытаць іх было для Вінцэнта — як вяртацца ў маладосць, у дамураўёўскую Літву-Беларусь.

*Люты — сакавік.* У Пецярбургу беларускія рэвалюцыйныя народнікі выдалі першы нумар нелегальнага гектаграфічнага часопіса «Гоман». Ідэя сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення беларускага народа акрэслілася выразна.

*25 сакавіка.* На радзіму (у Вільню) вярнуўся Францішак Багушэвіч. Вярнуўся, каб не пакінуць сіратою беларускую музу. Як пісаў сам паэт, вярнуўся ў дзень Звеставанне, нібы той бусел з далёкага працяглага выраю-бадзяння, змушаны хавацца ад расійскіх шпікоў-жандараў, якія на працягу 10—15 гадоў высочвалі былых удзельнікаў паўстання 1863—1864 гг.

*25 ліпеня.* Памёр зяць Казімір Асіповіч.

*15 верасня.* За Люцінку 10 руб. 44 кап. плаціў Эдвін Вінцэнтаў Жаброўскі. З іх залічвалася сплачаным за асноўны капітал усяго 3 руб. 81 кап., бо 6 руб. 31 кап. пайшлі за адсоткі. Усяго яшчэ на Люцінцы вісела пазыка 122 руб. 29 кап.

*16 кастрычніка.* Для ўдавы Камілы Асіповіч-Марцінкевіч складзены «Фармулярны (служебовы) спіс былога салікамскага павятовага лекара, калежскага саветніка Казіміра Асіповіча».

*15 лістапада.* За месяц да смерці Вінцэнта выходзіць падпольны часопіс «Гоман», № 2. Гэтак нараджалася новая, маладая рэвалюцыйная Беларусь, здзяйсняючы прыродную пераемнасць пакаленняў. Нічога няма даражэй, як бачыць, што пасеянае табою — узыходзіць.

*Перад 17 снежня.* З пісьмом, «поўным самых чуллівых пачуццяў да паданняў, мінуўшчыны і мовы народа, сярод якога правёў свой век», даслаў у *«Kraj»* узор свайго перакладу «Пана Тадэвуша», спадзеючыся з дапамогай уплывовай рэдакцыі знайсці выдаўца.

*17 (29) снежня.* Памёр у не сваім (бо закладзеным) маёнтку Люцінка, пад страхою, атуленай ліпаю, «уласнаю пасаджанай рукою». 90-гадовы селянін Вінцэнт Скрундзь успамінаў (1959): «На пахаванне з'ехалася многа паноў і сышлося многа мужыкоў. Усе шкадавалі. Пасля паклалі труну ў каляску і павезлі ў Тупальшчыну...»

Мужыкі везлі свой будучы гонар і славу…

# ЗМЕСТ

## ВЕРШАВАНЫЯ АПОВЕСЦІ І АПАВЯДАННІ


Błogosławiona rodzina. *Opowiadanie wierszem w 3-ch obrazkach* 6
Багаславёная сям'я. *Апавяданне вершам у 3-х карцінах.*
*Пераклаў Аляксей Зарыцкі* ..... 21
Sławianie w XIX wieku. *Powiastka historyczna w 2-ch pieśniach* 37
Славяне ў XIX стагоддзі. *Гістарычнае апавяданне ў 2-х песнях.*
*Пераклаў Алесь Звонак* ..... 49
Do Władysława Syrokomli ..... 61
Kłopoty literackie. *Opowiadanie w 3-ch częściach*..... 63
Да Уладзіслава Сыракомлі. *Пераклаў Паўлюк Прануза* ..... 92
Літаратарскія клопаты. *Апавяданне ў 3-х частках.*
*Пераклаў Пятро Бітэль* ..... 94
Шчароўскія дажынкі. Аповесць у 2-х абразках ..... 123
Lucynka, czyli Szwedzi na Litwie. *Opowiadania historyczne w*
*4-ch obrazkach* ..... 143
Люцынка, альбо Шведы на Літве. *Гістарычнае апавяданне ў*
*4-х абразках. Пераклаў Сяргей Дзяргай* ..... 183
Травіца брат-сястрыца. *Аповесць з мясцовай легенды* ..... 223
Быліцы, расказы Навума ..... 238
Злая жонка ..... 239
Халімон на каранацыі ..... 256
Z nad Isłoczy, czyli Lekarstwo na sen: *Opowiadanie Nauma*
*Pryhoworki w 2-ch częściach* ..... 278
З-над Іслачы, або Лекі на сон. *Апавяданне Навума Прыгаворкі*
*ў 2-х частках. Пераклаў Пятро Бітэль* ..... 309

## ВЕРШЫ


«...Czas w chyżym przelocie...» . . . . . 342
«...Час зусім нечакана...». *Песня з аперэткі «Рэкруцкі жыдоўскі набор». Пераклаў Іван Ралько* . . . . . 342
Modlitwa na dzień zaduszny . . . . . 343
Малітва на памінальны дзень. *Пераклаў Пятро Бітэль* . . . . . 343
Dziecię i matka . . . . . 344
Дзіця і маці. *Пераклаў Пятро Бітэль* . . . . . 345
Wiosna! . . . . . 346
Вясна! *Пераклаў Сяргей Сакалоў* . . . . . 347
Pryperć . . . . . 348
Прыпяць. *Пераклаў Мікола Хведаровіч* . . . . . 348
Litwinka . . . . . 349
Літвінка. *Пераклаў Мікола Хведаровіч* . . . . . 350
Fantazya Antoniemu Kątskiemu ofiarowana . . . . . 351
Фантазія, прысвечаная Антонію Концкаму. *Пераклаў Уладзімір Мархель* . . . . . 353
Gołąbki . . . . . 355
Галубкі. *Пераклаў Нічыпар Чарнушэвіч* . . . . . 358
Віншаванне войта Навума . . . . . 361
Wspomnienie! . . . . . 363
Успаміны! *Пераклаў Сяргей Сакалоў* . . . . . 364
Portret Stefci . . . . . 364
Партрэт Стэфы. *Пераклаў Мікола Хведаровіч* . . . . . 365
Niestałość . . . . . 366
Нясталасць. *Пераклаў Сяргей Сакалоў* . . . . . 367
Wędrowiec . . . . . 368
Вандроўнік. *Пераклаў Сяргей Сакалоў* . . . . . 369
Trzeba się kochać! . . . . . 369
Трэба кахаць! *Пераклаў Сяргей Сакалоў* . . . . . 370
Ona! . . . . . 370
Яна! *Пераклаў Сяргей Сакалоў* . . . . . 370
Tęsknota na obczyźnie . . . . . 371
Смутак на чужыне. *Пераклаў Мікола Хведаровіч* . . . . . 372
Czyż ja stary? *Wierszyk ulotny* . . . . . 373
Хіба я стары? *Вершык крылаты. Пераклаў Аляксей Зарыцкі* 377
Do poczciwych białorusinów! . . . . . 381
Да пачцівых беларусаў! *Пераклаў Паўлюк Прануза* . . . . . 383
Верш Навума Прыгаворкі . . . . . 384
«Заўтра спаса, кажуць людзе...» . . . . . 386

## ПУБЛІЦЫСТЫКА

Прадмова да зборніка «Гапон» ..... 388
Прадмова да зборніка «Цікавішся? — Прачытай!» ..... 389
Ліст у рэдакцыю «Gazety Polskiej» ..... 391

## ЛІСТЫ І ПАСЛАННІ

1. Маўрыкію Аргельбранту. (Паштовы штамп
14 лютага 1851 г.) ..... 396
2. Адаму Завадскаму. (Паштовы штамп 17 сакавіка 1851 г.) 396
3. Віленскаму вайсковаму губернатару Іллі Бібікаву.
5 мая 1851 г. ..... 397
4. Адаму Завадскаму. 1 лютага 1852 г. ..... 399
5. Уладзіславу Сыракомлю. Просьба № 1. Чэрвень 1855 г. (?).
*Пераклаў Валерый Стралко* ..... 400
6. Уладзіславу Сыракомлю. Чэрвень 1855 г. (?).
*Пераклаў Валерый Стралко* ..... 403
7. Юзафу Сікорскаму. 25 ліпеня 1855 г. ..... 404
8. Адаму Завадскаму. 21 лістапада 1856 г. ..... 405
9. Адаму Завадскаму. 4 снежня 1856 г. ..... 406
10. У Галоўнае цэнзурнае ўпраўленне. 8 верасня 1859 г. ..... 408
11. Міністру народнай асветы Яўграфу Кавалеўскаму.
14 студзеня 1860 г. ..... 411
12. Адаму Кіркору. 23 сакавіка 1862 г. ..... 414
13. У рэдакцыю газеты «Виленский вестник». 6 лютага 1867 г. 415
14. Яну Карловічу. 15 верасня 1868 г. ..... 416
15. Яну Карловічу. 17 лістапада 1868 г. ..... 421
16. Менскаму губернатару. 15 студзеня 1870 г. ..... 422
17. Галоўнаму начальніку Паўночна-Заходняга краю.
16 лютага 1870 г. ..... 426
18. Велікоднае пасланне суседцы Скіндэравай. 15 красавіка.
*Пераклаў Пятро Бітэль* ..... 429

## ПЕРАКЛАДЫ

А. Міцкевіч. Пан Тадэвуш ..... 432
Быліца першая ..... 434
Быліца другая ..... 462

DUBIA ..... 489
Плынуць вятры... ..... 489
Гутарка старога дзеда ..... 500
Гутарка двух суседаў ..... 512
Вісна ..... 539
«Божа, што Польшчу чэраз усе векі...» ..... 542
Перадсмяротны разгавор Пустэльніка Пятра, каторы жыў у пушчы дзевецьдзесят лет, а памёр, маючы сто сорак лет ..... 545

ЖЫЦЦЯПІС ВІНЦЭНТА ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА Ў КАНТЭКСЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ XIX СТАГОДДЗЯ 553

**Дуніи-Марцінкевіч, В.**

Д83 Збор твораў. У 2 т. Т. 2. Вершаваныя аповесці і апавяданні, вершы, публіцыстыка, лісты і пасланні, пераклады, Dubia / Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч; уклад. з тэкст. падрыхт., пер. Я. Янушкевіча.— Мінск : Маст. літ., 2008.— 598 с. : [16] л. іл.

ISBN 978-985-02-0976-4.

Другі том Збору твораў В. Дуніна-Марцінкевіча склалі раздзелы: «Вершаваныя аповесці і апавяданні», «Вершы», «Публіцыстыка», «Лісты і пасланні», «Пераклады», «Dubia», а таксама жыццяпіс Беларускага Дудара.

**УДК 821.161.3-1-3**
**ББК 84(4Бен)**

Літаратурна-мастацкае выданне

**ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ** Вінцэнт Іванавіч

*Збор твораў*
*у двух тамах*

**Том 2**

Вершаваныя аповесці і апавяданні
Вершы
Публіцыстыка
Лісты і пасланні
Пераклады
Dubia

Рэдактары *Л. Т. Калюжная, І. М. Паланейчык*
Рэдактар польскага тэксту *Я. М. Кісялёва*
Мастак *Ю. А. Тарэеў*
Мастацкі рэдактар *Н. В. Барай*
Тэхнічны рэдактар *В. І. Барута*
Стылістычныя рэдактары *Л. Г. Ганчарэнка, М. А. Паддубская, А. М. Анцытовіч, Л. А. Дзядзюля*

Падпісана да друку 24.11.08. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура Тып Таймс. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 34,88+0,93 укл. Улік.-выд. арк. 30,10. Тыраж 2000 экз. Заказ 269.

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0056778 ад 17.02.2004. Пр. Пераможцаў, 11, Мінск, 220004. www.mastlit.by; e-mail:mail@mastlit.by

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку». ЛП № 02330/0056853 ад 30.04.2004. Вул. Каржанеўскага, 20, Мінск, 220024.

ISBN 978-985-02-0976-4